БЕСПРИНЦИ́ПН||О *нареч.* беспрынцыпо́ва; ~**ОСТЬ** беспрынцыпо́васць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** беспрынцыпо́вы.

БЕСПРИСТРА́СТ||ИЕ *ср* бесстаро́ннасць, -ці *ж*; (*справедливость*) справядлі́васць, -ці *ж*; (*непредубеждённость*) непрадузя́тасць, -ці *ж*; ~**НО** *нареч.* бесстаро́нна; справядлі́ва; непрадузя́та; ~**НОСТЬ** бесстаро́ннасць, -ці *ж*; справядлі́васць, -ці *ж*; непрадузя́тасць, -ці *ж*; ~**НЫЙ** бесстаро́нні; (*справедливый*) справядлі́вы; (*непредубеждённый*) непрадузя́ты.

БЕСПРИЧИ́НН||О *нареч.* беспрычы́нна; ~**ОСТЬ** беспрычы́ннасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** беспрычы́нны.

БЕСПРИЮ́ТН||ОСТЬ беспрыту́льнасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** беспрыту́льны.

БЕСПРОБУ́ДН||О *нареч.* безпро́сыпу, непрабу́дна; ~**ЫЙ** беспрасы́пны, непрабу́дны.

БЕСПРО́ВОЛОЧНЫЙ бяздро́тавы.

БЕСПРОГУ́ЛЬНЫЙ беспрагу́льны.

БЕСПРО́ИГРЫШНЫЙ бяспро́йгрышны.

БЕСПРОСВЕ́ТНЫЙ *прям.*, *перен.* беспрасве́тны, непрагля́дны.

БЕСПРОСЫ́ПНЫЙ *разг.* беспрасы́пны, непрабу́дны.

БЕСПРОЦЕ́НТНЫЙ беспрацэ́нтны, беспрацэ́нтавы.

БЕСПУ́Т||НИК шалапу́т, -та *м*; (*лодырь*) лайда́к, -ка́ *м*; (*развратник*) распу́снік, -ка *м*; ~**НИЦА** шалапу́тка, -кі *ж*; лайда́чка, -кі *ж*; распу́сніца, -цы *ж*; ~**НИЧАТЬ** *несов. разг.* шалапу́тнічаць; (*лодырничать*) лайда́чыць; (*развратничать*) распу́снічаць; ~**НЫЙ** шалапу́тны; (*развратный*) распу́сны; ~**СТВО** *ср* шалапу́цтва, -ва *ср*, лайда́цтва, -ва *ср*; распу́снасць, -ці *ж*.

БЕССАРА́БИЯ *ист.* Бесара́бія, -біі *ж*.

БЕССАРА́БСКИЙ *ист.* бесара́бскі.

БЕССВЯ́ЗН||О *нареч.* бязла́дна, няскла́дна; без су́вязі; ~**ОСТЬ** бязла́днасць, -ці *ж*, няскла́днасць, -ці *ж*; (*бессвязные слова*) нязвя́заныя сло́вы; ~**ЫЙ** бязла́дны, няскла́дны; без су́вязі.

БЕССЕМЕ́ЙНЫЙ бессяме́йны, несяме́йны.

БЕССЕМЕ́Р *тех.* бесеме́р, -ра *м*; ~**ОВА́НИЕ** *тех.* бесемерава́нне, -ння *ср*; ~**ОВА́ТЬ** *сов. и несов. тех.* бесеме́раваць; ~**ОВСКИЙ** бесеме́раўскі.

БЕССЕМЯ́Н||КА *сад.* безнасе́нка, -кі *ж*; **~НЫЙ 1.** *бот.* безнасе́нны; 2. *зоол.* бяссе́мевы.

БЕССЕРДЕ́Ч||ИЕ *ср* бессардэ́чнасць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* бессардэ́чна; **~НОСТЬ** бессардэ́чнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** бессардэ́чны.

БЕССИ́Л||ИЕ *ср* бяссі́лле, -лля *ср*; (*слабость*) сла́басць, -ці *ж*, нядýжасць, -ці *ж*; **~ЬНО** *нареч.* бяссі́льна; **~ЬНЫЙ** бяссі́льны; (*слабый*) сла́бы, нядýжы.

БЕССИСТЕ́МН||О *нареч.* бессістэ́мна; **~ОСТЬ** бессістэ́мнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бессістэ́мны.

БЕССКАЗУ́ЕМНЫЙ *грам.* безвыка́знікавы.

БЕССЛА́В||ИЕ *ср* нясла́ва, -вы *ж*; (*позор*) га́ньба, -бы *ж*; **~НО** *нареч.* нясла́ўна; ганéбна; **~НЫЙ** нясла́ўны; (*позорный*) ганéбны.

БЕССЛЕ́ДН||О *нареч.* бяссле́дна; **~ЫЙ** бяссле́дны.

БЕССЛОВЕ́СН||ОСТЬ 1. (*отсутствие речи*) бязмóўнасць, -ці *ж*; 2. (*молчаливость*) маўклі́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** бязмóўны; 2. (*молчаливый*) маўклі́вы.

БЕССМЕ́НН||О *нареч.* нязмéнна; **~ОСТЬ** нязмéннасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нязмéнны.

БЕССМЕ́РТ||ИЕ *ср* бессмярóтнасць, -ці *ж*, неўмі́рýчасць, -ці *ж*; **~НИК** *бот.* бяссмéртнік, -ку *м*; **~НЫЙ 1.** *прил.* бессмярóтны, неўмі́рýчы; 2. *сущ.* бессмярóтны, -нага *м*.

БЕССМЕ́ТНЫЙ бескаштарысны.

БЕССМЫ́СЛЕНН||О *нареч.* 1. недарэ́чна; бязглýзда; неразýмна; без сэ́нсу; *в сочетаниях с неопр. накл. глагола, имеющих значение «нет смысла», переводится оборотом* нямá сэ́нсу; б. **э́то де́лать** нямá сэ́нсу гэ́та рабі́ць; 2. (*не соображая*) няўця́мна, не ця́мячы, бяздýмна, не дýмаючы; бязглýзда; *см.* **бессмы́сленный; ~ОСТЬ 1.** бяссэ́нсавасць, -ці *ж*; недарэ́чнасць, -ці *ж*; бязглýздасць, -ці *ж*; неразýмнасць, -ці *ж*; 2. няўця́мнасць, -ці *ж*; бяздýмнасць, -ці *ж*; неасэнсавáнасць, -ці *ж*; бязглýздасць, -ці *ж*; *см.* **бессмы́сленный; ~ЫЙ 1.** (*лишённый смысла*) бяссэ́нсавы; (*абсурдный*) недарэ́чны; (*неразумный*) неразýмны; 2. (*не соображающий*) няўця́мны; (*бездумный*) бяздýмны; (*неосмысленный*) неасэнсавáны; (*глупый*) бязглýзды.

БЕССМЫ́СЛИЦА бяссэ́нсіца, -цы *ж*; (*абсурд*) недарэ́чнасць, -ці *ж*; (*глупость*) бязглýздзіца, -цы *ж*.

БЕССНЕ́ЖНЫЙ бяснéжны.

БЕССО́ВЕСТН||О *нареч.* бессарóмна; несумлéнна; **~ОСТЬ** бессарóмнасць, -ці *ж*; несумлéннасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бессарóмны, (*нечестный*) несумлéнны.

БЕССОДЕРЖА́ТЕЛЬН||ОСТЬ беззмястóўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** беззмястóўны.

БЕССОЗНА́ТЕЛЬН||О *нареч.* несвядóма; неўсвядóмлена; **~ОСТЬ** несвядóмасць, -ці *ж*; неўсвядóмленасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** несвядóмы; (*неосознанный*) неўсвядóмлены; 2. (*сопровождаемый потерей сознания*) непрытóмны; **в ~ом состоя́нии** у стáне непрытóмнасці, у непрытóмным стáне.

БЕССО́НН||ИЦА бяссóнніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** бяссóнны.

БЕССПО́РН||О 1. *нареч.* бясспрэ́чна; 2. *вводн. сл.* бясспрэ́чна; (*безусловно*) безумóўна; **~ОСТЬ** бясспрэ́чнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бясспрэ́чны.

БЕССРЕ́БРЕННИК *уст.* бяссрэ́бранік, -ка *м*.

БЕССРО́ЧНЫЙ бестэрмінóвы.

БЕССТРА́СТ||ИЕ *ср* бясстрáснасць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* бясстрáсна; **~НЫЙ** бясстрáсны.

БЕССТРА́Ш||ИЕ *ср* бясстрáшнасць, -ці *ж*, адвáжнасць, -ці *ж*, смéласць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* бясстрáшна, адвáжна, смéла; **~НЫЙ** бясстрáшны, адвáжны, смéлы.

БЕССТРУКТУ́РН||ЫЙ бесструктýрны; **~ая по́чва** бесструктýрная глéба.

БЕССТРУ́ННЫЙ бясструнны.

БЕССТЫ́Д||НИК *разг.* сараматні́к, -кá *м*; **~НИЦА** сараматні́ца, -цы *ж*; **~НО** *нареч.* бессарóмна; **~НЫЙ** бессарóмны; **~СТВО** *ср* бессарóмнасць, -ці *ж*.

БЕССТЫ́ЖИЙ *разг.* бессарóмны.

БЕССУБЪЕ́КТН||ЫЙ: ~ое предложе́ние *грам.* бессуб'éктавы (безасабóвы) сказ.

БЕССЧЁТН||ЫЙ незлічóны; ◇ **~ое число́ раз** *разг.* бéзліч разóў.

БЕСТА́КТН||О *нареч.* бестактóўна, нетактóўна; **~ОСТЬ** бестактóўнасць, -ці *ж*, нетактóўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бестактóўны, нетактóўны.

БЕСТАЛА́ННЫЙ 1. (*бездарный*) бястáлентны; нялзáтны; 2. (*обездоленный*) бяздóльны; (*несчастный*) няшчáсны.

БЕСТЕЛЕ́СН||ОСТЬ бесцялéснасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бесцялéсны.

БЕ́СТИЯ *ж бран.* бэ́стыя, -тыі *м* и *ж*.

БЕСТОЛКО́В||О *нареч.* бесталкóва; **~ОСТЬ** бесталкóвасць, -ці *ж*; **~ЩИНА** *разг.* бесталкóўшчына, -ны *ж*; **~ЫЙ** бесталкóвы.

БЕ́СТОЛОЧЬ *разг.* бесталкóўшчына, -ны *ж*.

БЕСТРЕ́ПЕТН||О *нареч.* бясстрáшна; (*смело*) смéла; **~ОСТЬ** бясстрáшнасць, -ці *ж*; смéласць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бясстрáшны; (*смелый*) смéлы.

БЕСФО́РМЕНН||ОСТЬ бясфóрменнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бясфóрменны.

БЕСХАРА́КТЕРН||ОСТЬ бесхарáктарнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бесхарáктарны.

БЕСХВО́СТЫЙ бясхвóсты.

БЕСХИ́ТРОСТН||О *нареч.* няхі́тра; простадýшна; адкры́та; прóста; **~ОСТЬ** няхі́трасць, -ці *ж*; простадýшнасць, -ці *ж*; адкры́тасць, -ці *ж*; прастатá, -ты́ *ж*; **~ЫЙ** няхі́тры; (*простодушный*) простадýшны; (*открытый*) адкры́ты; (*простой*) прóсты.

БЕСХО́ЗН||ЫЙ безгаспадáрны; **~ое иму́щество** безгаспадáрная маёмасць.

БЕСХОЗЯ́ЙСТВЕНН||ОСТЬ безгаспадáрчасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** безгаспадáрчы.

БЕСХРЕБЕ́ТНЫЙ бесхрыбéтны.

БЕСЦВЕТКО́ВЫЙ *бот.* бяскветкавы.

БЕСЦВЕ́ТН||ОСТЬ 1. бяскóлернасць, -ці *ж*; 2. *перен.* бескалярóвасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** бяскóлерны; 2. *перен.* бескалярóвы.

БЕСЦЕ́ЛЬН||О *нареч.* бязмэ́тна; **~ОСТЬ** бязмэ́тнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бязмэ́тны.

БЕСЦЕ́Н||НОСТЬ 1. вялі́кая каштóўнасць; неацэ́ннасць, -ці *ж*; 2. бескаштóўнасць, -ці *ж*, бясцэ́ннасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** (*большой ценности*) вéльмі каштóўны; (*неоценимый*) неацэ́нны, дарагі́; **~ный друг** дарагі́ (неацэ́нны) друг; **~ОК: за ~ок** за бéсцань, за бясцэ́нак.

БЕСЦЕРЕМО́НН||О *нареч.* бесцырымóнна; **~ОСТЬ** бесцырымóннасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бесцырымóнны.

БЕСЧЕЛОВЕ́ЧН||О *нареч.* бесчалавéчна; **~ОСТЬ** бесчалавéчнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бесчалавéчны, нялюдскі.

БЕСЧЕ́СТ||ИТЬ *несов.* ганьбавáць, гáньбіць, няслáвіць; (*оскорблять*) зневажáць; **~НО** *нареч.* ганéбна; **~НОСТЬ** ганéбнасць, -ці *ж*; несумлéннасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** ганéбны; (*нечестный*) несумлéнны.

БЕСЧЕ́СТЬЕ *ср* гáньба, -бы *ж*; (*оскорбление*) знявáга, -гі *ж*; **нанести́ бесче́стье** знявáжыць гóнар, знясла́віць, аганьбавáць.

БЕСЧИ́Н||НЫЙ *уст.* бясчы́нны; **~СТВО** бясчы́нства, -ва *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов.* бясчы́нстваваць.

БЕСЧИ́СЛЕНН||ОСТЬ бéзліч, -чы *ж*, незлічóнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незлічóны.

БЕСЧУ́ВСТВЕНН||О *нареч.* 1. непрытóмна; 2. бяздýшна, нячýла; **~ОСТЬ 1.** нечутлі́васць, -ці *ж*, неадчувáльнасць, -ці *ж*; 2. непрытóмнасць, -ці *ж*; 3. бяздýшнасць, -ці *ж*, нячýласць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** (*лишённый чувствительности*) нечутлі́вы, неадчувáльны; 2. (*бессознательный*) непрытóмны; 3, (*бездушный*) бяздýшны.

БЕСЧУ́ВСТВ||ИЕ *ср* 1. (*обморочное состояние*) непрытóмнасць, -ці *ж*; 2. (*бездушие*) бяздýшнасць, -ці *ж*, нячýласць, -ці *ж*; ◇ **до ~ия** да непрытóмнасці.

БЕСШАБА́ШН||О *нареч.* бесшаба́шна; **∼ОСТЬ** бесшаба́шнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** бесшаба́шны.
БЕСШЕ́РСТ||НЫЙ, ∼ЫЙ бясшэ́рсны.
БЕСШО́ВНЫЙ бясшво́вы; без швоў (*без швов*).
БЕСШУ́МН||О *нареч.* бясшу́мна; бязгу́чна; ці́ха; **∼ЫЙ** бясшу́мны; (*беззвучный*) бязгу́чны; (*тихий*) ці́хі.
БЕ́ТЕЛЬ *бот.* бе́тэль, -лю *м.*
БЕТО́Н бето́н, -ну *м*; **∼И́РОВАНИЕ** бетанава́нне, -ння *ср*; **∼И́РОВАННЫЙ** *прич., прил.* бетанава́ны; **∼И́РОВАТЬ** *несов.* бетанава́ць; **∼И́РОВАТЬСЯ** *страд.* бетанава́цца; **∼НЫЙ** бето́нны, бето́навы.
БЕТОНОМЕША́ЛКА *тех.* бетонамяша́лка, -кі *ж.*
БЕТО́Н||ЩИК бето́ншчык, -ка *м*; **∼ЩИЦА** бето́ншчыца, -цы *ж*; **∼ЬЕ́РКА** *тех.* бетан'е́рка, -кі *ж.*
БЕЧ||ЕВА́ вяро́ўка, -кі *ж*, лі́на, -ны *ж*; **∼ЕВА́Я** *сущ. ж уст.* бе́раг, -га *м.*
БЕЧЁВ||КА *ж* вяро́вачка, -кі *ж*, або́рка, -кі *ж*; (*шпагат*) шпага́т, -ту *м*; **∼ОЧНЫЙ** вяро́вачны, або́рачны; шпага́тавы.
БЕШАМЕ́ЛЬ *кул.* бешаме́ль, -лі *ж.*
БЕШЕНКО́ВИЧИ *пос.* Бешанко́вічы, -віч.
БЕШЕНКО́ВИЧСКИЙ РАЙО́Н Бешанко́віцкі раён.
БЕ́ШЕН||О *нареч.* шалёна; (*очень сильно*) страшэ́нна; **∼СТВО** *ср* **1.** шале́нства, -ва *ср*; **2.** *перен.* шале́нства, -ва *ср*; (*неистовство*) раз'ю́шанасць, -ці *ж*; **прийти́ в ∼ство** ашале́ць, раз'ю́шыцца; развар'я́вацца; **∼ЫЙ 1.** шалёны; **2.** *перен.* шалёны; (*очень сильный*) раз'ю́шаны; ◇ **∼ые де́ньги** *разг.* шалёныя гро́шы.
БЕШМЕ́Т бешме́т, -та *м.*
БИБЛЕ́ЙСКИЙ біблейскі.
БИБЛИО́ГР||АФ бібліёграф, -фа *м*; **∼АФИ́ЧЕСКИЙ** бібліяграфі́чны; **∼А́ФИЯ** *в разн. знач.* бібліягра́фія, -фіі *ж.*
БИБЛИО́Л||ОГ бібліёлаг, -га *м*; **∼ОГИ́ЧЕСКИЙ** бібліялагі́чны; **∼О́ГИЯ** бібліяло́гія, -гіі *ж.*
БИБЛИОМА́Н бібліяма́н, -на *м*; **∼ИЯ** бібліяма́нія, -ніі *ж.*
БИБЛИОТЕ́||КА бібліятэ́ка, -кі *ж*; **∼КАРСКИЙ** бібліятэ́карскі; **∼КАРЬ** бібліятэ́кар, -ра *м*; **∼КА-ЧИТА́ЛЬНЯ** бібліятэ́ка-чыта́льня, *род.* бібліятэ́кі-чыта́льні *ж*; **∼КОВЕ́ДЕНИЕ** бібліятэказна́ўства, -ва *ср*; **∼КОВЕ́ДЧЕСКИЙ** бібліятэказна́ўчы; **∼ЧКА** *уменьш.* бібліятэ́чка, -кі *ж*; **∼ЧНЫЙ** бібліятэ́чны.
БИБЛИОФИ́Л бібліяфі́л, -ла *м*; **∼ЬСКИЙ** бібліяфі́льскі; **∼ЬСТВО** бібліяфі́льства, -ва *ср.*
БИ́БЛИЯ бі́блія, -ліі *ж.*
БИВА́||К біва́к, -ка *м*; **∼ЧНЫЙ** біва́чны.
БИВА́ТЬ *несов. многокр. разг.* біць.
БИ́ВЕНЬ ікóл, *род.* ікла́ *м*, *мн.* і́клы, -лаў.
БИВУА́||К, ∼ЧНЫЙ *см.* **бива́||к, ∼чный.**
БИГА́МИЯ біга́мія, -міі *ж.*
БИДО́Н бідо́н, -на *м.*
БИЕ́Н||ИЕ біццё, *род.* біцця́ *ср*; ◇ **∼ие жи́зни** пульсава́нне жыцця́.
БИЗА́НЬ *мор.* біза́нь, -ні *ж*; **б.-ма́чта** біза́нь-ма́чта, -ты *ж.*
БИЗЕ́РТА *г.* Бізе́рта, -ты *ж.*
БИЗО́Н *зоол.* бізо́н, -на *м.*
БИКАРБОНА́Т *хим.* бікарбана́т, -та *м.*
БИКВАДРА́Т *мат.* біквадра́т, -та *м*; **∼НЫЙ** біквадра́тны, біквадрато́вы.
БИКФО́РДОВ: б. шнур *тех.* бікфо́рдаў шнур.
БИЛАБИА́ЛЬНЫЙ *лингв.* білабія́льны.
БИЛЕ́Т біле́т, -та *м*; **∼ЁР** білецёр, -ра *м*; **∼ЁРША** білецёрка, -кі *ж*; **∼НЫЙ** біле́тны.
БИЛЛИО́Н більён, -на *м.*
БИЛЛО́Н *эк.* біло́н, -ну *м*; **∼НЫЙ** біло́нны, біло́навы.
БИЛЛЬ *полит.* біль, *род.* біля *м.*
БИ́ЛО *ср* **1.** біла, -ла *ср*; **2.** (*цепа*) біч, *род.* біча́ *м*; (*в ступе*) таўка́ч, -ча́ *м.*
БИЛЬБА́О *г.* Більба́о *нескл.*, *м.*
БИЛЬДАППАРА́Т більдапара́т, -та *м.*
БИЛЬЯ́РД більярд, -да *м*; **∼НАЯ** *сущ.* більярдная, -най *ж*; **∼НЫЙ** більярдны, більярдавы.
БИМЕТАЛЛИ́||ЗМ *эк.* біметалі́зм, -ма *м*; **∼ЧЕСКИЙ** біметалі́чны.
БИМС *мор.* бімс, *род.* бімса *м.*
БИНО́КЛЬ біно́кль, -ля *м.*
БИНОКУЛЯ́РНЫЙ бінакуля́рны.
БИНО́М *мат.* біно́м, -ма *м.*
БИНТ бінт, род. бінта *м*; **наложи́ть бинт** накла́сці бінт; **∼ОВА́ТЬ** *несов.* бінтава́ць; **∼ОВА́ТЬСЯ** *страд.* бінтава́цца; **∼О́ВКА** *ж* бінтава́нне, -ння *ср*, бінто́ўка, -кі *ж*; **∼ОВО́Й** бінтавы́.
БИОГЕНЕ́||З *биол.* біягене́з, -зу *м*; **∼ТИ́ЧЕСКИЙ** біягенеты́чны.
БИО́ГР||АФ біёграф, -фа *м*; **∼АФИ́ЧЕСКИЙ** біяграфі́чны; **∼А́ФИЯ** біягра́фія, -фіі *ж.*
БИОДИНА́М||ИКА *биол.* біядына́міка, -кі *ж*; **∼И́ЧЕСКИЙ** біядынамі́чны.
БИО́Л||ОГ біёлаг, -га *м*; **∼ОГИ́ЧЕСКИЙ** біялагі́чны; **∼О́ГИЯ** біяло́гія, -гіі *ж.*
БИОМАГНЕТИ́||ЗМ біямагнеты́зм, -ма *м*; **∼ЧЕСКИЙ** біямагнеты́чны.
БИОМЕХА́НИКА *биол., театр.* біямеха́ніка, -кі *ж.*
БИОСТА́НЦИЯ біяста́нцыя, -цыі *ж.*
БИОСФЕ́РА біясфе́ра, -ры *ж.*
БИОТЕ́ХНИКА біятэ́хніка, -кі *ж.*
БИОФИ́ЗИКА біяфі́зіка, -кі *ж.*
БИОХ||ИМИ́ЧЕСКИЙ біяхімі́чны; **∼И́МИЯ** біяхі́мія, -міі *ж.*
БИПЛА́Н *ав.* біпла́н, -на *м.*
БИПОЛЯ́РН||ОСТЬ *физ.* біпаля́рнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** біпаля́рны.
БИ́РЖ||А бі́ржа, -жы *ж*; ◇ **б. труда́** бі́ржа пра́цы; **чёрная б.** чо́рная бі́ржа; **∼ЕВИ́К** біржаві́к, -ка́ *м*; **∼ЕВО́Й** біржавы́.
БИ́РКА бі́рка, -кі *ж.*
БИ́РМА Бі́рма, -мы *ж.*
БИ́РМИНГЕМ *г.* Бі́рмінгем, -ма *м.*
БИРОБИДЖА́Н Бірабіджа́н, -на *м.*
БИРОБИДЖА́НСКИЙ бірабіджа́нскі.
БИРО́НОВЩИНА *ист.* біро́наўшчына, -ны *ж.*
БИРЮЗ||А́ *мин.* біруза́, -зы́ *ж*; **∼О́ВЫЙ** бірузо́вы.
БИРЮ́К *разг.* **1.** во́ўк, *род.* во́ўка *и* ваўка́ *м*; **2.** *перен.* во́ўк, *род.* во́ўка *и* ваўка́ *м*; (*бука*) сугне́й, -не́я *м*; **смотре́ть ∼о́м** глядзе́ць во́ўкам.
БИРЮ́ЛЬКИ *мн.* біру́лькі, -лек, *ед.* біру́лька, -кі *ж.*
БИРЮ́Ч *ист.* біру́ч, -ча́ *м*; вясту́н, -на́ *м*; вяшча́льнік, -ка *м.*
БИРЮЧИ́НА *бот.* біручы́на, -ны *ж.*
БИС *межд.* біс.
БИ́СЕР *м* бі́сер, -ру *м*; па́церкі, -рак, *ед.* па́церка, -кі *ж*; ◇ **мета́ть би́сер перед сви́ньями** сыпаць бі́сер (пе́рлы) перад сві́ннямі; **∼ИНА** бі́серына, -ны *ж*; па́церка, -кі *ж*; **∼НЫЙ** бі́серны; па́церкавы.
БИСИ́РОВАТЬ *сов. и несов.* бісі́раваць.
БИСКА́ЙСКИЙ ЗАЛИ́В Біска́йскі залі́ў.
БИСКА́ЙЯ Біска́йя, -ка́йі *ж.*
БИСКВИ́Т бісквіт, -та *м*; **∼НЫЙ** бісквí́тны.
БИССЕКТРИ́СА *мат.* бісектры́са, -сы *ж.*
БИСУЛЬФА́Т *хим.* бісульфа́т, -та *м.*
БИТА́ *спорт.* біта́, -ты́ *ж.*
БИ́ТВА бі́тва, -вы *ж.*
БИ́ТЕНГ *мор.* бі́тэнг, -га *м.*
БИТКО́М *нареч.*: **б. наби́ть** бітко́м набі́ць.
БИТО́К *кул.* біто́к, -тка́ *м.*
БИ́ТУМ *геол., хим.* бі́тум, -му *м.*
БИТУМ||ИНИЗА́ЦИЯ бітумініза́цыя, -цыі *ж*; **∼ИНИЗИ́РОВАНИЕ** бітумінізава́нне, -ння *ср*; **∼инизи́рование песко́в** бітумінізава́нне пяско́ў.

БИ́ТУМНЫЙ бітумны; **б. ме́тод закрепле́ния песко́в** бітумны метад замацава́ння пяскоў.

БИ́ТЫЙ 1. *в разн. знач.* біты; 2. (*убитый на мясо*) рэ́заны, біты; ко́латы; *см.* **бить;** ◇ **б. час** *разг.* цэ́лая (до́брая) гадзіна.

БИТ||Ь *несов.* 1. *в разн. знач.* біць; **жизнь бьёт ключо́м** жыццё б'е крыніцай; **бьёт по карма́ну** б'е па кішэні; **бить в ладо́ши** пляска́ць у ла́дкі (у дало́ні); **ружьё бьёт хорошо́** стрэ́льба б'е до́бра; **бить пти́цу на лету́** біць пту́шку на лятү́; **бить хвосто́м** біць хвасто́м; 2. (*резать птицу на мясо*) рэ́заць, біць; (*свиней*) кало́ць; 3. (*трясти, приводить в дрожь*) *разг.* трэ́сці, калаціць; **∼ЬЁ** біццё, -ццё *ср*; **∼ЬСЯ** 1. біцца; **во́лны бью́тся о бе́рег** хвалі б'юцца аб бе́раг; **∼ься в припа́дке** біцца ў прыпадку; 2. *страд.* біцца, рэ́зацца; кало́цца; *см.* **бить** 2; ◇ **∼ься об закла́д** *разг.* ісці ў закла́д, заклада́цца; **∼ься как ры́ба об лёд** *погов.* біцца як рыба аб лёд.

БИТЮ́Г біцю́г, -га́ *м*.

БИФУРКА́ЦИЯ біфурка́цыя, -цыі *ж*.

БИФШТЕ́КС *кул.* біфштэ́кс, -са *м*.

БИ́ЦЕПС *анат.* біцэпс, -са *м*.

БИЧ *м* 1. бізу́н, -на́ *м*; 2. *перен.* (*кара*) ка́ра, -ры *ж*; (*бедствие*) няшча́сце, -ця *ср*; 3. *перен.* біч, *род.* біча́ *м*; **бич сати́ры** біч сатыры.

БИЧЕВА́ *см.* бечева́.

БИЧЕВА́||НИЕ 1. хваста́нне, -ння *ср*; 2. *перен.* бічава́нне, -ння *ср*; **∼ТЬ** *несов.* 1. хваста́ць; 2. *перен.* бічава́ць; **∼ТЬСЯ** *страд.* 1. хваста́цца; 2. бічава́цца.

БИЧЕНО́СЦЫ *мн. зоол.* бічано́сцы, -цаў.

БИШЬ *част. разг.* (*при припоминании забытого*) бо; гэ́та; чакай, *мн.* чака́йце (*ставится в начале фразы*); ты сказаў, *мн.* вы сказа́лі (*при припоминании того, что было сказано собеседником*); **как бишь его́ зову́т?** як бо яго́ заву́ць?; як гэ́та яго́ заву́ць?; **кто бишь мне про э́то ска́зывал?** чакай (чака́йце), хто мне пра гэ́та гаварыў?; **как бишь э́то бы́ло?** як, ты сказаў (вы сказа́лі), гэ́та было́?

БЛАГ||О I *ср сущ.* 1. (*добро*) дабро́, -ра́ *ср*; (*счастье*) шча́сце, -ця *ср*; (*польза*) карысць, -ці *ж*; **на ∼о ро́дины** дзе́ля дабра́ радзімы; 2. (*материальное благополучие*) дабро́ты, -ро́т; (*выгоды*) выгады, -гад; **∼а жи́зни** дабро́ты (выгады) жыцця; ◇ **всех благ!** *разг.* усяго́ до́брага!, усяго́ найле́пшага!; **ни за каки́е ∼а** ні за што на све́це.

БЛА́ГО II *союз* балазе́; до́бра што; (*тем более*) тым больш; **бла́го он пришёл** балазе́ ён прыйшоў.

БЛАГОВЕ́РН||АЯ *сущ. шутл.* жанчына, -ны *ж*, жо́нка, -кі *ж*; **∼ЫЙ** *сущ. шутл.* чалаве́к, -ка *м*, муж, *род.* му́жа *м*.

БЛА́ГОВЕСТ *церк.* звон, *род.* звону *м*; **∼ИТЬ** *несов. прям., перен.* званіць.

БЛАГОВЕ́ЩЕНСК *г.* Благаве́шчанск, -ка *м*.

БЛАГОВИ́ДН||ОСТЬ прысто́йнасць, -ці *ж*, добрапрысто́йнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** прысто́йны, добрапрысто́йны; зру́чны; ◇ **под ∼ым предло́гом** знайшоўшы (прыду́маўшы) зру́чную прычыну.

БЛАГОВОЛ||Е́НИЕ *ср уст.* ла́ска, -кі *ж*, прыхільнасць, -ці *ж*, спрыянне, -ння *ср*, зычлівасць, -ці *ж*; **приобрести́ ∼е́ние** увайсці ў ла́ску (*да каго*); **∼И́ТЬ** *несов.* мець ла́ску (*да каго*), спрыяць (*каму*), ста́віцца з прыхільнасцю (*да каго*), зычыць (*каму*); ◇ **∼и́те** (*с неопр.*) *уст.* бу́дзьце ласка́вы, зрабіце ла́ску.

БЛАГОВО́Н||ИЕ *ср уст.* пах, *род.* па́ху *м*, паху́часць, -ці *ж*, духмянасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** паху́чы, духмя́ны.

БЛАГОВОСПИ́ТАНН||ОСТЬ *ж* до́брае выхава́нне; **∼ЫЙ** до́бра выхаваны.

БЛАГОВРЕ́МЕН||ИЕ: во ∼ии *уст.* своечасо́ва, у свой час, у пару́; **∼НЫЙ** своечасо́вы.

БЛАГОГЛУ́ПОСТЬ *ж ирон. уст.* глу́пства, -ва *ср*; недарэ́чнасць, -ці *ж*, бязглу́здзіца, -цы *ж*.

БЛАГОГОВЕ́||ЙНО *нареч.* з глыбо́кай паша́най, з глыбо́кай пава́гай; **∼ЙНЫЙ** по́ўны глыбо́кай паша́ны, по́ўны глыбо́кай пава́гі; **∼НИЕ** *ср* глыбо́кая паша́на, глыбо́кая пава́га; **∼ТЬ** *несов.* ста́віцца з глыбо́кай паша́най (з глыбо́кай пава́гай).

БЛАГОДАРЕ́НИЕ *ср уст.* падзя́ка, -кі *ж*.

БЛАГОДАР||И́ТЬ *несов.* дзя́каваць (*каму-чаму*); **∼ю (тебя́, вас)** дзя́кую (табе́, вам).

БЛАГОДА́Р||НО *нареч.* удзя́чна; **∼НОСТЬ** 1. (*чувство*) удзя́чнасць, -ці *ж*; 2. (*изъявление благодарности*) падзя́ка, -кі *ж*; ◇ **рассыпа́ться в ∼ностях** шчыра падзя́каваць; **∼НЫЙ** удзя́чны; **∼ный труд** удзя́чная пра́ца; **∼СТВЕННЫЙ** *уст.* падзя́чны; **∼ственное письмо́** падзя́чны ліст; **∼СТВОВАТЬ** *несов. уст.* дзя́каваць (*каму-чаму*); **∼ству́йте** дзя́кую, *мн.* дзя́куем.

БЛАГОДАРЯ́ *предлог с дат.* дзя́куючы (*каму-чаму*); **б. случа́йности** дзя́куючы выпадко́васці.

БЛАГОДА́ТНЫЙ 1. (*изобилующий благами, природными богатствами*) бага́ты, раско́шны; 2. (*хороший*) до́бры; (*чудесный*) цудо́ўны; (*счастливый*) шчаслівы; (*благоприятствующий*) спрыя́льны; жыватво́рны.

БЛАГОДА́ТЬ *ж* раско́ша, -шы *ж*.

БЛАГОДЕ́НСТВ||ИЕ *ср уст.* даста́так, -тку *м*, добрабыт, -ту *м*; (*процветание*) працвіта́нне, -ння *ср*; (*счастливая жизнь*) шчаслівае жыццё; **∼ОВАТЬ** *несов. уст.* жыць у даста́тку; (*процветать*) працвіта́ць; (*счастливо жить*) жыць у шча́сці.

БЛАГОДЕ́ТЕЛЬ *ж уст.* дабрадзе́й, -дзе́я *м*; **∼НИЦА** дабрадзе́йка, -кі *ж*; **∼НО** *нареч.* дабрадзе́йна; (*благотворно*) добратво́рна; **∼НЫЙ** дабрадзе́йны; (*благотворный*) добратво́рны; **∼СТВОВАТЬ** *несов. уст.* рабіць дабро́, спрыя́ць; (*покровительствовать*) апякава́цца (*над кім*).

БЛАГОДЕЯ́НИЕ *уст.* дабрадзе́йства, -ва *ср*; дабро́, -ра́ *ср*; до́бры ўчынак; спрыянне, -ння *ср*.

БЛАГОДУ́Ш||ЕСТВОВАТЬ *несов.* прабыва́ць у лаго́дным ста́не, правóдзіць бесклапо́тна час; **∼ИЕ** *ср* лаго́днасць, -ці *ж*; (*добродушие*) добраду́шнасць, -ці *ж*; **∼НО** *нареч.* лаго́дна; добраду́шна; **∼НЫЙ** лаго́дны; (*добродушный*) добраду́шны.

БЛАГОЖЕЛА́ТЕЛЬ добразычлівец, -лі́ўца *м*; (*сторонник*) прыхільнік, -ка *м*; **∼НИЦА** добразычлі́ўка, -кі *ж*; прыхільніца, -цы *ж*; **∼НО** *нареч.* добразычліва; прыхільна; спрыя́льна; **∼НЫЙ** добразычлівы; прыхільны; спрыя́льны.

БЛАГОЗВУ́Ч||ИЕ *ср* мілагу́чнасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** мілагу́чны.

БЛАГО́Й I *уст.* до́бры.

БЛАГ||О́Й II: **∼и́м ма́том** *уст.* не́мым го́ласам.

БЛАГОНАДЁЖН||ОСТЬ 1. *уст.* палітычная надзе́йнасць, добранадзе́йнасць, -ці *ж*; добранаме́рнасць, -ці *ж*; 2. надзе́йнасць, -ці *ж*; пэ́ўнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** 1. (*политически*) *уст.* палітычна надзе́йны, добранадзе́йны; добранаме́рны; 2. (*надёжный*) надзе́йны; (*достоверный*) пэ́ўны; ◇ **бу́дьте ∼ы** *разг.* бу́дзьце ўпэ́ўнены (пэ́ўны).

БЛАГОНАМЕ́РЕНН||ОСТЬ *уст.* добранаме́рнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** *уст.* добранаме́рны.

БЛАГОНРА́В||ИЕ *ср уст., ирон.* до́брыя паво́дзіны, мара́льнасць, -ці *ж*; прысто́йнасць, -ці *ж*; **∼НО** *нареч.* до́бра, мара́льна; прысто́йна; **∼НЫЙ** до́брых паво́дзін, мара́льны; прысто́йны.

БЛАГООБРА́З||ИЕ *ср* самавітасць, -ці *ж*; пава́жнасць, -ці *ж*; го́жасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** самавіты; пава́жны; го́жы.

БЛАГОПОЛУ́Ч||ИЕ *ср* (*благосостояние*) добрабыт, -ту *м*, даста́так, -тку *м*; (*счастье*) шча́сце, -ця *ср*; **∼НО** *нареч.* до́бра, шчасліва, уда́чна; паспяхо́ва; **∼НЫЙ** шчаслівы, уда́чны; (*успешный*) паспяхо́вы.

БЛАГОПРИОБРЕ́ТЕН||ИЕ *ср уст.* 1. набыццё, -цця́ *ср*, набыва́нне, -ння *ср*; 2. (*предмет*) набытак, -тку *м*; **∼НЫЙ** набыты; саманабыты.

БЛАГОПРИСТОЙН||О *нареч.* прыстойна, добрапрыстойна; **~ЫЙ** прыстойны, добрапрыстойны.

БЛАГОПРИЯТ||НО *нареч.* 1. спрыяльна; зручна, слушна; 2. прыхільна; 3. удачна, шчасліва, добра; **~НЫЙ** 1. (*способствующий*) спрыяльны; (*удобный*) зручны, слушны; **~ный случай** зручны (слушны) выпадак; 2. (*благосклонный*) прыхільны; **~ная рецензия** прыхільная рэцэнзія; 3. (*удачный*) удачны, шчаслівы, добры; **~ный исход** удачны (шчаслівы) канец; **~ные вести** добрыя весткі; **~СТВОВАНИЕ** спрыянне, -ння *ср*; **наибольшее ~ствование** *эк.*, *полит.* найбольшае спрыянне; **~СТВОВАТЬ** *несов.* спрыяць; **~СТВУЕМЫЙ: ~ствуемая нация** *дип.* нацыя найбольшага спрыяння.

БЛАГОРАЗУМ||ИЕ *ср* развáжнасць, -ці *ж*; асцярожнасць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* развáжна; асцярожна; разумна; **~НЫЙ** развáжны; (*осторожный*) асцярожны; (*разумный*) разумны.

БЛАГОРАСТВОР||ЕНИЕ: б. воздухов *шутл.* харáство надвор'я, раскоша паветра; **~ЁННЫЙ** *уст.* чысты, здаровы.

БЛАГОРОДИЕ *ср уст.* благародздзе, -ддзя *ср*, благароднасць, -ці *ж*; **ваше б.** ваша благародздзе.

БЛАГОРОД||НО *нареч.* высокародна; **~НЫЙ** 1. высокародны; прыстойны; 2. (*аристократический, дворянский*) *уст.* шляхетны; **институт ~ных девиц** інстытут шляхетных дзяўчат; ◇ **~ные металлы** высокародныя металы; **~СТВО** *ср* высокароднасць, -ці *ж*.

БЛАГОСКЛОНН||О *нареч.* прыхільна; **~ОСТЬ** прыхільнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыхільны.

БЛАГОСЛОВ||ЕНИЕ благаслаўленне, -ння *ср*; **~ЕННЫЙ** *поэт.* благаславёны; **~ИТЬ** *сов.* благаславіць; **~ЛЯТЬ** *несов.* благаслаўляць.

БЛАГОСОСТОЯНИЕ *ср* дабрабыт, -ту *м*, дастатак, -тку *м*, багацце, -цця *ср*.

БЛАГОТВОРИТЕЛЬ *уст.* добрачынец, -нца *м*; (*благодетель*) дабрадзей, -дзея *м*; **~НИЦА** добрачынніца, -цы *ж*; дабрадзейка, -кі *ж*; **~НОСТЬ** *уст.* добрачыннасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** добрачынны; **~СТВОВАТЬ** *несов.* *уст.* займацца добрачыннасцю.

БЛАГОТВОРН||О *нареч.* добратворна, жыватворна; **~ОСТЬ** добратворнасць, -ці *ж*, жыватворнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** добратворны, жыватворны.

БЛАГОУСМОТРЕНИЕ *уст.* меркаванне, -ння *ср*, вырашэнне, -ння *ср*.

БЛАГОУСТРАИВАТЬ *несов.* упарадкоўваць, добраўпарадкоўваць, парадкаваць.

БЛАГОУСТРО||ЕННОСТЬ упарадкаванасць, -ці *ж*, добраўпарадкаванасць, -ці *ж*; **~ЕННЫЙ** упарадкаваны, добраўпарадкаваны; **~ИТЬ** *сов.* упарадкаваць, добраўпарадкаваць; **~ЙСТВО** *ср* упарадкаванасць, -ці *ж*; (*действие*) упарадкаванне, -ння *ср*, добраўпарадкаванне, -ння *ср*; (*благосостояние*) дабрабыт, -ту *м*; **отдел городского ~йства** аддзел гарадскога добраўпарадкавання.

БЛАГОУХА||НИЕ *ср* пах, *род.* паху *м*, пахучасць, -ці *ж*, духмянасць, -ці *ж*; **~ННЫЙ** пахучы, духмяны; **~ТЬ** *несов.* пахнуць.

БЛАГОЧ||ЕСТИВЫЙ набожны; **~ЕСТИЕ** *ср церк.* набожнасць, -ці *ж*.

БЛАГОЧИННЫЙ 1. *прил. уст.* добрапрыстойны, прыстойны; 2. *сущ. церк.* благачынны, -ннага *м*.

БЛАЖЕН||НО *нареч.* шчасліва, шчасна; **~НЫЙ** 1. (*счастливый*) шчаслівы, шчасны; 2. (*глуповатый*) прыдуркаваты, блазнаваты; 3. *церк.* блажэнны; ◇ **~ной памяти** добрай памяці; **~СТВО** *ср* шчасце, -ця *ср*; асалода, -ды *ж*, раскоша, -шы *ж*; ◇ **быть на верху ~ства** быць на вышыні (на вышэйшай ступені) шчасця; **~СТВОВАТЬ** *несов.* раскашавацца, упівацца шчасцем, упівацца асалодай.

БЛАЖ||ИТЬ *несов. разг.* дурыць, блазнаваць; (*своенравничать*) своволіць; **~НОЙ** *разг.* дурны, блазнаваты.

БЛАЖЬ *ж* дур, *род.* дуру *м*; **выкинь блажь из головы** выкінь дур з галавы.

БЛАНК бланк, *род.* бланка *м*.

БЛАНКОВЫЙ бланкавы.

БЛАНКОНАДПИСАТЕЛЬ *торг.* бланканадпісальнік, -ка *м*.

БЛАНШИР||ОВАТЬ *несов. тех.* бланшаваць; **~ОВКА** *ж* бланшаванне, -ння *ср*.

БЛАСТЕМА *биол.* бластэма, -мы *ж*.

БЛАТ *просторец.* блат, *род.* блату *м*; **~НОЙ** блатны.

БЛЕВ||АТЬ *несов. просторец.* ванітаваць; **~ОТИНА** *ж* *просторец.* ваніты, -таў *ед. нет*.

БЛЕДНЕТЬ *несов.* бляднець.

БЛЕДН||О *нареч.* бледна; **~ОЛИЦЫЙ** бледнатвары; **~ОСТЬ** бледнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бледны.

БЛЕЙВЕЙС *тех.* блейвейс, -са *м*.

БЛЕК||ЛОСТЬ бляклacць, -ці *ж*; **~ЛЫЙ** бляклы; **~лая руда** *мин.* бляклая руда; **~НУТЬ** *несов.* бляклнуць.

БЛЕНДА *мин.*, *тех.* бленда, -ды *ж*.

БЛЕНОРРЕЯ *мед.* бленарэя, -рэі *ж*.

БЛЕСК *м* 1. бляск, *род.* бляску *м*; бліск, *род.* бліску *м*; 2. *перен.* бліскучасць, -ці *ж*; **блеск остроумия** бліскучасць дасціпнасці; **говорить с блеском** гаварыць з бліскучасцю; **во всём блеске** ва ўсёй бліскучасці; 3. *мин.* бліскак, -ку *м*; **железный, свинцовый блеск** жалезны, свінцовы бліскак.

БЛЕСНА *рыбол.* блешня, -ні *ж*.

БЛЕС||НУТЬ *сов. и однокр.* 1. бліснуць; 2. *перен.* (*отличиться*) бліснуць; 3. *перен.* (*мелькнуть*) мільгануць; (*появиться*) з'явіцца; **~нула мысль** мільганула (з'явілася) думка; **~ТЕТЬ** *несов.* 1. бліщчаць, бліскаць; (*сиять*) ззяць; (*сверкать*) зіхацець; 2. *перен.* (*отличаться*) вызначацца; **не блещет умом** не вызначаецца розумам.

БЛЁСТК||А 1. бліскаўка, -кі *ж*; 2. *перен.* іскра, -ры *ж*; **~и остроумия** іскры дасціпнасці.

БЛЕСТЯЩ||Е *нареч.* бліскуча; **~ИЙ** *прям.*, *перен.* бліскучы.

БЛЕФ блеф, *род.* блефу *м*.

БЛЕЯ||НИЕ бляянне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* бляяць.

БЛИЖАЙШ||ИЙ 1. *превосх. ст.* найбліжэйшы; **~ие задачи** найбліжэйшыя задачы; 2. *сравн. ст.* бліжэйшы; **при ~ем рассмотрении** пры бліжэйшым разглядзе.

БЛИЖЕ *сравн. ст.* 1. *нареч.* бліжэй; **подойти ближе** падысці бліжэй; 2. *прил.* бліжэйшы; **их отношения стали ближе** іх адносіны сталі бліжэйшымі.

БЛИЖНИЙ 1. *прил.* блізкі; бліжэйшы; 2. *сущ.* бліжні, -няга *м*, блізкі, -кага *м*.

БЛИЖНИЙ ВОСТОК Блізкі Усход.

БЛИЗ *предлог с род.* паблізу (*ад каго-чаго*), каля (*каго-чаго*).

БЛИЗЁХОНЬКО *нареч. разг.* блізенечка, блізенька.

БЛИЗИТЬСЯ *несов.* набліжацца.

БЛИЗ||КИЙ 1. *разн. знач.* блізкі; 2. (*в значении сказуемого переводится наречием*) блізка; **близок день** блізка дзень; **~КО** *нареч.*, *прил. в знач. сказ.* блізка.

БЛИЗЛЕЖАЩИЙ блізкі, бліжэйшы; (*смежный*) суможны.

БЛИЗНЕЦ *м* блізня, -няці *ср*, *мн.* блізняты, -нят; блізнюк, -ка *м*, *мн.* блізнюкі, -коў.

БЛИЗНЕЦЫ *астр.* Блізняты, -нят.

БЛИЗОРУК||ИЙ блізарукі; **~ОСТЬ** блізарукасць, -ці *ж*.

БЛИЗОСТЬ 1. блізкасць, -ці *ж*; 2. (*близкие отношения*) блізкія адносіны, блізкасць, -ці *ж*.

БЛИК блік, *род.* бліку *м*.

БЛИН блін, *род.* бліна *м*, блінец, -нца *м*; ◇ **первый блин комом** *погов.* першы блін камяком.

БЛИНД||АЖ бліндаж, -жа *м*; **~ИРОВАННЫЙ** бліндзіраваны; **~ИРОВАТЬ** *сов. и несов.* бліндзіраваць; **~ИРОВАТЬСЯ** *страд.* бліндзіравацца.

БЛИ́ННЫЙ бліннны, блінбвы.
БЛИНЧ||АТЫЙ блінчасты; **~ИК** бліне́ц, -нца́ *м*; (*сладкий*) налісні́к, -ка *м*.
БЛИСТА́||ТЕЛЬНОСТЬ бліску́часць, -ці *ж*; пышнасць, -ці *ж*; **~ТЕЛЬНЫЙ** бліску́чы; пышны; **~ТЬ** *несов.* 1. бліша́ць, блі́скаць; (*сиять*) ззяць; (*сверкать*) зіхаце́ць; 2. (*отличаться*) вызнача́цца; **~ть красноре́чием** вызнача́цца красамо́ўствам; ◇ **~ть отсу́тствием** *ирон.* пака́зваць адсу́тнасць, вызнача́цца адсу́тнасцю.
БЛОК I *тех.* блок, *род.* бло́ка *м*.
БЛОК II (*объединение*) блок, *род.* бло́ку *м*; **блок коммуни́стов и беспарти́йных** блок камуні́стаў і беспарты́йных.
БЛОКА́Д||А блака́да, -ды *ж*; **~НЫЙ** блака́дны.
БЛОКГА́УЗ *воен.* блакга́уз, -за *м*.
БЛОКИ́Р||ОВАНИЕ *разн. знач.* блакіраванне, -ння *ср*; **~ОВАННЫЙ** блакіраваны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов.* блакіраваць; **~ОВАТЬСЯ** блакірава́цца; **~О́ВКА** *ж* 1. (*действие*) блакірава́нне, -ння *ср*, блакіро́ўка, -кі *ж*; 2. *ж.-д.*, *воен.* блакіро́ўка, -кі *ж*; **~О́ВОЧНЫЙ** блакіро́вачны.
БЛОКНО́Т блакно́т, -та *м*.
БЛОК-СИГНА́Л *ж.-д.* блок-сігна́л, -ла *м*.
БЛОК-СИСТЕ́МА *ж.-д.* блок-сістэ́ма, -мы *ж*.
БЛО́КШИВ *мор.* бло́кшыў, -шыва *м*.
БЛОНДИ́Н бландзі́н, -на *м*; **~КА** бландзі́нка, -кі *ж*.
БЛОХА́ блыха́, -хі́ *ж*.
БЛО́ЧНЫЙ *тех.* бло́кавы, бло́чны.
БЛОШИ́||НЫЙ блышы́ны; **~СТЫЙ** блышы́вы.
БЛО́ШКА *уменьш.* бло́шка, -кі *ж*.
БЛОШНИ́ЦА *ж бот.* ума́н, -ну *м*.
БЛУД *м* распу́ста, -ты *ж*; **~И́ТЬ** *несов.* 1. (*распутничать*) распу́снічаць; 2. (*блуждать*) *обл.* блудзі́ць, блука́ць; **~ЛИ́ВО** *нареч.* 1. распу́сна, юрлі́ва; 2. памаўзлі́ва, зб́родліва; **~ЛИ́ВОСТЬ** 1. распу́снасць, -ці *ж*, юрлі́васць, -ці, *ж*; 2. памаўзлі́васць, -ці *ж*, збродлівасць, -ці *ж*; **~ЛИ́ВЫЙ** 1. распу́сны, юрлі́вы; 2. (*проказливый*) памаўзлі́вы, збродлівы; **~НИ́К** *уст.* распу́снік, -ка *м*; **~НИ́ЦА** распу́сніца, -цы *ж*.
БЛУ́ДНЫЙ блу́дны.
БЛУЖДА́||НИЕ блука́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* блука́ць; (*плутать*) блудзі́ць; **~ЮЩИЙ** *прил.* блука́ючы; **~ющий нерв** *анат.* блука́ючы нерв; **~ющая по́чка** *мед.* блука́ючая нырка; **~ющие звёзды** блука́ючыя зо́ры.
БЛУ́З||А блу́за, -зы *ж*; **~КА** блу́зка, -кі *ж*.
БЛУ́МИНГ *тех. см.* **блю́минг**.
БЛЮ́ДЕЧКО *ср уменьш.* спо́дачак, -чка *м*.
БЛЮ́ДО *ср* 1. (*посуда*) блю́да, -да *ср*; 2. (*кушанье*) стра́ва, -вы *ж*; **обе́д из трёх блюд** абе́д з трох страў.
БЛЮДОЛИ́З *уст.* блюдалі́з, -за *м*.
БЛЮ́ДЦЕ *ср* спо́дак, -дка *м*.
БЛЮ́МИНГ *тех.* блю́мінг, -га *м*.
БЛЮМС *тех.* блюмс, *род.* блю́мса *м*.
БЛЮСТ||И́ *несов.* сцерагчы́, ахо́ўваць, захо́ўваць; выко́нваць; падтрымо́ўваць; **б. поря́док** падтрымо́ўваць пара́дак; **~И́ТЕЛЬ** ахо́ўнік, -ка *м*, даглядальнік, -ка *м*; **~И́ТЕЛЬНИЦА** ахо́ўніца, -цы *ж*, даглядальніца, -цы *ж*.
БЛЯ́ХА бля́ха, -хі *ж*.
БОА́ 1. (*змея*) баа́ *нескл.*, *м*; 2. (*горжетка*) баа́ *нескл.*, *ср*.
БОБ *м* 1. (*плод*) струк, *род.* струка́ *м*; 2. (*зерно*) бо́бка, -кі *ж*; зе́рне, -ня́ці *ср*, *мн.* зярня́ты, -ня́т; **кака́овые ~ы** кака́вавыя зярня́ты; 3. (*растение*) боб, *род.* бо́бу *м*, *мн. нет*; **ко́нские ~ы** боб; **туре́цкие ~ы** фасо́ля; ◇ **~ы разводи́ть** *перен.* гавары́ць глу́пства; ве́рацi лухту́; мало́ць языко́м; **оста́ться, сиде́ть на ~а́х** *разг.* заста́цца, сядзе́ць ні з чым (ні пры чым).
БОБЁР (*мех*) бабёр, -бра́ *м*.
БОБИ́НА *тех.* бабі́на, -ны *ж*.
БОБК||И́ *бот.* бабкі́, -ко́ў *ед. нет*; **~О́ВЫЙ** бабко́вы.
БОБО́В||НИК *бот.* бабо́ўнік, -ку *м*; **~ЫЕ** *мн. сущ. бот.* стру́кавыя, -вых; **~ЫЙ** бабо́вы.
БОБО́К *м.* бо́бка, -кі *ж*; (*зерно*) зе́рне, -няці *ср*.
БОБР *зоол.* бабёр, -бра́ *м*; **~ЁНОК** *м* бабраня́, -ня́ці *ср*.
БО́БРИК *текст.* бо́брык, -ку *м*.
БО́БРИКОМ *нареч. разг.* пад-чуб; бо́брыкам.
БОБРО́ВЫЙ бабро́вы.
БОБРУ́ЙСК *г.* Бабру́йск, -ка *м*.
БОБРУ́ЙСКАЯ О́БЛАСТЬ Бабру́йская во́бласць.
БОБРУ́ЙСКИЙ РАЙО́Н Бабру́йскі раён.
БОБЫ́ЛЬ *разг.* бабы́ль, -ля́ *м*.
БОГ бог, *род.* бо́га *м*; ◇ **бог зна́ет, бог весть** *разг.* бог ве́дае; хто яго́ ве́дае; **ей-бо́гу** *разг.* далібо́г, дадушы́; **не дай (изба́ви, не приведи́) бог** *разг.* не дай бог (крый бо́жа, барані́ бо́жа); **сла́ва бо́гу** *разг.* дзя́куй бо́гу; **ра́ди бо́га** *разг.* на праму́лы бог; бо́гам прашу́ (про́сім).
БОГАДЕ́ЛЬНЯ *уст.*, *ирон.* багадзе́льня, -ні *ж*.
БОГ||АРА́ *с.-х.* багара́, -ры́ *ж*; **~А́РНЫЙ** бага́рны.
БОГАТЕ́||Й *разг.* багаце́й, -це́я *м*; **~ЙШИЙ** найбагаце́йшы; **~ТЬ** *несов.* багаце́ць.
БОГА́Т||О *нареч.* бага́та; **~СТВО** бага́цце, -цця *ср*; **приро́дные ~ства** прыро́дныя бага́цці; **~ЫЙ** 1. *прил.* бага́ты; 2. *сущ.* бага́ты, -тага *м*.
БОГАТЫ́||РСКИЙ 1. (*героический*) гераі́чны; **б. э́пос** гераі́чны э́пас; 2. (*атлетический*) валато́ўскі, атлеты́чны; ◇ **спать ~рским сном** спаць мо́цным сном; **~РСТВО** *ср* гераі́чнасць, -ці *ж*; **~РЬ** во́лат, -та *м*, асі́лак, -лка *м*.
БОГА́||Ч багаты́р, -ра́ *м*, багаце́й, -це́я *м*; **~ЧЕ** *сравн. ст.* 1. *нареч.* багаце́й; **стол сего́дня у́бран ~че, чем вчера́** стол сяго́ння пры́браны багаце́й, чым учо́ра; 2. *прил.* багаце́йшы; **э́тот колхо́з ~че** гэ́ты калга́с багаце́йшы; **~ЧКА** багаты́рка, -кі *ж*, багаце́йка, -кі *ж*.
БОГДЫХА́Н *ист.* багдыха́н, -на *м*; **~СКИЙ** багдыха́нскі.
БОГЕ́МА багема, -мы *ж*, *мн. нет*.
БОГЕ́МИЯ Бе́гемія, -міі *ж*; *см.* **Че́хия**.
БОГЕ́МСКИЙ баге́мскі.
БОГИ́НЯ *рел.*, *перен.* багі́ня, -ні *ж*.
БОГОБО́Р||ЕЦ богабо́рац, -рца *м*; **~ЧЕСКИЙ** богабо́рніцкі; **~ЧЕСТВО** богабо́рніцтва, -ва *ср*.
БОГОИСКА́ТЕЛЬ *ист.* богашука́льнік, -ка *м*; **~СТВО** *рел. ист.* богашука́нне, -ння *ср*.
БОГОМО́Л *зоол.* багамо́л, -ла *м*.
БОГОМО́Л||ЕЦ богамо́лец, -льца *м*; **~КА** богамо́лка, -кі *ж*; **~ЬЕ** богамо́лле, -лля *ср*; **~ЬНЫЙ** богамо́льны.
БОГОСЛО́В багасло́ў, -ло́ва *м*; **~ИЕ** багасло́ўе, -ло́ўя *ср*; **~СКИЙ** багасло́ўскі.
БОГОСЛУЖЕ́НИЕ *церк.* набажэ́нства, -ва *ср*.
БОГОСТРОИ́ТЕЛЬ *ист.* богастваральнік, -ка *м*; **~СТВО** *ист. рел.* богастваральніцтва, -ва *ср*.
БОГОТА́ *г.* Багата́, -ты́ *ж*.
БОГОТВОРИ́ТЬ *несов.* багатвары́ць.
БОГОУГО́ДН||ЫЙ *уст.* мі́лы бо́гу; **~ое заведе́ние** багадзе́льня; богаўго́дная ўстано́ва.
БОГОХУ́ЛЬ||НИК блюзне́р, -ра *м*, богазневажа́льнік, -ка *м*; **~НЫЙ** блюзне́рскі, богазневажа́льны; **~СТВО** блюзне́рства, -ва *ср*, богазневажа́нне, -ння *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов.* блюзне́рыць, зневажа́ць бо́га.
БОГУШЕ́ВСК *пос.* Багушэ́ўск, -ка *м*.
БОГУШЕ́ВСКИЙ РАЙО́Н Багушэ́ўскі раён.
БОД||А́ТЬ *несов.* басці́, баро́ць; **~А́ТЬСЯ** басці́ся, баро́цца; **~ЛИ́ВЫЙ** бадлі́вы, барлі́вы; **~НУ́ТЬ** *однокр.* бадану́ць, барну́ць.
БОДРИ́ТЬ *несов.* бадзёрыць; **~СЯ** бадзёрыцца.
БО́ДР||О *нареч.* бадзёра; **~ОСТЬ** бадзёрасць, -ці *ж*.

БО́ДРСТВОВА||НИЕ неспа́нне, -нння *ср*; **~ТЬ** *несов.* не спаць, не драма́ць.
БО́ДР||ЫЙ бадзёры; **~Я́ЩИЙ** *прил.* падбадзёрлівы.
БОДЯ́ГА *бот.* бадзя́га, -гі *ж.*
БОДЯ́К *бот.* чортапало́х, -ху *м*, бадзя́к, -ку́ *м.*
БОЕВ||И́К баяві́к, -ка́ *м*; **~О́Й** *в разн. знач.* баявы́; **~о́й патро́н** *воен.* баявы́ патро́н; **~о́й поря́док** *воен.* баявы́ пара́дак; **~а́я гото́вность** *воен.* баява́я гато́ўнасць; **~о́й това́рищ** *воен.* баявы́ тава́рыш; **~о́е креще́ние** *воен.* баяво́е хрышчэ́нне; **~о́й па́рень** *разг.* баявы́ хло́пец; **~а́я те́ма** баява́я тэ́ма.
БОЁК *воен., тех.* баёк, *род.* байка́ *м.*
БОЕПИТА́НИЕ *воен.* боезабеспячэ́нне, -нння *ср.*
БОЕПРИПА́СЫ *воен.* боепрыпа́сы, -саў *ед. нет.*
БОЕСПОСО́БН||ОСТЬ боездо́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** боездо́льны.
БОЕ́Ц *в разн. знач.* бае́ц, *род.* байца́ *м.*
БОЖБА́ *ж уст.* бажэ́нне, -нння *ср*, бажба́, -бы́ *ж.*
БОЖЕ́СТ||ВЕННО *нареч.* надзвыча́йна, чаро́ўна, цудо́ўна; **~ВЕННОСТЬ 1.** *уст.* бо́скасць, -ці *ж*; набо́жнасць, -ці *ж*; **2.** *перен.* надзвыча́йнасць, -ці *ж*, чаро́ўнасць, -ці *ж*, цудо́ўнасць, -ці *ж*; **~ВЕННЫЙ 1.** *уст.* бо́скі; (*божий*) бо́жы; (*религиозный*) набо́жны, рэлігі́йны; **2.** *перен.* надзвыча́йны, чаро́ўны, цудо́ўны; **~ВО́** *ср* **1.** бог, *род.* бо́га *м*, бажаство́, -ва́ *ср*; **2.** *перен.* бажаство́, -ва́ *ср.*
БО́Ж||ИЙ *рел.* бо́жы; **~И́ТЬСЯ** *несов. уст.* бажы́цца; **~НИ́ЦА** бажні́ца, -цы *ж*; **~О́К** *в разн. знач.* бажо́к, -жка́ *м.*
БО́ЖЬЯ КОРО́ВКА *зоол.* бо́жая каро́ўка.
БОЙ I *м* **1.** бой, *род.* бо́ю *м*; **обороне́тельный бой** абаро́нчы бой; **наступа́тельный бой** наступа́льны бой; **кла́ссовые бои́** кла́савыя баі́; **ввести́ в бой** увесці́ ў бой; **дать бой** даць бой; **приня́ть бой** прыня́ць бой; **взять без бо́я** узя́ць без бо́ю; **2.** (*сигнал ударами*) бой, *род.* бо́ю *м*; **бой часо́в** бой гадзі́нніка; **бой бараба́на** бой бараба́на; **3.** (*убой скота на мясо*) рэ́занне, -нння *ср*, зарэ́з, -зу *м*; (*свиней*) кало́нне, -нння *ср*; ◇ **взять с бо́ю** узя́ць з бо́ю; **бой-ба́ба** *разг.* бой-ба́ба; **бить сме́ртным бо́ем** біць смяро́тным бо́ем.
БОЙ II (*битое стекло, щебень*) бой, *род.* бо́ю *м.*
БО́Й||КИЙ 1. (*ловкий*) бо́йкі; **2.** (*оживлённый*) лю́дны, бо́йкі; **~КО** *нареч.* бо́йка; **~КОСТЬ** бо́йкасць, -ці *ж.*
БОЙКО́Т байко́т, -ту *м*; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов.* байкатава́ць; **~И́РОВАТЬСЯ** *страд.* байкатава́цца.
БОЙНИ́||ЦА 1. (*в стене*) байні́ца, -цы *ж*; **2.** *горн.* байні́ца, -цы *ж*; **3.** (*орудие убоя скота*) до́ўбня, -ні *ж*; **~ЧНЫЙ** байні́чны.
БО́ЙНЯ 1. (*для убоя скота*) бо́йня, -ні *ж*, разні́ца, -цы *ж*; **2.** *перен.* (*резня*) бо́йня, -ні *ж*, разня́, -ні́ *ж.*
БОЙЦО́ВЫЙ байцо́вы.
БОК бок, *род.* бо́ка *и* бо́ку *м*; **бок о́ бок** по́бач, плячо́ ў плячо́, бок у бок; **с бо́ку на́ бок** з бо́ку на́-бак; **по́ ~у** по́-баку; **под бо́ком** *разг.* пад бо́кам; **вы́йти бо́ком** *погов.* вы́йсці бо́кам; **с бо́ку припёка** *погов.* з бо́ку прыпёку.
БОКА́Л бака́л, -ла *м*, ке́ліх, -ха *м*; **поднима́ть бока́л (за кого́-что́-либо)** падыма́ць бака́л (за каго́-што-не́будзь).
БОКОВ||А́Я: на ~у́ю *разг.* на бакаву́ю, на́-бак.
БОКОВО́Й бакавы́.
БО́КОМ *нареч.* бо́кам.
БОКС *спорт.* бокс, *род.* бо́кса *м*; **~ЁР** баксёр, -ра *м*; **~ЁРСКИЙ** баксёрскі; **~И́РОВАТЬ** *несов.* баксі́раваць.
БОКСИ́Т *мин.* баксі́т, -ту *м*; **~ОВЫЙ** баксі́тавы; **~овый рудни́к** баксі́тавы рудні́к.
БОЛВА́Н *м* **1.** (*изваяние*) *уст.* балва́н, -на́ *м*; **2.** *бран.* ду́рань, -рня *м*; **3.** (*чурбан*) *обл.* цурба́н, -на́ *м*, кало́дка, -кі *ж*; **4.** (*деревянная форма*) праві́дла, -ла *ср.*
БОЛВА́НКА *ж* **1.** *тех.* балва́нка, -кі *ж*; **2.** (*деревянная форма*) праві́дла, -ла *ср.*
БОЛГА́РИН балга́рын, -на *м.*
БОЛГА́РИЯ Балга́рыя, -рыі *ж*; **Наро́дная Респу́блика Болга́рия** Наро́дная Рэспу́бліка Балга́рыя.
БОЛГА́РКА балга́рка, -кі *ж.*
БОЛГА́РСКИЙ балга́рскі.
БО́ЛЕ *нареч. уст.* бо́лей, больш.
БОЛЕВО́Й *мед.* бо́левы.
БО́ЛЕЕ 1. *нареч.* больш, бо́лей; **2.** (*при образовании сравнительной степени*) больш; **бо́лее споко́йный** больш спако́йны; ◇ **бо́лее и́ли ме́нее** больш-менш; **ни бо́лее ни ме́нее** ні больш ні менш; **бо́лее всего́** больш за ўсё; **бо́лее того́** больш таго́; **всё бо́лее и бо́лее** усё больш і больш; **тем бо́лее** тым больш.
БОЛЕ́ЗНЕНН||О *нареч.* **1.** хвараві́та; **2.** (*больно*) балю́ча, бале́сна; **~ОСТЬ 1.** хвараві́тасць, -ці *ж*; **2.** балю́часць, -ці *ж*, бале́снасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** (*нездоровый*) *прям., перен.* хвараві́ты; **2.** (*сопряжённый с болью*) балю́чы, бале́сны.
БОЛЕЗНЕТВО́РНЫЙ *мед.* хваробатво́рны.
БОЛЕ́ЗНЫЙ *обл.* **1.** (*жалкий*) няшча́сны; **2.** (*милый*) лю́бы; **3.** (*жалостливый*) жа́ласлівы.
БОЛЕ́З||НЬ *прям., перен.* хваро́ба, -бы *ж*; **морска́я ~нь** марска́я хваро́ба.
БОЛЕ́ЛЬЩИ||К *разг.* бале́льшчык, -ка *м*; **~ЦА** бале́льшчыца, -цы *ж.*
БОЛЕРО́ *муз.* балеро́ *нескл., ср.*
БОЛЕ́||ТЬ I *несов.* **1.** (*хворать*) хварэ́ць (*на што* і *чым*); **~ть гри́ппом** хварэ́ць на грып (гры́пам); **2.** *перен.* хварэ́ць (*за каго, за што*); **он ~ет о нём душо́й** ён хварэ́е за яго́ душо́й.
БОЛ||Е́ТЬ II *несов.* (*испытывать боль*) бале́ць; **у него́ ~и́т голова́** у яго́ балі́ць галава́; **душа́ ~и́т о ребёнке** душа́ балі́ць аб дзіця́ці; ◇ **что у кого́ ~и́т, тот про то и говори́т** *погов.* што каму́ ру́піць, той аб тым і жу́піць.
БОЛЕУТОЛЯ́ЮЩ||ИЙ *мед.* болепато́льны; **~ее сре́дство** болепато́льны сро́дак.
БОЛИВИ́||ЕЦ балівí́ец, -ві́йца *м*; **~ЙКА** балівí́йка, -кі *ж*; **~ЙСКИЙ** балівí́йскі.
БОЛИ́ВИЯ Балí́вія, -віі *ж.*
БОЛИГОЛО́В *бот.* аме́жнік, -ку *м.*
БОЛИ́Д *астр.* балí́д, -да *м.*
БОЛО́НКА бало́нка, -кі *ж.*
БОЛО́НЬЯ *г.* Бало́н'я, -н'і *ж.*
БОЛО́ТИСТЫЙ балаці́сты.
БОЛО́ТНИК *бот.* бало́тнік, -ку *м*; **~ОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* бало́тнікавыя, -вых.
БОЛО́ТНЫЙ бало́тны; **б. газ** *хим.* бало́тны газ.
БОЛО́ТО *в разн. знач.* бало́та, -та *ср*; **скати́ться в боло́то** *перен.* скаці́цца ў бало́та.
БОЛТ *м* **1.** *тех.* болт, *род.* балта́ *м*, ніт, *род.* ні́та *м*; **скрепи́ть ~о́м** узя́ць на ніт; **2.** (*железный прут для запирания ставней*) про́сва, -вы *ж.*
БОЛТА́НКА *ав. разг.* гайда́нка, -кі *ж.*
БОЛТА́ТЬ I *несов.* **1.** (*жидкость*) бо́ўтаць; **2.** (*чем-л.*) матля́ць.
БОЛТА́ТЬ II *несов.* (*говорить*) *разг.* балбата́ць, мало́ць, лапата́ць; (*на каком-л. языке*) бала́каць; **б. языко́м** (*пустословить*) мало́ць языќом.
БОЛТА́ТЬСЯ *несов. разг.* **1.** (*о жидкости*) бо́ўтацца; **2.** (*висеть, колыхаться*) матля́цца, целяпа́цца; **3.** (*слоняться*) сно́ўдацца, сланя́цца.
БОЛТА́ЮЩИЙСЯ: б. суста́в *анат.* віхля́сты суста́ў.
БОЛТЛИ́В||ОСТЬ балбатлі́васць, -ці *ж*; языка́тасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** балбатлі́вы; (*не умеющий хранить тайну*) языка́ты.
БОЛТОВНЯ́ *ж* балбатня́, -ні́ *ж*, пустасло́ўе, -ло́ўя *ср*; (*сплетня*) плёткі, -так, *ед.* плётка, -кі *ж.*
БОЛТО́ВЫЙ *тех.* балто́вы, ніта́вы.

БОЛТОРЕ́З *тех.* балтарэ́з, -за *м*, нітарэ́з, -за *м*; **~НЫЙ** балтарэ́зны, нітарэ́зны.

БОЛТУ́Н I *разг.* 1. (*пустомеля*) балбату́н, -на́ *м*, лапату́н, -на́ *м*, пустаслоў, -ло́ва *м*; 2. (*сплетник*) пляткар, -ра́ *м*.

БОЛТУ́Н II (*яйцо*) баўту́н, -на́ *м*.

БОЛТУ́НЬЯ 1. *разг.* (*пустомеля*) балбату́ха, -хі *ж*, лапату́ха, -хі *ж*; 2. (*сплетница*) пляткарка, -кі *ж*.

БОЛТУ́ШКА I *разг.* балбату́шка, -кі *ж*, лапату́шка, -кі *ж*.

БОЛТУ́ШКА II (*яичница*) *разг.* баўту́шка, -кі *ж*.

БОЛТУ́ШКА III *ж* (*пойло*) баўту́ха, -хі *ж*, по́йла, -ла *ср*.

БОЛЬ *ж* боль, *род.* бо́лю *м*; ▪ **бо́лью в душе́** з бо́лем у душы.

БОЛЬНА́Я *сущ.* хво́рая, -рай *ж*.

БОЛЬНИ́|ЦА бальні́ца, -цы *ж*; **~ЧНЫЙ** бальні́чны.

БО́ЛЬ|НО I 1. *нареч.* балю́ча; **~но уда́рить** балюча ўдарыць; 2. *сказ.* балю́ча, балі́ць (*при употреблении без неопр.*); **мне ~но слы́шать** мне балю́ча чуць.

БО́ЛЬНО II *нареч.* (*очень*) *разг.* на́дта, ве́льмі; **б. хитёр** на́дта (ве́льмі) хі́тры.

БОЛЬН|О́Й 1. *прил.* (*подверженный болезни*) хво́ры; (*связанный с ощущением боли*) балю́чы; **~о́й челове́к** хво́ры чалаве́к; **~о́е се́рдце** хво́рае сэ́рца; **~о́й па́лец** балю́чы па́лец; 2. *прил. перен.* (*уязвимый*) балю́чы; (*болезненно переживаемый*) хво́ры; **~о́й вопро́с** балю́чае пыта́нне; **~о́е самолю́бие** хво́рае самалю́бства; **~о́е ме́сто** *перен.* сла́бае (балю́чае, хво́рае) ме́сца; 3. *сущ.* хво́ры, -рага *м*.

БОЛЬША́К *обл.* 1. (*дорога*) гасці́нец, -нца *м*, бальша́к, -ка́ *м*, шлях, *род.* шля́ху *м*, тракт, *род.* тра́кту *м*; 2. (*хозяин*) гаспада́р, -ра́ *м*; (*старший сын*) старэ́йшы (бо́льшы) сын.

БОЛЬША́Я БЕРЕСТО́ВИЦА *пос.* Вялі́кая Бераsто́віца.

БО́ЛЬШЕ *сравн. ст.* 1. *нареч.* больш, бо́лей; **б. всего́** больш за ўсё; **б. того́** больш таго́; 2. *прил.* бо́льшы.

БОЛЬШЕБЕРЦО́ВЫЙ *анат.* вялікагалёначны.

БОЛЬШЕВ|ИЗА́ЦИЯ большэвіза́цыя, -цыі *ж*; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* большэвізава́ць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** большэвізава́цца; **~И́ЗМ** большэві́зм, -ма *м*; **~И́К** большэві́к, -ка́ *м*; **~И́СТСКИЙ** большэві́цкі; **~И́ЧКА** большэві́чка, -кі *ж*.

БОЛЬШЕГОЛО́ВЫЙ вялікагало́вы.

БОЛЬ|ШИ́Е *мн. сущ.* вялі́кія, -кіх, даро́слыя, -лых.

БО́ЛЬШ|ИЙ *сравн. ст.* бо́льшы; **~ей (~ею) ча́стью, по ~ей ча́сти** бо́льшай ча́сткай; **са́мое ~ее** са́мае бо́льшае; **~ИНСТВО́** *ср* бо́льшасць, -ці *ж*, *мн. нет*; **в ~инстве́ слу́чаев** у бо́льшасці выпадкаў.

БОЛЬШ|О́Й *в разн. знач.* вялі́кі; **~о́й па́лец** вялі́кі па́лец; **~а́я бу́ква** вялі́кая лі́тара; **~У́ЩИЙ** *разг.* велі-за́рны, велічэ́зны.

БОЛЯ́ЧКА *разг.* бо́лька, -кі *ж*.

БОЛЯ́ЩИЙ *сущ. уст.* хво́ры, -рага *м*.

БО́МБ|А бо́мба, -бы *ж*; **фуга́сная ~а** фуга́сная бо́мба; **оско́лочная ~а** аско́лачная бо́мба; **хими́ческая ~а** хімі́чная бо́мба; **а́томная ~а** а́тамная бо́мба; **водоро́дная ~а** вадаро́дная бо́мба; **напа́лмовая ~а** напа́лмавая бо́мба; ◇ **влете́ть ~ой** *разг.* уляце́ць бо́мбай.

БОМБАРД|И́Р *воен. уст.* бамбардзі́р, -ра *м*; **~ИРОВА́НИЕ** бамбардзірава́нне, -ння *ср*; **~ИРОВА́ТЬ** *несов.* бамбардзірава́ць; **~ИРОВА́ТЬСЯ** *страд.* бамбардзірава́цца; **~ИРО́ВКА** бамбардзіро́ўка, -кі *ж*; **~ИРО́ВОЧНЫЙ** бамбардзіро́вачны; **~ИРО́ВЩИК** *ав.* бамбардзіро́ўшчык, -ка *м*.

БОМБЁЖКА *разг.* бамбёжка, -кі *ж*.

БОМБЕ́Й *г.* Бамбе́й, -бе́я *м*.

БОМБИ́ТЬ *несов.* бамбі́ць; **~СЯ** *страд.* бамбі́цца.

БОМБОВО́З *ав.* бамбаво́з, -за *м*.

БО́МБОВЫЙ *воен.* бо́мбавы.

БОМБОДЕРЖА́ТЕЛЬ *ав.* бомбатрыма́льнік, -ка *м*.

БОМБО|МЁТ *ав.* бамбамёт, -та *м*; **~МЕТА́НИЕ** *ср воен.* бомбакіда́нне, -ння *ср*, бамбёжка, -кі *ж*.

БОМБОНЬЕ́РКА бамбан'е́рка, -кі *ж*.

БОМБОСБРА́СЫВАТЕЛЬ *ав.* бомбаскіда́льнік, -ка *м*.

БОМБОУБЕ́ЖИЩЕ бомбасхо́вішча, -шча *ср*.

БОМ-БРА́МСЕЛЬ *мор.* бом-бра́мсель, -ля *м*.

БОМ-БРАМ-СТЕ́НЬГА *мор.* бом-брам-стэ́ньга, -гі *ж*.

БО́НА *фин.* бо́на, -ны *ж*.

БОНАПАРТИ́|ЗМ *ист.* банапарты́зм, -ма *м*; **~СТ** *ист.* банапарты́ст, -та *м*; **~СТКА** банапарты́стка, -кі *ж*; **~СТСКИЙ** банапарты́сцкі.

БОНД|А́РНЫЙ бандарны; **~А́РНЯ** банда́рня, -ні *ж*; **~А́РСКИЙ** бо́ндарскі; **~А́РСТВО** бо́ндарства, -ва *ср*; **~А́РЬ** бо́ндар, -ра *м*.

БО́НЗА *рел.* бо́нза, -зы *м*.

БОНИФИКА́ЦИЯ *эк.* баніфіка́цыя, -цыі *ж*.

БОНН *г.* Бон, *род.* Бо́на *м*.

БО́ННА *уст.* бо́нна, *род.* бо́нны *ж*.

БОР I (*лес*) бор, *род.* бо́ру *м*; ◇ **с бо́ру да с со́сенки** *погов.* збор-дружы́на; адку́ль папа́ла; адусю́ль патро́ху; **отку́да сыр-бор загоре́лся** *погов.* адку́ль сыр-бор загарэ́ўся.

БОР II *хим.* бор, *род.* бо́ра *м*.

БОР III *бот.* прася́нік, -ку *м*.

БО́РА *метеор.* бо́ра, -ры *ж*.

БОРА́Т *мин.* бара́т, -ту *м*.

БОРАЦИ́Т *мин.* барацы́т, -ту *м*.

БО́РГЕС *тип.* бо́ргес, -су *м*.

БОРДО́ I (*вино*) бардо́ *нескл.*, *ср*.

БОРДО́ II *прил.* (*цвет*) бардо́ *нескл.*

БОРДО́ *г.* Бардо́ *нескл.*, *м*.

БОРДЮ́Р бардзю́р, -ру *м*.

БОРЕ́Й *поэт. уст.* барэ́й, -рэ́ю *м*.

БОРЕ́Ц I 1. барацьбі́т, -та́ *м*, змага́р, -ра́ *м*; 2. *спорт.* барэ́ц, *род.* барца́ *м*.

БОРЕ́Ц II *бот.* мардо́ўнік, -ку *м*.

БОРЖО́М баржо́м, -му *м*.

БОРЖО́МИ *г.* Баржо́мі *нескл.*, *м*.

БОРЗ|А́Я *ж сущ.*, *прил. охот.* хорт, *род.* харта́ *м*; **сво́ра ~ы́х** згра́я харто́ў; **~а́я су́ка** су́ка-хорт; **~о́й щено́к** шчаня́-хорт.

БОРЗОПИ́СЕЦ *м уст.*, *ирон.* піса́ка, -кі *м* и *ж*.

БО́РЗЫЙ *уст.* бо́рзды, бы́стры.

БОРИСЛА́В *г.* Барысла́ў, -ла́ва *м*.

БОРИ́СОВ *г.* Бары́саў, -сава *м*.

БОРИ́СОВСКИЙ РАЙО́Н Бары́саўскі раён.

БОРМАШИ́НА *мед.* бормашы́на, -ны *ж*.

БОРМОТ|А́НИЕ мармыта́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов.* мармыта́ць; **~У́Н** *разг.* мармыту́н, -на́ *м*, мармы́ль, -ля́ *м*.

БОРНЕ́О *о.* Барне́о *нескл.*, *м*.

БОРНИ́Т *мин.* барні́т, -ту *м*.

БО́РНЫЙ *хим.* бо́рны.

БО́РОВ I 1. (*кабан*) парсю́к, -ка́ *м*; вепру́к, -ка́ *м*; 2. *перен.* парсю́к, -ка́ *м*; вяпру́к, -ка́ *м*.

БО́РОВ II (*у дымохода*) ляжа́к, -ка́ *м*.

БОРОВИ́К баравік, -ка́ *м*.

БОРОВИ́НКА *сад.* барав́інка, -кі *ж*.

БОРОВО́Й баравы́.

БОРОДА́ барада́, -ды́ *ж*.

БОРОДА́ВКА баро́даўка, -кі *ж*.

БОРОДА́ВНИК *бот.* рудзяне́ц, -нцу́ *м*, барада́ўнік, -ку *м*.

БОРОДА́ВЧАТЫЙ баро́даўчаты.

БОРОД|А́ТЫЙ барада́ты; **~А́Ч** 1. *разг.* барада́ч, -ча́ *м*; 2. *бот.* барада́ч, -чу́ *м*; 3. *зоол.* барада́ч, -ча́ *м*.

БОРОДИНО́ *с.* Барадзіно́, -на́ *ср*.

БОРОДИ́НСКИЙ барадзінскі.

БОРО́ДКА *ж* **1.** баро́дка, -кі *ж*; **2.** (*у ключа*) цыпель, -пля *м*, цыплік, -ка *м*.

БОРОЗД||А́ 1. *с.-х.* (*складка земли*) баразна́, -ны́ *ж*; (*углубление*) разо́ра, -ры *ж*; **2.** *анат.* баразна́, -ны́ *ж*; **3.** *перен.* разо́ра, -ры *ж*, маршчына, -ны *ж*; **~И́ТЬ** *несов.* баразні́ць, баранава́ць; (*пересекать*) перасяка́ць; (*изрезывать*) зрэ́зваць, рэ́заць; **кана́вы ~я́т по́ле** кана́вы перасяка́юць (зрэ́зваюць) по́ле; **морщи́ны ~и́ли его́ лоб** маршчыны зрэ́звалі (баразні́лі) яго́ лоб; **~И́ТЬСЯ** *страд.* баразні́цца, баранава́цца; перасяка́цца; зрэ́звацца, рэ́зацца.

БОРО́ЗД||КА *уменьш.* баразёнка, -кі *ж*; разо́рка, -кі *ж*; *см.* **борозда́**; **~НИ́К** *с.-х.* баразні́к, -ка́ *м*; **~ЧА́ТЫЙ** баразнава́ты, разо́рысты; (*морщинистый*) маршчыністы.

БОРОН||А́ *с.-х.* барана́, -ны́ *ж*; **~И́ТЬ** *несов.* баранава́ць; скаро́дзіць; **~ОВА́НИЕ** баранава́нне, -ння *ср*; скаро́джанне, -ння *ср* (*преимущественно незасеянной почвы*); **~ОВА́ТЬ** *несов. см.* **борони́ть; ~ОВА́ТЬСЯ** *страд.* баранава́цца; скаро́дзіцца; **~ЬБА́** *см.* **боронова́ние.**

БОРО́ТЬСЯ *несов.* **1.** змага́цца; **боро́ться за мир** змага́цца за мір; **2.** *спорт.* баро́цца.

БОРТ *в разн. знач.* борт, *род.* бо́рта *м*, *мн.* барты́, -то́ў; **борт о́ борт** борт у борт; **за бо́ртом** за барто́м; **на борту́** на бо́рце; **вы́кинуть за бо́рт** вы́кінуць за бо́рт.

БОРТЕВО́Й *с.-х.* бо́рцевы.

БОРТМЕХА́НИК *ав.* бортмеха́нік, -ка *м*.

БО́РТНИ||К *с.-х.* *уст.* бо́ртнік, -ка *м*; **~ЧАТЬ** *несов. с.-х. уст.* бо́ртнічаць; **~ЧЕСТВО** *с.-х. уст.* бо́ртніцтва, -ва *ср*.

БОРТОВО́Й *мор.* бартавы́.

БОРТЬ *с.-х. уст.* борць, *род.* бо́рці *ж*, кало́да, -ды *ж*.

БОРЩ боршч, *род.* баршчу́ *м*.

БОРЩЕВИ́К *бот.* баршчэ́ўнік, -ку *м*.

БОРЬБА́ *ж* **1.** змага́нне, -ння *ср*, барацьба́, -бы́ *ж*; **кла́ссовая борьба́** кла́савая барацьба́; **борьба́ за мир** змага́нне (барацьба́) за мір; **борьба́ с за́сухой** змага́нне (барацьба́) з за́сухай; **2.** *спорт.* барацьба́, -бы́ *ж*.

БОСИКО́М *нареч.* басано́ж.

БОСНИ́ЙСКИЙ басні́йскі.

БО́СНИЯ Бо́снія, -ніі *ж*.

ЗАМЫ́ЗГ|АННЫЙ *разг*. завэ́дзганы; запэ́цканы; **~АТЬ** *сов*. завэ́дзгаць; (*загрязнить*) запэ́цкаць; **~ИВАТЬ** *несов*. завэ́дзгваць; (*загрязнять*) запэ́цкваць.
ЗАМЫКА́|НИЕ замыка́нне, -ння *ср*; **коро́ткое з.** *эл*. каро́ткае замыка́нне; **~ТЕЛЬ** *эл*. замыка́льнік, -ка *м*; **~ТЕЛЬНЫЙ** *эл*. замыка́льны; **~ТЬ** *несов. в разн. знач*. замыка́ць; *см*. **замкну́ть**; **~ТЬСЯ** замыка́цца; **~ться в своё скорлупу́** замыка́цца ў сваю́ шкарлу́піну.
ЗА́МЫС|ЕЛ *м* 1. заду́ма, -мы *ж*; (*проект*) прае́кт, -ту *м*; (*идея*) ідэ́я, -дэі *ж*; (*намерение*) заме́р, -ру *м*, наме́р, -ру *м*; 2. **~лы** *мн*. (*козни*) заме́р, -ру *м*; **вражде́бные ~лы** варо́жыя заме́ры.
ЗАМЫ́СЛИТЬ *сов*. заду́маць, наду́маць.
ЗАМЫСЛОВА́Т|О *нареч*. мудрагелі́ста; **~ОСТЬ** мудрагелі́стасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** мудрагелі́сты.
ЗАМЫ́ТЬ *сов*. замы́ць.
ЗАМЫЧА́ТЬ *сов*. 1. зарыка́ць, замы́каць; 2. *перен. разг*. замы́каць; (*забормотать*) замармыта́ць.
ЗАМЫШЛЯ́ТЬ *несов*. заду́мваць, наду́мваць.
ЗАМЯ́ТЬ *сов*. замя́ць; **~СЯ** (*смутиться*) збянтэ́жыцца, суме́цца; (*запнуться*) запну́цца; (*остановиться*) спыні́цца.
ЗАМЯУ́КАТЬ *сов*. замяу́каць, зайу́каць.
ЗАНАВА́ЖИВАТЬ *несов*. 1. *с.-х*. угно́йваць; 2. (*загрязнять*) забру́джваць; (*сором, мусором*) засме́чваць; **~СЯ** *страд*. 1. угно́йвацца; 2. забру́джвацца; засме́чвацца.
ЗА́НАВЕС *м* засло́на, -ны *ж*.
ЗАНАВЕ́|СИТЬ *сов*. заве́сіць; **~СКА** фіра́нка, -кі *ж*; **нёбная ~ска** *анат*. мя́ккае паднябе́нне; **~ШЕННЫЙ** заве́шаны; **~ШИВАТЬ** *несов*. заве́шваць; **~ШИВАТЬСЯ** заве́швацца.
ЗАНАВО́ЗИТЬ *сов*. 1. *с.-х*. угнаі́ць; 2. (*загрязнить*) забру́дзіць; (*сором, мусором*) засмяці́ць.
ЗАНА́ШИВАТЬ *несов*. зано́шваць; **~СЯ** зано́швацца.
ЗАНГЕЗУ́РСКИЙ ХРЕБЕ́Т Зангезу́рскі хрыбе́т.
ЗАНЕМО́ЧЬ *сов*. занядужаць.
ЗАНЕ́РВНИЧАТЬ *сов*. занервава́цца.
ЗАНЕСЁННЫЙ 1. зане́сены; 2. (*поднятый кверху*) узня́ты.
ЗАНЕСТИ́ *сов*. 1. занéсці; 2. (*поднять кверху*) узня́ць; **~СЬ** *сов*. 1. (*загордиться*) *разг*. заганары́цца, пача́ць задава́цца; 2. (*увлечься*) захапі́цца.
ЗАНЗИБА́Р *о*. Занзіба́р, -ра *м*.
ЗАНИЖ|А́ТЬ *несов*. заніжа́ць; **~Е́НИЕ** заніжэ́нне, -ння *ср*.
ЗАНИ́ЖЕННЫЙ зані́жаны.
ЗАНИ́ЗИТЬ *сов*. зані́зіць.
ЗАНИМА́ТЕЛЬН|О *нареч*. ціка́ва, займа́льна; **~ОСТЬ** ціка́васць, -ці *ж*, займа́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** ціка́вы, займа́льны.
ЗАНИМА́ТЬ I *несов*. (*брать взаймы*) пазыча́ць.
ЗАНИМА́ТЬ II *несов*. 1. *в разн. знач*. займа́ць; **з. до́лжность** займа́ць пасаду; **з. ме́сто** займа́ць ме́сца; **з. го́род** займа́ць го́рад; 2. (*интересовать*) ціка́віць; 3. (*развлекать*) забаўля́ць.
ЗАНИМА́ТЬСЯ I *несов. страд*. (*в долг*) пазыча́цца.
ЗАНИМА́ТЬСЯ II *несов*. (*кем-чем-л.*) займа́цца.
ЗАНИМА́|ТЬСЯ III *несов*. (*разгораться*) займа́цца; ◇ **дух ~ется** дух займа́е.
ЗА́НОВО *нареч*. на́нава.
ЗАНО́З|А *ж* 1. стрэ́мка, -кі *ж*; 2. *перен. разг*. прыдзі́ра, -ры *м* и *ж*; (*надоедливый*) надаку́члівы, -вага *м*; **~ИСТЫЙ** прыдзі́рлівы; надаку́члівы; **~И́ТЬ** *сов*. застрамі́ць.
ЗАНО́С зано́с, -су *м*.
ЗАНОСИ́ТЬ I *несов*. 1. зано́сіць; 2. (*поднимать кверху*) узніма́ць.
ЗАНОСИ́ТЬ II *сов*. (*загрязнить долгой ноской*) занасі́ць.
ЗАНОСИ́ТЬСЯ I *несов*. 1. (*гордиться*) *разг*. ганары́цца, задава́цца; 2. (*слишком увлекаться чем-л.*) захапля́цца.
ЗАНОСИ́ТЬСЯ II *сов*. (*истрепаться*) занасі́цца.
ЗАНО́СНЫЙ зано́сны.
ЗАНО́СЧИВ|О *нареч*. фанабе́рыста, ганары́ста; **~ОСТЬ** фанабе́рыстасць, -ці *ж*, ганары́стасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** фанабе́рысты, ганары́сты.
ЗАНОЧЕВА́ТЬ *сов*. заначава́ць.
ЗАНО́ШЕННЫЙ *прич*., *прил*. зано́шаны.
ЗАНУМЕРО́В|АННЫЙ занумарава́ны; **~А́ТЬ** *сов*. занумарава́ць; **~ЫВАТЬ** *несов*. занумаро́ўваць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд*. занумаро́ўвацца.
ЗАНЫ́ТЬ *сов*. заны́ць.
ЗАНЯ́ТИЕ *ср* 1. (*действие по глаг.* **заня́ть** II) заняцце, -цця *ср*, займа́нне, -ння *ср*; 2. *в др. знач*. заня́так, -тку *м*.
ЗАНЯ́ТН|О *нареч*. ціка́ва, заба́ўна; **~ОСТЬ** ціка́васць, -ці *ж*, заба́ўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** ціка́вы, заба́ўны.
ЗАНЯТО́Й заня́ты.
ЗА́НЯТОСТЬ заня́тасць, -ці *ж*.
ЗА́НЯТЫЙ I (*взятый в долг*) пазы́чаны.
ЗА́НЯТЫЙ II (*кем-чем-л.*) заня́ты.
ЗАНЯ́ТЬ I *сов*. (*взять в долг*) пазы́чыць.
ЗАНЯ́ТЬ II *сов*. 1. *в разн. знач*. заня́ць; *см*. **занима́ть** II; 2. (*заинтересовать*) зацікавіць; 3. (*развлечь*) заба́віць.
ЗАНЯ́ТЬСЯ I *сов*. (*кем-чем-л.*) заня́цца.
ЗАНЯ́ТЬСЯ II *сов*. (*начать разгораться*) заня́цца.
ЗАО́БЛАЧНЫЙ заво́блачны, захма́рны.
ЗАОДНО́ *нареч*. 1. заадно́; (*вместе*) ра́зам; (*сообща*) супо́льна; 2. (*попутно*) заадно́, за адны́м за́хадам.
ЗАОЗЁРНЫЙ заазёрны.
ЗАОКЕА́НСКИЙ заакія́нскі.
ЗАОРА́ТЬ *сов. разг*. закрыча́ць, зараўці́, загарлапа́ніць.

ЗАОСТР|ЕНИЕ завастрэнне, -ння *ср*; **~ЁННОСТЬ** завострачасць, -ці *ж*; **~ЁННЫЙ** *прич.*, *прил.* завостраны; **~ИТЬ** *сов. прям.*, *перен.* завастрыць; **~ить кол** завастрыць кол; **~ить вопрос** завастрыць пытанне; **~ИТЬСЯ** завастрыцца; **~ЯТЬ** *несов. прям.*, *перен.* завастраць, завострываць; **~ЯТЬСЯ** завастраціца, завострываціца.
ЗАОХАТЬ *сов.* завохкаць, завойкаць.
ЗАОЧ|НИК завочнік, -ка *м*; **~НИЦА** завочніца, -цы *ж*; **~НО** *нареч.* завочна; **~НЫЙ** завочны.
ЗАПАВШИЙ запалы.
ЗАПАД захад, -ду *м*, *мн. нет*; ■ **~у от...** на захад ад...
ЗАПАД (*Западная Европа*) Захад, -ду *м*.
ЗАПАДАТЬ *сов.* западаць.
ЗАПАДАТЬ *несов.* западаць; *см.* **запасть.**
ЗАПАДЕНИЕ западанне, -ння *ср*.
ЗАПАДНАЯ ДВИНА *р.* Заходняя Дзвіна.
ЗАПАДНЕЕ на захад ад...; больш на захад; **з. Москвы** на захад ад Масквы; **нет, река з.** не, рака больш на захад.
ЗАПАДНИ|К *ист.* заходнік, -ка *м*; **~ЧЕСКИЙ** заходніцкі; **~ЧЕСТВО** *ист.* заходніцтва, -ва *ср*.
ЗАПАДНОБЕЛОРУССКИЙ заходнебеларускі.
ЗАПАДНОЕВРОПЕЙСКИЙ заходнееўрапейскі.
ЗАПАДНО-КАЗАХСТАНСКАЯ ОБЛАСТЬ Заходне-Казахстанская вобласць.
ЗАПАДНОСЛАВЯНСКИЙ заходнеславянскі.
ЗАПАДНОУКРАИНСКИЙ заходнеўкраінскі.
ЗАПАДНЫЙ заходні.
ЗАПАДНЯ *прям.*, *перен.* пастка, -кі *ж*.
ЗАПАЗДЫВА|НИЕ спазненне, -ння *ср*, апазненне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* спазняцца, апазняцца.
ЗАПАИВАТЬ *несов.* (*к* **запаять**) залітоўваць, запайваць.
ЗАПАИВАТЬСЯ *несов. страд.* (*к* **запаивать**) залітоўвацца, запайвацца.
ЗАПАЙКА *ж тех.* залітоўка, -кі *ж*, запайка, -кі *ж*; (*неоконч. действие*) залітоўванне, -ння *ср*, запайванне, -ння *ср*.
ЗАПАКОВ|АННЫЙ запакаваны; **~АТЬ** *сов.* запакаваць; **~АТЬСЯ** запакавацца; **~ЫВАТЬ** *несов.* запакоўваць; **~ЫВАТЬСЯ** запакоўвацца.
ЗАПАКОСТИТЬ *сов. разг.* запаскудзіць, загадзіць; **~СЯ** запаскудзіцца, загадзіцца.
ЗАПАКОЩЕННЫЙ *разг.* запаскуджаны, загаджаны.
ЗАПАЛ *м* 1. (*у лошадей*) дыхавіца, -цы *ж*; 2. *тех.* запал, -ла *м*; **~ЁННЫЙ** (*зажжённый*) запалены.
ЗАПАЛЗЫВАТЬ *несов.* запаўзаць, запоўзваць.
ЗАПАЛ|ИВАТЬ *несов. разг.* запальваць; **~ИТЬ** *сов. разг.* запаліць; **~ЬНЫЙ** *тех.* запальны.
ЗАПАЛЬЧИВ|О *нареч.* запальчыва; **~ОСТЬ** запальчывасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** запальчывы.
ЗАПАЛЬЩИК *горн.* запальшчык, -ка *м*.
ЗАПАМЯТОВАТЬ *сов. разг.* запамятаваць, забыць, забыцца.
ЗАПАНИБРАТ|А *нареч. разг.* запанібрата; **~СКИЙ** запанібрацкі.
ЗАПАР|ИВАТЬ *несов. в разн. знач.* запарваць; **~ИВАТЬСЯ** запарвацца; **~ИТЬ** *сов. в разн. знач.* запарыць; **~ИТЬСЯ** запарыцца; **~КА** *тех.* запарка, -кі *ж*; **~НИК** *с.-х.* запарнік, -ка *м*; **~НОЙ, ~НЫЙ** *тех.* запарны.
ЗАПАС *в разн. знач.* запас, -су *м*; ◇ **про з.** пра запас; **~АТЬ** *несов.* запасіць, прызапашваць; **~АТЬСЯ** запасацца; **~ЕЦ** *разг.* запасік, -ку *м*; **~ЛИВОСТЬ** запасілівасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ** запаслівы; **~НОЙ** 1. *прил.* запасны; 2. *сущ. воен.* запасны, -нога *м*; **~ТИ** *сов.* запасці, прызапасіць; **~ТИСЬ** запасціся.
ЗАПАСТЬ *сов.* запасці; **з. в душу** запасці ў душу.

ЗАПАТЕНТОВ|АННЫЙ запатэнтаваны; **~АТЬ** *сов.* запатэнтаваць.
ЗАПАХ пах, *род.* паху *м*.
ЗАПАХ|АННЫЙ зааранны, заворанны; **~АТЬ** *сов. с.-х.* заараць.
ЗАПАХИВАТЬ I *несов. с.-х.* заворваць.
ЗАПАХИВАТЬ II *несов.* (*одежду*) захінаць.
ЗАПАХИВАТЬСЯ I *несов. страд. с.-х.* заворвацца.
ЗАПАХИВАТЬСЯ II *несов.* (*в одежду*) захінацца.
ЗАПАХНУТЬ *сов.* запахнуць.
ЗАПАХНУТЬ *сов.* (*одежду*) захінуць; **~СЯ** захінуцца.
ЗАПАЧКА|ННЫЙ запэцканы; **~ТЬ** *сов.* запэцкаць; **~ТЬСЯ** запэцкацца.
ЗАПАШ|КА *ж с.-х.* 1. (*действие*) заворванне, -ння *ср*; 2. (*количество запаханной земли*) ралля, -ллі *ж*, засевак, -севку *м*; **~НИК** *с.-х.* запашнік, -ка *м*.
ЗАПАШОК *разг.* душок, -шку *м*.
ЗАПАЯННЫЙ залітаваны, запаяны.
ЗАПАЯТЬ *сов.* залітаваць, запаяць; **~СЯ** залітавацца, запаяцца.
ЗАПЕВ запеў, -певу *м*; **~АЛА** запявала, -лы *м*; **~АТЬ** *несов.* запяваць.
ЗАПЕКА|НКА запяканка, -кі *ж*; **~ТЬ** *несов.* запякаць; **~ТЬСЯ** *в разн. знач.* запякацца; *см.* **запечься.**
ЗАПЁКШ|ИЙСЯ: ~аяся кровь запечаная кроў; **~иеся губы** пасмаглыя губы.
ЗАПЕЛЕНАТЬ *сов.* спавіць.
ЗАПЕЛЕНГ|ОВАННЫЙ запеленгаваны; **~ОВАТЬ** *сов. спец.* запеленгаваць.
ЗАПЕЛЁН|АТЫЙ спавіты; **~ЫВАТЬ** *несов.* спавіваць.
ЗАПЕНИ|ВШИЙСЯ *прил.* запенены; **~ТЬ** *сов.* запеніць; **~ТЬСЯ** запеніцца.
ЗАПЕРЕТЬ *сов.* 1. (*на ключ*) замкнуць; (*на крючок*) зашчапіць; (*затворить*) зачыніць; 2. *в др. знач.* заперці; **з. неприятельский флот** заперці варожы флот; **~СЯ** 1. (*на ключ*) замкнуцца; (*на крючок*) зашчапіцца; (*затвориться*) зачыніцца; 2. (*отрицать свою провинность*) заўперціся.
ЗАПЕРТЫЙ *разг.* 1. (*на ключ*) замкнёны; (*на крючок*) зашчэплены; (*затворенный*) зачынены; 2. *в др. знач.* запёрты.
ЗАПЕРШИТЬ *сов. безл.* запяршыць.
ЗАПЕСТР|ЕТЬ *сов.* застракацець, запярэсціцца; (*замелькать*) замільгаць; *см.* **пестреть; ~ИТЬ** *сов.* застракаціць, запярэсціць; ◇ **~ило в глазах** *безл.* замітусілася ў вачах.
ЗАПЕТЬ *сов.* заспяваць, запець.
ЗАПЕЧАЛИТЬСЯ *сов.* засмуткаваць, засмуціцца, зажурыцца, замаркоціцца; (*загрустить*) засумаваць.
ЗАПЕЧАТА|ННЫЙ запячатаны; **~ТЬ** *сов.* запячатаць; **~ТЬСЯ** запячатацца.
ЗАПЕЧАТ|ЛЕВАТЬ *несов.* 1. (*сохранять в памяти, в сердце и т. п.*) захоўваць; (*запоминать*) запамінаць; **~левать чей-либо образ** захоўваць чый-небудзь вобраз; 2. (*отражать*) *иск.* адлюстроўваць, адбіваць; (*воплощать*) увасабляць; **~ЛЕВАТЬСЯ** 1. захоўвацца; урэзвацца; западаць; запамінацца; 2. адлюстроўвацца, адбівацца; **~ЛЁННЫЙ** 1. захаваны; 2. адлюстраваны, адбіты; увасоблены; *см.* **запечатлевать; ~ЛЕТЬ** *сов.* 1. (*сохранить в памяти, в сердце и т. п.*) захаваць; (*запомнить*) запомніць; 2. (*отразить*) адлюстраваць, адбіць; **~леть образ современного человека ■ литературе** адлюстраваць вобраз сучаснага чалавека ў літаратуры; *см.* **запечатлевать;** ◇ **~леть поцелуй** *уст.* пацалаваць; **~ЛЕТЬСЯ** захавацца; урэзацца; запасці; запомніцца.
ЗАПЕЧАТЫВАТЬ *несов.* запячатваць; **~СЯ** запячатвацца.
ЗАПЕЧЁННЫЙ запечаны.

ЗАПЕЧНЫЙ *разг.* запечны.
ЗАПЕЧЬ *сов.* запячы; **~СЯ** *в разн. знач.* запячыся; **картошка запеклась** бульба запяклася; **губы запеклись** губы запякліся.
ЗАПИВАТЬ *несов. в разн. знач.* запіваць; *см.* **запить.**
ЗАПИЛИТЬ *сов.* запілаваць.
ЗАПИНАТЬСЯ *несов.* запінацца, спатыкацца.
ЗАПИНКА запінка, -кі *ж.*
ЗАПИРАТЕЛЬСТВО заўпіранне, -ння *ср.*
ЗАПИРАТЬ *несов.* 1. (*на ключ*) замыкаць; (*на крючок*) зашчэпліваць; (*затворять*) зачыняць; 2. *в др. знач.* запіраць; *см.* **запереть; ~СЯ** 1. (*на ключ*) замыкацца; (*на крючок*) зашчэплівацца; (*затворяться*) зачыняцца; 2. (*отрицать провинность*) заўпірацца.
ЗАПИРОВАТЬ *сов. разг.* забалявацы, забанкетаваць.
ЗАПИС||АННЫЙ запісаны; **~АТЬ** *сов.* запісаць; **~АТЬСЯ** запісацца.
ЗАПИС||КА запіска, -кі *ж*; **~КИ** *мн.* запіскі, -сак.
ЗАПИСН||ОЙ I (*служащий для записи*) запісны; **~ая книжка** запісная кніжка.
ЗАПИСНОЙ II (*рьяный*) *разг.* заўзяты, заядлы; **з. игрок** заўзяты (заядлы) ігрок.
ЗАПИСЫВАТЬ *несов.* запісваць; **~СЯ** запісвацца.
ЗАПИСЬ *ж* запіс, -су *м*; **метрическая з.** метрычны запіс.
ЗАПИТЬ *сов. в разн. знач.* запіць; **з. пилюлю водой** запіць пілюлю вадой; **он запил** ён запіў.
ЗАПИХ||АННЫЙ запханы; **~АТЬ** *сов. разг.* запхаць; **~ИВАТЬ** *несов. разг.* запіхваць, запіхаць; **~НУТЫЙ** запхнуты; **~НУТЬ** *сов. и однокр. разг.* запхнуць, запіхнуць.
ЗАПИЩАТЬ *сов.* запішчаць.
ЗАПЛАВЬ *гидр., мор.* запань, -ні *ж.*
ЗАПЛАКА||ННЫЙ заплаканы; **~ТЬ** *сов.* заплакаць.
ЗАПЛАНИРОВА||ННЫЙ запланаваны; **~ТЬ** *сов.* запланаваць.
ЗАПЛАТ||А лата, -ты *ж*; **~АННЫЙ** залаплены, залатаны; **~АТЬ** *сов. простореч.* залапіць, залатаць.
ЗАПЛАТИТЬ *сов.* заплаціць.
ЗАПЛАЧЕННЫЙ заплачаны.
ЗАПЛАЧКА *ж этн.* галашэнне, -ння *ср.*
ЗАПЛЁВАННЫЙ запляваны.
ЗАПЛЕВАТЬ *сов.* запляваць; **~СЯ** заплявацца.
ЗАПЛЁВЫВАТЬ *несов.* заплёўваць.
ЗАПЛЕСКАТЬ I *сов.* (*захлопать в ладоши*) *разг.* запляскаць.
ЗАПЛЕСКАТЬ II *сов.* (*залить*) заплюхаць.
ЗАПЛЕСКАТЬСЯ *сов.* заплюхацца.
ЗАПЛЁСКИВАТЬ *несов.* заплюхваць; **~СЯ** *страд.* заплюхвацца.
ЗАПЛЕСНЕВЕ||ЛЫЙ цвілы, запляснелы; (*о жидкостях*) забросьнелы; **~ТЬ** *сов.* зацвісці, заплеснець; (*о жидкостях*) забросьнець.
ЗАПЛЕСНУТЬ *сов.* заплюхнуць.
ЗАПЛЕСТИ *сов.* заплесці; **~СЬ** заплесціся.
ЗАПЛЕТ||АТЬ *несов.* заплятаць; **~АТЬСЯ** заплятацца; **~ЁННЫЙ** заплецены.
ЗАПЛЕЧИКИ *тех., тип.* заплечыкі, -каў *ед. нет.*
ЗАПЛЕЧН||ЫЙ заплечны; **~ых дел мастер** *ист.* заплечных спраў майстар; (*палач*) кат.
ЗАПЛЕЧЬЕ заплечча, -чча *ср.*
ЗАПЛОМБИРОВ||АННЫЙ *прич., прил.* запламбаваны; **~АТЬ** *сов.* запламбаваць; **~ЫВАТЬ** *несов.* запламбоўваць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд.* запламбоўвацца.
ЗАПЛУТАТЬ, ~СЯ *сов. простореч.* заблудзіць.
ЗАПЛЫ||В *спорт.* заплыў, -лыву *м*; **~ВАНИЕ** *в разн. знач.* заплыванне, -ння *ср*; **~ВАТЬ** *несов.* заплываць; **~ТЬ** *сов.* заплыць.
ЗАПЛЯСАТЬ *сов. разг.* заскакаць, затанцаваць.
ЗАПНУТЬСЯ *сов.* запнуцца, спатыкнуцца.
ЗАПОВЕДАТЬ *сов. уст.* запаведаць.
ЗАПОВЕДН||ИК запаведнік, -ка *м*; **~ЫЙ** 1. запаведны; 2. (*заветный*) запаветны.
ЗАПОВЕДОВАТЬ *несов. уст.* запаведваць.
ЗАПОВЕДЬ *рел., перен.* запаведзь, -дзі *ж.*
ЗАПОДАЗРИВАТЬ *несов.* западозрываць.
ЗАПОДЛИЦО *нареч. стол.* роўна.
ЗАПОДОЗР||ЕННЫЙ западозраны; **~ИВАТЬ** *несов. уст.* западозрываць; **~ИВАТЬСЯ** *страд.* западозрывацца; **~ИТЬ** *сов.* западозрыць.
ЗАПОЕМ *нареч.* запоем.
ЗАПОЗДА||ЛОСТЬ запозненасць, -ці *ж*; **~ЛЫЙ** запознены; (*поздний*) позны; **~НИЕ** запазненне, -ння *ср*; спазненне, -ння *ср*; **~ТЬ** *сов.* спазніцца, апазніцца.
ЗАПОИТЬ *сов. разг.* запаіць.
ЗАПОЙ запой, -пою *м*; **~НЫЙ** запойны.
ЗАПОЛЗ||АТЬ *сов.* запоўзаць; **~АТЬ** *несов.* запаўзаць, запоўзваць; **~ТИ** *сов.* запаўзці.
ЗАПОЛНЕНИЕ *в разн. знач.* запаўненне, -ння *ср.*
ЗАПОЛНИТЬ *сов. в разн. знач.* запоўніць; **~СЯ** запоўніцца.
ЗАПОЛНОЧЬ *нареч. разг.* запоўнач, да познай ночы.
ЗАПОЛНЯТЬ *несов. в разн. знач.* запаўняць; **~СЯ** запаўняцца.
ЗАПОЛОН||ЁННЫЙ запалонены; **~ИТЬ** *сов. разг.* запаланіць; **~ЯТЬ** *несов. разг.* запалоньваць.
ЗАПОЛУЧ||АТЬ *несов. разг.* даставаць; (*раздобывать*) раздабываць; (*получать*) атрымліваць; **~ИТЬ** *сов. разг.* дастаць; (*раздобыть*) раздабыць; (*получить*) атрымаць.
ЗАПОЛЫХАТЬ *сов.* запалаць, загарэцца.
ЗАПОЛЯРНЫЙ запалярны.
ЗАПОЛЯРЬЕ Запаляр'е, -р'я *ср.*
ЗАПОМИНА||НИЕ запамінанне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* запамінаць; **~ТЬСЯ** запамінацца.
ЗАПОМНИТЬ *сов.* запомніць; **~СЯ** запомніцца.
ЗАПОНКА запінка, -кі *ж.*
ЗАПОНЬ *гидр., мор.* запань, -ні *ж.*
ЗАПОР I *м* (*замок*) замок, -мка *м*; (*задвижка*) засаўка, -кі *ж*; (*засов*) завала, -лы *ж*; **взять на з.** узяць на замок; **дверь на ~е** дзверы на замку.
ЗАПОР II *мед.* запор, -ру *м*; **страдать ~ом** хварэць на запор.
ЗАПОРАШИВАТЬ *несов* 1. зацярушваць; 2. (*засорять*) *разг.* запарушваць; *см.* **запорошить.**
ЗАПОРОЖЕЦ *ист.* запарожац, -жца *м.*
ЗАПОРОЖСКАЯ ОБЛАСТЬ Запарожская вобласць.
ЗАПОРОЖСКИЙ запарожскі.
ЗАПОРОЖЬЕ *г.* Запарожжа, -жжа *ср.*
ЗАПОР||ОТЫЙ залупцаваны, забіты; **~ОТЬ** *сов.* залупцаваць, забіць.
ЗАПОРОШ||ЁННЫЙ 1. зацярушаны; 2. запарушаны; **~ИТЬ** *сов.* 1. зацерушыць; 2. (*засорить*) *разг.* запарушыць; **~ить глаза** запарушыць вочы.
ЗАПОРХНУТЬ *сов.* запырхнуць, заляцець.
ЗАПОТЕВАТЬ *несов.* пацець.
ЗАПОТЕ||ЛЫЙ запацелы; **~ТЬ** *сов.* запацець.
ЗАПРАВИЛА *разг.* верхавод, -да *м*, заправіла, -лы *м.*
ЗАПРАВ||ИТЬ *сов.* 1. (*вставить*) уставіць; (*вложить*) улажыць; (*всунуть*) усунуць, засунуць; (*приделать*) прыладзіць; 2. (*снарядить*) наладзіць, прыладзіць; (*приготовить*) падрыхтаваць; (*горючим*) заправіць; 3. *кул.* запраўіць, закрасіць; (*сметаной, молоком*) забяліць; (*салом*) заскварыць; (*жиром*) затлусціць, (*свиным*) затаўчы; (*мукой*) падкалаціць; *см.* **заправлять** 1—3; **~ИТЬСЯ** 1. запраўіцца; 2. падмацавацца, падсілкавацца; **~КА** *ж* 1. (*действие*) устаўлянне, -ння *ср*; укладанне, -ння *ср*; засоўванне, -ння *ср*; наладжванне, -ння *ср*, прыладжванне, -ння *ср*; падрыхтоўка, -кі *ж*; *см.* **заправлять** 1, 2; 2. (*горючим*) запраўка, -кі *ж*; 3. *кул.* заправа, -вы *ж*, закраса,

-сы *ж*; забе́лка, -кі *ж*; за́таўка, -кі *ж*; по́дкалатка, -кі *ж*; *см.* **заправля́ть**.

ЗАПРАВЛЯ́ТЬ *несов.* 1. (*вставлять*) устаўля́ць; (*вкладывать*) укла́дваць; (*всовывать*) усо́ўваць, засо́ўваць; (*приделывать*) прыла́джваць; **з. брю́ки в сапоги́** засо́ўваць штаны́ ў бо́ты; **з. огло́бли** прыла́джваць агло́блі; 2. (*снаряжать*) нала́джваць, прыла́джваць; (*приготовлять*) падрыхто́ўваць; (*горючим*) запраўля́ць; **з. ла́мпу** нала́джваць (наліва́ць) ля́мпу; **з. капка́н** нала́джваць (прыла́джваць, падрыхто́ўваць) па́стку; **з. автомоби́ль** запраўля́ць аўтамабі́ль; 3. *кул.* запраўля́ць, закра́шваць; (*сметаной, молоком*) забе́льваць; (*салом*) засква́рваць; (*жиром*) затлу́шчваць; (*свиным жиром*) зато́ўкваць; (*мукой*) падкало́чваць; 4. (*быть заправилой*) ару́даваць, верхаво́дзіць; (*руководить*) кірава́ць; **～СЯ** 1. (*горючим*) запраўля́цца; 2. *страд.* устаўля́цца, укла́двацца, усо́ўвацца, засо́ўвацца, прыла́джвацца; нала́джвацца, падрыхто́ўвацца, запраўля́цца; закра́швацца, забе́львацца, засква́рвацца, затлу́шчвацца, зато́ўквацца, падкала́чвацца; *см.* **заправля́ть** 1—3.

ЗАПРА́ВОЧНЫЙ запра́вачны.

ЗАПРА́ВСК||И *нареч. разг.* па-сапра́ўднаму; **～ИЙ** *разг.* сапра́ўдны; самдзе́лешні.

ЗАПРА́ВЩИ||К запра́ўшчык, -ка *м*; **～ЦА** запра́ўшчыца, -цы *ж*.

ЗАПРА́ШИВАТЬ *несов.* 1. (*делать запрос*) запы́тваць; 2. (*цену*) запра́шваць; **～СЯ** *несов. страд.* 1. запы́твацца; 2. запра́швацца.

ЗАПРЕВА́ТЬ *несов.* прэць, пачына́ць прэць.

ЗАПРЕ́Т *м* забаро́на, -ны *ж*; **～И́ТЕЛЬНЫЙ** забаро́нны; **～и́тельный тари́ф** забаро́нны тары́ф; **～И́ТЬ** *сов.* забараніць; **～НЫЙ** забаро́нены.

ЗАПРЕЩ||А́ТЬ *несов.* забараня́ць; **～А́ТЬСЯ** *страд.* забараня́цца; **～Е́НИЕ** *ср* забаро́на, -ны *ж*; **～Ё́ННЫЙ** забаро́нены.

ЗАПРИМЕ́||ТИТЬ *сов. разг.* запрыкме́ціць, заўва́жыць; **～ЧЕННЫЙ** запрыкме́чаны, заўва́жаны.

ЗАПРИХО́ДОВАТЬ *сов. бухг.* запрыхо́даваць, запрыбыткава́ць.

ЗАПРОД||АВА́ТЬ *несов. торг.* запрадава́ць; **～АВА́ТЬСЯ** *страд.* запрадава́цца; **～А́ЖА** *ж торг.* запро́даж, -жу *м*; **～А́ЖНЫЙ** запро́дажны.

ЗАПРО́Д||АННЫЙ запрада́дзены; **～А́ТЬ** *сов. торг.* запрада́ць.

ЗАПРОЕКТИ́РОВ||АННЫЙ запраектава́ны; **～АТЬ** *сов.* запраектава́ць.

ЗАПРОКИ́||ДЫВАТЬ *несов.* закі́дваць; (*назад*) адкі́дваць; **～НУТЬ** *сов.* закі́нуць; адкі́нуць; **～НУТЬСЯ** закі́нуцца; адкі́нуцца.

ЗАПРОПАСТИ́ТЬСЯ *сов. разг.* прапа́сці.

ЗАПРОПА́СТЬ *сов. разг.* прапа́сці.

ЗАПРО́С *м* 1. (*требование разъяснения*) за́пыт, -ту *м*; (*вопрос*) запыта́нне, -ння *ср*; **сде́лать з.** зрабі́ць за́пыт; **посла́ть з.** пасла́ць за́пыт (запыта́нне); 2. (*о цене*) запро́с, -су *м*; **це́ны без ～а** цэ́ны без запро́су; 3. *ед. нет* (*духовные потребности*) запатрабава́нне, -ння *ср*; **～И́ТЬ** *сов.* 1. (*сделать запрос*) запыта́ць; 2. (*цену*) запрасі́ць.

ЗА́ПРОСТО *нареч.* папро́сту, про́ста, без цырымо́ніі.

ЗАПРОТЕСТОВА́ТЬ *сов.* запратэстава́ць.

ЗАПРОТОКОЛИ́РОВА||ННЫЙ запратакалі́раваны; **～ТЬ** *сов.* запратакалі́раваць.

ЗАПРО́ШЕННЫЙ 1. запыта́ны; 2. (*о цене*) запро́шаны.

ЗАПРУ́||ДА гаць, *род.* га́ці *ж*; запру́да, -ды *ж*; **～ДИ́ТЬ** *сов.* 1. загаці́ць; запру́дзіць; 2. *перен.* запо́ўніць; **～ЖА́ТЬ** *несов.* 1. гаці́ць; запру́джваць; 2. *перен.* запаўня́ць; **～ЖА́ТЬСЯ** *страд.* гаці́цца; запру́джвацца; **～ЖЕННЫЙ, ～ЖЁННЫЙ** 1. зага́чаны; запру́джаны; 2. *перен.* запо́ўнены; **～ЖИВАНИЕ** зага́чванне, -ння *ср*; запру́джванне, -ння *ср*; **～ЖИВАТЬ** *несов.* 1. гаці́ць; запру́джваць; 2. *перен.* запаўня́ць; **～ЖИВАТЬСЯ** гаці́цца; запру́джвацца.

ЗАПРЫ́Г||АТЬ *сов.* заскака́ць; **～АТЬСЯ** *разг.* заскака́цца; **～ИВАТЬ** *несов. разг.* заска́кваць; **～НУТЬ** *сов. разг.* заско́кнуць.

ЗАПРЫ́СКАТЬ *сов.* запы́рскаць.

ЗАПРЯ||ГА́ТЬ *несов. прям., перен.* запрага́ць; **～ГА́ТЬСЯ** запрага́цца; **～ЖЁННЫЙ** запрэ́жаны.

ЗАПРЯ́ЖКА *ж* 1. (*действие*) запрага́нне, -ння *ср*; 2. *в др. знач.* запрэ́жка, -кі *ж*; (*упряжь*) ву́праж, -жы *ж*, збру́я, -руі *ж*.

ЗАПРЯ́Т||АТЬ *сов.* схава́ць, захава́ць; **～АТЬСЯ** схава́цца, захава́цца; **～ЫВАТЬ** *несов.* хава́ць; **～ЫВАТЬСЯ** хава́цца.

ЗАПРЯ́ЧЬ *сов. прям., перен.* запрэ́гчы; **～СЯ** запрэ́гчыся.

ЗАПУ́Г||АННОСТЬ запужа́насць, -ці *ж*, запало́ханасць, -ці *ж*; **～АННЫЙ** *прич., прил.* запужа́ны, запало́ханы; **～А́ТЬ** *сов.* запужа́ць, запало́хаць; **～И́ВАНИЕ** запу́жванне, -ння *ср*, запало́хванне, -ння *ср*; **～ИВАТЬ** *несов.* запу́жваць, запало́хваць; **～ИВАТЬСЯ** *страд.* запу́жвацца, запало́хвацца.

ЗАПУ́ДР||ИВАТЬ *несов.* запу́дрываць; **～ИТЬ** *сов.* запу́дрыць.

ЗАПУСКА́ТЬ I *несов.* запуска́ць; *см.* **запусти́ть** I.

ЗАПУСКА́ТЬ II *несов.* запуска́ць; *см.* **запусти́ть** II.

ЗАПУСКА́ТЬСЯ I *несов. страд.* (*от* **запуска́ть** I) запуска́цца.

ЗАПУСКА́ТЬСЯ II *несов. страд.* (*от* **запуска́ть** II) запуска́цца.

ЗАПУСТЕ́||ЛОСТЬ запусце́ласць, -ці *ж*; **～ЛЫЙ** *обл.* запусце́лы; **～НИЕ** запусце́нне, -ння *ср*; **～ТЬ** *сов.* запусце́ць.

ЗАПУСТИ́ТЬ I *сов.* запусці́ць; **з. стано́к** запусці́ць стано́к; **з. ко́гти** запусці́ць кіпцюры́; **з. ка́мнем** запусці́ць ка́менем.

ЗАПУСТИ́ТЬ II *сов.* запусці́ць; **з. сад** запусці́ць сад; **з. боле́знь** запусці́ць хваро́бу.

ЗАПУ́Т||АННО *нареч.* заблы́тана; **～АННОСТЬ** заблы́танасць, -ці *ж*; **～АННЫЙ** заблы́таны; **～АТЬ** *сов. в разн. знач.* заблы́таць; **～ать пря́жу** заблы́таць пра́жу; **～ать вопро́сами** заблы́таць пыта́ннямі; **～АТЬСЯ** заблы́тацца; **～ЫВАНИЕ** заблы́тванне, -ння *ср*; **～ЫВАТЬ** *несов. в разн. знач.* заблы́тваць; **～ЫВАТЬСЯ** заблы́твацца.

ЗАПУХА́ТЬ *несов.* запуха́ць.

ЗАПУ́ХНУТЬ *сов.* запу́хнуць.

ЗАПУШ||Ё́ННЫЙ запу́шаны; **～И́ТЬ** *сов.* запушы́ць.

ЗАПУ́ЩЕНН||ОСТЬ запу́шчанасць, -ці *ж*; **～ЫЙ** *в разн. знач.* запу́шчаны; **～ый сад** запу́шчаны сад; **～ый пла́нёр** запу́шчаны планёр.

ЗАПЫЛА́ТЬ *сов.* запала́ць.

ЗАПЫЛ||Ё́ННЫЙ запы́лены; **～И́ТЬ** *сов.* запылі́ць; **～И́ТЬСЯ** запылі́цца.

ЗАПЫХА́ВШИЙСЯ *прил.* задыха́ны.

ЗАПЫХА́ТЬСЯ *сов.* задыха́цца; *несов.* задыха́цца.

ЗАПЫХТЕ́ТЬ *сов.* запы́хкаць; (*от утомления*) засапці́.

ЗАПЬЯНЕ́ТЬ *сов. разг.* упі́цца, ап'яне́ць.

ЗАПЬЯ́НСТВОВАТЬ *сов.* зап'я́нстваваць.

ЗАПЯ́СТ||НЫЙ *анат.* запя́сцевы; **～ЬЕ** *ср* 1. *анат.* запя́сце, -ця *ср*; 2. (*браслет*) бранзале́т, -та *м*.

ЗАПЯТА́Я 1. *грам., бакт.* ко́ска, -кі *ж*; 2. *перен. шутл.* за́гвоздка, -кі *ж*; **вот тут-то тебе́** ■ **з.** вось тут табе́ і за́гвоздка.

ЗАПЯ́ТК||И *уст.* запя́ткі, -так *ед. нет*; **стоя́ть на ～ах** стая́ць на запя́тках.

ЗАПЯТН||А́ННЫЙ запля́млены; **～А́ТЬ** *сов. прям., перен.* запля́міць.

ЗАПЯТОВИ́ДНЫЙ *бакт.* коскападо́бны.

ЗАРАБ||А́ТЫВАТЬ *несов.* зарабля́ць; **～А́ТЫВАТЬСЯ** *страд.* зарабля́цца; **～О́ТАННЫЙ** заро́блены; **～О́ТАТЬ** *сов.*

1. (*приобрести работой*) зарабíць; 2. (*начать работать*) запрацавáць; ~**ОТАТЬСЯ** запрацавáцца.

ЗАРАБОТ||НЫЙ заробóтны; ~**ная плáта** заробóтная плáта; ~**ОК** заробóтак, -тку *м*, зарóбак, -бку *м*.

ЗАРÁВНИВАТЬ *несов.* зараўнóўваць; ~**СЯ** зараўнóўвацца.

ЗАРАЖ||ÁЕМОСТЬ заражáльнасць, -ці *ж*; ~**ÁТЬ** *несов.* заражáць; ~**ÁТЬСЯ** заражáцца; ~**ÉНИЕ** заражэ́нне, -ння *ср*; ~**ЁННОСТЬ** зарáжанасць, -ці *ж*; ~**ЁННЫЙ** зарáжаны.

ЗАРÁЗ *нареч. разг.* зарáз.

ЗАРÁЗ||А *прям., перен.* зарáза, -зы *ж*; ~**ÍТЕЛЬНО** *нареч.* зарáзліва; ~**ÍТЕЛЬНОСТЬ** *прям., перен.* зарáзлівасць, -ці *ж*; ~**ÍТЕЛЬНЫЙ** зарáзлівы; ~**ÍтельныЙ смех** зарáзлівы (вясёлы) смех; ~**ÍТЬ** *сов.* заразíць; ~**ÍТЬСЯ** заразíцца.

ЗАРАЗÍХ||А *бот.* заразíха, -хі *ж*; ~**ОВЫЕ** *мн. сущ.* заразíхавыя, -вых.

ЗАРÁЗН||АЯ *сущ.* зарáзная, -най *ж*; ~**ЫЙ** 1. *прил.* зарáзны; 2. *сущ.* зарáзны, -нага *м*.

ЗАРÁНЕЕ *нареч.* зáгадзя, напéрад.

ЗАРАПОРТОВÁТЬСЯ *сов. ирон.* зарапартавáцца.

ЗАРАС||ТÁТЬ *несов.* зарóстваць, зарастáць; ~**ТÍ** *сов.* зарасцí.

ЗАРВÁТЬСЯ *сов. разг.* зарвáцца.

ЗАРДÉТЬ *сов.* зачырванéць, запунсавéць; ~**СЯ** зачырванéцца, запунсавéцца.

ЗАРЕВÉТЬ *сов.* зараўцí.

ЗÁРЕВО зáрыва, -ва *ср*.

ЗАРЕВÓЙ заравы́; *см.* **зар́я**.

ЗАРЕГИСТР||ÍРОВАННЫЙ зарэгістравáны; ~**ÍРОВАТЬ** *сов.* зарэгістравáць; ~**ÍРОВАТЬСЯ** зарэгістравáцца.

ЗАРÉЗ *разг.* зарэ́з, -зу *м*; ✧ **прямо з.** прóста зарэ́з; **до** ~**у** да зарэ́зу.

ЗАРÉЗАТЬ *сов.* 1. зарэ́заць; (*о колке свиней*) закалóць; (*загрызть — о волке*) *обл.* задушы́ць; 2. *перен.* зарэ́заць; **з. без ножá** *разг.* зарэ́заць без нажá; **хоть зарéжь** *разг.* хоць зарэ́ж; ~**СЯ** зарэ́зацца.

ЗАРЕЗВÍТЬСЯ *сов.* 1. (*начать резвиться*) пачáць гуля́ць; пачáць весяліцца; пачáць дурэ́ць; *см.* **резвиться;** 2. (*резвясь, увлечься*) загуляцца; задурэ́цца.

ЗАРЕЗЕРВÍРОВАТЬ *сов.* зарэзервавáць.

ЗАРЕКÁ||НИЕ *разг.* заракáнне, -ння *ср*; ~**ТЬСЯ** *несов.* заракáцца.

ЗАРЕКОМЕНД||ОВАТЬ *сов.* зарэкамендавáць; ~**ÓВЫВАТЬ** *несов.* зарэкамендóўваць.

ЗАРÉ||ЧНЫЙ зарэ́чны; ~**ЧЬЕ** зарэ́чча, -чча *ср*.

ЗАРÉЧЬСЯ *сов.* зарачы́ся.

ЗАРÉЯТЬ *сов.* 1. (*начать парить*) пачáць лятáць, залятáць; 2. (*начать развеваться*) залунáць.

ЗАРЖÁ||ВЕВШИЙ заржавéлы; ~**ВЕТЬ** *сов.* заржавéць; ~**ВИТЬ** *сов.* заржáвіць; ~**ВЛЕННЫЙ** іржáвы; заржавéлы.

ЗАРЖÁТЬ *сов.* заржáць.

ЗАРИСÓВ||АННЫЙ зарысавáны; замалявáны; ~**ÁТЬ** *сов.* зарысавáць; (*красками*) замалявáць; ~**КА** зарысóўка, -кі *ж*; замалёўка, -кі *ж*; ~**ЫВАТЬ** *несов.* зарысóўваць; (*красками*) замалёўваць.

ЗАРÍТЬСЯ *несов. разг.* квáпіцца, гáліцца, гнáцца.

ЗАРНÍЦА блíскавіца, -цы *ж*, зарнíца, -цы *ж*.

ЗАРОБÉТЬ *сов. разг.* забаяцца.

ЗАРОВНЯ́ТЬ *сов.* зараўнавáць; ~**СЯ** зараўнавáцца.

ЗАРОДÍТЬ *сов.* зарадзíць; ~**СЯ** зарадзíцца.

ЗАРÓДЫШ *биол., перен.* зарóдак, -дка *м*; ~**ЕВЫЙ** зарóдкавы.

ЗАРОЖД||ÁТЬ *несов.* зараджáць; ~**ÁТЬСЯ** зараджáцца; ~**ÉНИЕ** зараджэ́нне, -ння *ср*; ~**ЁННЫЙ** зарóджаны.

ЗАРОЗОВÉТЬ *сов.* заружавéць.

ЗАРÓЙТЬСЯ *сов.* заро́іцца.

ЗАРÓК *разг.* зарóк, -ку *м*; **дать з.** **даць зарóк**.

ЗАРОКОТÁТЬ *сов.* заракатáць.

ЗАРОН||ÍТЬ *сов.* 1. (*уронить*) упусцíць; (*бросить*) кíнуць; (*забросить*) закíнуць; 2. (*вызвать, возбудить*) пасе́яць, вы́клікаць; **з. сомнéние** пасе́яць (вы́клікаць) сумнéнне; ~**ÍТЬСЯ** запáсці; зарадзíцца; ~**ЯТЬ** *несов.* 1. упускáць; кíдаць; закідáць; 2. сéяць, выклікáць; *см.* **заронить.**

ЗАРОПТÁТЬ *сов.* пачáць наракáць.

ЗÁРОСЛЬ *ж* зáраснік, -ку *м*.

ЗАРОСТОК *бот.* зáрастак, -тка *м*.

ЗАРÓСШИЙ *прил.* зарóслы.

ЗАРПЛÁТА (зáработная плáта) зарплáта, -ты *ж* (заробóтная плáта).

ЗАРУБÁТЬ *несов.* 1. (*убивать*) засякáць; 2. (*делать зарубку*) зарýбліваць, засякáць; *см.* **зарубить.**

ЗАРУБÉЖНЫЙ зарубéжны.

ЗАРУБÍТЬ *сов.* 1. (*убить*) засячы́; 2. (*сделать зарубку*) зарубíць, засячы́; ✧ **з. себé на носý** *разг.* зарубíць сабé на нóсе.

ЗАРÝБ||КА зарýбка, -кі *ж*; засéчка, -кі *ж*; ~**ЛЕННЫЙ** 1. (*лишённый жизни*) засéчаны; 2. (*о зарубке на чём-л.*) зарýблены, засéчаны.

ЗАРУБЦ||ЕВÁНИЕ *мед.* зарубцавáнне, -ння *ср*; ~**ЕВÁТЬСЯ** *сов.* зарубцавáцца; ~**ÓВЫВАТЬСЯ** *несов.* зарубцóўвацца.

ЗАРÝБЩИК *горн.* зарýбшчык, -ка *м*.

ЗАРУМЯ́НИ||ВАТЬ *несов.* зарумя́ньваць; ~**ВАТЬСЯ** зарумя́ньвацца; ~**ТЬ** *сов.* зарумя́ніць; ~**ТЬСЯ** зарумя́ніцца.

ЗАРУЧ||ÁТЬСЯ *несов.* заручáцца; ~**ÍТЬСЯ** *сов.* заручы́цца.

ЗАРÝЧКА *разг.* зарýчка, -кі *ж*.

ЗАРЫВÁТЬ *несов.* закóпваць.

ЗАРЫВÁТЬСЯ I *несов.* (*к* **зары́ться**) закóпвацца.

ЗАРЫВÁТЬСЯ II *несов.* (*к* **зарвáться**) зарывáцца.

ЗАРЫДÁТЬ *сов.* зарыдáць.

ЗАРЫ́ТЬ *сов.* закапáць; ~**СЯ** закапáцца.

ЗАРЫЧÁТЬ *сов.* зарыкáць; (*зареветь*) зараўцí; (*о собаке, а также перен.*) загы́ркаць.

ЗАР||Я́ *ж* 1. (*окраска горизонта*) зарá, -ры́ *ж*; 2. (*раннее утро*) зóлак, -лку *м*, дóсвітак, -ку *м*, світáнне, -ння *ср*; **на** ~**é** на зóлку, на дóсвітку, на світáнні; **встать с** ~**ёй** устáць на зóлку (на дóсвітку, на світáнні); **ни свет, ни з.** чуць свет, яшчэ́ і на дзень не займáлася; 3. *перен.* зарáнак, -нку *м*, світáнне, -ння *ср*, дóсвітак, -тку *м*; **з. нóвой жизни** зарáнак (світáнне) нóвага жыцця́; **на** ~**é юности** на зарáнку (на світáнні) юнáцтва; 4. (*сигнал*) зарá, -ры́ *ж*; **бить зóрю** біць зарý.

ЗАРЯБÍТЬ *сов.* 1. зарабацíць; 2. (*в глазах*) *безл.* замітусíцца.

ЗАРЯ́Д 1. (*для выстрела*) зарáд, -ду *м*, набóй, -бóю *м*; 2. *в др. знач.* зарáд, -ду *м*.

ЗАРЯДÍТЬ I *сов.* зарадзíць; **з. ружьё** зарадзíць стрэ́льбу.

ЗАРЯД||ÍТЬ II *сов.* зарадзíць; ~**ÍЛ дождь** зарадзíў дождж.

ЗАРЯДÍТЬСЯ зарадзíцца.

ЗАРЯ́Д||КА *в разн. знач.* зарáдка, -кі *ж*; ~**НИК** *воен.* зарáднік, -ка *м*; ~**НЫЙ** зарáдны.

ЗАРЯ́ДЬЕ *ист.* зарáддзе, -ддзя *ср*.

ЗАРЯЖ||ÁНИЕ зараджáнне, -ння *ср*; ~**ÁТЬ** *несов.* зараджáць; ~**ÁТЬСЯ** зараджáцца; ~**ÁЮЩИЙ** *сущ. воен.* зараджáльшчык, -ка *м*.

ЗАРЯЖ||ЕННЫЙ, ~**ЁННЫЙ** зарáджаны.

ЗАРЯНÍЦА *фольк.* заранíца, -цы *ж*, зарáнка, -кі *ж*.

ЗАСÁДА *в разн. знач.* засáда, -ды *ж*.

ЗАСАДИ́ТЬ *сов. в разн. знач.* засадзíць.
ЗАСА́ДКА *ж* заса́дка, -кі *ж*, заса́джванне, -ння *ср.*
ЗАСА́ДНИТЬ *сов. безл. разг.* зашчымéць, запячы́.
ЗАСА́ДНЫЙ *воен.* заса́дны.
ЗАСА́Ж|ЕННЫЙ *в разн. знач.* заса́джаны; **~ИВАТЬ** *несов.* заса́джваць; **~ИВАТЬСЯ** заса́джвацца.
ЗАСА́ЛЕННЫЙ *прич., прил.* зашмальцава́ны.
ЗАСА́ЛИВАТЬ I *несов.* (*пачкать*) зашмальцóўваць.
ЗАСА́ЛИВАТЬ II *несов.* (*солью*) засóльваць.
ЗАСА́ЛИВАТЬСЯ I *несов.* (*пачкаться*) зашмальцóўвацца.
ЗАСА́ЛИВАТЬСЯ II *несов. страд.* (*солью*) засóльвацца.
ЗАСА́ЛИТЬ *сов.* зашмальцава́ць; **~СЯ** зашмальцава́цца.
ЗАСА́РИВАТЬ *несов. см.* **засоря́ть; ~СЯ** *см.* **засоря́ться.**
ЗАСА́СЫВАТЬ *несов.* 1. (*изводить сосанием*) засыса́ць, засмóктваць; (*о тоске*) загрыза́ць; 2. *прям., перен.* (*поглощать*) засмóктваць.
ЗАСА́ХАР|ЕННЫЙ зацукрава́ны; **~ИВАТЬ** *несов.* зацукрóўваць; **~ИВАТЬСЯ** зацукрóўвацца; **~ИТЬ** *сов.* зацукрава́ць; **~ИТЬСЯ** зацукрава́цца.
ЗАСВЕРКА́ТЬ *сов.* заблíскаць; (*переливаясь*) зазіхацéць; (*заблестеть*) заблішча́ць.
ЗАСВЕРЛИ́ТЬ *сов.* засвідрава́ць.
ЗАСВЕТИ́ТЬ *сов.* запалíць; **з. фона́рь, свéчку** запалíць ліхта́р, свéчку; **~СЯ** 1. загарэ́цца; 2. *перен.* (*засиять*) засвяцíцца.
ЗАСВЕТЛÉТЬ *сов.* засвятлéць; **~СЯ** засвятлéцца.
ЗА́СВЕТЛО *нареч.* за́відна.
ЗАСВИДÉТЕЛЬСТВОВ|АНИЕ засвéдчанне, -ння *ср*; **~АННЫЙ** засвéдчаны; **~АТЬ** *сов.* засвéдчыць; пасвéдчыць; ◇ **~ать почтéние** *уст.* вы́казаць пашану.
ЗАСВИС|ТА́ТЬ, ~ТÉТЬ *сов.* засвіста́ць.
ЗАСÉВ *с.-х.* засéў, -сéву *м*; **~А́ТЬ** *несов. с.-х.* засява́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* засява́цца; **~ЩИК** *с.-х.* засéўшчык, -ка *м.*
ЗАСЕДА́|НИЕ пасяджэ́нне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬ** засяда́цель, -ля *м*; **наро́дный ~тель** наро́дны засяда́цель; **~ТЕЛЬСКИЙ** засяда́цельскі; **~ТЬ** *несов.* засяда́ць.
ЗАСÉИВАТЬ *несов. с.-х.* засява́ць; **~СЯ** *страд.* засява́цца.
ЗАСÉКА 1. (*место после срубки леса*) па́сека, -кі *ж*; 2. *воен., ист.* засéка, -кі *ж.*
ЗАСЕКА́ТЬ *несов.* 1. (*запарывать*) залупцóўваць, забіва́ць; 2. *в др. знач.* засяка́ць; **~СЯ** 1. (*о лошади*) задратóўвацца; 2. *страд.* залупцóўвацца, забіва́цца; засяка́цца; *см.* **засека́ть.**
ЗАСЕКРÉ|ТИТЬ *сов.* засакрэ́ціць; **~ЧЕННЫЙ** засакрэ́чаны; **~ЧИВАТЬ** *несов.* засакрэ́чваць; **~ЧИВАТЬСЯ** *страд.* засакрэ́чвацца.
ЗАСЕЛ|ÉНИЕ засялéнне, -ння *ср*; **~ЁННОСТЬ** засéленасць, -ці *ж*; **~ЁННЫЙ** засéлены; **~И́ТЬ** *сов.* засялíць; **~И́ТЬСЯ** засялíцца.
ЗАСÉЛ|ЬЩИК засéльшчык, -ка *м*; **~Я́ТЬ** *несов.* засяля́ць; **~Я́ТЬСЯ** засяля́цца.
ЗАСЕМЕНИ́ТЬ *сов.* (*ногами*) дрóбненька затýпаць (пача́ць ступа́ць, пача́ць ісцí, захадзíць); пача́ць перабіра́ць нага́мі; затэ́паць; *см.* **семени́ть.**
ЗАСЕРЕБРИ́ТЬСЯ *сов.* засерабры́цца.
ЗАСÉСТЬ *сов. в разн. знач.* засéсці; ◇ **з. ■ гóлову** засéсці ў галаву́.
ЗАСÉЧ|ЕННЫЙ, ~ЁННЫЙ 1. (*запоротый*) залупцава́ны, забíты; 2. *в др. знач.* засéчаны; **~КА** засéчка, -кі *ж.*
ЗАСÉЧНЫЙ *воен., ист.* засéчны.
ЗАСÉЧЬ *сов.* 1. (*запороть*) залупцава́ць, забíць; 2. *в др. знач.* засячы́; **~СЯ** (*о лошади*) задратава́цца.
ЗАСÉЯТЬ *сов. с.-х.* засéяць; **~СЯ** засéяцца.
ЗАСИДÉТЬ *сов. разг.* засéдзець.
ЗАСИДÉТЬСЯ *сов. разг.* засéдзецца.
ЗАСИ́Ж|ЕННЫЙ засéджаны; **~ИВАТЬ** *несов.* засéджваць.
ЗАСИ́ЖИВАТЬСЯ *несов.* засéджвацца.
ЗАСИЛОСОВА́ТЬ *сов. с.-х.* засіласава́ць.
ЗАСИ́ЛЬЕ засíлле, -лля *ср.*
ЗАСИ́М *нареч. уст.* заты́м; (*после этого*) пасля́ гэ́тага; (*потом*) пóтым; (*а теперь*) а цяпéр.
ЗАСИНÉТЬ *сов.* засінéць; **~СЯ** засінéцца.
ЗАСИ́Н|ИВАТЬ *несов.* засíньваць; **~ИТЬ** *сов.* засінíць.
ЗАСИЯ́ТЬ *сов.* заззя́ць; (*заблестеть*) заблішча́ць; (*засверкать*) зазіхацéць.
ЗАСКАКА́ТЬ *сов.* заскака́ць; (*быстро заехать куда-л.— ещё*) замча́цца.
ЗАСКА́КИВАТЬ *несов.* заска́кваць.
ЗАСКАНДА́ЛИТЬ *сов. разг.* заскандáліць.
ЗАСКВОЗ|И́ТЬ *сов.* 1. (*стать прозрачным*) стаць (пача́ць) свіцéцца, засвіцéцца; **ли́стья опали, и рóща ~и́ла** лісцё апала, і гай стаў (пача́ў) свіцéцца; 2. (*проглянуть*) прагляну́ць, паказа́цца; **чéрез густы́е вéтви ~и́ло голубóе нéбо** праз густóе галлё прагляну́ла (паказа́лася) блакíтнае нéба; 3. (*о сквозняке*) *безл.* пача́ць прадзіма́ць, пача́ць цягну́ць, пача́ць прайма́ць; *см.* **сквози́ть.**
ЗАСКИРД|ÓВАННЫЙ *с.-х.* засціртава́ны; склáдзены ў тарпы́; **~ОВА́ТЬ** *сов.* засціртава́ць; склáсці ў тарпы́.
ЗАСКÓК заскóк, -ку *м.*
ЗАСКОЛЬЗИ́ТЬ *сов.* заслізгацéць; заслíзгацца, закóўзацца; *см.* **скользи́ть.**
ЗАСКОРУ́З|ЛОСТЬ 1. закарэ́ласць, -ці *ж*; 2. *перен.* закару́зласць, -ці *ж*; **~ЛЫЙ** 1. закарэ́лы; 2. *перен.* закару́злы; **~НУТЬ** *сов.* 1. закарэ́ць; 2. *перен.* закару́знуць.
ЗАСКОЧИ́ТЬ *сов. разг.* заскóчыць.
ЗАСКРЕЖЕТА́ТЬ *сов.* заскрыгата́ць, заскры́гаць.
ЗАСКРЕСТИ́ *сов.* заскрэ́бці; **~СЬ** заскрэ́бціся.
ЗАСКРИПÉТЬ *сов.* заскрыпéць, заскры́паць, зарыпéць, зары́паць.
ЗАСКУЛИ́ТЬ *сов. разг.* заскавыта́ць, заскугóліць.
ЗАСКУЧА́ТЬ *сов.* занудзíцца; (*затосковать*) засумава́ць, замаркóціцца.
ЗАСЛА́ВЛЬ *м пос.* Засла́ўе, -ла́ўя *ср.*
ЗАСЛА́ВСКИЙ РАЙÓН Засла́ўскі раён.
ЗА́СЛ|АННЫЙ засла́ны; **~А́ТЬ** *сов.* засла́ць.
ЗАСЛЕДИ́ТЬ *сов. разг.* заслядзíць.
ЗАСЛÉЖ|ЕННЫЙ заслéджаны; **~ИВАТЬ** *несов. разг.* заслéджваць.
ЗАСЛЕЗИ́ТЬСЯ *сов.* заслязíцца.
ЗАСЛЕП|И́ТЬ *сов. разг.* засляпíць; **~ЛЁННЫЙ** заслéплены; **~ЛЯ́ТЬ** *несов. разг.* заслéпліваць, засляпля́ць; **~ЛЯ́ТЬСЯ** *страд.* заслéплівацца, засляпля́цца.
ЗАСЛÓН *м* 1. *воен.* заслóн, -ну *м*; 2. (*у печки*) за́сланка, -кі *ж*; **~ЁННЫЙ** заслóнены; **~И́ТЬ** *сов.* заслані́ць; **~И́ТЬСЯ** засланíцца; **~КА** за́сланка, -кі *ж*; **~Я́ТЬ** *несов.* засланя́ць; **~Я́ТЬСЯ** засланя́цца.
ЗАСЛУ́Г|А заслу́га, -гі *ж*; **по ~ам** па заслу́гах; **ста́вить себé в ~у** ста́віць сабé ў заслу́гу.
ЗАСЛУ́Ж|ЕННО *нареч.* заслу́жана; **~ЕННЫЙ, ~ЁННЫЙ** заслу́жаны; **~енный дéятель нау́ки** заслу́жаны дзéяч навукí; **~енный ма́стер спóрта** заслу́жаны майстар спóрту; **~ИВАТЬ** *несов.* заслугóўваць; **~И́ТЬ** *сов.* заслужы́ць.
ЗАСЛУ́Ш|АТЬ *сов.* заслу́хаць; **~АТЬСЯ** заслу́хацца; **~ИВАТЬ** *несов.* заслухóўваць; **~ИВАТЬСЯ** заслухóўвацца.
ЗАСЛЫ́ШАТЬ *сов.* счуць; (*услышать*) пачу́ць.
ЗАСЛЮН|ИВАТЬ *несов. разг.* заслíньваць; **~И́ТЬ, ~Я́ВИТЬ** *сов.* заслíніць.
ЗАСМА́ЛИВАТЬ *несов.* засмóльваць; **~СЯ** засмóльвацца.
ЗАСМА́ТРИВАТЬ *несов.* загля́дваць, загляда́ць, зазіра́ць; **~СЯ** загля́двацца, загляда́цца.

ЗАСМЕ́||ИВАТЬ *несов. разг.* засме́йваць, абсме́йваць; **~ЯННЫЙ** засме́яны, абсме́яны; **~Я́ТЬ** *сов. разг.* засмяя́ць, абсмяя́ць.

ЗАСМЕЯ́ТЬСЯ *сов.* засмяя́цца.

ЗАСМОЛ||ЁННЫЙ засмо́лены; **~И́ТЬ** *сов.* засмалі́ць.

ЗАСМОТРЕ́ТЬСЯ *сов.* загле́дзецца.

ЗАСНЕЖЕ́ННЫЙ засне́жаны.

ЗАСНИМА́ТЬ *несов. фот., кино* здыма́ць.

ЗАСНОВА́ТЬ *сов.* заснава́ць.

ЗАСНУ́||ВШИЙ *прил.* засну́лы; **~ТЬ** *сов.* засну́ць; ◇ **~ть ве́чным сном** засну́ць ве́чным сном.

ЗАСНЯ́||ТЫЙ зня́ты; **~ТЬ** *сов.* зняць.

ЗАСО́В *м* за́саўка, -кі *ж*; зава́ла, -лы *ж*.

ЗАСО́ВЕСТИТЬСЯ *сов. разг.* засаро́мецца.

ЗАСО́ВЫВАТЬ *несов.* засо́ўваць; **~СЯ** *страд.* засо́ўвацца.

ЗАСО́Л *м* засо́л, -лу *м*; **~Е́НИЕ** *с.-х.* засале́нне, -нне *ср*; **~е́ние по́чвы** засале́нне гле́бы; **~ЕННЫЙ** засо́лены; **~И́ТЬ** *сов.* засалі́ць; **~КА** засо́лка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** засо́лачны; **~ЬЩИК** засо́льшчык, -ка *м*; **~ЬЩИЦА** засо́льшчыца, -цы *ж*.

ЗАСОПЕ́ТЬ *сов.* засапці́.

ЗАСОР||Е́НИЕ *ср* засме́чванне, -ння *ср*; (*загрязнение*) забру́джванне, -ння *ср*; (*забивание*) забіва́нне, -ння *ср*; (*глаз*) запару́шванне, -ння *ср*; (*желудка*) засо́р, -ру *м*; *см.* **засоря́ть**; **~ЁННОСТЬ** засме́чанасць, -ці *ж*.

ЗАСО́Р||ЕННЫЙ, ~ЁННЫЙ (*сором*) засме́чаны; (*загрязнённый*) забру́джаны; (*забитый*) забі́ты; (*о глазах*) запару́шаны; (*о желудке*) засо́раны.

ЗАСОР||И́ТЬ *сов.* засмяці́ць; (*загрязнить*) забру́дзіць; (*забить*) забі́ць; (*глаза*) запарушы́ць; (*желудок*) засары́ць; *см.* **засоря́ть**; **~И́ТЬСЯ** засмяці́цца; забру́дзіцца; забі́цца; запарушы́цца; засары́цца; **~Я́ТЬ** *несов.* засме́чваць; (*загрязнять*) забру́джваць; (*забивать*) забіва́ць; (*глаза*) запару́шваць; (*желудок*) засо́рваць; **~я́ть ра́ковину в ку́хне** забру́джваць (забіва́ць) ра́кавіну ў ку́хні; **~я́ть го́лову** засме́чваць галаву́; **~Я́ТЬСЯ** засме́чвацца; забру́джвацца; забіва́цца; запару́швацца; засо́рвацца.

ЗАСО́С *м* засмо́ктванне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *сов.* **1.** (*начать сосать*) пача́ць ссаць, засмакта́ць, пача́ць смакта́ць; **2.** (*измучить сосанием*) зассаць, засмакта́ць; (*о тоске*) загрызці́; **3.** *прям., перен.* (*поглотить*) засмакта́ць.

ЗАСО́Х||НУТЬ *сов.* засо́хнуць; **~ШИЙ** *прил.* засо́хлы.

ЗАСОЧИ́ТЬСЯ *сов.* засачы́цца.

ЗА́СПАННЫЙ (*о глазах и т. п.*) заспа́ны.

ЗАСПА́ТЬ *сов. просторен.* (*ребёнка*) прыспа́ць; (*глаза и т. п.*) заспа́ць.

ЗАСПА́ТЬСЯ *сов. разг.* заспа́цца.

ЗАСПЕШИ́ТЬ *сов.* заспяша́цца.

ЗАСПИРТО́В||АННЫЙ заспіртава́ны; **~А́ТЬ** *сов.* заспіртава́ць; **~А́ТЬСЯ** заспіртава́цца; **~ЫВАТЬ** *несов.* заспірто́ўваць; **~ЫВАТЬСЯ** заспірто́ўвацца.

ЗАСПО́РИТЬ *сов.* заспрача́цца.

ЗАСПОРИ́ТЬСЯ *сов. разг.* заспарне́ць, заспо́рыцца.

ЗАСРАМИ́ТЬ *сов. разг.* засарамаці́ць.

ЗАСТА́ВА заста́ва, -вы *ж*.

ЗАСТАВА́ТЬ *несов.* застава́ць; заспява́ць (*застигать*); *см.* **заста́ть**.

ЗАСТА́ВИТЬ I *сов.* (*загромоздить*) заста́віць.

ЗАСТА́ВИТЬ II *сов.* (*обязать*) прыму́сіць, заста́віць; **з. ждать себя́** прыму́сіць чака́ць сябе́.

ЗАСТА́ВИТЬСЯ *сов.* (*чем-л.*) заста́віцца.

ЗАСТА́ВКА *тип.* заста́ўка, -кі *ж*.

ЗАСТА́ВЛЕННЫЙ (*загромождённый*) заста́ўлены.

ЗАСТАВЛЯ́ТЬ I *несов.* (*загромождать*) застаўля́ць.

ЗАСТАВЛЯ́ТЬ II *несов.* (*обязывать*) прымуша́ць, застаўля́ць.

ЗАСТАВЛЯ́ТЬСЯ *несов.* (*чем-л.*) застаўля́цца.

ЗАСТА́В||НЫЙ *тип.* заста́ўны; **~ОЧНЫЙ** заста́вачны.

ЗАСТА́ИВА||НИЕ засто́йванне, -ння *ср*; **~ТЬСЯ** *несов. в разн. знач.* засто́йвацца.

ЗАСТА||РЕВА́ТЬ *несов.* старэ́ць; **~РЕ́ЛОСТЬ** застарэ́ласць, -ці *ж*; **~РЕ́ЛЫЙ** застарэ́лы; **~РЕ́ТЬ** *сов.* застарэ́ць.

ЗАСТА́ТЬ *сов.* заста́ць; заспе́ць (*застигнуть*); **з. до́ма** заста́ць до́ма; **з. врасплох** заста́ць (заспе́ць) неспадзе́ўкі (зняна́цку); **з. в живы́х** заста́ць жыво́га.

ЗАСТЁГ||ИВАТЬ *несов.* зашпі́льваць, зашпіля́ць; **~ИВАТЬСЯ** зашпі́львацца, зашпіля́цца; **~НУТЫЙ** зашпі́лены.

ЗАСТЕГНУ́ТЬ *сов.* зашпілі́ць; **~СЯ** зашпілі́цца; **~ся на все пу́говицы** зашпілі́цца на ўсе гу́зікі.

ЗАСТЁЖКА за́спежка, -кі *ж*.

ЗАСТЕКЛ||ЁННЫЙ зашклёны; **~И́ТЬ** *сов.* зашклі́ць; **~Я́ТЬ** *несов.* зашкля́ць; **~Я́ТЬСЯ** *страд.* зашкля́цца.

ЗАСТЕЛИ́ТЬ *сов. разг.* засла́ць.

ЗАСТЕ́НОК *м* катава́льня, -ні *ж*, засце́нак, -нка *м*.

ЗАСТЕ́НЧИВ||О *нареч.* сарамлі́ва; **~ОСТЬ** сарамлі́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ** сарамлі́вы.

ЗАСТИГА́ТЬ *несов.* заскі́чваць, заспява́ць; (*заставать*) застава́ць; (*захватывать*) захо́пліваць.

ЗАСТИ́Г||НУТЫЙ заскі́чаны, заспе́ты; заста́ны; захо́плены; **~НУТЬ** *сов.* заскі́ціць, заспе́ць; (*застать*) заста́ць; (*захватить*) захапі́ць.

ЗАСТИЛА́ТЬ *несов. в разн. знач.* засціла́ць; *см.* **за́стла́ть**; **~СЯ** засціла́цца.

ЗАСТИ́ЛКА *ж* **1.** (*действие*) засціла́нне, -ння *ср*, засці́лка, -кі *ж*; **2.** (*о предмете*) засці́лка, -кі *ж*.

ЗАСТИ́Р||АННЫЙ замы́ты; **~А́ТЬ** *сов.* замы́ць; **~ЫВАТЬ** *несов.* замыва́ць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд.* замыва́цца.

ЗАСТИ́ЧЬ *сов.* заскі́ціць, заспе́ць; (*застать*) заста́ць; (*захватить*) захапі́ць.

ЗА́СТЛ||АННЫЙ засла́ны; **~А́ТЬ** *сов. в разн. знач.* засла́ць; **з. пол ковро́м** засла́ць падлогу дывано́м; **дым застла́л не́бо** дым засла́ў не́ба; **~А́ТЬСЯ** засла́цца.

ЗАСТО́Й *в разн. знач.* засто́й, -то́ю *м*; **~НЫЙ** засто́йны.

ЗАСТО́ЛЬНЫЙ засто́льны.

ЗАСТОНА́ТЬ *сов.* застагна́ць; (*жалобно*) зае́нчыць.

ЗАСТО́ПОРИ||ВАТЬ *несов.* застапо́рваць; **~ВАТЬСЯ** застапо́рвацца; **~ТЬ** *сов.* засто́парыць; **~ТЬСЯ** засто́парыцца.

ЗАСТОЯ́||ВШИЙСЯ *прил.* застаялы; **~ТЬСЯ** *сов. в разн. знач.* застая́цца.

ЗАСТРА́ГИВАТЬ *несов.* застру́гваць.

ЗАСТРА́ИВАТЬ *несов.* забудо́ўваць; **~СЯ** забудо́ўвацца.

ЗАСТРАХО́В||АННЫЙ застрахава́ны; **~А́ТЬ** *сов. прям., перен.* застрахава́ць; **~А́ТЬСЯ** застрахава́цца; **~ЫВАТЬ** *несов. прям., перен.* застрахо́ўваць; **~ЫВАТЬСЯ** застрахо́ўвацца.

ЗАСТРА́ЧИВАТЬ *несов. порт.* застро́чваць; **~СЯ** *страд.* застро́чвацца.

ЗАСТРА́Щ||АННЫЙ застра́шаны; **~А́ТЬ** *сов. разг.* застра́шыць; **~ИВАНИЕ** застра́шванне, -ння *ср*; **~ИВАТЬ** *несов. разг.* застра́шваць.

ЗАСТРЕВА́ТЬ *несов.* засяда́ць, вя́знуць.

ЗАСТРЕКОТА́ТЬ *сов.* застракатаць.

ЗАСТРЕ́Л *охот.* застрэ́л, -лу *м*; **~ЕННЫЙ** застрэ́лены; **~И́ТЬ** *сов.* застрэ́ліць; **~И́ТЬСЯ** застрэ́ліцца.

ЗАСТРЕ́ЛЬЩИ||К застрэ́льшчык, -ка *м*; **~ЦА** застрэ́льшчыца, -цы *ж*.

ЗАСТРЕ́ХА *ж обл.* падстрэ́шша, -шша *ср*, застрэ́шша, -шша *ср*.

ЗАСТР||ИГА́ТЬ *несов. разг.* застрыга́ць; **~И́ЖЕННЫЙ** застры́жаны; **~И́ЧЬ** *сов. разг.* застры́гчы; **~и́чь но́готь** застры́гчы но́гаць.

ЗАСТРО́Г||АННЫЙ застру́ганы; **~А́ТЬ** *сов.* **1.** (*заострить*) заструга́ць; **2.** (*начать строгать*) заструга́ць; (*рубанком*) загабля́ваць.

ЗАСТРО́||ИТЬ *сов.* забудава́ць; **~ИТЬСЯ** забудава́цца;

~ЙКА забудо́ва, -вы *ж*; **~ЙЩИК** забудо́ўшчык, -ка *м*; **~ЙЩИЦА** забудо́ўшчыца, -цы *ж*.

ЗАСТРО́Ч||ЕННЫЙ *прич.* застро́чаны; **~И́ТЬ** *сов. в разн. знач.* застрачы́ць.

ЗАСТРУ́Г||АННЫЙ, ~А́ТЬ *см.* **застро́ганный, ~а́ть.**

ЗАСТРУИ́ТЬСЯ *сов.* забруі́цца, заструме́ніць, заструме́ніцца.

ЗАСТРЯ́||ТЬ *сов.* **1.** засе́сці, завя́знуць; **слова́ ~ли в го́рле** сло́вы засе́лі ў го́рле; **2.** (*запропаститься*) прапа́сці; (*задержаться*) затрыма́цца; (*замешкаться*) замару́дзіць.

ЗАСТУДИ́ТЬ *сов.* застудзі́ць; **~СЯ** застудзі́цца.

ЗАСТУ́Ж||ЕННЫЙ засту́джаны; **~ИВАТЬ** *несов.* засту́джваць; **~ИВАТЬСЯ** засту́джвацца.

ЗА́СТУП *м* жалязня́к, -ка́ *м*, рыдлёўка, -кі *ж*.

ЗАСТУПА́ТЬ *несов. уст.* заступа́ць.

ЗАСТУПА́ТЬСЯ *несов.* заступа́цца.

ЗАСТУПИ́ТЬ *сов. уст.* заступі́ць; **з. чьё-либо ме́сто** заступі́ць чыё-не́будзь ме́сца.

ЗАСТУПИ́ТЬСЯ *сов.* заступі́цца.

ЗАСТУ́ПНИ||К засту́пнік, -ка *м*; **~ЦА** засту́пніца, -цы *ж*; **~ЧЕСКИЙ** засту́пніцкі; **~ЧЕСТВО** засту́пніцтва, -ва *ср*.

ЗАСТУЧА́ТЬ *сов.* засту́каць.

ЗАСТЫВА́ТЬ *несов.* ■ *разн. знач.* застыва́ць.

ЗАСТЫ́ВШИЙ *прил.* засты́лы.

ЗАСТЫДИ́ТЬ *сов.* засаро́міць, засарамаці́ць; **~СЯ** засаро́мецца.

ЗАСТЫ́||ЛЫЙ *разг.* засты́лы; **~ТЬ** *сов. в разн. знач.* засты́ць.

ЗАСУДИ́ТЬ *сов.* засудзі́ць.

ЗАСУЕТИ́ТЬСЯ *сов.* **1.** (*начать суетиться*) замітусі́цца; **2.** (*устать от суеты*) *разг.* забе́гацца.

ЗАСУ́НУТЬ *сов.* засу́нуць.

ЗА́СУХА за́суха, -хі *ж*, за́суш, -шы *ж*.

ЗАСУХОУСТО́ЙЧИВ||ОСТЬ *с.-х.* засухаўсто́йлівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** засухаўсто́йлівы.

ЗАСУ́Ч||ЕННЫЙ закаса́ны; **~ИВАТЬ** *несов.* зака́сваць; **~ИВАТЬСЯ** *страд.* зака́свацца; **~И́ТЬ** *сов.* закаса́ць; **приня́ться за де́ло, ~и́в рукава́** узя́цца за рабо́ту, закаса́ўшы рукавы́.

ЗАСУ́Ш||ЕННЫЙ засу́шаны; **~ИВАТЬ** *несов.* засу́шваць; **~ИВАТЬСЯ** засу́швацца; **~И́ТЬ** *сов.* засушы́ць; **~И́ТЬСЯ** засушы́цца; **~ЛИВЫЙ** засу́шлівы.

ЗАСЧИ́Т||АННЫЙ залі́чаны; **~А́ТЬ** *сов.* залічы́ць; **~А́ТЬСЯ** залічы́цца; **~ЫВАТЬ** *несов.* залі́чваць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд.* залі́чвацца.

ЗАСЫЛА́ТЬ *несов.* засыла́ць; **~СЯ** *страд.* засыла́цца.

ЗАСЫ́ЛКА засы́лка, -кі *ж*.

ЗАСЫ́ПАТЬ *сов. в разн. знач.* засы́паць; **з. вопро́сами** засы́паць пыта́ннямі; **з. овса́** засы́паць аўса́; **~СЯ** засы́пацца.

ЗАСЫПА́ТЬ I *несов.* (*начинать спать*) засына́ць.

ЗАСЫПА́ТЬ II *несов.* (*к* **засы́пать**) засыпа́ць.

ЗАСЫ́ПАТЬСЯ *сов. в разн. знач.* засы́пацца.

ЗАСЫПА́ТЬСЯ *несов.* (*к* **засы́паться**) засыпа́цца.

ЗАСЫ́ПКА *ж* **1.** (*действие*) засыпа́нне, -ння *ср*, засы́пка, -кі *ж*; **2.** (*засыпанное*) засы́пка, -кі *ж*.

ЗАСЫХА́ТЬ *несов.* засыха́ць.

ЗАТАВР||ЁННЫЙ затаўрава́ны, заклеймава́ны; **~И́ТЬ** *сов. спец.* затаўрава́ць, заклеймава́ць.

ЗАТАЁННЫЙ *прич., прил.* зато́ены.

ЗАТА́||ИВАТЬ *несов.* зато́йваць; **~ИВАТЬСЯ** зато́йвацца; **~И́ТЬ** *сов.* затаі́ць; **~И́ТЬСЯ** затаі́цца.

ЗАТА́КТ *муз.* зата́кт, -та *м*; **~НЫЙ** зата́ктавы.

ЗАТА́ЛКИВАТЬ *несов.* запіха́ць, заштурхваць.

ЗАТАНЦЕВА́ТЬ *сов.* затанцава́ць; (*заплясать*) заскака́ць; **~СЯ** (*увлечься танцами*) затанцава́цца; заскака́цца.

ЗАТА́ПЛИВАТЬ *несов.* запа́льваць, падпа́льваць; **~СЯ** запа́львацца, падпа́львацца.

ЗАТА́ПТЫВАТЬ *несов.* зато́птваць; **~СЯ** *страд.* зато́птвацца.

ЗАТАРАТО́РИТЬ *сов. разг.* засаката́ць, залапата́ць; (*заболтать*) забалбата́ць.

ЗАТА́СК||АННОСТЬ зацяга́насць, -ці *ж*; зано́шанасць, -ці *ж*; **~АННЫЙ** зацяга́ны; зано́шаны; **~А́ТЬ** *сов.* зацяга́ць; (*одежду — ещё*) занасі́ць.

ЗАТА́СКИВАТЬ I *несов.* зацягваць; (*одежду—ещё*) зано́шваць.

ЗАТА́СКИВАТЬ II *несов.* (*куда-л.*) зацягваць, завала́кваць, завалака́ць.

ЗАТА́СКИВАТЬСЯ *несов.* зацягвацца; (*об одежде — ещё*) зано́швацца.

ЗАТА́ЧИВАТЬ *несов.* (*делать острым*) заво́стрываць; (*на точиле*) зато́чваць; **~СЯ** *страд.* заво́стрывацца; зато́чвацца.

ЗАТА́Щ||ЕННЫЙ зацягнуты; завало́чаны; **~И́ТЬ** *сов. разг.* зацягну́ць; завалачы́.

ЗАТВЕР||ДЕВА́ТЬ *несов.* цвярдзе́ць, зацвердзява́ць; **~ДЕ́ЛОСТЬ** зацвярдзе́ласць, -ці *ж*; **~ДЕ́ЛЫЙ** зацвярдзе́лы; **~ДЕ́НИЕ** *мед.* зацвярдзе́нне, -ння *ср*; **~ДЕ́ТЬ** *сов.* зацвярдзе́ць.

ЗАТВЕРДИ́||ТЬ *сов.* **1.** (*запомнить*) завучы́ць; **з. стихи́** завучы́ць ве́ршы; **2.** (*начать повторять одно и то же*) задзяўбці́; **~л одно́ и то же** задзёўб адно́ і то́е ж.

ЗАТВЕРЖЁННЫЙ заву́чаны.

ЗАТВО́Р *м* **1.** (*в огнестрельном оружии*) замо́к, -мка́ *м*; **2.** *тех.* за́саўка, -кі *ж*; **3.** (*у ворот и т. п.*) за́саўка, -кі *ж*, за́шчапка, -кі *ж*; **4.** (*отшельничество*) *уст.* пустэ́льніцтва, -ва *ср*; (*келья*) ке́лля, -ллі *ж*; **жить** ■ **~е** жыць пустэ́льнікам.

ЗАТВОРИ́ТЬ *сов.* зачыні́ць; **~СЯ** зачыні́цца.

ЗАТВО́РКА *обл.* за́саўка, -кі *ж*, за́шчапка, -кі *ж*.

ЗАТВО́Р||НИК (*отшельник*) *церк., перен.* пустэ́льнік, -ка *м*; **~НИЦА** пустэ́льніца, -цы *ж*; **~НИЧЕСКИЙ** пустэ́льніцкі; **~НИЧЕСТВО** *церк., перен.* пустэ́льніцтва, -ва *ср*.

ЗАТВОРЯ́ТЬ *несов.* зачыня́ць; **~СЯ** зачыня́цца.

ЗАТЕВА́ТЬ *несов.* заду́мваць, выду́мваць; (*начинать*) распачына́ць, пачына́ць; (*устраивать*) ла́дзіць, нала́джваць; **~СЯ** заду́мвацца, выду́мвацца; распачына́цца, пачына́цца; ла́дзіцца, нала́джвацца.

ЗАТЕ́Й||ЛИВО *нареч.* **1.** вы́чварна; мудраге́ліста; напы́шліва; заба́ўна; ціка́ва; **2.** дасці́пна; вынахо́дліва; *см.* **зате́йливый; ~ЛИВОСТЬ 1.** вы́чварнасць, -ці *ж*; мудраге́лістасць, -ці *ж*; напы́шлівасць, -ці *ж*; заба́ўнасць, -ці *ж*, ціка́васць, -ці *ж*; **2.** дасці́пнасць, -ці *ж*, вынахо́длівасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ 1.** (*вычурный*) вы́чварны; (*замысловатый*) мудраге́лісты; (*витиеватый*) напы́шлівы; (*забавный*) заба́ўны; ціка́вы; **2.** (*остроумный*) дасці́пны; (*изобретательный*) вынахо́длівы.

ЗАТЕ́Й||НИК 1. (*выдумщик*) вы́думшчык, -ка *м*, штука́р, -ра́ *м*, заба́ўнік, -ка *м*; **2.** (*инициатор забав*) заба́ўнік, -ка *м*, арганіза́тар заба́ў; **~НИЦА 1.** вы́думшчыца, -цы *ж*, штука́рка, -кі *ж*, заба́ўніца, -цы *ж*; **2.** заба́ўніца, -цы *ж*, арганіза́тарка заба́ў; **~ЩИК** *разг.* завада́тай, -тая *м*.

ЗАТЕКА́ТЬ *несов. в разн. знач.* зацяка́ць; *см.* **зате́чь.**

ЗАТЕ́М *нареч.* **1.** (*потом*) заты́м, по́тым; **2.** (*поэтому*) *уст.* заты́м, таму́; **3.** (*с этой целью*) *разг.* заты́м, для таго́.

ЗАТЕМ||НЕ́НИЕ *в разн. знач.* зацямне́нне, -ння *ср*; **~НЁННЫЙ** зацямнёны; **~НЕ́ТЬ** *сов.* зацямне́ць; **~НЕ́ТЬСЯ** зацямне́цца; **~НИ́ТЬ** *сов.* зацямні́ць; **~НИ́ТЬСЯ** зацямні́цца; **~НЯ́ТЬ** *несов.* зацямня́ць; **~НЯ́ТЬСЯ** зацямня́цца.

ЗАТЕН||Е́НИЕ зацяне́нне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** зацёнены; **~И́ТЬ** *сов.* зацяні́ць; **~Я́ТЬ** *несов.* зацяня́ць; **~Я́ТЬСЯ** *страд.* зацяня́цца.

ЗАТЕ́ПЛИТЬ *сов.* запалі́ць; **~СЯ** загарэ́цца, запалі́цца.

ЗАТЕРЕБИ́ТЬ *сов.* **1.** (*начать теребить*) зашмо́ргаць, пача́ць шмо́ргаць; пача́ць перабіра́ць; зату́заць, пача́ць ту́заць; затармасі́ць, пача́ць тармасі́ць; пача́ць скубці; *см.* **теребить;** 2. *перен. разг.* зату́заць, затармасі́ць.

ЗАТЕРЕ́ТЬ *сов. в разн. знач.* заце́рці; **з. пятно́** зацерці пля́му; **су́дно затёрло льда́ми** су́дна заце́рла ільдамі; **~СЯ** заце́рціся.

ЗАТЕ́Р|ИВАТЬ *несов.* губля́ць; **~ИВАТЬСЯ** губля́цца; **~ЯННЫЙ** згу́блены; **~Я́ТЬ** *сов.* згубі́ць; **~Я́ТЬСЯ** згубі́цца.

ЗАТЁСАННЫЙ зачэ́саны.

ЗАТЕСА́ТЬ *сов.* зачаса́ць.

ЗАТЕСА́ТЬСЯ *сов. разг.* зачаса́цца.

ЗАТЁСЫВАТЬ *несов.* зачэ́сваць; **~СЯ** *страд.* зачэ́свацца.

ЗАТЕ́ЧЬ *сов. в разн. знач.* зацячы́; **вода́ затекла́ под стул** вада́ зацякла́ пад крэ́сла; **но́ги затекли́** но́гі зацяклі́.

ЗАТЕ́Я (*замысел*) заду́ма, -мы *ж*; (*выдумка*) вы́думка, -кі *ж*; (*забава*) заба́ва, -вы *ж*; **~ТЬ** *сов.* заду́маць, вы́думаць; (*начать*) распача́ць, пача́ць; (*устроить*) нала́дзіць; **~ТЬСЯ** заду́мацца, вы́думацца; распача́цца, пача́цца; нала́дзіцца.

ЗАТИРА́ЛЬНИК *горн.* заціра́льнік, -ка *м.*

ЗАТИРА́ТЬ *несов. в разн. знач.* заціра́ць; **~СЯ** заціра́цца.

КВИ́СЛИНГ *презр.* кві́слінг, -га *м*; **∼ОВЕЦ** кві́слінгавец, -гаўца *м*.
КВИТ *сказ. разг.* (*в расчёте*) кві́ты.
КВИТАНЦИО́ННЫЙ квітанцы́йны.
КВИТА́НЦИЯ *ж* квіто́к, -тка́ *м*, квіта́нцыя, -цыі *ж*.
КВИТА́ТЬСЯ *несов. разг.* квіта́цца.
КВИ́ТЫ *сказ. см.* **квит**.
КВО́РУМ кво́рум, -му *м*.
КВО́Т||А *эк.*, *полит.* кво́та, -ты *ж*; **∼А́ЦИЯ** *эк.*, *полит.* квата́цыя, -цыі *ж*.
КВОХТА́||НЬЕ квактанне, -ння *ср*; **∼ТЬ** *несов.* квакта́ць.
КЕБ кеб, *род.* ке́ба *м*.
КЕ́ГЕЛЬ *см.* **кегль**.
КЕГЕЛЬБА́Н *спорт.* кегельба́н, -на *м*.
КЕ́ГЕЛЬНЫЙ ке́гельны.
КЕ́ГЛИ *мн. спорт.* ке́глі, -ляў, *ед.* ке́гля, -лі *ж*.
КЕГЛЬ *тип.* ке́гель, -ля *м*.
КЕДР *бот.* кедр, *род.* ке́дра *и* (*о древесине*) ке́дру *м*.
КЕ́ДР||ОВКА *зоол.* арэ́хаўка, -кі *ж*; **∼О́ВЫЙ** ке́дравы.
КЕЙФ *шутл.* кейф, *род.* ке́йфу *м*; **∼ОВА́ТЬ** *несов.* *шутл.* кейфава́ць.
КЕКС кекс, *род.* ке́кса *м*.
КЕ́ЛАРЬ *церк.* ке́лар, -ра *м*.
КЕЛЕ́Й||НИК келе́йнік, -ка *м*; **∼НИЦА** келе́йніца, -цы *ж*; **∼НО** *нареч.* келе́йна; **∼НОСТЬ** келе́йнасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** келе́йны.
КЕЛЕ́РИЯ *бот.* келе́рыя, -рыі *ж*.
КЁЛЬН *г.* Кёльн, *род.* Кёльна *м*.
КЕ́ЛЬНЕР ке́льнер, -ра *м*; **∼ША** ке́льнерка, -кі *ж*.

КЕ́ЛЬНЯ *стр.* ке́льня, -ні *ж.*
КЕЛЬТ кельт, *род.* ке́льта *м*; **~СКИЙ** ке́льцкі.
КЕ́ЛЬЯ *прям., перен.* ке́лля, *род.* ке́ллі *ж.*
КЕМ *мест. твор. см.* **кто.**
КЕ́МБРИДЖ *г.* Ке́мбрыдж, -жа *м.*
КЕ́МБРИДЖСКИЙ ке́мбрыджскі.
КЕМБРИ́ЙСКИЙ *геол.* кембры́йскі.
КЕ́МЕРОВО *г.* Ке́мерава, -ва *ср.*
КЕ́МЕРОВСКАЯ О́БЛАСТЬ Ке́мераўская во́бласць.
КЕМЬ *г.* Кем, *род.* Ке́мі *ж.*
КЕНА́Ф *бот.* кена́ф, -фу *м.*
КЕНГУ||РО́ВЫЙ кенгуро́вы; **~РУ́** *зоол.* кенгуру́ *нескл., м.*
КЕНДЫ́РЬ *бот.* кенды́р, -ру *м.*
КЕ́НИЯ Ке́нія, -ніі *ж.*
КЕНОТРО́Н *радио* кенатро́н, -на *м.*
КЕНТА́ВР *миф.* кента́ўр, -ра *м.*
КЕ́П||И ке́пі *нескл., ср*; **~КА** ке́пка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** ке́пачны.
КЕПТА́УН *г.* Кепта́ун, -на *м.*
КЕРА́М||ИКА *иск.* кера́міка, -кі *ж*; **~И́ЧЕСКИЙ** кера-мі́чны.
КЕРАТИ́Н *биол.* керацін, -ну *м.*
КЕРАТИ́Т I *мед.* кераты́т, -ту *м.*
КЕРАТИ́Т II *мин.* кераты́т, -ту *м.*
КЕ́РЕН||КА *ист. разг.* ке́ранка, -кі *ж*; **~ЩИНА** *ист. пренебр.* ке́раншчына, -ны *ж.*
КЕРН *тех.* керн, *род.* ке́рна *м*; **~ЕР** ке́рнер, -ра *м.*
КЕРОГА́З керага́з, -за *м.*
КЕРОСИ́Н *м* га́за, -зы *ж*; **~КА** газні́ца, -цы *ж*; **~НЫЙ, ~ОВЫЙ** га́завы, га́зны.
КЕРОСИНОКАЛИ́ЛЬНЫЙ *тех.* газанапа́льны.
КЕРОСИ́НЩИ||К прадаве́ц га́зы; **~ЦА** прадаўшчы́ца га́зы.
КЕ́РЧЕНСКИЙ ПРОЛИ́В Ке́рчанскі пралі́ў.
КЕРЧЬ *г.* Керч, *род.* Ке́рчы *ж.*
КЕ́САР||Ь *ист.* ке́сар, -ра *м*; ◇ **~ево сече́ние** *мед.* ке́сарава сячэ́нне.
КЕССО́Н *тех.* кесо́н, -на *м*; **~НЫЙ** кесо́нны; **~ЩИК** кесо́ншчык, -ка *м.*
КЕ́ТА *зоол.* ке́та, -ты *ж.*
КЕТГУ́Т *мед.* кетгу́т, -ту *м.*
КЕ́ТОВЫЙ *зоол.* ке́тавы.
КЕТО́Н *хим.* кето́н, -на *м.*
КЕФА́ЛЬ *зоол.* кефа́ль, -лі *ж.*
КЕФИ́Р кефі́р, -ру *м*; **~НЫЙ** кефі́рны.
КЗЫЛ-ОРДА́ *г.* Кзыл-Орда́, -ды́ *ж.*
КЗЫЛ-ОРДИ́НСКАЯ О́БЛАСТЬ Кзыл-Ордзі́нская во́бласць.
КИБИ́Т||КА *в разн. знач.* кібі́тка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** кібі́тачны, кібі́ткавы.
КИВА́||НИЕ ківа́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* ківа́ць.
КИ́ВЕР *воен. ист.* кі́вер, -ра *м.*
КИВ||НУ́ТЬ *сов. и однокр.* кіўну́ць; **~О́К** ківо́к, *род.* кіўка́ *м.*
КИДА́||НИЕ кі́данне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* кі́даць; **~ТЬСЯ** кі́дацца.
КИ́ДКА *ж спец.* **1.** (*действие*) кі́данне, -ння *ср*; **2.** (*порция*) кі́дка, -кі *ж.*
КИ́ЕВ *г.* Кі́еў, *род.* Кі́ева *м.*
КИ́ЕВСКАЯ О́БЛАСТЬ Кі́еўская во́бласць.
КИ́ЕВСКАЯ РУСЬ *ист.* Кі́еўская Русь.
КИЗЕЛЬГУ́Р *геол.* кізельгу́р, -ру *м.*
КИЗИ́||Л *бот.* кізі́л, -лу *м*; **~ЛЕВЫЕ** *мн. сущ. бот.* кізі́лавыя, -вых; **~ЛЕВЫЙ** кізі́лавы; **~ЛОВЫЙ** кізі́лавы; **~ЛЬ** *см.* **кизи́л**; **~ЛЬНИК** *в разн. знач.* кізі́льнік, -ку *м*; **~ЛЬНЫЙ** кізі́лавы, кізі́льны.
КИЗЯ́К *обл.* кізя́к, -ку́ *м*; **~О́ВЫЙ** кізяко́вы.
КИЙ кій, *род.* кі́я *м.*

КИКИ́МОРА **1.** *фольк.* мара́, -ры́ *ж*, пачва́ра, -ры *ж*; **2.** *перен.* пачва́ра, -ры *ж.*
КИКЛА́ДСКИЕ ОСТРОВА́ Кікла́дскія астравы́.
КИЛ *мин.* кіл, *род.* кі́лу *м.*
КИЛА́ *обл.* кіла́, -лы́ *ж.*
КИЛЕВ||А́НИЕ *мор.* кілява́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов. мор.* кілява́ць; **~О́Й** кілявы́.
КИ́ЛЕЧНЫЙ кі́лечны.
КИЛИМАНДЖА́РО (*гора*) Кіліманджа́ро *нескл., м.*
КИЛО́ кіло́ *нескл., ср.*
КИЛОВА́ТТ *эл.* кілова́т, -та *м.*
КИЛОВА́ТТ-ЧАС *м* кілова́т-гадзі́на, -ны *ж.*
КИЛОВО́ЛЬТ кілаво́льт, -та *м.*
КИЛОГРА́ММ кілагра́м, -ма *м.*
КИЛОГРАММЕ́ТР *физ.* кілаграммэ́тр, -ра *м.*
КИЛОГРА́ММ-КАЛО́РИЯ *тех.* кілагра́м-кало́рыя, -рыі *ж.*
КИЛОГРА́ММОВЫЙ кілагра́мавы.
КИЛОЛИ́ТР кілалі́тр, -ра *м.*
КИЛОМЕ́ТР кіламе́тр, -ра *м*; **~ОВЫЙ** кіламе́травы.
КИЛОУА́ТТ *см.* **килова́тт.**
КИЛЬ *мор.* кіль, *род.* кі́ля *м.*
КИЛЬ *г.* Кіль, *род.* Кі́ля *м.*
КИЛЬВА́ТЕР *мор.* кільва́тэр, -ра *м*; **~НЫЙ** кільва́тэрны.
КИ́ЛЬКА кі́лька, -кі *ж.*
КИ́ЛЬСОН *мор.* кі́льсан, -на *м.*
КИМВА́Л *муз., ист.* кімва́л, -ла *м.*
КИМО́ГРАФ *тех.* кімо́граф, -фа *м.*
КИМОНО́ кімано́ *нескл., ср.*
КИ́НГСТОН *мор.* кі́нгстан, -на *м.*
КИНЕМА́Т||ИКА *мех.* кінема́тыка, -кі *ж*; **~И́ЧЕСКИЙ** кінематы́чны.
КИНЕМАТО́ГР||АФ кінемато́граф, -фа *м*; **~АФИ́СТ** кінематаграфі́ст, -та *м*; **~АФИ́ЧЕСКИЙ** кінематаграфі́чны; **~А́ФИЯ** кінематагра́фія, -фіі *ж.*
КИНЕ́Т||ИКА кіне́тыка, -кі *ж*; **~И́ЧЕСКИЙ** кінеты́чны.
КИНЖ||А́Л кінжа́л, -ла *м*; **~А́ЛЬНЫЙ** кінжа́льны.
КИ́НИК *филос. ист.* кі́нік, -ка *м.*
КИНО́ кіно́ *нескл., ср.*
КИНОАКТ||Ё́Р кіноакцё́р, -ра *м*; **~РИ́СА** кіноактры́са, -сы *ж.*
КИНОАППАРА́Т кіноапара́т, -та *м*; **~У́РА** кіноапарату́ра, -ры *ж.*
КИНОАРТИ́СТ кіноарты́ст, -та *м*; **~КА** кіноарты́стка, -кі *ж.*
КИНОАТЕЛЬЕ́ кіноатэлье́ *нескл., ср.*
КИНОВА́РНЫЙ кінава́рны.
КИ́НОВАРЬ кі́навар, -ры *ж.*
КИНОКАРТИ́НА кінокарці́на, -ны *ж.*
КИНОЛЕ́НТА кіносту́жка, -кі *ж.*
КИНООПЕРА́ТОР кінаапера́тар, -ра *м.*
КИНОО́ЧЕРК кінона́рыс, -са *м.*
КИНОПЕРЕДВИ́ЖКА кінoперасо́ўка, -кі *ж.*
КИНОПЛЁНКА кіноплё́нка, -кі *ж.*
КИНОПРОИЗВО́ДСТВО кіновытво́рчасць, -ці *ж.*
КИНОПРОМЫ́ШЛЕННОСТЬ кінопрамысло́васць, -ці *ж.*
КИНОРАБО́ТНИК кінорабо́тнік, -ка *м.*
КИНОРЕЖИССЁР кінорэжысё́р, -ра *м.*
КИНОСЕ́ТЬ кіносе́тка, -кі *ж.*
КИНОСТУ́ДИЯ кіносту́дыя, -дыі *ж.*
КИНОСЦЕНА́Р||ИЙ кіносцэна́рый, -рыя *м*; **~И́СТ** кіносцэнары́ст, -та *м.*
КИНОСЪЁМКА кіноздымка, -кі *ж.*
КИНОТЕА́ТР кінотэа́тр, -ра *м.*
КИНОТЕ́ХНИКА кінотэ́хніка, -кі *ж.*
КИНОУСТАНО́ВКА кіноўстано́ўка, -кі *ж.*
КИНОФА́БРИКА кінофа́брыка, -кі *ж.*
КИНОФЕСТИВА́ЛЬ кінофестыва́ль, -лю *м.*

КИНОФИКАЦИЯ кінофікáцыя, -цыі *ж.*
КИНОФИЛЬМ кінофільм, -ма *м.*
КИНОФИЦИРОВАТЬ *сов. и несов.* кінофікавáць; **~СЯ** *страд.* кінофікавáцца.
КИНОХРОНИКА кінохрóніка, -кі *ж.*
КИНУТЬ *сов.* кінуць; **к. жребий** кінуць жэ́рабя; **к. упрёк** кінуць папрóк; **~СЯ** кінуцца.
КИОСК кіёск, *род.* кіёска *м;* **~ЁР** кіяскёр, -ра *м.*
КИОТ *м* ківóт, -та *м,* бажніца, -цы *ж.*
КИОТО *г.* Кіёто *нескл., м.*
КИПА *ж* **1.** (*пачка*) стос, *род.* стóса *м;* **2.** (*упаковочная мера*) *торг.* кіпа, -пы *ж;* **3.** (*груда*) кýча, -чы *ж.*
КИПАРИС кіпарыс, *род.* кіпарыса *и* (*о древесине*) кіпарысу *м;* **~НЫЙ** кіпарысны; **~ОВЫЙ** кіпарысавы.
КИПЕН|ИЕ кіпéнне, -ння *ср;* **тóчка ~ия** пункт кіпéння.
КИПЕНЬ *м и ж* **1.** (*пена*) пéна, -ны *ж;* **2.** (*кипяток*) кіпецень, *род.* кіпетню *м,* вар, *род.* вáру *м.*
КИПЕРНЫЙ *текст.* кіперны.
КИПЕТЬ *несов.* ▪ *разн. знач.* кіпéць; **борщ кипит** боршч кіпіць; **рабóта кипит** рабóта кіпіць.
КИПР *о.* Кіпр, *род.* Кіпра *м.*
КИПРЕГЕЛЬ *геод.* кіпрэ́гель, -ля *м.*
КИПРЕЙ *бот.* скрыпень, -ню *м;* **~НЫЕ** *мн. сущ. бот.* скрыпневыя, -вых.
КИПРСКИЙ кіпрскі.
КИПУЧ|ЕСТЬ кіпýчасць, -ці *ж;* **~ИЙ** кіпýчы.
КИПЯ|ТИЛЬНИК кіпяцільнік, -ка *м;* **~ТИЛЬНЫЙ** кіпяцільны; **~ТИТЬ** *несов.* кіпяціць; **~тить вóду** гатавáць вадý; **~тить молокó** пáрыць малакó; **~ТИТЬСЯ** *несов.* **1.** кіпяціцца; **2.** *перен.* гарачыцца; кіпéць; **~ТОК** кіпецень, *род.* кіпетню *м,* вар, *род.* вáру *м;* **~ЧЕНИЕ** кіпячэ́нне, -ння *ср;* **~чéние воды** гатавáнне вады; **~чéние молокá** пáранне малакá; **~ЧЁННЫЙ** кіпячóны; **~ЧЁНЫЙ** кіпячóны; **~чёная водá** гатавáная вадá; **~чёное молокó** пáранае малакó.
КИПЯЩ|ИЙ *в знач. прил.* кіпячы; **~ее молокó** кіпячае малакó.
КИРАС|А *воен. ист.* кірáса, -сы *ж;* **~ИР** *воен. ист.* кірасір, -ра *м;* **~ИРСКИЙ** кірасірскі.
КИРГИЗ кіргіз, -за *м.*
КИРГИЗИЯ Кіргізія, -зіі *ж.*
КИРГИЗКА кіргізка, -кі *ж.*
КИРГИЗСКАЯ СОВЕТСКАЯ СОЦИАЛИСТИЧЕСКАЯ РЕСПУБЛИКА Кіргізская Савецкая Сацыялістычная Рэспýбліка.
КИРГИЗСКИЙ кіргізскі.
КИРЕНАИКА Кірэнáіка, -кі *ж.*
КИРЗ|А кірза, -зы *ж;* **~ОВЫЙ** кірзавы; **~овые сапоги** кірзавыя бóты.
КИРИЛЛИЦА *лингв.* кірыліца, -цы *ж.*
КИРКА *церк.* кірха, -хі *ж.*
КИРКА кірка, -кі *ж.*
КИРКАЗОН *бот.* кірказóн, -ну *м;* **~ОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* кірказóнавыя, -вых.
КИРКОВЫЙ кіркавы.
КИРОВ *г.* Кіраў, -рава *м.*
КИРОВОГРАД *г.* Кіравагрáд, -да *м.*
КИРОВОГРАДСКАЯ ОБЛАСТЬ Кіравагрáдская вóбласць.
КИРОВСК *пос.* Кіраўск, -ка *м.*
КИРОВСКАЯ ОБЛАСТЬ Кіраўская вóбласць.
КИРОВСКИЙ РАЙОН Кіраўскі раён.
КИРПИЧ *м* **1.** цэ́гла, -лы *ж;* **2.** (*одна штука*) цагліна, -ны *ж;* **~ИК** *уменьш.* цаглінка, -кі *ж;* **~ИНА** цагліна, -ны *ж;* **~НИК** цагéльнік, -ка *м;* **~НИЦА** цагéльніца, -цы *ж;* **~НЫЙ** цагéльны; **~ный завóд** цагéльны завóд, цагéльня; **~ный чай** прасавáны чай.
КИСЕЙН|ЫЙ кісéйны; ◇ **~ая бáрышня** *ирон. уст.* кісéйная панёнка.
КИСЕЛЕОБРАЗНЫЙ кіселепадóбны.
КИСЕЛЬ кісéль, -лю *м;* **~НЫЙ** кісéльны.
КИСЕТ кісéт, -та *м,* капшýк, -кá *м.*
КИСЕЯ кісяя, -сяі *ж.*
КИС-КИС *межд.* кіц-кіц.
КИСЛ|ЕТЬ *несов.* кіслéць; **~ИНКА: с ~инкой** *разг.* з кіслінкай; **~ИТЬ** *несов.* кісліць.
КИСЛ|ИЦА *бот.* кісліца, -цы *ж;* **~ИЧНЫЕ** *мн. сущ. бот.* кіслічныя, -ных.
КИСЛО *нареч.* кісла.
КИСЛОВКА *ж текст.* кіславáнне, -ння *ср.*
КИСЛОВОДСК *г.* Кіславóдск, -ка *м.*
КИСЛОВОДСКИЙ кіславóдскі.
КИСЛОВЩИ|К *текст.* кіславáльнік, -ка *м;* **~ЦА** кіславáльніца, -цы *ж.*
КИСЛОРОД кісларóд, -ду *м;* **~ИСТЫЙ** кісларóдзісты; **~НЫЙ** кісларóдны.
КИСЛОСЛАДКИЙ *прям., перен.* кісласалóдкі.
КИСЛ|ОТА кіслатá, -ты *ж;* **~ОТНОСТЬ** *хим.* кіслóтнасць, -ці *ж;* **~ОТНЫЙ** кіслóтны.
КИСЛОТООБРАЗУЮЩИЙ *тех.* кіслотаўтварáльны.
КИСЛОТОУПОРНЫЙ кіслотатрывáлы.
КИСЛ|ЫЙ *в разн. знач.* кіслы; **~ЯЙ** *разг. пренебр.* кісля́к, -кá *м;* **~ЯТИНА** *прям., перен.* кісля́ціна, -ны *ж.*
КИСНУТЬ *несов.* кіснуць.
КИСТА *мед.* кістá, -ты *ж.*
КИСТЕВИДНЫЙ *бот.* гронкападóбны.
КИСТЕВОЙ **1.** *анат.* кісцевы; **2.** (*относящийся к кисти пояса и т. п.*) кутасóвы; **3.** *бот.* грóнкавы; *см.* **кисть.**
КИСТЕНОСНЫЙ *бот.* гронканóсны.
КИСТЕНЬ кісцéнь, -ня́ *м.*
КИСТОЧКА *ж* **1.** (*для рисования*) пэ́ндзлік, -ка *м;* **2.** (*для украшения*) кутáсік, -ка *м;* **3.** *бот.* грóначка, -кі *ж;* **4.** (*для смазывания*) мамазóк, -зкá *м.*
КИСТЬ *ж* **1.** *анат.* кісць, *род.* кісці *ж;* **2.** *жив.* пэ́ндзаль, -ля *м;* **3.** (*украшение*) кутáс, -сá *м;* **4.** *бот.* грóнка, -кі *ж.*
КИТ кіт, *род.* кітá *м.*
КИТАЕВЕД кітаезнáвец, -нáўца *м.*
КИТА|ЕЦ кітáец, -тáйца *м;* **~ИСТ** кітаіст, -та *м.*
КИТАЙ Кітáй, -тáя *м.*
КИТАЙКА *текст. уст.* кітáйка, -кі *ж.*
КИТАЙСКАЯ НАРОДНАЯ РЕСПУБЛИКА Кітáйская Нарóдная Рэспýбліка.
КИТА|ЙСКИЙ кітáйскі; **~ЯНКА** кітаянка, -кі *ж.*
КИТЕЛЬ кіцель, -ля *м.*
КИТО *г.* Кіто *нескл., м.*
КИТОБОЕЦ кітабóец, -бóйца *м.*
КИТОБОЙ кітабóй, -бóя *м;* **~НЫЙ** кітабóйны.
КИТОВЫЙ кітóвы.
КИТОЛО[illegible] кіталóў, -лóва *м;* **~НЫЙ** кіталóўны; **~СТВО** кіталóўства, -ва *ср.*
КИТООБРАЗНЫЙ *зоол.* кітападóбны.
КИФАРА *муз. ист.* кіфáра, -ры *ж.*
КИЧИТЬСЯ *несов.* задавáцца, фанабэ́рыцца, выхваля́цца.
КИЧЛИВ|О *нареч.* фанабэ́рыста, пыхліва; **~ОСТЬ** фанабэ́рыя, -рыі *ж,* фанабэ́рыстасць, -ці *ж,* пыхлівасць, -ці *ж;* **~ЫЙ** фанабэ́рысты, пыхлівы.
КИШЕТЬ *несов.* кішэ́ць.
КИШЕЧНИК *анат.* кішэ́чнік, -ка *м.*
КИШЕЧНОДЫШАЩИЕ *мн. сущ. зоол.* кішэчнадыхальныя, -ных.
КИШЕЧНОЖАБЕРНЫЕ *мн. сущ. зоол.* кішэчнашчэ́лепныя, -ных.
КИШЕЧНОПОЛОСТНЫЕ *мн. сущ. зоол.* кішэчнапóласцевыя, -вых.
КИШЕЧНЫЙ кішэ́чны.
КИШИНЁВ *г.* Кішынёў, -нёва *м.*
КИШИНЁВСКИЙ кішынёўскі.

КИШКА́ *в разн. знач.* кішка, -кі *ж.*
КИШКООБРА́ЗНЫЙ кішкападо́бны.
КИШЛА́||К кішла́к, -ка́ *м*; **~ЧНЫЙ** кішла́чны.
КИШМИ́Ш кішмі́ш, -шу *м.*
КИШМЯ́: к. кишит *разг.* аж кішы́ць.
КИШНЕ́Ц *см.* **кориа́ндр.**
КЛАВЕСИ́Н *муз. ист.* клавесі́н, -на *м*; **~НЫЙ** клавесі́нны.
КЛАВИАТУ́РА клавіяту́ра, -ры *ж.*
КЛАВИКО́РДЫ *муз. уст.* клавіко́рды, -даў *ед. нет.*
КЛАВИ́Р *муз. уст.* клаві́р, -ра *м.*
КЛАВИРА́УСЦУГ *муз.* клавіра́ўсцуг, -га *м.*
КЛА́В||ИШ кла́віш, -ша *м*; **~ИША** кла́віша, -шы *ж*; **~ИШНЫЙ** кла́вішны.
КЛАД *прям., перен.* скарб, *род.* ска́рбу *м.*
КЛА́ДБ||ИЩЕ *ср* мо́гільнік, -ка *м*; **~И́ЩЕНСКИЙ** мо́гільнікавы.
КЛА́ДЕЗЬ *уст.* калодзеж, -жа *м*; ◇ **к. прему́дрости** *шутл.* скарбні́ца му́драсці.
КЛА́ДКА *ж* 1. (*укладывание*) скла́дванне, -ння *ср,* кла́дка, -кі *ж*; 2. *стр.* мурава́нне, -ння *ср* (*стен, труб и т. п.*); кла́дка, -кі *ж* (*кирпича*); муро́ўка, -кі *ж* (*результат укладки*); **к. сво́да** мурава́нне скляпе́ння; **кирпи́чная к.** цагля́ная муро́ўка; 3. (*яиц*) нясе́нне, -ння *ср,* но́ска, -кі *ж*; 4. (*холощение*) паклада́нне, -ння *ср.*
КЛАДОВА́Я *сущ.* кладо́ўка, -кі *ж*; (*чулан*) камо́ра, -ры *ж.*
КЛАДО́В||КА, ~У́ШКА *разг.* кладо́ўка, -кі *ж*; **~ЩИ́К** кладаўшчы́к, -ка́ *м.*
КЛАДОИСКА́ТЕЛЬ *уст.* шука́льнік ска́рбаў.
КЛА́ДЧИК 1. кла́дчык, -ка *м*; 2. (*строительный рабочий*) му́ляр, -ра *м.*
КЛАДЬ 1. (*груз*) пакла́жа, -жы *ж*; 2. (*скирда*) *обл.* сці́рта, -ты *ж.*
КЛА́ЙПЕДА *г.* Кла́йпеда, -ды *ж.*
КЛА́ЙПЕДСКИЙ клайпе́дскі.
КЛА́К||А *театр.* кла́ка, -кі *ж, мн. нет*; **~ЁР** *театр.* клакёр, -ра *м.*
КЛА́КСОН *тех.* кла́ксан, -на *м.*
КЛАН *ист.* клан, *род.* кла́на *м.*
КЛА́НЯТЬСЯ *несов.* кла́няцца; (*приветствовать — ещё*) віта́цца, здаро́ўкацца (*з кім*).
КЛА́ПАН *в разн. знач.* кла́пан, -на *м*; **~НЫЙ** кла́панны.
КЛАРНЕ́Т *муз.* кларне́т, -та *м*; **~И́СТ** кларнеты́ст, -та *м.*
КЛАСС I *в разн. знач.* клас, *род.* кла́са *м*; **учени́к деся́того ~а** ву́чань дзеся́тага кла́са; **к. млекопита́ющих** клас млекако́рмячых; **к. игры́** клас гульні́.
КЛАСС II клас, *род.* кла́са *м*; **рабо́чий к.** рабо́чы клас; **антагонисти́ческие кла́ссы** антаганісты́чныя кла́сы; **дру́жественные кла́ссы рабо́чих и колхо́зного крестья́нства** дружалю́бныя кла́сы рабо́чых і калга́снага сяля́нства.
КЛА́ССИК кла́сік, -ка *м.*
КЛАССИФИ||КА́ТОР класіфіка́тар, -ра *м*; **~КАЦИО́ННЫЙ** класіфікацы́йны; **~КА́ЦИЯ** класіфіка́цыя, -цыі *ж*; **~ЦИРОВАТЬ** *сов. и несов.* класіфікава́ць; **~ЦИРОВАТЬСЯ** *страд.* класіфікава́цца.
КЛАССИЦИ́ЗМ класіцы́зм, -ма *м.*
КЛАССИ́ЧЕСК||И *нареч.* класі́чна; **~ИЙ** *в разн. знач.* класі́чны.
КЛА́ССНЫЙ кла́сны.
КЛА́ССОВО *нареч.* кла́сава.
КЛА́ССОВО-ВРАЖДЕ́БНЫЙ кла́сава-варо́жы.
КЛА́ССОВОСТЬ кла́савасць, -ці *ж.*
КЛА́ССОВО-ЧУ́ЖДЫЙ кла́сава-чужы́.
КЛА́ССОВ||ЫЙ кла́савы; **~ая борьба́** кла́савая барацьба́; **~ые интере́сы** кла́савыя інтарэ́сы.
КЛАСТИ́ЧЕСКИЙ *горн.* класты́чны.

КЛАСТЬ *несов.* 1. кла́сці; 2. (*прибавлять, подмешивать*) кі́даць; (*всыпать*) сы́паць; (*вливать*) ліць; **к. са́хар в чай** кі́даць (сы́паць) цу́кар у чай; **к. ма́сло в ка́шу** кі́даць (ліць) ма́сла ў ка́шу; 3. (*делать каменную кладку*) мурава́ць (*стену, здание и т. п.*); кла́сці (*кирпич*); 4. (*яйца*) не́сці (*о птицах*); кла́сці (*о насекомых*); 5. (*холостить животных*) *обл.* паклада́ць; ◇ **к. в осно́ву** кла́сці ў асно́ву; **к. на му́зыку** кла́сці на му́зыку; **к. отпеча́ток** кла́сці адбі́так; **ему́ па́льца в рот не клади́** *разг.* яму́ па́льца ў рот не кладзі́; **к. покло́ны** *уст.* адбіва́ць пакло́ны; **~СЯ** *страд.* 1. кла́сціся; 2. кі́дацца; сы́пацца; лі́цца; 3. мурава́цца; кла́сціся; 4. не́сціся; кла́сціся; *см.* **класть 1—4.**
КЛА́УЗУЛА *юр., лит.* кла́ўзула, -лы *ж.*
КЛЁВ *рыбол.*: **хоро́ший, плохо́й клёв** (ры́ба) до́бра, дрэ́нна бярэ́цца; **клёв щу́ки начина́ется весно́й** шчупа́к пачына́е бра́цца вясно́й.
КЛЕВА́ТЬ *несов.* 1. (*о птицах*) дзяўбці́; 2. (*о рыбе*) то́ркаць; (*ловиться*) бра́цца; **смотри́, клюёт** глядзі́, то́ркае; **сего́дня ры́ба не клюёт** сяго́ння ры́ба не бярэ́цца (не то́ркае); **лещ клюёт на червя́** лешч бярэ́цца на чарвяка́; 3. *перен. разг.* клява́ць; ◇ **к. но́сом** *разг.* клява́ць но́сам.
КЛЕ́ВЕР *м бот.* канюшы́на, -ны *ж*; **~И́ЩЕ** *с.-х.* канюшы́нішча, -шча *ср*; **~НЫЙ** канюшы́нны, канюшы́навы.
КЛЕВЕРОТЁР||КА *с.-х.* канюшынацёрка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** канюшынацёрачны.
КЛЕВЕТ||А́ *ж* паклёп, -пу *м*; **~А́ТЬ** *несов.* паклёпнічаць, узво́дзіць паклёп; **~НИ́К** паклёпнік, -ка *м*; **~НИ́ЦА** паклёпніца, -цы *ж*; **~НИ́ЧЕСКИЙ** паклёпніцкі.
КЛЕВРЕ́Т клеўрэ́т, -та *м.*
КЛЕЕВА́Р клеява́р, -ра *м*; **~Е́НИЕ** клеяварэ́нне, -ння *ср*; **~НЫЙ** клеява́рны; **~НЯ** клеява́рня, -ні *ж.*
КЛЕЕВО́Й клеявы́.
КЛЕ́ЕНИЕ кле́янне, -ння *ср.*
КЛЕЁНКА цыра́та, -ты *ж.*
КЛЕ́ЕННЫЙ кле́ены.
КЛЕЁН||ОЧНЫЙ цыра́тны; **~ЧАТЫЙ** цырато́вы.
КЛЕЁН||ЫЙ праклéены; **~ая бума́га** праклéеная папе́ра.
КЛЕ́ЙЛЬ||НЫЙ клéяльны; **~ЩИК** клéйшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** клéйшчыца, -цы *ж.*
КЛЕ́ИТЬ *несов.* клéіць; **~СЯ** *несов. прям., перен.* клéіцца; **разгово́р не клéится** размо́ва не клéіцца; **что-то не клéится** нéшта не клéіцца.
КЛЕЙ клей, *род.* клéю *м*; **~КА** *ж* клéенне, -ння *ср,* клéйка, -кі *ж*; **~КИЙ** клéйкі; (*липкий*) лі́пкі; **~КОВИ́НА** *биол.* клейкаві́на, -ны *ж*; **~КОСТЬ** клéйкасць, -ці *ж*; лі́пкасць, -ці *ж.*
КЛЕЙ||МЕ́НИЕ *прям., перен.* клеймава́нне, -ння *ср*; **~МЁННЫЙ, ~МЁНЫЙ** клеймава́ны; **~МИ́ТЬ** *несов.* клеймава́ць; **~ми́ть позо́ром** га́ньбіць; **~МЛЕ́НИЕ** клеймава́нне, -ння *ср*; **~МО́** кляймо́, -ма́ *ср*; **~МО́ВЩИК** клеймаўшчы́к, -ка́ *м*; **~МО́ВЩИЦА** клеймаўшчы́ца, -цы *ж.*
КЛЕ́ЙСТЕР клéйстар, -ру *м.*
КЛЁКОТ клёкат, -ту *м.*
КЛЕКОТА́||НИЕ *ср* клеката́нне, -ння *ср,* клёкат, -ту *м*; **~ТЬ** *несов.* клеката́ць.
КЛЕ́ММА *тех.* клéма, -мы *ж.*
КЛЁН клён, *род.* клёна *и* (*о древесине*) клёну *м.*
КЛЕНО́ВЫЙ кляно́вы.
КЛЕПА́||ЛО *тех.* кляпа́ла, -ла *ср*; **~ЛЬНЫЙ** кляпа́льны; **~ЛЬЩИК** кляпа́льшчык, -ка *м*; **~НИЕ** кляпа́нне, -ння *ср.*
КЛЁПАН||НЫЙ *тех.* кляпа́ны; **~ЫЙ** кляпа́ны.
КЛЕПА́ТЬ I *несов. тех.* кляпа́ць.
КЛЕПА́ТЬ II *несов.* (*клеветать*) *разг.* паклёпнічаць.
КЛЁПКА I *ж тех.* клёпка, -кі *ж*; кляпа́нне, -ння *ср* (*только действие*).
КЛЁПКА II (*бочарная*) клёпка, -кі *ж.*

КЛЁПОЧН|ИК клёпачнік, -ка *м*; **~ЫЙ** клёпачны.
КЛЕПТОМА́Н *мед.* клептама́н, -на *м*; **~ИЯ** клептама́нія, -ніі *ж*; **~КА** клептама́нка, -кі *ж*.
КЛЕРИКА́Л клерыка́л, -ла *м*; **~И́ЗМ** клерыкалі́зм, -ма *м*; **~ЬНЫЙ** клерыка́льны.
КЛЕРК клерк, *род.* кле́рка *м*.
КЛЕР|ОВА́ЛЬНЫЙ *тех.* клерава́льны; **~ОВА́ТЬ** *несов.* клерава́ць; **~О́ВКА** *ж* клерава́нне, -ння *ср*, клеро́ўка, -кі *ж*.
КЛЕРС *тех.* клерс, *род.* кле́рса *м*.
КЛЁСТ *зоол.* крыжадзю́б, -ба *м*.
КЛЕ́Т|КА *в разн. знач* кле́тка, -кі *ж*; **грудна́я к.** *анат.* грудна́я кле́тка; **ткань в ~ку** ткані́на ў кле́тку; **бума́га** ■ **~ку** папе́ра ў кле́тку; **~КОВИ́НА** *бот.* клеткаві́на, -ны *ж*, клятча́тка, -кі *ж*; **~ОЧКА** *в разн. знач.* кле́тачка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** кле́тачны.
КЛЕТУ́ШКА (*маленькая комната*) *разг.* камо́рка, -кі *ж*.
КЛЕТЧА́ТКА *бот., хим.* клятча́тка, -кі *ж*.
КЛЕ́ТЧАТЫЙ клятча́сты.
КЛЕТЬ 1. клець, *род.* кле́ці *ж*; **2.** (*подъёмная*) *горн.* клець, *род.* кле́ці *ж*, кле́тка, -кі *ж*.
КЛЕЦК *г.* Клецк, *род.* Кле́цка *м*.
КЛЁЦКА *кул.* клёцка, -кі *ж*.
КЛЕ́ЦКИЙ РАЙО́Н Кле́цкі раён.
КЛЁШ 1. *сущ.* клёш, *род.* клёшу *м*; **2.** *прил.* клёш *нескл.*
КЛЕШНЕ|ВИ́ДНЫЙ, ~ОБРА́ЗНЫЙ клюшнепадо́бны.
КЛЕШ|НИ́ (*остов хомута*) кле́шчы, -шчэ́й, *ед.* кляшчына́, -ны́ *ж*; **~НЯ́** клю́шня, -ні *ж*.
КЛЕЩ *зоол.* клешч, *род.* кляшча́ *м*.
КЛЕЩЕВИ́Н|А *бот.* клешчаві́на, -ны *ж*; **~НЫЙ** клешчаві́нны.
КЛЕЩ|И́ 1. абцугі́, -го́ў *ед. нет*; (*кузнечные*) кле́шчы, -шчэ́й *ед. нет*; **2.** *воен.* кле́шчы, -шчэ́й *ед. нет*; ◇ **~а́ми не вы́тащить** *перен.* абцуга́мі не вы́цягнуць.
КЛИВА́Ж *геол.* кліва́ж, -жу *м*.
КЛИ́ВЕР *мор.* клі́вер, -ра *м*.
КЛИЕ́НТ клие́нт, -та *м*; **~КА** кліе́нтка, -кі *ж*; **~СКИЙ** кліе́нцкі; **~У́РА** *собир.* кліенту́ра, -ры *ж*; **~У́РНЫЙ** кліенту́рны.
КЛИ́ЗМА *мед.* клі́зма, -мы *ж*.
КЛИК клік, *род.* клі́ку *м*, по́кліч, -чу *м*.
КЛИ́КА *пренебр.* хе́ўра, -ры *ж*; зграя, *род.* згра́і *ж* (*свора*).
КЛИ́К|АТЬ *несов. разг.* **1.** (*кричать*) крыча́ць; **2.** (*громко звать*) клі́каць, гука́ць; **3.** (*называть*) клі́каць, зваць; **~НУТЬ** *сов. и однокр.* клі́кнуць; гукну́ць.
КЛИКУ́Ш|А *в разн. знач.* кліку́ша, -шы *м и ж*; **~ЕСКИЙ** кліку́нскі; **~ЕСТВО** кліку́нства, -ва *ср*; **~ЕСТВОВАТЬ** *несов.* кліку́шнічаць.
КЛИМАКТЕ́Р|ИЙ *мед.* клімактэ́рый, -рыя *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** клімактэры́чны.
КЛИ́МАТ клі́мат, -ту *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** кліматы́чны; **~и́ческие усло́вия** кліматы́чныя ўмо́вы.
КЛИМАТО́Л|ОГ кліматóлаг, -га *м*; **~ОГИ́ЧЕСКИЙ** кліматалагі́чны; **~О́ГИЯ** кліматало́гія, -гіі *ж*.
КЛИ́МОВИЧИ *г.* Клі́мавічы, -віч.
КЛИ́МОВИЧСКИЙ РАЙО́Н Клі́мавіцкі раён.
КЛИН 1. клін, *род.* клі́на *м*; **2.** *с.-х.* пале́так, -тка *м*; **яровой клин** яравы́ пале́так; **ози́мый клин** азі́мы пале́так; ◇ **клин кли́ном вышиба́ть** *разг.* клін клі́нам выганя́ць; **свет не кли́ном сошёлся** *разг.* свет не клі́нам сышо́ўся; **куда́ ни кинь — всё клин** *погов.* куды́ ні кінь — усю́ды клін.
КЛИ́Н|ИКА клі́ніка, -кі *ж*; **~ИЦИ́СТ** *мед.* клініцы́ст, -та *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** клінí́чны.
КЛИ́НКЕР *тех.* клі́нкер, -ру *м*; **~ОВА́ТЬ** *несов. тех.* клінкерава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** клінкерава́цца.
КЛИНКО́ВЫЙ клінко́вы.
КЛИНОВИ́ДНЫЙ клінападо́бны.
КЛИНО́К клінóк, -нка́ *м*.
КЛИНОЛИ́СТНЫЙ *бот.* клінaлі́сты.
КЛИНООБРА́ЗН|ЫЙ клінападо́бны; **~ые пи́сьмена́** *лингв.* клінападо́бныя пісьмёны.
КЛИНОПИ́СНЫЙ клінапі́сны.
КЛИ́НОПИСЬ *ж* клі́напіс, -са *м*.
КЛИНО́ЧНЫЙ клінко́вы.
КЛИ́НУШЕК *уменьш.* клінóк, -нка́ *м*, клінóчак, -чка *м*.
КЛИНЦОВА́ТЬ *несов. стр.* клінцава́ць.
КЛИ́НЫШЕК *см.* **кли́нушек.**
КЛИ́ПЕР *мор.* клі́пер, -ра *м*.
КЛИР *церк.* клір, *род.* клі́ру *м*; **~ИК** *церк.* клі́рык, -ка *м*.
КЛИ́РИНГ *фин.* клі́рынг, -гу *м*.
КЛИ́РОС *церк.* клі́рас, -са *м*.
КЛИСТИ́Р *мед.* клісты́р, -ра *м*; **~НЫЙ** клісты́рны.
КЛИ́ТОР *анат.* клі́тар, -ра *м*.
КЛИ́ЦА *эл.* клі́ца, -цы *ж*.
КЛИЧ кліч, *род.* клі́чу *м*, ва́клік, -ку *м*.
КЛИ́ЧЕВ *пос.* Клі́чаў, -чава *м*.
КЛИ́ЧЕВСКИЙ РАЙО́Н Клі́чаўскі раён.
КЛИ́ЧКА мяну́шка, -кі *ж*.
КЛИШЕ́ *тип.* клішэ́ *нескл., ср.*
КЛОА́|КА *прям., перен.* клаа́ка, -кі *ж*; **~КА́ЛЬНЫЙ** клаака́льны; **~ЧНЫЙ** клаа́чны.
КЛОБУ́К клабу́к, -ка́ *м*.
КЛОЗЕ́Т клазе́т, -та *м*; **~НЫЙ** клазе́тны.
КЛОК *м* **1.** жмут, *род.* жму́та *м*; па́сма, -мы *ж* (*волос*); касмы́к, -ка́ *м* (*шерсти и т. п.*); **2.** (*лоскут, обрывок*) шмато́к, -тка́ *м*; (*кусок*) кава́лак, -лка *м*; (*комок*) камя́к, -ка́ *м*; **изорва́ть в кло́чья** падра́ць на шматкі́ (на кава́лкі).
КЛО́КОТ *разг.* клёкат, -ту *м*; **~А́НИЕ** *прям., перен.* клеката́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов.* клеката́ць.
КЛОН *спорт., воен.* нахі́л, -лу *м*.
КЛОНДА́Й■ *г.* Кланда́йк, -ка *м*.
КЛОН|И́ТЬ *несов.* **1.** (*что-л.*) хілі́ць; (*наклонять*) нахіля́ць; (*склонять*) схіля́ць; (*нагибать*) нагіна́ць; (*гнуть*) гнуць; (*сгибать*) згіна́ць; **ло́дку ~и́ло на́бок** ло́дку хілі́ла (нахіля́ла, схіля́ла) на бок; **ве́тер ~и́л дере́вья** ве́цер нагіна́ў (гнуў, згіна́ў) дрэ́вы; **2.** *перен.* (*к чему*) хілі́ць (*на што, да чаго, куды*); гнуць (*да чаго, куды*); (*влечь*) цягну́ць (*на што, да чаго, куды*); (*вести*) ве́сці (*да чаго, куды*); (*направлять*) кірава́ць, скіро́ўваць (*на што, да чаго, куды*); вярну́ць (*да чаго, куды*); **кло́нит ко сну** хі́ліць на сон; **я сра́зу догада́лся, к чему́ он кло́нит** я адразу здагада́ўся, куды́ ён гне (хі́ліць); **он кло́нит разгово́р к тому́, что́бы...** ён вядзе́ (кіру́е, скіро́ўвае, ве́рне) размо́ву да таго́, каб...; **~И́ТЬСЯ 1.** хілі́цца; (*наклоняться*) нахіля́цца; (*склоняться*) схіля́цца; (*нагибаться*) нагіна́цца; (*гнуться*) гну́цца; (*сгибаться*) згіна́цца; **2.** *перен.* хілі́цца; (*склоняться*) схіля́цца; (*приближаться*) набліжа́цца; (*идти*) ісці́; (*подходить*) падыхо́дзіць; (*иметь какое-л. направление*) быць скірава́ным, скіро́ўвацца; **день ~и́лся к ве́черу** дзень хілі́ўся (схіля́ўся) к ве́чару; **де́ло ~и́лось к развя́зке** спра́ва набліжа́лася (ішла́, падыхо́дзіла) да развя́зкі; **его́ предложе́ние ~и́лось к тому́, что́бы...** яго́ прапано́ва была́ скірава́на да таго́, каб...
КЛОП клоп, *род.* клапа́ *м*; **~О́ВЫЙ** клапі́ны.
КЛОПО́ВНИК I *разг.* клапо́ўнік, -ка *м*.
КЛОПО́ВНИК II *бот.* клапо́ўнік, -ку *м*.
КЛОПО́ВЫЙ клапі́ны.
КЛОПОМО́Р клапамо́р, *род.* клапамо́ра *и* (*о порошке*) клапамо́ру *м*.
КЛО́ПФЕР *тех.* кло́пфер, -ра *м*.
КЛОП-ЧЕРЕПА́ШКА *зоол.* клоп-чарапа́шка, *род.* клапа́-чарапа́шкі *м*.
КЛО́УН кло́ун, *род.* кло́уна *м*; **~А́ДА** клауна́да, -ды *ж*; **~СКИЙ** кло́унскі.

КЛОХТА́||НИЕ квахта́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* квахта́ць.
КЛОЧ||КОВА́ТЫЙ касмыкава́ты; (*сбитый*) камякава́ты; **~кова́тые облака́** касмыкава́тыя во́блакі; **~кова́тая шерсть** камякава́тая (касмыкава́тая) шэрсць; **~О́К** жмуто́к, -тка́ *м*; шмато́к, -тка́ *м*; (*кусок*) кава́лачак, -чка *м*; ла́пік, -ка *м*; (*комок*) камячо́к, -чка́ *м*; **~о́к се́на** жмуто́к (шмато́к) се́на; **~о́к бума́ги** кава́лачак папе́ры; **~о́к земли́** ла́пік (кава́лачак) зямлі́; *см.* **клок.**
КЛО́ЧЬЯ *мн. см.* **клок.**
КЛУБ I клуб, *род.* клу́ба *м*; **рабо́чий клуб** рабо́чы клуб.
КЛУБ II клуб, *род.* клу́ба *м*; **~ы́ ды́ма** клубы́ ды́му.
КЛУБЕНЁК *бот.* клубе́ньчык, -ка *м*.
КЛУ́БЕНЬ *бот.* клу́бень, -бня *м*; **~КО́ВЫЙ** клубе́ньчыкавы.
КЛУБИ́ТЬ *несов.* клубі́ць; **~СЯ** клубі́цца.
КЛУБНЕВО́Й *бот.* клу́бневы.
КЛУБНЕПЛО́Д *бот., с.-х.* клубенепло́д, -да *м*.
КЛУБНИ́||КА клубні́ка, -кі *ж*, труска́лкі, -лак, *ед.* труска́лка, -кі *ж*; **~ЧНИК** клубні́чнік, -ку *м*; **~ЧНЫЙ** клубні́чны.
КЛУ́БНЫЙ клу́бны.
КЛУБО́||К клубо́к, -бка́ *м*; **~ЧЕК** *уменьш.* клубо́чак, -чка *м*.
КЛУ́МБА клу́мба, -бы *ж*.
КЛУПП *тех.* клуп, *род.* клу́па *м*.
КЛЫК ікол, *род.* ікла́ *м*, *мн.* і́клы, -лаў; **~А́СТЫЙ** ікла́сты.
КЛЮВ *м* дзю́ба, -бы *ж*.
КЛЮЗ *мор.* клюз, *род.* клю́за *м*.
КЛЮКА́ ку́льба, -бы *ж*, кульба́ка, -кі *ж*, крыву́ля, -лі *ж*.
КЛЮ́КВ||А *бот.* жураві́ны, -він, *ед.* жураві́на, -ны *ж*; ◇ **разве́систая к.** *шутл.* ≅ на вярбе́ гру́шы; вярбо́выя гру́шы; **~ЕННЫЙ** жураві́нны, жураві́навы.
КЛЮ́КНУТЬ *сов. простореч.* дзю́бнуць.
КЛЮ́НУТЬ *однокр.* **1.** (*о птицах*) дзеўбану́ць; **2.** (*о рыбе*) то́ркнуць; узя́цца; **3.** *перен.* клю́нуць; *см.* **клева́ть.**
КЛЮЧ I ключ, *род.* ключа́ *м*; **францу́зский ключ** *тех.* францу́зскі ключ; **ключ ме́стности** *воен.* ключ мясцо́васці.
КЛЮЧ II *муз.* ключ, *род.* ключа́ *м*.
КЛЮЧ III *м* (*источник*) крыні́ца, -цы *ж*; ◇ **бить ~о́м** *перен.* біць крыні́цай; **кипе́ть ~о́м** кіпе́ць, вірава́ць.
КЛЮЧА́РЬ *церк.* ключа́р, -ра́ *м*.
КЛЮЧЕВО́Й I ключавы́.
КЛЮЧЕВО́Й II *муз.* ключавы́.
КЛЮЧЕВО́Й III (*родниковый*) крыні́чны.
КЛЮЧЕВСКА́Я СО́ПКА (*вулкан*) Ключаўска́я со́пка.
КЛЮ́ЧИК *уменьш.* клю́чык, -ка *м*.
КЛЮЧИ́||ЦА *анат.* ключы́ца, -цы *ж*; **~ЧНЫЙ** ключы́чны.
КЛЮ́ЧН||ИК *уст.* клю́чнік, -ка *м*; **~ИЦА** клю́чніца, -цы *ж*.
КЛЮ́ШКА клю́шка, -кі *ж*.
КЛЯ́КСА кля́кса, -сы *ж*.
КЛЯ́НЧ||ЕНЬЕ *разг.* кле́нчанне, -ння *ср*, ка́ньканне, -ння *ср*; **~ИТЬ** *несов. разг.* кле́нчыць, ка́ньдаць.
КЛЯП *м* **1.** за́ткала, -ла *ср*, за́тычка, -кі *ж*; **2.** (*для стягивания верёвки*) цыру́балка, -кі *ж*.
КЛЯСТЬ *несов.* клясці́; (*проклинать*) праклінаць; **~СЯ** клясці́ся; (*клятвенно уверять*) прысяга́цца, прысяга́ць.
КЛЯ́ТВ||А *ж* кля́тва, -вы *ж*; (*клятвенное уверение*) прысяга́нне, -ння *ср*; (*присяга*) прыся́га, -гі *ж*; **дать ~у** даць прыся́гу; **~ЕННО** *нареч.* кля́твенна; **~ЕННЫЙ** кля́твенны.
КЛЯТВОПРЕСТ||УПЛЕ́НИЕ клятвапаруша́нне, -ння *ср*; **~У́ПНИК** клятвапаруша́льнік, -ка *м*; **~У́ПНИЦА** клятвапаруша́льніца, -цы *ж*; **~У́ПНЫЙ** клятвапаруша́льны.
КЛЯ́УЗ||А *ж разг.* паклёп, -пу *м*; (*каверза*) ка́верза, -зы *ж*; **~НИК** паклёпнік, -ка *м*; ка́верзнік, -ка *м*; **~НИЦА** паклёпніца, -цы *ж*; ка́верзніца, -цы *ж*; **~НИЧАТЬ** *несов.* паклёпнічаць; ка́верзнічаць; **~НИЧЕСКИЙ** паклёпніцкі; ка́верзніцкі; **~НИЧЕСТВО** паклёпніцтва, -ва *ср*; ка́верзніцтва, -ва *ср*; **~НЫЙ** паклёпны; ка́верзны.
КЛЯ́ЧА кля́ча, -чы *ж*.
КНЕХТ *мор.* кнехт, *род.* кне́хта *м*.
КНИ́||ГА кні́га, -гі *ж*; **счётная к.** рахунко́вая кні́га; **к. за́писей а́ктов гражда́нского состоя́ния** кні́га за́пісаў а́ктаў грамадзя́нскага ста́ну; **жа́лобная к.** кні́га ска́ргаў; **конто́рские ~ги** канто́рскія кні́гі; ◇ **и ~ги в ру́ки** *разг.* і кні́гі ў ру́кі.
КНИГОВЕ́Д кнігазна́вец, -на́ўца *м*; **~ЕНИЕ** кнігазна́ўства, -ва *ср*.
КНИГОЕ́Д **1.** *зоол.* кнігае́д, -да *м*; **2.** *перен.* кнігае́д, -да *м*.
КНИГОИЗДА́ТЕЛЬ кнігавыда́вец, -да́ўца *м*; **~СКИЙ** кнігавыдаве́цкі; **~СТВО** кнігавыдаве́цтва, -ва *ср*.
КНИГОЛЮ́Б *уст.* кнігалю́б, -ба *м*.
КНИГОНО́Ш||А кнігано́ша, -шы *м* и *ж*; **~ЕСКИЙ** кнігано́шавы.
КНИГОПЕЧА́Т||АНИЕ *ср* друка́рства, -ва *ср*, кнігадру́к, -ку *м*; **~НИК** *уст.* друка́р, -ра́ *м*; **~НЫЙ** друка́рскі; **~НЯ** *уст.* друка́рня, -ні *ж*.
КНИГОПРОДА́В||ЕЦ кнігапрада́вец, -да́ўца *м*; **~ЧЕСКИЙ** кнігапрадаве́цкі.
КНИГОТОРГО́В||ЕЦ кнігагандлёвец, -лёўца *м*; **~ЛЯ** *ж* кнігага́ндаль, -длю *м*; кні́жны га́ндаль; **~ЫЙ** кнігагандлёвы.
КНИГОТОРГУ́ЮЩ||ИЙ кнігагандлёвы; **~ая сеть** кнігагандлёвая се́тка.
КНИГОХРАНИ́ЛИЩЕ кнігасхо́вішча, -шча *ср*.
КНИ́ЖКА I кні́жка, -кі *ж*; **сберега́тельная к.** ашча́дная кні́жка; **трудова́я к.** працо́ўная кні́жка.
КНИ́ЖКА II *анат.* кні́жка, -кі *ж*.
КНИ́Ж||НИК кні́жнік, -ка *м*; **~НО** *нареч.* кні́жна; **~НОСТЬ** кні́жнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** кні́жны; **~ный магази́н** кніга́рня, кні́жны магазі́н; **~ная пала́та** кні́жная пала́та; **~ная по́лка** кні́жная палі́ца; **~ный стиль** кні́жны стыль.
КНИ́ЗУ *нареч.* (*вниз*) уні́з, яні́з.
КНИ́КСЕН *уст.* кні́ксен, -ну *м*.
КНИ́ЦА *мор.* кні́ца, -цы *ж*.
КНО́П||КА **1.** кно́пка, -кі *ж*; **2.** (*застёжка*) за́пінка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** **1.** кно́пкавы; **2.** за́пінкавы.
КНУТ *м* **1.** пу́га, -гі *ж*; **2.** *перен.* бізу́н, -на́ *м*; **~ОВИ́ЩЕ** пугаўё, -гаўя́ *ср*.
КНЯ́||ГИНЯ княгі́ня, -ні *ж*; **~ЖЕ́НИЕ** **1.** (*действие*) княжанне, -ння *ср*; **2.** (*княжество*) кня́ства, -ва *ср*.
КНЯ́||ЖЕСКИЙ кня́жацкі; **~ЖЕСТВО** кня́ства, -ва *ср*; **~ЖИТЬ** *несов. ист.* кня́жыць; **~ЖИЧ** *ист.* кня́жыч, -ча *м*; **~ЖНА́** князёўна, -ны *ж*; **~ЗЁК** *пренебр.* князёк, -зька́ *м*; **~ЗЬ** князь, *род.* кня́зя *м*.
КО *предлог см.* **к.**
КОАГУЛ||И́РОВАТЬ *несов. хим.* каагулі́раваць; **~Я́ЦИЯ** *хим.* каагуля́цыя, -цыі *ж*.
КОАЛИЦИО́ННЫЙ кааліцы́йны.
КОАЛИ́ЦИЯ кааліцыя, -цыі *ж*.
КО́БАЛЬТ ко́бальт, -ту *м*; **~ОВЫЙ** ко́бальтавы.
КОБЕ́ЛЬ саба́ка, -кі *м*; (*о самце волка, лисицы и т. п.*) саме́ц, -мца́ *м*; воўк, *род.* во́ўка *м*; ліс, *род.* лі́са *м* (*и т. п.*).
КОБЕ́НИТЬСЯ *несов. простореч.* наравіцца, нату́рыцца, упіра́цца.
КО́БЗА *муз.* ко́бза, -зы *ж*.
КОБЗА́||РСКИЙ кабза́рскі; **~РСТВО** кабза́рства, -ва *ср*; **~РЬ** кабза́р, -ра́ *м*.
КО́БРА *зоол.* ко́бра, -ры *ж*.
КО́БРИН *г.* Ко́брын, -на *м*.
КО́БРИНСКИЙ РАЙО́Н Ко́брынскі раён.
КОБУРА́ кабура́, -ры́ *ж*.
КО́БЧИК *зоол.* шулёнак, -нка *м*.

КОБЫЛ||А кабыла, -лы *ж*; **~ИЙ** кабылі́ны; **~ИЦА** кабыла, -лы *ж*; (*молодая — до трёх лет*) жаробка, -кі *ж*; **~КА** *ж* **1.** *уменьш.* кабылка, -кі *ж*; **2.** *зоол.* кабылка, -кі *ж*; **3.** (*подставка под струны*) *муз.* кабылка, -кі *ж*.

КОВАНЫЙ каваны, куты.

КОВАР||НО *нареч.* каварна, падступна; **~НОСТЬ** каварнасць, -ці *ж*, падступнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** каварны, падступны; **~СТВО** каварства, -ва *ср*, падступніцтва, -ва *ср*.

КОВАТЬ *несов.* каваць; ◊ **куй железо, пока горячо** *посл.* куй жалеза, пакуль гарачае; **~СЯ** *страд.* кавацца.

КОВБОЙ каўбой, -боя *м*; **~КА** (*шляпа, рубашка*) каўбойка, -кі *ж*.

КОВЁР дыван, -на *м*, кілім, -ма *м*; **к.-самолёт** *фольк.* кілім-самалёт.

КОВЕРКА||НИЕ *разг.* **1.** (*уродование*) псаванне, -ння *ср*; **2.** (*извращение*) скажэнне, -ння *ср*, перакручванне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* **1.** (*уродовать*) псаваць; **2.** (*извращать*) скажаць, перакручваць; **~ТЬСЯ** *страд.* **1.** псавацца; **2.** скажацца, перакручвацца.

КОВЕРКОТ *текст.* каверкот, -ту *м*; **~ОВЫЙ** каверкотавы.

КОВК||А *ж* каванне, -ння *ср*; **~ИЙ** коўкі; **~ОСТЬ** коўкасць, -ці *ж*.

КОВОЧНЫЙ *тех.* кавальны, ковачны.

КОВРИ||ГА *ж* бохан, -на *м*, буханка, -кі *ж*, булка, -кі *ж*; **~ЖКА** *ж* (*пряник*) *разг.* пернік, -ка *м*, мядовік, -ка *м*; ◊ **ни за какие ~жки** *разг.* ні за якія пернікі; ні за што на свеце.

КОВР||ИК *уменьш. разг.* дыванок, -нка *м*, кілімок, -мка *м*; **~ОВЩИК** дываншчык, -ка *м*, кілімшчык, -ка *м*; **~ОВЩИЦА** дываншчыца, -цы *ж*, кілімшчыца, -цы *ж*; **~ОВЫЙ** дывановы, кілімавы; **~овое производство** дывановая вытворчасць.

КОВЧЕГ каўчэг, -га *м*.

КОВШ **1.** (*для питья*) коўш, *род.* каўша *м*, карэц, -рца *м*; **2.** (*мукомольный*) кош, *род.* каша *м*; **3.** *в др. знач.* коўш, *род.* каўша *м*.

КОВЫ *мн. уст.* падкопы, -паў; падступніцтва, -ва *ср*; пастка, -кі *ж*; **строить к.** рыхтаваць падкопы (пастку).

КОВЫЛЬ *бот.* кавыль, -лю *м*.

КОВЫЛЬНЫЙ кавыльны.

КОВЫЛЯ||НИЕ чыкільганне, -ння *ср*; кульганне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. разг.* чыкільгаць; (*хромать*) кульгаць.

КОВЫРНУТЬ *однокр.* калупнуць; **~СЯ** *разг.* бразнуцца, кульнуцца.

КОВЫРЯ||НИЕ калупанне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* калупаць; **~ТЬСЯ** *несов.* калупацца.

КОГДА **1.** *нареч.* калі; **к. же вы придёте?** калі-ж вы прыдзеце?; **2.** *союз* калі; **приду, к. освобожусь** прыду, калі вызвалюся.

КОГДА-ЛИБО, КОГДА-НИБУДЬ *нареч.* калі-небудзь.

КОГДА-ТО *нареч.* **1.** (*в прошлом*) калісьці, каліс, некалі; **2.** (*в будущем*) калі, калі там, калі гэта; **когда-то он ещё приедет** калі (калі там) ён яшчэ прыедзе.

КОГЕРЕНТНОСТЬ *физ.* кагерэнтнасць, -ці *ж*.

КОГЕРЕР *радио* кагерэр, -ра *м*.

КОГО *мест. род., вин. см.* **кто; не у кого, не от кого** няма ў каго, няма ад каго; **ни у кого, ни от кого** ні ў кога, ні ад кога.

КОГОРТА кагорта, -ты *ж*.

КОГОТОК *уменьш.* кіпцюрок, -рка *м*, кіпцік, -ка *м*; ◊ **к. увяз — всей птичке пропасть** *посл.* кіпцюрок ушчаміўся — усёй птушцы прападаць.

КОГ||ОТЬ кіпцюр, -ра *м*, кіпець, -пця *м*; **показать ~ти** *перен.* паказаць кіпцюры (кіпці); **попасть в ~ти к кому-либо** *перен.* трапіць у кіпцюры (кіпці) каго-небудзь; **~ТИСТЫЙ** кіпцюрасты, кіпцясты, з вострымі кіпцюрамі; **~ТИТЬ** *несов. обл.* драць (кіпцюрамі).

КОД *спец.* код, *род.* кода *м*.

КОДА *муз., лит.* кода, -ды *ж*.

КОДАК кодак, -ка *м*.

КОДЕИН *фарм.* кадэін, -ну *м*.

КОДЕКС кодэкс, -са *м*.

КОДИФИ||КАТОР кадыфікатар, -ра *м*; **~КАЦИОННЫЙ** кадыфікацыйны; **~КАЦИЯ** кадыфікацыя, -цыі *ж*; **~ЦИРОВАТЬ** *сов. и несов.* кадыфікаваць; **~ЦИРОВАТЬСЯ** *страд.* кадыфікавацца.

КОЕ-ГДЕ *нареч.* сям-там, дзе-ні-дзе.

КОЕ-КАК *нареч.* сяк-так, так-сяк; (*как-нибудь*) як-небудзь, неяк, нейк; (*небрежно*) абы-як.

КОЕ-КАКОЙ *мест.* сякі-такі; такі-сякі; *см.* **какой.**

КОЕ-КОГДА *нареч.* сяды-тады, калі-ні-калі; (*иногда*) часам, часамі, падчас, іншы раз.

КОЕ-КТО *мест.* сёй-той, *род.* сяго-таго *м*; *см.* **кто.**

КОЕ-КУДА *нареч.* сюды-туды.

КОЕ-ЧЕЙ *мест.* сяго-таго, некаторых; **в рукописи есть кое-чьи замечания** у рукапісе ёсць заўвагі некаторых.

КОЕЧНЫЙ ложкавы; **к. больной** ложкавы хворы.

КОЕ-ЧТО *мест.* сёе-тое, *род.* сяго-таго, што-небудзь, *род.* чаго-небудзь; *см.* **что.**

КО||ЖА скура, -ры *ж*; ◊ **к. да кости** *разг.* скура ды косці; **из ~жи вон лезть** *разг.* са скуры вылузвацца; **мороз по ~же** мароз па скуры.

КОЖАН I *зоол.* кажан, -на *м*.

КОЖАН II *м* (*кожаная куртка*) *разг.* скуранка, -кі *ж*.

КОЖАН||КА скуранка, -кі *ж*; **~ЫЙ** скураны.

КОЖЕВЕННИК гарбар, -ра *м*.

КОЖЕВЕННО-ОБУВНОЙ гарбарна-абутковы.

КОЖЕВ||ЕННЫЙ гарбарны; (*об изделиях*) скураны; **к. завод** гарбарны завод, гарбарня; **к. товар** скураны тавар; **~НИК** гарбар, -ра *м*; **~НЯ** *уст.* гарбарня, -ні *ж*.

КОЖЕДЁР *спец.* скуралуп, -па *м*.

КОЖЕЕД *зоол.* скураед, -да *м*.

КОЖЕМЯКА *ж уст.* кажамяка, -кі *м*.

КОЖИМИТ скураміт, -ту *м*.

КОЖИСТ||ОСТЬ *спец.* скурастасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** скурасты.

КОЖИЦА скурка, -кі *ж*.

КОЖНИК *мед. разг.* скуранік, -ка *м*; урач (лекар, доктар) па скурных хваробах.

КОЖНО-ВЕНЕРИЧЕСКИЙ *мед.* скурна-венерычны.

КОЖНЫЙ скурны.

КОЖУРА лупіна, -ны *ж*.

КОЖУХ *в разн. знач.* кажух, -ха *м*.

КОЗ||А каза, -зы *ж*; ◊ **драть, как сидорову козу** *разг.* лупіць, як сідараву казу; **~ЁЛ** казёл, -зла *м*; ◊ **~ёл отпущения** *разг.* казёл адпушчэння.

КОЗЕЛЕЦ *бот.* чорнакорань, -ню *м*.

КОЗЕЛКИ *спец.* козелцы, -цаў *ед. нет.*

КОЗЕРОГ *зоол.* казярог, -га *м*.

КОЗЕРОГ *астр.* Казярог, -га *м*.

КОЗЕТКА *разг. уст.* казетка, -кі *ж*.

КОЗ||ИЙ казіны; **~ЛЁНОК** *м* казляня, -няці *ср*; **~ЛИНЫЙ** казліны.

КОЗЛОБОРОДНИК *бот.* казлабарод, -ду *м*.

КОЗЛОВЩИНА *с.* Казлоўшчына, -ны *ж*.

КОЗЛОВЩИНСКИЙ РАЙОН Казлоўшчынскі раён.

КОЗЛОВЫЙ казловы.

КОЗЛОНОГИЙ казланогі.

КОЗЛЫ *в разн. знач.* козлы, -лаў *ед. нет.*

КОЗЛЯК *бот.* масляк, -ка *м*.

КОЗНИ падкопы, -паў *ед. нет*; ◊ **строить к.** строіць падкопы.

КОЗОВОД *с.-х.* казавод, -да *м*, козагаловец, -доўца *м*; **~СТВО** *ср* козагадоўля, -лі *ж*; **~ЧЕСКИЙ** козагадоўчы.

КОЗОДÓЙ *зоол.* лялÿк, -кá *м.*
КОЗУ́ЛЯ *зоол.* казу́ля, -лі *ж.*
КОЗЫРЁК брыль, *род.* брыля́ *м*; казырóк, -ркá *м*; **сдéлать под к.** *воен.* узя́ць пад казырóк.
КОЗЫРНÓЙ казырны́.
КОЗЫРНУ́ТЬ I *однокр. карт., перен.* казырну́ць.
КОЗЫРНУ́ТЬ II *однокр.* (*сделать под козырёк*) *разг.* казырну́ць.
КОЗЫ́РНЫЙ казы́рны.
КÓЗЫР||Ь кóзыр, -ра *м*; **откры́ть свой ~и** паказáць свае́ казыры́; **~Я́НИЕ** казырáнне, -ння *ср.*
КОЗЫРЯ́ТЬ I *несов. карт., перен.* казырáць.
КОЗЫРЯ́ТЬ II *несов.* (*брать под козырёк*) *разг.* казырáць.
КОЗЯ́ВКА *разг.* казя́ўка, -кі *ж.*
КОЙ *мест. уст.* які́; ◇ **в кóи вéки** *разг.* нарэ́шце; (*очень редко*) гады́-ў-рады́.
КОЙ-ГДЕ́ *см.* **кóе-где.**
КÓЙКА *ж* лóжак, -жка *м.*
КОЙ-КА́К *см.* **кóе-кáк.**
КОЙ-КАКÓЙ *см.* **кóе-какóй.**
КОЙ-КОГДА́ *см.* **кóе-когдá.**
КОЙ-КТÓ *см.* **кóе-ктó.**
КОЙÓТ *зоол.* каёт, -та *м.*
КОЙ-ЧЕ́Й *см.* **кóе-чéй.**
КОЙ-ЧТÓ *см.* **кóе-чтó.**
КОК I *мор.* кок, *род.* кóка *м.*
КОК II (*вихор*) кок, *род.* кóка *м.*
КÓКА *бот.* кóка, -кі *ж.*
КОКАИ́Н *фарм.* какаі́н, -ну *м*; **~И́СТ** какаіні́ст, -та *м*; **~И́СТКА** какаіні́стка, -кі *ж*; **~ОВЫЙ** какаі́навы.
КОКА́РДА кукáрда, -ды *ж*, цэ́шка, -кі *ж.*
КÓКАТЬ *несов. простореч.* цю́каць.
КОКÉТ||КА *в разн. знач.* какéтка, -кі *ж*; **~ЛИВО** *нареч.* какéтліва; **~ЛИВОСТЬ** какéтлівасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ** какéтлівы; **~НИЧАНИЕ** какéтнічанне, -ння *ср*; **~НИЧАТЬ** *несов.* какéтнічаць; **~СТВО** какéцтва, -ва *ср.*
КОКИ́ЛЬ *тех.* каі́ль, -ля́ *м*; **литьё в к.** ліццё ў кakі́ль.
КОКК *бакт.* кок, *род.* кóка *м.*
КОКЛЮ́Ш *мед.* кóклюш, -шу *м.*
КОКЛЮ́Ш||ЕЧНЫЙ каклю́шкавы; **~КА** каклю́шка, -кі *ж.*
КОКЛЮ́ШНЫЙ *мед.* кóклюшны.
КÓКНУТЬ *сов. простореч.* цю́кнуць; **~СЯ** цю́кнуцца.
КÓКОН кóкан, -на *м*; **~НЫЙ** кóканавы.
КОКОНОМОТА́НИЕ *текст.* каканаматáнне, -ння *ср.*
КОКÓС какóс, *род.* какóса *и* (*о древесине*) какóсу *м*; **~ОВЫЙ** какóсавы.
КОКÓТКА какóтка, -кі *ж.*
КОКÓШНИК какóшнік, -ка *м.*
КОКС кокс, *род.* кóксу *м.*
КОК-САГЫ́З *бот.* кок-сагы́з, -зу *м.*
КОКСИ́Т *мед.* каксі́т, -ту *м.*
КОКСОБЕНЗ||ÓЛ *хим.* коксабензóл, -ла *м*; **~ÓЛЬНЫЙ** коксабензóльны.
КОКС||ОВА́ЛЬНЫЙ *тех.* каксавáльны; **~ОВА́НИЕ** каксавáнне, -ння *ср*; **~ÓВАННЫЙ** каксавáны; **~ОВА́ТЬ** *несов.* каксавáць; **~ОВА́ТЬСЯ** каксавáцца.
КÓКСОВЫЙ *тех.* кóксавы.
КÓКСО-ГА́ЗОВЫЙ *тех.* кóкса-гáзавы.
КОКСОХИ́М||ИК коксахі́мік, -ка *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** коксахі́мічны.
КОКСУ́ЕМОСТЬ каксавáльнасць, -ці *ж.*
КОКТÉЙЛЬ коктэ́йль, -лю *м.*
КОКУ́ШНИК *м бот.* ядру́шка, -кі *ж.*
КОКЧЕТА́В *г.* Какчэтáў, -тáва *м.*
КОКЧЕТА́ВСКАЯ ÓБЛАСТЬ Какчэтáўская вóбласць.
КОЛ кол, *род.* калá *м*; ◇ **ни колá, ни дворá** *погов.* ні калá, ні дварá; **хоть кол на головé теши́** *разг.* хоць кол на галавé чашы́.

КÓЛА *пос.* Кóла, -лы *ж.*
КÓЛБА *хим.* кóлба, -бы *ж.*
КОЛБАСА́ каўбасá, -сы́ *ж*, кілбасá, -сы́ *ж.*
КОЛБА́СН||АЯ *сущ.* каўбáсная, -най *ж*, кілбáсная, -най *ж*; **~ИК** каўбáснік, -ка *м*, кілбáснік, -ка *м*; **~ИЦА** каўбáсніца, -цы *ж*, кілбáсніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** каўбáсны, кілбáсны.
КОЛГУ́ЕВ МЫС Калгу́еў мыс.
КОЛГУ́ЕВ ÓСТРОВ Калгу́еў вóстраў.
КОЛДОВ||А́НИЕ *ср этн.* вядзьмáранне, -ння *ср*, чаравáнне, -ння *ср*; (*ворожба*) варажбá, -бы́ *ж*; **~А́ТЬ** *несов.* вядзьмáрыць, чаравáць; варажы́ць; **~СКÓЙ** 1. *этн.* вядзьмáрскі, чараўні́цкі; 2. *перен.* чараўні́чы; (*волшебный*) чарадзéйны; **~СТВÓ** 1. вядзьмáрства, -ва *ср*, чáры, -раў *ед. нет*, чараўні́цтва, -ва *ср*; 2. *перен.* (*чары*) чáры, -раў *ед. нет.*
КОЛДОГОВÓР (коллекти́вный договóр) колдагавóр, -ру *м* (калекты́ўны дагавóр); **~НЫЙ** колдагавóрны.
КОЛДУ́Н *этн., перен.* вядзьмáр, -рá *м*; (*волшебник*) чарадзéй, -дзéя *м*, чараўні́к, -кá *м.*
КОЛДУНЫ́ *кул.* калдуны́, -нóў.
КОЛДУ́НЬЯ *этн., перен.* вядзьмáрка, -кі *ж*; (*волшебница*) чараўні́ца, -цы *ж.*
КОЛЕБА́||НИЕ 1. хістáнне, -ння *ср*; **~ния мáятника** хістáнні мáятніка; **~ния температу́ры** хістáнні тэмперату́ры; **~ния земли́** хістáнні зямлі́; **к. ку́рса** (*на бирже*) хістáнне ку́рсу; 2. (*нерешительность, неустойчивость*) хістáнне, -ння *ср*, вагáнне, -ння *ср*; без **~ния** без вагáння, не вагáючыся, без хістáння; **~ТЕЛЬНЫЙ** хістáльны; **~тельное движéние** хістáльны рух; **~тельный кóнтур** *радио* хістáльны кóнтур; **~ТЬ** *несов.* 1. хістáць; (*колыхать*) калыхáць, гайдáць; 2. *перен.* хістáць; (*подрывать*) падрывáць; **~ТЬСЯ** 1. хістáцца; (*колыхаться*) калыхáцца, гайдáцца; **колéблется земля́** хістáецца зямля́; **струнá колéблется** струнá хістáецца; **водá колéблется** вадá хістáецца; **цéны колéблются** цэ́ны хістáюцца; 2. (*испытывать сомнение*) хістáцца, вагáцца; **~ться в вы́боре** хістáцца (вагáцца) у вы́бары; **не колéблясь** не вагáючыся, не хістáючыся.
КОЛÉБЛЮЩИЙСЯ *прил.* хі́сткі; (*изменчивый*) змéнлівы.
КОЛÉНКА *ж разг.* калéна, -на *ср.*
КОЛЕНКÓР каленкóр, -ру *м*; **~ОВЫЙ** каленкóравы.
КОЛ||ÉННЫЙ *анат.* калéнны; **~éнная чáшка** калéнная рэ́пка; **~éнное сочленéние** калéннае сучлянéнне.
КОЛ||ÉНО *в разн. знач.* калéна, -на *ср*; **постáвить на ~éни** *прям., перен.* паставі́ць на калéні; **к. реки́** калéна ракі́; **к. трубы́** калéна трубы́.
КОЛЕНОПРЕКЛОН||ÉНИЕ клéнчанне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** клéнчаны; **стоя́ть ~ённым** стая́ць уклéнчыўшы.
КОЛÉНЦЕ *простореч.* калéнца, -ца *ср*; ◇ **вы́кинуть к.** *разг.* урэ́заць штýчку.
КОЛÉНЧАТЫЙ *тех., бот.* калéнчаты; **к. вал** *тех.* калéнчаты вал.
КÓЛЕР I (*цвет*) кóлер, -ру *м.*
КÓЛЕР II *вет.* кóлер, -ру *м.*
КОЛЁСИКО кóлца, -ца *ср.*
КОЛЕСИ́ТЬ *несов. разг.* калясі́ць; (*ездить*) раз'язджáць, éздзіць; **к. по свéту** калясі́ць (éздзіць) па свéце.
КОЛÉСНИК каляснí́к, -кá *м.*
КОЛЕСНИ́ЦА *ист., уст.* калясні́ца, -цы *ж.*
КОЛЁСН||ЫЙ кóлавы; **~ая мазь** каламáзь; (*отработанная*) каланíца, -цы *ж.*
КОЛЕСÓ кóла, -ла *ср, мн.* кóлы, -лаў; **маховóе к.** махавíк, махавóе кóла; ◇ **к. истóрии** кóла гістóрыі; **вставля́ть пáлки в колёса** устаўля́ць пáлкі ў кóлы.
КОЛЕСОВА́||НИЕ *ист.* калесавáнне, -ння *ср*; **~ТЬ** *сов. и несов.* калесавáць.
КОЛЕСОВИ́ДНЫЙ колападóбны.

КОЛЕСОПРОКА́Т||НЫЙ *тех.* колапрака́тны; **~ЧИК** колапрака́тчык, -ка *м.*

КОЛЕ́Т *уст.* кале́т, -та *м.*

КОЛЕ́ЧКО *ср уменьш.* **1.** ко́лца, -ца *ср;* **2.** (*перстенёк*) пярсцёнак, -нка *м.*

КОЛЕ||Я́ 1. каляі́на, -ны *ж;* **2.** *ж.-д.* каляя́, -ляі́ *ж;* ◇ **войти́ в ~ю** увайсці́ ў каляі́ну; **вы́бить из ~й** вы́біць з каляі́ны.

КОЛИ́ *союз обл.* калі́.

КОЛИ́БРИ *зоол.* калі́бры *нескл., м.*

КОЛИЗЕ́Й Калізе́й, -зе́я *м.*

КО́ЛИКИ *мн. мед.* калацце́, -цця́ *ср;* ◇ **смея́ться до ко́лик** *разг.* смяя́цца аж захо́дзіцца; смяя́цца да ко́лік.

КОЛИРО́В||АННЫЙ *с.-х.* каліравáны; (*привитый*) прышчэ́плены; **~А́ТЬ** *несов.* каліраваць; (*прививать*) прышчэ́пліваць; **~КА** *ж* калірава́нне, -ння *ср,* каліро́ўка, -кі *ж;* прышчэ́пліванне, -ння *ср,* прышчэ́пка, -кі *ж.*

КОЛИ́Т *мед.* калі́т, -ту *м.*

КОЛИ́ЧЕ||СТВЕННО *нареч.* ко́лькасна; **~СТВЕННЫЙ** ко́лькасны; **~ственные числи́тельные** *грам.* ко́лькасныя лічэ́бнікі; **~СТВО** *ср* ко́лькасць, -ці *ж;* **перехо́д ~ства в ка́чество** перахо́д ко́лькасці ў я́касць.

КО́ЛКА *ж* ко́лка, -кі *ж,* кало́нне, -ння *ср.*

КО́ЛКИЙ I (*легко раскалывающийся*) ко́лкі.

КО́ЛКИЙ II **1.** (*колючий*) калю́чы; **2.** *перен.* калю́чы; (*язвительный*) з'е́длівы.

КО́ЛК||О *нареч.* калю́ча; (*язвительно*) з'е́дліва; **~ОСТЬ 1.** (*качество, свойство*) калю́часць, -ці *ж;* (*язвительность*) з'е́длівасць, -ці *ж;* **2.** (*колкое слово*) з'е́длівае сло́ва; **говори́ть ~ости** гавары́ць з'е́длівыя сло́вы.

КОЛЛАБОРАЦИОНИ́СТ *полит.* калабарацыяні́ст, -та *м.*

КОЛЛА́ПС *мед.* кала́пс, -су *м.*

КОЛЛЕ́ГА кале́га, -гі *м.*

КОЛЛЕГИА́ЛЬН||О *нареч.* калегія́льна; **~ОСТЬ** калегія́льнасць, -ці *ж;* **~ЫЙ** калегія́льны.

КОЛЛЕ́ГИЯ кале́гія, -гіі *ж.*

КОЛЛЕ́ДЖ кале́дж, -джа *м.*

КОЛЛЕ́ЖСКИЙ *ист.* кале́жскі.

КОЛЛЕКТИ́В калекты́ў, -ты́ву *м;* **~ИЗА́ЦИЯ** калектывіза́цыя, -цыі *ж;* **сплошна́я ~иза́ция** суцэ́льная калектывіза́цыя; **~ИЗИ́РОВАННЫЙ** *прич., прил.* калектывізава́ны; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* калектывізава́ць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** *страд.* калектывізава́цца; **~И́ЗМ** калектыві́зм, -му *м;* **~И́СТ** калектыві́ст, -та *м;* **~ИСТИ́ЧЕСКИЙ** калектывісты́чны; **~И́СТСКИЙ** калектыві́сцкі; **~НО** *нареч.* калекты́ўна; **~НОСТЬ** калекты́ўнасць, -ці *ж;* **~НЫЙ** калекты́ўны; **~ное хозя́йство** калекты́ўная гаспада́рка.

КОЛЛЕ́КТОР I *тех.* кале́ктар, -ра *м.*

КОЛЛЕ́КТОР II кале́ктар, -ра *м;* **библиоте́чный к.** бібліятэ́чны кале́ктар.

КОЛЛЕКЦИОН||Е́Р калекцыяне́р, -ра *м;* **~Е́РСКИЙ** калекцыяне́рскі; **~Е́РСТВО** калекцыяне́рства, -ва *ср;* **~И́РОВАТЬ** *несов.* калекцыяні́раваць; **~И́РОВАТЬСЯ** *страд.* калекцыяні́равацца.

КОЛЛЕ́КЦИЯ кале́кцыя, -цыі *ж.*

КОЛЛИ́ЗИЯ калі́зія, -зіі *ж.*

КОЛЛИМА́ЦИЯ *астр.* каліма́цыя, -цыі *ж.*

КОЛЛО́ДИЙ *хим.* кало́дый, -дыя *м.*

КОЛЛОИ́Д *хим.* кало́ід, -да *м;* **~А́ЛЬНОСТЬ** калаіда́льнасць, -ці *ж;* **~А́ЛЬНЫЙ** калаіда́льны; **~НЫЙ** кало́ідны.

КОЛЛО́КВИУМ *школ.* кале́квіум, -ма *м.*

КОЛОБО́К *обл.* піражо́к, -жка́ *м.*

КОЛОБРО́ДИТЬ *несов. разг.* **1.** (*возиться*) валтузі́цца; **2.** (*проказничать*) дурэ́ць, блазнава́ць; **3.** (*бесцельно блуждать*) блука́ць.

КОЛОВОРО́Т *м* **1.** *тех.* ко́рба, -бы *ж;* (*бурав*) свярдзел, -рдла *м;* **2.** (*водоворот*) вір, *род.* ві́ру *м;* **3.** (*круговорот*) кругаваро́т, -ту *м;* (*вихрь*) ві́хар, -хру *м.*

КОЛОВРА́ТКА *зоол.* калаўро́тка, -кі *ж.*

КОЛОВРА́||ТНЫЙ *тех.* колаваро́тны; **~тное движе́ние** колаваро́тны рух; **~ЩЕ́НИЕ** *ср уст.* кругаваро́т, -ту *м.*

КОЛО́ДА I *ж* **1.** кало́да, -ды *ж;* **2.** (*водопойная*) карыта, -та *ср;* (*жёлоб*) жо́лаб, -ба *м;* **3.** (*притолока над дверью*) вяршні́к, -ка́ *м.*

КОЛО́ДА II *карт.* кало́да, -ды *ж.*

КОЛО́||ДЕЗНЫЙ кало́дзежны; **~ДЕЗЬ** *уст.* кало́дзеж, -жа *м;* **~ДЕЦ** *м* **1.** (*для добывания воды*) сту́дня, -ні *ж,* кало́дзеж, -жа *м;* **артезиа́нский ~дец** артэзія́нскі кало́дзеж; **2.** *в др. знач.* кало́дзеж, -жа *м;* **ми́нный ~дец** мі́нны кало́дзеж; ◇ **не плюй в ~дец — пригоди́тся воды́ напи́ться** *посл.* не плюй у кало́дзеж — давядзе́цца вады́ напі́цца.

КОЛО́Д||КА *ж* **1.** кало́дка, -кі *ж;* **2.** *сапож.* капы́л, -ла́ *м;* **~НИК** *уст.* кало́днік, -ка *м.*

КОЛО́ДОЧНЫЙ 1. кало́дкавы; **2.** *сапож.* капыло́вы.

КОЛО́К кало́к, -лка́ *м.*

КО́ЛОК||ОЛ 1. звон, *род.* звана́ *м;* **2.** (*колпак*) *тех.* каўпа́к, -ка́ *м;* **водола́зный к.** вадала́зны каўпа́к; **к. возду́шного насо́са** каўпа́к паве́транай по́мпы; **~О́ЛЬНЫЙ** зво́навы; **~о́льный звон** звон; **~О́ЛЬНЯ** звані́ца, -цы *ж;* ◇ **смотре́ть со свое́й ~о́льни** *перен.* глядзе́ць са свае́й звані́цы; **~О́ЛЬЧИК 1.** звано́к, -нка́ *м,* звано́чак, -чка *м;* **2.** *бот.* звано́чак, -чка *м;* **~О́ЛЬЧИКОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* звано́чкавыя, -вых.

КОЛОМА́ЗЬ *спец.* калама́зь, -зі *ж;* (*отработанная*) калані́ца, -цы *ж.*

КОЛОМБИ́НА *лит., театр.* каламбі́на, -ны *ж.*

КОЛО́МБО *г.* Кало́мбо *нескл., м.*

КОЛО́МЕНСК||ИЙ: ~ая верста́ *разг.* кало́менская вярста́.

КОЛОМЯ́НК||А *текст.* каламя́нка, -кі *ж;* **~ОВЫЙ** каламя́нкавы.

КОЛО́Н *ист.* кало́н, -на *м;* **~А́Т** *ист.* калана́т, -ту *м.*

КОЛОНИА́ЛЬНИК *с.-х.* каланія́льнік, -ка *м.*

КОЛОНИА́ЛЬНЫЙ (*к* **коло́ния** I) каланія́льны.

КОЛОНИЗ||А́ТОР каланіза́тар, -ра *м;* **~А́ТОРСКИЙ** каланіза́тарскі; **~А́ТОРСТВО** каланіза́тарства, -ва *ср;* **~АЦИО́ННЫЙ** каланізацы́йны; **~А́ЦИЯ** каланіза́цыя, -цыі *ж;* **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов.* каланізава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** *страд.* каланізава́цца.

КОЛОНИ́СТ калані́ст, -та *м;* **~КА** калані́стка, -кі *ж;* **~СКИЙ** калані́сцкі.

КОЛО́Н||ИЯ I кало́нія, -ніі *ж;* **~ии А́нглии в А́фрике** кало́ніі А́нгліі ў А́фрыцы.

КОЛО́НИЯ II (*поселение*) кало́нія, -ніі *ж.*

КОЛО́НКА I кало́нка, -кі *ж;* **га́зовая к.** га́завая кало́нка.

КОЛО́НКА II (*столбец*) кало́нка, -кі *ж.*

КОЛОНКО́ВЫЙ *зоол.* каланко́вы.

КОЛО́ННА I кало́на, -ны *ж.*

КОЛО́ННА II *арх.* кало́на, -ны *ж.*

КОЛОННА́ДА *арх.* калана́да, -ды *ж.*

КОЛОННОВОЖА́ТЫЙ *воен. ист.* калонаважа́ты.

КОЛО́ННЫЙ кало́нны.

КОЛОНО́К *зоол.* калано́к, -нка́ *м.*

КОЛОН||ТИ́ТУЛ *тип.* калонты́тул, -ла *м;* **~ЦИ́ФРА** калонлі́чба, -бы *ж.*

КОЛОРА́ДО Калара́до *нескл., м.*

КОЛОРА́ДСКИЙ калара́дскі; **к. жук** калара́дскі жук.

КОЛОРАТУ́Р||А *муз.* каларату́ра, -ры *ж;* **~НЫЙ** каларату́рны.

КОЛОРИЗА́ЦИЯ каларыза́цыя, -цыі *ж.*

КОЛОРИ́М||ЕТР *физ.* калары́метр, -ра *м;* **~Е́ТРИЯ** калары́метрыя, -рыі *ж.*

КОЛОРИ́СТ *жив., текст.* каларыст, -та *м.*
КОЛОРИ́Т *прям., перен.* каларыт, -ту *м*; **~НО** *нареч.* каларытна; **~НЫЙ** каларытны.
КО́ЛОС ко́лас, -са *м, мн.* каласы, -со́ў, *собир.* кало́ссе, -сся *ср*; **~И́СТОСТЬ** каласі́стасць, -ці *ж*; **~И́СТЫЙ** каласі́сты; **~И́ТЬСЯ** *несов.* каласава́ць, выплыва́ць; **~КО́ВЫЙ** каласко́вы.
КОЛОСНИ́К каласні́к, -ка́ *м*; **~О́ВЫЙ** каласніко́вы.
КОЛОС||ОВО́Й каласавы́; **~ОВЫ́Е** *мн. сущ. бот.* каласавы́я, -вы́х; **~О́К** *уменьш.* каласо́к, -ска́ *м*; **души́стый ~о́к** *бот.* паху́чая то́мка.
КРОХОБО́Р *пренебр.* крыхабо́р, -ра *м,* дро́безнік, -ка *м;* **~СКИЙ** крыхабо́рскі, дро́безніцкі; **~СТВО** *пренебр.* крыхабо́рства, -ва *ср,* дро́безніцтва, -ва *ср;* **~СТВОВАТЬ** *несов. пренебр.* крыхабо́рнічаць, быць дро́бязным.
КРО́ХОТНЫЙ *разг.* малю́сенькі, мале́нькі.
КРО́ШЕВО *ср* **1.** кры́шанка, -кі *ж;* **2.** *перен.* мешаніна, -ны *ж.*
КРОШЁНЫЙ кры́шаны.
КРО́ШЕЧНЫЙ малю́сенькі, мале́нькі.
КРОШИ́||ЛЬЩИК крышы́льшчык, -ка *м;* **~ЛЬЩИЦА** крышы́льшчыца, -цы *ж;* **~ТЬ** *несов. в разн. знач.* крышы́ць; **~ТЬСЯ** крышы́цца.
КРО́Ш||КА I 1. (*хлеба и т. п.*) кро́шка, -кі *ж;* **2.** *перен.* крыха́, -хі́ *ж;* **не́т ни ~ки** няма́ ні крыхі́; **3.** *спец.* кро́шка, -кі *ж;* **мра́морная к.** мармуро́вая кро́шка; **4.** (*малютка*) малы́шка, -кі *ж,* мала́я, -ло́й *ж;* **иди́ сюда́, моя́ к.** ідзі сюды́, мая́ малы́шка; ◇ **поду́майте хоть ~ку** *разг.* паду́майце хоць тро́шкі (кры́шку); **ни ~ки** (*ничуть*) *разг.* ані.
КРО́Ш||КА II *ж* (*действие*) крышэ́нне, -ння *ср;* (*вид чего-л. накрошенного*) кры́шыва, -ва *ср;* **таба́к ме́лкой ~ки** тыту́нь дро́бнага кры́шыва.
КРУГ *м* **1.** *в разн. знач.* круг, *род.* кру́га *м;* **поля́рный круг** *геогр.* паля́рны круг; **спаса́тельный круг** выратава́льны круг; **бегово́й круг** бегавы́ круг; **квадрату́ра кру́га** квадрату́ра кру́га; **2.** (*замкнутая цепь*) ко́ла, -ла *ср;* (*в перен. знач. — обычно*) круг, *род.* кру́га *м;* **ста́ньте кру́гом** ста́ньце ў ко́ла; **заколдо́ванный круг** зачарава́нае ко́ла; **круг разви́тия** круг развіцця́; **круг обя́занностей** круг (ко́ла) абавя́зкаў; **3.** (*группа людей*) ко́ла, -ла *ср;* (*среда*) асяро́ддзе, -ддзя *ср;* (*кружок*) гурто́к, -тка́ *м;* **парти́йные, полити́ческие, литерату́рные круги́** парты́йныя, паліты́чныя, літарату́рныя ко́лы; **в кругу́ друзе́й** у асяро́ддзі сябро́ў; ■ **те́сном кругу́** у це́сным гуртку́; ◇ **поро́чный круг** *филос.* зага́нны круг; **на круг** (*в среднем*) *разг.* на круг.
КРУ́Г||ЛЕНЬКИЙ *разг.* кру́гленькі; **~ЛЕ́ТЬ** *несов.* круглець; **~ЛИ́ТЬ** *несов.* кругліць; **~ЛИ́ТЬСЯ** кругліцца; **~ЛО** *нареч.* кру́гла.
КРУГЛОБО́КИЙ круглабо́кі.
КРУГЛОГОЛО́ВКА *зоол.* круглагало́ўка, -кі *ж.*
КРУГЛОГОЛО́ВЫЙ круглагало́вы.
КРУГЛОГУ́БЦЫ *тех.* круглагу́бцы, -цаў *ед. нет.*
КРУ́ГЛОЕ *с.* Кру́глае, -лага *ср.*
КРУГЛОЛИ́ЦЫЙ круглатва́ры.
КРУГЛОРО́ТЫЕ *мн. сущ. зоол.* кругларо́тыя, -тых.
КРУГЛОСУ́ТОЧНЫЙ кругласу́тачны.
КРУ́ГЛЫЙ *в разн. знач.* кру́глы; ◇ **к. год** кру́глы (цэ́лы) год; **к. сирота́** кру́глы сірата́; **к. дура́к** кру́глы ду́рань.
КРУГЛЯ́К *стр.* кругля́к, -ка́ *м.*
КРУГЛЯ́НСКИЙ РАЙО́Н Круглянскі раён.
КРУГОВ||О́Й кругавы́; ◇ **~а́я пору́ка** кругава́я пару́ка.
КРУГОВОРО́Т кругаваро́т, -ту *м.*
КРУГОВРАЩ||А́ТЕЛЬНЫЙ кругавярча́льны; **~Е́НИЕ** кругавярчэ́нне, -ння *ср.*
КРУГОЗО́Р 1. (*горизонт*) далягля́д, -ду *м;* **2.** (*широта познаний*) кругагля́д, -ду *м.*
КРУ́ГОМ *нареч.:* **голова́ идёт к.** *разг.* галава́ кру́ціцца.
КРУГО́М I *нареч.* **1.** круго́м; **поверну́ться к.** павярну́цца круго́м; **круго́м!** *воен.* круго́м!; **2.** (*вокруг*) наво́кал, навако́л, вако́л, нау́кола, нау́ко́л; **3.** (*целиком*) круго́м; ца́лкам; (*совершенно*) зусі́м, спрэс; **к. винова́т** круго́м (ца́лкам) віна́ваты.
КРУГО́М II *предлог с род.* наво́кал, навако́л, вако́л, нау́кола, нау́ко́л (*каго-чаго*); **к. о́зера расту́т дере́вья** наво́кал (навако́л, вако́л, нау́кола, нау́ко́л) во́зера расту́ць дрэ́вы.
КРУГООБОРО́Т кругаабаро́т, -ту *м.*
КРУГООБРА́ЗНЫЙ кругападо́бны.
КРУГОСВЕ́ТНЫЙ кругасве́тны.
КРУЖА́ЛО *ср* **1.** *стр., тех.* кружа́ла, -ла *ср;* **2.** *ист.* шыно́к, -нка́ *м.*
КРУЖЕВН||И́ЦА кару́начніца, -цы *ж;* **~О́Й** кару́нкавы.
КРУ́ЖЕВ||О *ср* кару́нкі, -нак *ед. нет;* **~ЦЕ** *ср* кару́начкі, -чак *ед. нет.*
КРУЖЕ́НИЕ 1. (*верчение*) кручэ́нне, -ння *ср;* **2.** (*описывание кругов, блуждание*) кружэ́нне, -ння *ср;* *см.* **кружи́ть.**
КРУ́ЖЕЧНЫЙ 1. ко́навачны; ку́бкавы; ку́фельны; **2.** скарбо́начны; **к. сбор** скарбо́начны збор; *см.* **кру́жка.**
КРУЖИ́ТЬ *несов.* **1.** (*вертеть кого-что*) круці́ць; **танцо́р ло́вко кружи́л балери́ну** танцо́р спры́тна круці́ў балеры́ну; **мете́ль кру́жит** завіру́ха кру́ціць; **2.** (*описывать круги, блуждать*) кружы́ць; **в не́бе кружи́л ко́ршун** у не́бе кружы́ў каршу́н; **мы до́лго кружи́ли, пока́ добра́ли́сь до дере́вни** мы до́ўга кружы́лі, паку́ль дабра́ліся да вёскі; ◇ **к. го́лову кому́-либо** круці́ць галаву́ каму́-не́будзь; **~СЯ 1.** круці́цца; **2.** кружы́цца; ◇ **голова́ кру́жится** галава́ кру́ціцца.
КРУ́ЖКА *ж* **1.** ко́наўка, -кі *ж;* (*глиняная*) ку́бак, -бка *м;* (*пивная*) ку́фаль, -фля *м;* **2.** (*для сбора денег*) скарбо́нка, -кі *ж.*
КРУЖКО́В||ЕЦ гуртко́вец, -ко́ўца *м;* **~ЩИНА** *неодобр.* гуртка́ўшчы́на, -ны *ж;* **~ЫЙ** гуртка́вы.
КРУЖКО́М *нареч.* кружко́м, кружка́.
КРУ́ЖН||ЫЙ кружны́; вако́льны; **~ым путём** а) кружно́й даро́гай; б) *перен.* вако́льным шля́хам.
КРУЖО́К 1. кружо́к, -жка́ *м;* **2.** (*группа, организация*) гурто́к, -тка́ *м;* **к. по изуче́нию маркси́зма-ленини́зма** гурто́к па вывучэ́нню маркс́ізма-ленінізма; ◇ **остри́чься ■ к.** астры́гчыся ў кружо́к.
КРУМЦИ́РКУЛЬ *тех.* крумцы́ркуль, -ля *м.*
КРУП I *мед.* круп, *род.* кру́пу *м.*
КРУП II (*лошади*) крыж, *род.* кры́жа *м.*
КРУП||А́ *ж прям., перен.* кру́пы, *род.* круп *ед. нет;* **~И́НКА** *ж* **1.** крупі́нка, -кі *ж,* драбі́нка, -кі *ж,* драбо́к, -бка́ *м;* **~и́нка со́ли** драбо́к со́лі; **2.** *перен.* крупі́нка, -кі *ж;* **ни ~и́нки пра́вды** ні крупі́нкі пра́ўды; **~И́ЦА** *см.* **крупи́нка.**
КРУПИ́ЧАТЫЙ 1. (*о муке, хлебе*) пытлява́ны, крупча́ткавы; **2.** (*о мёде*) крупча́сты.
КРУ́ПКА *ж* **1.** *уменьш.-ласк.* кру́пкі, -пак *ед. нет;* **2.** (*первый, крупный размол зерна*) кру́пка, -кі *ж;* **3.** *бот.* кру́пка, -кі *ж.*
КРУ́ПКИ *пос.* Кру́пкі, -пак.
КРУПНЕ́||ЙШИЙ найбуйне́йшы; **~ТЬ** *несов.* буйне́ць, большаць.
КРУ́ПНО *нареч.* **1.** бу́йна; **к. писа́ть** бу́йна пі́саць; **2.** (*сильно*) мо́цна; (*резко*) рэ́зка, во́стра; **к. повздо́рить** мо́цна пасвары́цца; **к. поговори́ть** рэ́зка (во́стра) пагавары́ць.
КРУПНОЗЕРНИ́СТЫЙ буйназярні́сты.
КРУПНОКАЛИ́БЕРНЫЙ буйнакалі́берны.
КРУПНОПЛО́ДНЫЙ *с.-х.* буйнапло́дны.
КРУПНОСЕРИ́ЙНЫЙ буйнасеры́йны.
КРУ́ПН||ЫЙ 1. буйны́; **к. рога́тый скот** буйна́я рага́тая жывёла; **~ые де́ньги** буйны́я гро́шы; **2.** (*большого масштаба*) буйны́; **~ая промы́шленность** буйна́я прамысло́васць; **3.** (*значительный*) буйны́; **к. учёный** буйны́

вучо́ны; 4. (*важный, значительный*) вялі́кі; зна́чны; мо́цны; во́стры; ~**ые собы́тия** вялі́кія (зна́чныя) падзе́і; ~**ая ссо́ра** мо́цная сва́рка; ◇ **к. разгово́р** рэ́зкая (во́страя) размо́ва.

КРУПОВЕ́ЙКА *с.-х.* крупаве́йка, -кі *ж.*

КРУПОДЁРКА *с.-х.* крупадзёрка, -кі *ж.*

КРУПО́ЗН||ЫЙ *мед.* крупо́зны; ~**ое воспале́ние лёгких** крупо́знае запале́нне лёгкіх.

КРУПОРУ́ШКА *с.-х.* крупадзёрка, -кі *ж.*

КРУ́ПСКИЙ РАЙО́Н Кру́пскі раён.

КРУПЧА́ТКА крупча́тка, -кі *ж.*

КРУПЧА́ТЫЙ крупча́сты.

КРУПЬЕ́ круп'е́ *нескл., м.*

КРУПЯНИ́К *кул.* крупя́нік, -ку *м.*

КРУПЯНО́Й *с.-х.* крупяны́.

КРУТИЗНА́ 1. кру́тасць, -ці *ж,* стро́мкасць, -ці *ж;* 2. (*круча*) кру́ча, -чы *ж,* стро́ма, -мы *ж.*

КРУТИ́||ЛЬНЫЙ круці́льны; ~**льные весы́** круці́льная вага́; ~**ТЬ** *несов. в разн. знач.* круці́ць; ◇ ~**ть ру́ки** круці́ць ру́кі; ~**ТЬСЯ** круці́цца.

КРУ́ТКА *ж спец.* кручэ́нне, -ння *ср.*

КРУ́ТО I *нареч.* 1. (*обрывисто*) кру́та, стро́мка; 2. (*внезапно*) кру́та; 3. (*строго*) кру́та.

КРУ́ТО II *нареч.* (*густо*) гу́ста.

КРУТОБЕРЕ́ЖНЫЙ крутабярэ́жны, стромкабярэ́жны.

КРУТО́Й I 1. (*обрывистый*) круты́, стро́мкі; 2. (*внезапный*) круты́; **к. перело́м** круты́ перало́м; 3. (*строгий*) круты́.

КРУТ||О́Й II (*отвердевший, густой*) густы́; ◇ ~**о́е яйцо́** кру́тое яйцо́; **к. кипято́к** (круты́) кіпецень.

КРУ́ТОСТЬ 1. (*обрывистость*) кру́тасць, -ці *ж,* стро́мкасць, -ці *ж;* 2. (*внезапность*) кру́тасць, -ці *ж;* *см.* **круто́й** 1, 2.

КРУ́ЧА кру́ча, -чы *ж.*

КРУ́ЧЕ *сравн. ст.* 1. *нареч.* круце́й; страмчэ́й; гусце́й; *см.* **кру́то;** 2. *прил.* круце́йшы; страмчэ́йшы; гусце́йшы.

КРУЧ||Е́НИЕ кручэ́нне, -ння *ср;* ~**ЁНЫЙ** кру́чаны.

КРУЧИ́Н||А *ж фольк.* журба́, -бы́ *ж;* (*печаль*) сму́так, -тку *м,* марко́та, -ты *ж;* (*тоска*) туга́, -гі́ *ж;* ~**ИТЬСЯ** *несов. фольк.* журы́цца; (*печалиться*) смуткава́ць, марко́ціцца; (*тосковать*) тужы́ць; ~**НЫЙ** журбо́тны; сму́тны, марко́тны; тужлі́вы; ~**УШКА** *фольк. см.* **кручи́на.**

КРУШЕ́НИЕ *в разн. знач.* крушэ́нне, -ння *ср;* **к. по́езда** крушэ́нне по́езда (цягніка́); **к. всех наде́жд** крушэ́нне ўсіх надзе́й.

КРУШИ́Н||А *бот.* крушы́на, -ны *ж;* ~**ОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* крушы́навыя, -вых.

КРУШИ́ТЬ *несов.* 1. крышы́ць; (*разрушать*) разбура́ць; (*ломать*) ламаць; (*уничтожать*) знішча́ць; 2. (*томить, угнетать*) гняцці́, му́чыць.

КРЫЖО́В||ЕННЫЙ агрэ́ставы; ~**НИК** агрэ́ст, -ту *м.*

КРЫЛА́Н *зоол.* крыла́н, -на́ *м.*

КРЫЛА́ТКА *разг.* крыла́тка, -кі *ж.*

КРЫЛА́Т||ЫЙ *прям., перен.* крыла́ты; ~**ое сло́во** крыла́тае сло́ва.

КРЫЛА́Ч *тех.* крыла́ч, -ча́ *м.*

КРЫЛЕ́ЧКО *ср уменьш.* га́нак, -нка *м,* га́начак, -чка *м.*

КРЫЛО́ *в разн. знач.* крыло́, -ла́ *ср;* **распра́вить кры́лья** *перен.* распасце́рці кры́лы; **подре́зать кры́лья** *перен.* падрэ́заць кры́лы.

КРЫЛОНО́ГИЕ *мн. сущ. зоол.* крыланогія, -гіх.

КРЫ́ЛЫШКО *уменьш.-ласк.* кры́льца, -ца *ср;* **под ~м** *перен.* пад кры́льцам.

КРЫЛЬЦО́ *ср* га́нак, -нка *м.*

КРЫМ Крым, *род.* Кры́ма *м;* **в Крыму́** у Кры́ме.

КРЫМ-САГЫ́З *бот.* крым-сагы́з, -зу *м.*

КРЫ́МСКАЯ О́БЛАСТЬ Кры́мская во́бласць.

КРЫ́МСКИЙ кры́мскі.

КРЫ́Н||КА *ж* гладыш, -ша́ *м,* збан, *род.* збана́ *м,* гарла́ч, -ча́ *м;* ~**ОЧНЫЙ** гладышо́вы, зба́навы, гарла́човы.

КРЫ́С||А *ж прям., перен.* пацу́к, -ка́ *м;* ~**И́НЫЙ** пацучы́ны.

КРЫСОЛО́В мышало́ў, -ло́ва *м,* пацукало́ў, -ло́ва *м;* ~**КА** *ж* 1. па́стка на пацуко́ў; 2. (*о собаке*) мышало́ў, -ло́ва *м.*

КРЫ́||ТЫЙ кры́ты; ~**ТЬ** *несов.* 1. крыць; (*покрывать—краской, позолотой и т. п.*) пакрыва́ць; (*обивать*) абіва́ць, абабіва́ць; (*обшивать тканью*) пакрыва́ць, пацягваць; ~**ть кры́шу** крыць дах; 2. (*критиковать*) крыць; 3. *карт.* біць; ~**ть тузо́м** біць ту́зам; ~**ТЬСЯ** 1. (*скрываться*) хава́цца; (*таиться*) таі́цца; 2. (*заключаться*) заключа́цца; 3. *страд.* кры́цца; пакрыва́цца; абіва́цца, абабіва́цца; пацягвацца; *см.* **крыть.**

КРЫ́ША *ж* 1. (*железная, гонтовая, черепичная*) дах, *род.* да́ху *м;* (*из соломы*) страха́, -хі́ *ж;* 2. (*покрышка*) *спец.* по́крыўка, -кі *ж.*

КРЫ́ШКА *ж* на́крыўка, -кі *ж* (*покрышка*); ве́ка, -ка *ср* (*гроба, сундука и т. п.*); ве́чка, -ка *ср* (*коробки*); ◇ **тут емý и к.!** *простореч.* тут яму́ і капцы́!

КРЮЙТ-КА́МЕРА *мор.* круйт-ка́мера, -ры *ж.*

КРЮК 1. крук, *род.* кру́ка *м;* 2. (*окольный путь*) круг, *род.* кру́гу *м.*

КРЮ́ЧИТЬ *несов. безл. разг.* згіна́ць у крук, ку́рчыць; ~**СЯ** згіна́цца ў крук, ку́рчыцца.

КРЮЧКОВА́ТЫЙ кручкава́ты.

КРЮЧКОТВО́Р *неодобр.* кручкатво́р, -ра *м;* ~**СТВО** *неодобр.* кручкатво́рства, -ва *ср.*

КРЮ́ЧНИК (*носильщик*) *обл., спец.* кру́чнік, -ка *м.*

КРЮЧО́К 1. (*для застёжки*) гаплі́к, -ка́ *м;* 2. *в др. знач.* кручо́к, -чка́ *м.*

КРЮШО́Н крушо́н, -ну *м.*

КРЯ́ДУ *нареч. простореч.* за́пар; за́саб.

КРЯЖ 1. (*горная цепь*) краж, *род.* кра́жа *м;* 2. (*дереве*) краж, *род.* кража́ *м;* (*чурбан*) цурба́н, -на́ *м;* ~**Е́ВО́Й,** ~**ЕВЫЙ** кра́жавы; ~**ИСТЫЙ** (*о человеке*) *разг.* камлюкава́ты, карчакава́ты.

КРЯ́КА||НЬЕ кра́канне, -ння *ср;* ~**ТЬ** *несов.* кра́каць.

КРЯ́КВА *зоол.* крыжа́нка, -кі *ж.*

КРЯ́КНУТЬ *сов. и однокр.* крэ́кнуць, крактану́ць.

КРЯХТЕ́||НИЕ кракта́нне, -ння *ср;* ~**ТЬ** *несов.* кракта́ць.

КСЁНДЗ ксёндз, *род.* ксяндза́ *м.*

КСЕНО́Н *хим.* ксено́н, -на *м.*

КСЕРОФИ́Т *бот.* ксерафі́т, -ту *м.*

КСЕРОФО́РМ *фарм.* ксерафо́рм, -му *м.*

КСИЛЕ́МА *бот.* ксіле́ма, -мы *ж.*

КСИЛО́ГР||АФ *тип.* ксіло́граф, -фа *м;* ~**АФИ́ЧЕСКИЙ** *тип.* ксілаграфі́чны; ~**А́ФИЯ** *тип.* ксілагра́фія, -фіі *ж.*

КСИЛО́Л *хим.* ксіло́л, -лу *м.*

КСИЛОЛИ́Т *стр.* ксілалі́т, -ту *м.*

КСИЛОФО́Н *муз.* ксілафо́н, -на *м.*

КСТА́ТИ *нареч., вводн. сл.* дарэ́чы; **сказа́ть к.** сказа́ць дарэ́чы; **к., когда́ вы бу́дете здесь?** дарэ́чы, калі́ вы бу́дзеце тут?

КТИ́ТОР *церк.* царко́ўны ста́раста.

КТО *мест.* хто (*род., вин.* каго́, *дат.* каму́, *твор., предложн.* кім); **кто пошёл в теа́тр, кто в кино́** хто пайшо́ў у тэа́тр, хто ў кіно́; **кто что лю́бит** хто што любіць; **е́сли кто придёт, скажи́, что я пошёл на рабо́ту** калі́ хто прыйдзе, скажы́, што я пайшо́ў на рабо́ту; **кому́ посла́ть пригласи́тельные биле́ты?** каму́ пасла́ць запраша́льныя білеты?; **за кем вы стои́те?** за кім вы стаіце́?; **кем сде́лана э́та рабо́та?** кім зро́блена гэта рабо́та?; ◇ **кто бы ни...** хто-б ні ...; **ма́ло ли кто** (ці) ма́ла хто; **кто в лес, кто по дрова́** хто ў лес, а хто па дро́вы.

КТО́-ЛИБО, КТО́-НИБУДЬ *мест.* хто-не́будзь; *см.* **кто.**
КТО́-ТО *мест.* хто́сьці (*род., вин.* каго́сьці, *дат.* каму́сьці, *твор., предложн.* кі́мсьці), хтось (*род., вин.* каго́сь, *дат.* каму́сь, *твор., предложн.* кі́мсь), не́хта (*род., вин.* не́кага, *дат.* не́каму, *твор., предложн.* не́кім).
КУБ I *в разн. знач.* куб, *род.* ку́ба *м*; **возводи́ть в куб** *мат.* узво́дзіць у куб; **в ку́бе** *мат.* у ку́бе; **куб дров** куб дроў.
КУБ II (*сосуд*) куб, *род.* ку́ба *м*; **перего́нный куб** пераго́нны куб.
КУБ III *бот.* куб, *род.* ку́бу *м.*
КУ́БА *о.* Ку́ба, -бы *ж.*
КУБА́НКА I (*шапка*) куба́нка, -кі *ж.*
КУБА́НКА II (*пшеница*) куба́нка, -кі *ж.*
КУБА́НСКИЙ куба́нскі.
КУБА́НЬ Куба́нь, -ні *ж.*
КУ́БАРЕМ *нареч.* кулём.
КУБА́РЬ ваўчо́к, -чка́ *м.*
КУБАТУ́РА кубату́ра, -ры *ж.*
КУБИ́ЗМ *иск.* кубі́зм, -ма *м.*
КУ́БИК I (*для игры*) ку́бік, -ка *м.*
КУ́БИК II (*мера объёма*) *разг.* ку́бік, -ка *м.*
КУБИ́СТ *иск.* кубі́ст, -та *м*; **~КА** кубі́стка, -кі *ж*; **~СКИЙ** кубі́сцкі.
КУБИ́ЧЕСКИЙ кубі́чны.
КУБОВ||А́Я *сущ.* кубава́я, -во́й *ж*; **~И́ДНЫЙ** кубападо́бны.
КУБОВЩИ́||К кубаўшчы́к, -ка́ *м*; **~ЦА** кубаўшчы́ца, -цы *ж.*
КУ́БОВ||ЫЙ (*цвет*) ку́бавы; **~ая кра́ска** ку́бавая фа́рба.
КУ́БОК ку́бак, -бка *м.*
КУБОМЕ́ТР кубаме́тр, -ра *м.*
КУ́БРИК *мор.* ку́брык, -ка *м.*
КУБЫ́ШКА 1. (*копилка*) скарбо́нка, -кі *ж*; 2. (*толстушка*) *фам.* кацёлка, -кі *ж*; 3. *бот.* жо́ўты гарла́чык.
КУВА́ЛДА *тех.* кува́лда, -ды *ж.*
КУВШИ́Н збан, *род.* збана́ *м.*
КУВШИ́НК||А *ж бот.* бе́лы гарла́чык; **~ОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* гарла́чыкавыя, -вых.
КУВШИ́НН||ЫЙ збано́вы; ◇ **~ое ры́ло** *разг.* хра́па.
КУВШИ́НЧИК *обл.* збано́к, -нка́ *м*, збано́чак, -чка *м.*
КУВЫ́Р||К *межд. разг.* куле́ць; **~КА́НЬЕ** куля́нне, -ння *ср*, перакýльванне, -ння *ср*; **~КА́ТЬСЯ** *несов.* куля́цца, перакýльвацца; **~КНУ́ТЬСЯ** *сов.* кульну́цца; **~КО́М** *нареч. разг.* кулём; **~НУ́ТЬСЯ** *сов.* кульну́цца.
КУГУА́Р *зоол.* кугуа́р, -ра *м.*
КУДА́ *нареч.* 1. куды́; **к. он идёт?** куды́ ён ідзе́?; **к. назна́чат, туда́ и пое́ду** куды́ прызна́чаць, туды́ і паеду; 2. (*зачем, на что*) *разг.* нашто́, наво́шта; **к. вам сто́лько бума́ги?** нашто́ вам сто́лькі папе́ры?; 3. (*гораздо*) *разг.* зна́чна; **к. лу́чше** зна́чна лепш; ◇ **к. тебе!** дзе табе!; **к. уж!** дзе ўжо!; **к. там!** дзе там!; **хоть к.** *разг.* хоць куды́; **к. как хорошо́** *разг.* вельмі до́бра, ве́льмі до́бра; **к. ни шло** *разг.* куды́ ні ішло́.
КУДА́-ЛИБО, КУДА́-НИБУДЬ *нареч.* куды́-не́будзь.
КУДА́-ТО *нареч.* куды́сьці, куды́сь, не́куды.
КУДА́ХТА||НЬЕ куда́хтанне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* куда́хтаць.
КУДЕ́ЛЬ *текст.* кудзе́ля, -лі *ж.*
КУДЕ́СНИК вяшчу́н, -на́ *м*; (*колдун*) вядзьма́р, -ра́ *м*, чараўні́к, -ка́ *м.*
КУДЛА́||СТЫЙ, ~ТЫЙ *разг.* кудла́ты.
КУДРЕВА́ТЫЙ кучара́вісты.
КУ́ДР||И ку́чары, -раў *ед. нет*; **~Я́ВИТЬСЯ** *несов.* кучара́віцца; **~Я́ВОСТЬ** кучара́васць, -ці *ж*; **~Я́ВЫЙ** кучара́вы.
КУДЫМКА́Р *г.* Кудымка́р, -ра *м.*
КУЗБА́СС (Кузне́цкий бассе́йн) Кузба́с, -са *м* (Кузне́цкі басе́йн).
КУЗБА́ССОВСКИЙ кузба́саўскі.
КУЗНЕ́Ц кава́ль, -ля́ *м*; **~КИ́Й** кава́льскі.
КУЗНЕ́ЦКИЙ БАССЕ́ЙН Кузне́цкі басе́йн.
КУЗНЕ́ЧИК *зоол.* ко́нік, -ка *м.*
КУЗНЕ́ЧНЫЙ кава́льскі.
КУ́ЗНИЦА ку́зня, -ні *ж.*
КУ́ЗОВ 1. *см.* **ко́роб** 1; 2. (*у автомобиля и т. п.*) ку́заў, -зава *м.*
КУЗОВО́К *зоол.* кузаво́к, -заўка́ *м.*
КУ́ЗЬКА *зоол.* ку́зька, -кі *м.*
КУЗЬМИЧЁВ: ~а трава́ *бот.* эфе́дра.
КУ́ЙБЫШЕВ *г.* Ку́йбышаў, -шава *м.*
КУ́ЙБЫШЕВСКАЯ О́БЛАСТЬ Ку́йбышаўская во́бласць.
КУ́КА ПРОЛИ́В Ку́ка пралі́ў.
КУКА||РЕ́КАТЬ *несов.* кукарэ́каць; **~РЕ́КНУТЬ** *однокр.* кукарэ́кнуць; **~РЕКУ́** *межд.* кукарэ́ку.
КУ́КИШ *м простореч.* ду́ля, -лі *ж*, ку́кіш, -ша *м*; **показа́ть к.** паказа́ць ду́лю (ку́кіш).
КУ́КЛА *прям., перен.* ля́лька, -кі *ж.*
КУКОВА́||НИЕ кукава́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* кукава́ць.
КУ́КОЛКА 1. ля́лька, -кі *ж*, ля́лечка, -кі *ж*; 2. *зоол.* ку́калка, -кі *ж.*
КУ́КОЛЬ *бот.* куко́ль, -лю́ *м.*
КУ́КОЛЬНЫЙ ля́лечны; **к. теа́тр** ля́лечны тэа́тр.
КУ́КСИТЬСЯ *несов. разг.* ку́ксіцца, су́піцца.
КУКУ́ *межд.* куку́.
КУКУРЕ́КАТЬ *несов. см.* **кукаре́кать.**
КУКУРУ́З||А *с.-х.* кукуру́за, -зы *ж*; **~НЫЙ** кукуру́зны.
КУКУРУЗОДРОБИ́ЛКА *с.-х.* кукурузадрабі́лка, -кі *ж.*
КУКУРУЗОХРАНИ́ЛИЩЕ *с.-х.* кукурузасхо́вішча, -шча *ср.*
КУКУ́Ш||ЕЧИЙ зязю́лін; **~КА** 1. зязю́ля, -лі *ж*; 2. *перен.* куку́шка, -кі *ж*; **~КИН** зязю́лін, зязю́льчын; **~кин лён** *бот.* лугавы́ лён; **~кины слёзки** *бот.* пля́містая зязю́лька; **~кин цвет** *бот.* зязю́льчын све́тнік.
КУЛА́К I кула́к, -ка́ *м*; ◇ **брониро́ванный к.** браніра́ваны кула́к; **держа́ть в ~е** трыма́ць у кулаку́.
КУЛА́К II *тех.* кула́к, -ка́ *м.*
КУЛА́К III *эк.* кула́к, -ка́ *м.*
КУЛА́Н *зоол.* кула́н, -на *м.*
КУЛА́||ЦКИЙ, ~ЧЕСКИЙ кула́цкі; **~ЧЕСТВО** кула́цтва, -ва *ср*; **~ЧКА** кула́чка, -кі *ж.*
КУЛА́ЧКИ: идти́ на к. *разг.* ісці́ на кула́чкі.
КУЛАЧКО́ВЫЙ *тех.* кулачко́вы.
КУЛА́ЧН||ЫЙ кула́чны; **к. бой** *ист.* кула́чная бо́йка; **~ое пра́во** кула́чнае пра́ва.
КУЛАЧО́К I *уменьш.* кулачо́к, -чка́ *м*; *см.* **кула́к** I.
КУЛАЧО́К II *тех.* кулачо́к, -чка́ *м.*
КУЛАЧЬЁ *собир. презр.* кулаччо́, -чча́ *ср, мн. нет.*
КУЛЕБЯ́КА *кул.* кулябя́ка, -кі *ж.*
КУЛЁК мяшо́чак, -чка *м*, мяшо́к, -шка́ *м*; ◇ **из кулька́ в рого́жку** *погов.* ≅ з агню́ ды ў по́лымя.
КУ́ЛИ ку́лі *нескл., м.*
КУЛИ́К *зоол.* кулі́к, -ка́ *м*; ◇ **всяк к. своё боло́то хва́лит** *посл.* ≅ усякі цыга́н сваю́ кабы́лу хва́ліць.
КУЛИНА́Р куліна́р, -ра *м*; **~ИЯ** куліна́рыя, -рыі *ж*; **~КА** куліна́рка, -кі *ж*; **~НЫЙ** куліна́рны.
КУЛИ́С||А *в разн. знач.* кулі́са, -сы *ж*; **за ~ами** *прям., перен.* за кулі́самі; **~НЫЙ** кулі́сны.
КУЛИ́Ч кулі́ч, -ча́ *м.*
КУЛИ́ЧК||И: жить у чёрта на ~ах жыць за блі́зкім све́там; жыць у чо́рта ў зуба́х; **идти́ к чёрту на к.** ісці́ за блі́зкі свет; ісці́ к чо́рту ў зу́бы.
КУЛО́Н I (*женское украшение*) куло́н, -на *м.*
КУЛО́Н II *физ.* куло́н, -на *м.*
КУЛУ||А́РНЫЙ кулуа́рны; **~А́РЫ** кулуа́ры, -раў *ед. нет.*

КУЛЬ 1. мех, *род.* мяха́ *м*, мяшо́к, -шка́ *м*; **2.** (*соломы*) *обл.* куль, *род.* куля́ *м.*
КУЛЬБА́БА *ж бот.* лаганец, -нцу́ *м.*
КУЛЬМИН|АЦИО́ННЫЙ кульмінацы́йны; **~А́ЦИЯ** *астр., перен.* кульміна́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов. астр., перен.* кульміні́раваць.
КУЛЬТ культ, *род.* ку́льту *м.*
КУЛЬТИВ|А́ТОР *с.-х.* культыва́тар, -ра *м*; **~А́ЦИЯ** культыва́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАНИЕ** культывава́нне, -ння *ср*; **~И́РОВАТЬ** *несов.* культывава́ць; **~И́РОВАТЬСЯ** культывава́цца.
КУЛЬТКОМИ́ССИЯ культкамі́сія, -сіі *ж.*
КУЛЬТМА́ССОВЫЙ культма́савы.
КУ́ЛЬТОВЫЙ ку́льтавы.
КУЛЬТОТДЕ́Л культаддзе́л, -ла *м.*
КУЛЬТПОХО́Д культпахо́д, -ду *м.*
КУЛЬТРАБО́Т|А культрабо́та, -ты *ж*, культпра́ца, -цы *ж*; **~НИК** культрабо́тнік, -ка *м*, культпрацаўні́к, -ка́ *м.*
КУЛЬТСЕ́КТОР культсе́ктар, -ра *м.*
КУЛЬТУ́Р|А культу́ра, -ры *ж*; **~НИЧЕСКИЙ** культу́рніцкі; **~НИЧЕСТВО** культу́рніцтва, -ва *ср*; **~НО** *нареч.* культу́рна.
КУЛЬТУ́РНО-БЫТОВО́Й культу́рна-бытавы́.
КУЛЬТУ́РНО-ПРОСВЕТИ́ТЕЛЬНЫЙ культу́рна-асве́тны.
КУЛЬТУ́РН|ОСТЬ культу́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** культу́рны.
КУЛЬТУРТРЕ́ГЕР культуртрэ́гер, -ра *м*; **~СКИЙ** культуртрэ́герскі; **~СТВО** культуртрэ́герства, -ва *ср.*
КУЛЬТЯ́ *мед.*, **~ПКА** *разг.* ку́кса, -сы *ж.*
КУЛЯ́Б *г.* Куля́б, -ба *м.*
КУЛЯ́БСКАЯ О́БЛАСТЬ Куля́бская во́бласць.
КУ|М кум, *род.* ку́ма *м*; **~МА́** кума́, -мы́ *ж*; **~МАНЁК** *ласк. разг.* кумо́к, -мка́ *м.*
КУМАРИ́Н *тех.* кумары́н, -ну *м.*
КУМА́Ч кума́ч, -чу́ *м*; **~ЁВЫЙ** кумачо́вы; **~НЫЙ** кума́чны.
КУМЕ́КАТЬ *несов. обл.* куме́каць; ке́міць.
КУ́МЖА *зоол.* ку́мжа, -жы *ж.*
КУМИ́Р *в разн. знач.* кумі́р, -ра *м*; **~НЯ** кумі́рня, -ні *ж.*
КУМ|И́ТЬСЯ *несов.* кумі́цца; **~ОВСКО́Й** кумаўскі́; **~ОВСТВО́** *прям., перен.* кумаўство́, -ва́ *ср.*
КУМУЛ|ЯТИ́ВНЫЙ кумулятыўны; **~Я́ЦИЯ** *мед.* кумуля́цыя, -цыі *ж.*
КУ́МУШКА ку́мка, -кі *ж*, ку́мачка, -кі *ж.*
КУМЫ́К кумы́к, -ка́ *м.*
КУМЫ́С кумы́с, -су *м*; **~НЫЙ** кумы́сны.
КУМЫСОЛЕ|ЧЕ́БНИЦА *мед.* кумысалячэ́бніца, -цы *ж*; **~ЧЕ́БНЫЙ** кумысалячэ́бны; **~ЧЕ́НИЕ** кумысалячэ́нне, -ння *ср.*
КУМЫ́ЦКИЙ кумы́цкі.
КУМЫ́ЧКА кумы́чка, -кі *ж.*
КУН *этн.* кун, *род.* ку́ну *м*, *мн. нет.*
КУНА́|К *этн.* куна́к, -ка́ *м*; **~ЧЕСТВО** *этн.* куна́цтва, -ва *ср.*
КУНЖУ́Т *бот.* кунжу́т, -ту *м*; **~НЫЙ** кунжу́тны.
КУ́НИЙ куні́чны.
КУНИ́ЦА *зоол.* куні́ца, -цы *ж.*
КУНСТКА́МЕРА *ист., перен.* кунстка́мера, -ры *ж.*
КУНТУ́Ш (*кафтан*) *уст.* кунту́ш, -ша́ *м.*
КУ́ПА *уст.* ку́па, -пы *ж.*
КУПА́ВКА *см.* **купа́льница.**
КУПА́Ж *тех.* купа́ж, -жу́ *м.*
КУПА́ЛА *м этн.* Купа́лле, -лля *ср.*
КУПА́ЛЬНИЦА *бот.* пярэ́сна, -ны *ж.*
КУПА́ЛЬ|НЫЙ купа́льны; **~НЯ** купа́льня, -ні *ж.*
КУПА́|ЛЬЩИК купа́льшчык, -ка *м*; **~ЛЬЩИЦА** купа́льшчыца, -цы *ж*; **~НЬЕ** *в разг. знач.* купа́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* купа́ць; **~ТЬСЯ** купа́цца.
КУПЕ́ купэ́ *нескл., ср.*
КУПЕЛИ́РОВАТЬ *несов. хим.* купелі́раваць.
КУПЕ́ЛЬ *церк.* купе́ль, -лі *ж.*
КУПЕЛЯ́ЦИЯ *хим.* купеля́цыя, -цыі *ж.*
КУПЕ́НА *бот.* купе́на, -ны *ж.*
КУПЕ́|Ц купе́ц, -пца́ *м*; **~ЧЕСКИЙ** купе́цкі; **~ЧЕСТВО** *собир.* купе́цтва, -ва *ср.*
КУПИДО́Н *миф., поэт. уст.* купідо́н, -на *м.*
КУПИ́РОВАННЫЙ купі́раваны.
КУПИ́РОВАТЬ *сов. и несов.* купі́раваць.
КУПИ́ТЬ *сов.* купі́ць.
КУ́ПЛЕННЫЙ ку́плены.
КУПЛЕ́Т купле́т, -та *м*; **~И́СТ** *театр.* куплеты́ст, -та *м*; **~И́СТКА** куплеты́стка, -кі *ж.*
КУ́ПЛЯ ку́пля, -лі *ж.*
КУ́ПОЛ ку́пал, -ла *м*; **~ООБРА́ЗНЫЙ** купалападо́бны; **~ЬНЫЙ** *арх.* ку́пальны.
КУПО́Н *в разн. знач.* купо́н, -на *м*; **~НЫЙ** купо́нны, купо́навы.
КУПОРО́С *хим.* купарва́с, -су *м*; **~НЫЙ** купарва́сны.
КУПРИ́Т *мин.* купры́т, -ту *м.*
КУПФЕРНИ́КЕЛЬ *мин.* купферні́кель, -лю *м.*
КУ́ПЧ|ИЙ: **~ая (кре́пость)** *эк. уст.* ку́пчая, -чай *ж.*
КУ́ПЧ|ИК *разг. пренебр.* ку́пчык, -ка *м*; **~И́НА** *разг. пренебр.* купчы́на, -ны *м*; **~И́ХА** *разг.* купчы́ха, -хі *ж.*
КУПЫ́РЬ *бот.* марко́ўнік, -ку *м.*
КУПЮ́РА *в разн. знач.* купю́ра, -ры *ж.*
КУР: **попа́л, как кур во́ щи** ≅ тра́піў, як лісі́ца ў саладу́ху.
КУРА́ *р.* Кура́, -ры́ *ж.*
КУРАГА́ курага́, -гі́ *ж*, *мн. нет.*
КУРА́ЖИТЬСЯ *несов. разг.* кура́жыцца.
КУРА́НТ *спец.* кура́нт, -та *м.*
КУРА́НТЫ кура́нты, -таў *ед. нет*; **кремлёвские к.** крэмлёўскія кура́нты.
КУРА́ТОР *в разн. знач.* кура́тар, -ра *м.*
КУРБЕ́Т *спорт., перен.* курбе́т, -та *м.*
КУРГА́Н курга́н, -на́ *м.*
КУРГА́Н *г.* (*К прописное*) Курга́н, -на́ *м.*
КУРГА́ННЫЙ курга́нны.
КУРГА́НСКАЯ О́БЛАСТЬ Курга́нская во́бласць.
КУРГУ́ЗЫЙ *разг.* курта́ты.
КУРД курд, *род.* ку́рда *м.*
КУРДИСТА́Н Курдыста́н, -на *м.*
КУ́РДСКИЙ ку́рдскі.
КУРДЮ́|К курдзю́к, -ка́ *м*; **~ЧНЫЙ** курдзю́чны.
КУРДЯ́НКА курдзя́нка, -кі *ж.*
КУ́РЕВО *разг.* ку́рыва, -ва *ср.*
КУРЕ́НИЕ курэ́нне, -ння *ср.*
КУРЕННО́Й *ист.* **1.** *прил.* куранны́; **2.** *сущ.* куранны́, -но́га *м.*
КУРЁНОК *м обл.* кураня́, -ня́ці *ср.*
КУРЕ́НЬ *обл., ист.* курэ́нь, -раня́ *м.*
КУРЗА́Л *м* курза́ла, -лы *ж.*
КУРИА́ЛЬНЫЙ *юр.* курыя́льны.
КУРИ́ЛКА *разг.* куры́льня, -ні *ж*; ◇ **жив к.!** *разг.* жыў курылка!
КУРИ́ЛЬ|НИЦА *уст.* куры́льніца, -цы *ж*; **~НЯ** куры́льня, -ні *ж.*
КУРИ́ЛЬСКИЕ ОСТРОВА́ Куры́льскія астравы́.
КУРИ́ЛЬСКИЕ ПРОЛИ́ВЫ Куры́льскія пралі́вы.
КУРИ́ЛЬЩИ|К *м*, **~ЦА** *ж* курэ́ц, -рца́ *м.*
КУРИ́Н|ЫЕ *мн. сущ. зоол.* куры́ныя, -ных; **~ЫЙ** куры́ны; **~ая слепота́** а) *мед. разг.* куры́ная слепата́; б) *бот.* кураслёп.
КУРИ́|ТЕЛЬНЫЙ куры́льны; **~ТЬ** *несов.* **1.** куры́ць;

2. (*перегонкой*) курыць, гнаць; ◇ ~ть **фимиам** *перен.* курыць фіміям; ~**ТЬСЯ** курыцца.

КУР||ИЦА курыца, -цы *ж*, *мн.* куры, -рэй; ◇ **мокрая к.** *разг.* мокрая курыца; ~**ам на смех** *разг.* курам на смех.

КУРИЯ курыя, -рыі *ж.*

КУРКОВЫЙ курковы.

КУРКУМА *бот.* куркума, -мы *ж.*

КУРЛЫКА||НЬЕ курлыканне, -ння *ср*; ~**ТЬ** *несов.* курлыкаць.

КУРН||ОЙ курны; ~**ая изба** курная хата.

КУРНОСЫЙ кірпаносы, кірпаты.

КУРНЫЙ *см.* **курной.**

КУРОВОД *с.-х.* куравод, -да *м*, курагадовец, -доўца *м*; ~**СТВО** *ср с.-х.* курагадоўля, -лі *ж*; ~**ЧЕСКИЙ** курагадоўчы.

КУРОК курок, -рка *м.*

КУРОЛЕСИТЬ *несов. разг.* пракудзіць.

КУРОПАТКА курапатка, -кі *ж.*

КУРОРТ курорт, -та *м*; ~**НИК** *разг.* курортнік, -ка *м*; ~**НИЦА** курортніца, -цы *ж*; ~**НЫЙ** курортны.

КУРОСЛЕП *бот.* кураслеп, -пу *м.*

КУРС I курс, *род.* курсу *м*; **держать курс** трымаць курс; **менять курс** мяняць курс; ◇ **в курсе дела** у курсе справы.

КУРС II курс, *род.* курса *м*; **курс лекций** курс лекцый; **студент второго** ~**а** студэнт другога курса.

КУРСАНТ курсант, -та *м*; ~**КА** курсантка, -кі *ж*; ~**СКИЙ** курсанцкі.

КУРСИВ *тип.* курсіў, -сіву *м*; ~**НЫЙ** курсіўны.

КУРСИРОВА||НИЕ курсіраванне, -ння *ср*; ~**ТЬ** *несов.* курсіраваць.

КУРСИСТКА *уст.* курсістка, -кі *ж.*

КУРСК *г.* Курск, *род.* Курска *м.*

КУРСКАЯ ОБЛАСТЬ Курская вобласць.

КУРСОВКА курсоўка, -кі *ж.*

КУРСОВОЙ курсавы.

КУРСЫ курсы, -саў *ед. нет.*

КУРТАЖ *торг.* куртаж, -жу *м*; ~**НЫЙ** куртажны.

КУРТИЗАНКА *уст.* куртызанка, -кі *ж.*

КУРТИНА куртына, -ны *ж.*

КУРТ||КА куртка, -кі *ж*; ~**ОЧКА** *уменьш.* куртачка, кі *ж.*

КУРУЛТАЙ *полит.* курултай, -тая *м.*

КУРФЮРСТ *ист.* курфюрст, -та *м.*

КУРЦ-ГАЛОП *спорт.* курц-галоп, -пу *м.*

КУРЧАВИТЬСЯ *несов.* кучаравіцца.

КУРЧАВ||ОСТЬ кучаравасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** кучаравы.

КУРЧОНОК *м обл.* кураня, -няці *ср.*

КУРЫ: строить к. (*кому*) *шутл. уст.* заляцацца (*да каго*).

КУРЬЁЗ кур'ёз, -зу *м*; ~**НО** *нареч.* кур'ёзна; ~**НОСТЬ** кур'ёзнасць, -ці *ж*; ~**НЫЙ** кур'ёзны.

КУРЬЕР кур'ер, -ра *м*; ~**СКИЙ** кур'ерскі; ~**ША** кур'ерка, -кі *ж.*

КУРЯТ||ИНА *разг.* кураціна, -ны *ж*; ~**НИК** куратнік, -ка *м.*

КУРЯЩ||ИЙ 1.: быть ~**им** курыць; **он к.** ён курыць; 2. *сущ.* курэц, -рца *м*; **вагон для** ~**их** вагон для курцоў.

КУС *простореч.* кавалак, -лка *м*, кус, *род.* куса *м.*

КУСАТЬ *несов.* кусаць; ~**СЯ** *в разн. знач.* кусацца.

КУСАЧКИ *тех.* кусачкі, -каў *ед. нет.*

КУСК||ОВОЙ, ~**ОВЫЙ** кускавы.

КУСНУТЬ *однокр. разг.* кусануць.

КУС||ОК *в разн. знач.* кавалак, -лка *м*, кусок, -ска *м*; **к. дерева** кавалак дрэва; **к. хлеба** кавалак (кусок) хлеба; **сахар** ~**ками** цукар кавалкамі (кускамі); ◇ **лакомый к.** *прям.*, *перен.* смачны кавалак (кусок); **к. в горло нейдёт** кусок у горла не лезе; ~**ОЧЕК** *уменьш.* кавалачак, -чка *м*, кусочак, -чка *м.*

КУСТ I куст, *род.* куста *м*; ◇ **спрятаться в** ~**ы** *перен.* схавацца ў кусты.

КУСТ II (*объединение*) *эк.* куст, *род.* куста *м.*

КУСТАНАЙ *г.* Кустанай, -ная *м.*

КУСТАНАЙСКАЯ ОБЛАСТЬ Кустанайская вобласць.

КУСТАРНИК хмызняк, -ку *м*; (*кусты*) кусты, -тоў; ~**ОВЫЙ** *бот.* хмызняковы.

КУСТ||АРНИЧАТЬ *несов. прям.*, *перен.* саматужнічаць; ~**АРНИЧЕСТВО** *пренебр.* саматужніцтва, -ва *ср*; ~**АРНО** *нареч.* саматужна; ~**АРНОСТЬ** саматужнасць, -ці *ж*; ~**АРНЫЙ** саматужны; ~**АРЩИНА** *ж пренебр.* саматужніцтва, -ва *ср*; ~**АРЬ** саматужнік, -ка *м*; ~**арь-одиночка** саматужнік-адзіночка.

КУСТИК *уменьш.* кусцік, -ка *м.*

КУСТ||ИСТОСТЬ кусцістасць, -ці *ж*; ~**ИСТЫЙ** кусцісты; ~**ИТЬСЯ** *несов.* кусціцца; ~**ОВКА** *с.-х.* кустоўка, -кі *ж.*

КУСТОВОЙ I (*о заросли*) кустовы.

КУСТОВ||ОЙ II (*объединённый*) куставы; ~**ое собрание** куставы сход.

КУСТООБРАЗНЫЙ кустападобны.

КУСТОРЕЗ *с.-х.* кустарэз, -за *м.*

КУТАЙСИ *г.* Кутаісі *нескл.*, *м.*

КУТАТЬ *несов.* хутаць, захінаць; ~**СЯ** хутацца, захінацца.

КУТЁЖ *м* гулянка, -кі *ж*, папойка, -кі *ж.*

КУТЁНОК *м обл.* шчаня, -няці *ср*, шчанюк, -ка *м.*

КУТЕРЬМА *разг.* сумятня, -ні *ж*, мітусня, -ні *ж*; завіруха, -хі *ж.*

КУТИКУЛА *бот.* кутыкула, -лы *ж.*

КУТ||ИЛА *разг.* гуляка, -кі *м*; ~**ИТЬ** *несов.* гуляць, п'янстваваць; ~**НУТЬ** *однокр. разг.* гульнуць.

КУТУЗКА *простореч. уст.* кутузка, -кі *ж.*

КУТЬЯ *этн.* куцця, *род.* куцці *ж.*

КУХАР||КА кухарка, -кі *ж*; ~**НИЧАТЬ** *несов. разг.* кухарыць.

КУХМИСТЕР *уст.* кухмістар, -ра *м*; ~**СКАЯ** *сущ. уст.* кухмістарская, -кай *ж*; ~**СКИЙ** кухмістарскі.

КУХ||НЯ кухня, -ні *ж*; ~**ОННЫЙ** кухонны.

КУЦЫЙ *прям.*, *перен. разг.* куртаты.

КУЧ||А *прям.*, *перен.* куча, -чы *ж*; ◇ **валить всё в одну** ~**у** валіць усё ў адну кучу.

КУЧЕВ||ОЙ: ~**ые облака** *метеор.* кучавыя воблакі (аблокі).

КУЧЕР фурман, -на *м*; ~**СКАЯ** *сущ. уст.* фурманская, -кай *ж*; ~**СКОЙ** фурманскі.

КУЧКА *в разн. знач.* кучка, -кі *ж*; **могучая к.** *муз. ист.* магутная кучка.

КУЧН||О *нареч.* кучна; ~**ОСТЬ** кучнасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** кучны.

КУШ I *сущ. разг.* куш, *род.* куша *м*; **сорвать куш** сарваць куш.

КУШ II *межд. разг.* ляжы.

КУШАК *м* пояс, -са *м*, дзяга, -гі *ж*; (*ремённый*) папруга, -гі *ж.*

КУША||НЬЕ *ср* страва, -вы *ж*, ежа, *род.* ежы *ж*, яда, *род.* яды *ж*; ~**ТЬ** *несов.* есці; (*пить*) піць; ~**ть пирог** есці пірог; ~**ть чай** *уст.* піць чай; ~**йте!** (*ешьте*) ешце!; (*пейте*) *уст.* піце!; ~**ть подано** страва на стале; **пожалуйте** ~**ть!** просім (прашу) да стала!, калі ласка да стала!

КУШЕТКА кушэтка, -кі *ж.*

КУЩА *ж поэт. уст.* шата, -ты *ж*, шацёр, *род.* шатра *м.*

КУЩЕНЬЕ *бот.* кушчэнне, -ння *ср*, куставанне, -ння *ср.*

КУЭНЬ-ЛУНЬ Куэнь-Лунь, -ня *м.*

КХМЕР Кхмер, *род.* Кхмера *м.*

КШ *межд.* кіш.
КЫЗЫЛ *г.* Кызыл, -ла *м.*
КЫЗЫЛКУ́М Кызылку́м, -ма *м.*
КЭБ *м см.* **кеб.**
КЮВЕ́Т *воен., тех.* кюве́т, -та *м.*
КЮВЕ́ТКА *бот., тех.* кюве́тка, -кі *ж.*
КЮРАСО́ (*сорт ликёра*) кюрасо́ *нескл., ср.*
КЮРЕ́ *церк.* кюрэ́ *нескл., м.*
КЮРИ́ *прил. физ.* кюры́ *нескл.*
КЯРИ́З *гидр.* кяры́з, -за *м.*

Л

ЛАБА́З *уст.* лаба́з, -за *м*; **~НИК** *уст.* лаба́знік, -ка *м*; **~НИЦА** лаба́зніца, -цы *ж*; **~НЫЙ** лаба́зны.
ЛАБИАЛИЗ|А́ЦИЯ *лингв.* лабіялізá́цыя, -цыі *ж*; **~О́ВАННОСТЬ** *лингв.* лабіялізава́насць, -ці *ж*; **~О́ВАННЫЙ** лабіялізава́ны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов. лингв.* лабіялізава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** лабіялізава́цца.
ЛАБИА́ЛЬНЫЙ *лингв.* лабія́льны.
ЛАБИ́ЛЬНЫЙ лабі́льны.
ЛАБИОДЕНТА́ЛЬНЫЙ *лингв.* лабіядэнта́льны.
ЛАБИРИ́НТ *в разн. знач.* лабіры́нт, -та *м*; **~ОВЫЙ** лабіры́нтавы.
ЛАБОРА́НТ лабара́нт, -та *м*; **~КА** лабара́нтка, -кі *ж*; **~СКИЙ** лабара́нцкі.
ЛАБОРАТО́Р|ИЯ лабарато́рыя, -рыі *ж*; **~НЫЙ** лабарато́рны.
ЛАБРАДО́Р *геол.* лабрадо́р, -ру *м.*
ЛАБРАДО́Р *п-в* Лабрадо́р, -ра *м.*
ЛАБРАД|ОРИ́Т *геол.* лабрадары́т, -ту *м*; **~О́РОВЫЙ** лабрадо́равы.
ЛАБРАДО́РСКИЙ лабрадо́рскі.
ЛА́ВА I *мин.* ла́ва, -вы *ж.*
ЛА́ВА II (*казачья атака*) ла́ва, -вы *ж.*
ЛАВА́НД|А *бот.* лава́нда, -ды *ж*; **~НЫЙ, ~ОВЫЙ** лава́ндавы.
ЛАВИ́НА *прям., перен.* лаві́на, -ны *ж.*
ЛАВИ́РОВА|НИЕ *прям., перен.* лаві́раванне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. прям., перен.* лаві́раваць.
ЛА́ВКА I (*скамья*) ла́ва, -вы *ж*, ла́ўка, -кі *ж.*
ЛА́ВКА II (*магазин*) крама, -мы *ж*; **мелочная л.** *уст.* крама дробных тавараў.
ЛА́ВЛИВАТЬ *многокр.* лаві́ць.
ЛА́ВОЧКА I *уменьш.* (*скамейка*) ла́вачка, -кі *ж.*
ЛА́ВОЧК|А II 1. *уменьш.* (*торговое заведение*) кра́мка, -кі *ж*; 2. *перен. презр.* шахра́йская кра́мка; (*шайка*) хе́ўра, -ры *ж*; **устроили там ~у** зрабілі там шахра́йскую кра́мку; **это одна л.** гэта адна́ хе́ўра.
ЛА́ВОЧН|ИК кра́мнік, -ка *м*; **~ИЦА** 1. кра́мніца, -цы *ж*; 2. (*жена лавочника*) *простореч.* кра́мнічыха, -хі *ж*; **~ЫЙ** кра́мны.
ЛАВР лаўр, *род.* ла́ўра *и* (*о древесине*) ла́ўру *м*; ◇ **почива́ть на ~ах** спачыва́ць на ла́ўрах; **пожина́ть ~ы** пажына́ць ла́ўры; **уве́нчанный ~ами** увянча́ны ла́ўрамі.
ЛА́ВРА *церк. ист.* ла́ўра, -ры *ж.*
ЛАВРОВИ́Ш|НЕВЫЙ *бот., фарм.* лаўраві́шнёвы; **~НЯ** *бот.* лаўраві́шня, -ні *ж.*
ЛА́ВР|ОВЫЕ *мн. сущ. бот.* лаўро́выя, -вых; **~О́ВЫЙ** лаўро́вы; **~о́вый лист** лаўро́вы ліст.
ЛАВЧО́НКА *пренебр.* кра́мка, -кі *ж.*
ЛАГ *мор.* лаг, *род.* ла́га *м.*
ЛА́ГЕРНЫЙ ла́герны; **л. сбор** *воен.* ла́герны збор.
ЛА́ГЕР|Ь *прям., перен.* ла́гер, -ра *м*; **пионе́рский л.** піяне́рскі ла́гер; **уче́бный л.** вучэ́бны ла́гер; **концентрацио́нный л.** канцэнтрацы́йны ла́гер; **стоя́ть, располага́ться ~ем** стая́ць, размяшча́цца ла́герам; **жить в ~я́х** жыць у ла́герах; **междунаро́дный л. ми́ра** міжнаро́дны ла́гер мі́ру.
ЛА́ГОС *о.* Ла́гос, -са *м.*
ЛАГУ́Н|А лагу́на, -ны *ж*; **~НЫЙ** лагу́нны, лагу́навы.
ЛАД I *м* 1. (*согласие, мир, порядок*) лад, *род.* ла́ду *м*, зго́да, -ды *ж*, зла́гада, -ды *ж*; 2. (*способ, образец*) лад, *род.* ла́ду *м*; **на друго́й лад** на і́ншы лад; ◇ **быть не в ~а́х** быць не ў лада́х; не ла́дзіць; **де́ло идёт на лад** *разг.* спра́ва ідзе́ на лад.
ЛАД II *муз.* лад, *род.* ла́да *м*; ◇ **на ра́зные ~ы́** *прям., перен.* на ро́зныя лады́; **петь на но́вый лад** *перен.* спява́ць на но́вы лад; **петь в лад** спява́ць у лад; **настро́иться на друго́й лад** настро́іцца на і́ншы лад.
ЛАД III *охот.* склад, *род.* скла́ду *м.*
ЛА́ДАН ла́дан, -ну *м*; ◇ **дыша́ть на л.** *перен. разг.* ледзь ды́хаць; ды́хаць на ла́дан; **~КА** ла́данка, -кі *ж.*
ЛА́ДАННИК *бот.* ла́даннік, -ку *м*; **~ОВЫЕ** *мн. сущ. бот.* ла́даннікавыя, -вых.
ЛА́ДАННЫЙ ла́данны, ла́данавы; **л. кедр** *бот.* ла́данны (ла́данавы) кедр.
ЛАДЕ́ЙНЫЙ *шахм.* туро́вы.
ЛА́ДИТЬ I *несов.* (*жить в согласии*) ла́дзіць, жыць у зго́дзе (у зла́гадзе).
ЛА́ДИТЬ II *несов.* 1. (*налаживать*) ла́дзіць, нала́джваць; 2. (*намереваться*) *разг.* ме́рыцца, збіра́цца; 3. (*норовить*) *разг.* патрапля́ць у лад; (*стараться*) стара́цца; 4. (*твердить*) *разг.* дзяўбці́; **л. одно́ и то́ же** *разг.* дзяўбці́ адно́ і то́е-ж.
ЛА́ДИТЬСЯ *несов.* 1. (*идти на лад*) ла́дзіцца; 2. (*условливаться, рядиться*) гадзі́цца.
ЛА́ДНО *разг.* 1. *нареч.* (*как следует*) до́бра; 2. *нареч.* (*в ладу*) у зго́дзе, у зла́гадзе; (*мирно*) мі́рна; **жить л.** жыць у зго́дзе (у зла́гадзе, мі́рна); 3. *част.* (*согласен, пускай*) *част.* до́бра; **ну, л.** ну, до́бра.
ЛА́ДНЫЙ *разг.* до́бры; **па́рень л.** хло́пец до́бры.
ЛА́ДОГА *р.* Ла́дага, -гі *ж.*
ЛА́ДОЖСКИЙ ла́дажскі.
ЛА́ДОЖСКОЕ О́ЗЕРО Ла́дажскае во́зера.
ЛА́ДОНКА *см.* **ла́данка.**
ЛАД|О́ННЫЙ *анат.* дало́невы; **~О́НЧАТЫЙ** дало́ньчаты; **~О́НЬ** дало́нь, -ні *ж*; ◇ **как на ~о́ни** як на дало́ні.
ЛАДО́ШИ: бить, хло́пать в л. пляска́ць у ла́дкі (у дало́ні).
ЛАДО́ШКА *уменьш.* дало́нька, -кі *ж.*
ЛА́ДУШКИ *дет.* ла́дкі, -каў, ладу́сі, -сяў.
ЛАДЬЕ|ВИ́ДНЫЙ, ~ОБРА́ЗНЫЙ лодкападо́бны.
ЛАДЬЯ́ I (*лодка*) *уст.* ло́дка, -кі *ж.*
ЛАДЬЯ́ II *шахм.* тура́, -ры́ *ж.*
ЛАЖ *торг.* лаж, *род.* ла́жу *м*; **~НЫЙ** ла́жны.
ЛАЗ I *тех.* лаз, *род.* ла́за *м.*
ЛАЗ II (*представитель народности*) лаз, *род.* ла́за *м.*
ЛА́ЗАНЬЕ ла́жанне, -ння *ср.*
ЛАЗАРЕ́Т *уст.* лазарэ́т, -та *м*; **~НЫЙ** лазарэ́тны.
ЛА́З|АТЬ *несов. см.* **ла́зить**; **~Е́ЙКА** *ж* 1. прала́з, -зу *м*; 2. *перен.* шчы́ліна, -ны *ж*, прала́з, -зу *м.*
ЛА́ЗИТЬ *несов.* ла́зіць.
ЛАЗО́РЕВКА *зоол.* блакі́тніца, -цы *ж.*
ЛАЗО́РЕВЫЙ блакі́тны.

ЛА́ЗСКИЙ ла́зскі; **л. язы́к** ла́зская мо́ва.

ЛАЗУ́||РЕВЫЙ: л. ка́мень *мин.* ля́піс-лазу́рак; **~РИ́Т** *мин.* лазуры́т, -ту *м*; **~РНЫЙ** блакі́тны; **~РЬ** *ж* 1. (*о цвете*) блакі́т, -ту *м*; 2. (*краска*) лазу́рак, -рку *м*; **берли́нская ~рь** берлі́нскі лазу́рак.

ЛАЗУ́ТЧИК *уст.* лазу́тчык, -ка *м.*

ЛА́ЗЯЩИЕ *мн. сущ. бот., зоол.* лазуны́, -но́ў, ла́зячыя, -чых.

ЛАЙ *м* браха́нне, -ння *ср*, брэх, *род.* брэ́ху *м*, га́ўканне, -ння *ср.*

ЛА́ЙБА ла́йба, -бы *ж.*

ЛА́ЙКА I (*собака*) ла́йка, -кі *ж.*

ЛА́ЙКА II (*кожа*) ла́йка, -кі *ж.*

ЛА́ЙКОВ||ЫЙ ла́йкавы; **~ые перча́тки** ла́йкавыя пальча́ткі.

ЛАК лак, *род.* ла́ку *м.*

ЛАКА́ТЬ *несов.* хлябта́ць.

ЛАКЕ́Й лаке́й, -ке́я *м*, лёкай, -кая *м*; **~СКАЯ** *сущ.* лаке́йская, -кай *ж*, лёкайская, -кай *ж*; **~СКИЙ** лаке́йскі, лёкайскі; **~СТВО** *перен. презр.* лаке́йства, -ва *ср*, лёкайства, -ва *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов. перен. презр.* лаке́йнічаць, лёкайнічаць.

ЛАКИРОВА́ЛЬНЫЙ лакірава́льны.

ЛАКИРО́В||АННЫЙ лакірава́ны; **~А́ТЬ** *несов. прям., перен.* лакірава́ць; **~КА** *ж* 1. (*действие*) лакірава́нне, -ння *ср*, лакіро́ўка, -кі *ж*; 2. (*слой лака*) лакіро́ўка, -кі *ж*; 3. *перен.* лакіро́ўка, -кі *ж*, глянц, *род.* гля́нцу *м*; **~ОЧНЫЙ** лакіро́вачны; **~ЩИК** лакіро́ўшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** лакіро́ўшчыца, -цы *ж.*

ЛА́КМУС *хим.* ла́кмус, -су *м*; **~ОВЫЙ** ла́кмусавы.

ЛА́КОВЫЙ ла́кавы.

ЛА́КОМ||ИТЬСЯ *несов.* ла́саваца; **~КА** *м и ж разг.* ласу́н, -на́ *м*, ласу́ха, -хі *ж*; **~СТВО** *ср* ласу́нак, -нку *м* (*преимущественно о сластях*); прысма́кі, -каў *ед. нет* (*о разных вкусных блюдах*); **~ЫЙ** 1. (*вкусный*) сма́чны; (*привлекательный*) пры́на́дны; (*соблазнительный*) спаку́слівы; **~ый кусо́к** *прям., перен.* сма́чны кава́лак; 2. (*падкий*) ла́сы (*на што і да чаго*); **ла́ком до сла́дкого** ла́сы на салодкае (да сало́дкага).

ЛАКОНИ́||ЗМ лаканізм, -му *м*; **~ЧЕСКИ** *нареч.* лакані́чна; **~ЧЕСКИЙ** лакані́чны; **~ЧНО** *нареч.* лакані́чна; **~ЧНОСТЬ** лакані́чнасць, -ці *ж*; **~ЧНЫЙ** лакані́чны.

ЛАКОКРА́СОЧНЫЙ лакафа́рбавы.

ЛАКРИ́||ЦА *бот., фарм.* лакры́ца, -цы *ж*; **~ЧНИК** *бот.* лакры́чнік, -ку *м*; **~ЧНЫЙ** лакры́чны.

ЛАКТАЦИО́ННЫЙ *биол.* лактацы́йны.

ЛАКТА́ЦИЯ *биол.* лакта́цыя, -цыі *ж.*

ЛАКТОБАЦИЛЛИ́Н *бакт.* лактабацылі́н, -ну *м.*

ЛАКТО́ЗА *хим.* лакто́за, -зы *ж.*

ЛАКТО́МЕТР лакто́метр, -ра *м.*

ЛАКУ́НА *мед., лингв.* лаку́на, -ны *ж.*

ЛАКФИО́ЛЬ *бот.* лакфіёль, -лі *ж.*

ЛА́МА I *зоол.* ла́ма, -мы *ж.*

ЛА́МА II *рел.* ла́ма, -мы *м.*

ЛАМА||И́ЗМ *рел.* ламаі́зм, -ма *м*; **~И́СТ** ламаі́ст, -та *м*; **~И́СТСКИЙ** ламаі́сцкі.

ЛАМА́НШ (*пролив*) Лама́нш, -ша *м.*

ЛАМАРКИ́ЗМ *биол.* ламаркі́зм, -ма *м.*

ЛАМЕНТА́ЦИИ *мн. ирон.* лемянта́цыі, -цый.

ЛАМИНА́РНЫЙ ламіна́рны.

ЛА́МПА ля́мпа, -пы *ж*; **кероси́новая л.** га́завая (га́зная) ля́мпа; **насто́льная л.** насто́льная ля́мпа; **вися́чая л.** вiся́чая ля́мпа; **предохрани́тельная л.** засцерага́льная ля́мпа; **детéкторная л.** дэтэ́ктарная ля́мпа; **электри́ческая л.** электры́чная ля́мпа; **л. в 60, 100 свече́й** ля́мпа на 60, 100 све́чак; **рудни́чная л.** руднíковая ля́мпа; **кали́льная л.** напа́льная ля́мпа.

ЛАМПА́Д||А лампа́да, -ды *ж*; **~КА** лампа́дка, -дкі *ж*; **~НЫЙ** лампа́дны; **~ное ма́сло** лампа́днае ма́сла.

ЛАМПА́С лампа́с, -са *м.*

ЛАМПИО́Н лампіён, -на *м.*

ЛА́МПОВЩИ||К ля́мпаўшчык, -ка *м*; **~ЦА** ля́мпаўшчыца, -цы *ж.*

ЛА́МПО||ВЫЙ ля́мпавы; **~ЧКА** ля́мпачка, -кі *ж*; **~чка Ильича́** ля́мпачка Ільiча́.

ЛАН (*денежная и весовая единица*) лан, *род.* ла́на *м.*

ЛАНГЕДО́К Лангедо́к, -ка *м.*

ЛАНГ||У́СТ *м*, **~У́СТА** *ж зоол.* лангу́ст, -та *м.*

ЛАНГША́Н (*порода кур*) лангша́н, -на *м.*

ЛАНДВЕ́Р *ист.* ландвéр, -ру *м*, *мн. нет.*

ЛАНДКА́РТА *уст.* ландка́рта, -ты *ж.*

ЛАНДО́ ландо́ *нескл.*, *ср.*

ЛАНДСКНЕ́ХТ *ист.* ландскнéхт, -та *м.*

ЛА́НДСТИНГ *полит.* ла́ндстынг, -га *м.*

ЛАНДТА́Г *полит.* ландта́г, -га *м.*

ЛАНДША́ФТ ландша́фт, -ту *м*, краявíд, -ду *м*; **~НЫЙ** ландша́фтны.

ЛА́НДЫ *геогр.* ла́нды, -даў *ед. нет.*

ЛА́НДЫШ *бот.* ла́ндыш, -ша *м*; **~ЕВЫЙ** ла́ндышавы.

ЛАНИ́ТА *уст.* шчака́, -кі *ж.*

ЛАНКА́СТЕР Ланка́стэр, -ра *м.*

ЛАНКА́СТЕРСК||ИЙ *ист.* ланка́стэрскі; **~ое обуче́ние** *пед. ист.* ланка́стэрскае навуча́нне.

ЛАНКАШИ́Р Ланкашы́р, -ра *м.*

ЛАНОЛИ́Н *фарм.* ланалі́н, -ну *м*; **~ОВЫЙ** ланалі́навы.

ЛАНТА́Н *хим.* ланта́н, -на *м.*

ЛАНЦЕ́Т *спец.* ланцэ́т, -та *м.*

ЛАНЦЕ́ТНИК *зоол.* ланцэ́тнік, -ка *м.*

ЛАНЦЕ́ТНЫЙ ланцэ́тны.

ЛАНЦЕТОВИ́ДНЫЙ ланцэтападо́бны.

ЛАНЬ лань, *род.* ла́ні *ж.*

ЛА́ПА *прям., перен.* ла́па, -пы *ж*; ◇ **попа́сть в ла́пы** тра́піць у ла́пы.

ЛА-ПА́С *г.* Ла-Пас, -са *м.*

ЛА́ПАТЬ *несов. простореч.* ла́паць.

ЛАПИДА́РН||ОСТЬ лапіда́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** лапіда́рны; **~ый стиль** лапіда́рны стыль.

ЛА́ПКА *в разн. знач.* ла́пка, -кі *ж*; **коша́чья л.** *бот.* ага́ткі, -так, *ед.* ага́тка, -кі *ж*; ◇ **ходи́ть на за́дних ~х** *перен.* хадзі́ць на за́дніх ла́пках.

ЛАПЛА́НДЕЦ лапла́ндзец, -дца *м.*

ЛАПЛА́НДИЯ Лапла́ндыя, -дыі *ж.*

ЛАПЛА́НДКА лапла́ндка, -кі *ж.*

ЛАПЛА́НДСКИЙ лапла́ндскі.

ЛА-ПЛА́ТА *р.* Ла-Пла́та, -ты *ж.*

ЛА́ПОТ||НИК *уст.* 1. ла́патнік, -ка *м*; 2. *бран.* лапцю́жнік, -ка *м*; **~НЫЙ** 1. ла́пцевы; 2. лапцю́жны; **~О́К** *уменьш.* ла́пцік, -ка *м.*

ЛА́ПОТЬ ла́пац, -пця *м*; ◇ **ла́пти плести́** *перен. разг.* ла́пці плесці.

ЛА́ПОЧКА *уменьш.* ла́пачка, -кі *ж.*

ЛАПТА́ *спорт.* лапта́, -ты́ *ж.*

ЛАПЧА́ТКА *бот.* дубро́ўка, -кі *ж.*

ЛАПЧАТОНО́ГИЙ *зоол.* лапчастано́гі.

ЛА́ПЧАТЫЙ лапча́сты.

ЛАПША́ ло́кшына, -ны *ж.*

ЛАРЁК ларо́к, *род.* ларка́ *м.*

ЛАРЕ́Ц *м* куфэ́рак, -рка *м*, скры́начка, -кі *ж.*

ЛАРИНГИ́Т *мед.* ларынгі́т, -ту *м.*

ЛАРИНГО́||ЛОГ *мед.* ларынго́лаг, -га *м*; **~ЛО́ГИЯ** *мед.* ларынгало́гія, -гіі *ж*; **~СКО́П** ларынгаско́п, -па *м*; **~СКОПИ́Я** ларынгаскапі́я, -піі *ж*; **~ТО́МИЯ** ларынгато́мія, -міі *ж.*

ЛА́РЧИК *м* куфэ́рачак, -чка *м*, скры́начка, -кі *ж*; ◇ **а л. про́сто открыва́лся** а разга́дка была́ про́стая.

ЛАРЬ *м* скры́ня, -ні *ж*; (*сундук*) ку́фар, -фра *м.*

ЛА́СА *разг.* пля́ма, -мы *ж*, пля́міна, -ны *ж*; (*полоса*) пíсага, -гі *ж.*

ЛА́СКА I ла́ска, -кі *ж.*
ЛА́СКА II *зоол.* ла́ска, -кі *ж.*
ЛАСКА́ВЕЦ *бот.* клапо́ўнік, -ку *м.*
ЛАСКА́ТЕЛЬ|НЫЙ 1. ласка́льны; (*нежный*) пяшчо́тны; 2. *уст.* ліслі́вы, падлі́злівы; 3. *грам.* ласка́льны; **~СТВО** *ср уст.* падлі́зніцтва, -ва *ср,* ліслі́васць, -ці *ж.*
ЛАСКА́ТЬ *несов.* 1. пе́сціць, ла́шчыць (*особенно взор, слух и т. п.*); мілава́ць (*преимущественно о любовных ласках*); галу́біць (*голубить*); 2. (*утешать*) *уст.* це́шыць; **л. себя надеждой** це́шыць сябе́ надзе́яй; **~СЯ** ла́шчыцца; (*взаимно*) мілава́цца, галу́біцца.
ЛАСКА́ЮЩИЙ *прил.* ласка́льны; (*нежный*) пяшчо́тны.
ЛА́СКОВ|О *нареч.* ласка́ва; (*нежно*) пяшчо́тна; **~ОСТЬ** ласка́васць, -ці *ж;* пяшчо́тнасць, -ці *ж;* **~ЫЙ** ласка́вы; (*нежащий*) пяшчо́тны; **~ое сло́во** ласка́вае сло́ва.
ЛА́ССО ласо́ *нескл., ср.*
ЛАСТ I (*мера*) ласт, *род.* ла́ста *м.*
ЛАСТ II *зоол.* пла́вень, *род.* пла́ўня *м.*
ЛА́СТИК I *текст.* ла́сцік, -ку *м.*
ЛА́СТИК II *м разг.* гу́мка, -кі *ж,* рызі́нка, -кі *ж.*
ЛА́СТИКОВЫЙ I *текст.* ла́сцікавы.
ЛА́СТИКОВЫЙ II (*к* **ла́стик** II) гу́мавы, рызі́навы.
ЛА́СТИТЬСЯ *несов.* ла́шчыцца.
ЛА́СТОВЕНЬ *бот.* ла́ставень, -таўню *м.*
ЛА́СТОВИЦА *порт.* цві́кля, -лі *ж.*
ЛА́СТОВНЕВЫЕ *мн. сущ. бот.* ла́стаўневыя, -вых.
ЛА́СТОВЫЙ ла́ставы.
ЛАСТОНО́ГИЕ *мн. сущ. зоол.* плаўнено́гія, -гіх.
ЛА́СТОЧК|А ла́стаўка, -кі *ж;* **~ИН** ла́стаўчын.
ЛА́СТОЧНИК *бот.* ла́ставень, -таўню *м.*
ЛАТ (*денежная единица*) *ист.* лат, *род.* ла́та *м.*
ЛАТА́НИЯ *бот.* лата́нія, -ніі *ж.*
ЛАТА́ННЫЙ *разг.* ла́плены, ла́таны.
ЛАТАТЫ́: зада́ть л. *простореч.* даць лататы́; даць драпака́.
ЛАТА́ТЬ *несов. разг.* ла́піць, ла́таць; **~СЯ** *страд.* ла́піцца, ла́тацца.
ЛАТВИ́|ЕЦ латві́ец, -ві́йца *м;* **~ЙКА** латві́йка, -кі *ж.*
ЛАТВИ́ЙСКАЯ СОВЕ́ТСКАЯ СОЦИАЛИСТИ́ЧЕСКАЯ РЕСПУ́БЛИКА Латві́йская Саве́цкая Сацыялісты́чная Рэспу́бліка.
ЛАТВИ́ЙСКИЙ латві́йскі.
ЛА́ТВИЯ Ла́твія, -віі *ж.*
ЛАТЕ́НТНЫЙ латэ́нтны.
ЛАТЕРА́ЛЬНЫЙ *анат., лингв.* латэра́льны.
ЛАТЕРИ́Т *геол.* латэры́т, -ту *м.*
ЛАТИН|ИЗА́ЦИЯ латынізацыя, -цыі *ж;* **~ИЗИ́РОВАННЫЙ** латынізава́ны; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* латынізава́ць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** латынізава́цца; **~И́ЗМ** латыні́зм, -ма *м;* **~И́СТ** латыні́ст, -та *м.*
ЛАТИ́НИЦА *лингв.* латы́нка, -кі *ж.*
ЛАТИ́НСКИЙ латы́нскі.
ЛАТИ́НЯНИН *ист.* латы́нянін, -на *м.*
ЛАТИФУ́НДИЯ *ист., эк.* латыфу́ндыя, -дыі *ж.*
ЛА́ТН|ИК *ист.* ла́тнік, -ка *м,* па́нцырнік, -ка *м;* **~ЫЙ** ла́тны, па́нцырны.
ЛАТУ́К *бот.* лату́к, -ку *м;* **~ОВЫЙ** лату́кавы.
ЛАТУ́|ННЫЙ лату́невы, масянжо́вы; **~НЬ** *ж* лату́нь, -ні *ж,* мо́сенж, -жу *м.*
ЛА́ТЫ *ед. нет, ист.* ла́ты, *род.* лат *ед. нет,* па́нцыр, -ра *м.*
ЛАТЫ́НЬ латы́нь, -ні *ж, мн. нет.*
ЛАТЫ́Ш латы́ш, -ша́ *м;* **~КА** латы́шка, -кі *ж;* **~СКИЙ** латы́шскі.
ЛА́УН-ТЕ́ННИС ла́ўн-тэ́ніс, -са *м.*
ЛАУРЕА́Т лаўрэа́т, -та *м;* **л. Ста́линской пре́мии** лаўрэа́т Ста́лінскай прэ́міі.
ЛАФА́ *простореч.* лафа́, -фы́ *ж.*
ЛАФЕ́Т лафе́т, -та *м;* **~НЫЙ** лафе́тавы, лафе́тны.
ЛАФИ́Т (*сорт вина*) лафі́т, -ту *м.*
ЛА́ЦИУМ *ист.* Ла́цыум, -ма *м.*
ЛА́ЦКАН штры́фель, -фля *м.*
ЛАЧУ́|ГА хаці́на, -ны *ж,* халу́па, -пы *ж;* **~ЖКА** *уменьш.* хаці́нка, -кі *ж,* халу́пка, -кі *ж.*
ЛА́ЮЩИЙ *прил.* гаўклі́вы; **л. го́лос** гаўклі́вы го́лас.
ЛА́Я|НИЕ браха́нне, -ння *ср;* (*тявканье*) га́ўканне, -ння *ср;* **~ТЬ** *несов.* браха́ць; (*тявкать*) га́ўкаць; **~ТЬСЯ** *простореч.* грызці́ся, ла́яцца.
ЛГАНЬЁ *ср разг.* ілганнё, -ння́ *ср,* хлусня́, -ні́ *ж,* мана́, -ны́ *ж.*
ЛГАТЬ *несов.* ілга́ць, хлусі́ць, мані́ць.
ЛГУН ілгу́н, *род.* ілгуна́ *м,* хлус, *род.* хлу́са *м,* маню́ка, -кі *м;* **~И́ШКА** *пренебр.* маню́ка, -кі *м;* **~ЬЯ** ілгу́ха, -хі *ж,* хлусе́лька, -кі *ж,* маню́ка, -кі *ж.*
ЛЕБЕДА́ *бот.* лебяда́, -ды́ *ж.*
ЛЕБЕД|ЁНОК *м* лебедзяня́, -ня́ці *ср;* *ласк.* лебядзя́тка, -кі *ср;* **~И́НЫЙ** *прям., перен.* лебядзі́ны; **~и́ная пе́сня** *перен.* лебядзі́ная пе́сня.
ЛЕБЁДКА I *тех.* лябёдка, -кі *ж.*
ЛЕБЁДКА II 1. *зоол.* лябёдка, -кі *ж;* 2. *перен.* галу́бка, -кі *ж,* лябёдка, -кі *ж.*
ЛЕБЕДО́ВЫЕ *мн. сущ. бот.* лебядо́выя, -вых.
ЛЕБЁДЧИК *тех.* лябёдчык, -ка *м.*
ЛЕ́БЕДЬ ле́бедзь, -дзя *м.*
ЛЕБЕЗИ́ТЬ *несов. разг.* выдыга́ць (*перад кім-чым*); (*подольщаться*) падлабу́ньвацца, падлі́звацца (*да каго-чаго*).
ЛЕБЯ́ЖИЙ лебядзі́ны.
ЛЕВ I *зоол.* леў, *род.* ільва́, *мн.* ільвы́, -во́ў *м;* **морско́й лев** *зоол.* марскі́ леў; **муравьи́ный лев** *зоол.* мурашы́ны леў.
ЛЕВ II (*денежная единица*) леў, *род.* ле́ва *м.*
ЛЕВА́ДА *обл.* лява́да, -ды *ж.*
ЛЕВА́К *полит. разг.* лява́к, -ка́ *м.*
ЛЕВА́НТ *ист.* Лева́нт, -та *м.*
ЛЕВА́|ЦКИЙ лява́цкі; **~ЧЕСТВО** *полит.* лява́цтва, -ва *ср.*
ЛЕ́ВАЯ *сущ. полит.* ле́вая, -вай *ж.*
ЛЕ́ВЕЛЛЕР *полит. ист.* ле́велер, -ра *м.*
ЛЕВЕ́ТЬ *несов. полит.* ляве́ць.
ЛЕВИАФА́Н *миф., перен.* левіяфа́н, -на *м.*
ЛЕВИЗНА́ *полит.* левізна́, -ны́ *ж.*
ЛЕВИРА́Т *этн.* леві́ра́т, -ту *м.*
ЛЕВКА́С *тех.* ляўка́с, -су *м.*
ЛЕВКО́Й *м* ляўко́нія, -ніі *ж,* мацыёла, -лы *ж.*
ЛЕВОБЕРЕ́Ж|НЫЙ левабярэ́жны; **~ЬЕ** левабярэ́жжа, -жжа *ср.*
ЛЕВОСТОРО́ННИЙ левабако́вы.
ЛЕВОФЛАНГО́ВЫЙ *воен.* левафланго́вы.
ЛЕВУЛЁЗА *хим.* левулёза, -зы *ж.*
ЛЕВРЕ́ТКА леўрэ́тка, -кі *ж.*
ЛЕВША́ *м и ж* ляўша́, -шы́ *м и ж;* ляўшу́н, -на́ *м* (*только о мужчинах*).
ЛЕ́В|ЫЙ 1. *прил. в разн. знач.* ле́вы; 2. *сущ. полит.* ле́вы, -вага *м;* ◇ **встать с ~ой ноги́** уста́ць з ле́вай нагі́.
ЛЕГА́ВЫЙ *охот.* вы́жал, -жла *м.*
ЛЕГАЛИЗ|А́ЦИЯ легаліза́цыя, -цыі *ж;* **~О́ВАННЫЙ** легалізава́ны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов.* легалізава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** легалізава́цца.
ЛЕГА́ЛЬН|О *нареч.* лега́льна; **~ОСТЬ** лега́льнасць, -ці *ж;* **~ЫЙ** лега́льны.
ЛЕГА́Т *ист., церк.* лега́т, -та *м.*
ЛЕГА́ТО *нареч. муз.* лега́то.
ЛЕГГО́РН (*порода кур*) лего́рн, -на *м.*
ЛЕГЕ́НД|А *в разн. знач.* леге́нда, -ды *ж;* **~А́РНОСТЬ** легенда́рнасць, -ці *ж;* **~А́РНЫЙ** легенда́рны.
ЛЕГИО́Н легіён, -на *м;* **~ЕР** легіяне́р, -ра *м;* **~Е́РСКИЙ** легіяне́рскі.

ЛЕГИ́Р||ОВАНИЕ *тех.* легі́раванне, -ння *ср*; **~ОВАННЫЙ** *прич., прил.* легі́раваны; **~ованная сталь** легі́раваная сталь; **~УЮЩИЙ** *прил.* легіравальны.
ЛЕГИСЛА||ТИ́ВНЫЙ легіслатыўны; **~ТУ́РА** *юр.* легіслату́ра, -ры *ж.*
ЛЕГИТИМ||А́ЦИЯ *юр.* легітыма́цыя, -цыі *ж*; **~И́ЗМ** *ист., полит.* легітымі́зм, -ма *м*; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов. юр.* легітымі́раваць; **~И́СТ** легітымі́ст, -та *м*; **~И́СТКА** легітымі́стка, -кі *ж.*
ЛЁГК||ИЙ *в разн. знач.* лёгкі; **~ая инду́стрия, промы́шленность** лёгкая інду́стрыя, прамысло́васць; **~ая атле́тика** *спорт.* лёгкая атле́тыка; **~ое вино́** лёгкае віно́; **~ое чте́ние** *разг.* лёгкае чыта́нне; ✧ **с ~ой руки́** з лёгкай рукі́; **лёгок на поми́не!** *разг.* лёгкі на ўспамі́н; ≅ пра воўка памо́ўка, а во́ўк і тут; **с ~им се́рдцем** ■ лёгкім сэ́рцам.
ЛЕГКО́ *нареч., сказ.* лёгка.
ЛЕГКОАТЛЕ́Т *спорт.* лёгкаатле́т, -та *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** *спорт.* лёгкаатлеты́чны.
ЛЕГКОВЕ́Р||ИЕ *ср*, **~НОСТЬ** *ж* лёгкаве́рнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** лёгкаве́рны.
ЛЕГКОВЕ́С *спорт.* (спартсме́н) лёгкай вагі́; (*атлет*) лёгкаатле́т, -та *м.*
ЛЕГКОВЕ́СН||ОСТЬ *перен.* лёгкава́жнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** *прям., перен.* лёгкава́жны.
ЛЕГКОВО́Й легкавы́; **л. автомоби́ль** легкавы́ аўтамабі́ль; **л. изво́зчик** рамі́знік.
ЛЕГКОВООРУЖЁННЫЙ *воен. ист.* лёгкаўзбро́ены.
ЛЕГКОВОСПЛАМЕНЯ́ЮЩИЙСЯ *прил.* **1.** лёгкі на зага́ранне; **2.** *перен.* па́лкі.
ЛЕГКОДОРО́ЖНЫЙ *спец.* лёгкадаро́жны.
ЛЁГК||ОЕ *сущ. анат.* лёгкае, -кага *ср*; **воспале́ние ~их** *мед.* запале́нне лёгкіх.
ЛЕГКОКРЫ́ЛЫЙ лёгкакры́лы.
ЛЕГКОМОТО́РНЫЙ *тех.* лёгкамато́рны.
ЛЕГКОМЫ́СЛ||ЕННО *нареч.* лёгкаду́мна; **~ЕННОСТЬ** лёгкаду́мнасць, -ці *ж*; **~ЕННЫЙ** лёгкаду́мны; **~ИЕ** *ср* лёгкаду́мнасць, -ці *ж.*
ЛЕГКОНО́ГИЙ лёгкано́гі.
ЛЕГКОПЛА́ВК||ИЙ лёгкапла́ўкі; **~ОСТЬ** лёгкапла́ўкасць, -ці *ж.*
ЛЕГКОПРОНИЦА́ЕМЫЙ лёгкапраніка́льны.
ЛЕГКОРАСТВОРИ́МЫЙ *хим.* лёгкараствара́льны.
ЛЕГКОСЕМЕННО́Й *бот.* лёгканасе́нны.
ЛЁГКОСТЬ лёгкасць, -ці *ж.*
ЛЕГКОУЛЕТУ́ЧИВАЮЩИЙСЯ *хим.* лёгкавыпа́рны, лёгкавыпа́рвальны.
ЛЕГКОУСВОЯ́ЕМЫЙ лёгказасвая́льны, лёгказасво́йны.
ЛЕГКОХО́ДНЫЙ лёгкахо́дны.
ЛЁГОНЬКИЙ *разг.* лёгенькі.
ЛЕГО́||НЬКО *нареч. разг.* лёгенька; (*слегка*) злёгку; **~ХОНЬКО** *нареч. разг.* лёгенечка; (*слегка*) злёгеньку.
ЛЁГОЧНЫЙ лёгачны.
ЛЕГЧА́ЙШИЙ найлягчэ́йшы.
ЛЕГЧА́ТЬ *несов.* лягчэ́ць.
ЛЕ́ГЧЕ *сравн. ст.* **1.** *нареч.* лягчэ́й; **2.** *прил.* лягчэ́йшы; ✧ **час о́т часу не л.** чым дале́й, тым цяжэ́й.
ЛЁД лёд, *род.* лёду, *мн.* ільды́, -до́ў *м*; **дрейфу́ющий лёд** дрэйфу́ючы лёд; ✧ **лёд разби́т** *перен.* лёд разбі́ты.
ЛЕДА́ЩИЙ *простореч.* ляда́шчы.
ЛЕДЕНЕ́||ТЬ *несов.* ледзяне́ць; (*коченеть*) карчане́ць, дубе́ць; ✧ **кровь ~ет** *перен.* кроў ледзяне́е (сты́не).
НЕДЕ́ЛЯ *ж* ты́дзень, *род.* ты́дня *м*; ◇ **бе́з году н.** *разг. ирон.* без го́ду ты́дзень.

НЕДЕРЖА́НИЕ нетрыма́нне, -ння *ср*; **н. мочи́** *мед.* нетрыма́нне мачы́.

НЕДЁШЕВО *нареч.* **1.** ната́нна; **2.** *перен.* нялё́гка.

НЕДЕ́ЯТЕЛЬН||О *нареч.* нядзе́йна; неакты́ўна; **~ЫЙ** нядзе́йны; (*неактивный*) неакты́ўны.

НЕДИСЦИПЛИНИ́РОВАНН||О *нареч.* недысцыплінава́на; **~ОСТЬ** недысцыплінава́насць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недысцыплінава́ны.

НЕДИФФЕРЕНЦИ́РОВАННЫЙ недыферэнцы́раваны.

НЕДОБИРА́ТЬ *несов.* недабіра́ць.

НЕДОБИ́ТЫЙ недабі́ты.

НЕДОБО́Р недабо́р, -ру *м*.

НЕДОБР||А́ННЫЙ недабра́ны; **~А́ТЬ** *сов.* недабра́ць.

НЕДО́БРОЕ *сущ.* нядо́брае, -рага *ср*.

НЕДОБРОЖЕЛА́ТЕЛЬ незычлі́вец, -лі́ўца *м*; нядобразычлі́вец, -лі́ўца *м*; не́прыяцель, -ля *м*; зло́снік, -ка *м*, зласлі́вец, -лі́ўца *м*; (*враг*) во́раг, -га *м*; **~НИЦА** *ж* незычлі́віца, -цы *ж*; нядобразычлі́віца, -цы *ж*; не́прыяцелька, -кі *ж*; зло́сніца, -цы *ж*; зласлі́віца, -цы *ж*; во́раг, -га *м*; **~НО** *нареч.* незычлі́ва; нядобразычлі́ва; па-зло́сніцку, зласлі́ва; варо́жа; *см.* **недоброжела́тельный; ~НОСТЬ** *ж* незычлі́васць, -ці *ж*; нядобразычлі́васць, -ці *ж*; зло́сніцтва, -ва *ср*, зласлі́васць, -ці *ж*; варо́жасць, -ці *ж*; *см.* **недоброжела́тельный; ~НЫЙ** незычлі́вы; нядобразычлі́вы; зло́сніцкі, зласлі́вы; (*враждебный*) варо́жы; **~СТВО** *см.* **недоброжела́тельность.**

НЕДОБРОКА́ЧЕСТВЕНН||ОСТЬ нядобрая́каснасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нядобрая́касны.

НЕДОБРОСО́ВЕСТН||О *нареч.* нядобрасумле́нна; **~ОСТЬ** нядобрасумле́ннасць,-ці *ж*; **~ЫЙ** нядобрасумле́нны.

НЕДО́БР||ЫЙ 1. (*злой*) нядо́бры; **2.** (*плохой*) нядо́бры, дрэ́нны; **~ые ве́сти** нядо́брыя (дрэ́нныя) ве́сткі.

НЕДОВА́РЕННЫЙ недава́раны.
НЕДОВЕ́РИЕ *ср* недаве́р'е, -р'я *ср*, недаве́р, -ру *м.*
НЕДОВЁРНУТЫЙ недакру́чаны.
НЕДОВЕРНУ́ТЬ *сов.* недакруці́ць.
НЕДОВЁРТЫВАТЬ *несов.* недакру́чваць; **~СЯ** недакру́чвацца.
НЕДОВЕ́РЧИВ||О *нареч.* недаве́рліва; **~ОСТЬ** недаве́рлівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недаве́рлівы.
НЕДОВЕРШЁННЫЙ недаве́ршаны.
НЕДОВЕ́С *м* недава́жка, -кі *ж*; (*недовешивание*) недава́жванне, -ння *ср*; **~ИТЬ** *сов.* недава́жыць; **~ОК** *м* недава́жка, -кі *ж.*
НЕДОВЕ́Ш||ЕННЫЙ недава́жаны; **~ИВАНИЕ** недава́жванне, -ння *ср*; **~ИВАТЬ** *несов.* недава́жваць.
НЕДОВО́ЛЬ||НАЯ *сущ.* нездаво́леная, -най *ж*; **~НО** *нареч.* нездаво́лена; **~НЫЙ 1.** *прил.* нездаво́лены; **2.** *сущ.* нездаво́лены, -нага *м*; **~СТВО** *ср* нездаво́ленасць, -ці *ж*, нездавальне́нне, -ння *ср.*
НЕДОВЫПОЛНЕ́НИЕ недавыкана́нне, -ння *ср.*
НЕДОВЫ́ПОЛН||ЕННЫЙ недавы́кананы; **~ИТЬ** *сов.* недавы́канаць; **~Я́ТЬ** *несов.* недавыко́нваць; **~Я́ТЬСЯ** *страд.* недавыко́нвацца.
НЕДОВЫ́ПУСК недавы́пуск, -ку *м.*
НЕДОВЫ́РАБОТ||АННЫЙ недавы́працаваны, недавы́раблены; **~АТЬ** *сов.* недавы́працаваць, недавы́рабіць; **~КА** *ж* недавыпрацо́ўка, -кі *ж*, недавы́рабка, -кі *ж*, недавы́раб, -бу *м.*
НЕДОГА́ДЛИВ||ОСТЬ нездага́длівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нездага́длівы.
НЕДОГЛ||ЯДЕ́ТЬ *сов.* недагле́дзець; **~Я́ДЫВАТЬ** *несов. разг.* недагле́джваць.
НЕДОГОВА́РИВ||АНИЕ недагаво́рванне, -ння *ср*; **~АТЬ** *несов.* недагаво́рваць.
НЕДОГОВОРЁННОСТЬ недагаво́ранасць, -ці *ж*; недамо́ўленасць, -ці *ж.*
НЕДОГР||УЖА́ТЬ *несов.* недагружа́ць; **~У́З** недагру́з, -зу *м*; **~УЗИ́ТЬ** *сов.* недагрузі́ць; **~У́ЗКА** недагру́зка, -кі *ж.*
НЕДОДАВА́ТЬ *несов.* недадава́ць; **~СЯ** *страд.* недадава́цца.
НЕДОДА́||АННЫЙ недада́дзены; **~А́ТЬ** *сов.* недада́ць; **~А́ЧА** *ж* недадава́нне, -ння *ср*, недада́ча, -чы *ж.*
НЕДОДЕ́Л||АННОСТЬ недаро́бленасць, -ці *ж*; **~АННЫЙ** недаро́блены; **~КА** недаро́бка, -кі *ж.*
НЕДОД||ЕРЖА́ТЬ *сов. фот., тех.* недатрыма́ць; **~Е́РЖКА** *фот.* недатры́мка, -кі *ж.*
НЕДОДУ́МАННЫЙ недаду́маны.
НЕДОЕДА́||НИЕ недаяда́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* недаяда́ць.
НЕДОЕ́||ДЕННЫЙ недае́дзены; **~СТЬ** *сов.* недае́сці.
НЕДОЖИ́Н *с.-х.* недажы́н, -ну *м.*
НЕДОЖО́Г *тех.* недапа́л, -лу *м.*
НЕДОЗВО́Л||ЕННЫЙ недазво́лены; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** *уст.* недапушча́льны; недазво́льны.
НЕДОЗРЕ́Л||ОСТЬ *прям., перен.* недаспе́ласць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недаспе́лы.
НЕДОЙМ||КА нядо́імка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** нядо́імкавы, нядо́імны; **~ЩИК** нядо́імшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** нядо́імшчыца, -цы *ж.*
НЕДОКА́З||АННОСТЬ недака́занасць, -ці *ж*, недаве́дзенасць, -ці *ж*; **~АННЫЙ** недака́заны, недаве́дзены; **~А́ТЕЛЬНЫЙ** нядо́казны, бяздо́вадны; (*неубедительный*) непераканаўчы; (*неосновательный*) няслу́шны; **~У́ЕМОСТЬ** недаказа́льнасць, -ці *ж*; **~У́ЕМЫЙ** недаказа́льны.
НЕДОКА́Л *м тех.* недагарто́ўка, -кі *ж*, недага́рт, -ту *м.*
НЕ́ДОКИСЬ *хим.* не́дакіс, -су *м.*
НЕДОКО́НЧЕНН||ОСТЬ недако́нчанасць, -ці *ж*; няско́нчанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недако́нчаны; (*неоконченный*) няско́нчаны.
НЕДОКО́РМ недако́рм, -му *м.*
НЕДОЛГА́: (вот) и вся н. *разг.* (вось) і ўсё.
НЕДО́Л||ГИЙ нядо́ўгі; **~ГО** *нареч.* нядо́ўга.
НЕДОЛГОВЕ́ЧН||ОСТЬ нядоўгаве́чнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нядоўгаве́чны.
НЕДОЛГОВРЕ́МЕНН||ОСТЬ нядоўгача́снасць, -ці *ж*, кароткатэрміно́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нядоўгача́сны; (*непродолжительный*) кароткатэрміно́вы.
НЕДОЛЁТ *воен.* недалёт, -ту *м.*
НЕДОЛО́В *рыбол.* недало́ў, -ло́ву *м.*
НЕДОЛЮ́БЛИВАТЬ *несов. разг.* недалю́бліваць.
НЕДО́ЛЯ *уст.* нядо́ля, -лі *ж.*
НЕДОМЕ́Р||ЕННЫЙ недаме́раны; **~ИВАТЬ** *несов.* недаме́рваць, недамяра́ць; **~ИТЬ** *сов.* недаме́раць; **~ОК** недаме́рак, -рка *м*; **~Я́ТЬ** *несов.* недамяра́ць, недаме́рваць.
НЕДОМОГА́||НИЕ недамага́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* недамага́ць; *переводится также безличным глаг.* нездаро́віцца; **он ~ет** яму́ нездаро́віцца.
НЕДОМО́Л недамо́л, -лу *м.*
НЕДОМО́ЛВКА недагаво́ранасць, -ці *ж*, недамо́ўка, -кі *ж.*
НЕДОМЫ́СЛИЕ *ср* недамы́сленасць, -ці *ж*; (*глупость*) глу́пства, -ва *ср*, бязглу́здасць, -ці *ж*; (*необдуманность*) неабду́манасць, -ці *ж.*
НЕДОН||ЕСЕ́НИЕ *юр.* неданясе́нне, -ння *ср*; **~ОСИ́ТЕЛЬ** *юр.* недано́счык, -ка *м*; **~ОСИ́ТЕЛЬСТВО** *юр.* неданясе́нне, -ння *ср.*
НЕДОНО́СОК недано́сак, -ска *м.*
НЕДОНО́ШЕНН||ОСТЬ недано́шанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недано́шаны.
НЕДООЦЕНЁННЫЙ недааца́нены.
НЕДООЦЕ́Н||ИВАТЬ *несов.* недааца́ньваць; **~ИВАТЬСЯ** *страд.* недааца́ньвацца; **~И́ТЬ** *сов.* недаацані́ць; **~КА** недааца́нка, -кі *ж.*
НЕДОП||ЁК недапёк, -ку *м*; **~ЕКА́ТЬ** *несов.* недапяка́ць; **~ЕЧЁННЫЙ** недапёчаны; **~Е́ЧЬ** *сов.* недапячы́.
НЕДОПИВА́ТЬ *несов.* недапіва́ць.
НЕДОПИСА́ТЬ *сов.* **1.** (*пером*) недапіса́ць; **2.** (*кистью*) недамалява́ць.
НЕДОП||ИТО́Й, ~И́ТЫЙ недапі́ты.
НЕДОПИ́ТЬ *сов.* недапі́ць.
НЕДОПЛА́||ТА *ж* недапла́чванне, -ння *ср*, недапла́та, -ты *ж*; **~ТИ́ТЬ** *сов.* недаплаці́ць; **~ЧИВАТЬ** *несов.* недапла́чваць.
НЕДОПОЛ||УЧА́ТЬ *несов.* недаатры́мліваць; **~УЧА́ТЬСЯ** *несов.* недаатры́млівацца; **~У́ЧЕННЫЙ** недаатры́маны; **~УЧИ́ТЬ** *сов.* недаатрыма́ць.
НЕДОПОТРЕБЛЕ́НИЕ недаспажыва́нне, -ння *ср.*
НЕДОПРОИЗВО́ДСТВО *ср* недавы́раб, -бу *м.*
НЕДОПУСТИ́М||О *нареч.* недапушча́льна; **~ОСТЬ** недапушча́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недапушча́льны.
НЕДОПУЩЕ́НИЕ недапушча́нне, -ння *ср.*
НЕДОРАЗВИ́Т||ИЕ недаразві́ццё, -цця́ *ср*; **~ОСТЬ** недаразві́тасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** недаразві́ты.
НЕДОРАЗУМЕ́НИЕ непаразуме́нне, -ння *ср.*
НЕДОРО́Г||О *нареч.* нядо́рага; **~О́Й** недарагі́.
НЕДОРО́Д недаро́д, -ду *м.*
НЕ́ДОРОСЛЬ недаро́стак, -тка *м.*
НЕДОСЕ́||В *с.-х.* недасе́ў, -се́ву *м*; **~ЯТЬ** *сов.* недасе́яць.
НЕДОС||ИДЕ́ТЬ *сов.* недасядзе́ць, недасе́дзець; **~И́ЖИВАТЬ** *несов.* недасе́джваць.
НЕДОСЛЫШ||АННЫЙ недачу́ты; **~АТЬ** *сов.* недачу́ць; **~КА** *ж разг.* недачува́нне, -ння *ср*; **по ~ке** не дачу́ўшы.
НЕДОСМ||А́ТРИВАТЬ *несов.* (*за кем-чем*) недагляда́ць (*каго-што*); **~О́ТР** недагля́д, -ду *м*; **~О́ТРЕННЫЙ** недагле́джаны; **~ОТРЕ́ТЬ** *сов.* (*за кем-чем*) недагле́дзець (*каго-што*).

НЕДОСО́Л недасо́л, -лу *м*.
НЕДОСПА́ТЬ *сов*. недаспа́ць.
НЕДОСПЕ́ЛЫЙ недаспе́лы.
НЕДОСТА||ВА́ТЬ *несов. безл.* неставаць; (*нехватать*) не хапа́ць; бракава́ць; **∼ёт сил** сіл нестае́; **∼ёт двух рубле́й** не хапа́е двух рублёў; **∼ёт слов, что́бы ...** не хапа́е слоў, каб ...; **нам о́чень вас ∼ёт** нам ве́льмі вас не хапа́е (брaку́е); ◇ **э́того (ещё) ∼ва́ло!** *разг.* гэ́тага (яшчэ́) не хапа́ла!
НЕДОСТА́ВЛЕННЫЙ недаста́ўлены.
НЕДОСТА́||ТОК *м* 1. (*недочёт*) недахо́п, -пу *м*; (*изъян*) зага́на, -ны *ж*; (*погрешность*) хі́ба, -бы *ж*; **∼тки зре́ния** зага́ны зро́ку; 2. (*нехватка*) недахо́п, -пу *м*; нястача, -чы *ж*; брак, *род.* бра́ку *м*; **нет ∼тка** (*в ком, в чём*) няма́ нястачы (*у кім, у чым*), не браку́е (*каго-чаго*); 3. (*бедность, нужда*) нястача, -чы *ж*; ◇ **за ∼тком** з-за недахо́пу (праз недахо́п, з прычы́ны недахо́пу); **за ∼тком вре́мени** з-за недахо́пу ча́су; **∼ТОЧНО** 1. *нареч.* недаво́лі, нядо́сыць; 2. *сказ.* ма́ла, недаво́лі, нядо́сыць; **∼ТОЧНОСТЬ** 1. недастатко́васць, -ці *ж*; невыстарча́льнасць, -ці *ж*; 2. незамо́жнасць, -ці *ж*, недаста́тнасць, -ці *ж*; *см.* **недоста́точный**; **∼ТОЧНЫЙ** 1. недастатко́вы; (*не исчерпывающий*) невыстарча́льны; 2. (*незажиточный*) незамо́жны, недаста́тны; ◇ **∼точный глаго́л** *грам.* недастатко́вы дзеясло́ў; **∼ТЬ** *сов.* нястаць; (*нехватить*) не хапі́ць; **∼ЧА** нястача, -чы *ж*, недаста́ча, -чы *ж*; **∼Ю́ЩИЙ** якога (якой) не хапа́е; нехапа́ючы; (*отсутствующий*) адсу́тны.
НЕДОСТИГА́ЕМ||ОСТЬ, ∼ЫЙ *см.* **недостижи́м||ость, ∼ый.**
НЕДОСТИЖИ́М||ОСТЬ недася́жнасць, -ці *ж*, недасяга́льнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** недася́жны, недасяга́льны.
НЕДОСТОВЕ́РН||ОСТЬ неверaго́днасць, -ці *ж*, няпэ́ўнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** неверaго́дны, няпэ́ўны.
НЕДОСТО́ЙН||О *нареч.* ганебна; амара́льна; **∼ОСТЬ** гане́бнасць, -ці *ж*; амара́льнасць, -ці *ж*; *см.* **недосто́йный**; **∼ЫЙ** 1. (*нестоящий*) няварты; **быть ∼ым чего́-либо** быць ня́вартым (не заслуго́ўваць) чаго́-не́будзь; 2. (*не заслуживающий уважения*) ня́варты паваґі; (*бесчестный*) гане́бны; (*безнравственный*) амара́льны; **∼ый посту́пок** гане́бны ўчы́нак; **∼ый челове́к** чалаве́к, ня́варты паваґі (гане́бны чалаве́к).
НЕДОСТР||А́ИВАТЬ *несов.* недабудо́ўваць; **∼О́ЕННЫЙ** недабудава́ны; **∼О́ИТЬ** *сов.* недабудава́ць.
НЕДОСТУ́ПН||О недасту́пна; **∼ОСТЬ** недасту́пнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** недасту́пны.
НЕДОСУ́Г 1. (*отсутствие свободного времени*) адсу́тнасць (недахо́п, брак) ча́су; **за ∼ом** з-за адсу́тнасці (недахо́пу) ча́су; 2. (*нет времени*) няма́ калі́, не́калі, няма́ ча́су; **мне н.** мне няма́ калі́ (не́калі, няма́ ча́су).
НЕДОСЧ||ИТА́ТЬСЯ *сов.* недалі́чыцца; **∼И́ТЫВАТЬ** *несов.* недалі́чваць; **∼И́ТЫВАТЬСЯ** недалі́чвацца.
НЕДОСЫПА́НИЕ недасыпа́нне, -ння *ср*.
НЕДОСЫ́ПАТЬ *сов.* недасы́паць.
НЕДОСЫПА́ТЬ I *несов.* (*к* **недоспа́ть**) недасыпа́ць.
НЕДОСЫПА́ТЬ II *несов.* (*к* **недосы́пать**) недасыпа́ць.
НЕДОСЯГА́ЕМ||О *нареч.* недася́жна, недасяга́льна; **∼ОСТЬ** недася́жнасць, -ці *ж*, недасяга́льнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** недася́жны, недасяга́льны.
НЕДОТЁПА *разг. неодобр.* няўклю́да, -ды *м* и *ж*; няўда́ча, -чы *м* и *ж*.
НЕДОТЛЕ́ВШИЙ недатле́лы.
НЕДОТРО́ГА 1. *разг.* недаты́ка, -кі *м* и *ж*; недаткнёны, -нага *м* (*о мужчине*); недаткнёная, -най *ж* (*о женщине*); 2. *бот.* мімо́за, -зы *ж*.
НЕДОУ́ЗДОК *м* ка́нтар, -ра *м*, абро́ць, -ці *ж*, во́брaць, -ці *ж*.
НЕДОУМ||ЕВА́ТЬ *несов.* не разуме́ць, не магчы́ зразуме́ць; (*изумляться*) здзіўля́цца, дзіві́цца; **∼ЕВА́ЮЩИЙ** *см.* **недоуме́нный**; **∼Е́НИЕ** *ср* неўразуме́нне, -ння *ср*; (*изумление*) здзіўле́нне, -ння *ср*; (*растерянность*) збянтэ́жанасць, -ці *ж*, разгу́бленасць, -ці *ж*; **∼Е́ННО** *нареч.* не разуме́ючы; здзі́ўлена; (*растерянно*) збянтэ́жана, разгу́блена; **∼Е́ННЫЙ** неўразуме́нны; (*изумлённый*) здзі́ўлены; (*растерянный*) збянтэ́жаны, разгу́блены; **∼е́нный взгляд** неўразуме́нны (здзі́ўлены, збянтэ́жаны) по́гляд; **∼е́нный вопро́с** неўразуме́ннае (дзі́ўнае, ня́снае) пыта́нне; **∼е́нное молча́ние** збянтэ́жанае маўча́нне.
НЕДОУ́МОК *разг.* прыду́ркаваты, -тага *м*, недапе́чаны, -нага *м*.
НЕДОУЧЁТ недаўлі́к, -ку *м*.
НЕДОУ́ЧКА недаву́к, -ка *м*, недаву́чка, -кі *м*.
НЕДОХВА́Т *м*, **∼КА** *ж разг.* недахо́п, -пу *м*, нястача, -чы *ж*.
НЕДОХО́ДН||ОСТЬ недахо́днасць, -ці *ж*; (*неприбыльность*) непрыбытко́васць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** недахо́дны; (*неприбыльный*) непрыбытко́вы.
НЕДОХО́ДЧИВЫЙ *разг.* недахо́длівы.
НЕДОЧЁТ *м* 1. (*нехватка суммы*) нястача, -чы *ж*, недаста́ча, -чы *ж*; 2. (*ошибка, изъян*) недахо́п, -пу *м*.
НЕДОЧ||ИТА́ТЬ *сов.* недачыта́ць; **∼И́ТЫВАТЬ** *несов.* недачы́тваць.
НЕ́ДР||А 1. не́тры, -раў *ед. нет*; **земны́е н.** зямны́я не́тры; **разрабо́тка недр** распрацо́ўка не́траў; 2. *перен.* не́тры, -раў *ед. нет*; (*толща*) гу́шчы, -шчаў, *ед.* гу́шча, -шчы *ж*; (*глубина*) глыбіня́, -ні́ *ж*; ■ **∼ах Поле́сья** у не́трах Пале́сся; **в ∼ах души́** у глыбіні́ душы́.
НЕДРЕМА́НН||ЫЙ *уст.* нядрэ́мны; (*бдительный*) пі́льны; **∼ое о́ко** нядрэ́мнае во́ка.
НЕДРЕ́МЛЮЩИЙ нядрэ́мны; (*бдительный*) пі́льны.
НЕ́ДРУГ не́прыяцель, -ля *м*; (*враг*) во́раг, -га *м*; (*недоброжелатель*) зло́снік, -ка *м*.
НЕДРУЖЕЛЮ́Б||ИЕ *ср* недружалю́бнасць, -ці *ж*, непрыя́знасць, -ці *ж*; варо́жасць, -ці *ж*; **∼НО** *нареч.* недружалю́бна, непрыя́зна, варо́жа; **∼НЫЙ** недружалю́бны, непрыя́зны; (*враждебный*) варо́жы.
НЕДРУ́ЖНЫЙ нядру́жны.
НЕДУ́||Г *м* хваро́ба, -бы *ж*, не́мач, -чы *ж*; (*слабость*) сла́басць, -ці *ж*; **∼ЖИТЬСЯ** *несов. безл. обл.* няду́жыцца; **∼ЖНЫЙ** *уст.* няду́жы, хво́ры.
НЕДУ́Р||НО *нареч., сказ.* нядрэ́нна, някепска, няблага; (*ничего себе*) нішто́ сабе́; **∼НО́Й** 1. нядрэ́нны, някепскі, неблагі́; (*ничего себе*) нішто́ сабе́; 2. (*о внешности*) няброы́дкі; (*красивый*) прыго́жы; (*ничего себе*) нішто́ сабе́ (з твару, з вы́гляду).
НЕДЮ́ЖИНН||ОСТЬ незвыча́йнасць, -ці *ж*; выда́тнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** незвыча́йны; (*выдающийся*) выда́тны.
НЕЕСТЕ́СТВЕНН||О *нареч.* ненатура́льна; штучна; незвыча́йна; **н. большо́й** незвыча́йна вялі́кі; **∼ОСТЬ** ненатура́льнасць, -ці *ж*; шту́чнасць, -ці *ж*; незвыча́йнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** ненатура́льны; (*искусственный*) шту́чны; (*необычайный*) незвыча́йны; **∼ая улы́бка** ненатура́льная ўсме́шка; **∼ая весёлость** шту́чная (ненатура́льная) вясёласць.
НЕЖА́РКИЙ негара́чы.
НЕЖДА́НН||О *нареч.* нечака́на; неспадзява́на; **∼о-нега́данно** нечака́на-негада́на; **∼ЫЙ** нечака́ны; неспадзява́ны.
НЕЖЕЛА́||НИЕ нежада́нне, -ння *ср*; **∼ТЕЛЬНО** *сказ.* непажада́на; **∼ТЕЛЬНОСТЬ** непажада́насць, -ці *ж*; **∼ТЕЛЬНЫЙ** непажада́ны.
НЕ́ЖЕЛИ *союз* ніж, чым, як; *при сравн. ст. передаётся ещё конструкциями с предлогом:* за (*каго-што*), ад (*каго-чаго*); **она́ добрée, н. сестра́** яна́ дабрэ́йшая за сястру́; **пре́жде н.** перш чым, пе́рад тым як.
НЕЖЕНА́ТЫЙ нежана́ты.
НЕ́ЖЕНКА *м* и *ж разг.* пясту́н, -на́ *м* (*о мужчине*); пясту́ха, -хі *ж* (*о женщине*).
НЕЖИВО́Й нежывы́; (*мёртвый*) мёртвы; (*вялый*) вя́лы.

НЕЖИЗНЕННЫЙ нежыццёвы.

НЕЖИЗНЕСПОСОБН||ОСТЬ няжыццяздольнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** няжыццяздольны.

НЕЖИЛОЙ нежылы.

НЕЖИРНЫЙ нятлусты; (*не тучный*) нясыты.

НЕЖИТЬ I *несов.* песціць; (*голубить*) галубіць, мілаваць; (*ласкать*) лашчыць.

НЕЖИТЬ II *сущ. обл. миф.* нечысць, -ці *ж*, нячыстая сіла, погань, -ні *ж*.

НЕЖИТЬСЯ *несов.* песціцца.

НЕЖНИК *м бот. см.* **солнцецвет.**

НЕЖНИЧАТЬ *несов. разг.* 1. (*любезничать*) заляцацца *да каго*), гаварыць кампліменты (*каму*); (*взаимно*) галубіцца, мілавацца, пеставацца; 2. (*деликатничать*) далікатнічаць; (*церемониться*) цырымоніцца.

НЕЖН||О *нареч.* 1. (*ласково*) пяшчотна, ласкава; 2. (*деликатно*) далікатна; (*тонко*) тонка; (*мягко*) мякка; (*приятно*) прыемна; **~ОСТЬ 1.** пяшчотнасць, -ці *ж*; ласкавасць, -ці *ж*; далікатнасць, -ці *ж*; тонкасць, -ці *ж*; мяккасць, -ці *ж*; прыемнасць, -ці *ж*; *см.* **нежный** 1, 2; **~ость взгляда** пяшчотнасць позірку; **~ость кожи** мяккасць (далікатнасць) скуры; 2. (*ласка*) пяшчота, -ты *ж*; **материнская ~ость** мацярынская пяшчота; 3.: **~ости** *мн. разг.* пяшчоты, *род.* пяшчот, *ед.* пяшчота, -ты *ж*; ◇ **телячьи ~ости** *пренебр.* цялячыя пяшчоты; **~ЫЙ** 1. пяшчотны, ласкавы; **~ый взгляд** пяшчотны позірк; 2. (*деликатный*) далікатны; (*хрупкий*) кволы; (*тонкий*) тонкі; (*мягкий*) мяккі; (*приятный*) прыемны; **~ый голос** прыемны голас; **~ая кожа** мяккая (далікатная) скура; **~ый запах** прыемны (тонкі) пах; **~ое здоровье** кволае здароўе; ◇ **~ый возраст** дзіцячы ўзрост.

НЕЗАБВЕННЫЙ незабыўны.

НЕЗАБУДКА *бот.* незабудка, -кі *ж*.

НЕЗАБЫВАЕМЫЙ незабыўны.

НЕЗАВЕРЕННЫЙ незавераны, незасведчаны.

НЕЗАВЕРШЁНН||ОСТЬ незавершанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незавершаны.

НЕЗАВИДН||О *нареч.* незайздросна; **~ЫЙ** незайздросны.

НЕЗАВИСИМ||О *нареч.* незалежна; **~ОСТЬ** незалежнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незалежны.

НЕЗАВИСТЛИВЫЙ незайздросны, незайздрослівы.

НЕЗАВИСЯЩ||ИЙ незалежны; **по ~им обстоятельствам** па незалежных акалічнасцях.

НЕЗАДАЧ||А *разг.* няўдача, -чы *ж*; **~ЛИВЫЙ** 1. (*неудачный*) няўдачны; (*несчастливый*) нешчаслівы; **~ливый день** няўдачны (нешчаслівы) дзень; 2. (*неудачливый*) няўдачлівы; (*несчастливый*) нешчаслівы; (*неумелый*) няўдалы.

НЕЗАДОЛГО *нареч.* незадаўга.

НЕЗАЖИТОЧНЫЙ незаможны.

НЕЗАЗЕМЛЁННЫЙ *эл., радио* незаземлены.

НЕЗАКЛЕЕННЫЙ незаклеены.

НЕЗАКОННО *нареч.* незаконна.

НЕЗАКОННОРОЖДЁННЫЙ *уст.* незаконнароджаны, незаконны.

НЕЗАКОНН||ОСТЬ незаконнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незаконны.

НЕЗАКОНОМЕРН||ОСТЬ незаканамернасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незаканамерны.

НЕЗАКОНЧЕНН||ОСТЬ незакончанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незакончаны.

НЕЗАМАНЧИВЫЙ непрывабны, непрынадны; (*не соблазнительный*) неспакуслівы.

НЕЗАМЕДЛИТЕЛЬН||О неадкладна; **~ЫЙ** неадкладны.

НЕЗАМЕНИМ||О *нареч.* незаменна; **~ОСТЬ** незаменнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незаменны.

НЕЗАМЕРЗАЮЩИЙ незамярзаючы; **н. порт** незамярзаючы порт.

НЕЗАМЕТН||О *нареч.* непрыкметна; **~ОСТЬ** непрыкметнасць, -ці *ж*; нязначнасць, -ці *ж*; невыдатнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** непрыкметны; (*незначительный*) нязначны; (*не выдающийся*) невыдатны.

НЕЗАМЕЧЕННЫЙ незаўважаны, непрыкмечаны.

НЕЗАМОЖН||ИК *ист.* незаможнік, -ка *м*; **~ИЦА** незаможніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** *ист.* незаможны.

НЕЗАМУЖН||ИЙ незамужні; **~яя женщина** незамужняя жанчына, незамужка.

НЕЗАМЫСЛОВАТ||О *нареч.* немудрагеліста; няхітра; проста; **~ОСТЬ** немудрагелістасць, -ці *ж*; няхітрасць, -ці *ж*; прастата, -ты *ж*; **~ЫЙ** немудрагелісты; (*нехитрый*) няхітры; (*простой*) просты.

НЕЗАНЯТЫЙ незаняты.

НЕЗАПАМЯТН||ЫЙ 1. даўні; (*извечный*) спрадвечны; адвечны; **с ~ых времён** з давён-даўна; спрадвеку, спакон веку; 2. (*незабываемый*) незапамятны, незабыўны.

НЕЗАПЕРТЫЙ (*на ключ*) незамкнёны; (*на крючок*) незашчэплены; (*незатворённый*) незачынены.

НЕЗАПЯТНАНН||ОСТЬ незаплямленасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незаплямлены.

НЕЗАРАЗИТЕЛЬНЫЙ незаразлівы.

НЕЗАРАЗНЫЙ незаразны.

НЕЗАСЕЛЁННЫЙ незаселены.

НЕЗАСЛУЖЕНН||О *нареч.* незаслужана; **~ОСТЬ** незаслужанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незаслужаны.

НЕЗАСТРАХОВАННЫЙ незастрахаваны.

НЕЗАСТРОЕННЫЙ незабудаваны.

НЕЗАТАСКАННЫЙ *перен. разг.* незацяганы.

НЕЗАТЕЙЛИВ||О *нареч.* няхітра; немудрагеліста; проста; прымітыўна; нескладана; **~ОСТЬ** няхітрасць, -ці *ж*; немудрагелістасць, -ці *ж*; прастата, -ты *ж*; прымітыўнасць, -ці *ж*; нескладанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** няхітры; немудрагелісты; просты; прымітыўны; нескладаны.

НЕЗАТОПЛЯЕМ||ОСТЬ незатаплямльнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незатапляльны.

НЕЗАТУХАЮЩИЙ *физ.* незатухальны.

НЕЗАУРЯДНЫЙ незвычайны; (*выдающийся*) выдатны; не абы-які.

НЕЗАХОДЯЩИЙ незаходны.

НЕЗАЧЕМ *нареч.* няма чаго; (*не надо*) не трэба; (*нечего*) нечага; **н. туда ходить** няма чаго (не трэба, нечага) туды хадзіць; **н. было туда ходить** не было чаго (нечага было, не трэба было) туды хадзіць.

НЕЗАЩИЩЁННЫЙ неахоўваны, непрыкрыты, неабаронены.

НЕЗАЯВЛЕННЫЙ незаяўлены.

НЕЗВАНЫЙ няпрошаны.

НЕЗДЕШНИЙ нетутэйшы.

НЕЗДОРОВИТЬСЯ *несов. безл.* нездаровіцца; нядужыцца.

НЕЗДОР||ОВО *нареч.* нездарова; не па-здароваму; **~ОВЫЙ 1.** нездаровы; (*болезненный*) хваравіты; (*больной*) хворы; (*слабый*) нядужы; 2. (*вредный*) нездаровы; **~овый климат** нездаровы клімат; 3. (*о настроениях и т. п.*) нездаровы; **~овые привычки** нездаровыя прывычкі.

НЕЗДОРОВЬЕ *ср* нездароўе, -роўя *ср*; хворасць, -ці *ж*, нядужасць, -ці *ж*; *см.* **нездоровый** 1.

НЕЗЕМНОЙ няземны, незямны.

НЕЗЛОБИВ||О *нареч.* незлаліва; лагодна; **~ОСТЬ** незлалівасць, -ці *ж*; лагоднасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незлалівы; (*добродушный*) лагодны.

НЕЗЛОПАМЯТН||ОСТЬ незлапамятнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незлапамятны, незлапамятлівы.

НЕЗНАЙКА *разг.* нязнайка, -кі *м* и *ж*.

НЕЗНАКОМ||АЯ *сущ.* незнаёмая, -май *ж*; **~ЕЦ** незнаёмы, -мага *м*, незнаёмец, -мца *м*; **~КА** незнаёмка, -кі

ж, незнаёмая, -май *ж*; **~СТВО** незнаёмства, -ва *ср*; **~ЫЙ** 1. *прил.* незнаёмы; 2. *сущ.* незнаёмы, -мага *м.*

НЕЗНА́НИЕ нявéданне, -ння *ср.*

НЕЗНА́ЧАЩИЙ нязна́чны, малазна́чны; беззмястóўны.

НЕЗНАЧИ́ТЕЛЬН||ОСТЬ нязна́чнасць, -ці *ж*; малава́жнасць, -ці *ж*; *см.* **незначи́тельный; ~ЫЙ** нязна́чны; (*небольшой*) невялíкі; (*маловажный*) малава́жны.

НЕЗРЕ́Л||ОСТЬ 1. няспéласць, -ці *ж*; 2. *перен.* нястáласць, -ці *ж*; няспéласць, -ці *ж*; *см.* **незре́лый; ~ЫЙ** 1. (*о плодах и т. п.*) няспéлы; **~ое я́блоко** няспéлы я́блык; 2. *перен.* нястáлы; няспéлы; **~ое произведе́ние** няспéлы твор; **~ый ум** нястáлы (няспéлы) рóзум.

НЕЗРИ́М||О *нареч.* нябáчна; **~ЫЙ** нябáчны.

НЕЗРЯ́ЧИЙ невідýчы, сляпы́.

НЕЗЫ́БЛЕМ||О *нареч.* непахíсна; (*нерушимо*) непарýшна; **~ОСТЬ** непахíснасць, -ці *ж*; непарýшнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** непахíсны; (*нерушимый*) непарýшны.

НЕИЗБЕ́ЖН||О *нареч.* немінýча, непазбéжна, няўхíльна; **~ОСТЬ** немінýчасць, -ці *ж*, непазбéжнасць, -ці *ж*, няўхíльнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** немінýчы, непазбéжны, няўхíльны.

НЕИЗБЫ́ВНЫЙ *уст.* непазбы́ўны.

НЕИЗВЕ́ДАННЫЙ неспазнáны; (*о радости, страхе, голоде и т. п.*) незазнáны, непаспрабавáны, нявы́прабаваны; нязвéданы; незнаёмы; невядóмы.

НЕИЗВЕ́СТН||О *сказ. безл.* невядóма; **мне (тебе́) н.** мне (табé) невядóма; **никому́ н.** нікóму невядóма; **н. кто, отку́да** невядóма (нямавéдама) хто, адкýль; **~ОЕ** *мат.* невядóмае, -мага *ср*; **~ОСТЬ** невядóмасць, -ці *ж*; **быть в ~ости о чьей-либо судьбе́** нічóга не вéдаць аб чыíм-небудзь лёсе; **жить в ~ости** жыць у невядóмасці; **покры́то мра́ком ~ости** пакры́та цéмрай невядóмасці; **~ЫЙ** 1. *прил.* невядóмы; 2. *сущ.* невядóмы, -мага *м*; (*незнакомый*) незнаёмы, -мага *м.*

НЕИЗГЛАДИ́М||ЫЙ непазбы́ўны; (*незабываемый*) незабы́ўны; (*глубокий*) глыбóкі; **н. след** непазбы́ўны (глыбóкі) след; **~ое впечатле́ние** незабы́ўнае ўрáжанне.

НЕИ́ЗДАННЫЙ нявы́дадзены.

НЕИЗЛЕЧИ́М||О *нареч.* невылéчна; **~ОСТЬ** невылéчнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** невылéчны.

НЕИЗМЕ́Н||НО *нареч.* нязмéнна; (*всегда*) заўсёды, заўжды́; **~НОСТЬ** нязмéннасць, -ці *ж*; непахíснасць, -ці *ж*, стáласць, -ці *ж*; **~НЫЙ** 1. (*неизменяющийся*) нязмéнны; (*непоколебимый*) непахíсны; (*постоянный*) стáлы, заўсёдашні; 2. (*верный*) вéрны; няздрáдны; **~Я́ЕМОСТЬ** 1. нязмéннасць, -ці *ж*; нязмéнлівасць, -ці *ж*; 2. *грам.* нязмéннасць, -ці *ж*; **~Я́ЕМЫЙ** 1. нязмéнны; нязмéнлівы; 2. *грам.* нязмéнны.

НЕИЗМЕРИ́М||О *нареч.* нязмéрна; невымéрна; (*гораздо*) значна; (*непомерно*) празмéрна; (*несравненно*) непараўнáльна, непараўнáна; **~ОСТЬ** нязмéрнасць, -ці *ж*; невымéрнасць, -ці *ж*; празмéрнасць, -ці *ж*; непараўнáльнасць, -ці *ж*, непараўнáнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нязмéрны; невымéрны; (*непомерный*) празмéрны; (*несравнимый*) непараўнáльны, непараўнáны.

НЕИЗНОСИ́МЫЙ нязнóсны.

НЕИЗОБЛИЧЁННЫЙ нявы́крыты; (*необнаруженный*) нявы́яўлены.

НЕИЗОБРЕТА́ТЕЛЬН||ОСТЬ невынахóдлівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** невынахóдлівы.

НЕИЗРАСХО́ДОВАННЫЙ незрасхóдаваны, невыдаткавáны.

НЕИЗРЕЧЕ́ННЫЙ (*невыразимый*) *уст.* невыкáзны, невымóўны.

НЕИЗУ́ЧЕННЫЙ нявы́вучаны.

НЕИЗЪЯСНИ́МЫЙ незвычáйны (*необыкновенный*); невыкáзны (*невыразимый*); неперадавáльны (*непередаваемый*).

НЕИЗЯ́ЩНЫЙ нязгрáбны; (*некрасивый*) непрыгóжы.

НЕИМЕ́НИ||Е *ср* адсýтнасць, -ці *ж*; брак, *род.* брáку *м*; **за ~ем чего́-либо** з-за (з прычы́ны) адсýтнасці чагó-нéбудзь; не мáючы чагó-нéбудзь; **за ~ем лу́чшего** не мáючы лéпшага.

НЕИМОВЕ́РН||О *нареч.* неймавéрна; **~ОСТЬ** неймавéрнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неймавéрны.

НЕИМУ́ЩИЙ немаёмны; (*небогатый*) небагáты; (*незажиточный*) незамóжны.

НЕИНТЕРЕ́СН||О *нареч.* нецікáва; **~ЫЙ** нецікáвы; **~ый собесе́дник** нецікáвы субясéднік.

НЕИСКАЖЁННЫЙ нескажóны, неперакрýчаны; неперакры́ўлены.

НЕИСКОРЕНИ́М||О *нареч.* невыкаранáльна; **~ЫЙ** невыкаранáльны.

НЕИ́СКРЕН||НЕ *нареч.* няшчы́ра; **~НИЙ** няшчы́ры; **~НО** *нареч.* няшчы́ра; **~НОСТЬ** няшчы́расць, -ці *ж.*

НЕИСКУ́СН||О *нареч.* (*неумело*) няўмéла; не па-майстэрску, не па-майстэрску; **~ОСТЬ** *ж* (*неумелость*) няўмéльства, -ва *ср*; слáбая мастáцкасць; (*плохое мастерство*) дрэ́ннае майстэ́рства; **~ЫЙ** (*неумелый*) няўмéлы; (*не мастерской*) немастáцкі; немайстэ́рскі.

НЕИСКУШЁНН||ОСТЬ неспрактыкавáнасць, -ці *ж*, недасвéдчанасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неспрактыкавáны, недасвéдчаны.

НЕИСПОВЕДИ́МЫЙ *уст.* нявы́знаны, нязвéданы, неспазнáны.

НЕИСПОЛНЕ́НИЕ 1. невыканáнне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) невыкóнванне, -ння *ср*; 2. (*неосуществление*) нездзяйснéнне, -ння *ср.*

НЕИСПО́ЛН||ЕННЫЙ 1. (*невыполненный*) нявы́кананы; 2. (*неосуществлённый*) нездзéйснены, няспрáўджаны; **~И́МОСТЬ** невыканáльнасць, -ці *ж*; нездзяйснáльнасць, -ці *ж*; **~И́МЫЙ** невыканáльны, нездзяйснáльны; **~И́ТЕЛЬНОСТЬ** нестарáннасць, -ці *ж*, няспрáўнасць, -ці *ж*, неакурáтнасць, -ці *ж*; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** нестарáнны, няспрáўны, неакурáтны.

НЕИСПО́ЛЬЗОВАН||ИЕ невыкарыстáнне, -ння *ср*, нескарыстáнне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) невыкарыстóўванне, -ння *ср*, нескарыстóўванне, -ння *ср*; **~НЫЙ** нявы́карыстаны, нескарыстáны.

НЕИСПО́РЧЕНН||ОСТЬ несапсавáнасць, -ці *ж*, несапсýтасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** несапсавáны, несапсýты.

НЕИСПРАВИ́М||О *нареч.* непапрáўна; **~ОСТЬ** непапрáўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** непапрáўны.

НЕИСПРА́ВН||ОСТЬ няспрáўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** няспрáўны.

НЕИСПРО́БОВАННЫЙ непаспрабавáны.

НЕИСПЫ́ТАННЫЙ нявы́прабаваны; неправéраны.

НЕИССЛЕ́ДОВАНН||ЫЙ недаслéдаваны; **~ая о́бласть** недаслéдаваная вóбласць.

НЕИССЯКА́ЕМ||ОСТЬ невычэ́рпнасць, -ці *ж*, невычарпáльнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** *прям., перен.* невычэ́рпны, невычарпáльны.

НЕИ́СТОВ||О *нареч.* 1. шалёна; раз'юшана; лю́та; нястры́мна, безупы́нна; 2. утрапёна; пáлка; *см.* **неи́стовый; ~СТВО** *ср* шалéнства, -ва *ср*; раз'юшанасць, -ці *ж*; лю́тасць, -ці *ж*; нястры́мнасць, -ці *ж*, безупы́ннасць, -ці *ж*; **прийти́ в ~ство** прыйсці ў лю́тасць; **~СТВОВАТЬ** *несов.* шалéць, вар'явáцца; (*свирепствовать*) лютавáць; **~ЫЙ** 1. шалёны; (*яростный*) раз'юшаны; лю́ты; (*безудержный*) нястры́мны, безупы́нны; **~ые аплодисме́нты** нястры́мныя апладысмéнты; **~ый плач** нястры́мны плач; **~ые вы́ходки** шалёныя вы́хадкі; 2. (*одержимый*) утрапёны; пáлкі; ◇ **крича́ть ~ым го́лосом** крычáць нéмым гóласам.

НЕИСТОЩИ́М||ОСТЬ *ж* невычэ́рпнасць, -ці *ж*, невычарпáльнасць, -ці *ж*; багáцце, -цця *ср*; **~ЫЙ** невычэ́рпны, невычарпáльны; (*обильный*) багáты.

НЕИСТРЕБИ́МЫЙ невынішчáльны.

НЕИСХО́ДНЫЙ *см.* **безысхо́дный.**

НЕИСЦЕЛИ́М||ОСТЬ невылечнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** невылечны.

НЕИСЧЕРПА́ЕМ||ОСТЬ *ж* невычэрпнасць, -ці *ж*, невычарпальнасць, -ці *ж*; багацце, -цця *ср*; **~ЫЙ** невычэрпны, невычарпальны; (*обильный*) багаты.

НЕИСЧИСЛИ́М||ОСТЬ незлічонасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незлічоны.

НЕЙ *мест. дат., предложн. см.* **она́.**

НЕЙМЁТ *безл. разг.* не бярэ; ◇ **хоть ви́дит о́ко, да зуб н.** *посл.* хоць бачыць вока, ды дастаць далёка; **~СЯ** *безл. разг.* **1.** (*не сидится*) не сядзіцца; **ребёнку ~ся— всё бе́гает** дзіцяці не сядзіцца — усё бегае; **2.** (*хочется*) карціць; **ему́ ~ся поскоре́е уе́хать** яму карціць хутчэй паехаць.

НЕЙРО́Н *анат.* нейрон, -на *м.*

НЕЙТРАЛИ||ЗА́ЦИЯ *в разн. знач.* нейтралізацыя, -цыі *ж*; **~ЗОВА́ТЬ** *сов. и несов.* нейтралізаваць; **~ЗОВА́ТЬСЯ** нейтралізавацца; **~ЗУ́ЮЩИЙ** *прил.* нейтралізуючы; **~ТЕ́Т** нейтралітэт, -ту *м.*

НЕЙТРА́ЛЬН||О *нареч.* нейтральна; **~ОСТЬ** нейтральнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нейтральны.

НЕЙТРОДИ́Н *радио* нейтрадзін, -на *м.*

НЕЙТРО́Н *физ.* нейтрон, -на *м.*

НЕКАЗИ́СТЫЙ несамавіты; няважны; (*некрасивый*) непрыгожы.

НЕКВАЛИФИЦИ́РОВАНН||ОСТЬ некваліфікаванасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** некваліфікаваны.

НЕ́КЕМ *мест. твор. см.* **не́кого.**

НЕ́КИЙ *мест.* нейкі.

НЕ́КЛЕН *бот.* чорнаклён, *род.* чорнаклёна *и* (*о древесине*) чорнаклёну *м.*

НЕКЛЕ́ТОЧН||ЫЙ няклетачны; **~ые фо́рмы жи́зни** няклетачныя формы жыцця.

НЕКО́ВКИЙ *тех.* някоўкі.

НЕ́КОГДА I *нареч.* (*нет времени*) няма калі, некалі.

НЕ́КОГДА II *нареч.* (*когда-то*) некалі; калісьці, калісь.

НЕ́КОГО *мест.* няма каго, некага (*дат.* няма каму, некаму; *вин.* няма каго, некага; *твор.* няма кім, некім; *предложн.* няма аб кім, няма пра каго, не аб кім; (*прошедшее время*) не было каго, не было каму *и т. д.*; (*будущее время*) не будзе каго, не будзе каму *и т. д.*).

НЕКОЛЕБИ́МЫЙ *см.* **непоколеби́мый.**

НЕКОММЕ́РЧЕСКИЙ некамерцыйны.

НЕКОММУНИСТИ́ЧЕСКИЙ некомуністычны.

НЕКОМПЕНСИ́РОВАННЫЙ некампенсаваны.

НЕКОМПЕТЕ́НТН||ОСТЬ некампетэнтнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** некампетэнтны.

НЕКОМПЛЕ́КТ некамплект, -та *м*; **~НЫЙ** некамплектны.

НЕКОМСОМО́ЛЬСКИЙ некомсамольскі.

НЕ́КОМУ *мест. дат. см.* **не́кого.**

НЕКОНДИЦИО́ННЫЙ некандыцыйны.

НЕКОНКРЕ́ТН||О *нареч.* неканкрэтна; **~ОСТЬ** неканкрэтнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неканкрэтны.

НЕКОНСОЛИДИ́РОВАННЫЙ *в разн. знач.* некансалідаваны.

НЕКОНСТИТУЦИО́ННЫЙ неканстытуцыйны.

НЕКООПЕРИ́РОВАННЫЙ некааперавааны.

НЕКОРОНО́ВАННЫЙ некаранованы; **н. коро́ль** *ирон.* некаранаваны кароль.

НЕКОРРЕ́КТН||О *нареч.* некарэктна; **~ОСТЬ** некарэктнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** некарэктны.

НЕКОРЫСТОЛЮБИ́ВЫЙ некарысталюбны; (*некорыстный*) некарыслівы.

НЕ́КОТОР||ЫЙ *мест.* **1.** (*какой-то*) некаторы, нейкі; **в ~ых слу́чаях** у некаторых выпадках; **с ~ых пор** з некаторага часу; **~ым о́бразом** нейкім чынам; **~ое вре́мя** некаторы (нейкі) час; **~ое коли́чество** некаторая (нейкая) колькасць; **в ~ой сте́пени** у нейкай ступені; **2.: ~ЫЕ** (*кое-кто*) некаторыя, -рых; **~ые боя́тся грозы́** некаторыя баяцца навальніцы; **~ые из нас** некаторыя з нас.

НЕКО́ШЕННЫЙ някошаны.

НЕКРАСИ́В||О *нареч.* **1.** непрыгожа; няхораша; **2.** нядобра; **~ЫЙ 1.** непрыгожы; **2.** (*нехороший*) нядобры.

НЕКРА́ШЕНЫЙ нефарбаваны, непафарбаваны; немаляваны, непамаляваны.

НЕКРЕДИТОСПОСО́БН||ОСТЬ *фин.* некрэдытаздольнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** некрэдытаздольны.

НЕКРЕ́ПКИЙ нямоцны; (*несильный*) нядужы.

НЕКРИТИ́ЧЕСК||И *нареч.* некрытычна; **~ИЙ** некрытычны.

НЕКРОБИО́З *биол.* некрабіёз, -зу *м.*

НЕКРО́З *мед.* некроз, -зу *м.*

НЕКРОЛО́Г некралог, -га *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** некралагічны.

НЕКРОМА́НИЯ *мед.* некраманія, -ніі *ж.*

НЕКРО́ПОЛЬ некропаль, -ля *м.*

НЕКРОФО́Р *зоол.* некрафор, -ра *м.*

НЕКРУ́ПНЫЙ небуйны; невялікі; (*мелкий*) дробны.

НЕКРУЧЁНЫЙ някручаны.

НЕКРЫ́ТЫЙ някрыты.

НЕКСТА́ТИ *нареч.* недарэчы; (*не во-время*) няўчасна, няўчас, нясвоечасова, неўпару; (*не к месту*) не да месца.

НЕКТА́Р нектар, -ру *м.*

НЕКТА́Р||ИЙ *бот.* нектарый, -рыя *м*; **~И́Н** *сад.* нектарын, -на *м*; **~КА** *зоол.* нектарка, -кі *ж*; **~НИК** *бот.* нектарнік, -ка *м*; **~ОНО́С** *бот.* нектаранос, -са *м.*

НЕ́КТО *мест.* нехта (*род., вин.* некага, *дат.* некаму, *твор., предложн.* некім); (*кто-то*) хтосьці (*род., вин.* кагосьці, *дат.* камусьці, *твор., предложн.* кімсьці); хтось (*род., вин.* кагось, *дат.* камусь, *твор., предложн.* кімсь); (*некий*) нейкі; **н. Ивано́в** нейкі Іваноў.

НЕКТО́Н *биол.* нектон, -на *м.*

НЕ́КУДА *нареч.* няма куды, некуды.

НЕКУЛЬТУ́РН||О *нареч.* некультурна; **~ОСТЬ** некультурнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** некультурны.

НЕКУРЯ́ЩИЙ 1.: быть ~им не курыць; **он челове́к ~ий** ён не курыць; **2.** *сущ.* некурэц, -рца *м*; **ваго́н для ~их** вагон для некурцоў.

НЕ́ К ЧЕМУ няма чаго; (*не надо*) не трэба; (*нечего*) нечага; (*не следует*) не след; **не́ к чему серди́ться** няма чаго (нечага) злавацца.

НЕЛА́Д||НО 1. *нареч.* недаладу; (*нехорошо*) нядобра; (*плохо*) дрэнна, кепска; **2.** *сказ.* нядобра; дрэнна, кепска; ◇ **н. скро́ен, да кре́пко сшит** *погов.* нязграбна скроены, ды моцна сшыты; **~НЫЙ 1.** (*нехороший*) нядобры; (*плохой*) дрэнны, кепскі; **2.** (*нескладный*) нескладны; (*неуклюжий*) нязграбны; ◇ **будь он ~ен** каб ён спрах, няхай ён спрахне; няхай яму ліха.

НЕЛАДЫ́ *ед. нет* нелады, -доў, *ед.* нелад, -ду *м*; (*несогласие*) нязгода, -ды *ж*; (*ссоры*) сваркі, -рак, *ед.* сварка, -кі *ж.*

НЕЛА́СКОВ||О *нареч.* неласкава; **~ЫЙ** неласкавы.

НЕЛЕГА́ЛЬ||НО *нареч.* нелегальна; **~НОСТЬ** нелегальнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** нелегальны; **~ЩИНА** *разг.* нелегальшчына, -ны *ж.*

НЕЛЁГКАЯ *разг.*: **вот н. принесла́!** вось нячыстая (ліха) прынесла (прыгнала, прымчала)!; **куда́ его́ н. несёт?** куды яго нячыстая (ліха) нясе (гоніць, імчыць)?; ■ **угора́здила же меня́ н. сказа́ть!** і сабіла-ж мне сказаць!

НЕЛЁГКИЙ нялёгкі.

НЕЛЕ́П||ИЦА *см.* **неле́пость; ~О** *нареч.* недарэчна; (*бессмысленно*) бязглузда; **~ОСТЬ** недарэчнасць, -ці *ж*; (*бессмыслица*) бязглуздзіца, -цы *ж*; (*вздор*) лухта, -ты *ж*;

говори́ть ~ости гавары́ць недарэ́чнасці (лухту́); **~ЫЙ** недарэ́чны; бязглу́зды; **~ый посту́пок** недарэ́чны (бязглу́зды) учы́нак; **~ый костю́м** недарэ́чны касцю́м.

НЕЛЕ́СТН||О *нареч.* непахва́льна; непрые́мна; нядо́бра; непрыва́бна; непрына́дна; **~ЫЙ** (*неодобрительный*) непахва́льны; (*неприятный для кого-чего-л.*) непрые́мны; (*нехороший*) нядо́бры; (*незаманчивый*) непрыва́бны; непрына́дны.

НЕЛЕТУ́ЧИЙ *хим., фарм.* нелятучы.

НЕЛИКВИ́ДНЫЙ *фин.* неліквідны.

НЕЛИЦЕМЕ́РНЫЙ некрывадушны.

НЕЛИЦЕПРИЯ́ТН||О *нареч.* бесстаро́нна; справядлі́ва; аб'екты́ўна; непрадузя́та; **~ОСТЬ** бесстаро́ннасць, -ці *ж*; справядлі́васць, -ці *ж*; аб'екты́ўнасць, -ці *ж*; непрадузя́тасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** бесстаро́нны; справядлі́вы; аб'екты́ўны; непрадузя́ты.

НЕЛИ́ШН||Е *нареч.* нялі́шне; (*не мешает*) не шко́дзіць; (*следует*) ва́рта; **~ИЙ** нялі́шні; (*нужный*) патрэ́бны.

НЕЛО́В||КИЙ 1. (*неискусный*) няспры́тны; (*неумелый*) няўме́лы; (*неуклюжий*) нязгра́бны; (*нескладный*) няскла́дны; **~кое движе́ние** нязгра́бны рух; 2. (*неудобный*) няёмкі, нязру́чны, невыго́дны; **лежа́ть в ~ком положе́нии** ляжа́ць у нязру́чнай по́зе; 3. (*не меткий, неудачный*) няўда́лы, няўда́чны, нятра́пны; **н. отве́т** няўда́лы (няўда́чны) адка́з; **н. посту́пок** няўда́лы (няўда́чны) учы́нак; 4. (*стеснительный, затруднительный*) няёмкі, цяжкава́ты; **попа́сть ■ ~кое положе́ние** тра́піць у няёмкае стано́вішча; **~кое молча́ние** няёмкае маўча́нне; **~КО** 1. *нареч.* няспры́тна; няўме́ла; нязгра́бна; няскла́дна; сарамлі́ва; 2. *нареч.* няёмка, нязру́чна, невыго́дна; 3. *нареч.* няўда́ла, няўда́чна, нятра́пна; 4. *нареч.* няёмка; **чу́вствовать себя́ ~ко** адчува́ць сябе́ няёмка (нязру́чна); *см.* **нело́вкий; 5.** *сказ. безл.* няёмка, нязру́чна, невыго́дна; (*нехорошо*) нядо́бра; (*совестно*) со́рамна; **мне ~ко сиде́ть** мне няёмка (нязру́чна, невыго́дна) сядзе́ць; **~ко спра́шивать** няёмка пыта́цца; **мне ста́ло ~ко** мне ста́ла няёмка (со́рамна); **~КОСТЬ** 1. (*свойство, качество*) няспры́тнасць, -ці *ж*; няўме́ласць, -ці *ж*; нязгра́бнасць, -ці *ж*; няскла́днасць, -ці *ж*; няёмкасць, -ці *ж*, нязру́чнасць, -ці *ж*, невыго́днасць, -ці *ж*; няўда́ласць, -ці *ж*, няўда́чнасць, -ці *ж*, нятра́пнасць, -ці *ж*; **~кость движе́ний** нязгра́бнасць ру́хаў; *см.* **нело́вкий;** 2. (*неудачный поступок*) няёмкасць, -ці *ж*; (*промах*) прама́шка; няёмкі (няўда́лы) учы́нак; **допусти́ть ряд ~косте́й** дапусці́ць шэ́раг прама́шак (няўда́лых учы́нкаў); 3. (*чувство стеснительности*) няёмкасць, -ці *ж*, нязру́чнасць, -ці *ж*; (*смущение*) збянтэ́жанасць, -ці *ж*; (*стыд*) со́рам; **почу́вствовать ~кость** адчу́ць няёмкасць.

НЕЛОГИ́ЧН||О *нареч.* нелагі́чна; **~ОСТЬ** нелагі́чнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нелагі́чны.

НЕЛУЖЁНЫЙ нялу́джаны, нявы́луджаны.

НЕЛЬЗЯ́ *нареч.* не́льга (*невозможно*); нямо́жна (*не дозволено, не следует*); **их н. останови́ть** іх не́льга спыні́ць; **вам н. кури́ть** вам нямо́жна куры́ць; **н. не согласи́ться, не призна́ть** не́льга не згадзі́цца, не прызна́ць; **н. ли сде́лать э́то, помо́чь ему́** ці не́льга зрабі́ць гэ́та, дапамагчы́ яму́; **как н.** як магá; **как н. лу́чше, ху́же** як магá лепш (як найле́пш), горш (як найго́рш); **н. сказа́ть, что́бы...** не́льга сказа́ць, каб...

НЕ́ЛЬМА *зоол.* не́льма, -мы *ж*.

НЕЛЮБЕ́ЗН||О *нареч.* неласка́ва, нямі́ла, няве́тліва, непрыя́зна; **~ОСТЬ** неласка́васць, -ці *ж*, няве́тлівасць, -ці *ж*, непрыя́знасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неласка́вы, нямі́лы, няве́тлівы, непрыя́зны.

НЕЛЮБИ́МЫЙ нелюбі́мы; (*немилый*) нялю́бы, нямі́лы.

НЕ́ЛЮБО (не лю́бо) *сказ.* нялю́ба; (*не по нраву*) не да спадо́бы; (*неприятно*) непрые́мна; ◇ **не́любо (не лю́бо)— не слу́шай, а врать не меша́й** *посл.* нялю́ба — не слу́хай, а лгаць не перашкаджа́й.

НЕЛЮБО́ВЬ (*неприязнь*) нелюбо́ў, -бві́ *ж*; нялю́басць, -ці *ж*.

НЕЛЮБОЗНА́ТЕЛЬНЫЙ неціка́ўны; (*непытливый*) недапы́тлівы.

НЕЛЮБОПЫ́ТНЫЙ 1. (*не отличающийся любопытством*) неціка́вы; неціка́ўлівы; (*нелюбознательный*) неціка́ўны; недапы́тлівы; (*незаинтересованный*) незацікаўлены; 2. (*неинтересный*) неціка́вы.

НЕЛЮДИ́М нелюдзі́м, -ма *м*; не́людзень, -дня *м*; (*дикий, застенчивый человек*) дзіклі́вы, -вага *м*; (*угрюмый*) сугне́й, -не́я *м*; **~КА** нелюдзі́мка, -кі *ж*; не́людзень, -дня *м*; дзіклі́вая, -вай *ж*; сугне́й, -не́я *м*; **~ОСТЬ** нелюдзі́масць, -ці *ж*; дзіклі́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ** 1. нелюдзі́мы; (*угрюмый*) пану́ры; (*дикий, застенчивый человек*) дзіклі́вы; 2. (*пустынный*) *уст.* бязлю́дны.

НЁМ *мест. предложн. см.* **он.**

НЕМА́ЛО *нареч.* няма́ла.

НЕМАЛОВА́ЖНЫЙ нямалава́жны.

НЕМАЛОЧИ́СЛЕННЫЙ нямалалі́кі; (даво́лі) шматлі́кі; нямалако́лькасны; (*немалый*) нема́лы.

НЕМА́ЛЫЙ нема́лы.

НЕ́МАН *р.* Нёман, -на *м*.

НЕМА́РКИЙ нямаркі, нямазкі.

НЕМАРКСИ́СТСКИЙ немарксісцкі.

НЕМАТЕРИА́ЛЬНЫЙ нематэрыя́льны.

НЕМАТОЦИ́СТ *биол.* househematацы́ст, -та *м*.

НЕМА́Я *сущ.* нямая, -мо́й *ж*; не́мка, -кі *ж*.

НЕМЕ́Д||ЛЕННО *нареч.* неадкла́дна; (*тотчас*) за́раз-жа; **~ЛЕННЫЙ** неадкла́дны; **~ЛЯ** *см.* **неме́дленно.**

НЕМЕЗИ́ДА *миф., перен.* Немезі́да, -ды *ж*.

НЕМЕ́РКНУЩИЙ нягаснучы.

НЕМЕРТИ́НА *зоол.* немерты́на, -ны *ж*.

НЕМЕ́ТЬ *несов.* 1. няме́ць; 2. (*цепенеть*) няме́ць, дранвець; шэ́рхнуць; (*затекать*) зацяка́ць; (*застывать*) стыць.

НЕ́М||ЕЦ не́мец, -мца *м*; **~Е́ЦКИЙ** няме́цкі.

НЕМИ́ЛАЯ *сущ.* нялю́бая, -бай *ж*, нямі́лая, -лай *ж*.

НЕМИЛОСЕ́РД||ИЕ *ср* бязлі́тасн асць, -ці *ж*, неміласэ́рддзе, -ддзя *ср*; неміласэ́рнасць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* бязлі́тасна, неміласэ́рна; **~НЫЙ** бязлі́тасны, неміласэ́рны.

НЕМИ́ЛОСТИВ||О *нареч.* нелітасці́ва, нямі́ласціва, неласка́ва; **~ЫЙ** нелітасці́вы, нямі́ласцівы, неласка́вы.

НЕМИ́ЛОСТ||Ь (*нерасположение*) нямі́ласць, -ці *ж*; (*опала*) нялáска, -кі *ж*; **впасть в н.** стра́ціць ла́ску; **быть ■ ~и у кого́-либо** быць у няла́сцы ў каго́-не́будзь.

НЕМИ́ЛЫЙ I *прил.* нямі́лы; (*нелюбимый*) нялю́бы.

НЕМИ́ЛЫЙ II *сущ.* нялю́бы, -бага *м*, нямі́лы, -лага *м*.

НЕМИНУ́||ЕМО *нареч.* неміну́ча; **~ЕМОСТЬ** немінучасць, -ці *ж*; **~ЕМЫЙ, ~ЧИЙ** *простореч., фольк.* немінучы.

НЕ́МКА не́мка, -кі *ж*.

НЕМНО́Г||ИЕ 1. *прил.* няшма́т які́я, *род.* няшма́т які́х; ма́ла які́я, *род.* ма́ла які́х; нямно́гія, *род.* нямно́гіх; **н. лю́ди** няшма́т які́я (ма́ла які́я, нямно́гія) лю́дзі; **■ ~их слова́х** у не́калькіх сло́вах; 2. *сущ.* няшма́т хто, *род.* няшма́т каго́; ма́ла хто, *род.* ма́ла каго́; нямно́гія, *род.* нямно́гіх; **н. зна́ют об э́том** ма́ла хто (няшма́т хто) ве́дае пра гэ́та; **он ~их здесь зна́ет** ён ма́ла каго́ (няшма́т каго́) тут ве́дае.

НЕМНО́ГО 1. *нареч., сказ.* няшма́т; нямно́га, ма́ла; **н. по́льзы от э́того** няшма́т (нямно́га, ма́ла) カры́сці ад гэ́тага; 2. *нареч.* (*чуть-чуть, слегка*) тро́хі, крыху́; **н. голова́ боли́т** крыху́ (тро́хі) галава́ балі́ць; **вы́пить н. воды́** вы́піць тро́хі (крыху́) вады́.

НЕМНОГОВО́ДНЫЙ нямногаво́дны.

НЕМНО́Г||ОЕ *сущ.* няшма́т што, *род.* няшма́т чаго́ *ср*; ма́ла што, *род.* ма́ла чаго́ *ср*; нямно́гае, *род.* нямно́гага *ср*; **за ~им остано́вка** *разг.* за малы́м затры́мка; **~им бо́льше** (*чего*) ма́ла чым бо́льш (*за што*); (*около*) **каля**

(*чаго*); **∼ого не хватает** мала чаго не хапае; ✦ **за ∼им дело стало** за малым справа стала.

НЕМНОГОСЛОВНЫЙ няшматслоўны, нямногаслоўны.

НЕМНОГОЧИСЛЕНН||ОСТЬ няшматлікасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** няшматлікі.

НЕМНОЖ||ЕЧКО *нареч. разг.* трошачкі, крышачку; **∼КО** *нареч.* трошкі, крышку.

НЕМОЖЕТСЯ *безл.* нядужыцца, нямóжацца; нездаровіцца.

НЕМ||ОЙ 1. *прил.* ■ *разн. знач.* нямы; **н. человек** нямы чалавек, нямко; **∼ая тишина** *перен.* нямая цішыня; **∼ая карта** нямая карта; **∼ая азбука** нямая азбука; **2.** *сущ.* нямы, -мога *м*, нямко, -ка *м*; ◇ **нем, как рыба (как могила)** нямы, як рыба (як магіла).

НЕМОЛОДОЙ немалады.

НЕМОЛЧНЫЙ *поэт.* несціханы.

НЕМОТА немата, -ты *ж*.

НЕМОЧЬ *разг.* немач, -чы *ж*; **бледная н.** *мед.* бледная немач.

НЕМО||ЩНЫЙ нядужы; (*слабый*) слабы; (*больной*) хворы; **∼ЩЬ** *ж* немач, -чы *ж*, хвароба, -бы *ж*; (*недомогание*) недамаганне, -ння *ср*; (*слабость*) слабасць, -ці *ж*.

НЕМУДРЕНО *сказ.* не цяжка, не дзіва; **в такой холод н. простудиться** у такі холад не цяжка (не дзіва) прастудзіцца; **н., что он обиделся** не дзіва, што ён пакрыўдзіўся.

НЕМУДРЁН||ЫЙ 1. няхітры; (*незамысловатый*) немудрагелісты; (*нетрудный*) лёгкі, няцяжкі; (*простой*) просты; **н. прибор** няхітрая прылада; **н. узор** просты (немудрагелісты) узор; **∼ая задача** лёгкая (простая) задача; **2.** (*простодушный, неумный*) *разг.* простадушны, праставаты.

НЕМУДР||ЫЙ, ∼ЯЩИЙ *разг. см.* **немудрёный.**

НЕМУЗЫКАЛЬНЫЙ немузыкальны.

НЕМЫСЛИМ||ЫЙ неймаверны (*невероятный*); немагчымы, немажлівы (*невозможный*); **∼ые условия** неймаверныя ўмовы; **∼ое дело** немагчымая (немажлівая) справа; **это ∼о** гэта неймаверна (немагчыма), гэтага нельга ўявіць.

НЕНАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ ненаглядальны, неназіральны.

НЕНАВИ||ДЕТЬ *несов.* ненавідзець; **∼СТНИК** ненавіснік, -ка *м*; **∼СТНИЦА** ненавісніца, -цы *ж*; **∼СТНИЧЕСТВО** *ср* ненавісніцтва, -ва *ср*; **∼СТНЫЙ** ненавісны; зненавідны; (*постылый*) абрыдлы.

НЕНАВИСТЬ нянавісць, -ці *ж*; **питать н. к кому-либо** адчуваць нянавісць да каго-небудзь, ненавідзець каго-небудзь.

НЕНАГЛЯДНЫЙ ненаглядны; (*дорогой*) дарагі; (*милый*) любы, мілы.

НЕНАДЁВАННЫЙ *разг.* ненадзяваны; (*о верхней одежде*) неапрананы; (*об обуви*) неабуваны.

НЕНАДЁЖН||О *нареч.* **1.** ненадзейна; няпэўна; **2.** ненадзейна, нямоцна, нетрывала; **∼ОСТЬ 1.** ненадзейнасць, -ці *ж*; няпэўнасць, -ці *ж*; **2.** ненадзейнасць, -ці *ж*, нямоцнасць, -ці *ж*, нетрываласць, -ці *ж*; **∼ЫЙ 1.** ненадзейны; няпэўны; **2.** (*непрочный*) ненадзейны, нямоцны, нетрывалы.

НЕНАДОБН||О *сказ. безл.* не трэба; (*не нужно*) не патрэбна; **∼ОСТЬ** непатрэбнасць, -ці *ж*; **за ∼остью** з-за (з прычыны) непатрэбнасці; **∼ЫЙ** непатрэбны.

НЕНАДОЛГО *нареч.* ненадоўга, ненадаўга.

НЕНАКАЗАНН||ОСТЬ непакаранасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** непакараны.

НЕНАКАЗУЕМ||ОСТЬ *юр.* некаральнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** *юр.* некаральны.

НЕНАЛОГОВЫЙ непадатковы.

НЕНАМЕРЕНН||О *нареч.* без намеру; (*неумышленно*) ненаўмысна, няўмысна; (*ненарочно*) незнарок, неназнарок; **∼ЫЙ** (*неумышленный*) ненаўмысны, няўмысны; (*ненарочный*) незнарочысты.

НЕНАПАДЕН||ИЕ *ср* ненапад, -ду *м*, ненападзенне, -ння *ср*; **пакт о ∼ии** *дип.* пакт аб ненападзенні.

НЕНАПРАСНО *нареч.* недарэмна, недарма; (*недаром*) нямарна.

НЕНАРОКОМ *нареч. разг.* незнарок; (*случайно*) выпадкова; (*ненамеренно*) ненаўмысна.

НЕНАРОЧНО *нареч.* незнарок, неназнарок; (*неумышленно*) ненаўмысна.

НЕНАРУШИМ||ОСТЬ непарушнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** непарушны.

НЕНАСТН||ЫЙ непагодны; непагодлівы; (*дождливый*) дажджлівы; (*пасмурный*) пахмурны; **∼ая погода** непагадзь, дажджлівае надвор'е; **∼ая ночь** непагодная ноч.

НЕНАСТОЯЩИЙ несапраўдны.

НЕНАСТЬЕ *ср* непагадзь, -дзі *ж*; непагода, -ды *ж*, дажджлівае (пахмурнае) надвор'е.

НЕНАСЫТН||ОСТЬ 1. ненаеднасць, -ці *ж*; **2.** *перен.* ненаеднасць, -ці *ж*; ненасытнасць, -ці *ж*; прагавітасць, -ці *ж*, прагнасць, -ці *ж*; пражэрлівасць, -ці *ж*; *см.* **ненасытный; ∼ЫЙ 1.** ненаедны; **∼ый зверь** ненаедны звер; **2.** *перен.* ненаедны; (*не удовлетворяющийся ничем достигнутым*) ненасытны; (*жадный*) прагавіты, прагны; (*прожорливый*) пражэрлівы; **∼ое желание** ненасытнае жаданне.

НЕНАСЫЩЕННЫЙ *хим., перен.* ненасычаны.

НЕНАТУРАЛЬН||О *нареч.* ненатуральна; **∼ОСТЬ** ненатуральнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** ненатуральны.

НЕНАУЧН||О *нареч.* ненавукова; **∼ОСТЬ** ненавуковасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** ненавуковы.

НЕНАХОДЧИВ||ОСТЬ незнаходлівасць, -ці *ж*; нездагадлівасць, -ці *ж*; невынаходлівасць, -ці *ж*; недасціпнасць, -ці *ж*; *см.* **ненаходчивый; ∼ЫЙ** незнаходлівы; (*недогадливый*) нездагадлівы; (*неизобретательный*) невынаходлівы; (*неостроумный*) недасціпны.

НЕНАХОЖДЕНИ||Е: ■ **случае ∼я адресата** у выпадку незнаходжання адрасата.

НЕНЕЦ ненец, -нца *м*; **∼КИЙ** ненецкі.

НЕНЕЦКИЙ НАЦИОНАЛЬНЫЙ ОКРУГ Ненецкая нацыянальная акруга.

НЕНКА ненка, -кі *ж*.

НЕНОРМАЛЬН||О *нареч.* ненармальна; **∼ОСТЬ** ненармальнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** ненармальны.

НЕНОРМИРОВАННЫЙ ненарміраваны.

НЕ НУЖНО *сказ. безл.* не трэба, не патрэбна.

НЕНУЖНЫЙ непатрэбны.

НЕНУМЕРОВАННЫЙ ненумараваны.

НЕОБДЕЛАННЫЙ *разг.* неапрацаваны, невыраблены; (*без оправы*) неапраўлены.

НЕОБДУМАНН||О *нареч.* неабдумана; **∼ОСТЬ** неабдуманасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** неабдуманы.

НЕОБЕСПЕЧЕН||ИЕ *ср*, **∼НОСТЬ** *ж* незабяспечанасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** незабяспечаны.

НЕОБЖАЛОВАННЫЙ *юр.* неабскарджаны.

НЕОБЖ||ИТОЙ, ∼ИТЫЙ неабжыты.

НЕ ОБИНУЯСЬ *уст.* не задумваючыся, без хістання; (*без обиняков*) проста, без хітрыкаў.

НЕОБИТАЕМ||ОСТЬ незаселенасць, -ці *ж*, ненаселенасць, -ці *ж*; (*безлюдность*) бязлюднасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** незаселены, ненаселены; (*нежилой*) нежылы; (*безлюдный*) бязлюдны; **∼ый дом** незаселены (ненаселены, нежылы) дом; **∼ый остров** ненаселены (бязлюдны) востраў.

НЕОБЛАГАЕМЫЙ неабкладны; неабкладаемы.

НЕОБНАРОДОВАННЫЙ неабнародаваны; (*неопубликованный*) неапублікаваны.

НЕОБНАРУЖЕННЫЙ невыказаны, невыяўлены; непаказаны; невыяўлены, неадшуканы; *см.* **обнаружить.**

НЕОБОЖЖЁННЫЙ *тех.* неабпалены.

НЕОБОЗНАЧЕННЫЙ неабазначаны; непазначаны; непамечаны; неадзначаны; *см.* **обозначить.**

НЕОБОЗРИ́М||ОСТЬ неагля́днасць, -ці *ж*; неабся́жнасць, -ці *ж*, неабды́мнасць, -ці *ж*; бязме́жнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неагля́дны; (*необъятный*) неабся́жны, неабды́мны; (*беспредельный*) бязме́жны.

НЕОБОРИ́МЫЙ *уст.* неадо́льны; (*непобедимый*) неперамо́жны.

НЕОБОСНО́ВАНН||О *нареч.* неабгрунтава́на; беспадста́ўна; **~ОСТЬ** неабгрунтава́насць, -ці *ж*; беспадста́ўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неабгрунтава́ны; (*лишённый оснований*) беспадста́ўны.

НЕОБРАБО́ТАНН||ОСТЬ неапрацава́насць, -ці *ж*; неабро́бленасць, -ці *ж*; няўро́бленасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неапрацава́ны; неабро́блены; няўро́блены (*только о земле*).

НЕОБРАЗО́ВАНН||ОСТЬ *ж* неадукава́насць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неадукава́ны.

НЕОБРАТИ́М||ОСТЬ неабарача́льнасць, -ці *ж*; незваро́тнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неабарача́льны; незваро́тны.

НЕОБРЕМЕНИ́ТЕЛЬН||ОСТЬ няця́жкасць, -ці *ж*; лёгкасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** няця́жкі; (*лёгкий*) лёгкі.

НЕОБСТОЯ́ТЕЛЬН||ОСТЬ негрунто́ўнасць, -ці *ж*; (*поверхностность*) павярхо́ўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** негрунто́ўны; (*поверхностный*) павярхо́ўны.

НЕОБУ́ЗДАНН||ОСТЬ нястры́мнасць, -ці *ж*; неўтаймава́насць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нястры́мны (*неудержимый*); неўтаймава́ны (*неукротимый*).

НЕОБУСЛО́ВЛЕННЫЙ неабумо́ўлены.

НЕОБУ́ТЫЙ неабу́ты; (*разутый*) разу́ты; (*босой*) бо́сы.

НЕОБУ́ЧЕННЫЙ неабу́чаны, нявы́вучаны, ненаву́чаны.

НЕОБХОДИ́М||О 1. *сказ. безл.* неабхо́дна; (*очень нужно*) (ве́льмі) трэ́ба, (ве́льмі) патрэ́бна; **2.** *нареч.* неабхо́дна; абавязко́ва; **~ОЕ** *сущ.* неабхо́днае, -нага *ср*; **~ОСТЬ** неабхо́днасць, -ці *ж*; патрэ́ба, -бы *ж*, патрэ́бнасць, -ці *ж*; абавязко́васць, -ці *ж*; *см.* **необходи́мый; ~ЫЙ** неабхо́дны; (*очень нужный*) (ве́льмі) патрэ́бны; (*обязательный*) абавязко́вы; **~ая оборо́на** *юр.* неабхо́дная абаро́на.

НЕОБХОДИ́ТЕЛЬН||ОСТЬ нявე́тлівасць, -ці *ж*, недалıка́тнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нявე́тлівы, недалıка́тны.

НЕОБЩЕ́СТВЕННЫЙ неграма́дскі.

НЕОБЩИ́ТЕЛЬН||ОСТЬ нетавары́скасць, -ці *ж*; негаварлі́васць, -ці *ж*; замкнёнасць, -ці *ж*; нелюдзі́масць, -ці *ж*, дзіклі́васць, -ці *ж*; пану́расць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нетавары́скі; (*некомпанейский*) некампане́йскі; (*неразговорчивый*) негаваркі́, негаварлі́вы; (*замкнутый*) замкнёны; (*нелюдимый*) нелюдзі́мы, дзіклі́вы; (*угрюмый*) пану́ры.

НЕОБЪЕ́ЗЖЕННЫЙ (*о лошади*) неаб'е́зджаны.

НЕОБЪЯСНИ́М||ОСТЬ невытлумача́льнасць, -ці *ж*; незразуме́ласць, -ці *ж*; **~ЫЙ** невытлумача́льны; незразуме́лы; **~ый факт** невытлумача́льны факт; **~ым о́бразом** незразуме́лым чы́нам; **~ое явле́ние** незразуме́лая (невытлумача́льная) з'я́ва.

НЕОБЪЯ́ТН||ОСТЬ неабся́жнасць, -ці *ж*, неабды́мнасць, -ці *ж*; (*беспредельность*) бязме́жнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неабся́жны, неабды́мны; (*беспредельный*) бязме́жны; **~ая страна́** неабся́жная (неабды́мная, бязме́жная) краіна.

НЕОБЫКНОВЕ́НН||О *нареч.* незвыча́йна; надзвыча́йна; **~ОСТЬ** незвыча́йнасць, -ці *ж*; надзвыча́йнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незвыча́йны; (*чрезвычайный*) надзвыча́йны.

НЕОБЫЧА́ЙН||О *нареч.* незвыча́йна; надзвыча́йна; **~ОСТЬ** незвыча́йнасць, -ці *ж*; надзвыча́йнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** незвыча́йны; (*чрезвычайный*) надзвыча́йны.

НЕОБЫ́ЧН||О *нареч.* нязвы́чна, нязвы́кла; незвыча́йна; **~ОСТЬ** нязвы́чнасць, -ці *ж*, нязвы́класць, -ці *ж*; незвыча́йнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** нязвы́чны, нязвы́клы; (*необычайный*) незвыча́йны; **~ое вре́мя** незвыча́йны час; **~ые слова́** нязвы́чныя (нязвы́клыя) сло́вы; **~ый вид** незвыча́йны вы́гляд.

НЕОБЯЗА́ТЕЛЬН||О неабавязко́ва; **~ЫЙ 1.** неабавязко́вы; **2.** (*неуслужливый*) *уст.* непаслу́жлівы, няўслу́жлівы.

НЕОВИТАЛИ́ЗМ *биол.* неавіталі́зм, -ма *м.*

НЕОГЕГЕЛЬЯ́НСТВО *филос.* неагегелья́нства, -ва *ср.*

НЕОГЕ́НОВЫЙ *геол.* неаге́навы.

НЕОГЛЯ́ДНЫЙ неагля́дны; (*необъятный*) неабся́жны, неабды́мны; (*беспредельный*) бязме́жны.

НЕОГРАНИ́ЧЕНН||О *нареч.* неабмежава́на; бязме́жна; **~ОСТЬ** неабмежава́насць, -ці *ж*; бязме́жнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** неабмежава́ны; (*безграничный*) бязме́жны.

НЕОДАРВИНИ́ЗМ *биол.* неадарвіні́зм, -ма *м.*

НЕОДИ́М *хим.* неады́м, -ма *м.*

ПОЛЕТУ́ХА *зоол.* палятуха, -хі *ж*.
ПОЛЕ́Ч||ЕННЫЙ пале́чаны; **∼ИВАТЬ** *несов.* пале́чваць; (*лечить*) лячы́ць; **∼И́ТЬ** *сов.* палячы́ць; **∼И́ТЬСЯ** палячы́цца.
ПОЛЕ́ЧЬ *сов. в разн. знач.* пале́гчы; **в бою́ полегло́ мно́го во́инов** у баі́ палягло́ шмат во́інаў; **по́сле ли́вня пшени́ца полегла́** пасля́ лі́ўню пшані́ца палягла́.
ПО́ЛЗ||АНИЕ по́ўзанне, -ння *ср*; **∼АТЬ** *несов.* по́ўзаць; **∼КО́М** *нареч.* паўзко́м; **∼ТИ́** *несов.* паўзці́; **∼У́Н** *в разн. знач.* паўзу́н, -на́ *м*; **∼УНО́К** паўзуно́к, -нка́ *м*; **∼У́НЬЯ** паўзу́ха, -хі *ж*; **∼У́ЧЕСТЬ** паўзу́часць, -ці *ж*; **∼У́ЧИЙ** паўзу́чы.
ПОЛИАНДРИ́Я *этнол., бот.* паліяндры́я, -ры́і *ж*.
ПОЛИАНИ́Т *мин., горн.* палiяні́т, -ту *м*.
ПОЛИАРТИКУЛЯ́РНЫЙ *анат.* паліартыкуля́рны.
ПОЛИАРТРИ́Т *мед.* поліартры́т, -ту *м*.
ПОЛИА́РХИЯ палія́рхія, -хіі *ж*.
ПОЛИБАЗИ́Т *мин.* полібазі́т, -ту *м*.
ПОЛИ́В *м* паліва́нне, -ння *ср*, палі́ў, -лі́ву *м*.
ПОЛИВАЛЕ́НТНЫЙ *хим.* полівале́нтны.
ПОЛИВА́||ЛЬЩИК паліва́льшчык, -ка *м*; **∼ЛЬЩИЦА** паліва́льшчыца, -цы *ж*; **∼ТЬ** *несов.* паліва́ць; *см.* **поли́ть**; **∼ТЬСЯ** паліва́цца.
ПОЛИ́В||КА *ж* паліва́нне, -ння *ср*, палі́ўка, -кі *ж*; **∼НО́Й** палі́ўны; **∼но́е земледе́лие** палі́ўное землеро́бства; **∼О́ЧНЫЙ** палі́вачны.
ПОЛИГАМИ́ЧЕСКИЙ *этнол.* палігамі́чны.
ПОЛИГА́М||ИЯ *этнол.* паліга́мія, -міі *ж*; **∼НЫЙ** паліга́мны.
ПОЛИГЕНИ́ЗМ *биол., антр.* палігені́зм, -ма *м*.
ПОЛИГЕ́НИЯ *биол., антр.* паліге́нія, -ніі *ж*.
ПОЛИГИБРИ́Д *зоол., бот.* полігібры́д, -да *м*.
ПОЛИГИНИ́Я *этнол., бот.* палігіні́я, -ні́і *ж*.
ПОЛИГЛО́Т паліглóт, -та *м*; **∼И́ЧЕСКИЙ** паліглаты́чны.
ПОЛИГО́Н *воен., мат.* палігóн, -на *м*; **∼А́ЛЬНЫЙ** *мат.* палігана́льны; **∼НЫЙ** *воен.* палігóнны.
ПОЛИГРА́Ф *тех.* паліграф, -фа *м*; **∼И́СТ** паліграфі́ст, -та *м*; **∼И́СТКА** паліграфі́стка, -кі *ж*; **∼И́ЧЕСКИЙ** паліграфі́чны; **∼ИЯ** паліграфія, -фіі *ж*.
ПОЛИЗА́ТЬ *сов.* паліза́ць.
ПОЛИ́ЗЫВАТЬ *несов.* палі́зваць.
ПОЛИКЛИ́Н||ИКА полікліні́ка, -кі *ж*; **∼И́ЧЕСКИЙ** палікліні́чны.
ПОЛИКРА́ТИЯ палікра́тыя, -тыі *ж*.
ПОЛИМЕ́НТ *тех.* паліме́нт, -ту *м*.
ПОЛИМЕР||ИЗА́ТОР *тех.* палімерыза́тар, -ра *м*; **∼ИЗА́ЦИЯ** *хим.* палімерыза́цыя, -цыі *ж*; **∼И́Я** *хим.* палімеры́я, -ры́і *ж*.

ПОЛИМЕ́РНЫЙ палімéрны.
ПОЛИМЕ́РЫ *мн. хим.* палімéры, -раў.
ПОЛИМЕТ||АЛЛИ́ЧЕСКИЙ *геол.* поліметалі́чны; **~А́ЛЛЫ** *мн.* поліметáлы, -лаў.
ПОЛИМОРФ||И́ЗМ *біол., мин.* палімарфі́зм, -ма *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** палімарфі́чны.
ПОЛИМО́РФНЫЙ *биол., мин.* палімóрфны.
ПОЛИНЕВА́ТЬ *сов.* палінéіць.
ПОЛИНЕВРИ́Т *мед.* полінеўры́т, -ту *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** полінеўрыты́чны.
ПОЛИНЕЗИ́||ЕЦ палінезі́ец, -зі́йца *м*; **~ЙКА** палінезі́йка, -кі *ж*; **~ЙСКИЙ** палінезі́йскі.
ПОЛИНЕ́ЗИЯ Палінéзія, -зіі *ж*.
ПОЛИНО́М *мат.* паліно́м, -ма *м*.
ПОЛИНЯ́||ВШИЙ, ~ЛЫЙ палiня́лы, аблéзлы; **~ТЬ** *сов.* паліня́ць, аблéзці.
ПОЛИОМИЭЛИ́Т *мед.* поліяміэлі́т, -ту *м*.
ПОЛИ́П *зоол., мед.* палі́п, -па *м*.
ПОЛИПЛА́Н *ав.* паліплáн, -на *м*.
ПОЛИ́ПНЫЙ *зоол., мед.* палі́павы, палі́пны.
ПОЛИПО́ИД *зоол.* паліпóід, -да *м*.
ПОЛИПООБРА́ЗНЫЙ *зоол., мед.* паліпападóбны.
ПОЛИПТЕ́Р *зоол.* паліптэ́р, -ра *м*.
ПОЛИ́Р *тех.* палі́р, -ра *м*; **~ОВА́ЛЬНИК** *спец.* паліравáльнік, -ка *м*; **~ОВА́ЛЬНЫЙ** паліравáльны; **~ОВА́ЛЬНЯ** паліравáльня, -ні *ж*; **~ОВА́НИЕ** паліравáнне, -ння *ср*; **~О́ВАННЫЙ** паліравáны; **~ОВА́ТЬ** *несов.* паліравáць; **~ОВА́ТЬСЯ** паліравáцца; **~О́ВКА** *ж* **1.** (*действие*) паліравáнне, -ння *ср*, палірóўка, -кі *ж*; **2.** (*глянец*) палірóўка, -кі *ж*; **~О́ВОЧНЫЙ** палірóвачны; **~О́ВЩИК** палірóўшчык, -ка *м*; **~О́ВЩИЦА** палірóўшчыца, -цы *ж*.
ПО́ЛИС I пóліс, -са *м*; **страховóй п.** страхавы́ пóліс.
ПО́ЛИС II (*город-государство*) *ист.* пóліс, -са *м*.
ПОЛИСА́ХАР *хим.* поліцýкар, -кру *м*; **~И́Д** *хим.* поліцукры́н, -на *м*.
ПОЛИСЕМАНТИ́ЧЕСКИЙ *лингв.* полісеманты́чны.
ПОЛИСИНТЕТИ́ЧЕСКИЙ *лингв.* полісінтэты́чны.
ПОЛИСМЕ́Н палісмéн, -на *м*.
ПО́ЛИСНЫЙ *фин.* пóлісны.
ПОЛИСПА́СТ *тех.* паліспáст, -та *м*.
ПОЛИСПО́РА *бот.* поліспóра, -ры *ж*.
ПОЛИСТА́ТЬ *сов. разг.* пагартáць.
ПОЛИ́СТН||О *нареч.* паáркушна; **~ЫЙ** паáркушны.
ПОЛИТБЕСЕ́ДА палітгýтарка, -кі *ж*.
ПОЛИТБЮРО́ (политúческое бюрó) палітбюрó *нескл.*, *ср*, *мн. нет* (палітычнае бюрó).
ПОЛИТГРА́МОТА палітгрáмата, -ты *ж*.
ПОЛИТЕИ́||ЗМ *рел.* політэі́зм, -ма *м*; **~СТ** політэі́ст, -та *м*; **~СТИ́ЧЕСКИЙ** політэісты́чны.
ПОЛИТЕХН||ИЗА́ЦИЯ політэхнізáцыя, -цыі *ж*; **~ИЗИ́РОВАННЫЙ** політэхнізавáны; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* політэхнізавáць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** політэхнізавáцца; **~И́ЗМ** політэхні́зм, -му *м*.
ПОЛИТЕ́ХН||ИКУМ політэ́хнікум, -ма *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** політэхні́чны.
ПОЛИТЗАКЛЮЧЁННЫЙ палітзнявóлены, -нага *м*, палітвя́зень, -зня *м*.
ПОЛИТЗАНЯ́ТИЯ *мн.* палітзаня́ткі, -каў *ед. нет*.
ПОЛИ́ТИК палі́тык, -ка *м*.
ПОЛИ́ТИКА палі́тыка, -кі *ж*; **внýтренняя полúтика** унýтраная палі́тыка; **внéшняя полúтика** знéшняя палі́тыка.
ПОЛИТИКА́Н *презр.* палітыкáн, -на *м*; **~СТВО** *презр.* палітыкáнства, -ва *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов.* палітыкáнстваваць.
ПОЛИТИКОВОСПИТА́ТЕЛЬН||ЫЙ палітыкавыхавáўчы; **~ая рабóта** палітыкавыхавáўчая рабóта.
ПОЛИТИКОЭКОНОМИ́ЧЕСКИЙ палітыкаэканамі́чны.
ПОЛИТИНФОРМА́ЦИЯ палітінфармáцыя, -цыі *ж*.
ПОЛИТИПА́Ж *тип.* палітыпáж, -жа *м*.
ПОЛИТИ́Ч||ЕСКИ *нареч.* палiты́чна; **~ЕСКИЙ** палiты́чны; **~еская борьбá** палiты́чная барацьбá; **~еский строй** палiты́чны лад; **~НО** *нареч.* палiты́чна; **~НОСТЬ** палiты́чнасць, -цi *ж*; **~НЫЙ** палiты́чны.
ПОЛИТКАТОРЖА́НИН палiткатаржáнiн, -на *м*.
ПОЛИТКРУЖО́К палiтгуртóк, -ткá *м*.
ПОЛИТМИ́НИМУМ палiтмí нiмум, -му *м*.
ПОЛИТОБЗО́Р (политúческий обзóр) палiтагля́д, -ду *м* (палiты́чны агля́д).
ПОЛИТОБРАЗОВА́НИЕ *ср* (политúческое образовáние) палiтасвéта, -ты *ж* (палiты́чная асвéта).
ПОЛИТОТДЕ́Л (политúческий отдéл) палiтаддзéл, -ла *м* (палiты́чны аддзéл); **~ЕЦ** палiтаддзéлец, -льца *м*.
ПОЛИТПРОСВЕ́Т *м* (отдéл политúческого просвещéния) *ист.* палiтасвéта, -ты *ж* (аддзéл палiты́чнай асвéты).
ПОЛИТПРОСВЕЩЕ́НИЕ *ср* (политúческое просвещéние) палiтасвéта, -ты *ж* (палiты́чная асвéта).
ПОЛИТРАБО́Т||А (политúческая рабóта) палiтрабóта, -ты *ж* (палiты́чная рабóта); **~НИК** палiтрабóтнiк, -ка *м*.
ПОЛИТРУ́К (политúческий руководúтель) палiтрýк, -кá *м* (палiты́чны кiраўнíк).
ПОЛИТСОСТА́В (состáв политúческих рабóтников) *воен., мор.* палiтсастáў, -тáву *м* (састáў палiты́чных рабóтнiкаў).
ПОЛИТУПРАВЛЕ́НИЕ (политúческое управлéние) палiтупраўлéнне, -ння *ср* (палiты́чнае ўпраўлéнне); **Политуправлéние Совéтской А́рмии** Палiтупраўлéнне Савéцкай А́рмii.
ПОЛИТУ́Р||А палiтýра, -ры *ж*; **~НЫЙ** палiтýрны.
ПОЛИТУЧЁБА (политúческая учёба) палiтвучóба, -бы *ж* (палiты́чная вучóба).
ПОЛИТЧА́С *м* палiтгадзíна, -ны *ж*.
ПОЛИТЧА́СТЬ (политúческая часть) палiтчáстка, -кi *ж* (палiты́чная чáстка).
ПОЛИТШКО́ЛА палiтшкóла, -лы *ж*.
ПОЛИ́ТЫЙ палíты.
ПОЛИ́ТЬ *сов. в разн. знач.* палíць; **п. цветы́** палíць квéткi; **полúл дождь** палíў дождж; **~СЯ** палíцца.
ПОЛИТЭКОНО́МИЯ (политúческая эконóмия) палiтэканóмiя, -мii *ж* (палiты́чная эканóмiя).
ПОЛИТЭМИГРА́НТ (политúческий эмигрáнт) палiтэмiгрáнт, -та *м* (палiты́чны эмiгрáнт).
ПОЛИФОНИ́||ЗМ *муз.* палiфанíзм, -ма *м*; **~ЧЕСКИЙ** палiфанíчны.
ПОЛИФО́Н||ИЯ *муз.* палiфóнiя, -нii *ж*; **~НЫЙ** палiфóнны.
ПОЛИФТО́НГ *лингв.* палiфтóнг, -га *м*; **~И́ЧЕСКИЙ** палiфтангíчны.
ПОЛИХЛОРИ́Д *хим.* полiхлары́д, -да *м*.
ПОЛИХРОИ́ЗМ *мин.* палiхраíзм, -му *м*.
ПОЛИХРОМАТИ́ЧЕСКИЙ полiхраматы́чны.
ПОЛИХРО́МИЯ *спец.* палiхрóмiя, -мii *ж*.
ПОЛИЦЕЙМЕ́ЙСТЕР *уст.* палiцмáйстар, -тра *м*.
ПОЛИЦЕ́ЙСКИЙ **1.** *прил.* палiцэ́йскi; **2.** *сущ.* палiцэ́йскi, -кага *м*.
ПОЛИ́ЦИЯ палíцыя, -цыi *ж*.
ПОЛИЦМЕ́ЙСТЕР *см.* **полицеймéйстер.**
ПОЛИ́ЧН||ОЕ: поймáть с ~ым а) *юр.* злавíць з дóказамi злачы́нства; (*на месте преступления*) злавíць на мéсцы злачы́нства; б) *перен.* злавíць на гарáчым (на свéжым) учы́нку; злавíць на мéсцы злачы́нства.
ПОЛИШИНЕ́||ЛЬ *театр.* палiшынéль, -ля *м*; ◇ **секрéт ~ля** сакрэ́т палiшынéля.
ПОЛИЭ́ДР *мат.* палiэ́др, -ра *м*.
ПОЛИЭМБРИО́НИЯ *биол.* палiэмбрыёнiя, -нii *ж*.
ПОЛК полк, *род.* палкá *м*, *мн.* палкí, -кóў; **пехóтный полк** пяхóтны полк; **тáнковый полк** тáнкавы полк;

гвардейский полк гвардзейскі полк; ◇ **нашего полку прибыло** *погов.* нашага палку прыбыло.

ПОЛК||А I *ж* **1.** паліца, -цы *ж*; **книжная п.** кніжная паліца; **2.** (*в вагоне*) лаўка, -кі *ж*; **3.** (*у огнестрельного оружия*) брамка, -кі *ж*, полак, -лка *м*; **4.** (*в седле*) прыполак, -лка *м*; ◇ **положить зубы на ~у** *разг.* пакласці зубы на паліцу.

ПОЛКА II (*действие*) *с.-х.* поліва, -ва *ср*.

ПОЛКОВНИ||К палкоўнік, -ка *м*; **~ЦА** *разг.* палкоўнічыха, -хі *ж*; **~ЧЕСКИЙ, ~ЧИЙ** палкоўніцкі.

ПОЛКОВОДЕЦ палкаводзец, -дца *м*.

ПОЛКОВОЙ палкавы.

ПОЛКОПЕЙКИ *уст.* поўкапейкі *ж*; (*грош*) ґрош, *род.* гроша *м*.

ПОЛ-ЛИСТА 1. поўлістá *м*; **2.** *тип.* поўаркуша *м*.

ПОЛЛЮЦИЯ *физл.* палюцыя, -цыі *ж*.

ПОЛМИНУТЫ поўхвіліны *ж*, поўмінуты *ж*.

ПОЛМИРА поўсвета *м*.

ПОЛНЕЙШИЙ самы поўны; (*абсолютный*) абсалютны; (*сплошной*) суцэльны; (*ужасный*) страшэнны; ■ **комнате п. беспорядок** у пакоі абсалютнае (страшэннае, суцэльнае) бязладдзе.

ПОЛН||ЕТЬ *несов.* паўнець; (*толстеть*) таўсцець; **~ЁХОНЬКИЙ** *разг.* паўнюсенькі; **~ЁХОНЬКО** *нареч. разг.* паўнюсенька; **~ЁШЕНЬКИЙ** паўнюсенькі; **~ЁШЕНЬКО** *нареч. разг.* паўнюсенька; **~ИТЬ** *несов. разг.* таўсціць, рабіць надта (вельмі) поўным.

ПОЛНИТ||ЬСЯ: слухом земля ~ся *посл.* чуткамі зямля поўна.

ПОЛНО I *нареч.* поўна; **п. налить стакан** поўна наліць шклянку; **слишком п.** надта поўна.

ПОЛНО II *сказ.* (*довольно, хватит*) *простореч.* годзе, досыць, даволі; (*перестань, брось*) кінь; (*перестаньте, бросьте*) кіньце; (*что ты говоришь!*) што ты (кажаш)!; (*что вы говорите!*) што вы (кажаце)!; **п. вам плакать!** годзе (досыць, даволі) вам плакаць!; **~те ссориться!** годзе (досыць, даволі, кіньце) сварыцца!; **п., правда ли?** кінь (-це), хіба гэта праўда?; **~те, какая тут гордость!** што вы (кіньце), якая тут гордасць!; **и полно!** і годзе!, і толькі!

ПОЛНОВЕСН||ОСТЬ 1. поўнаважкасць, -ці *ж*; поўнавагавасць, -ці *ж*; **2.** *перен.* важкасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** поўнаважкі; поўнавагавы; **2.** *перен.* важкі; **~ые доводы** важкія довады.

ПОЛНОВЛАСТ||ИЕ поўнаўладдзе, -ддзя *ср*, поўнаўладства, -ва *ср*; **~НО** *нареч.* поўнаўладна; **~НЫЙ** поўнаўладны.

ПОЛНОВОД||НЫЙ поўнаводны; **~ЬЕ** поўнаводдзе, -ддзя *ср*.

ПОЛНОГЛАС||ИЕ *лингв.* поўнагалоссе, -сся *ср*; **~НЫЙ** поўнагалосны.

ПОЛНОГРУДЫЙ поўнагруды.

ПОЛНОЗВУЧ||НЫЙ поўнагучны; **~ИЕ** поўнагучча, -чча *ср*.

ПОЛНОЗНАЧНЫЙ *грам.* поўназначны.

ПОЛНОКРОВ||ИЕ *ср* поўнакроўнасць, -ці *ж*; **~НОСТЬ** поўнакроўнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** поўнакроўны.

ПОЛНОЛИЦЫЙ поўнатвары.

ПОЛНОЛУНИЕ *ср* поўня, -ні *ж*, *мн. нет*.

ПОЛНОМЕРНЫЙ поўнамерны.

ПОЛНОМЕТРАЖНЫЙ *кино* поўнаметражны.

ПОЛНОМОЧ||ИЕ поўнамоцтва, -ва *ср*; **~НЫЙ 1.** поўнамоцны; **~ный министр** поўнамоцны міністр; **~ный посол** поўнамоцны пасол; **~ный представитель** поўнамоцны прадстаўнік; **2.** (*уполномоченный*) упаўнаважаны; **я не ~ен это делать** я не ўпаўнаважаны гэта рабіць.

ПОЛНОПРАВ||ИЕ *ср* поўнапраўе, -праўя *ср*; **~НОСТЬ** поўнапраўнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** поўнапраўны.

ПОЛНОСТЬЮ *нареч.* поўнасцю; (*целиком*) цалкам.

ПОЛНОТ||А 1. паўната, -ты *ж*; **п. власти** паўната ўлады; **2.** (*тучность*) паўната, -ты *ж*; (*толщина*) таўшчыня, -ні *ж*; ◇ **от ~ы чувств** ад паўнаты пачуццяў.

ПОЛНОТЕ *см.* **полно** II.

ПОЛНОТЕЛЫЙ поўнацелы.

ПОЛНОЦЕНН||ОСТЬ поўнацэннасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** поўнацэнны.

ПОЛНОЧ||И поўночы *нескл.*, *ж*; **~НЫЙ** поўночны.

ПОЛНОЧЬ поўнач, -чы *ж*, *мн. нет*.

ПОЛНОЩНЫЙ поўночны.

ПОЛН||ЫЙ 1. поўны; **~ая победа социализма** поўная перамога сацыялізма; **работа в ~ом разгаре** праца ў поўным разгары; **~ое собрание сочинений** поўны збор твораў; **~ая власть** поўная ўлада; **~ые прилагательные** *грам.* поўныя прыметнікі; **~ая луна** поўня; **~ая вода** поўная вада; **~ая тишина** поўная цішыня; **взгляд, п. радости** позірк, поўны радасці; **комната полна людей** пакой поўны людзей; **ему нет ~ых тридцати лет** яму няма поўных трыццаці год; **2.** (*тучный*) поўны; (*толстый*) тоўсты; **п. мужчина** поўны (тоўсты) мужчына; ◇ **под ~ым ветром** *мор.* пад поўным ветрам; **~ая чаша** поўная чаша; **~ым голосом** на поўны голас; **~ЫМ-ПОЛНО** *сказ. разг.* паўнюсенька, поўна.

ПОЛО *спорт.* поло *нескл.*, *ср*.

ПОЛОБОРОТА 1. *воен.*, *спорт.* поўпаварота *нескл.*, *м*; **2.** *тех.* поўабарота *нескл.*, *м*; **п. вала** поўабарота вала.

ПОЛОВА *с.-х.* палова, -вы *ж*; (*мякина*) мякіна, -ны *ж*.

ПОЛОВ||ЕЦ *ист.* полавец, -лаўца *м*; **~ЕЦКИЙ** палавецкі.

ПОЛОВИК *м* палавік, -ка *м*; (*дорожка*) дарожка, -кі *ж*.

ПОЛОВИН||А 1. палавіна, -ны *ж*, палова, -вы *ж*; **п. третьего** палова на трэцюю; **2.** (*часть помещения*) *уст.* палавіна, -ны *ж*; **парадная п. дома** парадная палавіна дома; **~КА** *уменьш.* палавінка, -кі *ж*; **~ЧАТЫЙ** *в разн. знач.* палавінчаты; **~ЩИК** *спец.* палавіншчык, -ка *м*.

ПОЛОВИТЬ *сов. разг.* палавіць.

ПОЛОВИЦА маснічына, -ны *ж*, дошка (у падлозе).

ПОЛОВИЧОК *м уменьш.-ласк.* палавічок, -чка *м*; (*дорожка*) дарожка, -кі *ж*.

ПОЛОВНИК I *ист.* палавіншчык, -ка *м*.

ПОЛОВНИК II *обл. см.* **уполовник.**

ПОЛОВОДЬЕ *ср* паводка, -кі *ж*, разводдзе, -ддзя *ср*.

ПОЛОВ||ОЙ I *прил.* (*к* **пол** I) падлогавы; *чаще переводится оборотами* для падлогі, на падлогу; **~ые доски** дошкі падлогі; (*как строительный материал*) дошкі на падлогу (для падлогі); **~ая щётка** шчотка для падлогі.

ПОЛОВ||ОЙ II *прил. биол.* палавы; **~ая зрелость** палавая спеласць; **~ые органы** палавыя органы.

ПОЛОВОЙ III *сущ. уст.* слуга, -гі *м*.

ПОЛОВЧАНКА *ист.* палаўчанка, -кі *ж*.

ПОЛОВЫЙ (*о масти*) палавы.

ПОЛОГ полаг, -га *м*.

ПОЛОГ||ИЙ пакаты, спадзісты; **~ОСТЬ** пакатасць, -ці *ж*, спадзістасць, -ці *ж*.

ПОЛОЖЕН||ИЕ *ср* **1.** (*состояние, обстоятельства*) становішча, -ча *ср*; **международное п.** міжнароднае становішча; **внутреннее п. в стране** унутранае становішча ў краіне; **на военном ~ии** на ваенным становішчы; **социальное п.** сацыяльнае становішча; **найти выход из ~ия** знайсці выхад са становішча; **попасть в смешное п.** трапіць у смешнае становішча; **2.** (*местонахождение*) становішча, -ча *ср*, месцазнаходжанне, -ння *ср*; **определить п. планеты** вызначыць месцазнаходжанне планеты; **дивизия заняла наиболее выгодное п.** дывізія заняла найбольш выгаднае становішча; **3.** (*поза*) пастава, -вы *ж*; **п. корпуса при метании копья** пастава корпуса пры кіданні капʼя; **стрелять из винтовки с ~ия лёжа** страляць з вінтоўкі лежачы; **заснуть в сидячем ~ии** заснуць

сéдзячы; 4. (*научное, законодательное*) палажэ́нне, -ння *ср*; **п. о выборах** палажэ́нне аб вы́барах; **основные ~ия книги** асно́ўныя палажэ́нні кні́гі; ◇ **быть в ~ии** *разг.* быць цяжа́рнай.

ПОЛОЖ||ЕННЫЙ 1. *прич.* (*от глаг.* **положить**) пало́жаны, пакла́дзены; **2.** *прич.* (*решённый*) *уст.* вы́рашаны; (*постановленный*) ухва́лены; пастано́ўлены; **3.** *прич.* (*назначенный*) прызна́чаны; да́дзены; *см.* **положить; 4.** *прил.* (*заранее назначенный*) прызна́чаны, вы́значаны; (*надлежащий*) нале́жны; **~енное время** прызна́чаны час; **~ЕНО** *сказ.* **1.** (*принято*) пры́нята; (*в обычае*) заве́дзена, так вядзе́цца, ёсць такі́ звы́чай; (*надлежит*) нале́жыць; **2.** (*решено*) вы́рашана; (*постановлено*) ухва́лена; **3.** (*назначено*) прызна́чана, да́дзена; **~ИМ** *вводн. сл.* **1.** (*допустим*) дапу́сцім; **~им, что вы правы** дапу́сцім, што ва́ша пра́ўда (вы ма́еце ра́цыю); **~им, что пора уже** дапу́сцім, што пара́ ўжо; **2.** (*правда*) пра́ўда *нескл.*, *ж*; **он-то, ~им, не пришёл, но...** ён, пра́ўда, не прыйшо́ў, але́...; **3.** *межд.*: **ну, ~им!** *разг.* ну, дзе там!, ну, што вы!; (*посмотрим*) ну, гэ́та (яшчэ́) пабачым!

ПОЛОЖИТЕЛЬН||О *нареч.* **1.** (*утвердительно*) стано́ўча, дада́тна; **оценить п.** ацані́ць дада́тна; **ответить п.** адказа́ць стано́ўча; **2.** (*совершенно*) зусі́м; (*абсолютно*) абсалю́тна; (*буквально*) літара́льна; (*решительно*) рашу́ча; (*безусловно*) безумо́ўна; **п. ничего не знает** зусі́м (абсалю́тна) нічо́га не ве́дае; **он п. ничего не сделал** ён зусі́м (абсалю́тна) нічо́га не зрабі́ў; **п. ни в ком не было сочувствия** абсалю́тна (літара́льна) ні ў кім не было́ спага́ды; **п. все** абсалю́тна (літара́льна) усе́; **~ОСТЬ 1.** стано́ўчасць, -ці *ж*, дада́тнасць, -ці *ж*; **2.** ста́ласць, -ці *ж*, пава́жнасць, -ці *ж*; **3.** *мат.*, *физ.* дада́тнасць, -ці *ж*; *см.* **положительный 1, 2, 4; ~ЫЙ 1.** (*утвердительный*, *хороший*) стано́ўчы, дада́тны; **~ый ответ** стано́ўчы адка́з; **~ый герой романа** стано́ўчы (дада́тны) геро́й рама́на; **~ая оценка** стано́ўчая (дада́тная) ацэ́нка; **~ые результаты** стано́ўчыя (дада́тныя) вы́нікі; **2.** (*основательный*, *степенный*) ста́лы, пава́жны; **3.** (*несомненный*, *настоящий*) *разг.* сапра́ўдны, безумо́ўны; **~ый невежда** сапра́ўдны (безумо́ўны) не́вук; **4.** *мат.*, *физ.* дада́тны; **~ая величина** дада́тная велічыня́; **~ая температура** дада́тная тэмперату́ра; **~ый полюс** дада́тны по́люс; **~ый заряд** дада́тны зара́д; ◇ **~ая степень сравнения** *грам.* звыча́йная ступе́нь параўна́ння; **~ая философия** пазітывізм.

ПОЛОЖ||ИТЬ *сов.* **1.** палажы́ць; *многокр.* пакла́сці; **~ить все силы на служение родине** палажы́ць усе́ сі́лы на служэ́нне радзі́ме; **~ить много сил** пакла́сці мно́га сіл; **~ить больного в больницу** палажы́ць хво́рага ў бальні́цу; **~ить начало, конец чему-либо** пакла́сці пача́так, кане́ц чаму́-не́будзь; **2.** (*решить*) *уст.* вы́рашыць; (*постановить*) ухвалі́ць, пастанаві́ць; (*условиться*) умо́віцца; (*сговориться*) згавары́цца; **они ~или между собой** яны́ вы́рашылі (згавары́ліся) памі́ж сабо́ю; **3.** (*предположить*) дапусці́ць; **4.** (*назначить*) прызна́чыць, даць; **~ить ему хорошую плату** прызна́чыць (да́ць) яму́ до́брую пла́ту; ◇ **~ить за правило** узя́ць за пра́віла; **~а руку на сердце** палажы́ўшы руку́ на сэ́рца; **~ить на обе лопатки** *спорт.* палажы́ць на абе́дзве лапа́ткі; **вынь да положь** зара́з-жа і дай, вы́мі ды палажы́; **~ИТЬСЯ** (*понадеяться*) паспадзява́цца (*на каго-што*); (*довериться*) даве́рыцца (*каму-чаму*), зда́цца (*на каго-што*); (*быть уверенным*) быць упэ́ўненым (*у кім-чым*); **я напрасно ~ился на него** я дарэ́мна паспадзява́ўся на яго́; **я целиком ~ился на него** я ца́лкам зда́ўся на яго́ (даве́рыўся яму́); **на его слова нельзя ~иться** яго́ сло́вам не́льга даве́рыцца; **~итесь на меня** даве́рцеся мне, зда́йцеся на мяне́; **на меня можете положиться** на мне мо́жаце быць упэ́ўнены.

ПОЛОЗ I (*у саней и т. п.*) по́лаз, -за *м*, *мн.* палазы́, -зо́ў.

ПОЛОЗ II *зоол.* по́лаз, -за *м.*

ПОЛОК I (*в бане*) пало́к, -лка́ *м.*

ПОЛОК II (*телега*) пало́к, -лка́ *м.*

ПОЛО||ЛКА *с.-х.* пало́льшчыца, -цы *ж*; **~ЛЬНИК** (*орудие*) пало́льнік, -ка *м*; **~ЛЬНЫЙ** пало́льны; **~ЛЬЩИК** (*рабочий*) пало́льшчык, -ка *м*; **~ЛЬЩИЦА** пало́льшчыца, -цы *ж.*

ПОЛОМ пало́м, -му *м*; **~АННЫЙ** *в разн. знач.* палама́ны; **~АТЬ** *сов.* палама́ць; **~АТЬСЯ 1.** палама́цца; **2.** (*покривляться*) *разг.* пакрыўля́цца; (*поупрямиться*) паманéжыцца, панараві́цца; **~КА** *ж* **1.** (*действие*) пало́м, -му *м*, пало́мка, -кі *ж*; **2.** (*повреждение*) пало́мка, -кі *ж.*

ПОЛОМОЙКА прыбіра́льшчыца, -цы *ж.*

ПОЛОН по́ўны (*каго-чаго*); *см.* **полный 1.**

ПОЛОН *уст.* пало́н, -ну *м.*

ПОЛОНЕЗ палане́з, -за *м.*

ПОЛОН||ИЗАЦИЯ паланіза́цыя, -цыі *ж*; **~ИЗИРОВАННЫЙ** паланізава́ны; **~ИЗИРОВАТЬ** *сов. и несов.* паланізава́ць; **~ИЗИРОВАТЬСЯ** паланізава́цца; **~ИЗМ** *лингв.* паланізм, -ма *м.*

ПОЛОНИЙ *хим.* пало́ній, -нія *м.*

ПОЛОН||ИТЬ *сов. уст.* палані́ць; **~ЯНИН** *уст.* паланя́нін, -на *м*; **~ЯНКА** паланя́нка, -кі *ж.*

ПОЛОПАТЬСЯ *сов.* пало́пацца, патрэ́скацца.

ПОЛОРОГ||ИЕ *мн. сущ. зоол.* пустаро́гія, -гіх; **~ИЙ** пустаро́гі.

ПОЛОС||А *ж* **1.** пало́са, -сы *ж*, *мн.* пало́сы; **п. железа** пало́са жале́за; **п. материи** пало́са матэ́рыі; **тёмная п. леса на горизонте** цёмная пало́са ле́су на гарызо́нце; **полосы спектра** пало́сы спе́ктра; **солнечный луч тянулся светлой ~ой** со́нечны прамень цягну́ўся све́тлай пало́сай; **дождь прошёл ~ой** дождж прайшо́ў пало́сай; **2.** (*зона*) зо́на, -ны *ж*, паласа́, -сы́ *ж*; **п. отчуждения** *ж.-д.* паласа́ адчужэ́ння; **чернозёмная п.** чарназёмная паласа́ (зо́на); **лесная п.** ляcна́я зо́на (паласа́); **п. огня** *воен.* зо́на (паласа́) агню́; **3.** (*период*) перы́яд, -ду *м*, паласа́, -сы́ *ж*; **п. реакции** перы́яд (паласа́) рэа́кцыі; **п. хорошей погоды** перы́яд (паласа́) до́брага надво́р'я; **самая счастливая п. его жизни** са́мы шчаслі́вы перы́яд (са́мая шчаслі́вая паласа́) яго́ жыцця́.

ПОЛОСАТИК *зоол.* паласа́цік, -ка *м.*

ПОЛОСАТ||ОСТЬ паласа́тасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** паласа́ты.

ПОЛОСКА *уменьш.* пало́ска, -кі *ж.*

ПОЛОСКАНИЕ паласка́нне, -ння *ср.*

ПОЛОСК||АТЕЛЬНИЦА паласка́льніца, -цы *ж*; **~АТЕЛЬНЫЙ** паласка́льны; **~АТЬ** *несов.* паласка́ць; **~АТЬСЯ** паласка́цца.

ПОЛОСНОЙ *см.* **полосовой.**

ПОЛОСНУТЬ *сов. разг.* разану́ць, рэ́знуць.

ПОЛОСОВА||ЛЬНЫЙ *тех.* паласава́льны; **~НИЕ** паласава́нне, -ння *ср.*

ПОЛОСОВАННЫЙ паласава́ны.

ПОЛОСОВ||АТЬ *несов.* паласава́ць; **~ОЙ: ~ое железо** паласаво́е жале́за.

ПОЛОСТНОЙ *анат.* по́ласцевы.

ПОЛОСТЬ 1. *анат.* по́ласць, -ці *ж*, *мн.* по́ласці, -цей; **брюшная п.** брушна́я по́ласць; **2.** (*в экипаже*) запо́на, -ны *ж.*

ПОЛОТЕН||ЕЧНЫЙ ручніко́вы, уціра́льнікавы; **~ЦЕ** *ср* ручні́к, -ка́ *м*, уціра́льнік, -ка *м.*

ПОЛОТЁР палацёр, -ра *м*; **~НЫЙ** палацёрны; **~СКИЙ** палацёрскі.

ПОЛОТНИЩ||Е *ср* **1.** (*кусок ткани в натуральную ширину*) по́лка, -кі *ж*, палатно́, -на́ *ср*; **парус в четыре ~а** па́рус у чаты́ры по́лкі (палатны́); **2.** (*знамени и т. п.*) пало́тнішча, -шча *ср*; **п. знамени** пало́тнішча сця́га; **опознавательное п.** *воен.* апазнава́льнае пало́тнішча; **авиасигнальное п.** *воен.* авіясігна́льнае пало́тнішча;

3. (*инструмента*) палатно́, -на́ *ср*; **п. пилы́** палатно́ пілы́; 4. (*у ворот*) фо́ртка, -кі *ж*; **навесить п. воро́т** наве́сіць фо́ртку.

ПОЛОТН||О́ *ср* 1. палатно́, -на́ *ср*; **шёлковое п.** шаўко́вае палатно́; **узо́рчатое п.** узо́рыстае палатно́; **железнодоро́жное п.** чыгу́начнае палатно́; палатно́ чыгу́нкі; **земляно́е п.** (*дороги*) земляно́е палатно́; **ездово́е п.** (*моста*) ездаво́е палатно́; **п. конве́йера** палатно́ канве́ера; **п. пилы́** палатно́ пілы́; **п. изве́стного худо́жника** палатно́ вядо́мага мастака́; **широ́кое п. литерату́рного произведе́ния** шыро́кае палатно́ літарату́рнага тво́ра; 2. (*у ворот*) фо́ртка, -кі *ж*; **ле́вое п. воро́т** ле́вая фо́ртка варо́т; ◇ **бле́дный, как п.** бле́дны (бе́лы), як палатно́; **п. ~о́м** *разг.* як палатно́; **~Я́НЫЙ** палатня́ны.

ПОЛОТО́К *спец.* палато́к, -тка́ *м*.

ПО́ЛОТЫЙ по́латы.

ПОЛО́ТЬ *несов.* пало́ць.

ПОЛОУ́М||ИЕ *ср* вар'я́цтва, -ва *ср*, прыду́ркаватасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** вар'я́т, -та *м*, прыду́ркаваты.

ПО́ЛОЦК *г.* По́лацк, -цка *м*.

ПО́ЛОЦКАЯ О́БЛАСТЬ По́лацкая во́бласць.

ПО́ЛОЦКИЙ РАЙО́Н По́лацкі раён.

ПО́ЛОЧКА *уменьш.-ласк.* палі́чка, -кі *ж*.

ПО́ЛОЧНЫЙ палі́чны.

ПОЛПИ́ВО *разг.* поўпі́ва, -ва *ср*, лёгкае пі́ва.

ПОЛПО́РЦИИ поўпо́рцыі *ж*.

ПОЛПРЕ́Д (полномо́чный представи́тель) *дип.* паўпрэ́д, -да *м* (поўнамо́цны прадстаўні́к); **~СТВО** (полномо́чное представи́тельство) паўпрэ́дства, -ва *ср* (поўнамо́цнае прадстаўні́цтва).

ПОЛПУТИ́ *м* поўдаро́гі *ж*, палаві́на даро́гі; **верну́ться с п.** вярну́цца з поўдаро́гі; **пе́рвые п. мы прошли́ легко́** пе́ршую палаві́ну даро́гі мы прайшлі́ лёгка; ◇ **на п.** *переч.* на поўдаро́зе.

ПОЛСЛО́ВА поўсло́ва *ср*; ◇ **на п.** на поўсло́ва; **останови́ться на полсло́ве (на полусло́ве)** спыні́цца на поўсло́ве; **поня́ть с полсло́ва (с полусло́ва)** зразуме́ць з поўсло́ва.

ПОЛСО́ТНИ поўсо́тні *ж*.

ПОЛТА́ВА *г.* Палта́ва, -вы *ж*.

ПОЛТА́ВСКАЯ О́БЛАСТЬ Палта́ўская во́бласць.

ПОЛТИ́Н||А *ж*, **~НИК** *м разг.* поўрубе́ль, -бля́ *м*.

ПОЛТОРА́ паўтара́ *м* и *ср*; **п. го́да** паўтара́ го́да; **п. ведра́** паўтара́ вядра́.

ПОЛТОРА́СТА паўтара́ста.

ПОЛТОРЫ́ паўтары́ *ж*; **п. ты́сячи** паўтары́ ты́сячы.

ПОЛУАВТОМА́Т поўаўтама́т, -та *м*.

ПОЛУАНТРАЦИ́ТОВЫЙ поўантрацы́тавы.

ПОЛУБА́К *мор.* поўба́к, -ка *м*.

ПОЛУБЕЗРАБО́ТНЫЙ поўбеспрацо́ўны; напало́ву беспрацо́ўны; (*почти безработный*) ама́ль беспрацо́ўны.

ПОЛУБЕССОЗНА́ТЕЛЬНЫЙ напоўпрыто́мны.

ПОЛУБО́Г поўбо́г, -га *м*; **~И́НЯ** поўбагі́ня, -ні *ж*.

ПОЛУБОЛО́ТНЫЙ *с.-х.* напоўбало́тны.

ПОЛУБОЛЬНО́Й 1. *прил.* напоўхво́ры; (*почти больной*) хварава́ты, ама́ль хво́ры; (*больной*) хво́ры; 2. *сущ.* напоўхво́ры, -рага *м*.

ПОЛУБОТИ́НКИ *мн.* ту́флі, -ляў, *ед.* ту́фель, -фля *м*; поўчараві́кі, -ві́к, *ед.* поўчараві́к, -ка *м*.

ПОЛУВА́Л (*сорт кожи*) палува́л, -лу *м*.

ПОЛУВА́ННА поўва́нна, -ны *ж*.

ПОЛУВА́ТТ *эл.* поўва́т, -та *м*, *мн. нет*; **~НЫЙ** поўва́тны.

ПОЛУВЕКОВО́Й поўвекавы́.

ПОЛУВЗВО́Д поўузво́д, -да *м*.

ПОЛУВО́ЛЬТ *эл.* поўво́льт, -та *м*.

ПОЛУВЫ́ЕМКА *спец.* поўвы́емка, -кі *ж*.

ПОЛУГЛА́СНЫЙ *сущ. лингв.* поўгало́сны, -нага *м*.

ПОЛУГНИЛО́Й напоўгнілы́.

ПОЛУГО́Д||ИЕ поўго́ддзе, -ддзя *ср*; **~И́ЧНЫЙ** поўгадавы́; **~ОВА́ЛЫЙ** поўгадо́вы; **~ОВО́Й** поўгадавы́; **~ОК** поўго́дак, -дка *м*.

ПОЛУГОЛО́ДНЫЙ напоўгало́дны; галаднава́ты; ама́ль гало́дны.

ПОЛУГО́ЛЫЙ напоўго́лы; (*почти голый*) ама́ль го́лы.

ПОЛУГРА́МОТНЫЙ напоўпісьме́нны.

ПОЛУ́ДА *тех.* палу́да, -ды *ж*.

ПОЛУ́ДЕННЫЙ поўднёвы.

ПОЛУ||ДИКА́РЬ напоўдзіку́н, -на́ *м*; **~ДИ́КИЙ** напоўдзі́кі; (*почти дикий*) ама́ль дзі́кі.

ПОЛУДИ́ТЬ *сов.* палудзі́ць.

ПОЛУДРАГОЦЕ́ННЫЙ напоўкаштоў́ны.

ПОЛУДРЕМО́ТА напоўдрымо́та, -ты *ж*, поўдрымо́та, -ты *ж*.

ПОЛУДЮЙМО́В||КА поўцалёўка, -кі *ж*; **~ЫЙ** поўцалёвы.

ПОЛУ́Ж||ЕННЫЙ, ~ЁННЫЙ палу́джаны.

ПОЛУЖЕСТКОКРЫ́ЛЫЕ *мн. сущ. зоол.* поўцвёрдакры́лыя, -лых.

ПОЛУЖИВО́Й напоўжывы́; (*чуть живой*) ледзь жывы́.

ПОЛУЖИ́ДКИЙ 1. напоўва́дкі; 2. (*редкий*) напоўрэ́дкі; (*жидковатый*) радкава́ты.

ПОЛУЖИ́РНЫЙ *тип.* поўтлу́сты, поўто́ўсты.

ПОЛУЗАБЫ́||ТЫЙ напоўзабы́ты; поўзабы́ты; (*почти забытый*) ама́ль забы́ты; **~ТЬЁ** поўзабыццё, -ццю́ *ср*.

ПОЛУЗАВО́ДСК||ИЙ, ~О́Й напоўзаво́дскі.

ПОЛУЗАКРЫ́ТЫЙ напоўзачы́нены, поўзачы́нены; (*полупокрытый*) напоўзакры́ты, поўзакры́ты; (*полузаслонённый*) напоўзасло́нены, поўзасло́нены; (*полусложенный*) напоўзаго́рнуты, поўзаго́рнуты, напоўзго́рнуты, поўзго́рнуты; напоўскла́дзены, поўскла́дзены; (*о глазах*) напоўзаплю́шчаны, поўзаплю́шчаны.

ПОЛУЗАТОНУ́ВШИЙ напоўпатану́лы, напоўзатану́лы.

ПОЛУЗАЩИ́Т||А *спорт.* поўабаро́на, -ны *ж*; **~НИК** поўабаро́нца, -нцы *м*.

ПОЛУЗРЕ́ЛЫЙ напоўспе́лы; (*почти зрелый*) ама́ль спе́лы; (*несколько зрелый*) спелава́ты.

ПОЛУИМПЕРИА́Л *ист.* поўімперыя́л, -ла *м*.

ПОЛУКАФТА́Н *м*, **~ЬЕ** *ср уст.* поўкафта́н, -на *м*.

ПОЛУКО́ЖАНЫЙ: п. переплёт поўскурана́я во́кладка.

ПОЛУКОЛ||ОНИА́ЛЬНЫЙ напоўкаланія́льны, поўкаланія́льны; **~О́НИЯ** напоўкало́нія, -ніі *ж*, поўкало́нія, -ніі *ж*.

ПОЛУКОЛО́ННА *арх.* поўкало́на, -ны *ж*.

ПОЛУКОЛЬЦО́ 1. поўкальцо́, -ца́ *ср*; 2. (*полукруг*) поўко́ла, -ла *ср*.

ПОЛУКОПНА́ поўкапа́, -пы́ *ж*.

ПОЛУКОЧЕ́В||НИК *этн.* напоўкачэ́ўнік, -ка *м*, поўкачэ́ўнік, -ка *м*; **~О́Й** напоўкачавы́, поўкачавы́.

ПОЛУКРЕПОСТНИ́ЧЕСК||ИЙ напоўпрыго́нніцкі, поўпрыго́нніцкі; **~ое землевладе́ние** напоўпрыго́нніцкае землеўлада́нне.

ПОЛУКРО́В||КА *с.-х.* поўкро́ўка, -кі *ж*; **~НЫЙ** напоўкро́ўны, поўкро́ўны.

ПОЛУКРУ́||Г *м* поўкру́г, -га *м*; (*полузамкнутая цепь*) поўко́ла, -ла *ср*; **~ГЛЫЙ** напоўкру́глы, поўкру́глы; **~ЖИЕ** *ср уст.* поўкру́г, -га *м*.

ПОЛУКУСТА́РНИК *бот.* напоўхмызня́к, -ку́ *м*, поўхмызня́к, -ку́ *м*.

ПОЛУКУСТА́РНЫЙ напоўсамату́жны, поўсамату́жны.

ПОЛУЛЕГА́ЛЬНЫЙ напоўлега́льны, поўлега́льны.

ПОЛУЛЕЖА́||ТЬ *несов.* напоўляжа́ць, поўляжа́ць; **~ЧИЙ** напоўляжа́чы, поўляжа́чы.

ПОЛУЛИ́СТ 1. (*бумаги*) поўлі́ст, -та́ *м*; 2. *тип.* поўа́ркуш, -ша *м*.

ПОЛУЛИ́ТР поўлі́тр, -ра *м*; **~О́ВКА** *разг.* поўлітро́ўка, -кі *ж*; **~О́ВЫЙ** поўлітро́вы.

ПОЛУЛО́ДКА *мор.* поўло́дка, -кі *ж*.

ПОЛУЛЬНЯНО́Й поўільняны́, напоўільняны́.

ПОЛУМА́СКА поўма́ска, -кі *ж.*
ПОЛУМА́ССА *тех.* напоўма́са, -сы *ж*, поўма́са, -сы *ж.*
ПОЛУМГЛА́ поўімгла́, -лы́ *ж.*
ПОЛУМЕ́РА поўме́ра, -ры *ж.*
ПОЛУМЁРТВЫЙ напоўмёртвы; ама́ль мёртвы; напоўжывы́; ледзь жывы́.
ПОЛУМЕ́СЯ||Ц поўме́сяц, -ца *м*; **~ЧНЫЙ** поўме́сячны.
ПОЛУМЕТРО́ВЫЙ поўметро́вы.
ПОЛУМЕХАНИЗИ́РОВАННЫЙ напоўмеханізава́ны, поўмеханізава́ны.
ПОЛУМРА́К *м* пры́цемак, -мку *м, мн. нет*, поўце́мра, -ры *ж, мн. нет*; (*сумрак*) мо́рак, -ку *м, мн. нет*; змрок, -ку *м, мн. нет.*
ПОЛУМЯ́ГКИЙ напоўмя́ккі, поўмя́ккі.
ПОЛУНАГО́Й напоўго́лы; ама́ль го́лы.
ПОЛУНАДЗЕ́МНЫЙ напоўнадзе́мны, поўнадзе́мны.
ПОЛУНАЛИВНО́Й напоўналіўны́, поўналіўны́.
ПОЛУНАСЫ́ЩЕННЫЙ напоўнасы́чаны, поўнасы́чаны.
ПОЛУНАТУРА́ЛЬНЫЙ поўнатура́льны.
ПОЛУНО́ЧН||ИК поўно́чнік, -ка *м*; **~ИЦА** поўно́чніца, -цы *ж*; **~ИЧАТЬ** *несов.* сядзе́ць (працава́ць, гуля́ць *и т. п.*) да по́зняй но́чы; поўно́чнічаць.
ПОЛУ́Н||О́ЧНЫЙ, ~О́ЩНЫЙ поўно́чны.
ПОЛУОБЕЗЬЯ́НА поўма́лпа, -пы *ж.*
ПОЛУО́БМОРО||К *м* поўнепрыто́мнасць, -ці *ж*; **~ЧНЫЙ** поўнепрыто́мны, напоўнепрыто́мны.
ПОЛУОБНАЖЁННЫЙ напоўаго́лены, поўаго́лены.
ПОЛУОБОРО́Т 1. *воен., спорт.* поўпаваро́т, -та *м*; 2. *тех.* поўабаро́т, -та *м.*
ПОЛУОВ||А́Л поўава́л, -ла *м*; **~А́ЛЬНЫЙ** поўава́льны, напоўава́льны.
ПОЛУОГНЕСТО́ЙКИЙ напоўвогнеўсто́йлівы, поўвогнеўсто́йлівы.
ПОЛУОДЕ́ТЫЙ напоўадзе́ты, поўадзе́ты; (*в верхнюю одежду*) напоўапра́нены, поўапра́нены.
ПОЛУОКРУ́ЖНОСТЬ *мат.* поўакру́жнасць, -ці *ж.*
ПОЛУОСВЕЩЁННЫЙ напоўасве́тлены, поўасве́тлены.
ПОЛУО́СТРОВ *м* поўво́страў, -рава *м*; (*песчаный*) поўвы́спа, -пы *ж*; **~НО́Й** поўастраўны́.
ПОЛУО́СЬ поўво́сь, -сі *ж.*
ПОЛУОТВО́РЕННЫЙ прачы́нены, напоўадчы́нены, поўадчы́нены.
ПОЛУОТКРЫ́ТЫЙ 1. (*полуотворенный*) прачы́нены, напоўадчы́нены; (*о шторе, занавесе*) напоўадкры́ты; 2. *в др. знач.* напоўадкры́ты, поўадкры́ты.
ПОЛУОФИЦИА́ЛЬНЫЙ напоўафіцы́йны, поўафіцы́йны.
ПОЛУПА́ЛУБ||А *мор.* поўпа́луба, -бы *ж*; **~НЫЙ** поўпа́лубны.
ПОЛУПАЛЬТО́ поўпаліто́ *нескл., ср.*
ПОЛУПАНСИО́Н поўпансіён, -на *м.*
ПОЛУПА́Р *с.-х.* поўпапа́р, -ру *м.*
ПОЛУПАРАЛИ́Ч *мед.* поўпара́ліч, -чу *м*, поўпара́люш, -шу *м.*
ПОЛУПИ́ТЬСЯ *сов.* палупі́цца.
ПОЛУПОВОРО́Т поўпаваро́т, -ту *м.*
ПОЛУПОДВ||А́Л *м* поўпадва́л, -ла *м*, поўсутарэ́нне, -нне *ср*; **~А́ЛЬНЫЙ** поўпадва́льны, поўсутарэ́нны.
ПОЛУПРИСЕДА́НИЕ *спорт.* поўпрысяда́нне, -ння *ср.*
ПОЛУПРОВОДНИ́К *эл.* поўправадні́к, -ка́ *м.*
ПОЛУПРОДУ́КТ поўпраду́кт, -ту *м.*
ПОЛУПРОЗРА́ЧН||ОСТЬ напоўпразры́стасць, -ці *ж*, поўпразры́стасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** напоўпразры́сты, поўпразры́сты.
ПОЛУПРОЛЕТ||АРИА́Т напоўпралетарыя́т, -ту *м*, поўпралетарыя́т, -ту *м*; **~А́РИЙ** напоўпралета́рый, -рыя *м*, поўпралета́рый, -рыя *м.*
ПОЛУПРОНИЦА́ЕМЫЙ поўпаніка́льны, напоўпраніка́льны, поўпрапушча́льны, напоўпрапушча́льны.
ПОЛУПРОЦЕ́НТ поўпрацэ́нт, -та *м*; **~НЫЙ** поўпрацэ́нтны.
ПОЛУПУСТО́Й напоўпусты́, поўпусты́; (*почти пустой*) ама́ль пусты́; (*полупорожний*) напоўпаро́жні, поўпаро́жні; (*почти порожний*) ама́ль паро́жні.
ПОЛУПУСТЫ́||ННЫЙ напоўпустэ́льны, поўпустэ́льны; (*почти пустынный*) ама́ль пустэ́льны; **~НЯ** *геогр.* поўпусты́ня, -ні *ж*, поўпустэ́льня, -ні *ж.*
ПОЛУПЬЯ́НЫЙ п'янава́ты, напоўп'я́ны, поўп'я́ны.
ПОЛУРАБО́ЧИЙ (*день*) поўрабо́чы.
ПОЛУРАЗДЕ́ТЫЙ напоўраздзе́ты, поўраздзе́ты; (*наполовину снявший верхнее платье*) напоўраспра́нены, поўраспра́нены.
ПОЛУРАЗРУ́ШЕННЫЙ напоўразбу́раны, поўразбу́раны.
ПОЛУРАСКРЫ́ТЫЙ 1. (*о двери, окне и т. п.*) прачы́нены, напоўрасчы́нены, поўрасчы́нены; (*почти раскрытый*) ама́ль расчы́нены; 2. (*полуобнажённый*) напоўраскры́ты, поўраскры́ты; (*почти обнажённый*) ама́ль раскры́ты; 3. (*о рте*) напоўразя́ўлены, поўразя́ўлены; 4. (*о глазах*) напоўраcплю́шчаны, поўрасплю́шчаны; (*почти открытый*) ама́ль расплю́шчаны.
ПОЛУРО́Т||А *воен.* поўро́та, -ты *ж*; **~НЫЙ** поўро́тны.
ПОЛУСА́ЛЬНЫЙ *с.-х.* напоўса́льны.
ПОЛУСАПО́ЖКИ 1. поўбо́цікі, -каў; (*о валеных*) поўвалёнкі, -каў; 2. (*ботинки*) *уст.* чараві́кі, -ві́к.
ПОЛУСА́ХАРНЫЙ поўцукро́вы, напоўцукро́вы.
ПОЛУСВЕ́Т *м* 1. (*освещение*) поўсвятло́, -ла́ *ср*; 2. *уст.* поўсве́т, -ту *м.*
ПОЛУСГНИ́ВШИЙ напоўгнілы́.
ПОЛУСЕРЬЁЗН||О *нареч.* напоўсур'ёзна, поўсур'ёзна; **~ЫЙ** напоўсур'ёзны, поўсур'ёзны.
ПОЛУСИДЕ́ТЬ *несов.* напоўсядзе́ць, поўсядзе́ць.
ПОЛУСКА́Т *ж.-д.* поўска́т, -та *м*; **~НИК** *тех.* поўска́тнік, -ка *м*; **~НЫЙ** *ж.-д.* поўска́тны.
ПОЛУСЛЕПО́Й напоўсляпы́, поўсляпы́.
ПОЛУСМЕ́РТ||Ь: до ~и да поўсме́рці.
ПОЛУСО́Н поўсо́н, -сну́ *м*; **~НЫЙ** напоўсо́нны, поўсо́нны.
ПОЛУСО́ТНЯ поўсо́тня, -ні *ж.*
ПОЛУСПУ́ЩЕННЫЙ прыспу́шчаны, крыху́ спу́шчаны, напоўспу́шчаны.
ПОЛУСТА́Н||ОК *ж.-д.* поўста́нак, -нка *м*; **~КОВЫЙ** поўста́нкавы.
ПОЛУСТАЦИОНА́Р *мед.* поўстацыяна́р, -ра *м.*
ПОЛУСТИ́ШИЕ *лит.* поўрадко́ўе, -ко́ўя *ср.*
ПОЛУСТО́ЙКИЙ напоўустойлівы, поўусто́йлівы.
ПОЛУСУК||НО́ поўсукно́, -на́ *ср*; **~О́ННЫЙ** поўсуко́нны.
ПОЛУСУ́МРАК поўзмро́к, -ку *м.*
ПОЛУСУСТА́В *анат.* поўсуста́ў, -та́ва *м.*
ПОЛУСУ́ТОЧНЫЙ поўсу́тачны.
ПОЛУСУХО́Й сухава́ты; поўсухі́, напоўсухі́.
ПОЛУСФЕ́Р||А поўсфе́ра, -ры *ж*; **~И́ЧЕСКИЙ** поўсферы́чны; напоўсферы́чны.
ПОЛУСЫРЬЁ *ср* поўсырaві́на, -ны *ж.*
ПОЛУТА́КТ *муз.* поўта́кт, -ту *м*; **~НЫЙ: ~ная но́та** *муз.* поўта́ктная но́та.
ПОЛУТЁМНЫЙ цемнава́ты; напоўцёмны, поўцёмны.
ПОЛУТЕ́НЬ *ж* поўце́нь, -ню *м.*
ПОЛУТО́Н *в разн. знач.* поўто́н, -ну *м.*
ПОЛУТО́НКА *разг.* поўто́нка, -кі *ж.*
ПОЛУТОРАГОД||И́ЧНЫЙ, ~ОВА́ЛЫЙ паўтарагадо́вы.
ПОЛУТОРАМЕ́СЯЧНЫЙ паўтараме́сячны.
ПОЛУТОРАМЕТРО́ВЫЙ паўтараметро́вы.
ПОЛУТОРАТО́Н||КА *разг.* паўтарато́нка, -кі *ж*; **~НЫЙ** паўтарато́нны.
ПОЛУ́ТОРКА 1. (*полуторатонка*) *разг.* паўтарато́нка, -кі *ж*; паўтара́чка, -кі *ж*; 2. *в др. знач.* паўтара́чка, -кі *ж.*

ПОЛУ́ТОРН||ЫЙ паўтара́чны; **∼ая крова́ть** паўтара́чны ло́жак; **в ∼ом разме́ре** у паўтара́чным паме́ры.

ПОЛУТЬМА́ *ж* пры́цемак, -мку *м*, поўце́мра, -ры *ж*.

ПОЛУУСТА́В *лингв.* поўуста́ў, -та́ва *м*; **∼НЫЙ** поўуста́ўны.

ПОЛУУСТО́ЙЧИВЫЙ напоўусто́йлівы, поўусто́йлівы; (*шаткий, колеблющийся*) хісткі.

ПОЛУУЧЁНЫЙ *сущ. ирон.* напоўвучо́ны, -нага *м*.

ПОЛУФАБРИКА́Т поўфабрыка́т, -ту *м*.

ПОЛУФИНА́||Л *спорт.* поўфіна́л, -лу *м*; **∼ЛЬНЫЙ** поўфіна́льны.

ПОЛУЦИ́РКУЛЬНЫЙ *арх.* поўцы́ркульны.

ПОЛУЧАСОВО́Й поўгадзі́нны.

ПОЛУЧ||А́ТЕЛЬ атрыма́льнік, -ка *м*; **∼А́ТЕЛЬНИЦА** атрыма́льніца, -цы *ж*; **∼А́ТЬ** *несов.* атры́млівацъ; (*приобретать*) набыва́ць; (*добывать*) здабыва́ць; (*наживать*) нажыва́ць, дастава́ць; (*заболевать чем-л.*) захво́рваць (*на што*); *см.* **получи́ть**; **∼А́ТЬСЯ** **1.** прыхо́дзіць; **пи́сьма ∼а́лись о́чень ре́дко** пі́сьмы прыхо́дзілі ве́льмі рэ́дка; **2.** (*оказываться, появляться как результат*) атры́млівацца; выхо́дзіць, выяўля́цца; **результа́ты рабо́ты ∼а́ются прекра́сные** вы́нікі пра́цы атры́мліваюцца цудо́ўныя (выда́тныя); **из него́ ∼а́ется хоро́ший рабо́тник** з яго́ выхо́дзіць до́бры рабо́тнік; **∼а́ется, что мы с тобо́й прихо́дим к одни́м вы́водам** выхо́дзіць (выяўля́ецца), што мы з табо́й прыхо́дзім да адно́лькавых вы́вадаў; **∼а́ется недоразуме́ние** выхо́дзіць (атры́млівaецца) непаразуме́нне; **3.** *страд.* атры́млівацца; набыва́цца; здабыва́цца; нажыва́цца, дастава́цца; *см.* **получа́ть**; **∼Е́НИЕ** атрыма́нне, -ння *ср*; набыва́нне, -ння *ср*; здабыва́нне, -ння *ср*; нажыва́нне, -ння *ср*, дастава́нне, -ння *ср*; захво́рванне, -ння *ср*; **ште́мпель ме́ста ∼е́ния** (*на корреспонденции*) штэ́мпель ме́сца атрыма́ння; **прибо́р для ∼е́ния водоро́да** апара́т для здабыва́ння (атрыма́ння) вадаро́да; *см.* **получа́ть**.

ПОЛУ́ЧЕННЫЙ атры́маны; (*приобретённый*) набы́ты; (*добытый*) здабы́ты; (*нажитый*) нажы́ты.

ПОЛУЧИ́СТЫЙ поўчы́сты, напоўчы́сты.

ПОЛУЧИ́ТЬ *сов.* атрыма́ць; (*приобрести*) набы́ць; (*добыть*) здабы́ць; (*нажить*) нажы́ць, дастáць; (*заболеть чем-л.*) захварэ́ць (*на што*); **п. отве́т** атрыма́ць адка́з; **п. де́ньги** атрыма́ць гро́шы; **п. образова́ние** атрыма́ць асве́ту; **п. интере́сные вы́воды** атрыма́ць ціка́выя вы́вады; **п. зна́ния** набы́ць (атрыма́ць) ве́ды; **п. изве́стность** набы́ць вядо́масць; **п. значе́ние** набы́ць значэ́нне; **п. бензи́н из не́фти** здабы́ць (атрыма́ць) бензі́н з на́фты; **∼СЯ** **1.** (*быть доставленным*) прыйсці́; **2.** (*оказаться, появиться как результат*) атрыма́цца; вы́йсці, вы́явіцца; **из э́того ничего́ не получи́лось** з гэ́тага нічо́га не вы́йшла (не атрыма́лася); *см.* **получа́ться** 1, 2.

ПОЛУ́ЧК||А *ж* **1.** (*действие*) атрыма́нне, -ння *ср*; **2.** (*получение зарплаты*) *разг.* вы́плата, -ты *ж*; **ско́лько ты получи́л в э́ту ∼у?** ко́лькі ты атрыма́ў пры гэ́тай вы́плаце?; **у нас сего́дня п.** у нас сяго́ння вы́плата; **3.** (*заработная плата*) зарпла́та, -ты *ж*; (*заработок*) зарабо́так, -тку *м*; **всю ∼у истра́тил** усю́ зарпла́ту выдаткава́ў.

ПОЛУ́ЧШЕ *сравн. ст.* **1.** *нареч.* (тро́хі) лепш, (тро́хі) ле́пей; (*как можно лучше*) (як мага́) лепш, як найле́пш, (як мага́) ле́пей, як найле́пей; **п. стира́й рези́нкой** лепш (ле́пей) сцірáй гу́мкай; **2.** *прил.* (тро́хі) ле́пшы; (*лучше всего*) найле́пшы; **э́та доро́га п.** гэ́тая даро́га ле́пшая.

ПОЛУША́Г поўкро́к, -ку *м*, поўша́г, -гу *м*.

ПОЛУША́ЛОК *м разг. уст.* ху́стка, -кі *ж*, шаль, *род.* ша́ля *м*.

ПОЛУША́Р||ИЕ поўша́р'е, -р'я *ср*; **∼ия головно́го мо́зга** *анат.* поўша́р'і галаўно́га мо́згу; **магдебу́ргские ∼ия** *физ.* магдэбу́ргскія поўша́р'і; **се́верное, ю́жное, восто́чное, за́падное п.** *геогр.* поўно́чнае, поўднёвае, усхо́дняе, захо́дняе поўша́р'е.

ПОЛУШЁЛК поўшо́ўк, -ку *м*; **∼ОВЫЙ** напоўшаўко́вы, поўшаўко́вы.

ПОЛУШЁПОТ поўшэ́пт, -ту *м*.

ПОЛУШЕРСТЯНО́Й поўшарсцяны́, напоўшарсцяны́.

ПОЛУ́ШК||А *ж уст.* поўгро́ша *м*; шэ́лег, -га *м*; ◇ **не име́ть ни ∼и** не мець ні гро́ша (ні шэ́лега, ні капе́йкі).

ПОЛУШО́ПОТ *см.* **полушёпот.**

ПОЛУШТО́Ф *м* ква́рта, -ты *ж*; поўшто́ф, -фа *м*.

ПОЛУШУ́БОК поўкажу́шак, -шка *м*, кажушо́к, -шка́ *м*.

ПОЛУ||ШУТЛИ́ВЫЙ поўжартаўлі́вы, напоўжартаўлі́вы; **∼ШУТЯ́** *нареч.* поўжа́ртам, поўжартлі́ва, напоўжартлі́ва, напоўжарту́ючы.

ПОЛУ́ЩИВАТЬ *несов.* палу́шчваць, палу́зваць.

ПОЛУЩИ́ТЬ *сов.* **1.** палу́шчыць, палуза́ць; **2.** *с.-х.* палу́шчыць.

ПОЛУЭСКАДРО́Н *воен.* поўэскадро́н, -на *м*.

ПОЛУЮ́Т *мор.* поўю́т, -та *м*.

ПОЛУЯ́ВЬ *ж* поўя́ва, -вы *ж*; (*полусон*) поўсо́н, -сну́ *м*.

ПОЛУЯ́ЩИК *м* поўскры́нка, -кі *ж*.

ПОЛФУ́НТА *уст.* поўфу́нта *м*.

ПОЛЦЕНЫ́: за **п.** за поўцаны́.

ПОЛЧАСА́ поўгадзі́ны *ж*.

ПОЛЧЕ́ТВЕРТИ **1.** (*мера сыпучих тел*) *уст.* асмі́на, -ны *ж*; **2.** (*мера жидкости*) *уст.* поўга́рца *м*; **3.** *в др. знач.* поўчвэ́рці *ж*, поўчвэ́рткі *ж*.

ПО́ЛЧИЩЕ *ср* **1.** (*огромное войско*) по́лчышча, -шча *ср*; **2.** *перен.* по́лчышча, -шча *ср*; (*толпа*) нато́ўп, -пу *м*; (*множество*) про́цьма, -мы *ж*.

ПОЛШАГА́ поўкро́ку, поўша́гу.

ПОЛШТО́ФА ква́рта, -ты *ж*; поўшто́фа *м*.

ПО́Л||ЫЙ **1.** пусты́, паро́жні; **∼ая тру́бка** пуста́я (паро́жняя) тру́бка; **2.** **∼ая вода́** паво́дка; ◇ **∼ая ве́на** *анат.* по́лая ве́на.

ПО́ЛЫМЯ *обл.* по́лымя, -мя *ср*; ◇ **из огня́ да в п.** *погов.* з агню́ ды ў по́лымя.

ПОЛЫ́||ННЫЙ палыно́вы; **∼НОВКА** (*водка*) палыно́ўка, -кі *ж*; **∼НЬ** *ж бот.* палы́н, -ну́ *м*.

ПОЛЫНЬЯ́ пало́нка, -кі *ж*.

ПОЛЫСЕ́||НИЕ палысе́нне, -ння *ср*; **∼ТЬ** *сов.* палысе́ць.

ПОЛЫХ||А́ТЬ *несов.* пала́ць, гарэ́ць; (*выкидывая языки пламени*) шуга́ць; **∼НУ́ТЬ** *однокр.* запала́ць, загарэ́цца; шугану́ць; **ого́нь ∼ну́л из трубы́** аго́нь шугану́ў з комі́на.

ПО́ЛЬЗ||А карысць, -ці *ж*, *мн. нет*; **извле́чь ∼у** займець (атрыма́ць) карысць; **в ∼у** на карысць; **э́то говори́т в его́ ∼у** гэ́та гаво́рыць на яго́ карысць; **∼ОВАНИЕ** **1.** карыста́нне, -ння *ср*; **места́ обще́ственного ∼ования** ме́сцы грама́дскага карыста́ння; **2.** (*владение*) карыста́нне, -ння *ср*, улада́нне, -ння *ср*; **пра́во ∼ования** пра́ва карыста́ння; **в о́бщем ∼овании** ў агу́льным карыста́нні (улада́нні); **2.** (*лечение*) *уст.* лячэ́нне, -ння *ср*; **∼ОВАННЫЙ** *мед. уст.* ле́чаны; **∼ОВАТЕЛЬ** *юр.* карыста́льнік, -ка *м*; **∼ОВАТЬ** *несов. мед. уст.* лячы́ць; **∼ОВАТЬСЯ** **1.** карыста́цца; **2.** *мед. уст.* лячы́цца.

ПО́ЛЬКА I по́лька, -кі *ж*, паля́чка, -кі *ж*.

ПО́ЛЬКА II (*танец*) по́лька, -кі *ж*.

ПО́ЛЬСКАЯ НАРО́ДНАЯ РЕСПУ́БЛИКА По́льская Наро́дная Рэспу́бліка.

ПО́ЛЬСКИЙ I *прил.* по́льскі; **п. язы́к** по́льская мо́ва.

ПО́ЛЬСКИЙ II *сущ.* (*танец*) по́льскі, -кага *м*.

ПОЛЬСТИ́ТЬ *сов.* **1.** (*кому*) паліслі́віць (*перад кім*); (*похвалить*) пахвалі́ць (*каго*); **2.** (*кому-чему — доставить удовольствие*) пале́сціць (*каго-што*); усцёшыць, пацёшыць (*каго-што*), даць уце́ху (*каму-чаму*); пала́шчыць (*каго-што*); спадаба́цца (*каму-чаму*); *см.* **льстить**; **∼СЯ** пакваnі́цца (*на што*), пагалі́цца (*на што*); пагна́цца.

ПО́ЛЬША По́льшча, -шчы *ж*.

ПОЛЬЩЁ||ННЫЙ улéшчаны, усцéшаны, пацéшаны; (*удовлетворённый чем-л. лестным*) задавóлены; **я ~н его приглашéнием** я ўсцéшаны (задавóлены) ягó запрашэннем; **он ~н этой оцéнкой его рабóты** ён задавóлены (усцéшаны) гэтай ацэнкай ягó прáцы; **~нный предложéнием, он согласи́лся на все услóвия** усцéшаны прапанóвай, ён згадзíўся на ўсе ўмóвы.

ПОЛЮБÉЗНИЧАТЬ *сов.* (*поухаживать*) *разг.* пазаляцáцца (*да каго*); *см.* **любéзничать.**

ПОЛЮБИ́||ТЬ *сов.* **1.** палюбíць; (*почувствовать склонность*) упадабáць, спадабáць; **я ~л этого человéка** я палюбíў гэтага чалавéка; **я ~л приходи́ть сюдá** я ўпадабáў прыхóдзіць сюды́; **он ~л теáтр** ён палюбíў (упадабáў, спадабáў) тэáтр; **2.** (*начать любить*) пакахáць, палюбíць; **п. дéвушку** пакахáць дзяўчы́ну; **~ТЬСЯ 1.** палюбíцца; (*понравиться*) упадабáцца, спадабáцца.

ПОЛЮБОВА́ТЬСЯ *сов.* палюбавáцца.

ПОЛЮБÓВН||О *нареч.* палюбóўна; **~ЫЙ** палюбóўны.

ПОЛЮБОПЫ́ТСТВОВАТЬ *сов.* пацікáвіцца.

ПО-ЛЮДСКИ́ *нареч.* па-лю́дску.

ПОЛЮ́ДЬЕ *ист.* палю́ддзе, -ддзя *ср.*

ПÓЛЮС *в разн. знач.* пóлюс, -са *м*; **п. ми́ра** *астр.* пóлюс свéту; **положи́тельный п.** *физ.* дадáтны пóлюс; **отрицáтельный п.** *физ.* адмóўны пóлюс; **магни́тный п.** *физ.* магнíтны пóлюс; ◇ **два ~а** *перен.* два пóлюсы; **~НЫЙ** пóлюсны.

ПОЛЯ́К паля́к, -ка *м.*

ПОЛЯ́Н||А паля́на, -ны *ж*; **~КА** *уменьш.* паля́нка, -кі *ж.*

ПОЛЯ́РА *мат.* паля́ра, -ры *ж.*

ПОЛЯРИЗ||А́ТОР *физ.* палярызáтар, -ра *м*; **~АЦИÓННЫЙ** палярызацы́йны; **~А́ЦИЯ** *физ.* палярызáцыя, -цыі *ж*; **~ÓВАННЫЙ** палярызавáны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов.* палярызавáць; **~ОВА́ТЬСЯ** палярызавáцца.

ПОЛЯРИ́МЕТР *физ.* паляры́метр, -ра *м.*

ПОЛЯРИСКÓП *физ.* палярыскóп, -па *м.*

ПОЛЯ́РН||ИК паля́рнік, -ка *м*; **~ИЦА** паля́рніца, -цы *ж*; **~ОСТЬ** паля́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** *прям., перен.* паля́рны; **~ые интерéсы** паля́рныя інтарэ́сы; **Поля́рная звездá** *астр.* Паля́рная зóрка.

ПОМА́Д||А памáда, -ды *ж*; **~ИТЬ** *несов.* памáдзіць; **~ИТЬСЯ** памáдзіцца; **~КА** памáдка, -кі *ж*; **~НЫЙ** памáдны.

ПОМА́З||АНИЕ *церк. уст.* памáзанне, -ння *ср*; **~АННИК** *церк. уст.* памáзаннік, -ка *м*; **~АННИЦА** памáзанніца, -цы *ж.*

ПОМА́З||АННЫЙ памáзаны; **~АТЬ** *сов.* памáзаць; **~АТЬСЯ** памáзацца; **~ÓК** *спец.* памазóк, -зкá *м.*

ПОМАКА́ТЬ *сов.* памачáць.

ПОМАЛÉНЬКУ *нареч. разг.* памалéньку; (*понемножку*) патрóшку.

ПОМА́ЛКИВАТЬ *несов. разг.* маўчáць; памóўчваць.

ПОМА́ЛУ *нареч. уст.* памáлу; (*понемногу*) патрóху.

ПОМА́ЛЧИВАТЬ *несов. см.* **помáлкивать.**

ПОМАНÉЖИТЬ *сов. разг.* паманéжыць.

ПОМАНИ́ТЬ *сов.* **1.** (*позвать*) паклíкаць, пазвáць; **2.** *перен.* павáбіць, прыцягнýць.

ПОМАРА́ТЬ *сов.* (*погрязнить*) папэ́цкаць, пабрýдзіць.

ПОМА́РКА памáрка, -кі *ж.*

ПОМА́СЛ||ЕННЫЙ памáзаны мáслам; памáзаны алéем; палíты мáслам; палíты алéем; памáслены; паалéены; **~ИТЬ** *сов.* (*помазать коровьим маслом*) памáзаць мáслам; (*растительным*) памáзаць алéем; (*полить коровьим маслом*) палíць мáслам; (*растительным*) палíць алéем; памáсліць (*коровьим маслом*); паалéіць (*растительным*).

ПОМАХА́ТЬ *сов.* памахáць.

ПОМА́ХИВАТЬ *несов.* памáхваць.

ПОМА́ЯТЬСЯ *сов. разг.* памýчыцца; памардавáцца; (*утомиться*) змары́цца, стамíцца; *см.* **мáяться.**

ПОМБУ́Х (помóщник бухгáлтера) памбýх, -ха *м* (памóчнік бухгáлтара).

ПОМÉДЛИТЬ *сов.* пачакáць; памарýдзіць.

ПОМЕЛИ́ТЬ *сов.* пацéрці мéлам.

ПОМЕЛÓ памялó, -лá *ср*, *мн.* памёлы, -лаў.

ПОМЕЛЬКА́ТЬ *сов.* памільгáць, памільгацéць.

ПОМÉНЬШ||Е *сравн. ст.* **1.** *нареч.* (трóхі) менш, (трóхі) мéней; (*как можно меньше*) (як магá) менш; (як магá) мéней; як наймéнш, як наймéней; **2.** *прил.* (трóхі) мéншы; (*меньше всего*) наймéншы.

ПОМÉН||ЯННЫЙ *разг.* памяня́ны; **~Я́ТЬ** *сов.* памяня́ць; **~Я́ТЬСЯ** памяня́цца.

ПОМЕРА́НЕЦ *бот.* памярáнец, -нца *м.*

ПОМЕРА́НИЯ Памерáнія, -ніі *ж.*

ПОМЕРА́НЦЕВ||ЫЕ *мн. сущ. бот.* памярáнцавыя, -вых; **~ЫЙ** памярáнцавы.

ПОМЕРÉТЬ *сов. простореч.* памéрці; *см.* **помирáть.**

ПОМЕРÉЩИТЬСЯ *сов. разг.* здáцца; (*показаться*) паказáцца.

ПОМЁРЗ||ЛЫЙ *разг.* памёрзлы; **~НУТЬ** *сов.* памёрзнуць; **~ШИЙ** памёрзлы.

ПОМÉРИТЬ *сов.* памéраць; **~СЯ** памéрацца; **~ся си́лами** памéрацца сíламі.

ПОМÉРК||НУТЬ *сов.* **1.** пацямнéць; (*потускнеть*) пацьмянéць; (*погаснуть*) пагáснуць; **2.** *перен.* пацямнéць; загáснуць; **~ШИЙ 1.** пацямнéлы; пацьмянéлы; пагáслы; **2.** пацямнéлы; загáслы.

ПОМЕРТВÉ||ВШИЙ, ~ЛЫЙ памяртвéлы; здрантвéлы; **~НИЕ** памяртвéнне, -ння *ср*; здрантвéнне, -ння *ср*; **~ТЬ** *сов.* памяртвéць; здрантвéць.

ПОМЕРЦА́ТЬ *сов.* памігáць, памігацéць, памігцéць.

ПОМÉРЯТЬ, ~СЯ *сов. см.* **помéрить, ~ся.**

ПОМЕСИ́ТЬ *сов.* памясíць.

ПОМЕСТИ́ТЕЛЬН||ОСТЬ змяшчáльнасць, -ці *ж*, ёмістасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** змяшчáльны, ёмісты.

ПОМЕСТИ́ТЬ *сов.* **1.** змясцíць; (*отдать*) аддáць; **п. делегáтов в гости́ницу** змясцíць дэлегáтаў у гасцíніцу; **п. детéй в шкóлу** аддáць дзяцéй у шкóлу; **п. объявлéние** змясцíць аб'я́ву; **2.** (*расположить*) змясцíць, утóўпіць; **п. все вéщи в оди́н чемодáн** змясцíць (утóўпіць) усé рэ́чы ў адзíн чамадáн; *см.* **помещáть; ~СЯ 1.** змясцíцца; **2.** змясцíцца; утóўпіцца; *см.* **помещáться.**

ПОМÉСТН||ЫЙ *ист.* памéсны, дварóвы, маянткóвы; **~ое дворя́нство** *ист.* памéснае дварáнства.

ПОМÉСТЬЕ *ср* **1.** маёнтак, -тка *м*; **2.** *ист.* двор, *род.* дварá *м*, памéсце, -сця *ср.*

ПÓМЕСЬ *в разн. знач.* пóмесь, -сі *ж.*

ПОМÉСЯЧН||О *нареч.* памéсячна; (*ежемесячно*) штомéсячна; **~ЫЙ** памéсячны; штомéсячны.

ПОМЁТ 1. (*навоз*) памёт, -ту *м*; **2.** (*приплод*) прыплóд, -ду *м.*

ПОМÉТА памéтка, -кі *ж.*

ПОМЕТА́ТЬСЯ *сов.* пакідáцца; (*посуетиться*) памітусíцца; (*суетливо побегать*) пабéгаць, пагóйсаць.

ПОМÉТ||ИТЬ *сов.* памéціць, пазнáчыць; *см.* **помечáть; ~КА** памéтка, -кі *ж.*

ПОМÉХ||А перашкóда, -ды *ж*, замíнка, -кі *ж*; **быть ~ой** перашкаджáць.

ПОМЕЧА́ТЬ *несов.* памячáць, знáчыць; **п. гáлочкой** памячáць (знáчыць) птýшкай; **п. письмó каки́м-либо числóм** памячáць пісьмó якíм-нéбудзь чыслóм; **~СЯ** *страд.* памячáцца, знáчыцца.

ПОМÉЧЕННЫЙ памéчаны, пазнáчаны.

ПОМЕЧТА́ТЬ *сов.* памáрыць.

ПОМÉШАННАЯ *сущ.* вар'я́тка, -кі *ж.*

ПОМÉШАНН||ЫЙ I 1. (*сумасшедший*) *прил.* звар'яцéлы; **2.** (*испытывающий пристрастие к кому-чему-л.*) *прил. перен.*: **быть ~ым** (*на ком-чём*) страшэ́нна (шалёна, да вар'я́цтва) захапíцца (*кім-чым*); страшэ́нна (шалёна, да

вар'яцтва) палюбіць (*каго-што*); не по́мніць сябе́ ад захапле́ння (*кім-чым*), ад лю́басці (*да каго-чаго*); стра́ціць ро́зум ад захапле́ння (*кім-чым*), ад лю́басці (*да каго-чаго*); **он поме́шан на му́зыке** ён страшэ́нна (шалёна, да вар'яцтва) захапі́ўся му́зыкай (палюбі́ў му́зыку), ён не по́мніць сябе́ (стра́ціў ро́зум) ад захапле́ння му́зыкай; **3.** *сущ.* вар'я́т, -та *м.*

ПОМЕ́ШАННЫЙ II *прич.* (*от* **помеша́ть**) памяша́ны.

ПОМЕША́ТЕЛЬСТВО вар'я́цтва, -ва *ср.*

ПОМЕША́ТЬ I *сов.* (*кому-чему*) перашко́дзіць.

ПОМЕША́ТЬ II *сов.* (*что*) памяша́ць.

ПОМЕША́ТЬСЯ *сов.* **1.** (*сойти с ума*) звар'яце́ць; **2.** (*на ком-чём*) страшэ́нна (шалёна, да вар'яцтва) захапі́цца (*кім-чым*), страшэ́нна (шалёна, да вар'яцтва) палюбі́ць (*каго-што*); не по́мніць сябе́ ад захапле́ння (*кім-чым*), ад лю́басці (*да каго-чаго*); стра́ціць ро́зум ад захапле́ння (*кім-чым*), ад лю́басці (*да каго-чаго*).

ПОМЕ́ШИВАТЬ *несов.* (*мешать*) паме́шваць.

ПОМЕ́ШКАТЬ *сов. разг.* памару́дзіць.

ПОМЕЩ||А́ТЬ *несов.* **1.** змяшча́ць; (*отдавать*) аддава́ць; **~а́йте свои́ сбереже́ния в сберега́тельную ка́ссу** змяшча́йце свае́ зберажэ́нні ў ашча́дную ка́су; **2.** (*располагать*) змяшча́ць, утоўпліваць; *см.* **помести́ть; ~А́ТЬСЯ 1.** змяшча́цца; **учрежде́ние ~а́ется в э́том зда́нии** устано́ва змяшча́ецца ў гэ́тым буды́нку; **2.** змяшча́цца, утоўпліваца; **в э́том за́ле ~а́ется две́сти челове́к** у гэ́тай за́ле змяшча́ецца (утоўпліваецца) дзве́сце чалаве́к; **~Е́НИЕ** *ср* **1.** (*действие*) змяшчэ́нне, -ння *ср*; адда́ча, -чы *ж*; утоўпліванне, -ння *ср*; *см.* **помеща́ть; 2.** (*здание*) памяшка́нне, -ння *ср*; (*строение*) буды́нак, -нка *м*; **здесь большо́е ~е́ние** тут вялі́кае памяшка́нне; **~ЁННЫЙ 1.** зме́шчаны; **2.** зме́шчаны, у́тоўплены.

ПОМЕ́ЩИ||К *уст.* паме́шчык, -ка *м*; **~ЦА** паме́шчыца, -цы *ж*; **~ЧИЙ** паме́шчыцкі; **~чий дом** паме́шчыцкі дом.

ПОМИГА́ТЬ *сов.* **1.** (*глазами*) памо́ргаць; **2.** (*померцать*) памiга́ць, памігаце́ць, памігце́ць.

ПОМИДО́Р памiдо́р, -ра *м*; **~ОВЫЙ** памiдо́равы.

ПОМИ́ЛОВА||НИЕ памі́лаванне, -ння *ср*; **~ТЬ** *сов.* **1.** памі́лаваць; (*простить*) дарава́ць (*каму*); (*смилостивиться*) злі́таваца (*над кім*); **2.** (*отменить наказание*) *юр.* памі́лаваць; ◇ **поми́луй(те)!** злі́туйся (злі́туйцеся)!; (*да что ты, что вы!*) (ды) што ты (вы)!; (*простите!*) дару́й(це)!, выбача́йце!; (*постой, постойте!*) пасто́й(це)!, пачака́й(це)!

ПОМИЛОСЕ́РДСТВ||ОВАТЬ: ~у́й(те)! злі́туйся (злі́туйцеся)!; (*да что ты, что вы!*) (ды) што ты (вы)!; (*прости, простите!*) дару́й(це)!, выбача́й(це)!; (*постой, постойте!*) пасто́й(це)!, пачака́й(це)!

ПОМИ́МО *предлог с род.* **1.** апрача́, апро́ч, акрамя́ (*каго-чаго*); **п. всего́ про́чего** апрача́ (апро́ч, акрамя́) усяго́ і́ншага; **2.** (*минуя*) без (*каго-чаго*), без ве́дама (*каго-чаго*), без удзе́лу (*каго-чаго*), (*напротив*) насу́праць (*каму-чаму*); **э́то соверши́лось п. меня́** гэ́та зрабі́лася без мяне́ (майго́ ве́дама, удзе́лу).

ПОМИ́Н *разг.* памі́н, -ну *м*; ◇ **лёгок на ~е** лёгкі на ўспамі́н; пра во́ўка памо́ўка, а во́ўк і тут; **и ~у нет** і памі́ну няма́; **(и) в ~е нет** (і) за́ваду няма́; **~А́ЛЬНЫЙ** памiна́льны, памі́нкавы; **~А́НЬЕ** *церк.* памiна́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов.* **1.** (*вспоминать*) успаміна́ць; **2.** (*справлять поминки*) *церк.* паміна́ць; ◇ **не ~а́йте ли́хом** не ўспамiна́йце лі́хам; **~а́й как зва́ли** *погов.* успамiна́й як зва́лі; то́лькі яго́ і ба́чылі; **~А́ТЬСЯ** *страд.* **1.** успаміна́цца; **2.** паміна́цца; **~КИ** *уст.* памі́нкі, -каў *ед. нет*; **~ОВЕ́НИЕ** *церк.* памiна́нне, -ння *ср, мн. нет.*

ПОМИНУ́ТН||О *нареч.* штохвілі́ны, штохвілі́нна; **~ЫЙ** штохвілі́нны.

ПОМИРА́ТЬ *несов. разг.* памiра́ць; ◇ **п. со́ смеху** памiра́ць са сме́ху.

ПОМИРИ́ТЬ *сов.* памiры́ць; **~СЯ** памiры́цца.

ПО́-МИРУ: ходи́ть по́-миру *уст.* хадзі́ць з то́рбамі; жабрава́ць; **пусти́ть по́-миру** *уст.* пусці́ць з то́рбамі.

ПО́МНИТЬ *несов.* по́мніць, памята́ць; ◇ **не п. себя́ от ра́дости** не по́мніць сябе́ ад ра́дасці; **п. себя́** по́мніць (памята́ць) сябе́; **~СЯ 1.** по́мніцца, памята́цца; **мне по́мнится, что я вам э́то говори́л** мне по́мніцца (памята́ецца), што я вам гэ́та гавары́ў; **2.** *вводн. сл.:* **по́мнится** по́мніцца, я по́мню; **вы, по́мнится, приходи́ли уже́ сюда́** вы, по́мніцца (я по́мню), прыхо́дзілі ўжо сюды́.

ПОМНО́ГУ *нареч. разг.* шмат.

ПОМНОЖ||А́ТЬ *несов.* мно́жыць, памнажа́ць; **~А́ТЬСЯ** мно́жыцца, памнажа́цца; **~Е́НИЕ** мно́жанне, -ння *ср*, памнажэ́нне, -ння *ср.*

ПОМНО́Ж||ЕННЫЙ памно́жаны; **~ИТЬ** *сов.* памно́жыць; **~ИТЬСЯ** памно́жыцца.

ПОМОГА́ТЬ *несов.* дапамага́ць, памага́ць.

ПО-МО́ЕМУ *нареч.* па-мо́йму.

ПОМО́||И памы́і, -мы́яў *ед. нет*; ◇ **облива́ть ~ями** *перен.* аблiва́ць памы́ямі.

ПОМО́Й||КА памы́йніца, -цы *ж*; **~НЫЙ** памы́йны.

ПОМО́КНУТЬ *сов.* памо́кнуць.

ПОМО́Л памо́л, -лу *м, мн. нет.*

ПОМО́ЛВ||ИТЬ *сов. уст.* заручы́ць, засва́таць; **~КА** *ж* зару́чыны, *род.* зару́чын *ед. нет*; **~ЛЕННЫЙ** зару́чаны, засва́таны.

ПОМОЛИ́ТЬСЯ *сов. рел.* памалі́цца.

ПОМО́Л||ОГ *сад.* памо́лаг, -га *м*; **~ОГИ́ЧЕСКИЙ** памалагі́чны; **~О́ГИЯ** *сад.* памало́гія, -гіі *ж.*

ПОМОЛОДЕ́||ВШИЙ памаладзе́лы; **~ТЬ** *сов.* памаладзе́ць.

ПО-МОЛОДЕ́ЦКИ *нареч.* па-маладзе́цку.

ПОМОЛО́ЖЕ *сравн. ст.* **1.** *нареч.* (тро́хі) маладзе́й; (*как можно моложе*) (як мага́) маладзе́й; як наймаладзе́й; **он вы́глядит п.** ён выгляда́е маладзе́й; **2.** *прил.* (тро́хі) маладзе́йшы; (*моложе всего*) наймаладзе́йшы; **э́то де́рево помоло́же** гэ́тае дрэ́ва маладзе́йшае.

ПОМОЛОТИ́ТЬ *сов.* памалаці́ць.

ПОМО́Л||ОТЫЙ памо́латы; змо́латы; *см.* **помоло́ть; ~О́ТЬ** *сов.* памало́ць; (*смолоть*) змало́ць.

ПОМОЛО́ЧЕННЫЙ памало́чаны.

ПОМОЛЧА́ТЬ *сов.* памаўча́ць.

ПОМО́ЛЬ||НЫЙ: ~ная пла́та памо́льная пла́та; **~ЩИК** памо́льшчык, -ка *м*, заво́знік, -ка *м.*

ПОМО́Р памо́р, -ра *м.*

ПОМОРГА́ТЬ *сов.* памо́ргаць.

ПОМО́РЕЦ памо́рац, -рца *м.*

ПОМОРИ́ТЬ I *сов.* памары́ць; (*потравить*) патруці́ць; (*уничтожить*) вынíшчыць.

ПОМОРИ́ТЬ II *сов. тех.* памары́ць; **п. дуб** памары́ць дуб.

ПОМО́РКА памо́рка, -кі *ж.*

ПОМО́РНИК *зоол.* памо́рнік, -ка *м.*

ПОМОРО́||ЖЕННЫЙ памаро́жаны; **~ЗИТЬ** *сов.* памаро́зіць.

ПОМОРОСИ́||ТЬ *сов.* паімжэ́ць; **дождь ~л и переста́л** дождж паімжэ́ў і пераста́ў.

ПОМОРО́ЧИТЬ *сов. разг.* памаро́чыць, падуры́ць.

ПОМО́РСКИЙ памо́рскі.

ПОМО́РЩИТЬ *сов.* памо́ршчыць; **~СЯ** памо́ршчыцца.

ПОМО́РЬЕ памо́р'е, -р'я *ср*, прымо́р'е, -р'я *ср*, узмо́р'е, -р'я *ср.*

ПОМОРЯ́Н||ИН памара́нін, -на *м*; **~КА** памара́нка, -кі *ж.*

ПОМО́СТ памо́ст, -ту *м.*

ПОМОТА́ТЬ *сов.* (*головой*) *разг.* памата́ць; (*покачать*) паківа́ць.

ПОМОТА́ТЬСЯ I *сов.* (*покачаться, потрястись*) памата́цца; (*поболтаться*) паматля́цца, пацеля́пацца.

ПОМОТА́ТЬСЯ II *сов. разг.* **1.** (*в хлопотах, занятиях*)

пабе́гаць; (*без дела*) паматля́цца, пашлы́ндаць; 2. (*поскитаться*) пабадзя́цца; паматля́цца.
ПОМО́ХА *метеор.* імгла́, -лы́ *ж*, сухі́ тума́н.
ПОМО́ЧЕННЫЙ памо́чаны.
ПОМО́Ч||И падця́жкі, -жак *ед. нет*; ◇ **быть, ходи́ть, води́ть на ∼а́х** *разг.* быць, хадзі́ць, вадзі́ць на павадку́.
ПОМОЧИ́ТЬ *сов.* памачы́ць.
ПОМОЧИ́ТЬСЯ *сов.* памачы́цца.
ПОМО́ЧЬ *сов.* дапамагчы́, памагчы́.
ПОМО́ЩНИ||К памо́чнік, -ка *м*; **∼ЦА** памо́чніца, -цы *ж.*
ПО́МОЩ||Ь дапамо́га, -гі *ж*; по́мач, -чы *ж*; **оказа́ть п.** дапамагчы́; **получи́ть п.** атрыма́ць дапамо́гу; **взыва́ть** ■ **∼и** прасі́ць ратýнку; **на п.!** дапамажы́(це)!; **при ∼и** з дапамо́гай (пры дапамо́зе); **с ∼ью** з дапамо́гай; **без посторо́нней ∼и** без чужо́й (пабо́чнай) дапамо́гі; **медици́нская п.** меды́чная дапамо́га; **ско́рая п.** хýткая дапамо́га; **оказа́ть пе́рвую п.** *мед.* даць пе́ршую дапамо́гу; **п. на дому́** дапамо́га до́ма; **огнева́я п.** *воен.* агнявая дапамо́га; ◇ **пода́ть ру́ку ∼и** пада́ць рукý дапамо́гі.
ПО́МП||А I (*пышность*) по́мпа, -пы *ж*; **де́лать что́-либо с ∼ой** рабі́ць што-не́будзь з по́мпай.
ПО́МПА II (*насос*) по́мпа, -пы *ж.*
ПОМПАДУ́Р *ирон.* пампаду́р, -ра *м*; **∼СКИЙ** пампаду́рскі; **∼СТВО** пампаду́рства, -ва *ср*; **∼ША** пампаду́рка, -кі *ж.*
ПОМПЕ́ЗН||О, ПОМПЁЗН||О *нареч.* пампе́зна; **∼ОСТЬ** пампе́знасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** пампе́зны.
ПОМПЕ́Я *г. ист.* Пампе́я, -пе́і *ж.*
ПОМПОЛИ́Т (помо́щник полити́ческого руководи́теля) пампалі́т, -та *м* (памо́чнік паліты́чнага кіраўніка́).
ПОМПО́Н пампо́н, -на *м.*
ПОМРАЧ||А́ТЬ *несов.* 1. зацямня́ць, захму́рваць; 2. *перен.* (*печалить*) засмуча́ць; азмро́чваць; **∼А́ТЬСЯ** 1. засмуча́цца; азмро́чвацца; 2. *страд.* зацямня́цца, захму́рвацца; засмуча́цца, азмро́чвацца; *см.* **помрача́ть; ∼Е́НИЕ** зацямне́нне, -ння *ср*; **∼е́ние созна́ния** зацямне́нне свядо́масці (па́мяці); ◇ **уму́ ∼е́ние** *разг.* на дзі́ва, надзвыча́йна, дзіво́сна, дзі́ўна; **∼Ё́ННЫЙ** 1. зацямнёны, захму́раны; 2. *перен.* (*опечаленный*) засму́чаны; азмро́чаны; **∼И́ТЬ** *сов.* 1. зацямні́ць, захму́рыць; 2. *перен.* (*опечалить*) засмуці́ць; азмро́чыць; **∼НЕ́ТЬ** *сов.* стаць змро́чным (*стать сумрачным*); пацямне́ць (*потемнеть*); пахмурне́ць (*стать хмурым*); стаць па́хмурным (*стать пасмурным*); стаць пану́рым (*стать угрюмым*).
ПОМУДРИ́ТЬ *сов.* памудрава́ць, памудрагелі́ць.
ПОМУЗИЦИ́РОВАТЬ *сов. разг.* памузіцы́раваць.
ПОМУРА́В||ИТЬ *сов. тех.* палі́ць; **∼ЛЕННЫЙ** палі́ваны.
ПОМУРЛЫ́КАТЬ *сов.* 1. паму́ркаць, паваркатáць; 2. *перен.* памурлы́каць.
ПОМУ́С||ЛИТЬ *сов. разг.* паслі́ніць; **∼О́ЛЕННЫЙ** паслі́нены; **∼О́ЛИТЬ** *сов. см.* **пому́слить.**
ПОМУТ||И́ТЬ *сов.* 1. (*жидкость*) пакалáмуціць, памуці́ць; 2. *перен.* затумáніць; *см.* **мути́ть** 1, 2; **∼И́ТЬСЯ** 1. (*о жидкости*) пакаламу́ціцца, замуці́цца; 2. *перен.* (*помрачиться*) памутне́ць, затума́ніцца; 3. (*в голове, глазах и т. п.*) *безл.* памутне́ць; *см.* **мути́ться; ∼НЕ́ВШИЙ** 1. (*о жидкостях*) пакаламу́чаны, памутне́лы; 2. *в др. знач.* памутне́лы; **∼НЕ́НИЕ** 1. пакаламу́чанне, -ння *ср*, памутне́нне, -ння *ср*; 2. памутне́нне, -ння *ср*; **∼НЕ́ННЫЙ** 1. пакаламу́чаны; (*непрозрачный — о жидкостях*) каламу́тны, му́тны; (*непрозрачный — о стекле*) му́тны; 2. *перен.* памутне́лы; **∼НЕ́ТЬ** *сов.* 1. пакаламу́ціцца, памуці́цца, памутне́ць; 2. *перен.* памутне́ць; **∼НИ́ТЬ** *сов. разг.* 1. пакаламу́ціць; 2. *перен.* памутні́ць.
ПОМУ́ЧИТЬ *сов.* паму́чыць; пакатава́ць; **∼СЯ** паму́чыцца; папаку́тава́ць.
ПОМУШТРОВА́ТЬ *сов.* памуштрава́ць.
ПОМЧА́ТЬ *сов.* памча́ць; **∼СЯ** памча́цца.
ПОМЫКАТЬ *сов. обл., разг.:* **п. го́ре** пагарава́ць, пабедава́ць.
ПОМЫКА́ТЬ *несов.* папіха́ць (*кім-чым, каго-што*); трыма́ць у паняве́рцы (*каго*).
ПОМЫКА́ТЬСЯ *сов. разг.* пагарава́ць, пабедава́ць; (*поскитаться*) паблука́ць, пабадзя́цца.
ПОМЫ́Л||ЕННЫЙ памы́лены; **∼ИТЬ** *сов.* памы́ліць; **∼ИТЬСЯ** памы́ліцца.
ПО́МЫСЕЛ *м* (*мысль*) ду́мка, -кі *ж*; (*намерение*) наме́р, -ру *м.*
ПОМЫ́СЛИТЬ *сов.* паду́маць.
ПОМЫТА́Р||ЕННЫЙ зму́чаны, змардава́ны; **∼ИТЬ** *сов. разг.* паму́чыць, памардава́ць; **∼ИТЬСЯ** паму́чыцца, папаку́таваць, пагарава́ць, памардава́цца.
ПОМЫ́ТЫЙ памы́ты.
ПОМЫ́ТЬ *сов.* памы́ць; **∼СЯ** памы́цца.
ПОМЫЧА́ТЬ *сов.* парыка́ць, памы́каць.
ПОМЫШЛ||Е́НИЕ *ср* 1. ду́мка, -кі *ж*; (*размышление*) ро́здум, -му *м*; 2. (*намерение*) наме́р, -ру *м*; **∼Я́ТЬ** *несов.* ду́маць, паду́мваць; (*мечтать*) ма́рыць.
ПОМЯ́Н||УТЫЙ 1. *прич.* успо́мнены; памя́нуты; *см.* **помяну́ть;** 2. *прил.* памя́нуты; ◇ **не тем будь ∼ут** *погов.* не памі́наючы лі́хам; не ка́жучы благо́га сло́ва; **∼У́ТЬ** *сов.* 1. (*вспомнить*) успо́мніць; 2. (*справить поминки*) *церк.* памяну́ць; ◇ **∼и́те моё сло́во** *погов.* успо́мніце маё сло́ва.
ПОМЯ́ТЫЙ памя́ты; пакаме́чаны; патапта́ны; пацёрты.
ПОМЯ́ТЬ *сов.* 1. памя́ць; (*покомкать*) пакамячы́ць; (*потоптать*) патапта́ць; (*потереть*) паце́рці; 2. *перен. простореч.* пабі́ць.
ПОМЯ́ТЬСЯ I *сов.* памя́цца; пакамячы́цца.
ПОМЯ́ТЬСЯ II *сов.* (*помедлить*) паму́ляцца; памару́дзіць.
ПОНАБИРА́ТЬ *сов. разг.* панабіра́ць; (*набрать*) набра́ць; **∼СЯ** набра́цца.
ПОНАБЛЮДА́ТЬ *сов.* 1. панагляда́ць, паназіра́ць; (*проследить*) пасачы́ць (*за кім-чым*); 2. (*иметь надзор*) пagлядáць (*каго-што*).
ПОНАБРА́ТЬ *сов. разг.* панабіра́ць; (*набрать*) набра́ць; **∼СЯ** набра́цца.
ПОНАБРОСА́ТЬ *сов. разг.* панакіда́ць; (*набросать*) накі́даць.
ПОНАВЕ́ДАТЬСЯ *сов. разг.* наве́дацца, даве́дацца (*да каго*).
ПОНАВЕЗ||Ё́ННЫЙ панаво́жаны; наве́зены; **∼ТИ́** *сов.* панаво́зіць; (*навезти*) наве́зці.
ПОНАГНА́ТЬ *сов. разг.* панаганя́ць; (*нагнать*) нагна́ць.
ПО-НАД *предлог с твор.* па-над (*чым*).
ПОНАДАВА́ТЬ *сов. разг.* панадава́ць; (*надавать*) надава́ць.
ПОНАДАРИ́ТЬ *сов. разг.* панадо́рваць; (*надарить*) надары́ць.
ПОНАДЕ́ЛАТЬ *сов. разг.* панарабля́ць; нарабі́ць.
ПОНАДЕ́ЯТЬСЯ *сов.* паспадзява́цца.
ПОНА́ДОБИТЬСЯ *сов.* спатрэ́біцца; (*стать нужным*) быць патрэ́бным.
ПОНАЕ́ХАТЬ *сов. разг.* панаязджа́ць; нае́хаць.
ПОНАПРА́СНУ *нареч. разг.* дарэ́мна, дарма́; (*тщетно*) ма́рна.
ПОНАСЛЫ́ШКЕ па чу́тках.
ПОНАСМОТРЕ́ТЬСЯ *сов. разг.* нагле́дзецца.
ПО-НАСТОЯ́ЩЕМУ *нареч.* па-сапраўднаму.
ПОНАСТРО́||ЕННЫЙ панабудава́ны; набудава́ны; **∼ИТЬ** *сов. разг.* панабудо́ўваць; набудава́ць.
ПОНАТАСКА́ТЬ *сов. разг.* панацяга́ць; нацягну́ць.
ПОНАТЕ́ШИТЬСЯ *сов. разг.* нацешыцца.
ПОНАТОРЕ́ТЬ *сов. простореч.* налажы́цца (*да чаго*); (*наловчиться*) напрактыкава́цца (*у чым*), прызвыча́іцца

(*да чаго*); налаўчыцца; (*набить руку*) набіць руку (*на чым*).

ПОНАТУ́ЖИТЬСЯ *сов. разг.* паднату́жыцца; (*напрячься*) паднапру́жыцца.

ПОНАХВАТА́ТЬ *сов. разг.* панахапа́ць, панахвата́ць; (*нахватать*) нахапа́ць, нахвата́ць.

ПОНАХЛЫ́НУТЬ *сов. разг.* нахлы́нуць.

ПО-НА́ШЕМУ *нареч.* па-на́шаму.

ПОНЕВО́ЛЕ *нареч.* паняво́лі, не́хаця.

ПОНЕДЕ́ЛЬНИ||К панядзе́лак, -лка *м*; **∼ЧНЫЙ** панядзе́лкавы.

ПОНЕДЕ́ЛЬН||О *нареч.* патыднёва; (*еженедельно*) штотыднёва; **∼ЫЙ** патыднёвы; штотыднёвы.

ПОНЕ́ЖЕ *союз уст.* бо, таму́ што, пако́лькі.

ПОНЕ́ЖИТЬ *сов.* папе́сціць; (*поголубить*) пагалу́біць, памілава́ць; (*поласкать*) пала́шчыць; **∼СЯ** папе́сціцца.

ПОНЕ́ЖНИЧАТЬ *сов. разг.* 1. (*взаимно*) пагалу́біцца, памілава́цца, папе́стсовацца; 2. (*полюбезничать*) пазаляца́цца (*да каго*), пагавары́ць кампліме́нты (*каму*).

ПО-НЕМЕ́ЦКИ *нареч.* па-няме́цку.

ПОНЕМНО́||ГУ *нареч.* патро́ху, пакрысе́; **∼ЖКУ** патро́шку, пакры́шку.

ПОНЕС||ЁННЫЙ 1. пане́сены; 2. (*об утрате и т. п.*) пане́сены, перажы́ты; **∼ТИ́** *сов.* 1. пане́сці; 2. (*о лошадях*) памча́ць; **ло́шади ∼ли́ нас с горы́** ко́ні памча́лі нас з гары́; 3. *перен.* (*потерпеть*) пане́сці, пацярпе́ць, перажы́ць; **∼ти́ утра́ту** пане́сці (пацярпе́ць) стра́ту; **∼ти́ наказа́ние** быць пакара́ным; 4. (*начать говорить вздор*) пача́ць вярзці́; пача́ць плявузгаць; **∼ти́ ахинé ю** пача́ць вярзці́ ахіне́ю; 5. (*подуть*) *безл.* падзьму́ць; **к ве́черу ∼ло́ хо́лодом** пад ве́чар падзьму́ла хо́ладам; 6. (*о запахе*) *безл.* пацягну́ць; **из столово́й ∼ло́ жа́реным** са стало́вай пацягну́ла сма́жаным; 7. (*забеременеть*) *простореч. уст., обл.* зацяжа́раць; **∼ТИ́СЬ** *разг.* памча́цца; (*побежать*) пабе́гчы.

ПО́НИ по́ні *нескл., м.*

ПОНИЖ||А́ТЕЛЬ (*на бирже*) паніжа́льнік, -ка *м*, зніжа́льнік, -ка *м*; **∼А́ТЬ** *несов.* паніжа́ць, зніжа́ць; **∼А́ТЬСЯ** паніжа́цца, зніжа́цца.

ПОНИ́Ж||Е *сравн. ст.* 1. *нареч.* (тро́хі) ніжэ́й; (*как можно ниже*) (як мага́) ніжэ́й; як найніжэ́й; 2. *прил.* (тро́хі) ніжэ́йшы; (*ниже всего*) найніжэ́йшы; **∼Е́НИЕ** паніжэ́нне, -ння *ср*, зніжэ́нне, -ння *ср*; **∼ЕННЫЙ** паніжаны, зніжаны.

ПОНИЗИ́ТЕЛЬН||ЫЙ *тех.* паніжа́льны, зніжа́льны; **∼ая подста́нция** паніжа́льная падста́нцыя.

ПОНИ́ЗИТЬ *сов.* пані́зіць, зні́зіць; **∼СЯ** пані́зіцца, зні́зіцца.

ПОНИЗО́ВЬЕ панізо́ўе, -зо́ўя *ср.*

ПО́НИЗУ *нареч.* пані́зе; (*внизу*) уні́зе, ні́зам.

ПОНИКА́ТЬ *несов.* ні́кнуць.

ПОНИ́К||НУТЬ *сов.* пані́кнуць; **∼ШИЙ** пані́клы.

ПОНИМА́||НИЕ разуме́нне, -ння *ср*; **э́то вы́ше моего́ ∼ния** гэ́та вышэ́й (ад) майго́ разуме́ння; **∼ТЬ** *несов.* разуме́ць; ◇ **∼ешь (ли), ∼ете (ли)** *вводн. сл.* разуме́еш, разуме́еце; **вот э́то я ∼ю** вось гэ́та я разуме́ю; *см.* **поня́ть**; **∼ТЬСЯ** *страд.* разуме́цца.

ПО-НИ́ЩЕНСКИ *нареч.* па-жабра́чаму, па-жабра́цку.

ПОНОВЕ́ТЬ *сов.* панаве́ць.

ПО-НО́ВОМУ *нареч.* па-но́ваму.

ПОНОЖО́ВЩИНА *разг.* панажо́ўшчына, -ны *ж*; (*резня*) разані́на, -ны *ж.*

ПОНОМА́||РСКИЙ дзякоўскі; **∼РЬ** дзяк, *род.* дзяка́ *м*, дзячо́к, -чка́ *м.*

ПОНО́С *мед.* пано́с, -су *м.*

ПОНОСИ́ТЬ I *несов.* (*порочить*) га́ньбіць, знеслаўля́ць; (*ругать*) ла́яць; (*оскорблять*) зневажа́ць, абража́ць.

ПОНОСИ́ТЬ II *сов.* (*к* **носи́ть**) панасі́ць.

ПОНОСИ́ТЬСЯ I *несов. страд.* га́ньбіцца, знеслаўля́цца; ла́яцца; зневажа́цца, абража́цца; *см.* **поноси́ть I.**

ПОНОСИ́ТЬСЯ II *сов.* (*пробыть в носке*) панасі́цца.

ПОНО́СКА *спец.* 1. (*у собаки*) пано́ска, -кі *ж*; 2. (*взяток пчелы*) *с.-х.* но́шка, -кі *ж.*

ПОНО́СНЫЙ пано́сны.

ПОНОШЕ́НИЕ *ср* га́ньба, -бы *ж*, знеслаўле́нне, -ння *ср*; ла́янка, -кі *ж*; знява́га, -гі *ж*; абра́за, -зы *ж.*

ПОНО́ШЕННЫЙ 1. *прил.* (*о платье, обуви*) падно́шаны, но́шаны; (*изношенный*) зно́шаны; (*стоптанный*) стапта́ны; 2. *перен.* пано́шаны.

ПОНРА́ВИТЬСЯ *сов.* спадаба́цца.

ПОНТЁР *карт. уст.* панцёр, -ра *м.*

ПОНТИ́Р||ОВАТЬ *несов. карт.* панці́раваць; **∼О́ВКА** *карт.* панціро́ўка, -кі *ж.*

ПОНТО́Н *в разн. знач.* панто́н, -на *м*; **∼ЁР** *воен.* пантанёр, -ра *м*; **∼НЫЙ** панто́нны; **∼ный мост** панто́нны мост; **∼ная часть** панто́нная часць.

ПОНУДИ́ТЕЛЬНЫЙ прымусо́вы.

ПОНУ́ДИТЬ *сов.* прыму́сіць.

ПОНУЖД||А́ТЬ *несов.* прымуша́ць; **∼Е́НИЕ** *ср* прыму́с, -су *м*; **∼Ё́ННЫЙ** прыму́шаны.

ПОНУКА́||НИЕ панука́нне, -ння *ср*, падганя́нне, -ння *ср*; **∼ТЬ** *несов.* пану́кваць, падганя́ць.

ПОНУ́Р||ЕННЫЙ пану́раны; (*опущенный*) апу́шчаны; **∼ИТЬ** *сов.* пану́рыць; апусці́ць; **∼ить го́лову** пану́рыць (апусці́ць) галаву́; **∼ИТЬСЯ** пану́рыцца; апусці́цца; **∼ЫЙ** пану́ры.

ПО́НЧИК по́нчык, -ка *м.*

ПОНЫ́НЕ *нареч. уст.* дагэ́туль, да гэ́тага ча́су.

ПО-НЫ́НЕШНЕМУ *нареч.* па-цяпе́рашняму; па-суча́снаму.

ПОНЫРЯ́ТЬ *сов. разг.* паныра́ць, падава́ць нырца́.

ПОНЫ́ТЬ *сов.* паны́ць.

ПОНЮ́||ХАТЬ *сов.* панюхаць; **∼ШКА** *ж* нюх, *род.* нюху *м*; (*щепотка табаку*) панюшка, -кі *ж*; **на одну́ ∼шку** на адзі́н нюх; ◇ **ни за ∼шку табаку́** ні за нюх табакі.

ПОНЯ́НЧИТЬ *сов.* паня́ньчыць; **∼СЯ** 1. паня́ньчыцца; 2. *перен.* паня́ньчыцца, паца́цкацца.

ПОНЯ́Т||ИЕ 1. паня́цце, -цця *ср*; **п. квадра́та** паня́цце квадра́та; **п. приба́вочной сто́имости** паня́цце прыба́вачнай ва́ртасці; **растяжи́мое п.** няпэ́ўнае (малаакрэ́сленае) паня́цце; 2. (*представление*) уяўле́нне, -ння *ср*; **име́ть п. о чём-либо** мець уяўле́нне аб чым-не́будзь; **не име́ть (ни мале́йшего) ∼ия о чём-либо** не мець (ніякага, аніякага) уяўле́ння аб чым-не́будзь; **предвзя́тые ∼ия** прадузя́тыя ўяўле́нні; 3. *в др. знач.* разуме́нне, -ння *ср*; **челове́к без вся́кого ∼ия** чалаве́к без усякага разуме́ння; **дать п. о чём-либо** даць разуме́нне аб чым-не́будзь; **∼ЛИВОСТЬ** цямлі́васць, -ці *ж*; (*сообразительность*) ке́млівасць, -ці *ж*, ке́мнасць, -ці *ж*; **∼ЛИВЫЙ** цямлі́вы; ке́млівы, ке́мны; **∼НО** 1. *нареч.* зразуме́ла; **говори́те ∼но** гавары́це зразуме́ла; 2. *сказ. безл.* зразуме́ла; 3. *вводн. сл.* зразуме́ла; (*конечно*) вядо́ма; **я, ∼но, обо всём напишу́ вам** я, зразуме́ла (вядо́ма), аб усім напішу́ вам; **∼НОСТЬ** зразуме́ласць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** зразуме́лы; ◇ **∼ное де́ло (поня́тная вещь)** *вводн. сл. разг.* зразуме́лая рэч.

ПОНЯТО́Й *сущ. уст.* паняты́, -то́га *м.*

ПОНЯ́ТЫЙ зразуме́ты.

ПОНЯ́ТЬ *сов.* зразуме́ць; **дать п.** даць зразуме́ць; *см.* **понима́ть.**

ПООБВЫ́КНУТЬ *сов. разг.* прывы́кнуць, прызвыча́іцца; (*свыкнуться*) звы́кнуцца.

ПООБДУ́МАТЬ *сов. разг.* (тро́хі) абду́маць.

ПООБЕ́ДАТЬ *сов.* паабе́даць; *см.* **обе́дать.**

ПООБЕ́Щ||АННЫЙ паабяца́ны, даклерава́ны; **~АТЬ** *сов.* паабяца́ць, даклерава́ць.

ПООБЖИ́ТЬСЯ *сов. разг.* (тро́хі, патро́ху) абжы́цца.

ПООБСО́ХНУТЬ *сов. разг.* (тро́хі, патро́ху) абсо́хнуць.

ПОО́ДАЛЬ *нареч.* наво́ддаль, во́ддаль.

ПООДИНО́ЧКЕ *нареч.* па адны́м.

ПООКТЯ́БРЬСКИЙ паслякастры́чніцкі.

ПООСМОТРЕ́ТЬСЯ *сов. разг.* (тро́хі, патро́ху) агле́дзецца.

ПООСТРИ́ТЬ I *сов.* (*наточить*) павастры́ць.

ПООСТРИ́ТЬ II *сов.* (*наговорить острот*) павостраслóвіць; (*зло*) пакпі́ць, пастрóіць кпі́ны; (*пошутить*) пажартава́ць, пастрóіць жа́рты; (*потрунить*) папаке́пліваць, пастрóіць ке́пікі.

ПООТВЫ́КНУТЬ *сов. разг.* (тро́хі, патро́ху) адвы́кнуць.

ПО-ОТЦО́ВСКИ *нареч.* па-бацькóўску.

ПОО́ХАТЬ *сов.* (тро́хі) паво́хкаць, (тро́хі) паво́йкаць.

ПООХО́ТИТЬСЯ *сов.* папалява́ць.

ПО-ОХО́ТНИЧЬИ *нареч.* па-паляўні́чаму.

ПООЧЕРЁДН||О *нареч.* па чарзе́; **~ЫЙ** па чарзе́ (*по очереди*); пачарго́вы; **нести́ ~ое дежу́рство** не́сці дзяжу́рства (дзяжу́рыць) па чарзе́.

ПООЩР||Е́НИЕ *ср* 1. (*действие*) заахво́чванне, -ння *ср*; (*поддержка одобрением, похвалой*) падтры́мка, -кі *ж*, падтры́мліванне, -ння *ср*; **э́та рабо́та заслу́живает ~е́ния** гэ́та рабо́та заслуго́ўвае падтры́мкі; 2. (*награда*) узнагаро́да, -ды *ж*; **~ЁННЫЙ** заахво́чаны; падтры́маны; *см.* **поощря́ть; ~И́ТЕЛЬНО** *нареч.* заахво́чваюча; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** заахво́чвальны; **~и́тельный тон** заахво́чвальны тон; **~И́ТЬ** *сов.* заахво́ціць; (*поддержать одобрением, похвалой, наградой*) падтрыма́ць (адабрэ́ннем, пахвало́й, узнагаро́дай); **~Я́ТЬ** *несов.* заахво́чваць; (*поддерживать одобрением, похвалой*) падтры́мліваць (адабрэ́ннем, пахвало́й, узнагаро́дай); **оте́ц ~я́л заня́тия сы́на жи́вописью** ба́цька заахво́чваў сы́на да заня́ткаў жы́вапісам (падтры́мліваў заня́ткі сы́на жы́вапісам); **~Я́ТЬСЯ** *страд.* заахво́чвацца; падбухто́рвацца, падбі́вацца, паддра́жнівацца; падтры́млівацца.

ПОП I поп, *род.* папа́ *м*; **како́в поп, тако́в ■ прихо́д** *погов. уст.* які́ поп, такі́ і пры́ход.

ПОП II: **ста́вить, поста́вить на попа́** *простореч.* ста́віць, паста́віць стаяко́м (старчма́).

ПОПАДА́НИЕ папада́нне, -ння *ср*; **прямо́е п.** прамо́е папада́нне.

ПОПА́ДАТЬ *сов. разг.* папа́даць; пава́лі́цца.

ПОПАДА́ТЬ *несов.* 1. (*куда-л.*) трапля́ць; папада́ць; 2. (*в кого-что*) папада́ць; трапля́ць; 3. *безл. разг.* папада́ць, улята́ць; *см.* **попа́сть; ~СЯ** 1. (*встречаться, случаться*) трапля́цца; папада́цца; 2. (*оказываться уличённым, пойманным*) папада́цца; *см.* **попа́сться.**

ПОПАЛЬЯ́ *разг.* пападдзя́, -ддзі́ *ж*.

ПОПАЛЁННЫЙ 1. папа́лены; 2. пасма́лены; *см.* **попали́ть** I.

ПОПАЛИ́ТЬ I *сов.* 1. (*пожечь*) папалі́ць; 2. (*тушу, ворс и т. п.*) пасмалі́ць.

ПОПАЛИ́ТЬ II *сов.* (*пострелять*) папалі́ць, пасмалі́ць.

ПОПА́Р||ЕННЫЙ папа́раны; **~ИТЬ** *сов.* папа́рыць.

ПОПАРИ́ТЬ *сов.* палята́ць.

ПОПА́РИТЬСЯ *сов. в разн. знач.* папа́рыцца.

ПОПА́РНО *нареч.* па́рамі.

ПО-ПАРТИ́ЙНОМУ *нареч.* па-парты́йнаму.

ПОПАСТИ́ *сов.* папа́свіць; **~СЬ** папа́свіцца.

ПОПА́СТЬ *сов.* 1. (*куда-л.*) тра́піць; папа́сці; **п. на доро́гу** тра́піць (папа́сці) на даро́гу; **домо́й мы попа́ли по́здно ве́чером** дамо́ў мы тра́пілі (папа́лі) по́зна ўве́чары; **он дово́лен, что попа́л в университе́т** ён здаво́лены, што тра́піў (папа́ў) ва ўніверсітэ́т; 2. (*в кого-что*) папа́сці; тра́піць; **стрело́к попа́л в мише́нь** страло́к папа́ў (тра́піў) у мішэ́нь; **пу́ля попа́ла мне в но́гу** ку́ля папа́ла (тра́піла) мне ў нагу́; **он попа́л ного́й ■ грязь** ён папа́ў (тра́піў) наго́й у гразь; **в се́ти попа́ло мно́го ры́бы** у се́тку папа́ла (тра́піла) мно́га ры́бы; 3. *безл. разг.* папа́сці, уляце́ць; **ему́ попа́ло от роди́телей** яму́ папа́ла (уляце́ла) ад бацько́ў; ◇ **п. в беду́** тра́піць (папа́сці) у бяду́; **п. ■ неприя́тное положе́ние** тра́піць у непрые́мнае стано́вішча; **п. па́льцем ■ не́бо** *разг.* тра́піць (папа́сці) па́льцам у не́ба; **п. в са́мую то́чку** тра́піць (папа́сці) у са́мую кро́пку; **п. впроса́к** тра́піць у няёмкае стано́вішча, укляпа́цца, ашука́цца; **ему́ попадёт!** *разг.* яму́ пападзе́ (уляці́ць)!; **как попа́ло** як папа́ла (пападзе́цца); **где попа́ло** дзе папа́ла (пападзе́цца); **кому́ попа́ло** каму́ папа́ла (пападзе́цца); **~СЯ** 1. (*встретиться, случиться*) тра́піцца; папа́сціся; **по пути́ мне никто́ не попа́лся** па даро́зе мне ніхто́ не тра́піўся (не папа́ўся); 2. (*оказаться уличённым, пойманным*) папа́сціся; **вор, наконе́ц, попа́лся** зло́дзей, нарэ́шце, папа́ўся; ◇ **~ся на у́дочку** папа́сціся на ву́ду (на ву́дачку); **~ся на глаза́** тра́піцца (папа́сціся) на во́чы; **~ся под ру́ку** *прям., перен.* тра́піцца (папа́сціся) пад руку́; **что попадётся** што тра́піцца (пападзе́цца); **вот так попа́лся!** *разг.* вось дык папа́ўся (ускочы́ў)!; (*влопался*) укляпа́ўся, уло́паўся!; **пе́рвый попа́вшийся** пе́ршы сустрэ́чны.

ПОПА́ХИВАТЬ *несов.* (*слегка пахнуть*) папа́хваць.

ПОПЕНЯ́ТЬ *сов. разг.* панарака́ць, паска́рдзіцца, падакара́ць; *см.* **пеня́ть.**

ПОПЕРЁК 1. *нареч.* упо́перак; напо́перак; 2. *предлог с род.* упо́перак (*каго-чаго*); **п. доро́ги встал** упо́перак даро́гі стаў; ◇ **вдоль и п.** а) (*во всех направлениях*) наўсця́ж; удо́ўж і ўпо́перак; б) (*во всех подробностях*) удо́ўж і ўпо́перак; **стать кому́-либо п. го́рла** *разг.* стаць каму́-не́будзь упо́перак го́рла.

ПОПЕРЕМЕ́НН||О *нареч.* паперамéнна, напераме́нку; **~ЫЙ** паперамéнны.

ПОПЕРЕ́ЧИНА папяро́чка, -кі *ж*.

ПОПЕРЕ́ЧИТЬ *сов. разг.* папярэ́чыць.

ПОПЕРЕ́ЧН||ИК 1. *тех.* папяро́чнік, -ка *м*; (*диаметр*) дыя́метр, -ра *м*; **де́сять сантиме́тров ■ ~ике** дзе́сяць сантыме́траў у дыя́метры (у папяро́чніку); 2. (*ремень*) па́сак, -ска *м*; **~ЫЙ** папяро́чны; ◇ **встре́чный и ~ый** *разг.* ко́жны сустрэ́чны; ко́жны, хто папа́ла.

ПОПЕРХНУ́ТЬСЯ *сов.* папярхну́цца.

ПОПЕ́РЧ||ЕННЫЙ папе́рчаны; **~ИТЬ** *сов.* папе́рчыць.

ПОПЕ́ТЬ *сов.* паспява́ць, папе́ць.

ПОПЕЧА́ЛИТЬСЯ *сов.* пасмуткава́ць, пасмуці́цца, пажуры́цца, памаркоціцца; (*погрустить*) пасумава́ць.

ПОПЕЧЕ́Н||ИЕ *ср* 1. (*покровительство, помощь*) апе́ка, -кі *ж* (*над кім-чым*), апекава́нне, -ння *ср* (*над кім-чым*); (*забота*) кло́пат, -ту *м*; (*наблюдение*) нагля́д, -ду *м* (*над кім-чым*); (*иждивение*) утрыма́нне, -ння *ср* (*каго-чаго*); **оста́вить на чье-либо п.** пакі́нуць пад чы́м-не́будзь нагля́дам; **име́ть п.** апекава́цца; клапаці́цца; **име́ть на ~ии** мець на ўтрыма́нні (пад апе́каю, пад нагля́дам); **быть на ~ии** быць на ўтрыма́нні (пад апе́каю, пад нагля́дам); ◇ **отложи́ть п.** пакі́нуць ду́маць, пакі́нуць ду́мку; адкла́сці кло́патьі.

ПОПЕЧИ́ТЕЛЬ 1. (*опекун*) апяку́н, -на́ *м*; 2. (*должностное лицо*) *уст.* папячы́цель, -ля *м*; **~НИЦА** 1. апяку́нка, -кі *ж*; 2. папячы́цельніца, -цы *ж*; **~НЫЙ** 1. (*заботливый*) *уст.* клапатлі́вы; 2. *офиц. уст.* папячы́цельны; **~ный сове́т** папячы́цельны саве́т; **~СКИЙ** 1. апяку́нскі; 2. папячы́цельскі; **~СТВО** *ср* 1. апе́ка, -кі *ж, мн. нет,* апекава́нне, -ння *ср*, апяку́нства, -ва *ср*; 2. (*учреждение, должность*) *уст.* папячы́цельства, -ва *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов.* апекава́цца, апяку́нстваваць.

ПОПЕ́ЧЬ *сов.* папячы́; **~СЯ** папячы́ся.

ПОПИВА́ТЬ *несов. разг.* папіва́ць.

ПОПИЛИ́ТЬ *сов.* папілава́ць.
ПОПИРА́||НИЕ 1. таптанне, -ння *ср*; 2. таптанне, -ння *ср*; папіханне, -ння *ср*; (грубае) парушэнне, -ння *ср*; зневажанне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. уст.* 1. (*наступать на кого-что-л.*) таптаць; 2. таптаць; папіхаць; (*грубо нарушать*) (груба) парушаць; (*оказывать неуважение, оскорблять*) зневажаць; ◇ **~ть чьи-либо права́** таптаць (парушаць) чыё-небудзь правы.
ПОПИРОВА́ТЬ *сов.* пабалява́ць, пабанкетава́ць.
ПОПИСА́ТЬ *сов.* 1. папіса́ць; 2. (*красками*) памалява́ць; ◇ **ничего́ не попи́шешь** *разг.* нічога не папішаш.
ПОПИ́СКИВАТЬ *несов. разг.* папіскваць.
ПОПИ́СЫВАТЬ *несов. разг.* папісваць.
ПОПИ́||ТЬ *сов. разг.* 1. (*выпить*) папіць; 2. (*напиться, утолить жажду*) напіцца; **дай ~ть** дай напіцца.
ПО́ПКА (*попугай*) *разг.* попка, -кі *м.*
ПОПЛА́В||АТЬ *сов.* папла́ваць; **~КО́ВЫЙ** плаўко́вы, паплаўко́вы; **~О́К** ■ *разн. знач.* плаво́к, *род.* плаўка́ *м*, паплаво́к, -лаўка́ *м.*
ПОПЛА́КАТЬ *сов.* папла́каць; **~СЯ** (*пожаловаться*) паскардзіцца; пажаліцца; (*посетовать*) панарака́ць; (*погоревать*) пабедава́ць; папла́каць (*только в конструкциях без дополн.*).
ПОПЛАТИ́ТЬСЯ *сов.* паплаці́цца; **п. голово́й** паплаціцца галаво́ю.
ПОПЛЕВА́ТЬ *сов. разг.* пaплява́ць.
ПОПЛЁВЫВАТЬ *несов. разг.* паплёўваць.
ПОПЛЕСКА́ТЬ *сов.* паплю́хаць; (*побрызгать*) папырскаць; **~СЯ** паплю́хацца; папялёскацца.
ПОПЛЁСКИВАТЬ *несов.* паплю́хваць; (*побрызгивать*) папырскваць.
ПОПЛЕСТИ́ *сов.* паплесці.
ПОПЛЕСТИ́СЬ *сов. разг.* папле́сціся, пацягну́цца.
ПО ПЛЕЧУ́ *см.* **плечо́.**
ПОПЛИ́Н *текст.* паплін, -ну *м*; **~ОВЫЙ** паплінавы.
ПОПЛОТНЕ́ТЬ *сов.* 1. (*стать более плотным*) пашчыльне́ць; 2. (*окрепнуть*) памацне́ць; (*стать более массивным*) патаўсце́ць, зрабіцца больш дзябёлым, зрабіцца больш грубы́м; зрабіцца больш га́матным; (*погустеть*) зрабіцца больш ча́стым, пагусце́ць; (*потвердеть*) пацвярдзе́ць, зрабіцца больш тугім; 3. (*стать человеком более крепкого телосложения*) памажне́ць, стаць больш мажны́м, стаць больш дзябёлым, падзябёлець; (*стать более коренастым*) стаць больш каржакава́тым; (*потолстеть*) патаўсце́ць, *см.* **пло́тный.**
ПОПЛУТА́ТЬ *сов. разг.* паблудзіць; (*поблуждать*) паблука́ць.
ПОПЛЫ́ТЬ *сов.* паплыць.
ПОПЛЯСА́ТЬ *сов. разг.* паскака́ць; (*потанцевать*) патанцава́ць; ◇ **ты у меня́ попля́шешь (он у меня́ попля́шет)** *разг.* ты ў мяне́ паска́чаш (ён у мяне́ паска́ча).
ПОПО́В||ИЧ *разг.* пападзюк, -ка́ *м*, папо́віч, -ча *м*; **~НА** пападзянка, -кі *ж*, папо́ўна, -ны *ж.*
ПОПОВНИ́К *бот.* цюцюпан, -ну *м.*
ПОПО́В||СКИЙ папо́ўскі; **~ЩИНА** *пренебр.* папо́ўшчына, -ны *ж.*
ПОПО́ЕННЫЙ, ПОПОЁННЫЙ папо́ены, напо́ены.
ПОПОИ́ТЬ *сов.* папаіць, напаіць.
ПОПО́ЙКА выпіўка, -кі *ж*, папо́йка, -кі *ж.*
ПОПОЛА́М *нареч.* папала́м, напала́м.
ПОПО́ЛДНИЧАТЬ *сов.* папалу́днаваць.
ПОПО́ЛЗЕНЬ *зоол.* по́паўзень, -зня *м.*
ПОПОЛЗНОВЕ́НИЕ *ср* (*намерение*) наме́р, -ру *м*; (*замысел, умысел*) заме́р, -ру *м*; (*покушение*) зама́х, -ху *м*; **сде́лать п.** зрабіць наме́р, наме́рыцца (*вознамериться*); паспрабава́ць, папрабава́ць (*попытаться*).
ПОПОЛЗТИ́ *сов.* папаўзці.
ПОПОЛНЕ́НИЕ *в разн. знач.* папаўне́нне, -ння *ср.*
ПОПО́ЛНЕННЫЙ папо́ўнены.
ПОПОЛНЕ́ТЬ *сов.* папаўне́ць; (*потолстеть*) патаўсце́ць.
ПОПО́ЛН||ИТЬ *сов.* папо́ўніць; **~ИТЬСЯ** папо́ўніцца; **~Я́ТЬ** *несов.* папаўня́ць; **~Я́ТЬСЯ** папаўня́цца.
ПОПОЛОСКА́ТЬ *сов.* папаласка́ць; **~СЯ** папаласка́цца.
ПОПОЛО́ТЬ *сов.* папало́ць.
ПОПОЛУ́ДНИ *нареч.* папоўдні.
ПОПОЛУ́НОЧИ *нареч.* папо́ўначы.
ПОПО́ЛЬЗОВАТЬ *сов. уст. мед.* палячы́ць; **~СЯ** 1. (*воспользоваться*) пакарыста́цца; 2. (*полечиться*) *уст.* палячы́цца.
ПО-ПО́ЛЬСКИ *нареч.* па-по́льску.
ПОПО́МН||ИТЬ *сов. разг.* 1. (*не забыть*) успо́мніць, прыпо́мніць; 2. (*запомнить обиду*) папо́мніць; **я тебе́ э́то ~ю!** ■ табе́ гэ́та папо́мню!; ◇ **~и(те) моё сло́во!** папо́мні(це), успо́мні(це) маё сло́ва!
ПОПО́НА гу́нька, -кі *ж.*
ПОПО́Р||ТИТЬ *сов. разг.* папсава́ць; **~ТИТЬСЯ** папсава́цца; **~ЧЕННЫЙ** папсава́ны.
ПОПОСТИ́ТЬСЯ *сов.* папасціцца.
ПОПОТЕ́ТЬ *сов.* папаце́ць.
ПОПО́ТЧЕВАТЬ *сов. разг.* пачастава́ць.
ПОПРАВЕ́||НИЕ паправе́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *сов.* паправе́ць.
ПОПРАВИ́М||ЫЙ папра́ўны; які́ мо́жна папра́віць; **э́то ~о** гэ́та мо́жна папра́віць.
ПОПРА́В||ИТЬ *сов. в разн. знач.* папра́віць; **п. оши́бку** папра́віць памылку; **п. ученика́** папра́віць ву́чня; **п. приче́ску** папра́віць прычо́ску; **~ИТЬСЯ 1.** (*исправить ошибку*) папра́віцца; 2. (*выздороветь*) папра́віцца, паздараве́ць, ачуня́ць; **~КА** папра́ўка, -кі *ж*; **~ЛЕ́НИЕ** папраўле́нне, -ння *ср*; **~ЛЕННЫЙ** папра́ўлены; **~ЛЯ́ТЬ** *несов.* папраўля́ць; *см.* **попра́вить; ~ЛЯ́ТЬСЯ** 1. (*исправлять ошибку*) папраўля́цца; 2. (*выздоравливать*) папраўля́цца, здараве́ць, ачу́ньваць; *см.* **попра́виться;** 3. *страд.* папраўля́цца; **~ОЧНЫЙ** папра́вачны; **~очный коэффицие́нт** *мат.* папра́вачны каэфіцые́нт.
ПОПРА́НИЕ *уст.* тапта́нне, -ння *ср*, папіха́нне, -ння *ср*; (гру́бае) парушэ́нне, -ння *ср*, зневажа́нне, -ння *ср.*
ПО́ПРАННЫЙ *уст.* 1. (*потоптанный*) патапта́ны; 2. (*грубо нарушенный*) патапта́ны; растапта́ны; (гру́ба) пару́шаны; зняважаны; *см.* **попира́ть.**
ПОПРА́ТЬ *сов. уст.* 1. (*наступить на кого-что-л.*) патапта́ць; 2. патапта́ць; растапта́ць; (*грубо нарушить*) (гру́ба) пару́шыць; (*оказать неуважение, оскорбить*) зняважыць; *см.* **попира́ть.**
ПОПРЕ́ЖНЕМУ *нареч.* па-ране́йшаму, як і ране́й.
ПОПРЁК *м* папіка, -кі *ж*, упіка, -кі *ж*, папіка́нне, -ння *ср*, упіка́нне, -ння *ср*; (*укор*) дако́р, -ру *м*, дакара́нне, -ння *ср.*
ПОПРЕК||А́ТЬ *несов.* (*кого в чём*) папіка́ць, упіка́ць (*каму*); дакара́ць (*каго*); **~НУ́ТЬ** *сов.* (*кого в чём*) папікну́ць, упікну́ць (*каму*); дакары́ць (*каго*).
ПОПРЕ́ТЬ *сов.* папрэ́ць.
ПОПРИВЫ́КНУТЬ *сов. разг.* (тро́хі, патро́ху) прывы́кнуць; (тро́хі, патро́ху) прызвыча́іцца.
ПОПРИДЕРЖА́ТЬ *сов.* (тро́хі) прытрыма́ць.
ПОПРИ́ТЧИТЬСЯ *сов. уст.* зда́цца.
ПОПРИ́ЩЕ по́ле дзе́йнасці (*поле деятельности*); ні́ва, -вы *ж*; арэ́на, -ны *ж* (*арена*); **рабо́тать на литерату́рном п.** праца́ваць на літарату́рнай ні́ве.
ПО-ПРИЯ́ТЕЛЬСКИ *нареч. разг.* па-сябро́ўску, па-прыяце́льску.
ПОПРО́БОВАТЬ *сов.* 1. паспрабава́ць, папрабава́ць; **попро́буй(те)!** паспрабу́й(це), папрабу́й(це)!; 2. (*отведать*) пакаштава́ць, паспрабава́ць, папрабава́ць; *см.* **про́бовать.**
ПО-ПРОЛЕТА́РСКИ *нареч.* па-пралета́рску.
ПОПРОСИ́ТЬ *сов.* 1. папрасі́ць; 2. (*пригласить*) запрасі́ць; *см.* **проси́ть** 1, 2; **~СЯ** папрасі́цца; *см.* **проси́ться.**

ПО́ПРОСТУ *нареч.* папро́сту, папро́стаму; (*просто*) про́ста; **п. говоря́** про́ста ка́жучы.

ПОПРОША́Й||КА *м и ж* 1. (*нищий*) жабра́к, -ка́ *м*; (*нищенка*) жабра́чка, -кі *ж*; 2. (*надоедающий просьбами*) *пренебр.* про́ська, -кі *м и ж*, папраша́йка, -кі *м и ж*; **~НИЧАНЬЕ** 1. (*нищенство*) жабрава́нне, -ння *ср*; 2. (*надоедливая просьба*) папраша́йнічанне, -ння *ср*; ка́нькание, -ння *ср*, кле́нчанне, -ння *ср*; **~НИЧАТЬ** *несов.* 1. (*нищенствовать*) жабрава́ць; 2. (*надоедливо просить*) *пренебр.* папраша́йнічаць; (*клянчить*) ка́нькаць, кле́нчыць; **~НИЧЕСТВО** 1. жабрава́нне, -ння *ср*, жабра́цтва, -ва *ср*; 2. (*надоедливое приставание с просьбами*) папраша́йніцтва, -ва *ср*; ка́нькание, -ння *ср*, кле́нчанне, -ння *ср*.

ПОПРО́ШЕННЫЙ 1. папро́шаны; 2. (*приглашённый*) запро́шаны.

ПОПРОЩА́ТЬСЯ *сов.* развіта́цца.

ПОПРЫГ||А́ТЬ *сов.* паскака́ць; **~ИВАТЬ** (зрэ́дку, час ад ча́су) скака́ць; паска́кваць; **~У́Н** *разг.* скаку́н, -на́ *м*; (*вертун*) вярту́н, -на́ *м*; (*непоседа*) непасе́да, -ды *м и ж*; **~У́НЬЯ** скаку́ха, -хі *ж*; вярту́ха, -хі *ж*; непасе́да, -ды *ж*; **~у́нья-стрекоза́** скаку́ха-страказа́.

ПОПРЫ́СК||АННЫЙ папы́рсканы; **~АТЬ** *сов.* папы́рскаць; **~АТЬСЯ** папы́рскацца.

ПОПРЯ́ТА||ННЫЙ пахава́ны; **~ТЬ** *сов.* пахава́ць; **~ТЬСЯ** пахава́цца.

ПО-ПТИ́ЧЬИ *нареч.* па-птушы́наму.

ПОПУГА́Й *прям., перен.* папуга́й, -га́я *м*; **~НИЧАТЬ** *несов. разг.* папуга́йнічаць, перайма́ць.

ПОПУГА́ТЬ *сов.* папужа́ць, папало́хаць.

ПОПУ́ДР||ЕННЫЙ папу́драны; **~ИТЬ** *сов.* папу́дрыць; **~ИТЬСЯ** папу́дрыцца.

ПОПУЛЯРИЗ||А́ТОР папулярыза́тар, -ра *м*; **~А́ЦИЯ** *в разн. знач.* папулярыза́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАННЫЙ** папулярызава́ны; **~О́ВАННЫЙ** папулярызава́ны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов.* папулярызава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** *страд.* папулярызава́цца.

ПОПУЛЯ́РН||О *нареч.* папуля́рна; **~ОСТЬ** папуля́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** папуля́рны.

ПОПУРРИ́ *муз.* папуры́ *нескл., ср.*

ПОПУСТИ́||ТЕ́ЛЬ патура́льнік, -ка *м*; **~ТЕЛЬНИЦА** патура́льніца, -цы *ж*; **~ТЕЛЬСКИЙ** патура́льніцкі; **~ТЕЛЬСТВО** патура́нне, -ння *ср, мн. нет*; **~ТЕЛЬСТВОВАТЬ** *несов.* патура́ць; **~ТЬ** *сов.* дазво́ліць, папусці́ць, папусці́цца.

ПОПУСТО́МУ, ПО́ПУСТУ *нареч. разг.* дарма́, дарэ́мна, ма́рна.

ПОПУ́ТАТЬ *сов.* 1. (*спутать*) паблы́таць; 2. *перен.* звесці́, спакусі́ць, падбі́ць; **~СЯ** паблы́тацца.

ПОПУ́ТНИЧЕ||СКИЙ спадаро́жніцкі; **~СТВО** спадаро́жніцтва, -ва *ср*.

ПОПУ́ТН||О *нареч.* за адны́м ра́зам, аднача́сна, мімахо́дам; **~ЫЙ** спадаро́жны; ◇ **~ый ве́тер** спадаро́жны ве́цер.

ПОПУ́ТЧИ||К *прям., перен.* спадаро́жнік, -ка *м*; **~ЦА** спадаро́жніца, -цы *ж*.

ПОПУЩЕ́НИЕ *уст.* (*попустительство*) патура́нне, -ння *ср*.

ПОПЫТА́ТЬ *сов.* 1. (*попробовать*) *разг.* паспрабава́ць, папрабава́ць; **п. сча́стья** паспрабава́ць шча́сця; (*поискать счастья*) пашука́ць шча́сця; 2. (*расспросить*) *простореч.* папыта́ць; 3. (*подвергнуть пытке*) пакатава́ць; **~СЯ** паспрабава́ць, папрабава́ць.

ПОПЫ́ТК||А спро́ба, -бы *ж*; **предпринима́ть ~и** рабі́ць спро́бы; (*пытаться*) спрабава́ць; ◇ **п. не пы́тка** *погов.* ≈ купі́ў не купі́ў, а патаргава́ць мо́жна.

ПОПЫ́ХИВАТЬ *несов. в разн. знач.* пы́хкаць; **п. тру́бкой** пы́хкаць лю́librкай.

ПОПЫХТЕ́ТЬ *сов. разг.* 1. папы́хкаць; (*от утомления*) пасапці́; 2. *перен.* папаце́ць.

ПОПЯ́Т||ИТЬ *сов.* пада́ць наза́д, адсу́нуць наза́д; **~ИТЬСЯ** пада́цца (наза́д, за́дам), адступі́ць, адысці́ (наза́д, за́дам); **~НЫЙ** адваро́тны (*обратный*); накірава́ны наза́д (*направленный назад*); ◇ **идти́ (пойти́) на ~ный (на ~ную), на ~ный двор** адступа́цца (адступі́цца), падава́цца (пада́цца) наза́д; адрака́цца (адрачы́ся); адмаўля́цца (адмо́віцца); біць (забі́ць) адбо́й.

ПО́РА по́ра, -ры *ж*; сітаві́на, -ны *ж*; **засоре́ние пор** забіва́нне пор.

ПОР||А́ I *ж* (*период*) пара́, -ры́ *ж*, час, *род.* ча́су *м*; **весе́нняя п.** веснава́я (вясе́нняя) пара́; веснавы́ (вясе́нні) час; **ночно́й ~о́й** у начну́ю пару́; у начны́ час, уначы́ (уно́чы, но́ччу); **п. обмоло́та** час (пара́) малацьбы́; **в ле́тнюю по́ру** у ле́тнюю пару́; у ле́тні час, уле́тку, ле́там; **ра́нняя п. чего́-либо** ра́нняя пара́ (ра́нні я часы́) чаго́-не́будзь; **до по́здней ~ы́** да по́зняй пары́ (по́зняга ча́су); ◇ **~о́й** паро́ю, ча́сам, часа́мі; **в ~е́** у ро́сквіце; **на пе́рвых ~а́х** спача́тку, у пе́ршы(я) час(ы́); **в ту по́ру** у той час, у ту́ю пару́; ■ **(об) э́ту по́ру** у гэ́тую пару́; у гэ́ты час; **до сих пор** а) (*до этого времени*) да гэ́тай пары́; да гэ́тага ча́су; б) (*до этого места*) дагэ́туль; **до тех пор** да той пары́; да таго́ ча́су; дату́ль; **до каки́х (кото́рых) пор?** да яко́га ча́су, да яко́й пары́, даку́ль?; **до ~ы́, до вре́мени** да пары́, да ча́су; **с тех пор** з той пары́; з тых часо́ў; **с той ~ы́** ■ той пары́, з таго́ ча́су; **с э́тих пор** ■ гэ́тай пары́, ■ гэ́тых часо́ў; **с э́той ~ы́** ■ гэ́тай пары́, з гэ́тага ча́су; **с каки́х (кото́рых) пор** з які́х часо́ў, з яко́й пары́; **с да́вних пор** здаўна́, з да́ўняй пары́, з да́ўніх часо́ў; ■ **(са́мую) по́ру** а) (*во время*) у час (у са́мы час), у пару́ (у са́мую пару́), своечасо́ва; б) (*по размеру*) якра́з, як па ме́рцы; **о сю по́ру** *уст.* да гэ́тага ча́су, дагэ́туль.

ПОРА́ II *сказ.* пара́, час; **п. обе́дать** пара́ (час) абе́даць; **п. домо́й** пара́ (час) дамо́ў (дадо́му).

ПОРАБО́ТАТЬ *сов.* папрацава́ць, парабі́ць.

ПОРАБО||ТИ́ТЕЛЬ *прям., перен.* занява́льнік, -ка *м*; (*угнетатель*) прыгнята́льнік, -ка *м*; **~ТИ́ТЕЛЬНИЦА** занява́льніца, -цы *ж*, прыгнята́льніца, -цы *ж*; **~ТИ́ТЬ** *сов. прям., перен.* заняво́ліць; прыгне́сці; **~ТИ́ТЬСЯ** заняво́ліцца; **~ЩА́ТЬ** *несов. прям., перен.* заняво́льваць; прыгнята́ць; **~ЩА́ТЬСЯ** 1. заняво́львацца; 2. *страд.* заняво́львацца; прыгнята́цца; *см.* **поработи́ть; ~ЩЕ́НИЕ** *ср* заняво́ленне, -ння *ср*, заняво́льванне, -ння *ср*; прыгнята́нне, -ння *ср*, прыгнёт, -ту *м, мн. нет*; **~ЩЁННЫЙ** заняво́лены, прыгне́чаны.

ПОРАВНЯ́ТЬ *сов.* параўнава́ць; **~СЯ** зраўнава́цца.

ПОРАДЕ́ТЬ *сов. уст.* (*кому-чему, о чём*) пару́піцца (*аб кім-чым*), падба́ць (*аб кім-чым*), паклапаці́цца (*аб кім-чым*), паспрыя́ць (*каму-чаму*), пастара́цца (*аб кім-чым*).

ПОРА́ДОВАТЬ *сов.* пара́даваць, пацэ́шыць; **~СЯ** пара́давацца, пацэ́шыцца.

ПОРАЖА́ТЬ *несов.* 1. (*наносить удар*) паража́ць; удара́ць; (*попадать во что-л.*) папада́ць (*у што*), трапля́ць (*у што*); 2. (*побеждать*) паража́ць, перамага́ць; (*разбивать*) разбіва́ць; 3. *мед.* пашко́джваць; разбіва́ць; (*слепотой, глухотой и т. п.*) тра́ціць зрок (слых *и т. п.*); 4. *перен.* (*производить сильное впечатление*) уража́ць; (*удивлять*) здзіўля́ць, дзіві́ць; 5. *юр.* пазбаўля́ць (*каго-чаго*); *см.* **порази́ть; ~СЯ** 1. дзіві́цца, здзіўля́цца; *см.* **порази́ться;** 2. *страд.* паража́цца; удара́цца; папада́цца, трапля́цца; перамага́цца; пашко́джвацца; разбіва́цца; уража́цца, здзіўля́цца, пазбаўля́цца; *см.* **поража́ть.**

ПОРАЖЕ́НЕЦ *полит.* паражэ́нец, -нца *м*.

ПОРАЖ||Е́НИЕ *ср* 1. (*действие*) паражэ́нне, -ння *ср*; папада́нне, -ння *ср*, трапля́нне, -ння *ср*; *см.* **поража́ть** 1; **~е́ние живы́х це́лей проти́вника** паражэ́нне жывы́х цэ́лей праціўніка (папада́нне ў жывы́я цэ́лі праціўніка); 2. (*разгром*) паражэ́нне, -ння *ср*; разгро́м, -му *м*; **потерпе́ть ~е́ние** пацярпе́ць паражэ́нне; **нанести́ ~е́ние врагу́**

нанéсці паражэ́нне вóрагу; 3. *мед.* пашкóджанне, -ння *ср*; **~éние зри́тельного нéрва** пашкóджанне зрóкавага нéрва; ◇ **~éние в правáх** *юр.* пазбаўлéнне праў; **~ЁННОСТЬ** *мед.* пашкóджанасць, -ці *ж*; **~ЁННЫЙ 1.** (*ударом*) паражаны; удáраны; 2. (*побеждённый*) паражóны, перамóжаны; (*разбитый*) разбíты; 3. *мед.* пашкóджаны; (*разбитый*) разбíты; 4. *перен.* урáжаны; (*удивлённый*) здзíўлены; 5. *юр.* пазбáўлены (*кого-чего*); **~ённый в правáх** пазбáўлены праў.

ПОРАЖÉНЧЕ||СКИЙ паражэ́нчы; **~СТВО** *полит.* паражэ́нства, -ва *ср*.

ПОРАЗВÉДАТЬ *сов. разг.* развéдаць, вы́ведаць.

ПОРАЗВЛÉЧЬ *сов. разг.* (трóхі) забáвіць, (трóхі) развесялíць; (трóхі) занЯць; *см.* **развлéчь; ~СЯ** (трóхі) пазабаўлЯцца, (трóхі) павесялíцца; (трóхі) развéяцца; *см.* **развлéчься.**

ПОРАЗИ́ТЕЛЬН||О *нареч.* на дзíва; (*чрезвычайно*) надзвычáйна; (*удивительно*) дзівóсна; дзíўна; **~ЫЙ** надзвычáйны (*чрезвычайный*); цудóўны (*восхитительный*); дзівóсны, дзíўны (*удивительный*); страшэ́нны (*приводящий в недоумение*).

ПОРАЗИ́ТЬ *сов.* 1. (*нанести удар*) паразíць; удáрыць; (*попасть*) папáсці (*у што*), трáпіць (*у што*); **п. пу́лей** паразíць кýляй; **п. нá смерть** паразíць на смерць; **п. грóмом** удáрыць грóмам; **п. цель** паразíць цэль (папáсці ў цэль); 2. (*победить*) паразíць, перамагчы́; (*разбить*) разбíць; **п. врагá** перамагчы́ вóрага; **п. неприя́тельские вóйска** разбíць варóжыя вóйскі; 3. *мед.* пашкóдзіць; (*разбить*) разбíць; (*поразить слепотой, глухотой и т. п.*) стрáціць зрок (слых *и т. п.*); **егó поразúл парали́ч** ягó разбíў парáліч; **егó поразúла слепотá** ён стрáціў зрок (аслéп, перастáў бáчыць); 4. *перен.* (*произвести сильное впечатление*) урáзіць; (*удивить*) здзівíць; **э́то извéстие меня́ поразúло** гэ́та вéстка мянé здзівíла; **э́то поразúло воображéние** гэ́та ўрáзіла ўяўлéнне; **п. до глубины́ души́** урáзіць да глыбíні душы́; 5. *юр.* пазбáвіць (*кого-чего*); **п. в правáх** пазбáвіць праў; **~СЯ** здзівíцца; **он поразúлся уви́денным** ён здзівíўся з убáчанага.

ПОРАЗМЫ́СЛИТЬ *сов. разг.* падýмаць (дóбра).

ПОРАЗМЯ́ТЬ *сов. разг.* (трóхі) размЯць; **~СЯ** (трóхі) размЯцца.

ПО-РÁЗНОМУ *нареч.* па-рóзнаму.

ПОРАЗНЮ́ХАТЬ *сов. просторен.* разнюхаць.

ПОРАЗУЗНÁТЬ *сов. разг.* развéдацца, дазнáцца, давéдацца.

ПОРАЙÓНН||О *нареч.* параённа; **~ЫЙ** параённы.

ПОРÁН||ЕННЫЙ парáнены, рáнены; **~ИТЬ** *сов.* парáніць, рáніць; **~ИТЬСЯ** *разг.* парáніцца.

ПОРÁНЬШЕ *сравн. ст. нареч.* (трóхі) ранéй; (*как можно раньше*) (як магá) ранéй; як найранéй.

ПОРАСКИ́||ДАННЫЙ параскíданы; **~ДÁТЬ** *сов. разг.* параскідáць; **~НУТЬ** *сов.* раскíнуць; **~НУТЬСЯ** раскíнуцца.

ПОРАССКАЗÁТЬ *сов. разг.* расказáць.

ПОРАССПРОСИ́ТЬ *сов. разг.* распытáць, распытáцца.

ПОРАСТÁТЬ *несов.* парастáць, парóстваць; (*зарастить*) зарастáць, зарóстваць.

ПОРАС||ТИ́ *сов.* 1. (*прибавить в росте*) парасцí; **э́та рассáда ещё ~тёт** гэ́та расáда яшчэ́ парасцé; 2. (*чем*) парасцí; (*зарасти*) зарасцí; **п. травóй** зарасцí травóй.

ПОРАСТРÉСКАТЬСЯ *сов. разг.* патрэ́скацца, палóпацца.

ПÓРВАННЫЙ 1. (*о бумаге, платье и т. п.*) падрáны, падзёрты; 2. (*о струне, верёвке и т. п.*) парвáны; 3. (*прекращённый*) парвáны.

ПОРВÁТЬ *сов.* 1. (*бумагу, платье и т. п.*) падрáць, падзéрці; 2. (*струну, верёвку и т. п.*) парвáць; 3. (*прекратить*) парвáць; разарвáць; *см.* **порывáть; ~СЯ 1.** падрáцца, падзéрціся; 2. парвáцца; 3. парвáцца; разарвáцца.

ПО-РЕБЯ́ЧЕСКИ *нареч.* 1. (*по-детски*) па-дзіцЯчаму; па-дзіцЯчы; 2. *перен.* па-дзяцíнаму.

ПОРЕВÉТЬ *сов.* параўцí.

ПОРЕВНОВÁТЬ *сов.* парáўнаваць.

ПОРЕДÉ||ВШИЙ, ~ЛЫЙ парадзéлы, парадчэ́лы; **~ТЬ** *сов.* парадзéць, парадчэ́ць.

ПОРÉЗ парэ́з, -зу *м*; **~АННЫЙ** парэ́заны; **~АТЬ** *сов.* 1. парэ́заць; 2. (*убить*) парэ́заць; (*свиней*) пакалóць; **~АТЬСЯ** парэ́зацца.

ПОРЕЗВИ́ТЬСЯ *сов.* пагулЯць; (*повеселиться*) павесялíцца; (*пошалить*) падурэ́ць.

ПОРÉЗНИК *бот.* парэ́знік, -ку *м*.

ПОРÉЙ *бот.* парэ́й, -рэ́ю *м*.

ПОРЕКОМЕНДОВÁТЬ *сов.* парэкамендавáць.

ПОРЕФÓРМЕННЫЙ парэфóрменны.

ПОРÉЧЬЕ *обл.* парэ́чча, -чча *ср*.

ПОРЕЩИ́ТЬ *сов. разг.* вы́рашыць.

ПОРЖÁВЕТЬ *сов. разг.* паржавéць; (*заржаветь*) заржавéць.

ПОРИСОВÁТЬ *сов.* парысавáць; (*красками*) памалявáць.

ПОРИСОВÁТЬСЯ *сов. разг.* парысавáцца, павыстаўлЯцца, папазíраваць.

ПÓРИСТ||ОСТЬ пóрыстасць, -ці *ж*; сітавáтасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** пóрысты; сітавáты.

ПОРИЦÁ||НИЕ *ср* ганьбавáнне, -ння *ср*; (*выговор*) вымóва, -вы *ж*; **общéственное п.** грамáдскае ганьбавáнне; **вы́разить п.** вы́несці ганьбавáнне; **~ТЕЛЬ** ганьбíцель, -ля *м*; **~ТЕЛЬНЫЙ** ганьбавáльны; **~ТЬ** *несов.* гáніць, гáньбіць, ганьбавáць; **~ТЬСЯ** *страд.* гáніцца, гáньбіцца, ганьбавáцца.

ПÓРКА I *ж* (*распарывание*) распóрванне, -ння *ср*, пóрка, -кі *ж*.

ПÓРКА II (*наказание*) лупцóўка, -кі *ж*.

ПОРНОГР||АФИ́ЧЕСКИЙ парнаграфíчны; **~ÁФИЯ** парнагрáфія, -фіі *ж*, *мн. нет*.

ПÓРОВН||У *нареч.* парóўну; **~Я́ТЬСЯ** *сов.* зраўнавáцца.

ПОРÓГ *в разн. знач.* парóг, -га *м*; **днепрóвские ~и** днЯпрóўскія парóгі; **п. сознáния** *психол.* парóг свядóмасці; **п. слы́шимости, слуховóй п.** *физл.* слыхавы́ парóг; **световóй п.** *физл.* светавы́ парóг; ◇ **стоя́ть на ~е смéрти** стаЯць на парóзе смéрці; **на п. не пускáть** *разг.* на парóг не пускáць; **обивáть ~и** *разг.* абівáць парóгі; **за п.** (*из дому*) *перен. разг.* за парóг; **не выходи́ть за п.** не выхóдзіць за парóг.

ПОРÓД||А *в разн. знач.* парóда, -ды *ж*; **~ИСТОСТЬ** парóдзістасць, -ці *ж*; **~ИСТЫЙ** парóдзісты.

ПОРОДИ́ТЬ *сов.* 1. (*родить*) *уст.* нарадзíць, спарадзíць; 2. *перен.* парадзíць, спарадзíць; (*вызвать*) вы́клікаць; (*причинить*) прычынíць; *см.* **порождáть.**

ПОРОДНИ́ТЬ *сов.* зраднíць, параднíць; **~СЯ** зраднíцца, параднíцца.

ПОРÓДН||ОСТЬ *с.-х.* парóднасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** парóдны.

ПОРОЖД||ÁТЬ *несов.* 1. (*рожать*) *уст.* нараджáць, спараджáць; 2. *перен.* параджáць, спараджáць; (*вызывать*) выклікáць; (*причинять*) прычынЯць; **п. недоразумéния** параджáць (выклікáць) непаразумéнні; **~ÁТЬСЯ 1.** нараджáцца, спараджáцца; 2. *перен.* параджáцца, спараджáцца; выклікáцца, прычыняцца; **~ÉНИЕ** параджэ́нне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ 1.** нарóджаны, спарóджаны; 2. *перен.* парóджаны, спарóджаны; вы́кліканы; прычы́нены; *см.* **породи́ть.**

ПОРÓЖИСТ||ОСТЬ парóжыстасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** парóжысты.

ПОРÓЖН||ИЙ *разг.* парóжні; ◇ **переливáть из пустóго в ~ее** *погов.* пералівáць з пустога ў парóжняе; **~Я́К** *ж.-д.* паражнЯк, -кý *м*; **~ЯКÓМ** *нареч.* паражнякóм, улéгцы.

ПÓРОЗНЬ *нареч.* паасóбку, паасóбна.

ПО́РОЗОВ *с.* По́разаў, -зава *м.*
ПОРОЗОВЕ́ТЬ *сов.* паружаве́ць.
ПО́РОЗОВСКИЙ РАЙО́Н По́разаўскі раён.
ПОРО́Й *нареч.* паро́ю, ча́сам, часа́мі.
ПОРО́К *м* **1.** (*изъян*) зага́на, -ны *ж*, ва́да, -ды *ж*; (*недостаток*) недахо́п, -пу *м*; **2.** (*разврат*) распу́ста, -ты *ж*; **погря́знуть в ~е** загра́знуць (увя́знуць) у распу́сце; ◇ **п. се́рдца** *мед.* паро́к сэ́рца; **бе́дность не п.** бе́днасць не зага́на.
ПОРОС||ЁНОК парася́, -ся́ці *ср*; **~И́ТЬСЯ** *несов.* пара́сіцца.
ПО́РОСЛЬ 1. (*побеги*) па́расткі, -каў, *ед.* па́растак, -тка *м*; па́сынкі, -каў, *ед.* па́сынак, -нка *м*; **2.** (*заросль*) па́раснік, -ку *м*, за́раснік, -ку *м*.
ПОРО́СЩИЙ *прил.* паро́слы.
ПОРОС||Я́ *обл.* парася́, -ся́ці *ср*; **~Я́ТИНА** *разг.* парася́ціна, -ны *ж*; **~Я́ТНИК** *с.-х.* парася́тнік, -ка *м*; **~Я́ЧИЙ** парася́чы.
ПО́РОТЫЙ I (*распоротый*) по́раты; распо́раты.
ПО́РОТЫЙ II (*высеченный*) *разг.* аддупцава́ны, вы́лупцаваны.
ПОРО́ТЬ I *несов.* (*распарывать*) паро́ць; распо́рваць; ◇ **п. чушь, вздор, дичь** вярзці́ лухту́; **п. горя́чку** паро́ць гара́чку.
ПОРО́ТЬ II *несов.* (*сечь*) лупцава́ць.
ПОРО́ТЬСЯ *несов.* (*распарываться*) паро́цца.
ПО́РОХ по́рах, -ху *м*, *мн. нет*; **безды́мный п.** безды́мны по́рах; ◇ **п. да́ром тра́тить** по́рах дарэ́мна тра́ціць; **~у не хвата́ет** по́раху не хапае; **он ~а не вы́думает** ён по́раху не вы́думае; **понюхать ~у** панюхаць по́раху; **держа́ть п. сухи́м** трыма́ць по́рах сухі́м; **~ом па́хнет** по́рахам па́хне; **~ОВНИ́ЦА** парахаўні́ца, -цы *ж*; ◇ **есть ещё по́рох в ~овни́цах** *перен.* ёсць яшчэ́ по́рах у парахаўні́цах; **~ОВО́Й** парахавы́; **~ово́й по́греб** парахавы́ склеп; **~ово́й заво́д** парахавы́ заво́д.
ПОРО́Ч||ЕНИЕ нясла́ўленне, -ння *ср*, знясла́ўленне, -ння *ср*, ганьбава́нне, -ння *ср*; **~ИТЬ** *несов.* нясла́віць, знеслаўля́ць, ганьбава́ць, га́ніць; **~ить хоро́шую рабо́ту** ганьбава́ць (га́ніць) до́брую рабо́ту; **~ить челове́ка** нясла́віць (знеслаўля́ць) чалаве́ка; **~НОСТЬ 1.** (*безнравственность*) распу́снасць, -ці *ж*; (*развращённость*) разбэ́шчанасць, -ці *ж*; (*испорченность*) сапсава́насць, -ці *ж*; (*позорность*) ганебнасць, -ці *ж*; **2.** *в др. знач.* зага́ннасць, -ці *ж*; ва́днасць, -ці *ж*; **~ность доказа́тельства** зага́ннасць до́казу; **~НЫЙ 1.** распу́сны; разбэ́шчаны; сапсава́ны; ганебны; **~ный хара́ктер** сапсава́ны (разбэ́шчаны, распу́сны) хара́ктар; **2.** *в др. знач.* зага́нны; ва́дны; **~ные ме́тоды** зага́нныя ме́тады; ◇ **~ный круг** зага́нны круг.
ПОРО́ША паро́ша, -шы *ж*.
ПОРОШИ́ТЬ *несов.* церушы́ць.
ПОРОШИ́ЦА *зоол.* парашы́ца, -цы *ж*.
ПОРОШКО́ВЫЙ парашко́вы.
ПОРОШКООБРА́ЗНЫЙ парашкападо́бны; парашкава́ты.
ПОРОШ||О́К парашо́к, -шка́ *м*; **зубно́й п.** зубны́ парашо́к; **лека́рство в ~ка́х** ляка́рства (ле́кі) у парашка́х; ◇ **растере́ть (стере́ть) в п.** *прям.*, *перен.* расце́рці (сце́рці) на парашо́к; **~О́ЧНЫЙ** парашко́вы.
ПОРО́Ю *нареч.* паро́ю, ча́сам.
ПОРСК *охот.* порск, *род.* по́рску *м*; **~А́НЬЕ** *охот.* по́рсканне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов. охот.* по́рскаць.
ПОРСКНУТЬ *сов. обл.* (*вспорхнуть*) пы́рхнуць.
ПОРСКНУ́ТЬ *сов. охот.* по́рскнуць.
ПОРТ порт, *род.* по́рта *м*, *мн.* по́рты, -таў; **войти́ в порт** увайсці́ ў порт; **есте́ственный порт** прыро́дны порт; **возду́шный порт** паве́траны порт, аэрапо́рт; **торго́вый порт** гандлёвы порт; **морско́й порт** марскі́ порт.
ПОРТ||А́Л *арх.*, *тех.* парта́л, -ла *м*; **~А́ЛЬНЫЙ** парта́льны; **~а́льный кран** *тех.* парта́льны кран.

ПОРТ-АРТУ́Р *г.* Порт-Арту́р, *род.* Порт-Арту́ра *м*.
ПОРТАТИ́ВН||ОСТЬ партаты́ўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** партаты́ўны.
ПОРТВЕ́ЙН партве́йн, -ну *м*.
ПО́РТЕР по́ртэр, -ру *м*; **~НАЯ** *сущ. уст.* по́ртэрная, -най *ж*; **~НЫЙ** по́ртэрны.
ПО́РТИК *арх.* по́рцік, -ка *м*.
ПО́РТИТЬ *несов. в разн. знач.* псава́ць; **п. желу́док** псава́ць жыво́т; **п. зре́ние** псава́ць во́чы (зрок); **п. аппети́т** псава́ць апеты́т; **п. настрое́ние кому́-либо** псава́ць настро́й каму́-не́будзь; **п. себе́ не́рвы** *разг.* псава́ць сабе́ не́рвы; **п. кровь** псава́ць кроў; **~СЯ** псава́цца.
ПОРТКИ́ *разг.* по́рткі, -так *ед. нет*.
ПОРТЛА́НД-ЦЕМЕ́НТ *стр.* партла́нд-цэме́нт, -ту *м*.
ПОРТМОНЕ́ *нескл.*, *ср* партмане́т, -та *м*.
ПОРТН||И́ХА шва́чка, -кі *ж*, краўчы́ха, -хі *ж*; **~О́ВСКИЙ** краве́цкі; **~о́вские но́жницы** краве́цкія но́жны; **~о́вская мастерска́я** краве́цкая майстэ́рня; **~О́Й** краве́ц, *род.* краўца́ *м*; **мужско́й ~о́й** мужчы́нскі краве́ц; **~Я́ЖИЙ** *уст.* краве́цкі; **~Я́ЖИТЬ**, **~Я́ЖНИЧАТЬ** *несов. разг.* займа́цца краўцо́ўствам; **~Я́ЖНИЧЕСТВО** краўцо́ўства, -ва *ср*, краве́цтва, -ва *ср*; **~Я́ЖНЫЙ** краўцо́ўскі, краве́цкі; ◇ **~я́жная мы́шца** *анат.* краўцо́ўская мы́шца.
ПО́РТО *торг.* по́рто *нескл.*, *ср*.
ПОРТОВИ́К *разг.* партаві́к, -ка́ *м*.
ПОРТО́ВЫЙ парто́вы; **п. го́род** парто́вы го́рад.
ПО́РТО-ФРА́НКО *эк.* по́рто-фра́нко *нескл.*, *ср*.
ПОРТПЛЕ́Д партпле́д, -да *м*; **~НЫЙ** партпле́дны, партпле́давы.
ПОРТРЕ́Т *в разн. знач.* партрэ́т, -та *м*; **п. во весь рост** партрэ́т на ўвесь рост; **поясно́й п.** паясны́ партрэ́т (партрэ́т у по́яс); **~И́СТ** партрэты́ст, -та *м*; **~И́СТКА** партрэты́стка, -кі *ж*; **~НЫЙ** партрэ́тны; **~ное схо́дство** партрэ́тнае падабе́нства; **~ная жи́вопись** партрэ́тны жы́вапіс.
ПОРТ-САИ́Д *г.* Порт-Саі́д, *род.* Порт-Саі́да *м*.
ПОРТСИГА́Р партсіга́р, -ра *м*.
ПО́РТСМУТ *г.* По́ртсмут, -та *м*.
ПОРТУГА́ЛЕЦ партуга́лец, -льца *м*.
ПОРТУГА́ЛИЯ Партуга́лія, -ліі *ж*.
ПОРТУГ||А́ЛКА партуга́лка, -кі *ж*; **~А́ЛЬСКИЙ** партуга́льскі.
ПОРТУЛА́К *бот.* партула́к, -ку *м*; **~ОВЫЕ** *мн. сущ.* партула́кавыя, -вых; **~ОВЫЙ** партула́кавы.
ПОРТУПЕ́ЙНЫЙ партупе́йны.
ПОРТУПЕ́Й-ПРА́ПОРЩИК *воен. ист.* партупе́й-пра́паршчык, *род.* партупе́й-пра́паршчыка *м*.
ПОРТУПЕ́Й-Ю́НКЕР *воен. ист.* партупе́й-ю́нкер, *род.* партупе́й-ю́нкера *м*.
ПОРТУПЕ́Я *воен.* партупе́я, -пе́і *ж*.
ПОРТФЕ́ЛЬ партфе́ль, -ля *м*; **мини́стр без портфе́ля** мі́ністр без партфе́ля; **~НЫЙ** партфе́льны.
ПОРТШЁЗ партшэ́з, -за *м*.
ПОРТЫ́ *разг.* по́рткі, -так *ед. нет*.
ПОТРЕПА́ТЬ *сов.* **1.** (*потрясти*) патрэ́сці; (*потормошить*) патармасі́ць, пакалашма́ціць; (*подёргать*) патузаць; (*волосы, гриву и т. п.*) пакудла́ціць; **2.** (*костюм, обувь и т. п.*) *разг.* падра́ць, падзе́рці (*порвать*); знасі́ць, пазно́шваць (*износить*); **3.** (*о лихорадке*) патрэ́сці; **4.** (*похлопать*) паля́паць; (*погладить*) пагла́дзіць; **5.** (*лён, шерсть и т. п.*) патрапа́ць; **6.** (*войска*) патрапа́ць, пашмата́ць; *см.* **трепа́ть.**

ПОТРЕПА́ТЬСЯ *сов.* (*износиться*) пазно́швацца, знасі́цца; (*порваться*) падра́цца, падзе́рціся.

ПОТРЕ́СКА||ВШИЙСЯ *прил.* патрэ́сканы; **~ТЬСЯ** *сов.* патрэ́скацца, пало́пацца.

ПОТРЕ́СКИВА||НИЕ патрэ́скванне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. разг.* патрэ́скваць.

ПОТРЕЩА́ТЬ *сов.* патрашча́ць.

ПОТРО́ГАТЬ *сов.* пачапа́ць, пакра́таць.

ПОТРОХА́ *ед. нет* вантро́бы, -баў, *ед.* вантро́ба, -бы *ж*; (*требуха*) трыбухі́, -хо́ў, *ед.* трыбу́х, -ха́ *м*; ◇ **со все́ми ~ми** *разг.* з усі́мі трыбуха́мі.

ПОТРОШ||Е́НИЕ патрашэ́нне, -ння *ср*; трыбушэ́нне, -ння *ср*; **~Ё́ННЫЙ** па́трашаны; **~И́ТЬ** *несов.* па́трашыць; трыбушы́ць.

ПОТРУДИ́ТЬСЯ *сов.* папрацава́ць; ◇ **потруди́тесь!** патурбу́йцеся!; (*будьте добры*) бу́дзьце ласка́вы, зрабі́це ла́ску.

ПОТРЯСА́ТЬ *несов.* **1.** (*трясти*) трэ́сці; (*размахивать*) маха́ць; (*оружием*) бра́згаць; **2.** (*колебать*) хіста́ць, узвару́шваць, узру́шваць; **п. во́здух** хіста́ць (узвару́шваць, узру́шваць) паве́тра; **3.** *перен.* узру́шваць; (*волновать*) хваля́ваць; (*поражать*) уража́ць; (*ошеломлять*) ашаламля́ць; **п. зри́телей** узру́шваць (хваля́ваць) гледачо́ў; **~СЯ** (*колебаться*) трэ́сціся.

ПОТРЯСА́ЮЩ||ИЙ *прил.* надзвыча́йны; (*ошеломляющий*) ашаламля́льны; (*яркий*) (надзвы́чай, надзвыча́йна) я́ркі; **~ая игра́** надзвыча́йная (надзвы́чай я́ркая) ігра́; **~ее впечатле́ние** надзвыча́йнае (ашаламля́льнае) ура́жанне; **~ие собы́тия** надзвыча́йныя (ашаламля́льныя) падзе́і.

ПОТРЯС||Е́НИЕ *ср* узрушэ́нне, -ння *ср*; (*волнение*) хваля́ванне, -ння *ср*; (*катастрофа*) катастро́фа, -фы *ж*; **не́рвное п.** нерво́вае ўзрушэ́нне; **~Ё́ННЫЙ 1.** пахі́снуты, узвару́шаны, узру́шаны; **2.** *перен.* узру́шаны; усхваля́ваны; ура́жаны; ашало́млены.

ПОТРЯС||ТИ́ *сов.* **1.** патрэ́сці; (*помахать*) памаха́ць; **2.** (*поколебать*) пахісну́ць, узварушы́ць, узру́шыць; **3.** *перен.* узру́шыць; (*взволновать*) усхваля́ваць; (*поразить*) ура́зіць; (*ошеломить*) ашалами́ць; **смерть его́ ~ла́ всех** смерць яго́ ўзру́шыла (ашалаlі́ла) усі́х; **~ТИ́СЬ** патрэ́сціся; (*содрогнуться*) страсяну́цца.

ПОТРЯ́ХИВАТЬ *несов.* патрэ́сваць, трэ́сці.

ПОТСДА́М Патсда́м, -ма *м.*

ПОТУ́ГИ *мн.* **1.** пату́гі, -гаў, *ед.* пату́га, -гі *ж*; (*усилия*) намага́нні, -нняў, *ед.* намага́нне, -ння *ср*; **2.** (*при родах*) пату́гі, -гаў, *ед.* пату́га, -гі *ж.*

ПОТУЖИ́ТЬ *сов. разг.* патужы́ць.

ПОТУ́ПИТЬ *сов.* апусці́ць, спусці́ць; **п. взгляд** апусці́ць во́чы.

ПОТУ́П||ИТЬСЯ *сов.* апусці́ць во́чы (*опустить глаза*); апусці́ць галаву́ (*опустить голову*); **~ившись** апусці́ўшы во́чы; апусці́ўшы галаву́; пану́рыўшыся; **~ЛЕННЫЙ** апу́шчаны, спу́шчаны; ∎ апу́шчанымі вачы́ма; з апу́шчанай галаво́й; *см.* **поту́пить; ~ЛЯ́ТЬ** *несов.* апушча́ць, спушча́ць.

ПО-ТУРЕ́ЦКИ *нареч.* па-турэ́цку.

ПОТУСКНЕ́||ВШИЙ, ~ЛЫЙ пацьмяне́лы; (*потемневший*) пацямне́лы; **~ТЬ** *сов.* **1.** пацьмяне́ць; **2.** *перен.* пацьмяне́ць; (*померкнуть*) пацямне́ць; пага́снуць.

ПОТУСТОРО́ННИЙ *рел.* тагасве́тны; (*загробный*) замагі́льны; (*не земной*) няземны; **п. мир** той свет.

ПОТУХА́||НИЕ патуха́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* патуха́ць.

ПОТУ́Х||НУТЬ *сов.* пату́хнуць; **~ШИЙ** пату́хлы.

ПОТУЧНЕ́ТЬ *сов. разг.* пасыце́ць, патлусце́ць, папаўне́ць, пагладчэ́ць.

ПОТУ́ШЕННЫЙ пату́шаны, пага́шаны.

ПОТУШИ́ТЬ I *сов.* (*погасить*) патушы́ць, пагасі́ць; **п. свечу́** патушы́ць свячу́.

ПОТУШИ́ТЬ II *сов. кул.* патушы́ць; **п. мя́со** патушы́ць мя́са.

ПО́ТЧЕВАТЬ *несов. разг.* частава́ць.

ПОТЫКА́ТЬ *сов.* паты́каць.

ПОТЯГА́ТЬСЯ *сов.* (*помериться силами*) пазмага́цца, паду́жацца; (*поспорить*) паспрача́цца.

ПОТЯГИВ||АНИЕ пацягванне, -ння *ср*; **~АТЬ** *несов.* пацягваць; **~АТЬСЯ** пацягвацца.

ПОТЯН||УТЫЙ пацягнуты, пацягнены; **~УТЬ** *сов. в разн. знач.* пацягнуць; **~ул ветерок** пацягнуў ветрык; **~уло домой** пацягнула дамоў; **~УТЬСЯ** пацягнуцца.

ПОУБАВ||ИТЬ *сов. разг.* **1.** (*уменьшить*) (трохі) адбавіць, (трохі) збавіць, (трохі) паменшыць; **2.** (*укоротить*) (трохі) пакараціць; ◇ **п. спеси кому-либо** трохі збіць пыху каму-небудзь; **~ЛЕННЫЙ 1.** (трохі) паменшаны; **2.** (трохі) пакарочаны.

ПОУГОМОНИТЬСЯ *сов. разг.* (трохі) уціхамірыцца; (трохі) супакоіцца; (трохі) суняцца.

ПО-УДАРНОМУ *нареч.* па-ударнаму.

ПОУДИТЬ *сов.* павудзіць.

ПОУЖИНАТЬ *сов.* павячэраць.

ПОУЛЕЧЬСЯ *сов.* **1.** (*лечь — о многих*) палегчы; **2.** *перен.* (трохі) улегчыся; **волны поулеглись** хвалі ўлягліся.

ПОУМЕ||РИТЬ *сов.* (трохі) зменшыць; (трохі) стрымаць, (трохі) суцішыць; **~рь свой пыл!** стрымай (трохі) свой запал!

ПОУМНЕТЬ *сов.* паразумнець.

ПОУПОРСТВОВАТЬ *сов.* паўпірацца.

ПОУПРАВИТЬСЯ *сов. разг.* управіцца.

ПОУПРЯМИТЬСЯ *сов.* паўпірацца, панатурыцца.

ПОУРОЧН||О *нареч.* ад урока; паўрочна; **~ЫЙ** паўрочны; ад урока; **~ая плата** плата ад урока.

ПОУСЕРДСТВОВАТЬ *сов.* пастарацца.

ПОУСПОКОИТЬСЯ *сов.* (трохі, патроху) супакоіцца; (трохі, патроху) заспакоіцца; (*немного, понемногу утихнуть*) (трохі, патроху) сцішыцца; (трохі, патроху) суняцца; (*немного, понемногу угомониться*) (трохі, патроху) уціхамірыцца.

ПОУТРУ *нареч.* раніцай, раніцой, ранкам, уранку (*утром*); зранку (*с утра*).

ПОУТЮЖИТЬ *сов.* папрасаваць.

ПОУХАЖИВАТЬ *сов.* **1.** (*присмотреть за больным, за детьми, за цветами и т. п.*) падаглядаць (*каго-што*); **2.** (*угождая*) падагаджаць (*каму-чаму*); **3.** (*услуживая за столом и т. п.*) паслужыць (*каму-чаму*); **4.** (*с любовными намерениями*) пазаляцацца.

ПОУЧАТЬ *несов.* вучыць, навучаць, павучаць; **~СЯ** вучыцца, навучацца, павучацца.

ПОУЧЕНИЕ *ср* навучанне, -ння *ср*, павучанне, -ння *ср*, навука, -кі *ж*.

ПОУЧИТЕЛЬН||О *нареч.* павучальна; **~ОСТЬ** павучальнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** павучальны, навучальны.

ПОУЧИТЬ *сов.* павучыць; **~СЯ** павучыцца.

ПОФАНТАЗИРОВАТЬ *сов.* пафантазіраваць.

ПОФИЛОСОФСТВОВАТЬ *сов.* пафіласофстваваць.

ПОФЛИРТОВАТЬ *сов.* пафліртаваць.

ПОФОРСИТЬ *сов. разг.* пафарсіць.

ПОФРАНТИТЬ *сов. разг.* пафранціць.

ПО-ФРАНЦУЗСКИ *нареч.* па-французску.

ПОФЫРК||АТЬ *сов.* пафыркаць; **~ИВАТЬ** *несов.* пафыркваць.

ПОХАБ||НИЧАТЬ *несов. простореч.* пахабнічаць; **~НЫЙ** пахабны; **~ЩИНА** *презр.* пахабшчына, -ны *ж*.

ПОХАЖИВАТЬ *несов. разг.* **1.** (*ходить не торопясь*) пахаджаць; **2.** (*приходить, навещать*) хадзіць, паходжваць; (*часто*) учашчаць.

ПОХАНДРИТЬ *сов.* пахандрыць.

ПОХАЯТЬ *сов. разг.* пaганіць; (*поругать*) палаяць.

ПОХВАЛ||А пахвала, -лы *ж*; **отозваться о ком-либо с ~ой** адазвацца аб кім-небудзь з пахвалой.

ПОХВАЛ||ЕННЫЙ пахвалены; **~ИВАТЬ** *несов. разг.* пахвальваць; **~ИТЬ** *сов.* пахваліць; **~ИТЬСЯ** пахваліцца; **~ЬБА** *ж разг. неодобр.* выхвалянне, -ння *ср*, пахвальба, -бы *ж*; **~ЬНО** *нареч.* пахвальна; **~ЬНЫЙ** пахвальны; **~ЯТЬСЯ** *несов. разг.* хваліцца; выхваляцца.

ПОХВАРЫВАТЬ *несов. разг.* хварэць, пахворваць.

ПОХВАСТАТЬ, ~СЯ *сов.* пахваліцца; **не могу ~ся** не магу пахваліцца.

ПОХВАТАТЬ *сов. разг.* пахапаць, пахватаць.

ПОХВОРАТЬ *сов.* пахварэць.

ПОХИТИТЕЛЬ злодзей, -дзея *м*, выкрадальнік, -ка *м*, крадзежнік, -ка *м*; **~НИЦА** зладзейка, -кі *ж*, выкрадальніца, -цы *ж*, крадзежніца, -цы *ж*.

ПОХИТИ||ТЬ *сов.* выкрасці, украсці; (*взять*) забраць; узяць; **п. документы** выкрасці (украсці) дакументы; **смерть ~ла его** смерць забрала яго.

ПОХИХИКАТЬ *сов.* пахіхікаць.

ПОХИЩ||АТЬ *несов.* выкрадаць, красці; (*брать*) забіраць, браць; *см.* **похитить; ~ЕНИЕ** *ср* выкраданне, -ння *ср*, крадзеж, -жу *м*.

ПОХИЩЕННЫЙ выкрадзены, украдзены; забраны, узяты; *см.* **похитить.**

ПОХЛЕБАТЬ *сов. разг.* пасёрбаць; (*полакать*) пахлябтаць.

ПОХЛЁБКА поліўка, -кі *ж*; (*мучная*) зацірка, -кі *ж*.

ПОХЛЕСТАТЬ *сов.* пахвастаць, пасцябаць.

ПОХЛЁСТЫВАТЬ *несов.* пахвостваць, пасцёбваць.

ПОХЛОПАТЬ *сов.* **1.** (*чем-л. твёрдым или по твёрдому*) паляпаць, пагрукаць; **2.** (*чем-л. мягким или по мягкому*) паляпаць; паляскаць (*преимущественно кнутом, по лицу и т. п.*); папляскаць (*преимущественно в ладоши, по воде и т. п.*); палопаць (*преимущественно крыльями, по плечу и т. п.*); *см.* **хлопать.**

ПОХЛОПОТАТЬ *сов.* **1.** (*позаботиться*) паклапаціцца; **п. о приятеле** паклапаціцца аб сябру; **2.** (*походатайствовать*) паклапатаць, пахадайнічаць; **п. об устройстве чего-либо** паклапатаць (пахадайнічаць) аб наладжванні чаго-небудзь; **3.** (*побыть в хлопотах*) пабыць у клопаце, займець клопату, пастарацца, паўвіхацца; *см.* **хлопотать.**

ПОХЛОПЫВА||НИЕ 1. паляпванне, -ння *ср*, пагрукванне, -ння *ср*; **2.** паляпванне, -ння *ср*; паляскванне, -ння *ср*; папляскванне, -ння *ср*; палопванне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* **1.** (*чем-л. твёрдым или по твёрдому*) паляпваць, пагрукваць; **2.** (*чем-л. мягким или по мягкому*) паляпваць; папляскваць (*преимущественно в ладоши, по воде и т. п.*); палопваць (*преимущественно крыльями, по плечу и т. п.*).

ПОХМЕЛЬЕ *ср* пахмелле, -лля *ср*; пахмелка, -кі *ж*; ◇ ■ **чужом пиру п.** *погов.* з чужога шалу галава крўціцца.

ПОХНЫКАТЬ *сов.* пахныкаць.

ПОХОД I паход, -ду *м*; **туристский п.** турысцкі паход; ◇ **крестовый п.** *ист.* крыжовы паход.

ПОХОД II (*излишек в весе*) *разг.* лішак, -шку *м*, гак, *род.* гаку *м*; **с ~ом** з гакам.

ПОХОДАТАЙСТВОВАТЬ *сов.* пахадайнічаць.

ПОХОДИТЬ I *сов.* (*к* **ходить**) пахадзіць.

ПОХОДИТЬ II *несов.* (*быть похожим*) быць падобным (*да каго-чаго, на каго-што*); **п. на брата** быць падобным да брата (на брата).

ПОХОДКА хада, -ды *ж*, паходка, -кі *ж*.

ПОХОДН||ЫЙ паходны; **~ая кухня** паходная кухня; **~ое снаряжение** *воен.* паходная амуніцыя, паходны рыштунак; **~ая форма** паходная форма; **~ая колонна** паходная калона.

ПОХОДЯ *нареч. разг.* **1.** (*на ходу*) на хаду; **закусывать п.** закусваць на хаду; **2.** (*попутно*) заадно, за адным заходам; (*мимоходом*) мімаходам, між іншым; **нельзя решать вопросы п.** нельга вырашаць пытанні мімаходам.

ПОХОЖДЕНИЕ *ср* прыгода, -ды *ж*.

ПОХОЖ||Е *вводн. сл. разг.* здаецца (*кажется*); нібы (*как-будто*); **~ИЙ** падобны (*да каго-чаго, на каго-што*);

п. на то, что... падобна на тое, што...; **это ни на что не п.** *разг.* гэта нікуды не варта; **~ий, как две капли воды** падобны, як дзве кроплі вады.

ПОХОЗЯЙНИЧАТЬ *сов.* пагаспадарыць.

ПО-ХОЗЯЙСКИ *нареч.* па-гаспадарску.

ПОХОЗЯЙСТВОВАТЬ *сов. разг.* пагаспадарыць.

ПОХОЛО||ДАНИЕ пахаладанне, -ння *ср*; **~ДАТЬ** *сов.* пахаладаць; **~ДЕТЬ** *сов.* пахаладзець; застыць.

ПОХОРОН||ЕННЫЙ, ~ЁННЫЙ *прям., перен.* пахаваны; **~ИТЬ** *сов. прям., перен.* пахаваць; **~НЫЙ** пахавальны.

ПОХОРОНЫ *ед. нет* пахаванне, -ння *ср, мн. нет.*

ПО-ХОРОШЕМУ *нареч.* па-добраму.

ПОХОРОШЕТЬ *сов.* папрыгажэць, пахарашэць.

ПОХОТЛИВ||О *нареч.* юрліва; пажадліва; **~ОСТЬ** юрлівасць, -ці *ж*; пажадлівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** юрлівы; (*чувственный*) пажадлівы.

ПОХОТНИК *анат.* клітар, -ра *м.*

ПОХОТЬ *ж* юр, *род.* юру *м.*

ПОХОХ||АТЫВАТЬ *несов. разг.* парагатваць; **~ОТАТЬ** *сов.* парагатаць.

ПОХРАБРИТЬСЯ *сов. разг.* пахрабрыцца.

ПОХРАМЫВАТЬ *несов.* пакульгваць, накульгваць.

ПОХРАПЕТЬ *сов.* пахрапці.

ПОХРАПЫВАТЬ *несов. разг.* (паціху, зрэдку, час-ад-часу) храпці.

ПОХРИПЕТЬ *сов.* пахрыпець.

ПОХРОМАТЬ *сов.* пакульгаць.

ПОХРУСТЕТЬ *сов.* пахрустаць, пахрабусцець, пахрабустаць, пахрумстаць.

ПОХРЮКАТЬ *сов.* парохкаць.

ПОХУ||ДАНИЕ *разг.* пахудзенне, -ння *ср*; **~ДЕВШИЙ** пахудзелы; **~ДЕТЬ** *сов.* пахудзець.

ПОХУЖЕ *сравн. ст.* **1.** *нареч.* (трохі) горш; (трохі) горай; (*как можно хуже*) (як мага) горш, як найгорш, (як мага) горай, як найгорай; **2.** *прил.* (трохі) горшы; (*хуже всего*) найгоршы.

ПОЦАРАПА||ННЫЙ (трохі) абдзёрты, (трохі) абадраны; паабдзіраны; **~ТЬ** *сов.* (трохі) абдзерці, (трохі) абадраць; (*во многих местах*) паабдзіраць; **~ТЬСЯ** (трохі) абдзерціся; (трохі) абадрацца; паабдзірацца.

ПОЦАРСТВОВАТЬ *сов.* **1.** (*побыть царём*) пацарстваваць, пацараваць; **2.** *перен.* (*погосподствовать*) папанаваць.

ПОЦЕДИТЬ *сов.* пацадзіць.

ПОЦЕЛ||ОВАТЬ *сов.* пацалаваць; **~ОВАТЬСЯ** пацалавацца; **~УЙ** пацалунак, -нку *м*; **запечатлеть ~уй** пацалаваць; **~УЙНЫЙ** пацалункавы; **~уйный обряд** *этн.* пацалункавы абрад.

ПОЦЕРЕМОНИТЬСЯ *сов.* пацырымоніцца.

ПОЧАВКАТЬ *сов.* пачмякаць, пачвякаць.

ПОЧАЕВАТЬ, ПОЧАЁВНИЧАТЬ *сов. разг.* папіць чаю, пачаяваць.

ПОЧАС||НО *нареч.* пагадзінна; па гадзінах; **~НЫЙ, ~ОВОЙ** пагадзінны; па гадзінах.

ПОЧАТОК 1. *бот.* катах, -ха *м*; **2.** (*о пряже*) пачынак, -нка *м.*

ПОЧАТЫЙ *уст.* пачаты.

ПОЧАТЬ *сов. уст.* пачаць.

ПОЧАЩЕ *нареч.* (трохі) часцей; (*как можно чаще*) (як мага) часцей, як найчасцей; **п. заходите** часцей заходзьце.

ПОЧВ||А *ж* **1.** глеба, -бы *ж*; **2.** *перен.* глеба, -бы *ж*, грунт, *род.* грунту *м*; (*основание*) падстава, -вы *ж*; ◇ **на ~е чего** на глебе (грунце) чаго; **подготовить ~у для чего** падрыхтаваць глебу (грунт) для чаго; **не терять ~ы под ногами** не губляць грунту (глебы) пад нагамі; **стоять на твёрдой ~е** стаяць на цвёрдай глебе (на цвёрдым грунце); **выбить ~у из-под ног** выбіць глебу (грунт) з-пад ног; **нащупывать (зондировать) ~у** намацваць (зандзіраваць) глебу (грунт).

ПОЧВАНИТЬСЯ *сов. разг.* пазадавацца, пафанабэрыцца.

ПОЧВЕНН||ЫЙ глебавы; **~ые воды** глебавыя воды.

ПОЧВОВЕД глебазнавец, -наўца *м*; **~ЕНИЕ** глебазнаўства, -ва *ср*; **~ЧЕСКИЙ** глебазнаўчы.

ПОЧВОЗАЩИТНЫЙ *с.-х.* глебаахоўны.

ПОЧВООБРАБАТЫВАЮЩИЙ *с.-х.* глебаапрацоўчы.

ПОЧВООБРАЗОВАНИЕ глебаўтварэнне, -ння *ср.*

ПОЧВОУГЛУБИТЕЛЬ *с.-х.* глебапаглыбнік, -ка *м*; **~НЫЙ** глебапаглыбны.

ПОЧВОУТОМЛЕНИЕ *с.-х.* глебастамленне, -ння *ср.*

ПО-ЧЕЛОВЕЧЕСКИ *нареч.* па-чалавечы.

ПОЧЁМ *нареч. разг.* **1.** (*по какой цене*) пачым; **2.** (*на основании чего-л.*) адкуль; **п. я знаю** адкуль я ведаю; **п. знать** хто ведае.

ПОЧЕМУ *нареч.* чаму.

ПОЧЕМУ-ЛИБО *нареч.* чаму-небудзь.

ПОЧЕМУ-НИБУДЬ *нареч.* чаму-небудзь.

ПОЧЕМУ-ТО *нареч.* чамусьці, чамусь.

ПОЧЕРК почырк, -ка *м.*

ПОЧЁРКАТЬ, ПОЧЕРКАТЬ *сов.* пакрэсліць, пакасаваць.

ПОЧЕР||НЕВШИЙ, ~НЕЛЫЙ пачарнелы, счарнелы; **~НЕНИЕ** пачарненне, -ння *ср*; **~НЕТЬ** *сов.* пачарнець, счарнець; **~НИТЬ** *сов.* пачарніць.

ПОЧЕРП||АТЬ *сов.* пачэрпаць; **~АТЬ** *несов.* чэрпаць; (*брать*) браць; **~НУТЫЙ** пачэрпнуты; (*взятый*) узяты; **~НУТЬ** *сов.* **1.** (*зачерпнуть*) *разг.* зачэрпаць; **2.** *перен.* пачарпнуць; (*взять*) узяць.

ПОЧЕРСТВЕ||ВШИЙ, ~ЛЫЙ пачарствелы; **~ТЬ** *сов. прям., перен.* пачарствець.

ПОЧЕРТИТЬ *сов.* **1.** пачарціць; **2.** (*по чему*) паправодзіць рысы, пакрэсліць; (*рукою в воздухе*) павадзіць.

ПОЧЕСАТЬ *сов.* **1.** (*поскрести*) пачухаць; **п. ногу** пачухаць нагу; **2.** (*лён, волосы*) пачасаць; **~СЯ 1.** пачухацца; **2.** (*позудеть*) *безл.* пасвярбець.

ПОЧЕС||ТЬ *ж* ушанаванне, -ння *ср*; (*почёт*) пашана, -ны *ж*; (*уважение*) павага, -гі *ж*; **военные ~ти** ваенныя ўшанаванні; **воздавать ~ти** ушаноўваць, аддаваць пашану.

ПОЧЕСТЬ *сов.* палічыць; (*признать*) прызнаць.

ПОЧЕСУХА *ж мед.* сверб, *род.* свербу *м.*

ПОЧЁСЫВАТЬ *несов.* пачухваць; **~СЯ** чухацца.

ПОЧЁТ *м* пашана, -ны *ж, мн. нет*; (*уважение*) павага, -гі *ж, мн. нет*; (*почитание*) шанаванне, -ння *ср*; (*честь*) гонар, -ру *м*; **быть в ~е** быць у пашане; **пользоваться ~ом** карыстацца пашанай; **оказывать п.** выказваць пашану; **орден «Знак почёта»** ордэн «Знак пашаны»; ◇ **п. и уважение!** *разг.* пашана і павага!; (*в знач.: «моё почтение»*) маё шанаванне; **~НОСТЬ 1.** ганаровасць, -ці *ж*; **~ность звания** ганаровасць звання; *см.* **почётный** 2; **2.** пачэснасць, -ці *ж*; **~ность предложения** пачэснасць прапановы; **~ность положения** пачэснасць становішча; *см.* **почётный** 3; **~НЫЙ 1.** (*пользующийся почётом*) пачэсны; (*почтенный*) шаноўны; (*уважаемый*) паважаны; **~ный гость** пачэсны госць; **2.** (*избираемый в знак почёта, являющийся выражением почёта*) ганаровы; **~ный академик** ганаровы акадэмік; **~ное звание** ганаровае званне; **~ный президиум** ганаровы прэзідыум; **~ный караул** ганаровая варта; **~ная грамота** ганаровая грамата; **3.** (*делающий честь*) пачэсны; **~ное предложение** пачэсная прапанова; **~ный мир** пачэсны мір.

ПОЧЕЧНЫЙ I *бот.* пупышкавы.

ПОЧЕЧНЫЙ II *анат.* ныркавы.

ПОЧЕЧУЙ *мед. уст.* гемарой, -рою *м*; **~НИК** *бот.* драсён звычайны; **~НЫЙ** *мед. уст.* гемаройны.

ПОЧИВА́||ЛЬНЯ *уст.* спачыва́льня, -ні *ж*; **~ТЬ** *несов. уст.* адпачыва́ць, спачыва́ць.
ПОЧИ́ВШИЙ *уст. сущ.* нябо́жчык, -ка *м.*
ПОЧИ́Н пачы́н, -ну *м, мн. нет.*
ПОЧИ́НЕННЫЙ, ПОЧИНЁННЫЙ папра́ўлены; адрамантава́ны.
ПОЧИНИ́ТЬ *сов.* папра́віць, адрамантава́ць; парапарава́ць; (*положить заплаты*) пала́таць.
ПОЧИ́НК||А *ж* папра́ўка, -кі *ж*; рамо́нт, -ту *м*; **отда́ть в ~у** адда́ць папра́віць (у папра́ўку, у рамо́нт).
ПОЧИ́Н||ОЧНЫЙ рамо́нтны; **~очная мастерска́я** рамо́нтная майстэ́рня; **~ЩИК** папра́ўшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** папра́ўшчыца, -цы *ж*; **~Я́ТЬ** *несов.* папраўля́ць, пра́віць; рамантава́ць; рапарава́ць; (*накладывать заплаты*) ла́таць; **~Я́ТЬСЯ** *несов. страд.* папраўля́цца, пра́віцца; рамантава́цца; рапарава́цца; ла́тацца.
ПОЧИРИ́КАТЬ *сов.* пацыры́каць, пацвы́ркаць.
ПОЧИ́СТИТЬ *сов. в разн. знач.* пачы́сціць; **~СЯ** пачы́сціцца.
ПОЧИТА́Й *нареч. обл.* **1.** (*почти*) ама́ль (што); **почита́й что год прошёл** ама́ль што год прайшо́ў; **2.** (*пожалуй*) бада́й; (*вероятно*) напэ́ўна; **он, почита́й, здесь и не быва́л** ён, бада́й (напэ́ўна), тут і не быва́ў.
ПОЧИТА́||НИЕ шанава́нне, -ння *ср*, паважа́нне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬ** пакло́ннік, -ка *м* (*поклонник*); прыхі́льнік, -ка *м* (*сторонник*); **~ТЕЛЬНИЦА** пакло́нніца, -цы *ж*; прыхі́льніца, -цы *ж.*
ПОЧИТА́ТЬ I *сов.* (*к* **чита́ть**) пачыта́ць.
ПОЧИТА́ТЬ II *несов.* (*уважать*) шанава́ць; паважа́ць.
ПОЧИТА́ТЬ III *несов.* (*считать*) лічы́ць; (*признавать*) прызнава́ць; **п. свои́м до́лгом** лічы́ць сваі́м абавя́зкам.
ПОЧИТА́ТЬСЯ I *несов. страд.* (*уважаться*) шанава́цца; паважа́цца.
ПОЧИТА́ТЬСЯ II *несов.* (*считаться*) лічы́цца.
ПОЧИ́ТЫВАТЬ *несов. разг.* пачы́тваць.
ПОЧИ́ТЬ *сов. уст.* спачы́ць; ◇ **п. на ла́врах** спачы́ць на ла́ўрах.
ПОЧИ́ЩЕ *сравн. ст.* **1.** *нареч.* (тро́хі) чысце́й; (*как можно чище*) (як мага́) чысце́й, як найчысце́й; **почи́ще вытира́й** чысце́й выціра́й; **2.** *прил.* (тро́хі) чысце́йшы; (*чище всего*) найчысце́йшы; **голубо́й таз почи́ще** блакі́тны таз чысце́йшы.
ПОЧИ́ЩЕННЫЙ пачы́шчаны.
ПО́ЧКА I **1.** *бот.* пупы́шка, -кі *ж*; **2.** *зоол.* по́чка, -кі *ж.*
ПО́ЧКА II *анат.* ны́рка, -кі *ж*; **блужда́ющая по́чка** *мед.* блука́ючая ны́рка.
ПОЧКОВА́||НИЕ *биол.* пачкава́нне, -ння *ср*; **~ТЬСЯ** *несов. биол.* пачкава́цца.
ПОЧКОВИ́ДНЫЙ ныркападо́бны.
ПОЧКОЕ́Д *зоол.* пупышкае́д, -да *м.*
ПОЧМО́К||АТЬ *сов.* пацмо́каць; **~ИВАТЬ** *несов.* пацмо́кваць.
ПО́ЧТ||А *в разн. знач.* по́шта, -ты *ж*; **посла́ть по ~е** пасла́ць па по́шце; **разноси́ть ~у** разно́сіць по́шту; **~АЛЬО́Н** паштальён, -на *м*; **~А́МТ** пашта́мт, -та *м*; **~А́МТСКИЙ** пашта́мцкі.
ПОЧТЕ́Н||ИЕ *ср* паша́на, -ны *ж, мн. нет*; (*уважение*) пава́га, -гі *ж, мн. нет*; ◇ **моё ~ие!** *разг.* маё шанава́нне!; **~НЫЙ** **1.** (*внушающий почтение, заслуживающий почтения*) пава́жны; (*уважаемый*) шано́ўны, паважа́ны; **~ный во́зраст** пава́жны ўзрост; **~ный челове́к** пава́жны (паважа́ны, шано́ўны) чалаве́к; **~ная нару́жность** пава́жны (во́нкавы) вы́гляд; **подойди́, ~ный!** *фам.* падыдзі́, шано́ўны!; **2.** (*большой*) *разг.* пава́жны; (*значительный*) ла́дны, немалы́, зна́чны; **статья́ ~ных разме́ров** арты́кул пава́жных (зна́чных) паме́раў.
ПОЧТИ́ *нареч.* ама́ль, траха́; ◇ **п. что** ама́ль што.
ПОЧТИ́ТЕЛЬН||О *нареч.* пачці́ва; (*с почтением*) з паша́най, з пава́гай; **~ОСТЬ** пачці́васць, -ці *ж*; паша́на, -ны *ж*, пава́га, -гі *ж*; **~ЫЙ** **1.** (*выражающий почтение*) пачці́вы; **2.** (*большой*) пава́жны; (*значительный*) ла́дны, немалы́, зна́чны; **~ое расстоя́ние** пава́жная адле́гласць.
ПОЧТИ́ТЬ *сов.* ушанава́ць; **п. па́мять** ушанава́ць па́мяць.
ПОЧТМЕ́ЙСТЕР *уст.* поштма́йстар, -тра *м*; **~СКИЙ** поштма́йстарскі; **~ША** поштма́йстарыха, -хі *ж.*
ПОЧТО́ *нареч. уст.* нашто́.
ПОЧТО́ВО-ТЕЛЕГРА́ФНЫЙ пашто́ва-тэлеграфны.
ПОЧТО́В||ЫЙ пашто́вы; **~ая ма́рка** пашто́вая ма́рка; **~ая ка́рточка** пашто́ўка; **п. перево́д** пашто́вы перавод; **п. я́щик** пашто́вая скры́нка; ◇ **е́хать, как на ~ых** *уст.* е́хаць, як на пашто́вых.
ПОЧУ́ВСТВОВАТЬ *сов.* адчу́ць; пачу́ць; **~СЯ** адчу́цца; пачу́цца.
ПОЧУД||А́ЧИТЬ, ~И́ТЬ *сов.* падзіва́чыць.
ПОЧУ́ДИ||ТЬСЯ *сов.* зда́цца, пада́цца; (*показаться*) паказа́цца; **~лись шаги́** здало́ся, што чува́ць кро́кі.
ПОЧУ́ЯТЬ *сов.* счуць, учу́ць, пачу́ць.
ПОШАБА́ШИТЬ *сов. разг.* пашаба́шыць.
ПОШАГА́ТЬ *сов.* пакро́чыць; (*походить*) патупаць, пахадзі́ць; (*пойти*) пайсці́.
ПОША́Л||ИВАТЬ *несов.* **1.** (*шалить время от времени*) (тро́хі, ча́сам, зрэ́дку, час-ад-ча́су) дурэ́ць; (*забавляться*) (тро́хі, зрэ́дку, ча́сам) забаўля́цца; **2.** *перен.* (*побаливать, действовать неисправно*) *разг.* пабо́льваць; **3.** *перен.* (*бесчинствовать*) *простореч.* сваво́ліць, гарэ́заваць; (*грабить*) гра́біць; **~И́ТЬ** *сов.* **1.** (*порезвиться*) падурэ́ць; (*позабавиться*) пазабаўля́цца; **2.** (*легкомысленно поиграть с кем-чем-л.*) пажартава́ць; *см.* **шали́ть** 1, 2.
ПОША́МКАТЬ *сов. разг.* паша́мкаць.
ПОША́РИТЬ *сов.* пашна́рыць, пашука́ць; (*пощупать*) пама́цаць.
ПОША́РКАТЬ *сов.* паша́ркаць, пашо́ргаць.
ПОШАТ||А́ТЬ *сов.* пахіста́ць; **~А́ТЬСЯ** **1.** пахіста́цца, паківа́цца, пакалыва́цца; **2.** (*побродить без дела*) *разг.* пабадзя́цца, паблука́ць; **~НУ́ТЬ** *сов. прям., перен.* пахіснýць; **~НУ́ТЬСЯ** пахісну́цца.
ПОША́ТЫВА||НИЕ хіста́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* (патро́ху, зрэ́дку, час-ад-ча́су) хіста́ць; **~ТЬСЯ** (тро́хі, зрэ́дку, час-ад-ча́су) хіста́цца.
ПОШВЫРЯ́ТЬ *сов.* пашпурля́ць, пакі́даць.
ПОШЕВЕ́Л||ИВАТЬ *несов. разг.* паварýшваць, пашаве́льваць; **~ивай!** (*трогай*) варушы́ся!, ру́хай!; **~ИВАТЬСЯ** *разг.* паварýшвацца, варушы́цца, пашаве́львацца, шавялі́цца; **~ивайся!** (*поторапливайся*) варушы́ся!
ПОШЕВЕ||ЛИ́ТЬ *сов.* паварушы́ць, пашавялі́ць; **~ЛИ́ТЬСЯ** паварушы́цца, пашавялі́цца; **~ЛЬНУ́ТЬ** *сов. разг.* паварухну́ць, пашавяльну́ць; ◇ **па́льцем не ~льну́ть** па́льцам не паварушы́ць; **~ЛЬНУ́ТЬСЯ** паварухну́цца, пашавяльну́цца.
ПО́ШЕВНИ *обл.* разва́лкі, -лак *ед. нет*, разва́лы, -вал *ед. нет.*
ПОШЕПТА́ТЬ *сов.* пашапта́ць; **~СЯ** пашапта́цца.
ПОШЕХО́Н||ЕЦ *уст.* пашахо́нец, -нца *м*; **~СКИЙ** пашахо́нскі; **~ЬЕ** *уст.* пашахо́нне, -ння *ср.*
ПОШИ́Б *м неодобр.* (*манера*) *разг.* мане́р, -ру *м*; **одного́ ~а** на адзі́н мане́р, на адзі́н капы́л.
ПОШИ́В *м*, **~КА** *ж* пашы́ўка, -кі *ж*; **~ОЧНАЯ** *сущ.* пашы́вачная, -най *ж*; **~ОЧНЫЙ** пашы́вачны; **~ЩИК** пашы́ўшчык, -ка *м*; (*портной*) краве́ц, *род.* краўца́ *м*; **~ЩИЦА** пашы́ўшчыца, -цы *ж*; шва́чка, -кі *ж*; краўчы́ха, -хі *ж.*
ПОШИ́||ТЫЙ пашы́ты; **~ТЬ** *сов. в разн. знач.* пашы́ць; **~ть два часа́** пашы́ць дзве гадзі́ны; **~ть пиджа́к** пашы́ць пінжа́к.
ПОШЛЁПАТЬ *сов.* пашлёпаць.
ПОШЛЕ́ТЬ *несов.* пашле́ць.
ПО́ШЛИН||А *эк.* по́шліна, -ны *ж*; **~НЫЙ** по́шлінны.

ПО́ШЛ||О *нареч.* по́шла; **~ОСТЬ** *в разн. знач.* по́шласць, -ці *ж*; **~ЫЙ** по́шлы; **~Я́К** *презр.* пашля́к, -ка́ *м*; **~Я́ТИНА** *разг. презр.* пашля́ціна, -ны *ж*.

ПОШЛЯ́ТЬСЯ *сов. простореч.* пабадзя́цца, пашвэ́ндацца.

ПОШЛЯ́ЧКА *презр.* пашля́чка, -кі *ж*.

ПОШТО́ПАТЬ *сов.* пацырава́ць.

ПОШТУКАТУ́РИТЬ *сов.* патынкава́ць.

ПОШТУ́ЧН||О *нареч.* пашту́чна, ад шту́кі; **~ЫЙ** пашту́чны.

ПОШУМЕ́ТЬ *сов.* пашуме́ць; (*поговорить*) пагавары́ць; (*о громком разговоре*) пагамані́ць; (*покричать*) пакрыча́ць.

ПОШУТИ́ТЬ *сов.* **1.** пажартава́ць; **2.** (*понасмехаться над кем-чем*) пажартава́ць (*з каго-чаго*), папаке́пліваць (*з каго-чаго*); (*зло*) пакпі́ць (*з каго-чаго*).

ПОШУ́ЧИВАТЬ *несов.* (злёгку, часа́мі, зрэ́дку, час-ад-ча́су) жартава́ць.

ПОЩА́||ДА лі́тасць, -ці *ж, мн. нет*; **проси́ть ~ды** прасі́ць лі́тасці; **~ДИ́ТЬ** *сов.* **1.** (*дать пощаду*) даць лі́тасць (*каму-чаму*); (*пожалеть*) пашкадава́ць (*каго-што, чаго*); (*помиловать*) памі́лаваць (*каго-што*), злі́тавацца (*над кім-чым*); **~ди́ меня́** злі́туйся нада мно́ю, пашкаду́й мяне́; **2.** (*поберечь*) паберагчы́, паашчаджа́ць; (*пожалеть*) пашкадава́ць (*каго-што, чаго*); (*отнестись бережно, заботливо*) пашанава́ць; (*сохранить*) захава́ць; **~ди́ своё здоро́вье** пашану́й сваё здаро́ўе, пашкаду́й свайго́ здаро́ўя; **жи́зни не ~жу́** жыцця́ не пашкаду́ю; **~ди́ть чью-либо жизнь** захава́ць чыё-не́будзь жыццё.

ПОЩЕГОЛЯ́ТЬ *сов. прям., перен.* пафранці́ць, пафарсі́ць; (*похвастаться*) павыхваля́цца.

ПОЩЕКОТА́ТЬ *сов. прям., перен.* пашчыката́ць, пакавыта́ць, паласката́ць.

ПОЩЁЛКАТЬ *сов.* **1.** (*надавать щелчков*) папстры́каць; **2.** (*произвести щёлкающие звуки*) пацмо́каць.

ПОЩЕЛКА́ТЬ *сов. разг.* надава́ць пстры́чак; (*поколотить*) пабі́ць, набі́ць.

ПОЩЁЛКИВАТЬ *несов.* **1.** (*время от времени щёлкать по чему-л.*) ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) пстры́каць; **2.** (*производить время от времени щёлкающие звуки*) ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) пстры́каць (*пальцами*); ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) ля́скаць, паля́скваць (*кнутом, зубами*); ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) шчо́ўкаць, пашчо́ўкваць (*пружиной, замком*); ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) цмо́каць, пацмо́кваць (*языком*); ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) цо́каць (*шпорами, каблуками*); **3.** (*грызть изредка орехи и т. п.*) ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) лу́скаць, ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) лузаць, палу́зваць; **4.** (*о некоторых птицах — петь изредка*) ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) цёхкаць, ча́сам (калі́-ні-калі́, зрэ́дку) шчо́ўкаць.

ПОЩЕПА́ТЬ *сов.* пашчапа́ць.

ПОЩЁЧИНА *ж* **1.** аплявуха, -хі *ж*, по́ўха, -хі *ж*; **2.** *перен.* аплявуха, -хі *ж*; (*удар*) уда́р, -ру *м*; (*оскорбление*) знява́га, -гі *ж*; **нра́вственная п.** мара́льная аплявуха (мара́льны ўдар).

ПОЩИ́П||АННЫЙ *разг.* пашчы́паны; паску́бены; **~А́ТЬ** *сов.* пашчыпа́ць; (*о перьях, волосах, траве и т. п.*) паскубці́; **~ЫВАТЬ** *несов.* пашчы́пваць; паску́бваць.

ПОЩУ́П||АТЬ *сов.* пама́цаць; **~ЫВАТЬ** *несов.* пама́цваць.

ПОЩУ́РИТЬ *сов.* пажму́рыць; **~СЯ** пажму́рыцца.

ПОЭ́ЗИЯ паэ́зія, -зіі *ж, мн. нет*.

ПОЭКЗАМЕНОВА́ТЬ *сов.* паэкзаменава́ць; **~СЯ** паэкзаменава́цца.

ПОЭ́МА *лит.* паэ́ма, -мы *ж*.

ПОЭСКАДРО́НН||О *нареч.* паэскадро́нна; **~ЫЙ** *воен.* паэскадро́нны.

ПОЭ́Т паэ́т, -та *м*; **~Е́ССА** паэтэ́са, -сы *ж*; паэ́тка, -кі *ж*; **~ИЗИ́РОВАННЫЙ** паэтызава́ны; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* паэтызава́ць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** паэтызава́цца; **~ИКА** паэ́тыка, -кі *ж*; **~И́ЧЕСКИ** *нареч.* паэты́чна; **~И́ЧЕСКИЙ** паэты́чны; **~И́ЧНО** *нареч.* паэты́чна; **~И́ЧНОСТЬ** паэты́чнасць, -ці *ж*; **~И́ЧНЫЙ** паэты́чны.

ПОЭ́ТОМУ *нареч.* таму́, дзе́ля таго́; (*следовательно*) *разг.* зна́чыць, выхо́дзіць.

ПОЯВ||И́ТЬСЯ *сов.* з'яві́цца; **~ЛЕ́НИЕ** з'яўле́нне, -ння *ср*; **~ЛЯ́ТЬСЯ** *несов.* з'яўля́цца.

ПОЯ́Р||КОВЫЙ пая́ркавы; **~ОК** пая́рак, -рку *м*.

ПО́ЯС *в разн. знач.* по́яс, -са *м*; **спаса́тельный п.** ратава́льны по́яс; **жа́ркий п.** *геогр.* гара́чы по́яс.

ПОЯСН||Е́НИЕ тлумачэ́нне, -ння *ср*; **~Ё́ННЫЙ** растлума́чаны; **~И́ТЕЛЬ** тлумача́льнік, -ка *м*; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** тлумача́льны; **~и́тельные слова́** *грам.* тлумача́льныя сло́вы; **~И́ТЬ** *сов.* растлума́чыць.

ПОЯС||НИ́ЦА паясні́ца, -цы *ж*; **~НИ́ЧНЫЙ** паясні́чны; **~НО́Й** *прям., перен.* паясны́.

ПОЯСНЯ́ТЬ *несов.* тлума́чыць; **~СЯ** *страд.* тлума́чыцца.

ПОЯСО́К *уменьш. в разн. знач.* паясо́к, -ска́ *м*.

ПРАБА́Б||КА, ~УШКА праба́бка, -кі *ж*.

ПРА́ВАЯ *сущ. полит.* пра́вая, -вай *ж*.

ПРА́ВД||А *в разн. знач.* пра́ўда, -ды *ж, мн. нет*; **~И́ВО** *нареч.* праўдзі́ва; **~И́ВОСТЬ** праўдзі́васць, -ці *ж, мн. нет*; **~И́ВЫЙ** праўдзі́вы; **~И́СТ** *ист.* праўдзі́ст, -та *м*.

ПРАВДОИСКА́ТЕЛЬ *уст.* шука́льнік пра́ўды.

ПРАВДО||ЛЮБИ́ВЫЙ праўдалюбі́вы, праўдалю́бны; **~ЛЮ́БИЕ** *уст.* праўдалю́бства, -ва *ср, мн. нет.*

ПРАВДОПОДО́Б||ИЕ *ср* праўдападо́бнасць, -ці *ж*; **~НО** *нареч.* праўдападо́бна; **~НОСТЬ** праўдападо́бнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** праўдападо́бны.

ПРА́ВЕДН||ИК *уст.* пра́веднік, -ка *м*; **~ИЦА** пра́ведніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** пра́ведны.

ПРАВЁЖ *м ист.* правёж, -жу́ *м*; катава́нне, -ння *ср*.

ПРАВЕ́||НИЕ праве́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. полит.* праве́ць.

ПРА́ВИЛ||О пра́віла, -ла *ср*; **по всем ~ам иску́сства** па ўсіх пра́вілах майстэ́рства.

ПРАВИ́ЛО *ср* **1.** *стр., сапож.* праві́дла, -ла *ср*; **2.** (*руль*) *уст.* стырно́, -на́ *ср*; **3.** *охот.* хвост, *род.* хваста́ *м*.

ПРА́ВИЛЬН||О *нареч.* пра́вільна; **~ОСТЬ** пра́вільнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** пра́вільны.

ПРАВИ́ЛЬНЫЙ (*к* **прави́ло** 1) праві́длавы.

ПРА́ВИ́ЛЬ||ЩИК *тип.* праві́льшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** праві́льшчыца, -цы *ж*.

ПРАВИ́ТЕЛЬ **1.** праві́цель, -ля *м*; кіраўні́к, -ка́ *м*; (*властелин*) валада́р, -ра́ *м*; **2.** (*управляющий*) *уст.* кіраўні́к, -ка́ *м*; (*заведующий*) зага́дчык, -ка *м*; **~НИЦА** праві́цельніца, -цы *ж*.

ПРАВИ́ТЕЛЬ||СТВЕННЫЙ ура́давы; **~СТВО** *ср* ура́д, -да *м*; **Прави́тельство СССР** Ура́д СССР; **~СТВУЮЩИЙ** праві́цельствуючы.

ПРА́ВИТЬ I *несов.* **1.** (*управлять страной, государством и т. п.*) пра́віць; (*руководить*) кірава́ць; **п. страно́й** кірава́ць краі́най; **2.** (*лодкой, автомобилем, лошадьми и т. п.*) кірава́ць.

ПРА́ВИТЬ II *несов.* **1.** (*исправлять ошибки*) пра́віць, папраўля́ць, выпраўля́ць; **2.** (*вывихнутое*) упраўля́ць; **3.** (*выпрямлять*) выпро́стваць, выраўно́ўваць; **4.** (*бритву*) напраўля́ць, наво́дзіць; (*точить*) вастры́ць; **5.** (*совершать, отправлять*) *уст.* пра́віць; (*тризну и т. п.*) спраўля́ць.

ПРА́ВКА *ж* пра́ўка, -кі *ж*, папраўле́нне, -ння *ср*; выпраўле́нне, -ння *ср*; упраўле́нне, -ння *ср*; выпро́стванне, -ння *ср*, выраўно́ўванне, -ння *ср*; напра́ўка, -кі *ж*, наво́дка, -кі *ж*, вастрэ́нне, -ння *ср*; *см.* **пра́віть** II 1—4.

ПРАВЛЕ́Н||ИЕ **1.** (*управление государством*) праўле́нне, -ння *ср*; кірава́нне, -ння *ср*; **о́браз ~ия** спо́саб (лад) праўле́ння; **2.** (*орган, возглавляющий учреждение*) праўле́нне,

-ння *ср*; (*управа*) *уст.* управа, -вы *ж*; **волостное п.** валасная ўправа.

ПРАВЛЕНЫЙ (*о тексте*) праўлены, папраўляны, выпраўляны.

ПРАВНУ||К праўнук, -ка *м*; **~ЧКА** праўнучка, -кі *ж*.

ПРАВ||О I *в разн. знач.* права, -ва *ср*; **всеобщее избирательное п.** усеагульнае выбарчае права; **п. на труд, на отдых, на образование** права на працу, на адпачынак, на адукацыю; **иметь п.** мець права; **принадлежащий по ~у** належачы (належны) па праву; **с полным ~ом** з поўным правам; **водительские ~а** вадзіцельскія правы.

ПРАВО II *вводн. сл.* сапраўды, праўда; **я, право, не виноват** я, сапраўды, не вінаваты.

ПРАВОБЕРЕЖ||НЫЙ правабярэжны; **~ЬЕ** правабярэжжа, -жжа *ср*.

ПРАВОВЕД *уст.* прававед, -да *м*, правазнавец, -наўца *м*; **~ЕНИЕ** *уст.* правазнаўства, -ва *ср*, *мн. нет*.

ПРАВОВЕРНЫЙ *церк.* прававерны.

ПРАВОВОЙ прававы.

ПРАВОЛЕВАЦКИЙ *полит.* правалявацкі.

ПРАВОМЕРН||ОСТЬ правамернасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** правамерны.

ПРАВОМОЧ||ИЕ *юр.* правамоцтва, -ва *ср*; **~НЫЙ** правамоцны.

ПРАВОНАРУШ||ЕНИЕ *юр.* правапарушэнне, -ння *ср*; **~ИТЕЛЬ** правапарушальнік, -ка *м*.

ПРАВООППОРТУНИСТИЧЕСКИЙ *полит.* правааппартуністычны.

ПРАВОПИСАНИЕ *ср* правапіс, -су *м*.

ПРАВОПОРЯДОК *юр.* правапарадак, -дку *м*, *мн. нет*.

ПРАВОСЛАВ||ИЕ праваслаўе, -лаўя *ср*, *мн. нет*; **~НЫЙ** праваслаўны.

ПРАВОСПОСОБН||ОСТЬ *юр.* правяздольнасць, -ці *ж*, *мн. нет*; **~ЫЙ** праваздольны.

ПРАВОСТОРОННИЙ правабаковы.

ПРАВОСУД||ИЕ правасуддзе, -ддзя *ср*, *мн. нет*; **~НЫЙ** правасудны.

ПРАВОТА невінаватасць, -ці *ж*; справядлівасць, -ці *ж*; правільнасць, -ці *ж*; слушнасць, -ці *ж*; праўда, -ды *ж*; *см.* **правый** II.

ПРАВОУКЛОНИСТ *полит.* праваўхіліст, -та *м*.

ПРАВОФЛАНГОВЫЙ правафланговы.

ПРАВЩИ||К *тип.* праўшчык, -ка *м*; **~ЦА** праўшчыца, -цы *ж*.

ПРАВЫЙ I (*противоположный левому*) **1.** *прил.* правы; 2. *сущ. полит.* правы, -вага *м*.

ПРАВ||ЫЙ II **1.** (*не виновный*) невінаваты; **суд признал его ~ым** суд прызнаў яго невінаватым; **2.** (*справедливый*) справядлівы; (*правильный*) правільны; (*резонный*) слушны; **наше дело ~ое** справа наша справядлівая; **3.** (*говорящий, поступающий правильно*): **ты прав, вы ~ы** твая праўда (ты маеш рацыю), ваша праўда (вы маеце рацыю); **она оказалась ~а в своих подозрениях** праўда была яе, калі яна падазравала (яна мела рацыю, калі падазравала); **вы совершенно ~ы** праўда цалкам ваша (вы цалкам маеце рацыю).

ПРАВЯЩИЙ правячы; кіруючы; **п. класс** правячы клас.

ПРАГА *г.* Прага, -гі *ж*.

ПРАГМ||АТИЗМ прагматызм, -ма *м*; **~АТИК** прагматык, -ка *м*; **~АТИСТ** прагматыст, -та *м*; **~АТИЧЕСКИЙ** прагматычны; **~АТИЧНОСТЬ** прагматычнасць, -ці *ж*; **~АТИЧНЫЙ** прагматычны.

ПРАД||ЕД прадзед, -да *м*; **~ЕДОВСКИЙ** прадзедаўскі; **~ЕДУШКА** прадзед, -да *м*.

ПРАЖСКИЙ пражскі.

ПРАЗДН||ЕСТВО *ср уст.* свята, -та *ср*; (*празднование*) святкаванне, -ння *ср*; (*торжество*) урачыстасць, -ці *ж*; **~ИК** *м* свята, -та *ср*; ✧ **будет и на нашей улице ~ик** *погов.* будзе і на нашай вуліцы свята; **~ИЧНО** *нареч.* па-святочнаму, святочна; (*торжественно*) урачыста; **~ИЧНОСТЬ** святочнасць, -ці *ж*; (*торжественность*) урачыстасць, -ці *ж*; **~ИЧНЫЙ** святочны; (*торжественный*) урачысты.

ПРАЗДНО *нареч.* нічога не робячы, без работы, без справы; **жить п.** жыць, нічога не робячы; гультаяваць; **п. тратить время** марнаваць час.

ПРАЗДНОВА||НИЕ 1. святкаванне, -ння *ср*; 2. спраўлянне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* 1. святкаваць; 2. (*устраивать пир, торжество по случаю чего-л.*) спраўляць.

ПРАЗДНОСЛОВ||ИЕ пустаслоўе, -лоўя *ср*, *мн. нет*, марнаслоўе, -лоўя *ср*, *мн. нет*; **~НЫЙ** пустаслоўны, марнаслоўны.

ПРАЗДНОС||ТЬ *ж* **1.** (*качество, свойство*) пустата, -ты *ж*; марнасць, -ці *ж*; бескарыснасць, -ці *ж*; бяздзейнасць, -ці *ж*; незанятасць, -ці *ж*; **п. разговора** пустата размовы; *см.* **праздный; 2.** (*праздная жизнь, безделье*) бяздзейнасць, -ці *ж*; (*свойственная бездельнику*) гультаяванне, -ння *ср*, гультайства, -ва *ср*; **жить в ~ти** гультаяваць; лынды (бібікі) біць; жыць прывольна.

ПРАЗДНОШАТАЮЩИЙСЯ *презр.* **1.** *прил.* гуляшчы; 2. *сущ.* гуляшчы, -шчага *м*, гультай, -тая *м*, туляга, -гі *м*.

ПРАЗДН||ЫЙ 1. (*пустой*) пусты; (*тщетный*) марны; (*бесполезный*) бескарысны; **п. разговор** пустая размова; **это не п. вопрос** гэта не пустое пытанне; **~ое любопытство** пустая цікавасць; 2. (*бездельный*) бяздзейны, гуляшчы; (*свойственный бездельнику*) гультайскі; (*незанятый*) (нічым) незаняты; **~ая жизнь** бяздзейнае (гуляшчае, гультайскае) жыццё; **п. человек** гуляшчы (нічым не заняты) чалавек; (*бездельник*) лодар.

ПРАЗЕМ *мин.* празем, -му *м*.

ПРАЗЕОДИМ *хим.* празеадым, -ма *м*.

ПРАКРИТ *лингв.* пракрыт, -ту *м*, *мн. нет*; **~СКИЙ** пракрыцкі.

ПРАКТИ||К практык, -ка *м*; **~КА** *в разн. знач.* практыка, -кі *ж*, *мн. нет*; **~КАНТ** практыкант, -та *м*; **~КАНТКА** практыкантка, -кі *ж*; **~КАНТСКИЙ** практыканцкі; **~КАНСТВО** практыканцтва, -ва *ср*; **~КОВАННЫЙ** практыкаваны; **~КОВАТЬ** *несов.* практыкаваць; **~КОВАТЬСЯ** практыкавацца; **~КУМ** практыкум, -ма *м*; **~КУЮЩИЙ** *прил.* практыкуючы; **~ЦИЗМ** практыцызм, -ма *м*.

ПРАКТИЧ||ЕСКИ *нареч.* практычна; **~ЕСКИЙ** практычны; **~НО** *нареч.* практычна; **~НОСТЬ** практычнасць, -ці *ж*, *мн. нет*; **~НЫЙ** практычны.

ПРАОТ||ЕЦ прабацька, -кі *м*; ✧ **отправиться к ~цам** *разг.* адправіцца на той свет; **~ЦОВСКИЙ** прабацькаўскі.

ПРАПОРЩИ||К *воен. ист.* прапаршчык, -ка *м*; **~ЦКИЙ** прапаршчыцкі.

ПРАПРАВНУ||К прапраўнук, -ка *м*; **~ЧКА** прапраўнучка, -кі *ж*.

ПРАПРАДЕД прапрадзед, -да *м*.

ПРАРОД||ИНА *ист.* прарадзіма, -мы *ж*; **~ИТЕЛЬ** прабацька, -кі *м*; **~ИТЕЛЬНИЦА** прамаці *нескл.*, *ж*; **~ИТЕЛЬСКИЙ** прабацькаўскі.

ПРАС||ОЛ *уст.* прасол, -ла *м*; **~ОЛЬСКИЙ** прасольскі.

ПРАХ 1. (*пыль*) *уст.* пыл, *род.* пылу *м*, *мн. нет*; **2.** *перен.* (*о недолговечном*) пыл, *род.* пылу *м*, *мн. нет*; **3.** (*останки*) астанкі, -каў *ед. нет*, прах, *род.* праху *м*, *мн. нет*; ✧ **пойти прахом** пайсці прахам; **прах его возьми** *бран.* ліха яго бяры; **в пух и прах** нашчэнт, ушчэнт, датла.

ПРАЧ||ЕЧНАЯ *сущ.* пральня, -ні *ж*; **~ЕЧНЫЙ** пральны; **~КА** прачка, -кі *ж*.

ПРАЩ *м*, **~ЩА** *ж ист.* прашча, -чы *ж*.

ПРАЩЕВИДНЫЙ прашчападобны.

ПРАЩУР прашчур, -ра *м*.

ПРАЯЗЫ||К *м лингв. уст.* прамова, -вы *ж*; **~КОВЫЙ** прамоўны.

ПРЕАМБУЛА *дип.* прэамбула, -лы *ж*.

ПРЕБОГА́ТЫЙ *разг.* ве́льмі бага́ты.
ПРЕБО́ЛЬНО *нареч. разг.* ве́льмі балю́ча.
ПРЕБЫВА́||НИЕ знахо́джанне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* знахо́дзіцца (*находиться*); быць (*быть*).
ПРЕВАЛИ́РОВАТЬ *несов.* прэвалі́раваць, пераважа́ць.
ПРЕВЕЛИ́КИЙ *разг.* найвялі́кшы.
ПРЕВЕНТИ́ВНЫЙ правенты́ўны.
ПРЕВЗОЙ||ДЕ́ННЫЙ перася́гнуты, переве́ршаны; **~ТИ́** *сов.* перасягну́ць, перавы́сіць; ◇ **~ти́ (самого́) себя́** перасягну́ць (само́га) сябе́.
ПРЕВОЗМ||ОГА́ТЬ *несов.* перасі́льваць, перамага́ць, пераадо́льваць; **~О́ЧЬ** *сов.* перасі́ліць, перамагчы́, перадо́лець.
ПРЕВОЗН||ЕСЕ́НИЕ (ве́льмі высо́кае, залі́шняе) узніма́нне, -ння *ср*, (ве́льмі высо́кае, залі́шняе) узнясе́нне, -ння *ср*, (ве́льмі высо́кае, залі́шняе) расхва́льванне, -ння *ср*; **~ЕСЁННЫЙ** (ве́льмі высо́ка, залі́шне) узня́ты, (ве́льмі высо́ка, залі́шне) узнёсены, (ве́льмі, залі́шне) расхва́лены; **~ЕСТИ́** *сов.* (ве́льмі, залі́шне) узня́ць, (ве́льмі, залі́шне) узнясці́, (ве́льмі, залі́шне) расхвалі́ць; ◇ **~ести́ до небе́с** узнясці́ (усхвалі́ць, узвы́сіць) да нябёс; **~ОСИТЬ** *несов.* (ве́льмі, залі́шне) узніма́ць, (ве́льмі, залі́шне) узно́сіць, (ве́льмі, залі́шне) расхва́льваць; **~ОСИТЬСЯ** *страд.* (ве́льмі, залі́шне) узніма́цца, (ве́льмі, залі́шне) узно́сіцца, (ве́льмі, залі́шне) расхва́львацца.
ПРЕВОСХОДИ́ТЕЛЬСТВО правасхадзі́цельства, -ва *ср*.
ПРЕВОСХОДИ́ТЬ *несов.* перасяга́ць, перавыша́ць.
ПРЕВОСХО́Д||НО *нареч.* ве́льмі до́бра; (*чудесно*) цудо́ўна; (*отлично*) выда́тна; (*необыкновенно*) надзвыча́йна; **~НЫЙ 1.** (*очень хороший*) ве́льмі до́бры; (*чудесный*) цудо́ўны; (*отличный*) выда́тны; (*необыкновенный*) надзвыча́йны; **~ный челове́к** ве́льмі до́бры (цудо́ўны) чалаве́к; **2.** (*превосходящий*) перавыша́ючы; ◇ **~ная сте́пень** *грам.* найвышэ́йшая ступе́нь; **~СТВО** *ср* перава́га, -гі *ж*, *мн. нет*; **~ЯЩИЙ** перавыша́ючы.
ПРЕВРАТИ́ТЬ *сов.* ператвары́ць; (*обратить*) перавярну́ць; *см.* **превраща́ть**; **~СЯ** ператвары́цца; (*обратиться*) перавярну́цца; ◇ **~ся в слух** ува́жліва прыслу́хацца.
ПРЕВРА́ТН||О *нареч.* скажо́на; няпра́вільна; памылко́ва; *см.* **превра́тный** 2; **~ОСТЬ 1.** (*изменчивость*) зме́нлівасць, -ці *ж*; (*непостоянство*) нястáласць, -ці *ж*; **~ость судьбы́** зме́нлівасць лёсу; **2.** (*искажённость*) скажо́насць, -ці *ж*; (*неправильность*) няпра́вільнасць, -ці *ж*; (*ошибочность*) памылко́васць, -ці *ж*; **~ость толкова́ния** няпра́вільнасць (скажо́насць, памылко́васць) тлумачэ́ння; *см.* **превра́тный**; **3.** *чаще мн.* (*злоключения*) нягóды, -го́д, *ед.* нягóда, -ды *ж*; ліхту́га, -гі *ж*, ліхі́я прыгóды; (*несчастье*) няшча́сце, -ця *ср*; **~ЫЙ 1.** (*изменчивый*) *уст.* зме́нлівы; (*непостоянный*) нястáлы; **2.** (*искажённый*) скажо́ны; (*неправильный*) няпра́вільны; (*ошибочный*) памылко́вы.
ПРЕВРАЩ||А́ТЬ *несов.* ператвара́ць; (*обращать*) перавaро́чваць; **п. де́ло в шу́тку** ператвара́ць спра́ву ў жарт; **~А́ТЬСЯ** ператвара́цца; перавaро́чвацца; *см.* **преврати́ться**; **~Е́НИЕ** *ср* ператварэ́нне, -ння *ср*; перавaро́чванне, -ння *ср*; метамарфо́за, -зы *ж*; **~ЁННЫЙ** ператво́раны; переве́рнуты.
ПРЕВЫ́СИТЬ *сов.* перавы́сіць.
ПРЕВЫША́ТЬ *несов.* перавыша́ць; **~СЯ** перавыша́цца.
ПРЕВЫ́Ш||Е *нареч.* (шмат) вышэ́й; ◇ **п. всего́** вышэ́й за ўсё; **~Е́НИЕ** перавышэ́нне, -ння *ср*; **~ЕННЫЙ** перавы́шаны.
ПРЕГРА́||ДА перашко́да, -ды *ж*; перапо́на, -ны *ж*; **грудобрю́шная п.** *анат.* грудабру́шная перапо́на; **~ДИ́ТЬ** *сов.* перагарадзі́ць; (*путь, проход*) заступі́ць; перапыні́ць; (*воспрепятствовать*) забараніць; **часово́й ~ди́л ему́ доро́гу** вартавы́ перагарадзі́ў (заступі́ў) яму́ даро́гу; **~ЖДА́ТЬ** *несов.* перагараджа́ць; заступа́ць; перапыня́ць; забараня́ць; **~ЖДА́ТЬСЯ** перагараджа́цца; заступа́цца; перапыня́цца; забараня́цца; **~ЖДЕ́НИЕ** *ср* **1.** (*действие*) перагараджэ́нне, -ння *ср*; заступле́нне, -ння *ср*; перапыне́нне, -ння *ср*; забаране́нне, -ння *ср*, забаро́на, -ны *ж*; **2.** (*преграда*) *уст.* перашко́да, -ды *ж*; (*препона*) перапо́на, -ны *ж*; **~ЖДЁННЫЙ** перапы́нены; перагаро́джаны; засту́плены.
ПРЕГРЕШЕ́НИЕ *ср уст. шутл.* грэх, *род.* граху́ *м.*
ПРЕД, ПРЕ́ДО *предлог с твор.* перад (*кім-чым*); перада (*употребляется только в сочетании:* перада мно́й).
ПРЕДАВА́ТЬ *несов.* **1.** (*отдавать*) аддава́ць; перадава́ць; (*подвергать*) падвярга́ць (*чаму*); **п. гла́сности** даво́дзіць да (ве́дама) публі́чнасці, апублікóўваць; (*разглашать*) разгалаша́ць; **п. ана́феме кого́-либо** *церк.*, *перен.* абвяшча́ць ана́фему каму́-не́будзь, аддава́ць ана́феме каго́-не́будзь; **п. забве́нию** аддава́ць забыццю́, забыва́ць; **п. земле́** хава́ць, аддава́ць зямлі́; **п. ка́зни** кара́ць сме́рцю, аддава́ць на смяро́тную ка́ру; **п. огню́ и мечу́** аддава́ць пад аго́нь і меч (агню́ і мячу́); **п. суду́** аддава́ць пад суд; **п. сме́рти** аддава́ць на смерць (сме́рці); **2.** (*изменять*) здра́джваць (*каму-чаму*); (*выдавать*) выдава́ць (*каго-што*); **~СЯ 1.** (*чему*) аддава́цца; (*впадать во что-л.*) упада́ць (*у што*); (*углубляться*) паглыбля́цца; **~ся отча́янию** упада́ць у ро́спач; **~ся мечта́м** аддава́цца ма́рам, паглыбля́цца ў ма́ры; **2.** (*кому-чему*) *уст.* аддава́цца; (*переходить на сторону кого-л.*) перахо́дзіць (*да каго-чаго*); (*доверяться*) давяра́цца.
ПРЕДА́НИЕ I (*действие*) адда́нне, -ння *ср*, *мн. нет*; **п. суду́** адда́нне пад суд; **п. земле́** адда́нне зямлі́.
ПРЕДА́Н||ИЕ II (*легенда*) пада́нне, -ння *ср*; **по ~ию** паво́дле пада́ння; ◇ **свежо́ п., а ве́рится с трудо́м** пада́нне све́жае, але́ паве́рыць ця́жка; было́ няда́ўна, а паве́рыць ця́жка.
ПРЕ́ДАНН||О *нареч.* адда́на; ве́рна; **~ОСТЬ** адда́насць, -ці *ж*; ве́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** *прич.* адда́дзены; перада́дзены; падве́ргнуты; здра́джаны; вы́дадзены; **~ый забве́нию** адда́дзены забыццю́, забы́ты; **~ый земле́** пахава́ны, адда́дзены зямлі́; **~ый сме́рти** адда́дзены на смерць (сме́рці); **~ый огню́ и мечу́** адда́дзены пад аго́нь і меч (агню́ і мячу́); **~ый суду́** адда́дзены пад суд; **~ый ка́зни** пакара́ны сме́рцю, адда́дзены на смяро́тную ка́ру; **2.** *прил.* адда́ны; (*верный*) ве́рны; **~ый сын сове́тского наро́да** адда́ны (ве́рны) сын саве́цкага наро́ду.
ПРЕДА́||ТЕЛЬ здра́днік, -ка *м*; прада́жнік, -ка *м*; **~ТЕЛЬНИЦА** здра́дніца, -цы *ж*; прада́жніца, -цы *ж*; **~ТЕЛЬСКИ** *нареч.* па-здра́дніцку; па-прада́жніцку; **~ТЕЛЬСКИЙ** здра́дніцкі; прада́жніцкі; **~ТЕЛЬСТВО** здра́дніцтва, -ва *ср*; прада́жніцтва, -ва *ср*; **~ТЬ** *сов.* **1.** (*отдать*) адда́ць; перада́ць; (*подвергнуть*) падве́ргнуць (*чаму*); **2.** (*изменить*) здра́дзіць (*каму-чаму*); (*выдать*) вы́даць (*каго-што*); *см.* **предава́ть**; **~ТЬСЯ 1.** (*чему*) адда́цца; (*впасть во что-л.*) упа́сці (*у што*); (*углубиться*) паглы́біцца; **2.** (*кому-чему*) *уст.* адда́цца; (*перейти на сторону кого-л.*) перайсці́ (*да каго-чаго*); (*довериться*) даве́рыцца.
ПРЕДБА́ННИК прылáзнік, -ка *м.*
ПРЕДБРЮШИ́ННЫЙ *анат.* перадбрушы́нны.
ПРЕДВАР||И́ТЕЛЬНО *нареч.* папярэ́дне; (*сначала*) спача́тку; **~И́ТЕЛЬНОСТЬ** папярэ́днасць, -ці *ж*; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** папярэ́дні; **~И́ТЬ** *сов. уст.* **1.** (*сделать раньше кого-чего*) апярэ́дзіць; **2.** (*предупредить*) папярэ́дзіць; **~Я́ТЬ** *несов. уст.* **1.** (*делать раньше кого-чего*) апярэ́джваць; **2.** (*предупреждать*) папераджа́ць, папярэ́джваць; **3.** (*предшествовать*) папярэ́днічаць (*каму-чаму*), быць (*перад кім-чым*), адбыва́цца (*перад кім-чым*); ◇ **~я́ть собы́тия** апярэ́джваць падзе́і.
ПРЕДВЕСЕ́ННИЙ перадвеснавы́, перадвясе́нні.
ПРЕДВЕ́СТ||ИЕ прадве́сце, -ця *ср*; **~НИК** прадве́снік, -ка *м*; **~НИЦА** прадве́сніца, -цы *ж.*
ПРЕДВЕ́ЧНЫЙ *уст.* спрадве́чны.
ПРЕДВЕЩА́||НИЕ прадвяшча́нне, -ння *ср*; (*предвестие*) прадве́сце, -ця *ср*; **~ТЬ** *несов.* **1.** (*предрекать*) прадрака́ць; (*предсказывать*) прадка́зваць; (*пророчить*) праро́чыць;

2. (*служить предзнаменованием*) служыць прыкметай; прадвяшчаць.

ПРЕДВЗЯТ||О *нареч.* прадузята; ~ОСТЬ прадузятасць, -ці *ж*; ~ЫЙ прадузяты.

ПРЕДВИДЕ||НИЕ прадбачанне, -ння *ср*; ~ННЫЙ прадбачаны; ~ТЬ *несов.* прадбачыць; ~ТЬСЯ прадбачыцца.

ПРЕДВКУ||СИТЬ *сов.* пасмакаваць наперад, адчуць (смак) наперад; пацешыцца наперад; прадчуць; ~ШАТЬ *несов.* смакаваць наперад; адчуваць (смак) наперад, цешыцца наперад; прадчуваць; **~шать удовольствие** адчуваць прыемнасць наперад; ~ШЕНИЕ *ср* смакаванне наперад, адчуванне (смаку) наперад; прадчуванне, -ння *ср*; **в ~шении радостной встречи** адчуваючы наперад радасную сустрэчу.

ПРЕДВОДИТЕЛЬ 1. (*вождь*) правадыр, -ра *м*; (*руководитель*) кіраўнік, -ка *м*; (*вожак*) важак, -ка *м*; (*заправила*) завадатай, -тая *м*; 2. (*дворянства*) *ист.* прадвадзіцель, -ля *м*, маршалак, -лка *м*; ~НИЦА *ж* правадырка, -кі *ж*; кіраўніца, -цы *ж*; важак, -ка *м*; завадатай, -тая *м*; ~СКИЙ 1. правадырскі; кіраўнічы; завадатайскі; 2. прадвадзіцельскі, маршалкаўскі; *см.* **предводитель;** ~СТВО *ср* правадырства, -ва *ср*; (*руководство*) кіраўніцтва, -ва *ср*; каманда, -ды *ж*, камандаванне, -ння *ср*; **под ~ством старого партизана** пад камандай (камандаваннем) старога партызана; **~ство отрядом** кіраўніцтва (камандаванне) атрадам; ~СТВОВАТЬ *несов.* быць правадыром; правадырстваваць (*у каго-чаго*); быць (стаяць) на чале (*каго-чаго*); (*руководить*) кіраваць; (*командовать*) камандаваць.

ПРЕДВОЕННЫЙ перадваенны.

ПРЕДВОЗВЕ||СТИЕ *уст.* прадвесце, -ця *ср*; ~СТИТЬ *сов. уст.* 1. (*предречь*) прадказаць; 2. (*возвестить заранее*) спавясціць (наперад), абвясціць (наперад); прадвясціць; ~СТНИК *уст.* прадвеснік, -ка *м*; ~СТНИЦА прадвесніца, -цы *ж*; ~ЩАТЬ *несов. уст.* 1. (*предрекать*) прадказваць; 2. (*возвещать заранее*) спавяшчаць (наперад), абвяшчаць (наперад); прадвяшчаць; ~ЩЕНИЕ *уст.* 1. прадказанне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) прадказванне, -ння *ср*; 2. спавяшчэнне (наперад), абвяшчэнне (наперад); прадвяшчэнне, -ння *ср*.

ПРЕДВОСХИ||ТИТЬ *сов.* прадугадаць (*предугадать*); апярэдзіць (*предупредить, опередить*); вызначыць наперад (*определить заранее*); зрабіць раней (за каго-небудзь) (*сделать что-л., опередив другого*); *см.* **предвосхищать;** ~ЩАТЬ *несов.* прадугадваць; апярэджваць; вызначаць наперад; рабіць раней (за каго-небудзь); **~щать чью-либо мысль** прадугадваць чыю-небудзь думку; **~щать события** апярэджваць падзеі; **~щать чьё-либо открытие** рабіць адкрыццё раней за каго-небудзь; ~ЩЕНИЕ прадугадванне, -ння *ср*; апярэджванне, -ння *ср*; вызначэнне наперад; ~ЩЕННЫЙ прадугаданы; апярэджаны; вызначаны наперад; зроблены раней (за каго-небудзь).

ПРЕДВЫБОРНЫЙ перадвыбарны.

ПРЕДГО||РНЫЙ перадгорны; ~РЬЕ перадгор'е, -р'я *ср*.

ПРЕДГРОЗОВОЙ пераднавальнічны.

ПРЕДГРОЗЬЕ *ср* час перад навальніцай.

ПРЕДДВЕР||ИЕ *ср* 1. (*место перед дверью, перед входом*) прысенак, -нка *м*; (месца) перад дзвярыма; (месца) перад уваходам; **стоять у ~ия** стаяць перад дзвярыма (перад уваходам); 2. *анат.* переддзвер'е, -р'я *ср*; **п. в ушном лабиринте** переддзвер'е ў вушным лабірынце; 3. *перен.* парог, -га *м* (*порог*); пачатак, -тку *м*, перадпачатак, -тку *м* (*начало*); пярэддзе, -ня *ср* (*канун*); **в ~ии театрального сезона** на парозе (напярэдадні) тэатральнага сезону; **в ~ии науки** перад пачаткам (у перадпачатку) навукі.

ПРЕДЕЛ *м* 1. (*граница*) мяжа, -жы *ж*; граніца, -цы *ж*; (*рубеж*) рубеж, -жа *м*; **~ы колебания температуры** межы хістання тэмпературы; **предел упругости, высоты, нагрузки** мяжа пругкасці, вышыні, нагрузкі; **предел прочности** *тех.* мяжа трываласці; **предел человеческой жизни** мяжа (рубеж) чалавечага жыцця; **перейти ~ы** *перен.* перайсці межы; **в ~ах года** у межах года, 2. (*конец*) канец, *род.* канца *м*; **этому нужно положить предел** гэтаму трэба пакласці канец; 3. (*край, страна*) *поэт. уст.* край, *род.* краю *м*; краіна, -ны *ж*; 4. *мат.* граніца, -цы *ж*; ~ЬНО *нареч.* гранічна; (*крайне*) крайне; (*до последнего*) да апошняга, да краю, да канца; ~ЬНОСТЬ гранічнасць, -ці *ж*; крайняя (апошняя) мяжа; **~ьность усилий** крайняя (апошняя) мяжа намаганняў; ~ЬНЫЙ гранічны; (*крайний*) крайні; (*последний*) апошні; (*наибольший*) найбольшы; **~ьная скорость** гранічная (найбольшая) хуткасць; **~ьная температура** гранічная (крайняя) тэмпература; **~ьное напряжение тока** гранічнае (крайняе) напружанне току; **~ьные усилия** апошнія (крайнія) намаганні; **~ьный срок** апошні тэрмін.

ПРЕДЕРЖАЩ||ИЙ: **власти ~ие** *уст.* уладатрымальнікі, -каў, уладаносцы, -цаў.

ПРЕДЗАВКОМА (председатель заводского комитета) старшыня заўкома (старшыня заводскага камітэта).

ПРЕДЗАКАТНЫЙ перадзаходні, перадвячэрні, адвячоркавы, надвячэрні.

ПРЕДЗНАМЕНОВ||АНИЕ *ср* прыкмета, -ты *ж* (*примета*); знак, *род.* знака *м* (*знамение*); адзнака, -кі *ж* (*признак*); (*предвестие*) прадвесце, -ця *ср*; ~АТЬ *несов.* служыць прыкметай; азначаць; прадвяшчаць.

ПРЕДИКА||Т *филос., грам.* прэдыкат, -та *м*; ~ТИВНО *нареч.* прэдыкатыўна; ~ТИВНОСТЬ *филос., грам.* прэдыкатыўнасць, -ці *ж*; ~ТИВНЫЙ прэдыкатыўны; ~ЦИЯ *филос., грам.* прэдыкацыя, -цыі *ж*.

ПРЕДИСЛОВИЕ *ср прям., перен.* прадмова, -вы *ж*.

ПРЕДИСПОЗИЦИЯ *мед.* прадыспазіцыя, -цыі *ж*.

ПРЕДИСПОЛКОМА (председатель исполнительного комитета) старшыня выканкома (старшыня выканаўчага камітэта).

ПРЕДИСТОРИЯ перадгісторыя, -рыі *ж*.

ПРЕДКАМЕР||А *тех.* перадкамера, -ры *ж*; ~НЫЙ перадкамерны.

ПРЕДКРИЗИСНЫЙ перадкрызісны.

ПРЕДКРЫЛОК *ав.* перадкрылак, -лка *м*.

ПРЕСЛЕ́ДОВА||НИЕ *ср* праслéдаванне, -ння *ср*; (*гонение*) гане́нне, -ння *ср*; (*притеснение*) уці́ск, -ку *м*, прыгнёт, -ту *м*; **суде́бное п.** судóвае праслéдаванне; **ма́ния ~ния** *мед.* ма́нія праслéдавання; ~**ТЕЛЬ** праслéдавацель, -ля *ср*; (*гонитель*) ганíцель, -ля *м*; (*притеснитель*) прыгнята́льнік, -ка *м*; ~**ТЕЛЬНИЦА** праслéдавацельніца, -цы *ж*; ганíцелька, -кі *ж*; прыгнята́льніца, -цы *ж*; ~**ТЬ** *несов.* **1.** праслéдаваць; (*гнаться*) гна́цца (*за кім*); (*гнать, подвергать гонениям*) гнаць; (*притеснять*) прыгнята́ць, уціска́ць; ~**ть врага́ по пята́м** праслéдаваць (гнаць) вóрага па пя́тах; **империали́сты пресле́дуют передовы́х де́ятелей нау́ки** імперыялі́сты праслéдуюць (прыгнята́юць, уціска́юць) перадавы́х дзеячóў наву́кі; **2.** *перен.* не дава́ць спакóю (*каму-чаму*); (*угнетать*) гняці́; (*мучить*) му́чыць; (*докучать*) дакуча́ць, надакуча́ць; назаля́ць (*каму-чаму*); (*донимать*) дайма́ць (*каго-што*), дапяка́ць (*каму-чаму*); **мысль о мое́й оши́бке пресле́дует меня́** ду́мка аб маёй памы́лцы не дае́ мне спакóю (му́чыць мяне́, гняце́ мяне́); **3.** (*стремиться к чему-л.*) мець на ўва́зе (*што*), мець на мэ́це (*што*); (*добиваться*) дабіва́цца; дамага́цца (*чаго*); (*заботиться о чём-л.*) клапаці́цца (*аб чым*), дбаць (*аб чым*); ~**ть свои́ интере́сы** клапаці́цца (дбаць) аб сваі́х інтарэ́сах; ~**ть цель** мець на мэ́це, ста́віць сабе́ мэ́таю; ~**ть коры́стные це́ли** мець (ста́віць) кары́слівыя мэ́ты; ~**ТЬСЯ** *страд.* праслéдавацца; прыгнята́цца, уціска́цца; мець на ўва́зе, мець на мэ́це; дабіва́цца (*чаго*), дамага́цца (*чаго*), клапаці́цца (*аб чым*), дбаць (*аб чым*); **кака́я цель пресле́дуется ва́ми?** якую вы ма́еце на ўва́зе мэ́ту?, якую вы ста́віце сабе́ мэ́ту?; чагó вы дамага́ецеся (дабіва́ецеся)?

ПРЕСЛОВУ́ТЫЙ *ирон.* праславу́ты.

ПРЕСМЫКА́||НИЕ, ~ТЕЛЬСТВО *презр.* пóўзанне, -ння *ср*; (*раболепство*) рабалéпства, -ва *ср*; (*низкопоклонство*) нізкапаклóнства, -ва *ср*; ~**ТЬСЯ** *несов. уст.* **1.** пóўзаць; **2.** *перен.* (*перед кем-чем*) пóўзаць; (*раболепствовать*) рабалéпстваваць; (*низкопоклонничать*) нізкапаклóннічаць; ~**ЮЩЕЕСЯ** *ср сущ. зоол.* паўзу́н, -на́ *м*, *мн.* паўзуны́, -нóў.

ПРЕ́СНО *нареч.* прэ́сна.

ПРЕСНОВО́ДНЫЙ прэснавóдны.

ПРЕ́СН||ОСТЬ прэ́снасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** прэ́сны.

ПРЕСПОКО́ЙН||О *нареч.* зусім спакóйна; са́мым спакóйным чы́нам; ~**ЫЙ** ве́льмі спакóйны.

ПРЕСС *в разн. знач.* прэс, *род.* прэ́са *м*.

ПРЕ́ССА *ж* прэ́са, -сы *ж*; (*печать*) друк, *род.* дру́ку *м*.

ПРЕСС-БЮРО́ прэс-бюрó *нескл.*, *ср*.

ПРЕСС-КОНФЕРЕ́НЦИЯ прэс-канферэ́нцыя, -цыі *ж*.

ПРЕССОВА́||ЛЬНЫЙ прасава́льны; ~**НИЕ** прасава́нне, -ння *ср*.

ПРЕССО́В||АННЫЙ праса́ваны; ~**А́ТЬ** *несов.* прасава́ць; ~**А́ТЬСЯ** прасава́цца; ~**КА** *ж* прасава́нне, -ння *ср*; прасóўка, -кі *ж*; ~**ЩИ́К** прасаўшчы́к, -ка́ *м*; ~**ЩИ́ЦА** прасаўшчы́ца, -цы *ж*.

ПРЕ́ССОВЫЙ *тех.* прэ́савы.

ПРЕСС-ПАПЬЕ́ прэс-пап'е́ *нескл., ср.*
ПРЕССШПА́Н *тех., эл.* прэсшпа́н, -на *м.*
ПРЕСТА́ВИТЬСЯ *сов. уст.* паме́рці; (*скончаться*) ска́нацца.
ПРЕСТАРЕ́Л||ОСТЬ састарэ́ласць, -ці *ж,* ста́расць, -ці *ж;* **~ЫЙ** састарэ́лы, стары́.
ПРЕСТИ́Ж прэсты́ж, -жу *м.*
ПРЕСТИ́ССИМО *нареч. муз.* прэсты́сіма.
ПРЕ́СТО *муз.* **1.** *сущ.* прэ́ста *нескл., ср;* **2.** *нареч.* прэ́ста.
ПРЕСТО́Л **1.** трон, *род.* тро́на *м;* **2.** *церк.* прасто́л, -ла *м.*
ПРЕСТОЛОНАСЛЕ́Д||ИЕ *ср* перахо́д у спа́дчыну тро́на; **~НИК** насле́днік тро́на; **~НИЦА** насле́дніца тро́на.
ПРЕСТО́ЛЬНЫЙ: п. го́род *уст.* сто́льны (сталі́чны) го́рад; **п. пра́здник** *рел.* фэст, *род.* фэ́сту *м,* храмаво́е свя́та.
ПРЕСТРА́НН||О *нареч. разг.* ве́льмі дзіўна; **~ЫЙ** ве́льмі дзіўны.
ПРЕСТУП||А́ТЬ *несов.,* **~И́ТЬ** *сов. уст. см.* **престу-п||а́ть, ~и́ть.**
ПРЕСТУПЛЕ́Н||ИЕ злачы́нства, -ва *ср;* **соверши́ть п.** зрабі́ць злачы́нства; **соста́в ~ия** склад злачы́нства; **п. по до́лжности** *юр.* злачы́нства па слу́жбе.
ПРЕСТУ́П||НИК злачы́нец, -нца *м;* **~НИЦА** злачы́нка, -кі *ж;* **~НО** *нареч.* злачы́нна; **~НОСТЬ** злачы́ннасць, -ці *ж;* **~НЫЙ** злачы́нны.
ПРЕСЫ́ТИТЬ *сов. уст.* **1.** (*пищей*) перакармі́ць; (*обкормить*) абкармі́ць; **2.** (*перенасытить*) *спец.* перанасы́ціць; **3.** *перен.* збры́даць (*каму*), абры́даць (*каму*), надаку́чыць (*каму*); (*насладиться*) (да адва́лу) нацёшыцца (*чым*); (*удовлетвориться*) (да адва́лу) здаво́ліцца (*чым*); **ско́ро все развлече́ния его́ пресы́тили** ху́тка ўсе забавы яму́ збры́далі (надаку́чылі), ху́тка ўсімі забавамі ён нацёшыўся (здаво́ліўся) да адва́лу; **~СЯ** **1.** (*пищей*) наесціся (да адва́лу); (*объесться*) аб'е́сціся; **2.** (*перенасытиться*) *спец.* перанасы́ціцца; **3.** *перен.* (*насладиться*) (да адва́лу) нацёшыцца; (*удовлетвориться*) (да адва́лу) здаво́ліцца; збры́даць (*каму*), абры́даць (*каму*); (*надоесть*) надаку́чыць (*каму*); **он пресы́тился все́ми развлече́ниями** ён нацёшыўся (здаво́ліўся) усімі заба́вамі да адва́лу, усе́ заба́вы яму́ збры́далі (надаку́чылі).
ПРЕСЫЩА́||ТЬ *несов. уст.* **1.** (*пищей*) перако́рмліваць; (*обкармливать*) абко́рмліваць; **2.** (*перенасыщать*) *спец.* перанасыча́ць; **родники́ пита́ют и ~ют по́чву** крыні́цы жывя́ць і перанасыча́юць глебу; **3.** *перен.* збры́дваць (*каму*), абры́дваць (*каму*), надакуча́ць (*каму*); (да адва́лу) нацёшвацца (*чым*); (да адва́лу) здавальня́цца (*чым*); *см.* **пресы́тить; ~ТЬСЯ** **1.** (*пищей*) наяда́цца (да адва́лу); (*объедаться*) аб'яда́цца; **2.** (*перенасыщаться*) *спец.* перанасыча́цца; **кисло́ты пресыща́ются щелоча́ми** кісло́ты перанасыча́юцца шчо́лачамі; **3.** *перен.* (да адва́лу) нацёшвацца; (да адва́лу) здавальня́цца; збры́дваць (*каму*), абры́дваць (*каму*), надакуча́ць (*каму*).
ПРЕСЫЩЕ́Н||ИЕ *ср* **1.** пе́расыць, -ці *ж;* сыць, *род.* сы́ці *ж;* **2.** (*перенасыщенность*) перанасычэ́нне, -ння *ср;* перанасы́чанасць, -ці *ж;* ◇ **до ~ия** да сы́ці, да адва́лу.
ПРЕСЫ́ЩЕННОСТЬ, ПРЕСЫЩЁННОСТЬ *см.* **пресыще́ние.**
ПРЕСЫ́ЩЕННЫЙ, ПРЕСЫЩЁННЫЙ **1.** *прич.* (*пищей*) перако́рмлены; **2.** *прич.* (*перенасыщенный*) перанасы́чаны; **3.** *прил. перен.* сыты; здаво́лены (усім да адва́лу).
ПРЕТВОР||Е́НИЕ *в разн. знач.* ператварэ́нне, -ння *ср;* **п. реше́ний в жизнь** ператварэ́нне рашэ́нняў у жыццё; **~Ё́ННЫЙ** ператво́раны; **~И́ТЬ** *сов.* ператвары́ць; **~И́ТЬСЯ** ператвары́цца; **~Я́ТЬ** *несов.* ператвара́ць; **~Я́ТЬСЯ** ператвара́цца.
ПРЕТЕНД||Е́НТ прэтэндэ́нт, -та *м;* **~Е́НТКА** прэтэндэ́нтка, -кі *ж;* **~ОВА́ТЬ** *несов.* прэтэндава́ць.
ПРЕТЕ́НЗИЯ прэтэ́нзія, -зіі *ж.*
ПРЕТЕНЦИО́ЗН||О *нареч.* прэтэнцыёзна; **~ОСТЬ** прэтэнцыёзнасць, -ці *ж;* **~ЫЙ** прэтэнцыёзны.
ПРЕТЕР||ПЕВА́ТЬ *несов.* **1.** (*изменения и т. п.*) зазнава́ць (*што* і *чаго*); перано́сіць; **~пева́ть измене́ния** змяня́цца, зазнава́ць зме́ны; **2.** (*переносить*) цярпе́ць, перано́сіць; (*изведывать*) зве́дваць, спазнава́ць; зазнава́ць (*чаго* і *што*) (*о радости, страхе, голоде и т. п.*); **~ПЕ́ТЬ** *сов.* **1.** (*изменения и т. п.*) зазна́ць (*што* і *чаго*); перане́сці; **2.** (*перенести*) нацярпе́цца (*чаго*), перане́сці; (*изведать*) зве́даць, спазна́ць; зазна́ць (*чаго* і *што*) (*о радости, страхе, голоде и т. п.*); **~пе́ть го́лод и сту́жу** нацярпе́цца (зазна́ць) го́ладу і хо́ладу; **всё он ви́дел, всё ~пе́л** усё ён ба́чыў, усё перанёс (усяго́ нацярпе́ўся).
ПРЕТ||И́ТЬ *несов.* быць гі́дка, быць агі́дна, быць пры́кра; **по́стное ма́сло мне ~и́т** ад але́ю мне гі́дка (агі́дна).
ПРЕТКНОВЕ́Н||ИЕ: ка́мень ~ия ка́мень спатыкне́ння; перашко́да (*помеха*).
ПРЕ́ТОР *ист.* прэ́тар, -ра *м;* **~ИА́НЕЦ** *ист., перен.* прэтарыя́нец, -нца *м;* **~ИА́НСКИЙ** прэтарыя́нскі.
ПРЕТО́РИЯ *ист.* прэто́рыя, -рыі *ж.*
ПРЕТО́РИЯ (П *прописное*) *г.* Прэто́рыя, -рыі *ж.*
ПРЕТЬ *несов. в разн. знач.* прэць.
ПРЕУВЕЛ||ИЧЕ́НИЕ перабо́льшанне, -ння *ср,* пераве́лічэнне, -ння *ср;* (*неоконч. действие*) перабо́льшванне, -ння *ср;* перавялі́чванне, -ння *ср;* **~И́ЧЕННО** *нареч.* перабо́льшана, перавялі́чана; **~И́ЧЕННОСТЬ** перабо́льшанасць, -ці *ж,* перавялі́чанасць, -ці *ж;* **~И́ЧЕННЫЙ** перабо́льшаны, перавялі́чаны; **~И́ЧИВАТЬ** *несов.* перабо́льшваць, перавялі́чваць; **~И́ЧИВАТЬСЯ** *страд.* перавялі́чвацца; **~И́ЧИТЬ** *сов.* перабо́льшыць, перавялі́чыць.
ПРЕУМЕНЬШ||А́ТЬ *несов.* перамянша́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* перамянша́цца; **~Е́НИЕ** перамяншэ́нне, -ння *ср;* (*неоконч. действие*) пераме́ншванне, -ння *ср;* **~Ё́ННЫЙ** пераме́ншаны.
ПРЕУМЕ́НЬШИТЬ *сов.* пераме́ншыць.
ПРЕУС||ПЕВА́ТЬ *несов.* мець (вялі́кі) по́спех (вялі́кія по́спехі), дасяга́ць (вялі́кага) по́спеху (вялі́кіх по́спехаў), дабіва́цца (вялі́кага) по́спеху (вялі́кіх по́спехаў), рабі́ць (вялі́кі) по́спех (вялі́кія по́спехі); **~ПЕ́ТЬ** *сов.* дасягну́ць (вялі́кага) по́спеху (вялі́кіх по́спехаў), дабі́цца (вялі́кага) по́спеху (вялі́кіх по́спехаў), зрабі́ць (вялі́кі) по́спех (вялі́кія по́спехі); **~ПЕЯ́НИЕ** *ср уст. ирон.* (вялі́кі) по́спех, -ху *м;* (вялі́кія) по́спехі, -хаў.
ПРЕФЕ́КТ прэфе́кт, -та *м;* **~У́РА** прэфекту́ра, -ры *ж.*
ПРЕФЕРА́НС *карт.* прэфера́нс, -са *м;* **~И́СТ** прэфера́нсіст, -та *м;* **~НЫЙ** прэфера́нсны.
ПРЕФЕР||ЕНЦИА́ЛЬНЫЙ прэферэнцыйны; **~Е́НЦИЯ** *эк.* прэферэ́нцыя, -цыі *ж.*
ПРЕ́ФИКС *лингв.* прэ́фікс, -са *м.*
ПРЕФИ́КС *фин.* **1.** *сущ.* прэфі́кс, -су *м;* **2.** *прил.* прэфі́кс *нескл.*
ПРЕФИКСА́||ЛЬНЫЙ прэфікса́льны; **~ЦИЯ** *лингв.* прэфікса́цыя, -цыі *ж.*
ПРЕХОД||И́ТЬ *несов. уст.* прахо́дзіць; (*переходить*) перахо́дзіць; (*миновать*) міна́ць; (*исчезать*) зніка́ць; **~Я́ЩИЙ** міну́чы; (*временный*) часо́вы; (*недолговечный*) нядоўгаве́чны; **истори́чески ~я́щий хара́ктер капитали́зма** гістары́чна міну́чы хара́ктар капіталі́зма; **~я́щее явле́ние** часо́вая (міну́чая) з'я́ва; **всё на све́те ~я́ще** усё на све́це міна́ецца.
ПРЕЦЕДЕ́НТ прэцэдэ́нт, -ту *м.*
ПРЕЦЕ́ССИЯ *астр.* прэцэ́сія, -сіі *ж.*
ПРЕЦИПИТ||А́Т *хим., с.-х.* прэцыпіта́т, -ту *м;* **~А́ТОР** *хим.* прэцыпіта́тар, -ра *м;* **~А́ЦИЯ** *хим., биол.* прэцыпіта́цыя, -цыі *ж;* **~И́Н** *хим.* прэцыпіці́н, -ну *м.*
ПРЕЧИ́СТ||О *нареч. разг.* ве́льмі чы́ста; **чи́сто-п.** чы́ста-чы́ста; **~ЫЙ** ве́льмі чы́сты.
ПРЖЕВА́ЛЬСК *г.* Пржэва́льск, -ка *м.*

ПРИ *предлог с предложн.* пры (*кім-чым*); **стоя́ть при вхо́де** стая́ць пры ўваходзе; **при доро́ге** пры даро́зе; **бой при Цуси́ме** бой пры Цусі́ме; **лаборато́рия при институ́те** лабараторыя пры інстытуце; **коми́ссия при Сове́те Мини́стров** камі́сія пры Саве́це Міні́страў; **при сове́тской вла́сти** пры саве́цкай ула́дзе; **он находи́лся всё вре́мя при мне** ён знахо́дзіўся ўвесь час пры мне; **служи́ть при шта́бе** служы́ць пры шта́бе; **име́ть при себе́ спра́вку с ме́ста рабо́ты** мець пры сабе́ даве́дку з ме́сца пра́цы; **при жела́нии всего́ мо́жно доби́ться** пры жада́нні ўсяго́ мо́жна дабі́цца; **при ору́жии** пры збро́і; **при встре́че** пры сустрэ́чы; **при соде́йствии прису́тствующих** пры садзе́йнічанні прысу́тных; **при перехо́де че́рез у́лицу** пры перахо́дзе це́раз ву́ліцу; **при по́лном молча́нии** пры по́ўным маўча́нні; **чита́ть при электри́честве** чыта́ць пры электры́чнасці; **сказа́ть при свиде́телях** сказа́ць пры све́дках; **э́то случи́лось при мне** гэ́та зда́рылася пры мне; *кроме того, иногда переводится также иными предлогами, в частности:* а) (*в знач. возле, около*) каля (*каго-чаго*), ля (*каго-чаго*); (*над*) над (*чым*); (*под*) пад (*чым*); **жить при ста́нции** жыць пры (каля, ля) ста́нцыі; **би́тва при Бородине́** бі́тва пры Барадзіне́ (каля Барадзіна́, ля Барадзіна́, пад Барадзіно́м); б) (*при наличии*) з (са) (*кім-чым*); (*с собой*) з сабо́й; **при таки́х зна́ниях** пры такі́х ве́дах, з такі́мі ве́дамі; **при тако́м здоро́вье** з такі́м здаро́ўем, пры такі́м здаро́ўі; **при часа́х** пры гадзі́нніку, з гадзі́ннікам; **де́ньги бы́ли при мне** гро́шы былі́ пры мне (са мной); **у него́ при себе́ все бума́ги** у яго́ з сабо́й (пры сабе́) усе́ папе́ры; в) (*во время, в эпоху*) за (*каго-што*), пад час (*чаго*); **при Пари́жской комму́не** пры Пары́жскай камуне, пад час Пары́жскай каму́ны; **при Петре́ Пе́рвом** пры Пятру́ Пе́ршым, за Пятра́ Пе́ршага; ◇ **при жи́зни** пры жыцці́; **при́ смерти** пры сме́рці; **при всём том** пры ўсім тым; **при э́том** пры гэ́тым; **при по́мощи** пры дапамо́зе, з дапамо́гаю; **при усло́вии** пры ўмо́ве; (*с условием*) з умо́вай; **при зву́ке его́ го́лоса** пачу́ўшы яго́ го́лас; **при слу́чае** калі́ бу́дзе (зда́рыцца) вы́падак; **быть при ме́сте** *уст.* быць на паса́дзе; **оста́ться при свои́х** заста́цца пры сваі́х; **быть при де́ле** быць заня́тым спра́вай.

ПРИАЗО́ВСКИЙ прыазо́ўскі.

ПРИАЗО́ВЬЕ Прыазо́ўе, -зо́ўя *ср.*

ПРИАМУ́РСКИЙ прыаму́рскі.

ПРИАМУ́РЬЕ Прыаму́р'е, -р'я *ср.*

ПРИАТЛАНТИ́ЧЕСКИЙ прыатланты́чны.

ПРИБА́В||ИТЬ *сов.* **1.** прыба́віць; (*добавить*) даба́віць; **п. со́ли в суп** прыба́віць (даба́віць) со́лі ў суп; **п. пять рубле́й** прыба́віць (даба́віць) пяць рублёў; **2.** (*увеличить*) прыба́віць; павялі́чыць (*што*); **п. ша́гу** прыба́віць кро́ку; **3.** (*сказать или написать в дополнение*) дада́ць; **п. от себя́** дада́ць ад сябе́; **4.** (*в весе*) *разг.* прыба́віцца, прыбы́ць; **она́ ~ила в ве́се не́сколько килогра́ммов** яна́ прыба́вілася (прыбыла́) у вазе́ на не́калькі кілагра́маў; **5.** *перен.* (*преувеличить*) *разг.* перабо́льшыць, перавялі́чыць; (*приврать*) прыхлусі́ць; **~ИТЬСЯ 1.** прыба́віцца, прыбы́ць, павялі́чыцца, пабо́льшаць; **день ~ился** дзень прыбы́ў (прыба́віўся, павялі́чыўся, пабо́льшаў); **воды́ ~илось** вады́ прыба́вілася (прыбыло́, пабо́льшала); **2.** (*в весе*) *разг.* прыба́віцца, прыбы́ць; **~КА** *ж* **1.** (*действие*) прыбаўле́нне, -ння *ср*, прыба́ўка, -кі *ж*; дабаўле́нне, -ння *ср*, даба́ўка, -кі *ж*; павелічэ́нне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) павялі́чванне, -ння *ср*; *см.* **приба́вить** 1, 2; **2.** (*то, что прибавлено*) прыба́ўка, -кі *ж*; **получи́ть ~ку** атрыма́ць прыба́ўку; **~ЛЕ́НИЕ** *ср* **1.** (*действие*) прыбаўле́нне, -ння *ср*, прыба́ўка, -кі *ж*; дабаўле́нне, -ння *ср*, даба́ўка, -кі *ж*; павелічэ́нне, -ння *ср*; павялі́чванне, -ння *ср*; дадава́нне, -ння *ср*; прыбыва́нне, -ння *ср*; перабо́льшанне, -ння *ср*, перабо́льшванне, -ння *ср*; перавелічэ́нне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) перавялі́чванне, -ння *ср*; *см.* **приба́вить, ~ся**; **2.** (*то, что прибавлено*) дада́так, -тку *м*; (*прибавка*) прыба́ўка, -кі *ж*; **рассказа́л об э́том с ра́зными ~ле́ниями** расказа́ў аб гэ́тым з ро́знымі дада́ткамі; **~ЛЯ́ТЬ** *несов.* **1.** прыбаўля́ць; (*добавлять*) дабаўля́ць; **2.** (*увеличивать*) прыбаўля́ць; павялі́чваць (*што*); **3.** (*говорить или писать в дополнение*) дадава́ць; **4.** (*в весе*) *разг.* прыбаўля́цца, прыбыва́ць; **5.** *перен.* (*преувеличивать*) *разг.* перабо́льшваць, перавялі́чваць; (*привирать*) прыхлу́шваць; **~ЛЯ́ТЬСЯ 1.** прыбаўля́цца, прыбыва́ць, павялі́чвацца; **2.** (*в весе*) *разг.* прыбаўля́цца, прыбыва́ць; **3.** *страд.* прыбаўля́цца; дабаўля́цца; павялі́чвацца; *см.* **прибавля́ть** 1, 2.

ПРИБА́ВОЧН||ЫЙ прыба́вачны; **~ая сто́имость** *эк.* прыба́вачная ва́ртасць; **п. труд** прыба́вачная пра́ца; **п. проду́кт** прыба́вачны праду́кт.

ПРИБАЙКА́ЛЬЕ Прыбайка́лле, -лля *ср.*

ПРИБАЙКА́ЛЬСКИЙ прыбайка́льскі.

ПРИБАЛТИ́ЙСКИЙ прыбалты́йскі.

ПРИБА́ЛТИКА Прыба́лтыка, -кі *ж.*

ПРИБАУ́ТКА пры́маўка, -кі *ж*, прыгаво́рка, -кі *ж.*

ПРИБЕГА́ТЬ I *несов.* (*к* **прибежа́ть**) прыбяга́ць.

ПРИБЕГА́ТЬ II *несов.* (*к* **прибе́гнуть**) звярта́цца (*обращаться*); ужыва́ць (*применять*); *см.* **прибе́гнуть.**

ПРИБЕ́ГНУТЬ *сов.* звярну́цца (*обратиться*); ужы́ць (*применить*); **п. к ору́жию** ужы́ць збро́ю; **п. к врачу́** звярну́цца да ўрача́; **п. к кра́йним ме́рам** ужы́ць кра́йнія ме́ры, зрабі́ць кра́йнія за́хады.

ПРИБЕДН||И́ТЬСЯ *сов.* прыбе́днiцца; **~Я́ТЬСЯ** *несов.* прыбядня́цца.

ПРИБЕЖА́ТЬ *сов.* прыбе́гчы.

ПРИБЕ́ЖИЩЕ *ср* прыста́нішча, -шча *ср*, прыста́нак, -нку *м* (*пристанище*); прыту́лак, -лку *м* (*приют*); абаро́на, -ны *ж* (*защита*).

ПРИБЕР||ЕГА́ТЬ *несов.* прыхо́ўваць, прыберага́ць; (*сберегать*) зберага́ць; **~ЕГА́ТЬСЯ** *страд.* прыхо́ўвацца, прыберага́цца; зберага́цца; **~ЕЖЁННЫЙ** прыхава́ны, прыберажо́ны; зберажо́ны.

ПРИБЕРЕ́ЖНИК *бот.* прыбярэ́жнік, -ку *м.*

ПРИБЕРЕ́ЖНЫЙ прыбярэ́жны.

ПРИБЕРЕ́ЧЬ *сов.* прыхава́ць, прыберагчы́; (*сбречь*) зберагчы́.

ПРИБИВА́ТЬ *несов. в разн. знач.* прыбіва́ць; **~СЯ** прыбіва́цца.

ПРИБИ́В||КА *ж* прыбіва́нне, -ння *ср*, прыбі́ўка, -кі *ж*; **~НО́Й** прыбі́ўны.

ПРИБИРА́ТЬ *несов. разг.* прыбіра́ць; *см.* **прибра́ть; ~СЯ** прыбіра́цца.

ПРИБИ́ТЫЙ прыбі́ты.

ПРИБИ́ТЬ *сов. в разн. знач.* прыбі́ць; **~СЯ** прыбі́цца.

ПРИБЛИЖ||А́ТЬ *несов. в разн. знач.* набліжа́ць, прыбліжа́ць; **~А́ТЬСЯ** набліжа́цца, прыбліжа́цца; **~Е́НИЕ** **1.** (*действие*) набліжэ́нне, -ння *ср*, прыбліжэ́нне, -ння *ср*; **2.** *мат.* прыбліжэ́нне, -ння *ср*; **сте́пень ~е́ния** ступе́нь прыбліжэ́ння; **~ЁННАЯ** *сущ.* прыблі́жаная, -най *ж*, блі́зкая асо́ба; **~ЁННО** *нареч.* прыблі́жана; **~ЁННОСТЬ** *мат.* прыблі́жанасць, -ці *ж.*

ПРИБЛИ́Ж||ЕННЫЙ наблі́жаны, прыблі́жаны; **~ЁННЫЙ 1.** *прил.* прыблі́жаны; (*близкий*) блі́зкі; **~ённое вычисле́ние** *мат.* прыблі́жанае вылічэ́нне; **2.** *сущ.* прыблі́жаны, -нага *м*, блі́зкая асо́ба.

ПРИБЛИЗИ́ТЕЛЬН||О *нареч.* прыблі́зна; **~ОСТЬ** прыблі́знасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыблі́зны.

ПРИБЛИ́ЗИТЬ *сов. в разн. знач.* наблі́зіць, прыблі́зіць; **~СЯ** наблі́зіцца, прыблі́зіцца.

ПРИБЛУДИ́||ВШИЙСЯ *прил.* прыблу́дны; **~ТЬСЯ** *сов. обл.* прыблудзі́цца.

ПРИБЛУ́ДНЫЙ *обл.* прыблу́дны.

ПРИБО́Й прыбо́й, -бо́ю *м*; **~НЫЙ** прыбо́йны.

ПРИБОЛО́ТНЫЙ прыбало́тны.

ПРИБО́Р *м* 1. (*приспособление*) прыла́да, -ды *м*; (*аппарат*) апара́т, -та *м*; (*машина*) машы́на, -ны *ж*; **измери́тельный п.** вымяра́льная прыла́да; **отопи́тельный п.** абаграва́льны апара́т; **счётный п.** лічы́льны апара́т (лічы́льная машы́на); **артиллери́йский п.** артылеры́йская прыла́да; **навигацио́нные ~ы** навігацы́йныя прыла́ды; **п. управле́ния зени́тным огнём** *воен.* прыла́да кірава́ння зені́тным агнём; **дымово́й п.** *воен.* дымавы́ апара́т; 2. (*комплект, набор предметов*) прыла́дак, -дку *м*; (*набор инструментов*) начы́нне, -нне *ср*; (*столовый*) прыбо́р, -ра *м*; куве́рт, -та *м*; пасу́дак, -дку *м*, серві́з, -за *м*; **пи́сьменный п.** пісьмо́вы прыла́дак; **п. для бритья́** прыла́дак для гале́ння; **туале́тный п.** туале́тны прыла́дак; **ками́нный п.** камі́нны прыла́дак; **накры́ть стол на пять ~ов** накры́ць стол на пяць асо́б (куве́ртаў); **ча́йный п.** ча́йны пасу́дак (ча́йны серві́з); 3. (*набор частей для изготовления чего-л.*) *спец.* набо́р, -ру *м*; (*принадлежности*) прыла́дак, -дку *м*, прыла́ддзе, -ддзя *ср*; **печно́й п.** пячны́ набо́р; **око́нный и дверно́й п.** ако́нны і дзвярны́ набо́р; **шве́йный п.** шве́йны набо́р (прыла́дак, шве́йнае прыла́ддзе).

ПРИБО́РКА *ж* прыбіра́нне, -нне *ср*, прыбо́рка, -кі *ж*.

ПРИБОРОСТРО||Е́НИЕ прыладабудава́нне, -ння *ср*; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** прыладабудаўні́чы.

ПРИ́БРАННЫЙ прыбра́ны.

ПРИБРА́ТЬ *сов. разг.* прыбра́ць; ◊ **п. к рука́м** прыбра́ць да рук; **~СЯ** *разг.* прыбра́цца.

ПРИБРЕ́Ж||НЫЙ узбярэ́жны, прыбярэ́жны; **~ЬЕ** узбярэ́жжа, -жжа *ср*, прыбярэ́жжа, -жжа *ср*.

ПРИБРЕСТИ́ *сов. разг.* прыйсці́ (*прийти*); прыцягну́цца, прывалачы́ся (*притащиться*); прыпле́сціся (*приплестись*).

ПРИБУКСИ́РОВА||ННЫЙ прыбуксі́раваны; **~ТЬ** *сов.* прыбуксі́раваць.

ПРИБЫВА́ТЬ *несов.* 1. прыбыва́ць; (*приезжать*) прыязджа́ць; (*приходить*) прыхо́дзіць; 2. (*увеличиваться*) прыбыва́ць; прыбаўля́цца; **п. в ве́се** прыбыва́ць у вазе́.

ПРИБЫ́ВШИЙ прыбы́ўшы, прыбылы́; прые́хаўшы; прыйшо́ўшы.

ПРИБЫЛО́Й 1. (*о воде*) прыбылы́; 2. (*о скоте*) сяго́летні; 3. (*лишний*) лі́шні; **п. па́лец у соба́к** лі́шні па́лец у саба́к.

ПРИ́БЫЛЬ *ж* 1. (*доход*) прыбы́так, -тку *м*; 2. (*приращение*) прыро́ст, -ту *м*; (*увеличение*) прыбыва́нне, -ння *ср*, павелічэ́нне, -ння *ср*; **п. населе́ния** прыро́ст насе́льніцтва; 3. *перен.* (*польза*) *разг.* кары́сць, -ці *ж*, прыбы́так, -тку *м*; ◊ **извлека́ть п.** атры́мліваць прыбы́так; **луна́ на при́были** ме́сяц прыбыва́е; **вода́ идёт на п.** вада́ прыбыва́е (падыма́ецца); **~НО** *нареч.* з прыбы́ткам, прыбытко́ва; **~НОСТЬ** прыбытко́васць, -ці *ж*; **~ность предпри́ятия** прыбытко́васць прадпрые́мства; **~НЫЙ** прыбытко́вы; **~ное заня́тие** прыбытко́вы заня́так.

ПРИБЫ́||ТИЕ *ср* прыбыццё, -цця́ *ср*; (*неоконч. действие*) прыбыва́нне, -ння *ср*; прые́зд, -ду *м*; прыхо́д, -ду *м*; **~ТЬ** *сов.* 1. прыбы́ць; (*приехать*) прые́хаць; (*прийти*) прыйсці́; 2. (*увеличиться*) прыбы́ць, прыба́віцца.

ПРИВА́Д||А *ж охот., рыбол.* 1. (*действие*) прына́джанне, -ння *ср*, прына́джванне, -ння *ср*, прына́да, -ды *ж*; 2. (*приманка*) прына́да, -ды *ж*; **~ИТЬ** *сов.* 1. прына́дзіць; **~ить те́терева** прына́дзіць цецерука́; 2. *перен. разг.* прына́дзіць; (*привлечь*) прыва́біць.

ПРИВА́ЖЕННЫЙ 1. прына́джаны; 2. *перен. разг.* прына́джаны; (*привлечённый*) прыва́блены.

ПРИВА́ЖИВАТЬ *несов.* 1. прына́джваць; на́дзіць; 2. *перен. разг.* прына́джваць; на́дзіць; (*привлекать*) прыва́бліваць, ва́біць.

ПРИВА́Л прыва́л, -лу *м*; **~ИВАТЬ** *несов.* 1. прыва́льваць; 2. (*о судах*) *спец.* падплыва́ць; (*приставать к чему-л.*) прыстава́ць; **~ИВАТЬСЯ** прыва́львацца; **~И́ТЬ** *сов.* 1. прываліць; **~и́ть ка́мень к стене́** прываліць ка́мень да сцяны́; **ему́ сча́стье ~и́ло** яму́ шча́сце прываліла; 2. (*о судах*) *спец.* падплы́ць; (*пристать к чему-л.*) прыста́ць.

ПРИВА́ЛЬНЫЙ *мор.* прыва́льны.

ПРИВА́Р||ЕННЫЙ прыва́раны; **~ИВАТЬ** *несов.* прыва́рваць; **~ИВАТЬСЯ** прыва́рвацца; **~И́ТЬ** *сов.* прывары́ць; **~И́ТЬСЯ** прывары́цца; **~КА** *ж* 1. (*действие*) прыва́рка, -кі *ж*; *неоконч.* прыва́рванне, -ння *ср*; 2. (*то, что приварено*) прыва́рка, -кі *ж*; **~ОК** прыва́рак, -рку *м*; **~ОЧНЫЙ** прыва́рачны.

ПРИВА́Т-ДОЦЕ́НТ *уст.* прыва́т-дацэ́нт, -та *м*.

ПРИВА́ТНЫЙ *уст.* прыва́тны.

ПРИВЕД||Е́НИЕ прывядзе́нне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** прыве́дзены.

ПРИВЕЗ||ЁННЫЙ прыве́зены; **~ТИ́** *сов.* прыве́зці.

ПРИВЕРЕ́Д||ЛИВОСТЬ *разг.* пераборлівасць, -ці *ж*; нараві́стасць, -ці *ж*; капры́знасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ** 1. пераборлівы; 2. (*о человеке*) пераборлівы; (*с прихотями*) нараві́сты; (*капризный*) капры́зны; **~НИК** *разг.* пераборлівы, -вага *м*; нараві́сты, -тага *м*; капры́зны, -нага *м*; **~НИЦА** пераборлівая, -вай *ж*; нараві́стая, -тай *ж*; капры́зная, -най *ж*; **~НИЧАНЬЕ** *ср разг.* перабіра́нне, -ння *ср*, перабо́ры, -раў *ед. нет*, пераборлівасць, -ці *ж*; нараві́стасць, -ці *ж*; капры́зы, -заў; **~НИЧАТЬ** *несов. разг.* перабіра́ць; нараві́цца; капры́зіць.

ПРИВЕ́РЖЕН||ЕЦ прыхі́льнік, -ка *м*; **~НОСТЬ** прыхі́льнасць, -ці *ж*; (*преданность*) адда́насць, -ці *ж*; **~НЫЙ** прыхі́льны; адда́ны.

ПРИВЁРНУТЫЙ прыкру́чаны.

ПРИВЕРНУ́ТЬ *сов. в разн. знач.* прыкруці́ць; **п. га́йку** прыкруці́ць га́йку; **п. фити́ль в ла́мпе** прыкруці́ць кнот у ля́мпе.

ПРИВЕРТЕ́ТЬ *сов.* прыкруці́ць.

ПРИВЁРТЫВАТЬ *несов. в разн. знач.* прыкру́чваць; *см.* **приверну́ть; ~СЯ** *страд.* прыкру́чвацца.

ПРИВЕ́С *м* прыбаўле́нне ў вазе́; **п. скота́** *с.-х.* прыбаўле́нне жывёлы ў вазе́.

ПРИВЕ́С||ИТЬ *сов.* прыве́сіць; (*прицепить*) прычапі́ць; **~КА** *ж* 1. прыве́шванне, -ння *ср*; прычэ́пліванне, -ння *ср*; **~НО́Й** прывясны́; прычапны́; **~ОК** *м* 1. прыве́сак, -ска *м*; (*дополнение*) дада́так, -тку *м*; 2. (*довесок*) дава́жка, -кі *ж*.

ПРИВЕСТИ́ *сов.* прыве́сці; **п. дете́й домо́й** прыве́сці дзяце́й дамо́ў; **п. в по́дданство** прыве́сці ў падда́нства; **п. в поря́док** прыве́сці ў пара́дак; **п. на па́мять** прыве́сці на па́мяць; **~СЬ** *безл.* даве́сціся, прыйсці́ся; **не привело́сь побыва́ть** не давяло́ся пабы́ць.

ПРИВЕ́Т *м* прывіта́нне, -ння *ср*, віта́нне, -ння *ср*; ◊ **ни отве́та, ни ~а** *разг.* ні слы́ху, ні ды́ху; **~ИТЬ** *сов. уст.* 1. (*приветливо отнестись*) прыве́ціць; 2. (*приветствовать*) *поэт.* прывіта́ць; **~ЛИВО** *нареч.* прыве́тліва, ве́тліва; **~ЛИВОСТЬ** прыве́тлівасць, -ці *ж*, ве́тлівасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ** прыве́тлівы, ве́тлівы; **~НЫЙ** *уст.* прыве́тлівы, ве́тлівы; **~СТВЕННЫЙ** прывіта́льны; **~СТВИЕ** прывіта́нне, -ння *ср*; **~СТВОВАТЬ** *сов.* прывіта́ць; *несов.* віта́ць.

ПРИВЕ́Ш||ЕННЫЙ прыве́шаны; (*прицепленный*) прычэ́плены; **~ИВАТЬ** *несов.* прыве́шваць; (*прицеплять*) прычэ́пліваць, прычапля́ць; **~ИВАТЬСЯ** прыве́швацца; прычэ́плівацца, прычапля́цца.

ПРИВИВА́||ЕМОСТЬ прышчэ́пнасць, -ці *ж*, прышчапля́льнасць, -ці *ж*; **~НИЕ** *прям., перен.* прышчэ́пліванне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬ** *мед.* прышчэ́пнік, -ка *м*; **~ТЬ** *несов. прям., перен.* прышчэ́пліваць; *см.* **приви́ть; ~ТЬСЯ** *несов.* прышчэ́плівацца.

ПРИВИ́В||КА *ж* 1. (*действие*) прышчэ́пліванне, -ння *ср*, прышчэ́пка, -кі *ж*; 2. (*привой*) *сад.* прышчэ́пак, -пка *м*; 3. (*прививочный препарат*) *мед.* прышчэ́пка, -кі *ж*; прышчэ́пачны прэпара́т; **~НО́Й** прышчэ́пны; **~ОК** *сад.* прышчэ́пак, -пка *м*; **~ОЧНЫЙ** 1. (*прил. к* **приви́вка**) *сад., мед.*

прышчэ́пачны; 2. (*прил. к* **приви́вок**) прышчэ́пкавы; ~**ЧИВЫЙ** *сад., мед.* прышчэ́плівы.
ПРИВИДЕ́НИЕ *ср* здань, -ні *ж*; (*призрак*) пры́від, -ду *м.*
ПРИВИ́ДЕТЬСЯ *сов.* паказа́цца, зда́цца; (*во сне*) пры-сні́цца.
ПРИВИЛ||ЕГИРО́ВАННОСТЬ прывілеява́насць, -ці *ж*, прывіле́йнасць, -ці *ж*; ~**ЕГИРО́ВАННЫЙ** прывілеява́ны, прывіле́йны; ~**Е́ГИЯ** прывіле́я, -ле́і *ж.*
ПРИВИНТИ́ТЬ *сов.* прышрубава́ць; (*привернуть*) пры-круці́ць; ~**СЯ** прышрубава́цца; прыкруці́цца.
ПРИВИ́НЧ||ЕННЫЙ прышрубава́ны; (*привёрнутый*) прыкру́чаны; ~**ИВАТЬ** *несов.* прышрубо́ўваць; прыкру́ч-ваць; ~**ИВАТЬСЯ** прышрубо́ўвацца; прыкру́чвацца.
ПРИВИРА́ТЬ *несов. разг.* прыхлу́шваць.
ПРИВИ́Т||ИЕ *прям., перен.* прышчэ́пліванне, -ння *ср*, *мн. нет*; ~**О́Й**, ~**ЫЙ** прышчэ́плены.
ПРИВИ́ТЬ *сов. прям., перен.* прышчапі́ць; **п. вкус** ■ **литерату́ре** прышчапі́ць густ да літарату́ры; ~**СЯ** *сов.* прышчапі́цца.
ПРИ́ВКУС *м* 1. пры́смак, -ку *м*; 2. *перен.* пры́смак, -ку *м*; (*оттенок*) адце́нне, -ння *ср.*
ПРИВЛЕКА́ТЕЛЬН||О *нареч.* прыва́бна; ~**ОСТЬ** пры-ва́бнасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** прыва́бны.
ПРИВЛ||ЕКА́ТЬ *несов.* 1. прыця́гваць; (*к участию в чём-л.— ещё*) залуча́ць; (*вовлекать*) уця́гваць (*у што*); **п. внима́ние** прыця́гваць ува́гу; **п. взо́ры** прыця́гваць по́зіркі (по́гляды); **п. к отве́тственности** прыця́гваць да адка́знасці; **п. к суду́** прыця́гваць да суда́; **п. к рабо́те** прыця́гваць (залуча́ць) да рабо́ты, уця́гваць у рабо́ту; 2. (*влечь, манить*) прыця́гваць, ва́біць, прыва́бліваць; **п. свои́м тала́нтом** прыця́гваць (ва́біць, прыва́бліваць) сваі́м та́лентам; 3. (*склонять*) схіля́ць; **п. на свою́ сто́рону** схіля́ць на свой бок; ~**ЕКА́ТЬСЯ** *страд.* 1. прыця́гвацца, залуча́цца, уця́гвацца; 2. прыця́гвацца, ва́біцца, прыва́блі-вацца; ~**ЕЧЕ́НИЕ** 1. прыцягне́нне, -ння *ср*, прыця́гванне, -ння *ср*; залучэ́нне, -ння *ср*; 2. прыцягне́нне, -ння *ср*, прыця́гванне, -ння *ср*, ва́бленне, -ння *ср*; прыва́бліванне, -ння *ср*; 3. схіле́нне, -ння *ср*; *см.* **привлека́ть**; ~**ЕЧЁННЫЙ** 1. прыця́гнены, прыця́гнуты; залу́чаны; 2. прыця́гнены, прыця́гнуты, прыва́блены; 3. схі́лены; ~**Е́ЧЬ** *сов.* 1. пры-цягну́ць; (*к участию в чём-л.— ещё*) залучы́ць; (*со-влечь*) уцягну́ць (*у што*); 2. (*увлечь*) прыцягну́ць, прыва́біць; 3. (*склонить*) схілі́ць; *см.* **привлека́ть**.
ПРИВН||ЕСЕ́НИЕ прыўнясе́нне, -ння *ср*; ~**ЕСЁННЫЙ** прыўне́сены; ~**ЕСТИ́** *сов.* прыўне́сці; ~**ОСИ́ТЬ** *несов.* прыўно́сіць; ~**ОСИ́ТЬСЯ** *страд.* прыўно́сіцца.
ПРИВО́Д I *м юр.* прыво́д, -ду *м*; прывядзе́нне, -ння *ср.*
ПРИВО́Д II *тех.* прыво́д, -да *м*; (*конный — ещё*) мане́ж, -жа́ *м*; (*ремённый*) пас, *род.* па́са *м.*
ПРИВОДИ́М||ОСТЬ *мат.* прыво́днасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** прыво́дны.
ПРИВОДИ́ТЬ *несов.* прыво́дзіць; *см.* **привести́**.
ПРИВОДИ́ТЬСЯ *несов. страд.* (*к* **приводи́ть**) прыво́-дзіцца.
ПРИВО́Д||КА *ж* 1. (*действие*) *разг.* прывядзе́нне, -ння *ср*, прыво́д, -ду *м*; 2. *тип.* прыво́дка, -кі *ж*; ~**НО́Й** *тех.* прывадны́; ~**но́й реме́нь** (прывадны́) пас.
ПРИВО́З прыво́з, -зу *м*; ~**И́ТЬ** *несов.* прыво́зіць; ~**И́ТЬСЯ** *страд.* прыво́зіцца; ~**КА** *ж простореч.* пры-во́з, -зу *м*; ~**НО́Й**, ~**НЫЙ** прывазны́.
ПРИВО́Й *сад.* прышчэ́пак, -пка *м.*
ПРИВОКЗА́ЛЬНЫЙ прываказа́льны.
ПРИВОЛА́КИВАТЬ *несов. простореч.* прывала́кваць, прывалака́ць, прыця́гваць; ~**СЯ** *страд.* прывала́квацца, прывалака́цца, прыця́гвацца.
ПРИВО́ЛЖСКИЙ прывало́жскі.
ПРИВО́ЛЖЬЕ Прыво́лжжа, -жжа *ср.*
ПРИВОЛОКНУ́ТЬСЯ *сов. разг.* пача́ць заляца́цца (*да каго*), пача́ць упада́ць (*за кім*), пача́ць уляга́ць (*за кім*).
ПРИВОЛО́||ЧЕННЫЙ прывало́чаны, прыця́гнуты; ~**ЧИ́ТЬ**, ~**ЧИ́ТЬСЯ** *сов. см.* **приволо́чь**, ~**ся**; ~**ЧЬ** *сов. простореч.* прывалачы́, прыцягну́ць; ~**ЧЬСЯ** пры-валачы́ся, прыцягну́цца.
ПРИВО́ЛЬ||Е прыво́лле, -лля *ср*; ~**НО** *нареч.* прыво́льна; ~**НЫЙ** прыво́льны.
ПРИВОРА́ЖИВАТЬ *несов. прям., перен.* прывaро́жваць, прычаро́ўваць; ~**СЯ** *страд.* прываро́жвацца, прычаро́ў-вацца.
ПРИВОРА́ЧИВАТЬ *несов. разг.* прываро́чваць; ~**СЯ** *страд.* прываро́чвацца.
ПРИВОРО́Ж||ЁННЫЙ прываро́жаны, прычарава́ны; ~**И́ТЬ** *сов. прям., перен.* прываражы́ць, прычарава́ць.
ПРИВОРО́Т *м этн.* ча́ры, -раў *ед. нет*, чараўні́цтва, -ва *ср*, нагаво́р, -ру *м*; ~**НЫЙ** нагаво́рны, чараўні́чы; ~**ное зе́лье** нагаво́рнае зе́лле.
ПРИВРА́ТНИ||К 1. бра́мнік, -ка *м*; вартаўні́к пры ва-ро́тах; 2. *анат.* прываро́тнік, -ка *м*; ~**ЦА** бра́мніца, -цы *ж*; вартаўні́ца пры варо́тах.
ПРИВРА́ТЬ *сов. разг.* прыхлусі́ць.
ПРИВСК||А́КИВАТЬ *несов.* прыўска́кваць; ~**ОЧИ́ТЬ** *сов.* прыўско́чыць.
ПРИВСТ||АВА́ТЬ *несов.* прыўстава́ць; ~**А́ТЬ** *сов.* пры-ўста́ць.
ПРИВХОДЯ́Щ||ИЙ пабо́чны (*посторонний*); выпадко́вы (*случайный*); дадатко́вы (*дополнительный*); ~**ие обстоя́-тельства** пабо́чныя акалі́чнасці.
ПРИВЫКА́ТЬ *несов.* прывыка́ць; (*осваиваться*) прызвы-ча́йвацца; ◇ **нам не п.** *разг.* нам не прывыка́ць.
ПРИВЫ́||КНУТЬ *сов.* прывы́кнуць; (*освоиться*) пры-звыча́іцца; ~**ЧКА** прывы́чка, -кі *ж*, звы́чка, -кі *ж*; ~**ЧНОСТЬ** прывы́чнасць, -ці *ж*; звыча́йнасць, -ці *ж*; ~**ЧНЫЙ** 1. (*ставший привычкой*) прывы́чны; (*обычный*) звыча́йны; ~**чный о́браз жи́зни** прывы́чны (звыча́йны) спо́саб жыцця́; ~**чное явле́ние** звыча́йная (прывы́чная) з'ява; 2. (*привыкший*) *разг.* звы́клы, прызвыча́ены; **он челове́к** ~**чный** ён чалаве́к звы́клы; ~**чный конь** пры-звыча́ены (звы́клы) конь.
ПРИВЯ́ЗАННОСТЬ *ж* 1. (*о чувстве*) прыхі́льнасць, -ці *ж* (*расположение*); сімпа́тыя, -тыі *ж* (*симпатия*); лю́басць, -ці *ж*, любо́ў, -бві *ж*, замілава́нне, -ння *ср* (*лю-бовь*); адда́насць, -ці *ж* (*преданность*); **п.** ■ **нау́ке** прыхі́льнасць (лю́басць) да навукі, адда́насць наву́цы; **п. к семье́** любо́ў да сям'і́, адда́насць сям'і́; 2. (*о че-ловеке или предмете*) упадаба́нне, -ння *ср*, упадо́ба, -бы *ж*; сімпа́тыя, -тыі *ж* (*симпатия*), любо́ў, -бві *ж*, замі-лава́нне, -ння *ср* (*любовь*); улюбе́нец, -нца *м* (*любимец*), улюбёнка, -кі *ж* (*любимица*); **кни́га — моя́ давни́шняя п.** кні́га — мая́ да́ўняя ўпадо́ба (маё да́ўняе ўпадаба́нне); **она́ — его́ ста́рая п.** яна́ — яго́ стара́я сімпа́тыя (любо́ў).
ПРИВЯ́З||АННЫЙ 1. *прич.* прывя́заны; 2. *прил.* адда́ны (*преданный*); прыхі́льны (*расположенный*); ~**А́ТЬ** *сов.* 1. прывяза́ць; 2. *перен.* (*расположить к себе*) схілі́ць (*склонить*); вы́клікаць прыхі́льнасць (сімпа́тыю, лю́басць, любо́ў, замілава́нне, адда́насць) (*вызвать, внушить чув-ство привязанности*); прыва́біць (*привлечь*); ~**А́ТЬСЯ** 1. прывяза́цца; 2. *перен.* (*почувствовать привязанность*) адчу́ць (займе́ць) прыхі́льнасць (сімпа́тыю, лю́басць, любо́ў, замілава́нне, адда́насць); (*полюбить*) палюбі́ць, упадаба́ць; (*прывыкнуть*) прывы́кнуць; 3. (*придраться, пристать*) прычапі́цца; ~**КА** *ж разг.* прывя́званне, -ння *ср*, прывя́зка, -кі *ж*; ◇ **топографи́ческая** ~**ка** *воен.* тапаграфі́чная прывя́зка.
ПРИВЯ́ЗНИК *ав.* прывя́знік, -ка *м.*
ПРИВЯЗНО́Й прывязны́.
ПРИВЯ́ЗЧИВ||ОСТЬ 1. прыхі́лістасць, -ці *ж*; схі́льнасць да лю́басці (да замілава́насці, да адда́насці); 2. (*придир-чивость*) прычэ́плівасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** 1. (*склонный к чувству привязанности*) прыхі́лісты; схі́льны да лю́басці

(да замілава́насці, да адда́насці); 2. (*придирчивый*) прычэ́плівы.

ПРИВЯ́ЗЫВАТЬ *несов.* 1. прывя́зваць; 2. *перен.* (*располагать к себе*) схіля́ць (*склонять*); выкліка́ць прыхільнасць (сімпа́тыю, лю́басць, любо́ў, замілава́нне, адда́насць) (*вызывать, внушать чувство привязанности*); прыва́бліваць; **∼СЯ** 1. прывя́звацца; 2. *перен.* (*чувствовать привязанность*) адчува́ць (пачува́ць, мець) прыхільнасць (сімпа́тыю, лю́басць, любо́ў, замілава́нне, адда́насць); (*любить*) любі́ць; (*привыкать*) прывыка́ць; 3. *перен.* (*придираться, приставать*) чапля́цца, прычэ́пліваццa.

ПРИ́ВЯЗ||Ь пры́вязь, -зі *ж*; **держа́ть на ∼и** трыма́ць на пры́вязі.

ПРИВЯ́ЛИ||ВАТЬ *несов.* прывя́льваць; **∼ТЬ** *сов.* прывя́ліць.

ПРИВЯ́НУТЬ *сов. разг.* прывя́нуць.

ПРИГА́Р *м* 1. прыга́рка, -кі *ж*, прыга́р, -ру *м*; 2. *тех.* прыга́р, -ру *м*; **∼ИНА** прыга́рка, -кі *ж*.

ПРИ́ГАРЬ *ж* прыга́р, -ру *м*; **с ∼ю** прыгарэ́лы.

ПРИГАС||А́ТЬ *несов.* прытуха́ць, прыгаса́ць; **∼И́ТЬ** *сов.* прытушы́ць, прыгасі́ць.

ПРИГА́С||НУТЬ *сов.* прыту́хнуць, прыга́снуць; **∼ШИЙ** прыту́хлы, прыга́слы.

ПРИГАША́ТЬ *несов.* прыту́шваць, прыгаша́ць.

ПРИГВО||ЖДА́ТЬ *несов.* 1. прыбіва́ць; 2. *перен.* прыко́ўваць; **∼ЗДИ́ТЬ** *сов.* 1. прыбі́ць; 2. *перен.* прыкава́ць; **страх ∼здил его́ к ме́сту** страх прыкава́ў яго́ да ме́сца; ◇ **∼зди́ть к позо́рному столбу́** *перен.* паста́віць да ганебнага слупа.

ПРИГИБА́ТЬ *несов.* прыгіна́ць, прыгіба́ць; **∼СЯ** прыгіна́цца, прыгіба́цца.

ПРИГЛА́||ДИТЬ *сов.* прыгла́дзіць; **∼ДИТЬСЯ** прыгла́дзіцца; **∼ЖЕННЫЙ** прыгла́джаны; **∼ЖИВАТЬ** *несов.* прыгла́джваць; **∼ЖИВАТЬСЯ** прыгла́джвацца.

ПРИГЛАСИ́||ТЕЛЬНЫЙ запраша́льны; **п. биле́т** запраша́льны біле́т; **∼ТЬ** *сов.* запрасі́ць.

ПРИГЛАШ||А́ТЬ *несов.* запраша́ць; **∼А́ТЬСЯ** *страд.* запраша́цца; **∼Е́НИЕ** *в разн. знач.* запрашэ́нне, -ння *ср*; **яви́ться по ∼е́нию** з'яві́цца па запрашэ́нню; **разосла́ть ∼е́ния** разасла́ць запрашэ́нні; **∼Ё́ННЫЙ** запро́шаны.

ПРИГЛУШ||А́ТЬ *несов.* прыглуша́ць; **∼А́ТЬСЯ** *страд.* прыглуша́цца; **∼Ё́ННЫЙ** *прич., прил.* прыглу́шаны; **∼И́ТЬ** *сов.* прыглушы́ць.

ПРИГЛЯДЕ́ТЬ *сов. разг.* 1. (*за кем-чем*) панагляда́ць; дагле́дзець (*каго-што*); **п. за детьми́** дагле́дзець дзяце́й; 2. (*кого-что*) нагле́дзець; **п. но́вый га́лстук** нагле́дзець но́вы га́льштук; **∼СЯ** прыгле́дзецца.

ПРИГЛЯ́ДЫВАТЬ *несов. разг.* 1. (*за кем-чем*) нагляда́ць; дагляда́ць (*каго-што*); 2. (*кого-что*) нагляда́ць; *см.* **пригляде́ть**; **∼СЯ** прыгля́двацца.

ПРИГЛЯНУ́ТЬ *сов. см.* **пригляде́ть** 1.

ПРИГЛЯНУ́ТЬСЯ *сов.* спадаба́цца, упадаба́цца; кі́нуцца ў во́ка.

ПРИ́ГНАННЫЙ I (*к* **пригна́ть** I) прыгна́ны.

ПРИ́ГНАННЫЙ II (*прилаженный*) прыгна́ны, дапу́шчаны; *см.* **пригна́ть** II.

ПРИГНА́ТЬ I *сов.* прыгна́ць; **п. ста́до домо́й** прыгна́ць ста́так дамо́ў.

ПРИГНА́ТЬ II *сов.* (*приладить*) прыгна́ць, дапусці́ць; **п. око́нную ра́му** прыгна́ць (дапусці́ць) ако́нную ра́му.

ПРИГНУ́||ТЫЙ прыгну́ты; **∼ТЬ** *сов.* прыгну́ць; **∼ТЬСЯ** прыгну́цца.

ПРИГОВА́РИВАТЬ I *несов.* (*выносить приговор*) прыгаво́рваць; прысуджа́ць.

ПРИГОВА́РИВАТЬ II *несов.* (*говорить что-л. делая*) прыка́зваць, прымаўля́ць, прыгаво́рваць.

ПРИГОВА́РИВАТЬСЯ *несов. страд.* (*присуждаться*) прыгаво́рвацца; прысуджа́цца.

ПРИГОВО́Р *м* 1. (*судебный*) прыгаво́р, -ру *м*; прысу́д, -ду *м*; **вы́нести п.** вы́несці прыгаво́р; **оправда́тельный п.** апраўда́льны прыгаво́р; **сме́ртный п.** смяро́тны прыгаво́р; **привести́ п. ■ исполне́ние** прыве́сці прыгаво́р у выкана́нне; 2. (*постановление*) пастано́ва, -вы *ж*; (*решение*) рашэ́нне, -ння *ср*; 3. *перен.* прысу́д, -ду *м*, прыгаво́р, -ру *м*, вы́рак, -ку *м*; **что ни сло́во — п.** што ні сло́ва — прысу́д (вы́рак); 4. (*прибаутка*) *обл.* пры́маўка, -кі *ж*, прыгаво́рка, -кі *ж*; **голова́ с покло́ном, язы́к с ∼ом** *погов.* галава́ з пакло́нам, язы́к з прыгаво́ркай.

ПРИГОВОР||Ё́ННЫЙ прыгаво́раны; прысу́джаны; **∼И́ТЬ** *сов.* прыгавары́ць; прысудзі́ць.

ПРИГОВО́РКА *обл.* пры́маўка, -кі *ж*, прыгаво́рка, -кі *ж*.

ПРИГОДИ́ТЬСЯ *сов.* спатрэ́біцца.

ПРИГО́ДН||ОСТЬ прыго́днасць, -ці *ж*, прыда́тнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** прыго́дны, прыда́тны.

ПРИГО́Ж||ЕСТЬ прыго́жасць, -ці *ж*, прыгажо́сць, -ці *ж*; **∼ИЙ** прыго́жы.

ПРИГОЛУ́Б||ИТЬ *сов. разг.* прыгалу́біць; **∼ЛЕННЫЙ** прыгалу́блены; **∼ЛИВАТЬ** *несов. разг.* прыгалу́бліваць.

ПРИГО́Н прыго́н, -ну *м*; **∼КА** *спец.* прыго́нка, -кі *ж*; **∼НЫЙ** прыго́нны; **∼ОЧНЫЙ** прыго́начны.

ПРИГОНЯ́ТЬ I *несов.* прыганя́ць.

ПРИГОНЯ́ТЬ II *несов.* (*прилаживать*) прыганя́ць; дапуска́ць.

ПРИГОНЯ́ТЬСЯ I *несов. страд.* прыганя́цца.

ПРИГОНЯ́ТЬСЯ II *несов. страд.* (*прилаживаться*) прыганя́цца, дапуска́цца.

ПРИГОРА́ТЬ *несов.* прыгара́ць, прыга́рваць.

ПРИГОРЕ́||ВШИЙ, ∼ЛЫЙ прыгарэ́лы; **∼ТЬ** *сов.* прыгарэ́ць.

ПРИ́ГОРОД пры́гарад, -да *м*.

ПРИ́ГОРОДН||ЫЙ пры́гарадны; **∼ая ме́стность** пры́гарадная мясцо́васць; **∼ый по́езд** пры́гарадны по́езд; **∼ая желе́зная доро́га** пры́гарадная чыгу́нка.

ПРИГО́РОК паго́рак, -рка *м*; узго́рак, -рка *м*.

ПРИ́ГОРШНЯ *ж* пры́гаршчы, -чаў *ед. нет*; **по́лными ∼ми** *перен.* по́ўнымі пры́гаршчамі.

ПРИГОРЮ́НИ||ВАТЬСЯ *несов. разг.* журы́цца; **∼ТЬСЯ** *сов. разг.* зажуры́цца.

ПРИГОТА́ВЛИВАТЬ *несов.* 1. падрыхто́ўваць, рыхтава́ць; 2. (*стряпать*) гатава́ць, вары́ць; **∼СЯ** 1. падрыхто́ўвацца; рыхтава́цца; 2. *страд.* падрыхто́ўвацца, рыхтава́цца; гатава́цца, вары́цца; *см.* **пригота́вливать**.

ПРИГОТОВИ́ТЕЛЬНЫЙ падрыхто́ўчы; **п. класс** *уст.* падрыхто́ўчы клас.

ПРИГОТО́В||ИТЬ *сов.* 1. падрыхтава́ць; 2. (*состряпать*) згатава́ць, звары́ць; **∼ИТЬСЯ** падрыхтава́цца; **∼ЛЕ́НИЕ** *ср* 1. (*действие*) падрыхто́ўванне, -ння *ср*, падрыхто́ўка, -кі *ж*, рыхтава́нне, -ння *ср*; гатава́нне, -ння *ср*, варэ́нне, -ння *ср*; *см.* **пригота́вливать**; 2. (*подготовительные работы*) падрыхто́ўка, -кі *ж*; **∼ЛЕННЫЙ** 1. падрыхтава́ны; 2. згатава́ны, зва́раны; **∼ЛЯ́ТЬ** *несов.* 1. падрыхто́ўваць, рыхтава́ць; 2. (*стряпать*) гатава́ць, вары́ць; **∼ЛЯ́ТЬСЯ** 1. падрыхто́ўвацца, рыхтава́цца; 2. *страд.* падрыхто́ўвацца, рыхтава́цца; гатава́цца, вары́цца; *см.* **приготовля́ть**.

ПРИГРЕБ||А́ТЬ *несов.* 1. прыграба́ць; прыго́ртваць (*только о чём-л. сыпучем*); 2. (*вёслами*) прывясло́ўваць; **∼А́ТЬСЯ** 1. прывясло́ўвацца; 2. *страд.* прыграба́цца, прыго́ртвацца; прывясло́ўвацца; *см.* **пригреба́ть**; **∼Ё́ННЫЙ** прыгрэ́бены; прыго́рнуты.

ПРИГРЕ́В *м* прыгрэ́ў, -рэ́ву *м*, сонцапёк, -ку *м*, со́нца, -ца *ср*.

ПРИГРЕВА́||НИЕ прыграва́нне, -ння *ср*; **∼ТЬ** *несов.* прыграва́ць; **∼ТЬСЯ** прыграва́цца.

ПРИГРЕ́ЗИТЬСЯ *сов.* прымро́іцца; (*представиться в мечтах*) прыма́рыцца; (*померещиться*) зда́цца; (*привидеться во сне*) прысні́цца, сасні́ць (*каго-што*).

ПРИГРЕСТИ́ *сов.* 1. прыгрэ́бці; прыгарну́ць (*только о чём-л. сыпучем*); 2. (*вёслами*) прывеславаць.
ПРИГРЕ́||ТЫЙ прыгрэ́ты; **~ТЬ** *сов.* прыгрэ́ць.
ПРИГРОЗИ́ТЬ *сов.* прыгразі́ць.
ПРИГУ́Б||ИТЬ *сов.* прыгу́біць; **~ЛЕННЫЙ** прыгу́блены; **~ЛИВАТЬ** *несов.* прыгу́бліваць.
ПРИГУ́Л *с.-х.* нагу́л, -лу *м*, напа́с, -су *м*.
ПРИГУ́Л||ИВАТЬ *несов. с.-х.* нагу́льваць, напа́сваць; **~ЯТЬ** *сов. с.-х.* нагуля́ць, напа́свіць.
ПРИДАВА́ТЬ *несов.* 1. (*усиливать, прибавлять*) прыдава́ць, дадава́ць; **п. эне́ргии** прыдава́ць (дадава́ць) энэ́ргіі; **п. бо́дрости** прыдава́ць (дадава́ць) бадзёрасці; **п. уве́ренности** прыдава́ць (дадава́ць) упэ́ўненасці; 2. (*сообщать какое-л. качество, свойство, вкладывать какой-л. смысл*) надава́ць; **лак придава́л ме́бели блеск** лак надава́ў мэ́блі бляск; **п. серьёзное выраже́ние своему́ лицу́** надава́ць сур'ёзны вы́раз сваймý тва́ру; **я не придава́л э́тому никако́го значе́ния** я не надава́ў гэ́таму ніякага значэ́ння.
ПРИДАВИ́ТЬ *сов.* 1. прыдушы́ць; (*прижать*) прыціснуць; 2. *перен.* прыгнясці́.
ПРИДА́ВЛ||ЕННОСТЬ прыгне́чанасць, -ці *ж*; **~ЕННЫЙ** 1. прыду́шаны; (*прижатый*) прыці́снуты; 2. *перен.* прыгне́чаны; **~ИВАТЬ** *несов.* 1. прыду́шваць; (*прижимать*) прыціска́ць; 2. *перен.* прыгнята́ць.
ПРИДА́НИЕ нада́нне, -ння *ср*; **п. зако́нной си́лы** *юр.* нада́нне зако́ннай сі́лы.
ПРИ́ДАННЫЙ 1. (*усиленный, прибавленный*) прыда́дзены, дада́дзены; 2. (*сообщённый чему-л.*) нада́дзены; 3. *воен.* прыда́дзены; *см.* **прида́ть.**
ПРИДА́НОЕ *ср уст.* пасаг, -гу *м*.
ПРИДА́Т||КОВЫЙ прыда́ткавы; **~ОК** прыда́так, -тку *м*; **~ОЧНЫЙ** прыда́ткавы; ◇ **~очное предложе́ние** *грам.* дада́ны сказ.
ПРИДА́||ТЬ *сов.* 1. (*усилить, прибавить*) прыда́ць, дада́ць; 2. (*сообщить качество, свойство, вложить какой-л. смысл*) нада́ць; *см.* **придава́ть; ~ЧА** *ж* 1. (*действие*) дадава́нне, -ння *ср*, дада́ча, -чы *ж*; прыдава́нне, -ння *ср*, прыда́ча, -чы *ж*; 2. (*то, что придано*) дада́ча, -чы *ж*; (*прибавка*) прыда́ча, -чы *ж*, дада́так, -тку *м*; ◇ **в ~чу** *разг.* у прыда́чу (у дада́так).
ПРИДВИГА́ТЬ *несов.* 1. прысо́ўваць; (*пододвигать*) падсо́ўваць; 2. (*сроки*) прыбліжа́ць, набліжа́ць; **~СЯ** 1. прысо́ўвацца; падсо́ўвацца; 2. прыбліжа́цца, набліжа́цца.
ПРИДВИЖНО́Й прыстаўны́, прысо́ўны.
ПРИДВИ́НУ||ТЫЙ 1. прысу́нуты; падсу́нуты; 2. прыблі́жаны, набліжаны; **~ТЬ** *сов.* 1. прысу́нуць; (*пододвинуть*) падсу́нуць; 2. (*сроки*) прыблі́зіць, наблі́зіць; **~ТЬСЯ** 1. прысу́нуцца; падсу́нуцца; 2. прыблі́зіцца, наблі́зіцца.
ПРИДВО́РНЫЙ 1. *прил.* прыдво́рны; 2. *сущ.* прыдво́рны, -нага *м*.
ПРИДЕ́Л *м* 1. (*пристройка*) *уст.* прыбудо́ўка, -кі *ж*; 2. *церк.* бакавы́ алта́р.
ПРИДЕ́Л||АННЫЙ 1. прыро́блены; 2. прыбудава́ны; **~АТЬ** *сов.* 1. прырабі́ць; 2. (*пристроить*) прыбудава́ць; **~КА** прыро́бка, -кі *ж*; **~ЫВАТЬ** *несов.* 1. прырабля́ць; 2. (*пристраивать*) прыбудо́ўваць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд.* 1. прырабля́цца; 2. прыбудо́ўвацца.
ПРИДЕ́РЖ||АННЫЙ прытрыма́ны; **~А́ТЬ** *сов.* прытрыма́ць; **~ИВАТЬ** *несов.* прытры́мліваць; **~ИВАТЬСЯ** *в разн. знач.* прытры́млівацца.
ПРИДИ́Р||А *разг.* прыдзі́ра, -ры *м* и *ж*, прычэ́па, -пы *м* и *ж*; **~А́ТЬСЯ** *несов.* прыдзіра́цца, чапля́цца; **~КА** прыдзі́рка, -кі *ж*, прычэ́пка, -кі *ж*, пры́чапка, -кі *ж*; **~ЧИВО** *нареч.* прыдзі́рліва; **~ЧИВОСТЬ** прыдзі́рлівасць, -ці *ж*; **~ЧИВЫЙ** прыдзі́рлівы.
ПРИДНЕПРО́ВСКИЙ прыдняпро́ўскі.
ПРИДНЕПРО́ВЬЕ Прыдняпро́ўе, -ро́ўя *ср.*
ПРИДНЕСТРО́ВСКИЙ прыднястро́ўскі.
ПРИДНЕСТРО́ВЬЕ Прыднястро́ўе, -ро́ўя *ср.*

ПРИДО́НСКИЙ прыдо́нскі.
ПРИДОРО́ЖН||ИК *бот. обл.* трыпу́тнік, -ку *м*; **~ЫЙ** прыдаро́жны.
ПРИДРА́ТЬСЯ *сов. разг.* прыдра́цца, прычапі́цца.
ПРИДТИ́, ~СЬ *см.* **прийти́, ~сь.**
ПРИДУ́М||АННЫЙ прыду́маны; **~АТЬ** *сов.* прыду́маць; **~ЫВАТЬ** *несов.* прыду́мваць; прыдумля́ць; **~ЫВАТЬСЯ** *страд.* прыду́мвацца, прыдумля́цца.
ПРИДУРКОВА́Т||ОСТЬ прыду́ркаватасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыду́ркаваты.
ПРИ́ДУРЬ *ж* дур, *род.* ду́ру *м*, ду́расць, -ці *ж*; **с ~ю** прыду́ркаваты.
ПРИДУ́Ш||ЕННЫЙ *прич., прил.* прыду́шаны; **~И́ТЬ** *сов.* прыдушы́ць.
ПРИДЫХА́||НИЕ *лингв.* прыдыха́нне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬНЫЙ** прыдыха́льны.
ПРИЕ́ВШИЙСЯ *прил.* абры́длы.
ПРИЕДА́ТЬСЯ *несов.* прыяда́цца; (*надоедать — о чём-л.*) дакуча́ць, надакуча́ць.
ПРИЕ́З||Д прые́зд, -ду *м*; **с ~дом!** з прые́здам!; **~ЖА́ТЬ** *несов.* прыязджа́ць; **~ЖА́ЮЩИЙ** *сущ.* прые́зджы, -джага *м*; **гости́ница для ~жа́ющих** гасці́ніца для прые́зджых; **~ЖАЯ** *сущ.* прые́зджая, -джай *ж*; **~ЖИЙ** 1. *прил.* прые́зджы; 2. *сущ.* прые́зджы, -джага *м*.
ПРИЁ||М *м в разн. знач.* прыём, -му *м*; (*действие*) прыйма́нне, -ння *ср*, прыня́ццe, -цця *ср*; **приём в па́ртию** прыём у па́ртыю; **во вре́мя ~ма у врача́** у час прыёму (прыйма́ння, прыня́цця) ва ўрача́; **часы́ ~ма** гадзі́ны прыёму; **приём паке́тов** прыём (прыйма́нне) паке́таў; **быть на ~ме у кого́-либо** быць на прыёме ў каго́-не́будзь; **оказа́ть кому́-либо раду́шный, тёплый, серде́чный приём** прыня́ць каго́-не́будзь з ра́дасцю, цёпла, сардэ́чна; **худо́жественный приём** маста́цкі прыём; **ружейные ~мы** *воен.* ружэ́йныя прыёмы; ◇ **в оди́н, два, три ~ма** за адзі́н, два, тры разы́; адны́м, двума́, трыма́ на́варатамі (за́хадамі); **на оди́н, два, три ~ма** на адзі́н, два, тры разы́; **~МКА** *ж разг.* прыём, -му *м*; прыйма́нне, -ння *ср*, прыня́ццe, -цця *ср*.
ПРИЕ́МЛЕМ||ОСТЬ прыйма́льнасць, -ці *ж*, прые́млемасць, -ці *ж*; (*допустимость*) дапушча́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыйма́льны, прые́млемы; (*допустимый*) дапушча́льны; **э́то ~о** гэ́та мо́жна прыня́ць.
ПРИЁМН||АЯ *сущ.* прыёмная, -най *ж*; **~ая в больни́це** прыёмная ў бальні́цы.
ПРИЁМНИК *радио* прыёмнік, -ка *м*.
ПРИЁМН||ЫЙ 1. прыймо́вы; прыйма́льны; **п. день** прыймо́вы дзень; **п. экза́мен** прыймо́вы экза́мен; **~ая ко́мната** прыймо́вы пако́й; **~ая коми́ссия** прыймо́вая камі́сія; **~ая ста́нция** *радио* прыйма́льная ста́нцыя; 2. (*усыновлённый, усыновивший*) прыёмны; **п. сын** прыёмны сын; **~ая мать** прыёмная ма́ці.
ПРИЁМ||ОЧНЫЙ прыёмачны; (*приёмный*) прыймо́вы; **п. докуме́нт** прыёмачны дакуме́нт; **~очная коми́ссия** прыёмачная (прыймо́вая) камі́сія; **~ЩИК** прыёмшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** прыёмшчыца, -цы *ж*; **~ЫШ** *м разг.* прыёмыш, -ша *м* и *ж*.
ПРИЕ́СТЬСЯ *сов.* прые́сціся; (*надоесть*) надаку́чыць, абры́даць, абры́днуць.
ПРИЕ́ХАТЬ *сов.* прые́хаць.
ПРИЖА́||ТЫЙ 1. прыці́снуты; 2. (*к груди, к сердцу*) прыту́лены; 3. *перен.* (*притеснённый*) прыці́снуты, прыгне́чаны; **~ТЬ** *сов.* 1. прыці́снуць; 2. (*к груди, к сердцу*) прытулі́ць; 3. *перен.* (*притеснить*) прыці́снуць, прыгнясці́; ◇ **~ть кого́-либо к стене́** *перен.* прыпе́рці каго́-не́будзь да сцяны́; **~ТЬСЯ** 1. прыці́снуцца; 2. прытулі́цца.
ПРИЖ||Е́ЧЬ *сов. мед.* прыпячы́; **~ЖЁННЫЙ** прыпе́чаны.
ПРИЖИВА́ЕМОСТЬ прыжыва́льнасць, -ці *ж*; **п. дере́вьев** прыжыва́льнасць дрэў.
ПРИЖИВА́Л *уст. см.* **прижива́льщик; ~КА** нахле́б-

ніца, -цы *ж*; (*дармоедка*) дармае́дка, -кі *ж*; **~ЫЩИК** *уст.* нахле́бнік, -ка *м*; (*дармоед*) дармае́д, -да *м*.

ПРИЖИВА́ТЬ *несов.* прыжыва́ць.

ПРИЖИВА́ТЬСЯ *несов.* **1.** прыжыва́цца; (*осваиваться*) асво́йтвацца; (*привыкать*) прывыка́ць; **2.** (*о растениях*) прыжыва́ць; (*приниматься*) прыма́цца.

ПРИЖИВИ́ТЬ *сов.* прыжыві́ць; (*прирастить*) прырасці́ць; **~СЯ** прыжы́ць; (*прирасти*) прырасці́; (*срастись*) зрасці́ся.

ПРИЖИ́В||КА *ж*, **~ЛЕ́НИЕ** *ср* **1.** (*действие*) прыжыўле́нне, -ння *ср*; прыро́шчванне, -ння *ср*; *см.* **приживи́ть; 2.** (*состояние*) прыжыва́нне, -ння *ср*; прыраста́нне, -ння *ср*; зраста́нне, -ння *ср*; *см.* **приживи́ться; ~ЛЁННЫЙ** прыжы́ўлены; пры́рошчаны; **~ЛЯ́ТЬ** *несов.* прыжыўля́ць; (*приращивать*) пры́рошчваць; **~ЛЯ́ТЬСЯ** прыжыва́ць; (*прирастать*) прыраста́ць; (*срастаться*) зраста́цца.

ПРИЖИ́Г *м тех.* прыпяка́нне, -ння *ср*; **~А́НИЕ** *мед.* прыпяка́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов. мед.* прыпяка́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* прыпяка́цца; **~А́ЮЩЕЕ** *сущ. мед.* прыпяка́ючае, -чага *ср*; **~А́ЮЩИЙ** *прил. мед.* прыпяка́ючы.

ПРИЖИ́ЗНЕННЫЙ прыжыццёвы.

ПРИЖИ́М *м* **1.** (*действие*) пры́ціск, -ку *м*; *неоконч.* прыціска́нне, -ння *ср*; **2.** *тех.* прыціска́ч, -ча́ *м*; **~А́ТЬ** *несов.* **1.** прыціска́ць; **2.** (*к груди, к сердцу*) прыту́льваць, тулі́ць; **3.** *перен.* (*притеснять*) прыціска́ць, прыгнята́ць; *см.* **прижа́ть; ~А́ТЬСЯ 1.** прыціска́цца; **2.** прыту́львацца; **3.** *страд.* прыціска́цца, прыту́львацца; прыгнята́цца; *см.* **прижима́ть.**

ПРИЖИ́МИСТ||ОСТЬ прыці́склівасць, -ці *ж*; (*скупость*) ску́пасць, -ці *ж*, скна́рнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыці́склівы; скупы́, скна́ры.

ПРИЖИ́МНЫЙ *тех.* прыціскны́.

ПРИЖ||ИТО́Й, ~И́ТЫЙ прыжы́ты.

ПРИЖИ́ТЬ *сов. разг.* прыжы́ць; **~СЯ 1.** прыжы́цца; (*освоиться*) асво́йтацца; (*привыкнуть*) прывы́кнуць; **2.** (*о растениях*) прыжы́ць; (*приняться*) прыня́цца.

ПРИЖМУ́РИ||ВАТЬ *несов.* прыжму́рваць; **~ВАТЬСЯ** прыжму́рвацца; **~ТЬ** *сов.* прыжму́рыць; **~ТЬСЯ** прыжму́рыцца.

ПРИЗ прыз, *род.* пры́за *м*.

ПРИЗАДУ́М||АТЬСЯ *сов. разг.* (тро́хі) заду́мацца; **~ЫВАТЬСЯ** *несов. разг.* (тро́хі) заду́мвацца.

ПРИЗАНЯ́ТЬ *сов. разг.* пазы́чыць.

ПРИЗВА́Н||ИЕ *ср* **1.** (*действие*) *уст.* клі́канне, -ння *ср*; заклі́ка́нне, -ння *ср* (*на што і да чаго*); (*призыв*) за́клік, -ку *м*; *см.* **призва́ть** 1, 3; **2.** (*склонность*) прызва́нне, -ння *ср*; (*к чему*) схі́льнасць, -ці *ж*, нахі́л, -лу *м*; **худо́жник по ~ию** маста́к па прызва́нню; **п. к му́зыке** схі́льнасць (нахі́л) да му́зыкі; **3.** (*предназначение*) прызначэ́нне, -ння *ср*; **истори́ческое п. пролетариа́та — стать моги́льщиком капитали́зма** гістары́чнае прызначэ́нне пралетарыя́ту — стаць магі́льшчыкам капіталі́зма.

ПРИ́ЗВ||АННЫЙ 1. *прич.* паклі́каны; **2.** *прич.* прызва́ны; **3.** *прич.* заклі́каны (*на што і да чаго*); *см.* **призва́ть; 4.** (*имеющий призвание*) прызва́ны; (*предназначенный*) прызна́чаны; **он ~ан быть учёным** ён прызва́ны (прызна́чаны) быць вучо́ным, яго́ прызва́нне быць вучо́ным; **~А́ТЬ** *сов.* **1.** (*позвать*) паклі́каць; **~а́ть на по́мощь** паклі́каць на дапамо́гу; **2.** (*на военную службу*) прызва́ць; **3.** (*к чему*) заклі́каць (*на што і да чаго*); **~а́ть к защи́те Ро́дины** заклі́каць на абаро́ну (да абаро́ны) Радзі́мы; **~а́ть к поря́дку** заклі́каць да пара́дку.

ПРИЗЕ́МИСТ||ОСТЬ прыса́дзістасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** прыса́дзісты.

ПРИЗЕМЛ||Е́НИЕ *спорт., ав.* прызямле́нне, -ння *ср*; **~И́ТЬСЯ** *сов. ав.* прызямлі́цца; **~Я́ТЬСЯ** *несов. ав.* прызямля́цца.

ПРИЗЁР *спорт.* прызёр, -ра *м*; **~ША** прызёрка, -кі *ж*.

ПРИ́ЗМА пры́зма, -мы *ж*; **~ТИ́ЧЕСКИЙ** прызматы́чны.

ПРИЗМАТО́ИД *мат.* прызмато́ід, -да *м*.

ПРИЗНАВА́ТЬ I *несов.* прызнава́ць; *см.* **призна́ть I.**

ПРИЗНАВА́ТЬ II *несов.* (*узнавать, опознавать*) пазнава́ць; *см.* **призна́ть II.**

ПРИЗНАВА́ТЬСЯ I *несов.* прызнава́цца; *см.* **призна́ться.**

ПРИЗНАВА́ТЬСЯ II *несов. страд.* (*узнаваться, опознаваться*) пазнава́цца.

ПРИ́ЗНАК *м* адзна́ка, -кі *ж*; (*примета*) прыкме́та, -ты *ж*.

ПРИЗНА́Н||ИЕ *в разн. знач.* прызна́нне, -ння *ср*; **п. прав** прызна́нне право́ў; **вы́слушать п.** вы́слухаць прызна́нне; **по о́бщему ~ию** паво́дле агу́льнага прызна́ння, па агу́льнаму прызна́нню.

ПРИ́ЗНАННЫЙ I *прич., прил.* прызна́ны.

ПРИ́ЗНАННЫЙ II (*узнанный, опознанный*) *прич. разг.* пазна́ны.

ПРИЗНА́ТЕЛЬН||О *нареч.* удзя́чна; **~ОСТЬ** удзя́чнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** удзя́чны.

ТЩА́ТЕЛЬН||О *нареч.* стара́нна; руплі́ва, ру́пна, шчы́ра; дба́йна, пі́льна, ува́жліва; акура́тна, спра́ўна; даклáдна; ~**ОСТЬ** стара́ннасць, -ці *ж*; руплі́васць, -ці *ж*, ру́пнасць, -ці *ж*, шчы́расць, -ці *ж*; дба́йнасць, -ці *ж*, пі́льнасць, -ці *ж*, ува́жлівасць, -ці *ж*; акура́тнасць, -ці *ж*, спра́ўнасць, -ці *ж*, даклáднасць, -ці *ж*; ~**ЫЙ** стара́нны; (*усердный*) руплі́вы, ру́пны, шчы́ры; (*внимательный*) дба́йны, пі́льны, ува́жлівы; (*аккуратный*) акура́тны, спра́ўны; (*точный*) даклáдны.
ТЩЕДУ́Ш||ИЕ *ср*, ~**НОСТЬ** *ж* ляда́штасць, -ці *ж*, хі́ласць, -ці *ж*, кво́ласць, -ці *ж*, няду́жасць, -ці *ж*, шчу́пласць, -ці *ж*; ~**НЫЙ** ляда́шты, хі́лы, кво́лы, няду́жы, шчу́плы.
ТЩЕСЛА́В||ИЕ *ср* ганары́стасць, -ці *ж*, пыхлі́васць, -ці *ж*, фанабэ́рыя, -рыі *ж*; ~**НОСТЬ** ганары́стасць, -ці *ж*, пыхлі́васць, -ці *ж*, фанабэ́рыстасць, -ці *ж*; ~**НЫЙ** ганары́сты, пыхлі́вы, фанабэ́рысты.

ТЩЕТА́ ма́рнасць, -ці *ж.*
ТЩЕ́ТН||О *нареч.* ма́рна, дарэ́мна; **~ОСТЬ** ма́рнасць, -ці *ж.*; **~ЫЙ** ма́рны, дарэ́мны.
ТЩИ́ТЬСЯ *несов. уст.* намага́цца, стара́цца; (*лезть из кожи вон*) пну́цца.
ТЫ *мест.* ты (*род., вин.* цябе́, *дат., предложн.* табе́, *твор.* табо́й, табо́ю); ◇ **(быть) на ты** (быць) на ты.
ТЫ́КАТЬ I *несов.* ты́каць; то́ркаць; (*втыкать*) уты-ка́ць; уто́ркваць; (*совать*) ты́цкаць; **т. па́лкой в зе́млю** ты́каць (то́ркаць) па́лкай у зямлю́; **поросёнок ты́чет нос в коры́то** парася́ ты́цкае лыч у кары́та; **т. па́льцем на кого́-либо** ты́цкаць па́льцам на каго́-не́будзь; ◇ **т. в нос** (*кому-л.*) *разг.* ты́цкаць у нос.
ТЫ́КАТЬ II *несов.* (*называть на «ты»*) ты́каць.
ТЫ́КАТЬСЯ *несов.* **1.** (*наталкиваться*) то́ркацца, сту́кацца; **2.** *перен.* ле́зці.
ТЫКВ||А *ж* гарбу́з, -за́ *м*; **~ЕННИК** *кул.* гарбу́з, -за́ *м*; **~ЕННЫЕ** *мн. сущ. бот.* гарбузо́выя, -вых; **~ЕННЫЙ** гарбузо́вы; **~ООБРА́ЗНЫЙ** гарбузападо́бны.
ТЫЛ тыл, *род.* ты́лу *м*; ■ **тылу́ врага́** у ты́ле во́рага; **зайти́ с ты́ла** зайсці́ з ты́лу; **~ОВИ́К** тылаві́к, -ка́ *м*; **~ОВО́Й** тылавы́.
ТЫ́ЛЬНЫЙ ты́льны.
ТЫН тын, *род.* ты́ну *м*; **~НЫЙ** ты́навы.
ТЫСЧО́НКА *разг.* ты́сячына, -ны *ж.*
ТЫ́СЯЦКИЙ *сущ. ист.* ты́сяцкі, -кага *м.*
ТЫ́СЯЧ||А ты́сяча, -чы *ж*; ◇ **~у раз** ты́сячу разо́ў; **в ~у раз** у ты́сячу разо́ў.
ТЫСЯЧЕГОЛО́В *бот.* тысячагало́ў, -ло́ва *м.*
ТЫСЯЧЕГОЛО́СЫЙ тысячагало́сы.
ТЫСЯЧЕЛЕ́Т||ИЕ тысячаго́ддзе, -ддзя *ср*; **~НИЙ** тысячагадо́вы.
ТЫСЯЧЕЛИ́СТНИК *бот.* крыва́ўнік, -ку *м.*
ТЫСЯЧЕТО́ННЫЙ тысячато́нны.
ТЫ́СЯЧН||ИК ты́сячнік, -ка *м*; **~ЫЙ** ты́сячны.
ТЫЧИ́Н||КА *бот.* тычы́нка, -кі *ж*; **~КОВЫЙ, ~ОЧНЫЙ** тычы́нкавы.
ТЫЧКО́М *нареч.* старчма́, старч, наста́рч.
ТЫЧО́К *м* **1.** (*торчащий предмет*) *разг.* патарча́ка, -кі *ж*; **2.** (*поперечная кладка кирпича*) *стр.* старча́к, -ка́ *м*; папяро́чка, -кі *ж.*
ТЬМА I *прям., перен.* (*мрак*) це́мра, -ры *ж*, це́мрадзь, -дзі *ж*; ◇ **т. кроме́шная** це́мра апраме́тная.
ТЬМА II (*множество*) *разг.* про́цьма, -мы *ж.*
ТЬМА-ТЬМУ́ЩАЯ *разг.* (цэ́лая) про́цьма, -мы *ж.*
ТЬФУ *межд. разг.* тфу; ◇ **тьфу, про́пасть!** *разг.* тфу, згінь ты!
ТЮБЕТЕ́ЙКА цюбецейка, -кі *ж.*
ТЮ́БИК цю́бік, -ка *м.*
ТЮ́БИНГ *тех.* цю́бінг, -га *м*; **~ОВЫЙ** цю́бінгавы; **~ЩИК** цю́біншчык, -ка *м.*
ТЮК пак, *род.* па́ка *м*, цюк, *род.* цюка́ *м.*
ТЮ́К||АТЬ *несов. разг.* цю́каць; **~АТЬСЯ** цю́кацца; **~НУТЫЙ** цю́кнуты; **~НУТЬ** *сов. и однокр. разг.* цю́кнуць; **~НУТЬСЯ** цю́кнуцца.
ТЮКО́В||АННЫЙ пакава́ны, цюкава́ны; **~А́ТЬ** *несов.* пакава́ць, цюкава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* пакава́цца, цюкава́цца; **~КА** пако́ўка, -кі *ж*, цюко́ўка, -кі *ж*; **~ЩИ́К** пако́ўшчык, -ка *м*, цюко́ўшчык, -ка *м.*
ТЮ́ЛЕВЫЙ *текст.* цю́левы.
ТЮЛЕНЕБО́||ЕЦ цюленебо́ец, -бо́йца *м*; **~ЙНЫЙ** цюленебо́йны.
ТЮЛЕ́||НЕВЫЕ *мн. сущ. зоол.* цюле́невыя, -вых; **~НЕВЫЙ** цюле́невы; **~НЁНОК** *м* цюляня́, -ня́ці *ср*; **~НИЙ** цюле́невы; **~НИНА** цюле́ніна, -ны *ж*; **~НЩИК** цюле́ньшчык, -ка *м*; **~НЬ** **1.** цюле́нь, -ня *м*; **2.** *перен.* цяльпу́к, -ка́ *м.*
ТЮЛЬ *м текст.* цюль, *род.* цю́лю *м*, ту́ля, -лі *ж.*
ТЮ́ЛЬКА *зоол.* цю́лька, -кі *ж.*
ТЮЛЬПА́Н *бот., зоол.* цюльпа́н, -на *м*; **~НЫЙ** цюльпа́навы.
ТЮЛЬПАНООБРА́ЗНЫЙ цюльпанападо́бны.
ТЮМЕ́НСКАЯ О́БЛАСТЬ Цюме́нская во́бласць.
ТЮМЕ́НЬ *г.* Цюме́нь, -ні *ж.*
ТЮ́НИ||К *м*, **~КА** *ж* ту́нік, -ка *м.*
ТЮРБА́Н турба́н, -на *м.*
ТЮРЕ́М||НЫЙ турэ́мны, астро́жны; **~ЩИК** турэ́мшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** турэ́мшчыца, -цы *ж.*
ТЮРИ́НГИЯ Цюры́нгія, -гіі *ж.*
ТЮРК цюрк, *род.* цю́рка *м.*
ТЮ́РКСК||ИЙ цю́ркскі; **~ие языки́** цю́ркскія мо́вы.
ТЮРЧА́НКА цюрча́нка, -кі *ж.*
ТЮРЬМ||А́ *ж* турма́, -мы́ *ж*, астро́г, -га *м*; **заключи́ть в ~у́** пасадзі́ць у турму́ (астро́г).
ТЮ́РЯ *кул.* цура́, -ры́ *ж.*
ТЮ́ТЕЛЬК||А: **т. в ~у** цю́целька ў цю́цельку.
ТЮ-ТЮ *межд. разг.* цю-цю.
ТЮФ||ЯК **1.** сянні́к, -ка́ *м*; (*матрац*) матра́ц, -ца *м*; **2.** *перен. разг.* пяхце́р, -ра *м*; **~ЯЧНЫЙ** сеннiко́вы; **~ЯЧО́К** *уменьш.* сенніч́ок, -чка́ *м.*
ТЮЧО́К *уменьш.* паку́начак, -чка *м*, цючо́к, -чка́ *м.*
ТЯВ *межд.* гаў, дзяў, цяў; **~КАНЬЕ** га́ўканне, -ння *ср*, дзя́ўканне, -ння *ср*, ця́ўканне, -ння *ср*; **~КАТЬ** *несов.* га́ўкаць, дзя́ўкаць, ця́ўкаць; **~КНУТЬ** *сов. и однокр.* га́ўкнуць, дзя́ўкнуць, ця́ўкнуць.
ТЯ́Г||А *в разн. знач.* цяга, -гі *ж*; **механи́ческая т.** механі́чная цяга; **электри́ческая т.** электры́чная цяга; **парова́я т.** парава́я цяга; **ко́нная т.** ко́нная цяга; **в печи́ си́льная т.** у пе́чы мо́цная цяга; **слу́жба ~и** *ж.-д.* слу́жба цягі; **т. к нау́ке** *перен.* цяга да наву́кі; ◇ **дать ~у** *разг.* даць цягу (драла).
ТЯГА́ЛЬНЫЙ *тех.* цяга́льны.
ТЯГА́ТЬ *несов. простореч.* цяга́ць; (*дёргать*) рваць; **т. лён** рваць лён; **~СЯ** змага́цца, ду́жацца; (*спорить*) спрача́цца; цяга́цца; **тру́дно с ним ~ся в учёбе** цяжка з ім змага́цца ў вучо́бе.
ТЯГА́Ч *тех.* цяга́ч, -ча́ *м*; ◇ **дать ~а́** *разг.* даць драла.
ТЯГЛЕ́Ц *ист.* цягле́ц, -ца́ *м.*
ТЯ́ГЛО I *с.-х.* цягло́, -ла́ *ср.*
ТЯ́ГЛО II *ист.* цягло́, -ла́ *ср.*
ТЯГЛОВО́Й I *с.-х.* цяглавы́.
ТЯГЛОВО́Й II *ист.* цяглавы́.
ТЯ́ГО||ВЫЙ цягавы; **~МЕ́Р** *тех.* цягаме́р, -ра *м.*
ТЯ́ГОСТН||О *нареч., сказ.* ця́жка; **~ОСТЬ** ця́жкасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** ця́жкі.
ТЯ́ГО||СТЬ *ж* цяжа́р, -ру *м*; ця́жкасць, -ці *ж*; **быть в т. кому́-либо** быць цяжа́рам для каго́-не́будзь, быць у цяжа́р каму́-не́будзь; **~ТА́** *ж*, **~ТЫ** *мн.* цяжа́р, -ру *м.*
ТЯГОТЕ́НИЕ *ср* **1.** *физ.* прыцягне́нне, -ння *ср*; **2.** *перен.* цяга, -гі *ж*; (*стремление*) імкне́нне, -ння *ср.*
ТЯГОТЕ́||ТЬ *несов.* **1.** (*испытывать тяготение*) мець цягу; (*стремиться*) імкну́цца, цягну́цца, прыця́гвацца; **Луна́ ~ет к Земле́** Ме́сяц ма́е цягу да Зямлі́; **т. к иску́сству** мець цягу (імкну́цца, цягну́цца) да маста́цтва; **2.** (*давить*) гнясці́ (*каго-што*), душы́ць (*каго-што*); (*висеть*) ві́сець (*над кім-чым*); **над коло́ниями ~ет власть капита́ла** кало́ніі гняце́ ўла́да капіта́лу.
ТЯГОТИ́ТЬ *несов.* абцяжа́рваць; (*быть в тягость*) быць у цяжа́р (*каму-чаму*), быць вялі́чным (*дзеля каго-чаго*); (*угнетать*) гнясці́; **меня́ тяготи́т его́ прису́тствие** мяне́ абцяжа́рвае (мне ў цяжа́р, мяне́ гняце́) яго́ прысу́тнасць; **~СЯ** быць у цяжа́р (*каму-чаму*), адчува́ць цяжа́р (*ад каго-чаго*); **я тягощу́сь одино́чеством** адзіно́та мне ў цяжа́р, я адчува́ю цяжа́р ад адзіно́ты.
ТЯГУ́Ч||ЕСТЬ цягу́часць, -ці *ж*; **~ИЙ** цягу́чы.
ТЯГЧА́ЙШИЙ найцяжэ́йшы.
ТЯЖ *м* **1.** *тех.* пас, *род.* па́са *м*, цяж, *род.* цяжа́ *м*;

2. (*в повозке*) атóса, -сы *ж*; 3. *мед.* цяж, *род.* цяжá *м*; **тяжи в лёгких** цяжы ў лёгкіх.

ТЯ́ЖБА *ж* 1. (*судебное дело*) *уст.* судóвая спрáва, суд, *род.* сýду *м*; 2. *перен.* спрэ́чка, -кі *ж*; спабóрніцтва, -ва *ср*, змагáнне, -ння *ср*.

ТЯ́ЖЕБН||ИК *м*, **∼ИЦА** *ж уст.* суця́га, -гі *м* и *ж*; **∼ЫЙ** судóвы; спрэ́чны.

ТЯЖЕЛЕ́Е *сравн. ст.* 1. *нареч.* цяжэ́й; **нагрузи́ть т.** нагрузíць цяжэ́й; 2. *прил.* цяжэ́йшы; **э́тот сундýк т. я́щика** гэ́ты кýфар цяжэ́йшы за скры́нку.

ТЯЖЕЛЕ́ТЬ *несов.* цяжэ́ць.

ТЯЖЕЛО́ *нареч., сказ.* ця́жка; **т. дыша́ть** ця́жка ды́хаць; **ей т. без по́мощи** ёй ця́жка без дапамóгі; **на душе́ т.** на душы́ ця́жка.

ТЯЖЕЛОАТЛЕ́Т *спорт.* цяжкаатлéт, -та *м*; **∼И́ЧЕСКИЙ** цяжкаатлеты́чны.

ТЯЖЕЛОБОЛЬНО́Й цяжкахвóры.

ТЯЖЕЛОВА́Т||О *нареч., сказ.* цяжкавáта; **∼ЫЙ** зацяжкі, цяжкавáты.

ТЯЖЕЛОВЕ́С *спорт.* (спартсмéн) ця́жкай вагí; (*об атлете*) цяжкаатлéт, -та *м*.

ТЯЖЕЛОВЕ́СН||ОСТЬ 1. цяжкавагóвасць, -ці *ж*, цяжкавáжнасць, -ці *ж*; 2. *перен.* ця́жкасць, -ці *ж*, цяжкавáжнасць, -ці *ж*; нязгрáбнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** 1. (*с тяжёлым грузом*) цяжкавагóвы, цяжкавáжны; **∼ые поезда́** цяжкавагóвыя паязды́ (цягнікí); **∼ые това́ры** цяжкавáжныя тавáры; 2. *перен.* ця́жкі, цяжкавáжны; (*лишённый изящества*) нязгрáбны; **∼ые слова́** ця́жкія (цяжкавáжныя) слóвы; **∼ый стиль** нязгрáбны стыль.

ТЯЖЕЛОВО́З (*лошадь*) ламавíк, -кá м.

ТЯЖЕЛОГРУ́ЗНЫЙ цяжкагрýзны.

ТЯЖЕЛОДУ́М цяжкадýм, -ма *м*.

ТЯЖЕЛОРА́НЕНЫЙ *сущ.* цяжкарáнены, -нага *м*.

ТЯЖЁЛ||ЫЙ ■ *разн. знач.* ця́жкі; **т. чемода́н** ця́жкі чамадáн; **т. день** ця́жкі дзень; **∼ые мы́сли** ця́жкія дýмкі; **∼ое наказа́ние** ця́жкая кáра; **∼ая ра́на** ця́жкая рáна; **т. шаг** ця́жкі крок; **т. слог** ця́жкі стыль; **т. во́здух** ця́жкае павéтра; **т. сон** ця́жкі сон; **∼ая пи́ща** ця́жкая ежа; **∼ая голова́** ця́жкая галавá; **т. хара́ктер** ця́жкі харáктар; **∼ая артилле́рия** *воен.*, *перен.* ця́жкая артылéрыя; **∼ое ма́сло** *спец.* ця́жкае мáсла; **∼ая вода́** *хим.* ця́жкая вадá; **∼ые мета́ллы** *спец.* ця́жкія метáлы; **∼ая рука́** *разг.* ця́жкая рукá; **т. на подъём** *разг.* ця́жкі на пад'ём; **быть ∼ой** (*беременной*) *обл.* быць цяжáрнай.

ТЯ́Ж||ЕСТЬ *ж* цяжáр, -ру *м*; (*трудность*) ця́жкасць, -ці *ж*; **центр ∼ести** *физ.*, *перен.* цэнтр цяжáру; **си́ла ∼ести** *физ.* сíла цяжáру; **т. но́ши** цяжáр нóшы; **т. невелика́** цяжáр невялíкі; **подня́ть т.** падняць цяжáр; **т. наказа́ния** цяжáр кáры; **т. ■ голове́** цяжáр у галавé; **ложи́ться ∼естью** клáсціся цяжáрам; **∼ести пути́** ця́жкасці дарóгі; **∼КИЙ** ця́жкі; ◇ **пусти́ться во все ∼кие** *разг.* пусцíцца ва ўсю (напрапалýю), разысцíся на ўсе застаўкі.

ТЯЖКОДУ́М цяжкадýм, -ма *м*.

ТЯ́ЖУЩИЙСЯ 1. *сущ. уст.* ця́жабнік, -ка *м*; 2. *прил. юр.* судóва-спрэ́чны, ця́жабны.

ТЯНУ́ЛЬ||НЫЙ *спец.* цягнýльны; **∼ЩИК** *спец.* цягнýльшчык, -ка *м*; **∼ЩИЦА** цягнýльшчыца, -цы *ж*.

ТЯНУ́ТЬ *несов.* цягнýць; ◇ **т. жи́лы** цягнýць жы́лы; **т. каните́ль** валавóдзіць; **т. ля́мку** *перен.* цягнýць ля́мку; **∼СЯ** цягнýцца.

ТЯНУ́||ЧКА, ∼ШКА цягýчка, -кі *ж*.

ТЯ́НУЩИЙ *прил.* 1. (*мучительный*) ця́гнучы, цягýчы; 2. *тех.* ця́гнучы; **т. винт** *ав.* ця́гнучы вінт.

ТЯНЬЦЗИ́НЬ *г.* Цяньцзíнь, -ня *м*.

ТЯНЬ-ШАНЬ (*горы*) Тянь-Шань, -ня *м*.

ТЯНЬ-ША́НЬСКАЯ О́БЛАСТЬ Тянь-Шáнская вóбласць.

ТЯНЬ-ША́НЬСКИЙ цянь-шáнскі.

ТЯП *межд.* цяп.

ТЯ́П||АТЬ *несов. разг. в разн. знач.* ця́паць; **∼КА** *ж* 1. *с.-х.* маты́ка, -кі *ж*; 2. (*для рубки*) сякáч, -чá *м*; **∼НУТЬ** *сов. разг. в разн. знач.* ця́пнуць.

ТЯ́ТЕНЬКА *уменьш.-ласк. обл.* тáтачка, -кі *м*.

ТЯ́ТЯ *обл.* тáта, -ты *м*.

У

У I *предлог с род.* 1. (*около, возле*) каля, ля (*каго-чаго*); (*при*) пры (*кім-чым*); (*за*) за (*кім-чым*); **останови́ться у две́ри** спынíцца каля (ля) дзвярэ́й; **уса́дьба у доро́ги** ся́дзіба каля (ля) дарóгі (пры дарóзе); **стоя́ть у станка́** стая́ць пры станкý (за станкóм, каля станкá); **сиде́ть у руля́** сядзéць за рулём; **у телефо́на** пры тэлефóне (каля тэлефóна); **у роя́ля** за раялем; 2. (*при указании на лицо или предмет, к которым что-л. относится, в пределах которых что-л. происходит*) у, ў, ва, ува (*каго-чаго*); *при этом* у *употребляется в начале предложения, после знаков препинания и после согласных*; ў — *после гласных, если слово, оканчивающееся на гласный, не отделено от предлога знаком препинания*; ва, ува — *перед словами, начинающимися на* у; **жить у това́рища** жыць у тавáрыша; **шить пальто́ у портно́го** шыць палітó ў краўцá; **у нас сего́дня гость** у нас сёння госць; **у меня́ нет вре́мени** у мянé нямá чáсу; **у него́ три сы́на** у ягó тры сыны́; *кроме того, иногда переводится также иными предлогами или конструкциями без предлогов, в частности*: а) (*в знач.* «*вместе*», «*при*») пры (*кім-чым*); **жить у роди́телей** жыць у бацькóў (пры бацькáх); б) (*в знач. принадлежности, когда указывается на то, чему свойственно что-л. или к чему приделано что-л.*) на (*чым*), у (*чым*); *а также переводится конструкциями с род. падежом без предлога и конструкциями с глаголом* мець; **лист у кле́вера тройча́тый** ліст у канюшы́ны (на канюшы́не) трайчáсты; **у магази́на есть вы́веска** на магазíне ёсць шы́льда, магазíн мáе шы́льду; **дверь у шка́фа заперта́** дзвéры ў шáфе замкнёны; **но́жки у стола́ неро́вные** нóжкі сталá (у сталé) няроўныя; в) (*со словом* «*меня*» *при выражении угрозы*) у (*каго*), *а также без предлога с дат.*; **бу́дешь ты у меня́ знать!** бýдзеш ты ў мянé (мне) вéдаць!; **смотри́ ты у меня́!** глядзí ты мне (у мянé)!; **посме́й то́лько у меня́!** паспрабýй тóлькі мне (у мянé)!; ◇ **быть у вла́сти** стая́ць на чалé ўлáды, трымáць улáду.

У II *межд.* 1. (*при выражении испуга, страха*) ой; ух; **у, как темно́** ой (ух), як цёмна; 2. (*при выражении укора*) от; **у, ба́ловень!** от дураслíвец! 3. (*при выражении угрозы*) у.

УА́ *межд.* кугá.

УА́ТТ *эл.* ват, *род.* вáта *м*, уáт, *род.* уáта *м*.

УАТТМЕ́ТР *эл.* ватмéтр, -ра *м*, уатмéтр, -ра *м*.

УБА́В||ИТЬ *сов.* 1. збáвіць, убáвіць; (*уменьшить*) змéншыць, памéншыць; (*отбавить*) адбáвіць; **у. це́ну** збáвіць (убáвіць) цану́; **у. ско́рость** збáвіць (змéншыць, памéншыць) скóрасць; **у. ма́сла** адбáвіць мáсла; **у. спе́си** збáвіць гóнару (фанабэ́рыстасці, пы́хі); 2. (*укоротить*) пакарацíць; **у. рукава́** пакарацíць рукавы́; 3. (*в весе*) збáвіцца, убáвіцца, убы́ць; **больна́я ∼ила в ве́се** хвóрая

збáвілася (убы́ла) у вазé; **~ИТЬСЯ 1.** убáвіцца; (*уменьшиться*) змéншыцца, памéншыцца; **нарóду у кáссы ~илось** нарóду ля кáсы ўбáвілася (змéншылася, памéншылася); **дни ~ились** дні памéншыліся; 2. (*укоротиться*) пакараціцца; 3. (*убыть*) змéншыцца, памéншыцца; (*о воде*) спáсці; (*о луне*) убы́ць; **воды́ в рекé ~илось** вадá ў рацэ́ спáла; **мéсяц ~ился** мéсяц убы́ў; **~ЛЕННЫЙ** 1. збáўлены, убáўлены, змéншаны, памéншаны; адбáўлены; 2. пакарóчаны; *см.* **убáвить** 1, 2; **~ЛЯ́ТЬ** *несов.* **1.** збаўля́ць, убаўля́ць; (*уменьшать*) змяншáць, памяншáць; (*отбавлять*) адбаўля́ць; 2. (*укорачивать*) пакарачáць; 3. (*в весе*) збаўля́цца, убаўля́цца, убывáць; *см.* **убáвить; ~ЛЯ́ТЬСЯ 1.** убаўля́цца; (*уменьшаться*) змяншáцца, памяншáцца; 2. (*укорачиваться*) пакарóчвацца; 3. (*убывать*) змяншáцца, памяншáцца; (*о воде*) спадáць; (*о луне*) убывáць; *см.* **убáвиться; 4.** *страд.* збаўля́цца, убаўля́цца, змяншáцца, памяншáцца, адбаўля́цца; пакарачáцца; *см.* **убавля́ть** 1, 2.

УБАЮ́К||АННЫЙ 1. укалыхáны, закалыхáны, залюля́ны; 2. *перен.* убаю́каны, забаю́каны; заспакóены; **~АТЬ** *сов.* 1. укалыхáць, закалыхáць, залюля́ць; 2. *перен.* убаю́каць, забаю́каць; (*успокоить*) заспакóіць; *см.* **убаю́кивать; ~АТЬСЯ** укалыхáцца, закалыхáцца, залюля́цца; (*уснуть*) заснýць; **~ИВАНИЕ 1.** укалы́хванне, -ння *ср*, закалы́хванне, -ння *ср*, люля́нне, -ння *ср*; 2. *перен.* убаю́кванне, -ння *ср*, забаю́кванне, -ння *ср*; заспакóйванне, -ння *ср*; **~ИВАТЬ** *несов.* 1. укалы́хваць, закалы́хваць, люля́ць; 2. *перен.* убаю́кваць, забаю́кваць; (*успокаивать*) заспакóйваць; **~ивать себя́ надéждой** убаю́кваць (забаю́кваць, заспакóйваць) сябé надзéяй; **~ИВАТЬСЯ 1.** укалы́хвацца, закалы́хвацца; (*засыпать*) засынáць; 2. *страд.* укалы́хвацца, закалы́хвацца, люля́цца; убаю́квацца, забаю́квацца, заспакóйвацца; *см.* **убаю́кивать; ~ИВАЮЩЕ** *нареч.* 1. укалы́хваюча, закалы́хваюча; 2. *перен.* убаю́кваюча, забаю́кваюча; заспакóйваюча; **~ИВАЮЩИЙ** *в знач. прил.* 1. укалы́хваючы, закалы́хваючы; 2. *перен.* убаю́кваючы, забаю́кваючы; заспакóйваючы; **~ивающий моти́в** убаю́кваючы маты́ў.

УБЕГÁ||ТЬ *несов.* 1. бéгчы; (*выбегать*) выбягáць; (*отбегать*) адбягáць, адбягáцца; **я ~ю** *разг.* я бягý (пабéг, пабягý); 2. (*уходить тайком, спасаться бегством*) уцякáць; (*сбегать*) збягáць; *см.* **убежáть** 1, 2; 3. (*избегать*) *уст.* пазбягáць; унікáць; ухіля́цца (*ад чаго*).

УБЕДИ́ТЕЛЬН||О *нареч.* 1. перакана́ўча, перакана́льна; **у. говори́ть** перакана́ўча (перакана́льна) гавары́ць; 2. вéльмі, мóцна, вéльмі мóцна; **у. проси́ть** вéльмі (мóцна, вéльмі мóцна) прасі́ць; **~ОСТЬ** перакана́ўчасць, -ці *ж*, перакана́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** перакана́ўчы, перакана́льны; **~ый дóвод** перакана́ўчы (перакана́льны) дóвад; 2. (*настоятельный*) вялі́кі, мóцны, вéльмі вялі́кі, вéльмі мóцны; **~ая прóсьба** вялі́кая (вéльмі вялі́кая) прóсьба.

УБЕДИ́ТЬ *сов.* пераканáць; (*уверить*) упэ́ўніць; **~СЯ** пераканáцца; (*увериться*) упэ́ўніцца.

УБЕЖÁ||ТЬ *сов.* 1. пабéгчы; (*выбежать*) вы́бегчы; (*отбежать*) адбéгчы, адбéгчыся; **дéти ~ли в лес** дзéці пабéглі ў лес; **одéлся и ~л на рабóту** адзéўся і пабéг на прáцу; 2. (*уйти тайком, спастись бегством*) уцячы́; (*сбежать*) збéгчы; **у. из тюрьмы́** уцячы́ з турмы́; **лóшадь ~ла** конь уцёк (збег); 3. (*о молоке, самоваре и т. п.*) пабéгчы.

УБЕЖДÁТЬ *несов.* перакóнваць; (*уверять*) упэ́ўніваць; **~СЯ** перакóнвацца; (*уверяться*) упэ́ўнівацца.

УБЕЖДÉНИЕ 1. (*действие*) пераканáнне, -ння *ср*; *неоконч.* перакóнванне, -ння *ср*; 2. (*твёрдый взгляд*) пераканáнне, -ння *ср*.

УБЕЖДЁНН||О *нареч.* пераканáна; упэ́ўнена; **~ОСТЬ** перакóнанасць, -ці *ж*; упэ́ўненасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** пераканáны; (*уверенный*) упэ́ўнены.

УБÉЖИЩ||Е *ср* 1. пристáнішча, -шча *ср*; пристáнак, -нку *м*; (*приют*) прытýлак, -лку *м*; 2. (*укрытие*) *воен.* схóвішча, -шча *ср*; ◇ **прáво ~а** прáва пристáнішча; **~НЫЙ** схóвішчны.

УБЕЛЁННЫЙ убéлены, пабéлены; **у. сединáми** (увéсь) сі́вы, (увéсь) пасівéлы.

УБЕЛ||И́ТЬ *сов.* убялі́ць; **~Я́ТЬ** *несов.* убяля́ць, бялі́ць.

УБЕРЕГÁТЬ *несов.* захóўваць, зберагáць; (*устерегать*) усцерагáць, уберагáць, упільнóўваць; **~СЯ** усцерагáцца; уберагáцца.

УБЕРЕЖЁННЫЙ захавáны, збераж́оны; (*устережённый*) усцярэ́жаны, увераж́оны, упільнавáны.

УБЕРÉЧЬ *сов.* захавáць, зберагчы́; (*устеречь*) усцерагчы́, уберагчы́, упільнавáць; **~СЯ** усцерагчы́ся, уберагчы́ся.

УБИВÁТЬ *несов.* 1. (*умерщвлять*) забівáць; 2. *перен.* (*уничтожать*) ні́шчыць, зніш́чáць; 3. *перен.* (*глубоко огорчать, приводить в отчаяние*) прыбівáць, прыгнятáць, прывóдзіць у рóспач; (*ошеломлять*) ашаламля́ць; 4. *перен.* (*тратить на что-л.*) *разг.* трáціць; (*издерживать*) выдаткóўваць; (*о времени*) марнавáць; 5. (*уплотнять, утрамбовывать*) *разг.* убівáць, утóўкваць, утрамбóўваць; 6. (*покрывать*) *карт. разг.* біць; 7. (*выводить из игры*) *спорт.* вывóдзіць з гульні́; *см.* **уби́ть; ~СЯ** *разг.* 1. забівáцца; (*ударяться*) ударáцца, выцінáцца; *см.* **уби́ться;** 2. (*быть в сильном горе*) гаравáць, бедавáць, пакýтаваць.

УБИ́ЙСТВЕНН||О *нареч.* жахлі́ва, страшэ́нна (*ужасно*); знішчáльна (*уничтожающе*); **~ОСТЬ** жахлі́васць, -ці *ж*, страшэ́ннасць, -ці *ж*; знішчáльнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** забóйчы; (*смертоносный*) смяртэ́льны, смярóтны; (*вредный*) шкóдны; **~ый кли́мат** смяртэ́льны (шкóдны) клі́мат; 2. *перен.* жахлі́вы, страшэ́нны (*ужасный*); знішчáльны (*разящий, уничтожающий*); **~ая жарá** жахлі́вая (страшэ́нная) гарачыня́; **~ая ирóния** знішчáльная ірóнія.

УБИ́Й||СТВО забóйства, -ва *ср*; **~ЦА** забóйца, -цы *м* и *ж*.

УБИРÁ||ТЬ *несов.* 1. (*прочь*) прымáць; (*забирать*) забірáць; (*снимать, свёртывать*) здымáць, скрýчваць; (*поднимать*) падымáць; 2. (*приводить в порядок*) прыбірáць; 3. (*украшать*) убірáць, прыбірáць; 4. (*о полевых культурах*) убірáць; (*собирать*) збірáць; (*складывать*) склáдваць, складáць; (*прятать*) хавáць; 5. (*умещать*) убірáць, змяшчáць; 6. *перен.* (*устранять*) устараня́ць; (*с работы, с должности*) здымáць, знімáць; (*выводить*) вывóдзіць; *см.* **убрáть; ~ТЬСЯ 1.** (*управляться*) упраўля́цца, спраўля́цца; упарадкóўвацца; (*приводить в порядок*) прыбірáць; **~ться с хлéбом** упраўля́цца (упарадкóўвацца) са збóжжам; **~ться в кóмнате** прыбірáць у пакóі; 2. (*укладываться*) уклáдвацца; (*умещаться*) убірáцца; змяшчáцца; (*влезать*) улáзіць; **словá ~ются в однý строкý** слóвы змяшчáюцца (убірáюцца) у адзі́н радóк; 3. (*украшаться*) убірáцца, прыбірáцца; **гóрод ~лся к прáзднику** гóрад убірáўся (прыбірáўся) да свя́та; 4. (*уходить*) *разг.* выбірáцца, ісці́; **~йтесь отсю́да!** выбірáйцеся (ідзі́це) адсю́ль!; **~йтесь подобрý-поздорóву** выбірáйцеся, пакýль цэ́лыя; 5. *страд.* прымáцца, забірáцца, здымáцца, скрýчвацца, падымáцца; прыбірáцца; убірáцца; збірáцца, склáдвацца, складáцца, хавáцца; *см.* **убирáть** 1—4.

УБИ́Т||ЫЙ 1. (*умерщвлённый*) забі́ты; 2. *перен.* (*уничтоженный*) зні́шчаны; 3. *перен.* (*глубоко огорчённый чем-л., приведённый в отчаяние*) прыбі́ты, прыгнéчаны, прывéдзены ў рóспач; (*ошеломлённый*) ашалóмлены; 4. *перен.* (*потраченный на что-л.*) *разг.* патрáчаны; (*издержанный*) выдаткавáны; (*о времени*) змарнавáны; 5. (*уплотнённый, утрамбованный*) *разг.* убі́ты, утóўчаны, утрамбавáны; 6. (*покрытый*) *карт. разг.* пабі́ты; 7. (*выведенный из игры*) *спорт.* вы́ведзены з гульні́; 8. (*выражающий огорчение, отчаяние, подавленность*) прыгнéчаны, засмýчаны, сýмны; **у. вид** сýмны вы́гляд; 9. *сущ.* забі́ты, -тага *м*; **у проти́вника большóе коли́чество ~ых** у працí́ў-

ніка вялікая колькасць забітых; ◇ **спит как у.** спіць як забіты; **молчит как у.** маўчыць як забіты; **ходит как у.** ходзіць прыгнечаны (засмучаны, сумны); **у. горем** прыгнечаны горам; засмучаны (*опечаленный*).

УБИ||ТЬ *сов.* 1. (*умертвить*) забіць; **у. из ружья** забіць са стрэльбы; **у. наповал** забіць напавал; 2. *перен.* (*уничтожить*) знішчыць; **нельзя у. нашу веру в будущее** нельга знішчыць нашу веру ў будучыню; 3. *перен.* (*глубоко огорчить, привести в отчаяние*) прыбіць, прыгнесці, прывесці ў роспач; (*ошеломить*) ашаламіць; **это известие его ∼ло** гэта вестка яго прыбіла (прыгняла, прывяла ў роспач); 4. *перен. разг.* (*потратить на что-л.*) патраціць; (*издержать*) выдаткаваць; (*о времени*) змарнаваць; **у. много энергии на что-либо** патраціць шмат энергіі на што-небудзь; 5. (*уплотнить, утрамбовать*) *разг.* убіць, утаўчы, утрамбаваць; 6. (*покрыть*) *карт. разг.* пабіць; **у. туза козырем** пабіць туза козырам; 7. (*вывести из игры*) *спорт.* вывесці з гульні; **у. мяч** вывесці з гульні мяч; ◇ **у. время** змарнаваць час; **у. молодость** змарнаваць маладосць; **убей меня бог** *разг.* забі мяне бог; **у. бобра** *перен.* ашукацца; **∼ТЬСЯ** *разг.* забіцца; (*удариться*) ударыцца, выцяцца; **он ∼лся, упав с лошади** ён забіўся, зваліўшыся з каня.

УБЛАГОТВОР||ЁННЫЙ задаволены; **∼ИТЬ** *сов. уст., ирон.* задаволіць; **∼ИТЬСЯ** задаволіцца; **∼ЯТЬ** *несов. уст., ирон.* задавальняць; **∼ЯТЬСЯ** задавальняцца.

УБЛАЖ||АТЬ *несов. разг.* улагоджваць; **∼АТЬСЯ** *страд.* улагоджвацца; **∼ИТЬ** *сов. разг.* улагодзіць.

УБЛЮДО||К 1. (*помесь — о животных*) *обл.* мяшанец, -нца *м*; 2. *перен. презр.* вырадак, -дка *м*; **∼ЧНЫЙ** 1. (*о животном*) мяшаны; 2. *перен. презр.* палавінчаты, камрамісны.

УБО||ГИЙ 1. *прил.* убогі; 2. *сущ.* убогі, -гага *м*; **∼ГО** *нареч.* убога; **∼ГОСТЬ** убогасць, -ці *ж.*

УБОЖЕСТВО убоства, -ва *ср.*

УБОИНА 1. (*о мясе*) *спец.* свежына, -ны *ж*; 2. (*скотина на убой*) *обл.* жывёла на зарэз (на забой).

УБОЙ зарэз, -зу *м*, забой, -бою *м*; **на у.** на зарэз (на забой); **кормить как на у.** карміць як на зарэз (на забой); **гнать на у.** *перен.* гнаць на смерць.

УБОЙН||ОСТЬ *воен.* забойнасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** забойны.

УБОР *м* убор, -ру *м*, убранне, -ння *ср*; **головной у.** галаўны ўбор.

УБОРИСТ||О *нареч.* спорна, дробна; сціісла; **у. писать** дробна (сціісла) пісаць; **∼ОСТЬ** спорнасць; сціісласць; **∼ЫЙ** спорны, дробны; (*сжатый*) сціслы; **∼ая печать** спорны (дробны) друк; **∼ый шрифт** спорны (дробны) шрыфт; **∼ый почерк** сціслы почырк.

УБОРКА *ж* 1. *с.-х.* уборка, -кі *ж*; 2. (*действие*) прыманне, -ння *ср*, забіранне, -ння *ср*, здыманне, -ння *ср*, скручванне, -ння *ср*, падыманне, -ння *ср*; прыбіранне, -ння *ср*; убіранне, -ння *ср*, прыбіранне, -ння *ср*; збор, *род.* збору *м*; *неоконч.* збіранне, -ння *ср*, складванне, -ння *ср*, складанне, -ння *ср*, хаванне, -ння *ср*; змяшчэнне, -ння *ср*; *см.* **убрать** 2 — 4.

УБОРНАЯ *в разн. знач.* прыбіральня, -ні *ж.*

УБОРОЧНЫЙ *с.-х.* уборачны.

УБОРЩИ||К прыбіральшчык, -ка *м*; **∼ЦА** прыбіральшчыца, -цы *ж.*

УБОЯТЬСЯ *сов.* збаяцца, забаяцца; (*испугаться*) спалохацца, спужацца.

УБРАННЫЙ 1. (*прочь*) прыняты; (*забранный*) забраны; (*снятый, свёрнутый*) зняты, скручаны; (*поднятый*) падняты; 2. (*приведённый в порядок*) прыбраны; 3. (*украшенный*) убраны, прыбраны; 4. (*о полевых культурах*) убраны; (*собранный*) сабраны; (*сложенный*) складзены; (*спрятанный*) схаваны.

УБРАНСТВО убранне, -ння *ср.*

УБРАТЬ *сов.* 1. (*прочь*) прыняць; (*забрать*) забраць; (*снять, свернуть*) зняць, скруціць; (*поднять*) падняць; **у. посуду со стола** прыняць посуд са стала; **уберите это прочь!** прыміце (забярыце) гэта прэч!; **уберите руку** прыміце руку; **у. паруса** зняць (скруціць) парусы; **у. якорь** падняць якар; 2. (*привести в порядок*) прыбраць; **у. комнату** прыбраць пакой; 3. (*украсить*) убраць, прыбраць; **у. зал цветами** убраць (прыбраць) залу кветкамі; 4. (*о полевых культурах*) убраць; (*собрать*) сабраць; (*сложить*) скласці; (*спрятать*) схаваць; **своевременно у. урожай** своечасова ўбраць (сабраць) ураджай; **у. зерно в амбар** скласці (схаваць) збожжа ў свіран; **у. книги в шкаф** схаваць кнігі ў шафу; **у. шасси** *ав.* схаваць шасі; 5. (*уместить*) убраць, змясціць; **у. все слова в строку** убраць (змясціць) усе словы ў радок; 6. *перен.* (*устранить*) устараніць; (*с работы, с должности*) зняць; (*вывести*) вывесці; **у. с дороги** устараніць з дарогі; **у. с должности** зняць з пасады; **∼СЯ** 1. (*управиться*) управіцца, справіцца; упарадкавацца; (*привести в порядок*) прыбрацца; 2. (*уложиться*) улажыцца; (*уместиться*) убрацца, змясціцца; (*влезть*) улезці; 3. (*украситься*) убрацца, прыбрацца; 4. (*уйти*) *разг.* выбрацца, пайсці; *см.* **убираться.**

УБЫВА||НИЕ (*уменьшение*) памяншэнне, -ння *ср*, змяншэнне, -ння *ср*; спаданне, -ння *ср*, спад, *род.* спаду *м*; **∼ТЬ** *несов.* 1. (*уменьшаться*) меншаць, памяншацца, змяншацца; (*о воде*) спадаць; (*о луне*) убываць; (*о здоровье, силе*) падупадаць; **дни ∼ют** дні меншаюць (карацеюць); **вода начала ∼ть** вада пачала спадаць (змяншацца); **к старости силы ∼ют** пад старасць сілы меншаюць (змяншаюцца, падупадаюць); 2. (*выбывать*) выбываць; (*отбывать*) адбываць; 3. (*гибнуть*) гінуць; *см.* **убыть;** **∼ЮЩИЙ** *прил.* меншаючы, спадаючы; убываючы; **∼ющая доза** *мед.* меншаючая доза; **∼ющая прогрессия** *мат.* спадаючая прагрэсія; **∼ющая луна** убываючы месяц.

УБЫЛ||Ь *ж* (*уменьшение*) змяншэнне, -ння *ср*; (*движение к уменьшению*) спад, *род.* спаду *м*; (*потери*) страты; **у. личного состава** змяншэнне асабовага саставу; **пополнение ∼и в войсках** папаўненне страт у войсках; **идти, пойти на у.** ісці, пайсці на змяншэнне (на спад).

УБЫСТР||ЁННЫЙ *разг.* паскораны; **∼ИТЬ** *сов.* паскорыць; **∼ИТЬСЯ** паскорыцца; **∼ЯТЬ** *несов.* паскорваць; **∼ЯТЬСЯ** паскорвацца.

УБЫТ||ОК *м* страта, -ты *ж*; **быть в ∼ке** цярпець страту; **∼ОЧНОСТЬ** стратнасць, -ці *ж*; **∼ОЧНЫЙ** стратны.

УБЫТЬ *сов.* 1. (*уменьшиться*) зменшаць, паменшыцца, зменшыцца; (*о воде*) спасці; (*о луне*) убыць; (*о здоровье, силе*) падупасці; 2. (*выбыть*) выбыць; (*отбыть*) адбыць; 3. (*погибнуть*) загінуць; ◇ **его, вас не убудет** з ім, вамі нічога не станецца (не зробіцца); *см.* **убывать.**

УВАЖ||АЕМЫЙ паважаны; (*почтенный*) шаноўны; **у. товарищ** паважаны таварыш; **∼АТЬ** *несов.* паважаць; (*почитать*) шанаваць; **∼ать чужое мнение** паважаць чужую думку (чужы пагляд); **заставить себя ∼ать** прымусіць сябе паважаць; **∼АТЬСЯ** *страд.* паважацца; шанавацца; **∼ЕНИЕ** *ср* павага, -гі *ж*, паважанне, -ння *ср*; (*почёт*) пашана, -ны *ж*; **внушать ∼ение** выклікаць павагу; **чувствовать (питать) ∼ение** адчуваць павагу, паважаць; **из ∼ения к вам** з павагі да вас, паважаючы вас; ◇ **почёт и ∼ение** *разг.* пашана і павага.

УВАЖЕННЫЙ (*принятый во внимание*) уважаны, прыняты пад увагу.

УВАЖИТЕЛЬН||ОСТЬ уважлівасць, -ці *ж*; **∼ЫЙ** 1. уважлівы; **∼ые причины** уважлівыя прычыны; 2. *уст.* *см.* **почтительный.**

УВАЖИТЬ *сов.* 1. (*принять во внимание*) уважыць, прыняць пад увагу; 2. (*оказать уважение*) *разг.* уважыць; (*почтить*) ушанаваць.

УВАЛЕНЬ *м* цяльпук, -ка *м*, мяла, -ла *ср.*

УВА́ЛЬЧИВ||ОСТЬ *мор.* ува́лістасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** *мор.* ува́лісты.

УВА́Р *м* ува́р, -ру *м*; (*неоконч. действие*) ува́рванне, -ння *ср*; **~ЕННЫЙ** ува́раны; **~ИВАТЬ** *несов.* ува́рваць; **~ИВАТЬСЯ** ува́рвацца.

УВАРИ́ТЬ *сов.* увары́ць; **~СЯ** увары́цца.

УВА́РКА *ж* ува́рка, -кі *ж*; (*неоконч. действие*) ува́рванне, -ння *ср*.

УВАРОВИ́Т *мин.* уваравіт, -ту *м*.

УВА́РОВИЧИ *пос.* Ува́равічы, -віч.

УВА́РОВИЧСКИЙ РАЙО́Н Ува́равіцкі раён.

УВА́Р||ОЧНЫЙ ува́рачны; **~ЩИК** ува́ршчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** ува́ршчыца, -цы *ж*.

УВЕДЁННЫЙ 1. паве́дзены; вы́ведзены; адве́дзены; заве́дзены; зве́дзены; 2. (*похищенный*) укра́дзены; зве́дзены; забра́ны; *см.* **увести́.**

УВЕДОМИ́ТЕЛЬ паведамля́льнік, -ка *м*; **~НЫЙ** паведамля́льны.

УВЕ́ДОМ||ИТЬ *сов.* паве́даміць; **~ЛЕ́НИЕ** паведамле́нне, -ння *ср*; **~ЛЕННЫЙ** паве́дамлены; **~ЛЯ́ТЬ** *несов.* паведамля́ць; **~ЛЯ́ТЬСЯ** *страд.* паведамля́цца.

УВЕЗ||ЁННЫЙ 1. паве́зены; вы́везены; адве́зены; заве́зены; зве́зены; 2. укра́дзены; зве́зены; забра́ны; **~ТИ́** *сов.* 1. паве́зці; (*вывезти*) вы́везці; (*отвезти*) адве́зці; (*завезти*) заве́зці; (*свезти*) зве́зці; 2. (*похитить*) укра́сці; (*свезти*) зве́зці; (*забрать*) забра́ць.

УВЕКОВЕ́Ч||ЕНИЕ увекаве́чанне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) увекаве́чванне, -ння *ср*; **~ЕННЫЙ** увекаве́чаны; **~ИВАТЬ** *несов.* увекаве́чваць; **~ИВАТЬСЯ** увекаве́чвацца; **~ИТЬ** *сов.* увекаве́чыць; **~ИТЬСЯ** увекаве́чыцца.

УВЕЛ||ИЧЕ́НИЕ 1. (*действие*) павелічэ́нне, -ння *ср*, пабо́льшанне, -ння *ср*; *неоконч.* павялі́чванне, -ння *ср*, пабо́льшванне, -ння *ср*; 2. (*то, на что увеличено что-л.*) павелічэ́нне, -ння *ср*; **у. составля́ет не́сколько сантиме́тров** павелічэ́нне склада́е не́калькі сантыме́траў; **~И́ЧЕННЫЙ** павялі́чаны, пабо́льшаны; **~И́ЧИВАТЬ** *несов.* павялі́чваць, пабо́льшваць; **~И́ЧИВАТЬСЯ** павялі́чвацца, пабо́льшвацца; **~ИЧИ́ТЕЛЬ** *тех.* павеліча́льнік, -ка *м*; **~ИЧИ́ТЕЛЬНЫЙ** павеліча́льны; **~ичи́тельное стекло́** павеліча́льнае шкло; **~ичи́тельный су́ффикс** *лингв.* павеліча́льны су́фікс; **~ичи́тельное и́мя** *грам.* павеліча́льнае імя́; **~ичи́тельный аппара́т** *фот.* павеліча́льны апара́т; **~И́ЧИТЬ** *сов.* павялі́чыць, пабо́льшыць; **~И́ЧИТЬСЯ** павялі́чыцца, пабо́льшыцца.

УВЕНЧА́НИЕ увянча́нне, -ння *ср*.

УВЕ́НЧ||АННЫЙ увянча́ны; **~А́ТЬ** *сов.* увянча́ць; **~А́ТЬСЯ** увянча́цца; **~а́ться успе́хом** увянча́цца по́спехам; **~ИВАТЬ** *несов.* уве́нчваць; **~ИВАТЬСЯ** уве́нчвацца.

УВЕРЕ́НИЕ упэ́ўненне, -ння *ср*, запэ́ўненне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) упэ́ўніванне, -ння *ср*, запэ́ўніванне, -ння *ср*; **прими́те у. в моём соверше́нном уваже́нии** *офиц.* прыміце ўпэ́ўненне ў маёй по́ўнай пава́зе.

УВЕ́РЕНН||О *нареч.* упэ́ўнена; **~ОСТЬ** упэ́ўненасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** 1. *прич.* упэ́ўнены, запэ́ўнены; (*убеждённый*) перакана́ны; 2. *прил.* упэ́ўнены, перакана́ны; ◇ **будь уве́рен** будзь пэ́ўны, будзь упэ́ўнены.

УВЕ́РИТЬ *сов.* упэ́ўніць, запэ́ўніць; (*убедить*) перакана́ць; **~СЯ** упэ́ўніцца; перакана́цца.

УВЕРНУ́ТЬСЯ *сов.* 1. (*отклониться*) адхілі́цца; ухілі́цца; уні́кнуць; **у. от уда́ра** ухілі́цца ад уда́ру; 2. *перен.* (*избегнуть*) вы́круціцца, ухілі́цца, уні́кнуць, пазбе́гнуць; **у. от прямо́го отве́та** ухілі́цца ад шчы́рага адка́зу.

УВЕ́РОВАТЬ *сов.* паве́рыць.

УВЕРСТА́ННЫЙ *тип.* уверста́ны.

УВЕРСТА́ТЬ *сов. тип.* уверста́ць; **~СЯ** уверста́цца.

УВЁРСТ||КА *ж тип.* увёрстка, -кі *ж*; (*неоконч. действие*) увёрстванне, -ння *ср*; **~ЫВАТЬ** *несов. тип.* увёрстваць; **~ЫВАТЬСЯ** увёрстывацца.

УВЁРТ||КА *ж* выкру́чванне, -ння *ср*, вы́круг, -ту *м*, выкрута́с, -су *м*, хі́трыкі, -каў; **~ЛИВОСТЬ** выкру́тлівасць, -ці *ж*, вёрткасць, -ці *ж*, спры́тнасць, -ці *ж*; хі́трасць, -ці *ж*; **~ЛИВЫЙ** выкру́тлівы, вёрткі, спры́тны; хі́тры.

УВЁРТЫВАТЬСЯ *несов.* 1. (*отклоняться*) адхіля́цца; ухіля́цца; уніка́ць; 2. *перен.* (*избегать*) выкру́чвацца, ухіля́цца, уніка́ць, пазбяга́ць; *см.* **уверну́ться.**

УВЕРТЮ́РА *муз.* уверцю́ра, -ры *ж*.

УВЕРЯ́ТЬ *несов.* упэ́ўніваць, запэ́ўніваць; (*убеждать*) пераконваць; **~СЯ** 1. упэ́ўнівацца; пераконвацца; 2. *страд.* упэ́ўнівацца, запэ́ўнівацца, пераконвацца.

УВЕСЕЛ||Е́НИЕ *ср* 1. (*действие*) развесяле́нне, -ння *ср*, весяле́нне, -ння *ср*, забаўля́нне, -ння *ср*, пацчша́нне, -ння *ср*; 2. (*развлечение*) заба́ва, -вы *ж*; (*потеха*) паце́ха, -хі *ж*; (*игра*) гульня́, -ні *ж*; (*зрелище*) відо́вішча, -шча *ср*; (*прогулка*) пагуля́нка, -кі *ж*; **ма́ссовые ~е́ния** ма́савыя заба́вы (паце́хі, гу́льні, відо́вішчы); **~И́ТЕЛЬ** заба́ўнік, -ка *м*, паце́шнік, -ка *м*; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** заба́ўны, заба́ўлівы, паце́шны, паце́шлівы; (*весёлый*) вясёлы; **~и́тельные зре́лища** заба́ўныя (паце́шныя, вясёлыя) відо́вішчы; **~и́тельная прогу́лка** (вясёлая, паце́шная) пагуля́нка; **~И́ТЬ** *сов.* развесялі́ць, павесялі́ць, звесялі́ць, заба́віць, паце́шыць; **~Я́ТЬ** *несов.* весялі́ць, забаўля́ць, це́шыць, пацяша́ць; **~Я́ТЬСЯ** весялі́цца, забаўля́цца, це́шыцца, пацяша́цца.

УВЕ́СИСТ||ОСТЬ ва́жкасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** ва́жкі.

УВЕСТИ́ *сов.* 1. паве́сці; (*вывести*) вы́весці; (*отвести*) адве́сці; (*завести*) заве́сці; (*свести*) зве́сці; 2. (*похитить*) укра́сці; (*свести*) зве́сці; (*забрать*) забра́ць.

УВЕ́Ч||ИТЬ *несов.* няве́чыць, зняве́чваць; (*калечить*) кале́чыць; **~ИТЬСЯ** няве́чыцца, зняве́чвацца; кале́чыцца; **~НЫЙ** 1. *прил.* пакале́чаны, зняве́чаны; 2. *сущ.* кале́ка, -кі *м*, пакале́чаны, -нага *м*, зняве́чаны, -нага *м*.

УВЕ́ША||ННЫЙ уве́шаны, абве́шаны; **~ТЬ** *сов.* уве́шаць, абве́шаць; **~ТЬСЯ** уве́шацца, абве́шацца.

УВЕ́ШИВАТЬ *несов.* (*к* **уве́шать**) уве́шваць, абве́шваць.

УВЕ́ШИВАТЬСЯ *несов.* уве́швацца, абве́швацца.

УВЕЩА́||НИЕ *ср* 1. угаво́рванне, -ння *ср*, угаво́ры, -раў, *ед.* угаво́р, -ру *м*; пераконванне, -ння *ср*; ра́джанне, -ння *ср*; 2. навуча́нне, -ння *ср*, павуча́нне, -ння *ср*; саро́мленне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬ** *уст.* угаво́ршчык; (*советчик*) дара́дчык; **~ТЕЛЬНЫЙ** угаво́рны; угаво́рлівы; (*назидательный*) навуча́льны, павуча́льны; **~ТЬ** *несов.* (*уговаривать*) угаво́рваць; (*убеждать*) пераконваць; (*советовать*) ра́іць, ра́дзіць; (*наставлять*) навуча́ць, павуча́ць; (*усовещивать*) сарамаці́ць.

УВЕЩЕВА́||НИЕ, ~ТЕЛЬ, ~ТЕЛЬНЫЙ *уст. см.* **увеща́||ние, ~тель, ~тельный.**

УВЕЩЕВА́ТЬ *несов. см.* **увеща́ть.**

УВИВА́ТЬ *несов.* увіва́ць, укру́чваць; **~СЯ** 1. (*ухаживать*) *фам.* увіва́цца, круці́цца, удыга́ць; 2. *страд.* увіва́цца, укру́чвацца.

УВИДА́ТЬ *сов. разг.* уба́чыць, угле́дзець; **~СЯ** уба́чыцца, угле́дзецца.

УВИ́ДЕТЬ *сов.* уба́чыць, угле́дзець; **~СЯ** уба́чыцца, угле́дзецца.

УВИ́||ЛИВАТЬ *несов. разг.* уві́льваць, ухіля́цца, выкру́чвацца; **~ЛЬНУ́ТЬ** *сов. разг.* увільну́ць, ухілі́цца, вы́круціцца.

УВИО́ЛЕВЫЙ *физ.* увіёлевы.

УВИТО́Й, УВИ́ТЫЙ уві́ты, укру́чаны.

УВИ́ТЬ *сов.* уві́ць, укруці́ць.

УВЛАЖН||Е́НИЕ увільгатне́нне, -ння *ср*, звільгатне́нне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) увільго́тніванне, -ння *ср*, звільго́тніванне, -ння *ср*; намо́чванне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** увільго́тнены, звільго́тнены; (*смоченный*) намо́чаны; **~И́ТЕЛЬНЫЙ** *тех.* увільгатлі́вы; **~И́ТЬ** *сов.* зрабі́ць вільго́тным (мо́крым), увільгатні́ць, звільгатні́ць; (*смочить*)

намачы́ць; ~ИТЬСЯ стаць (зрабі́цца) вільго́тным (мо́крым), увільгатні́цца; (*намокнуть*) намо́кнуць; ~ЯТЬ *несов.* рабі́ць вільго́тным (мо́крым), увільго́тніваць, звільго́тніваць; (*смачивать*) намо́чваць; ~ЯТЬСЯ станаві́цца (рабі́цца) вільго́тным (мо́крым), увільго́тнівацца; (*намокать*) намака́ць.

УВЛЕКА́ТЕЛЬ *тех.* захапні́к, -ка́ *м.*

УВЛЕКА́ТЕЛЬН||О *нареч.* захапляю́ча; ціка́ва, займа́льна; прыва́бна, пры́надна; чаро́ўна; спаку́сліва; ~ОСТЬ захапля́льнасць, -ці *ж*; ціка́васць, -ці *ж*; займа́льнасць, -ці *ж*; прыва́бнасць, -ці *ж*, пры́наднасць, -ці *ж*; чаро́ўнасць, -ці *ж*; спаку́слівасць, -ці *ж*; ~ЫЙ захапляю́чы; (*интересный*) ціка́вы; (*занимательный*) займа́льны; (*пленительный*) прыва́бны, пры́надны; (*очаровательный*) чаро́ўны; (*соблазнительный*) спаку́слівы.

УВЛЕКА́||ТЬ *несов.* 1. (*тащить*) цягну́ць, уця́гваць, заця́гваць; (*захватывать*) захо́пліваць; (*уносить*) не́сці, зано́сіць; (*уводить*) ве́сці, заво́дзіць; (*направлять*) накіро́ўваць; 2. *перен.* (*захватывать, восхищать*) захапля́ць; (*очаровывать*) чарава́ць, зачаро́ўваць; (*пленять, соблазнять*) прыва́бліваць, спакуша́ць; *см.* **увле́чь;** ~ТЬСЯ 1. захапля́цца; 2. (*влюбляться*) каха́ць (*каго*), захапля́цца; ~ЮЩИЙ *прил. см.* **увлека́тельный;** ~ЮЩИЙСЯ *прил.* 1. схі́льны да захаплення; 2. (*влюбчивый*) улю́блівы.

УВЛЕЧ||Е́НИЕ *ср* 1. (*действие*) уцягне́нне, -ння *ср*; *неоконч.* уця́гванне, -ння *ср*; захо́пліванне, -ння *ср*; *см.* **увлека́ть;** 2. (*восторг*) захапле́нне, -ння *ср*; (*пыл*) запа́л, -лу *м*; **рабо́тать с ~е́нием** працава́ць з запа́лам (захапле́ннем); **расска́зывать с ~е́нием** раска́зваць з захапле́ннем (запа́лам); 3. (*сильный, большой интерес к чему-л., привязанность*) захапле́нне, -ння *ср*; **у. теа́тром** захапле́нне тэа́трам; **ша́хматы — его́ у.** ша́хматы — яго́ захапле́нне; 4. (*влюблённость*) захапле́нне, -ння *ср*, закаха́насць, -ці *ж*; (*любовь*) каха́нне, -ння *ср*; **у. перешло́ в серьёзное чу́вство** захапле́нне перайшло́ ў сур'ёзнае пачуццё; ~ЁННОСТЬ захо́пленасць, -ці *ж*; ~ЁННЫЙ 1. (*втянутый*) уця́гнуты, заця́гнуты; (*захваченный*) захо́плены; (*унесённый*) занёсены; (*уведённый*) заве́дзены; 2. *перен.* (*восхищённый*) захо́плены; (*очарованный*) зачарава́ны; (*пленённый, соблазнённый*) прыва́блены; спаку́шаны; *см.* **увле́чь.**

УВЛЕ́||ЧЬ *сов.* 1. (*утащить*) уцягну́ць, зацягну́ць; (*захватить*) захапі́ць; (*унести*) занёсці; (*увести*) заве́сці; (*направить*) накірава́ць; **во́лны ~кли́ ло́дку в мо́ре** хва́лі уцягну́лі (зацягну́лі) ло́дку ў мо́ра; **ка́мень увлёк за собо́й при паде́нии ма́ссу песку́** ка́мень захапі́ў з сабо́й пры па́данні ма́су пяску́; **мечты́ ~кли́ его́ в бу́дущее** ма́ры занёслі (завялі) яго́ ў бу́дучыню; 2. *перен.* (*восхитить*) захапі́ць; (*очаровать*) зачарава́ць; (*пленить, соблазнить*) прыва́біць, спакусі́ць; **рабо́та ~кла́ его́** рабо́та захапі́ла яго́; ~ЧЬСЯ 1. захапі́цца; 2. (*влюбиться*) закаха́цца (*у каго*), захапі́цца.

УВО́Д *м* адво́д, -ду *м*, звод, *род.* зво́ду *м*; (*похищение*) выкрада́нне, -ння *ср*; (*кража*) крадзёж, -жу́ *м*; **сва́дьба ~ом** *уст.* вясе́лле з выкрада́ннем; ~ИТЬ *несов.* 1. ве́сці; (*выводить*) выво́дзіць; (*отводить*) адво́дзіць; (*заводить*) заво́дзіць; (*сводить*) зво́дзіць; 2. (*похищать*) кра́сці; (*сводить*) зво́дзіць; (*забирать*) забіра́ць; ~ИТЬСЯ *страд.* 1. ве́сціся; выво́дзіцца; адво́дзіцца; заво́дзіцца; зво́дзіцца; 2. кра́сціся; зво́дзіцца; забіра́цца.

УВО́З *м* адво́з, -зу *м*, звоз, *род.* зво́зу *м*; (*похищение*) выкрада́нне, -ння *ср*; (*кража*) крадзёж, -жу́ *м*; **сва́дьба ~ом** *уст.* вясе́лле з выкрада́ннем; ~ИТЬ *несов.* 1. ве́зці; (*вывозить*) выво́зіць; (*отвозить*) адво́зіць; (*завозить*) заво́зіць; (*свозить*) зво́зіць; 2. (*похищать*) кра́сці; (*свозить*) зво́зіць; (*забирать*) забіра́ць; ~ИТЬСЯ *страд.* 1. ве́зціся; выво́зіцца; адво́зіцца; заво́зіцца; зво́зіцца; 2. кра́сціся; зво́зіцца; забіра́цца.

УВОЛА́КИВАТЬ *несов. разг.* валачы́; (*выволакивать*) выvала́кваць, вывалака́ць; (*в сторону*) адвала́кваць, адвалака́ць; ~СЯ *страд.* валачы́ся; вывала́квацца, вывалака́цца; адвала́квацца, адвалака́цца.

УВО́Л||ЕННЫЙ зво́льнены; вы́звалены; ~ИТЬ *сов.* 1. зво́льніць; (*освободить*) вы́зваліць; *см.* **увольня́ть;** 2. (*избавить*) *уст.* зба́віць, пазба́віць; (*освободить*) вы́зваліць; **~ьте меня́ от его́ посеще́ний** зба́ўце мяне́ ад яго́ наве́дванняў; **нет уж, ~ьте!** *разг.* не ўжо, зба́ўце (вы́звальце)!; ~ИТЬСЯ зво́льніцца; (*освободиться*) вы́зваліцца.

УВОЛОЧИ́ТЬ *сов. см.* **уволо́чь.**

УВОЛО́ЧЬ *сов. разг.* павалачы́; (*выволочь*) вы́валачы; (*в сторону*) адвалачы́.

УВОЛЬН||Е́НИЕ звальне́нне, -ння *ср*; (*освобождение*) вызвале́нне, -ння *ср*; ~И́ТЕЛЬНЫЙ: **~и́тельный биле́т** біле́т аб звальне́нні (на звальне́нне); адпускны́ біле́т; **~и́тельное свиде́тельство** пасве́дчанне аб звальне́нні (на звальне́нне); (*временное*) адпускно́е пасве́дчанне; **~и́тельная запи́ска** запі́ска аб звальне́нні (на звальне́нне); адпускна́я запі́ска; ~ЯТЬ *несов.* звальня́ць; (*освобождать*) вызваля́ць; **~я́ть по сокраще́нию шта́тов** звальня́ць па скарачэ́нню шта́таў; **~я́ть в о́тпуск** звальня́ць у во́дпуск; **~я́ть в запа́с** *воен.* звальня́ць у запа́с; **~я́ть в до́лжности** звальня́ць в пасады, вызваля́ць ад паса́ды; ~ЯТЬСЯ звальня́цца; (*освобождаться*) вызваля́цца.

УВОРО́В||АННЫЙ укра́дзены; ~А́ТЬ *сов. простореч.* укра́сці; ~ЫВАТЬ *несов. простореч.* кра́сці.

УВРАЧЕВА́ТЬ *сов. уст.* залячы́ць.

УВУЛЯ́РНЫЙ *лингв.* увуля́рны.

УВЫ́ *межд.* нажа́ль (*к сожалению*); аво́хці (*горе!*); эх-эх (*эх!*); ды дзе там (*но не тут-то было*); **но увы́!** але́ нажа́ль!, ды дзе там!; **он до́лжен был прие́хать, но, увы́! его́ ещё нет** ён павінен быў прые́хаць, але́, нажа́ль, яго́ яшчэ́ няма́; **увы́, э́то о́чень печа́льно** нажа́ль, гэ́та ве́льмі су́мна; **увы́, наде́жды бо́льше нет** нажа́ль, надзе́і больш няма́.

УВЯДА́||НИЕ 1. завяда́нне, -ння *ср*, завя́нне, -ння *ср*; 2. (*человека*) завяда́нне, -ння *ср*, змарне́нне, -ння *ср*; ~ТЬ *несов.* 1. вя́нуць; 2. (*о человеке*) вя́нуць, марне́ць.

УВЯ́ДШИЙ *прил.* 1. завя́лы; 2. (*о человеке*) завя́лы, змарне́лы.

УВЯ́ЗАННЫЙ 1. (*связанный*) увя́заны; 2. *перен.* увя́заны; (*согласованный*) узго́днены.

УВЯЗА́ТЬ I *сов.* 1. (*связать*) увяза́ць; 2. *перен.* увяза́ць; (*согласовать*) узгадні́ць.

УВЯЗА́ТЬ II *несов.* (*в грязи*) вя́знуць, угруза́ць, уграза́ць, засяда́ць.

УВЯЗА́ТЬСЯ *сов. разг.* 1. (*о вещах*) увяза́цца; 2. (*уложиться*) звяза́цца; 3. *перен.* увяза́цца; (*согласоваться*) узго́дніцца; 4. (*следовать неотступно*) увяза́цца.

УВЯ́ЗКА *ж* 1. (*вещей*) увя́званне, -ння *ср*; 2. *перен.* увя́зка, -кі *ж*; (*согласование*) узгадне́нне, -ння *ср*.

УВЯ́ЗНУТЬ *сов.* увя́знуць, угру́знуць, угра́знуць, засе́сці.

УВЯ́ЗЫВА||НИЕ 1. увя́званне, -ння *ср*; 2. *перен.* увя́званне, -ння *ср*; узгадне́нне, -ння *ср*; ~ТЬ *несов.* 1. (*связывать*) увя́зваць; 2. *перен.* увя́зваць; (*согласовывать*) узгадня́ць; ~ТЬСЯ *разг.* 1. (*о вещах*) увя́звацца; 2. (*укладываться*) звя́звацца; 3. *перен.* увя́звацца; (*согласовываться*) узгадня́цца; 4. (*следовать неотступно*) увя́звацца; 5. *страд.* увя́звацца; узгадня́цца; *см.* **увя́зывать.**

УВЯ́НУТЬ *сов.* 1. завя́нуць, звя́нуць; 2. (*о человеке*) завя́нуць, звя́нуць, змарне́ць.

УГА́Д||АННЫЙ угада́ны, адгада́ны; ~А́ТЬ *сов.* угада́ць, адгада́ць; ~ЫВАНИЕ уга́дванне, -ння *ср*, адга́дванне, -ння *ср*; ~ЫВАТЬ *несов.* уга́дваць, адга́дваць; ~ЫВАТЬСЯ *страд.* уга́двацца, адга́двацца.

УГА́Р I *м* 1. чад, *род.* ча́ду *м*; **выделя́ть у.** чадзі́ць; 2. *перен.* чад, *род.* ча́ду *м*; (*самозабвение*) самазабыццё, -цця́ *ср*; (*экстаз*) экста́з, -зу *м*; **в ~е страсте́й** у экста́зе пачу́ццяў.

УГА́Р II *тех.* уга́р, -ру *м*; **у. при пла́вке мета́лла** уга́р пры пла́ўцы мета́лу.
УГА́РНО *в знач. сказ.* ча́дна.
УГА́РН||ЫЙ I 1. ча́дны; **в ко́мнате у. во́здух** у пакоі ча́днае паве́тра; **у. газ** *хим.* ча́дны газ; 2. *перен.* (*безудержный*) нястры́мны; (*разнузданный*) распу́шчаны; разбэ́шчаны; (*лихорадочный*) ліхама́нкавы; **~ое весе́лье** нястры́мная весяло́сць.
УГА́РН||ЫЙ II *тех.* уга́рны; **~ые оста́тки** уга́рныя рэ́шткі; **~ая пря́жа** уга́рная пра́жа.
УГАСА́||НИЕ *прям., перен.* згаса́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* 1. ту́хнуць, га́снуць, згаса́ць; 2. *перен.* га́снуць, згаса́ць.
УГА́СНУТЬ *сов.* 1. патухнуць, пага́снуць, зга́снуць; 2. *перен.* пага́снуць, зга́снуць.
УГА́СШИЙ 1. патухлы, пага́слы, зга́слы; 2. *перен.* пага́слы, зга́слы.
УГЛЕБЕТО́Н *стр.* вуглебето́н, -ну *м.*
УГЛЕВИ́ДНЫЙ вуглепадо́бны.
УГЛЕВО́Д *хим.* вугляво́д, -да *м*; **~НЫЙ** вугляво́дны.
УГЛЕВОДОРО́Д *хим.* вуглевадаро́д, -да *м*; **~НЫЙ** вуглевадаро́дны.
УГЛЕВО́З вугляво́з, -за *м*; **~НЫЙ** вугляво́зны.
УГЛЕДОБЫ́ЧА вуглездабы́ча, -чы *ж.*
УГЛЕДРОБИ́||ЛКА *тех.* вугледрабі́лка, -кі *ж*; **~ЛЬНЫЙ** вугледрабі́льны.
УГЛЕЖЖЕ́НИЕ выпа́льванне ву́галю, вуглевыпа́льванне, -ння *ср.*
УГЛЕЖО́Г *спец.* вугляпа́л, -ла *м.*
УГЛЕ||КИСЛОТА́ *хим.* вуглекіслата́, -ты́ *ж*; **~КИСЛО́ТНЫЙ** вуглекісло́тны; **~КИ́СЛЫЙ** *хим.* вуглекі́слы.
УГЛЕКО́П вугляко́п, -па *м.*
УГЛЕМО́ЙКА *горн.* вуглемы́йка, -кі *ж.*
УГЛЕМО́Л *горн.* вуглямо́л, -ла *м.*
УГЛЕНАГРУЖА́ТЕЛЬ *горн.* вугленагружа́льнік, -ка *м*; **~НЫЙ** вугленагружа́льны.
УГЛЕНО́СНЫЙ *горн.* вуглено́сны.
УГЛЕОБЖИГА́||НИЕ *горн.* вуглеабпа́льванне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬ** *горн.* вуглеабпа́льшчык, -ка *м.*
УГЛЕОБОГАТИ́ТЕЛЬНЫЙ *горн.* вуглеабагача́льны.
УГЛЕОПРОКИ́ДЫВАТЕЛЬ *горн.* вуглеперакý́льнік, -ка *м*; **~НЫЙ** вуглеперакý́льны.
УГЛЕОТДЕЛИ́ТЕЛЬ *горн.* вуглеадлу́чнік, -ка *м*; **~НЫЙ** вуглеадлу́чны.
УГЛЕО||ЧИСТИ́ТЕЛЬНЫЙ вуглеачышча́льны; **~ЧИ́СТКА** *горн.* вуглеачы́стка, -кі *ж.*
УГЛЕПЕРЕГРУЖА́ТЕЛЬ *горн.* вуглеперагружа́льнік, -ка *м.*
УГЛЕПОГРУ́З||КА вуглепагру́зка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** вуглепагру́зачны.
УГЛЕПОДАЮ́ЩИЙ *тех.* вуглепадава́льны.
УГЛЕПОДЪЁМН||ИК *горн.* вуглепад'ёмнік, -ка *м*; **~ЫЙ** вуглепад'ёмны.
УГЛЕПОСТАВЩИ́К вуглепастаўшчы́к, -ка́ *м.*
УГЛЕПРОМ||ЫВА́ТЕЛЬ *горн.* вуглепрамыва́льнік, -ка *м*; **~ЫВОЧНЫЙ** вуглепрамы́вачны.
УГЛЕПРОМЫШЛЕНН||ИК вуглепрамысло́вец, -ло́ўца *м*; **~ОСТЬ** вуглепрамысло́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ** вуглепрамысло́вы.
УГЛЕРЕ́ЗКА *тех.* вуглерэ́зка, -кі *ж.*
УГЛЕРО́Д *хим.* вугляро́д, -да *м*; **~ИСТЫЙ** вугляро́дзісты; **~НЫЙ** вугляро́дны.
УГЛЕСКЛА́Д вуглескла́д, -да *м.*
УГЛЕСНАБЖ||АЮ́ЩИЙ вуглезабяспе́чваючы; **~Е́НИЕ** вуглезабеспячэ́нне, -ння *ср.*
УГЛЕСО́С *горн.* вугляссо́с, -са *м.*
УГЛЕТУШИ́ТЕЛЬ *спец.* вуглетушы́льнік, -ка *м.*
У́ГЛИСТЫЙ *хим.* ву́глісты.
УГЛОВА́Т||ОСТЬ 1. вуглава́тасць, -ці *ж*; 2. *перен.* нехлямя́жасць, -ці *ж*; нязгра́бнасць, -ці *ж*; рэ́зкасць, -ці *ж*; непада́тлівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** 1. (*неровный, с углами*) вуглава́ты; 2. *перен.* (*неуклюжий*) нехлямя́жы; нязгра́бны; (*резкий*) рэ́зкі; (*неподатливый*) непада́тлівы.
УГЛОВ||О́Й 1. *мат., тех.* вуглавы́; **~о́е ускоре́ние** вуглаво́е паскарэ́нне; **у. ра́диус** вугла́вы ра́дыус; 2. (*находящийся на углу*) рагавы́; **у. дом** рагавы́ дом; **у. магази́н** рагавы́ магазі́н; 3. (*находящийся в углу*) ку́тні; **~а́я ко́мната** ку́тні пакой; **у. стол** ку́тні стол; 4. (*имеющий форму угла, согнутый под углом*) вуглавы́; **~о́е желе́зо** вуглаво́е жале́за; **~о́е соедине́ние** вуглаво́е злучэ́нне; **~о́й замо́к** *плотн.* вуглавы́ замо́к.
УГЛОМЕ́Р *тех., спец.* вугламе́р, -ра *м*; **~НЫЙ** вугламе́рны.
УГЛУБИ́||ТЕЛЬ *тех.* паглы́бнік, -ка *м*; **~ТЬ** *сов. прям., перен.* паглы́біць; **~ТЬСЯ** паглы́біцца.
УГЛУ́БКА *ж тех., горн.* паглы́бка, -кі *ж*, паглыбле́нне, -ння *ср.*
УГЛУБЛ||Е́НИЕ *ср* 1. (*действие*) паглыбле́нне, -ння *ср*; 2. (*впадина*) упа́дзіна, -ны *ж*, заглыбле́нне, -ння *ср*; **~Ё́ННО** *нареч.* паглы́блена; **~Ё́ННОСТЬ** паглы́бленасць, -ці *ж*; **~Ё́ННЫЙ** паглы́блены; **~Я́ТЬ** *несов. прям., перен.* паглыбля́ць; **~Я́ТЬСЯ** паглыбля́цца.
УГЛЯД||Е́ТЬ *сов.* 1. (*увидеть*) угле́дзець; 2. (*устеречь*) *разг.* упільнава́ць, дагле́дзець; **за ним не ~и́шь** яго́ не ўпільну́еш.
УГЛЯ́РКА *тех.* вугля́рка, -кі *ж.*
У́ГНАННЫЙ 1. пагна́ны; (*выгнанный*) вы́гнаны; (*отогнанный*) адагна́ны; 2. (*похищенный*) укра́дзены; (*согнанный*) сагна́ны; (*забранный*) забра́ны.
УГНА́ТЬ *сов.* 1. пагна́ць; (*выгнать*) вы́гнаць; (*отогнать*) адагна́ць; 2. (*похитить*) укра́сці; (*согнать*) сагна́ць; (*забрать*) забра́ць; *см.* **угоня́ть; ~СЯ** *прям., перен.* дагна́ць (*каго-што*), паспе́ць (*за кім-чым*), зраўнава́цца (*з кім-чым*).
УГНЕЗДИ́ТЬСЯ *сов. разг.* угнездава́цца, угняздзі́цца.
УГНЕСТИ́ *сов.* прыгне́сці.
УГНЕТА́ТЕЛЬ прыгнята́льнік, -ка *м*; **~СКИЙ** прыгнята́льніцкі.
УГНЕТ||А́ТЬ *несов.* прыгнята́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* прыгнята́цца; **~А́ЮЩЕ** *нареч.* прыгнята́льна; **~А́ЮЩИЙ** *прил.* прыгнята́льны; **~Е́НИЕ** прыгне́чанне, -ння *ср*; **~Ё́ННОСТЬ** прыгне́чанасць, -ці *ж*; **~Ё́ННЫЙ** прыгне́чаны.
УГОВА́РИВАТЬ *несов.* угаво́рваць; **~СЯ** 1. (*условливаться*) угаво́рвацца, умаўля́цца; (*договариваться*) дагаво́рвацца, дамаўля́цца; 2. *страд.* угаво́рвацца.
УГОВО́Р *м* 1. (*действие*) угаво́р, -ру *м*; *неоконч.* угаво́рванне, -ння *ср*; 2. (*взаимное соглашение*) угаво́р, -ру *м*, умо́ва, -вы *ж*; (*договорённость*) дагаво́ранасць, -ці *ж*, дамо́ўленасць, -ці *ж*; **у. доро́же де́нег** *посл.* угаво́р даражэ́й за гро́шы; **~И́ТЬ** *сов.* угавары́ць; **~И́ТЬСЯ** (*условиться*) угавары́цца, умо́віцца; (*договориться*) дагавары́цца, дамо́віцца; **~НЫЙ** *разг.* умо́ўлены.
УГО́Д||А: в ~у каб дагадзі́ць.
УГО́ДЕН *см.* **уго́дный.**
УГОДИ́||ТЬ *сов.* 1. (*услужить*) дагадзі́ць (*каму-чаму*); угадзі́ць (*каму-чаму*); унараві́ць (*каму-чаму*); **на всех тру́дно у.** усім дагадзі́ць (угадзі́ць, унараві́ць) цяжка; 2. (*попасть куда-л.*) *разг.* тра́піць; папа́сці; **лиса́ ~ла в капка́н** ліса́ тра́піла (папа́ла) у па́стку; 3. (*удариться*) *разг.* уда́рыцца, вы́цяцца; **он ~л лбом в дверь** ён уда́рыўся (вы́цяўся) ілбо́м у дзве́ры; 4. (*бросая, попасть*) папа́сці, тра́піць; **у. ка́мнем в окно́** папа́сці (тра́піць) ка́менем у акно́.
УГО́ДЛИВ||ОСТЬ *ж* даго́длівасць, -ці *ж*; уго́длівасць, -ці *ж*; ліслі́васць, -ці *ж*, падлі́званне, -ння *ср*; **~ЫЙ** даго́длівы; уго́длівы; (*льстивый*) ліслі́вы, падлі́злівы.
УГО́ДНИ||К 1. *разг.* уго́днік, -ка *м*; (*льстец*) ліслі́вец, -лі́ўца *м*, падлі́знік, -ка *м*, падлі́за, -зы *м*; 2. *рел.* уго́д-

УТВЕР‖ДИ́ТЕЛЬНО *нареч.* сцвярджа́льна; **~ДИ́ТЕЛЬНОСТЬ** сцвярджа́льнасць, -ці *ж*; **~ДИ́ТЕЛЬНЫЙ** сцвярджа́льны; **~ДИ́ТЬ** *сов.* 1. (*установить*) устанаві́ць, усталява́ць; (*укрепить*) умацава́ць; (*закрепить*) замацава́ць; 2. (*признать окончательным*) зацве́рдзіць; (*скрепить*) сцве́рдзіць; 3. (*заставить убедиться*) умацава́ць, пераканаць; *см.* **утвержда́ть** 1 — 3; **~ДИ́ТЬСЯ** 1. (*установиться*) устанаві́цца, усталява́цца; (*укрепиться*) умацава́цца; (*закрепиться*) замацава́цца; 2. (*убедиться*) умацава́цца, пераканаа́цца; **~ЖДА́ТЬ** *несов.* 1. (*устанавливать*) устана́ўліваць, усталёўваць; (*укреплять*) умацо́ўваць; (*закреплять*) замацо́ўваць; **~жда́ть при́нципы чего́-либо** устана́ўліваць (усталёўваць) пры́нцыпы чаго́-не́будзь; 2. (*признавать окончательным*) зацвярджа́ць; (*скреплять*) сцвярджа́ць; **~жда́ть поря́док дня** зацвярджа́ць пара́дак дня; **~жда́ть в до́лжности** зацвярджа́ць на паса́ду; **~жда́ть догово́р по́дписью** сцвярджа́ць (зацвярджа́ць) дагаво́р по́дпісам; 3. (*заставлять убедиться*) умацо́ўваць, перако́нваць; **~жда́ть кого́-либо в како́м-либо мне́нии** умацо́ўваць чыю́-не́будзь ду́мку; 4. (*настойчиво доказывать*) сцвярджа́ць; (*говорить*) каза́ць, гавары́ць; (*уверять*) упэ́ўніваць, перако́нваць; **вы ~жда́ете, что ви́дели его́** вы сцвярджа́еце (ка́жаце, гаворыце, упэ́ўніваеце), што ба́чылі яго́; **~ЖДА́ТЬСЯ** 1. (*устанавливаться*) устана́ўлівацца, усталёўвацца; (*укрепляться*) умацо́ўвацца; (*закрепляться*) замацо́ўвацца; 2. (*убеждаться*) умацо́ўвацца, перако́нвацца; 3. *страд.* устана́ўлівацца, усталёўвацца, умацо́ўвацца, замацо́ўвацца; зацвярджа́цца, сцвярджа́цца; перако́нвацца; каза́цца; гавары́цца, упэ́ўнівацца; **~ЖДЕ́НИЕ** 1. (*действие*) устанаўле́нне, -ння *ср*, усталява́нне, -ння *ср*, умацава́нне, -ння

ср; замацаванне, -ння *ср*; 2. зацвярджэнне, -ння *ср*; сцвярджэнне, -ння *ср*; умацаванне, -ння *ср*; перакананне, -ння *ср*; *неоконч.* устанаўліванне, -ння *ср*, усталёўванне, -ння *ср*; умацоўванне, -ння *ср*, замацоўванне, -ння *ср*; пераконванне, -ння *ср*; упэўніванне, -ння *ср*; *см.* **утверждать;** 2. (*мнение*) сцверджанне, -ння *ср*; **~ЖДЁННЫЙ** 1. устаноўлены, усталяваны; умацаваны; замацаваны; 2. зацверджаны; сцверджаны; 3. умацаваны, пераканаы; *см.* **утвердить.**

УТЕКАТЬ *несов.* 1. (*о жидкости*) выцякаць; 2. *перен.* (*миновать*) мінаць; (*проходить*) праходзіць; (*исчезать*) знікаць; *см.* **утечь.**

УТЁНОК *м* качаня, -няці *ср.*

УТЕПЛ||ЕНИЕ уцяпленне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** уцеплены; **~ИТЕЛЬ** *тех.* уцяпліцель, -ля *м*; **~ИТЬ** *сов.* уцяпліць; **~ЯТЬ** *несов.* уцяпляць; **~ЯТЬСЯ** *страд.* уцяпляцца.

УТЕРЕТЬ *сов.* уцерці; **~СЯ** уцерціся.

УТЕРОСКОПИЯ *мед.* утэраскапія, -піі *ж.*

УТЕРПЕТЬ *сов.* уцерпець, выцерпець; (*выдержать*) вытрымаць, вытрываць.

УТЕР||Я згуба, -бы *ж*; **~ЯННЫЙ** згублены; **~ЯТЬ** *сов.* згубіць; **~ЯТЬСЯ** згубіцца.

УТЁС *м* уцёс, -са *м*; (*скала*) скала, -лы *ж.*

УТЕСАТЬ *сов.* учасаць.

УТЁСИСТЫЙ уцёсісты; (*скалистый*) скалісты.

УТЕХА уцеха, -хі *ж.*

УТЕЧКА уцечка, -кі *ж.*

УТЕЧЬ *сов.* 1. (*о жидкости*) выцечы; 2. *перен.* (*миновать*) мінуць; (*пройти*) прайсці; (*исчезнуть*) знікнуць; **утекли годы** мінулі (прайшлі) гады; **время утекло** час прайшоў (мінуў).

УТЕШ||АТЬ *несов.* 1. (*успокаивать*) уцяшаць, суцяшаць; заспакойваць; 2. (*радовать*) цешыць; **~АТЬСЯ** 1. уцяшацца, суцяшацца; заспакойвацца; 2. (*радоваться*) цешыцца; **~ЕНИЕ** *ср* 1. (*действие*) уцяшэнне, -ння *ср*, суцяшэнне, -ння *ср*; заспакаенне, -ння *ср*; *неоконч.* заспакойванне, -ння *ср*; 2. (*утеха*) уцеха, -хі *ж*, заспакаенне, -ння *ср*; **~ИТЕЛЬ** суцяшальнік, -ка *м*; **~ИТЕЛЬНОСТЬ** суцяшальнасць, -ці *ж*; **~ИТЕЛЬНЫЙ** суцяшальны.

УТЕШИТЬ *сов.* уцешыць, суцешыць; заспакоіць; **~СЯ** уцешыцца, суцешыцца; заспакоіцца.

УТИЛИЗ||АТОР утылізатар, -ра *м*; **~АТОРСКИЙ** утылізатарскі; **~АТОРСТВО** утылізатарства, -ва *ср*; **~АЦИОННЫЙ** утылізацыйны; **~АЦИЯ** утылізацыя, -цыі *ж*; **~ИРОВАННЫЙ** утылізаваны; **~ИРОВАТЬ** *сов. и несов.* утылізаваць; **~ИРОВАТЬСЯ** *страд.* утылізавацца.

УТИЛИТ||АРИЗМ утылітарызм, -ма *м*; **~АРИСТ** утылітарыст, -та *м*; **~АРИСТКА** утылітарыстка, -кі *ж*; **~АРИСТСКИЙ** утылітарысцкі; **~АРНОСТЬ** утылітарнасць, -ці *ж*; **~АРНЫЙ** утылітарны.

УТИЛЬ утыль, -лю *м.*

УТИЛЬЗАВОД утыльзавод, -да *м.*

УТИЛЬНЫЙ утыльны.

УТИЛЬСЫРЬ||Ё *ср* утыльсыравіна, -ны *ж*; **~ЕВОЙ** утыльсыравінны.

УТИЛЬЦЕХ утыльцэх, -ха *м.*

УТИЛЬЩИ||К утыльшчык, -ка *м*; **~ЦА** утыльшчыца, -цы *ж.*

УТИНЫЙ качыны.

УТИРА||ЛЬНИК *обл.* уціральнік, -ка *м*, ручнік, -ка *м*; **~НИЕ** уціранне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* уціраць; **~ТЬСЯ** уціраацца.

УТИ-УТИ *межд.* вуць-вуць.

УТИХА||НИЕ уціханне, -ння *ср*, сціханне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* уціхаць, сціхаць.

УТИХНУТЬ *сов.* уціхнуць, сціхнуць.

УТИХОМИР||ЕННЫЙ уціхаміраны; **~ИВАТЬ** *несов.* уціхамірваць; **~ИВАТЬСЯ** уціхамірвацца; **~ИТЬ** *сов.* уціхамірыць; **~ИТЬСЯ** уціхамірыцца.

УТКА I *зоол.* качка, -кі *ж.*

УТКА II (*выдумка*) вутка, -кі *ж*; выдумка, -кі *ж*; **газетная у.** газетная вутка.

УТКА III *мор.*, *мед.* вутка, -кі *ж.*

УТК||АННЫЙ утканы, уватканы; **~АТЬ** *сов.* утказь, уватказь.

УТКНУ||ТЫЙ *разг.* уткнуты, уваткнуты; **~ТЬ** *сов.* *разг.* уткнуць, уваткнуць; **~ть нос** уткнуць (уваткнуць) нос; **~ТЬСЯ** *разг.* уткнуцца, уваткнуцца.

УТКОНОС *зоол.* качканос, -са *м.*

УТЛЫЙ (*некрепкий*) лядашты, кволы.

УТОК *текст.* уток, *род.* утку *м.*

УТОЛ||ЕНИЕ 1. наталенне, -ння *ср*, заспакаенне, -ння *ср*, здаволенне, -ння *ср*; *неоконч.* заспакойванне, -ння *ср*, здавольванне, -ння *ср*; 2. заспакаенне, -ння *ср*, суцішэнне, -ння *ср*; *неоконч.* заспакойванне, -ння *ср*; *см.* **утолить;** **~ИТЕЛЬ** здавольнік, -ка *м*; **~ИТЬ** *сов.* 1. (*удовлетворить*) наталіць, заспакоіць, здаволіць; 2. (*успокоить, умерить*) заспакоіць, суцішыць; **~ИТЬСЯ** заспакоіцца, суцішыцца.

УТОЛ||СТИТЬ *сов.* патоўсціць; **~СТИТЬСЯ** патоўсціцца; **~ЩАТЬ** *несов.* патаўшчаць; **~ЩАТЬСЯ** патаўшчацца; **~ЩЕНИЕ** патаўшчэнне, -ння *ср*; **~ЩЁННЫЙ** патоўшчаны.

УТОЛЯТЬ *несов.* 1. (*удовлетворять*) наталяць, заспакойваць, здавольваць; **у. жажду** праганяць (заспакойваць) смагу; 2. (*успокаивать, умерять*) заспакойваць, суцішаць; **~СЯ** 1. заспакойвацца, суцішацца; 2. *страд.* наталяцца, заспакойвацца, здавольвацца; суцішацца; *см.* **утолять.**

УТОМИТЕЛЬН||О *нареч.* утомна, стомна; нудна; **~ОСТЬ** утомнасць, -ці *ж*, стомнасць, -ці *ж*; нуднасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** утомны, стомны; (*нудный*) нудны.

УТОМ||ИТЬ *сов.* утаміць, стаміць; змарыць; **~ИТЬСЯ** утаміцца, стаміцца; змарыцца; (*от дороги — ещё*) здарожыцца; **~ЛЕНИЕ** *ср* 1. стомленасць, -ці *ж*; (*усталость*) утома, -мы *ж*, стома, -мы *ж*; змора, -ры *ж*; 2. *с.-х.* стамленне, -ння *ср*; **~ление почвы** стамленне глебы; **~ЛЁННЫЙ** *прич.*, *прил.* утомлены, стомлены; зморапы; **~ЛЯЕМОСТЬ** стамляльнасць, -ці *ж*; **~ЛЯЕМЫЙ** стамляльны; **~ЛЯТЬ** *несов.* утамляць, стамляць, таміць; зморваць; **~ЛЯТЬСЯ** 1. утамляцца, стамляцца; зморвацца; (*от дороги — ещё*) здарожвацца; 2. *страд.* утамляцца, стамляцца, таміцца; зморвацца; *см.* **утомлять.**

УТОНУТЬ *сов.* патануць; (*утопиться*) утапіцца.

УТОНЧ||АТЬ *несов.* 1. патончваць; 2. *перен.* вытончваць; **~АТЬСЯ** 1. танчэць, патанчацца; 2. *перен.* вытончвацца; 3. *страд.* патончвацца; вытончвацца; *см.* **утончать;** **~ЕНИЕ** 1. (*действие*) патанчэнне, -ння *ср*; вытанчэнне, -ння *ср*; *неоконч.* патончванне, -ння *ср*; вытончванне, -ння *ср*; *см.* **утончать;** 2. (*состояние*) танчэнне, -ння *ср*, патанчэнне, -ння *ср*; вытанчэнне, -ння *ср*; *см.* **утончаться** 1, 2; 3. (*утончённое место*) патанчэнне, -ння *ср*; **~ЁННО** *нареч.* вытанчана; **~ЁННОСТЬ** вытанчанасць, -ці *ж*; **~ЁННЫЙ** 1. *прич.* патончаны; 2. *прич.* *перен.* вытанчаны; 3. *прил.* вытанчаны; **~ённый вкус** вытанчаны густ; **~ИТЬ** *сов.* 1. патанчыць; 2. *перен.* вытанчыць; **~ИТЬСЯ** 1. патанчэць, патанчыцца; 2. *перен.* вытанчыцца.

УТОПА||ТЬ *несов.* 1. (*тонуть*) тануць; (*топиться*) тапіцца; 2. *перен.* патанаць, тануць; **~ЮЩИЙ** *сущ.* тапелец, -льца *м.*

УТОПИ||ЗМ утапізм, -му *м*; **~СТ** утапіст, -та *м*; **~СТКА** утапістка, -кі *ж.*

УТОПИТЬ *сов.* 1. утапіць; 2. *перен.* утапіць, загубіць; **~СЯ** утапіцца.

УТОПИЧ||ЕСКИЙ утапічны; **~НОСТЬ** утапічнасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** утапічны.

УТОПИЯ утопія, -піі *ж.*

УТОПЛЕНИЕ утапленне, -ння *ср.*

УТО́ПЛЕНН||ИК тапе́лец, -льца *м*; **~ИЦА** тапе́льніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** уто́плены.
УТО́ПТ||АННЫЙ утапта́ны; **~А́ТЬ** *сов.* утапта́ць; **~А́ТЬСЯ** *разг.* утапта́цца.
УТО́||Р *м спец.* уто́ра, -ры *ж*; **~РИТЬ** *несов.* зараза́ць уто́ры; **~РКА** *ж* зараза́нне уто́раў; **~РНИК** уто́рнік, -ка *м*, уто́рак, -рка *м*; **~РЫ** *мн.* уто́ры, -раў, *ед.* уто́ра, -ры *ж*.
УТО́ЧЕННЫЙ сто́чаны.
УТО́ЧИНА *тех.* уто́чына, -ны *ж*.
УТОЧИ́ТЬ *сов. тех.* стачы́ць; **~СЯ** стачы́цца.
УТО́ЧКА *ж тех.* сто́чванне, -ння *ср*.
УТОЧН||Е́НИЕ удакладне́нне, -ння *ср*; **~Ё́ННЫЙ** удакла́днены.
УТО́ЧНИК *спец.* уто́чнік, -ка *м*.
УТОЧНИ́ТЬ *сов.* удакладні́ць; **~СЯ** удакладні́цца.
УТО́ЧНЫЙ *спец.* уто́чны.
УТОЧНЯ́ТЬ *несов.* удакладня́ць; **~СЯ** удакладня́цца.
УТРА́ИВАТЬ *несов.* патро́йваць, утро́йваць; **~СЯ** патро́йвацца, утро́йвацца.
УТРАМБО́В||АННЫЙ утрамбава́ны; **~А́ТЬ** *сов.* утрамбава́ць; **~А́ТЬСЯ** утрамбава́цца; **~КА** *ж* утрамбо́ўка, -кі *ж*, утрамбава́нне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) утрамбо́ўванне, -ння *ср*, трамбава́нне, -ння *ср*; **~ОЧНЫЙ** утрамбо́вачны; **~ЩИК** утрамбо́ўшчык, -ка *м*; **~ЫВАТЬ** *несов.* утрамбо́ўваць, трамбава́ць; **~ЫВАТЬСЯ 1.** утрамбо́ўвацца; **2.** *страд.* утрамбо́ўвацца, трамбава́цца; *см.* **утрамбо́вывать.**
УТРА́||ТА стра́та, -ты *ж*; **~ТИТЬ** *сов.* стра́ціць; (*преимущественно о конкретных предметах*) згубі́ць; **~ЧЕННЫЙ** стра́чаны; **~ТИТЬСЯ** стра́ціцца; згубі́цца; **~ЧИВАТЬ** *несов.* тра́ціць; (*преимущественно о конкретных предметах*) губля́ць; **~ЧИВАТЬСЯ** тра́ціцца; губля́цца.
У́ТРЕНН||ИЙ ра́нішні; **~яя звезда́** зара́нка, ра́нішняя зо́рка; **~ИК 1.** ра́нішнік, -ка *м*; **2.** (*о морозе*) (ра́нішні) за́маразак, (ра́нішні) пры́маразак.
У́ТРЕНЯ *церк.* ю́трань, -ні *ж*.
У́ТРЕЧКОМ *нареч. разг.* ра́ніцай, раніцо́й, ра́нкам.
У́ТРЕШНИЙ *разг.* ра́нішні.
УТРИ́Р||ОВАНИЕ утры́раванне, -ння *ср*; **~ОВАННЫЙ** утры́раваны; **~ОВАТЬ** *сов. и несов.* утры́раваць; **~ОВАТЬСЯ** *страд.* утры́равацца; **~О́ВКА** *ж* утрыро́ўка, -кі *ж*; (*неоконч. действие*) утры́раванне, -ння *ср*.
У́ТРО *ср* **1.** ра́ніца, -цы *ж*, ра́нак, -нку *м*; **к утру́** пад ра́ніцу; **2.** *перен.* (*начало*) пача́так, -тку *м*, ра́ніца, -цы *ж*, зо́лак, -лку *м*; ◇ **одно́ у.** адна́е ра́ніцы, адно́йчы ра́ніцай; **под у.** пад ра́ніцу; **с утра́ до но́чи** з ра́нку да но́чы; **до утра́** да ра́ніцы; **ра́нним ~м** ранічко́ю; (*на рассвете*) на до́світку; **до́брое у.!** до́брай ра́ніцы!; **с утра́** з ра́ніцы; **по утра́м** ра́ніцамі, заўсё́ды ра́ніцай.
УТРО́Б||А *ж уст.* чэ́рава, -ва *ср*; вантро́ба, -бы *ж* (*внутренности*); **~НЫЙ** чэ́раўны, вантро́бны.
УТРОЕ́НИЕ патрае́нне, -ння *ср*, утрае́нне, -ння *ср*.
УТРО́||ЕННЫЙ патро́ены, утро́ены; **~ИТЬ** *сов.* патро́іць, утро́іць; **~ИТЬСЯ** патро́іцца, утро́іцца.
У́ТРОМ *нареч.* ра́ніцай, раніцо́й, ра́нкам.
УТРУ||ДИ́ТЬ *сов.* патурбава́ць; **~ЖДА́ТЬ** *несов.* турбава́ць; **~ЖДЁННЫЙ** патурбава́ны.
УТР||УСИ́ТЬСЯ *сов.* утрэ́сціся; **~У́СКА** *торг.* утру́ска, -кі *ж*.
УТРЯС||А́ТЬ *несов. в разн. знач.* утраса́ць, утрэ́сваць; **~А́ТЬСЯ** утраса́цца, утрэ́свацца; **~Ё́ННЫЙ** утрэ́сены; **~ТИ́** *сов. в разн. знач.* утрэ́сці; **~ТИ́СЬ** утрэ́сціся.
УТУЧН||Е́НИЕ *ср* **1.** (*действие*) угнае́нне ту́кам, угнае́нне, -ння *ср*; уко́рмліванне, -ння *ср*; адко́рмліванне, -ння *ср*; *см.* **утучни́ть; 2.** (*состояние*) угно́енасць ту́кам, угно́енасць, -ці *ж*; уко́рмленасць, -ці *ж*, адко́рмленасць, -ці *ж*; **~И́ТЬ** *сов.* **1.** угнаі́ць ту́кам; угнаі́ць; **2.** (*животных*) укармі́ць, адкармі́ць; **~И́ТЬСЯ 1.** угнаі́цца ту́кам; угнаі́цца; **2.** укармі́цца, адкармі́цца; **~Я́ТЬ** *несов.* **1.** угно́йваць ту́кам; угно́йваць; **2.** (*животных*) уко́рмліваць, адко́рмліваць; **~Я́ТЬСЯ 1.** угно́йвацца ту́кам; угно́йвацца; **2.** уко́рмлівацца, адко́рмлівацца.
УТЫ́КАТЬ *сов.* уты́каць; (*заткнуть*) абты́каць, абаткну́ць.
УТЫКА́ТЬ I *несов.* (*к уткну́ть*) утыка́ць.
УТЫКА́ТЬ II *несов.* (*к уты́кать*) утыка́ць; (*затыкать*) абтыка́ць.
УТЬ-УТЬ *межд.* вуць-вуць.
УТЮ́||Г *м* **1.** прас, *род.* пра́са *м*; (*цельный, нагреваемый на огне*) жаля́зка, -ка *ср*; **электри́ческий у.** электры́чны прас; **2.** *тех.* уцю́г, -га́ *м*; (*каток*) като́к, -тка́ *м*; **~ЖЕНИЕ** прасава́нне, -ння *ср*; **~ЖЕННЫЙ** прасава́ны; **~ЖИЛЬНЫЙ** прасава́льны; **~ЖИЛЬЩИК** прасава́льшчык, -ка *м*; **~ЖИЛЬЩИЦА** прасава́льшчыца, -цы *ж*; **~ЖИТЬ** *несов.* прасава́ць; **~ЖИТЬСЯ** *страд.* прасава́цца; **~ЖКА** *ж* прасава́нне, -ння *ср*, прасо́ўка, -кі *ж*; **отда́ть в ~жку** адда́ць прасава́ць; **~ЖНИК** *спец.* праса́р, -ра́ *м*, ма́йстар пра́саў; **~ЖНЫЙ** праса́рны; **~жное произво́дство** праса́рная вытво́рчасць, вы́раб пра́саў; **~ЖО́К** *уменьш.* пра́сік, -ка *м*.
УТЯЖЕЛ||Ё́ННЫЙ уцяжа́раны; **~И́ТЬ** *сов.* зрабі́ць (больш) ця́жкім; уцяжа́рыць; **~И́ТЬСЯ** зрабі́цца, стаць (больш) ця́жкім; уцяжа́рыцца; **~Я́ТЬ** *несов.* рабі́ць (больш) ця́жкім; уцяжа́рваць; **~Я́ТЬСЯ** рабі́цца, станаві́цца (больш) ця́жкім; уцяжа́рвацца.
УТЯНУ́ТЬ *сов.* **1.** (*уволочь за собой*) *просторечн.* сцягну́ць; (*оттянуть*) адцягну́ць; **2.** *перен.* (*украсть*) *разг.* сцягну́ць.
УТЯ́ТИНА *ж разг.* качы́нае мя́са.
УФ *межд.* ух; **уф, как жа́рко** ух, як го́рача.
УФА́ *г.* Уфа́, *род.* Уфы́ *ж*.
УФИ́МСКИЙ уфі́мскі.
УХ *межд.* ух; **ух, како́й большо́й!** ух, які́ вялі́кі!
УХА́ ю́шка, -кі *ж*; ры́бная палі́ўка.
УХА́Б *м* уха́ба, -бы *ж*; **~ИНА** *обл.* уха́біна, -ны *ж*; **~ИСТЫЙ** уха́бісты.
УХАЖЁР *разг.* кавале́р, -ра *м*, залё́тнік, -ка *м*; **~СКИЙ** кавале́рскі, залё́тніцкі.
УХА́ЖИВА||НИЕ 1. дагляда́нне, -ння *ср*; **2.** дагаджа́нне, -ння *ср*; **3.** служэ́нне, -ння *ср*; частаванне, -ння *ср*; **4.** заляца́нне, -ння *ср*; *см.* **уха́живать; ~ТЕЛЬ** *см.* **ухажё́р; ~ТЬ** *несов.* **1.** (*присматривать за кем-чем-л.*) дагляда́ць (*каго-што*); **~ть за больны́ми** дагляда́ць хво́рых; **2.** (*угождая*) дагаджа́ць (*каму-чаму*); **3.** (*услуживая за столом и т. п.*) служы́ць (*каму-чаму*); (*угощать*) частава́ць (*каго*); **4.** (*с любовными намерениями*) заляца́цца (*да каго*); **~ть за же́нщиной** заляца́цца да жанчы́ны.
У́ХАНЬЕ *разг.* ву́хканне, -ння *ср*.
У́ХАР||СКИ *нареч. разг.* зухава́та, хва́цка; **~СКИЙ** зухава́ты, хва́цкі; **~СТВО** *ср разг.* зухава́тасць, -ці *ж*, хва́цкасць, -ці *ж*.
У́ХАРЬ *разг.* зух, *род.* зу́ха *м*, хват, *род.* хва́та *м*.
У́ХАТЬ *несов. разг.* (*издавать громкий звук*) грыме́ць; (*громко кричать*) ву́хкаць, во́хкаць; **вдалеке́ у́хал гром** удалечыні́ грымеў гром; **~СЯ** бу́хацца.
УХВА́Т *м в разн. знач.* ві́лкі, -лак *ед. нет*.
УХВАТИ́ТЬ *сов. прям., перен.* ухапі́ць; **он ухвати́л меня́ за́ руку** ён ухапі́ў мяне́ за руку́; **мы сра́зу же ухвати́ли его́ мысль** *перен. разг.* мы адра́зу-ж ухапі́лі яго́ ду́мку; **~СЯ** *прям., перен.* ухапі́цца.
УХВА́Т||КА *ж разг.* **1.** (*манера*) мане́ра, -ры *ж*, звы́чка, -кі *ж*; **2.** (*ловкость, сноровка*) спрыт, *род.* спры́ту *м*, спры́тнасць, -ці *ж*.
УХВА́ТНЫЙ ві́лачны.
УХВА́||ТЫВАТЬ *несов.* хапа́ць; *см.* **ухвати́ть; ~ТЫВАТЬСЯ** хапа́цца; **~ЧЕННЫЙ** ухо́плены.

УХИТР||ЙТЬСЯ *сов. разг.* ухітрыцца; **~ЯТЬСЯ** *несов. разг.* ухітрацца.

УХИЩР||ЕНИЕ *ср* хітрыка, -кі *ж*, хітрасць, -ці *ж*; **~ЁННОСТЬ** хітрасць, -ці *ж*; **~ЁННЫЙ** хітры; **~ЯТЬСЯ** *несов.* хітраваць, ухітрацца.

УХЛОП||АННЫЙ *простореч.* 1. укакошаны; забіты; 2. усаджаны, угачаны, патрачаны; **~АТЬ** *сов. простореч.* 1. (*убить*) укакошыць; забіць; 2. (*истратить, израсходовать*) усадзіць, угаціць, патраціць; **~ЫВАТЬ** *несов. простореч.* 1. (*убивать*) укакошваць; забіваць; 2. (*тратить, расходовать*) усаджваць, угачваць, трацць.

УХМЫ||ЛКА *разг.* ухмылка, -кі *ж*, усмешка, -кі *ж*; **~ЛЬНУТЬСЯ** *сов. разг.* ухмыльнуцца, усміхнуцца; **~ЛЯТЬСЯ** *несов. разг.* ухмыляцца, усміхацца.

УХНУ||ТЬ *сов. разг.* 1. (*издать громкий звук*) грымнуць; (*громко крикнуть*) вухнуць, вохнуць; *см.* **ухать;** 2. (*с шумом упасть*) бухнуць, гопнуць, гопнуцца; грымнуцца; упасці; **книги ~ли на пол** кнігі бухнулі (упалі) на падлогу; 3. (*положить в большом количестве*) бухнуць, угаціць, уперці; **у. всё масло в котёл** бухнуць (угаціць, уперці) усё масла ў кацёл; 4. (*пропасть*) ляснуць, марна прапасці, згінуць; **~ли мой денежки** ляснулі мае грошыкі; 5. (*израсходовать*) бухнуць, выдаткаваць; **он все деньги ~л на покупку книг** ён усе грошы бухнуў на куплю кніг; 6. (*ударить*) *простореч.* грымнуць, выцяць, агрэць; **~ТЬСЯ** бухнуцца, грымнуцца.

УХО вуха, -ха *ср*, *мн.* вушы, -шэй; **наружное ухо** знадворнае вуха; **среднее ухо** сярэдняе вуха; **внутреннее ухо** унутранае вуха; **воспаление уха** *мед.* запаленне вуха; **заткнуть уши** заткнуць вушы; **отодрать за уши** накруціць вушы; **медвежье ухо** *бот.* дзіванна вялікая; ◇ **дать (съездить)** ■ **ухо** *разг.* даць (заехаць) у вуха; **и ухом не ведёт** *разг.* і вухам не вядзе, і не шманае; **как своих ушей не видать** *разг.* як сваіх вушэй не бачыць; **мимо ушей пропустить** *разг.* міма вушэй прапусціць; **навострить (насторожить) уши** *разг.* натапырыць вушы; **тугой на ухо** тугі на вуха; **прожужжать (прокричать, протрещать, протрубить) уши** *разг.* пратрубіць вушы; **слушать во все уши** *разг.* слухаць на ўсе вушы; ■ **одно ухо вошло,** ■ **в другое вышло** *разг.* у адно вуха ўвайшло, а ў другое выйшла; **слушать краем уха** *разг.* слухаць краем вуха; **держать ухо востро** *разг.* трымаць вуха востра; **одним ухом слышать** *разг.* адным вухам чуць; **покраснеть до ушей** *разг.* пачырванець да вушэй; **(говорить) на ухо** (гаварыць) на вуха; **дуть, петь (надуть, напеть) в уши** *разг.* пець (напець) у вушы; **за ушами трещит** *разг.* за вушамі трашчыць; **не верить своим ушам** *разг.* не верыць сваім вушам; **у стен уши есть** сцены вушы маюць; **ухо (уши) дерёт (режет)** *разг.* вуха (вушы) дзярэ; **уши вянут** *разг.* вушы вянуць; **по уши** *разг.* па вушы; **влюбиться по уши** *разг.* закахацца па вушы; **слышать собственными ушами** *разг.* чуць уласнымі вушамі; **дойти до ушей** дайсці да вушэй; **развесить уши** *разг.* развесіць вушы.

УХОВЁРТКА *зоол.* вухавёртка, -кі *ж*.

УХОД I *м* (*действие по глаг.* **уходить** I) 1. адыход, -ду *м*; (*выход*) выхад, -ду *м*; (*исчезновение*) знікненне, -ння *ср*; *неоконч.* знікание, -ння *ср*; пакіданне, -ння *ср*; 2. (*бегство*) уцёкі, -каў, уцяканне, -ння *ср*.

УХОД *м* II (*действие по глаг.* **ухаживать** 1) догляд, -ду *м*; *неоконч.* дагляданне, -ння *ср*.

УХОДИТЬ I *несов.* 1. (*идти*) ісці; (*выходить*) выходзіць; (*отходить*) адыходзіць, адыходзіцца; (*направляться*) накіроўвацца, падавацца; (*исчезать*) знікаць; (*покидать*) пакідаць; (*переставать заниматься чем-л., делать что-л., быть кем-чем и т. п.*) пераставаць быць (займацца, рабіць *и т. п.*); 2. (*убегать, скрываться, спасаться*) уцякаць; (*избегать*) пазбягаць, унікаць; (*избавляться*) пазбаўляцца; (*отделываться*) адчэпліваццa, адкараскваццa; 3. (*расходоваться*) ісці, выходзіць; (*тратиться*) быць выдаткаваным, быць страчаным; (*пропадать*) прападаць; (*убегать*) уцякаць; (*исчезать*) знікаць; (*вытекать — о жидкостях*) выцякаць; (*при кипении*) бегчы; 4. (*углубляться*) паглыбляцца; 5. (*проходить — о времени*) праходзіць, мінаць; *см.* **уйти.**

УХОДИ||ТЬ II *сов. простореч.* 1. (*изнурить*) уходаць, змардаваць, знясіліць; 2. (*убить, погубить*) уходаць, загубіць, збаёдаць; 3. (*промотать*) уходаць; ◇ **~ли сивку крутые горки** *погов.* быў конь, ды з'ездзіўся; замучылі сівага крутыя горкі.

УХОДИТЬСЯ *сов. разг.* 1. (*угомониться*) ушчыхамірыцца, супакоіцца, суняцца; 2. (*устать от ходьбы*) натупацца.

УХУДШ||АТЬ *несов.* пагаршаць; **~АТЬСЯ** пагаршацца; **~ЕНИЕ** 1. (*действие*) пагаршэнне, -ння *ср*, пагоршанне, -ння *ср*; *неоконч.* пагоршванне, -ння *ср*; **~ение положения рабочего класса при капитализме** пагаршэнне становішча рабочага класа пры капіталізме; 2. (*состояние*) пагаршэнне, -ння *ср*, пагоршанне, -ння *ср*; **~ение отношений** пагаршэнне адносін.

УХУДШ||ЕННЫЙ пагоршаны; **~ИТЬ** *сов.* пагоршыць; **~ИТЬСЯ** пагоршыцца.

УЦЕЛЕ||ВШИЙ уцалелы; **~ТЬ** *сов.* уцалець.

УЦЕН||ЁННЫЙ уцэнены; **~ИВАТЬ** *несов.* уцэньваць; **~ИВАТЬСЯ** уцэньвацца; **~ИТЬ** *сов.* уцаніць; **~КА** ■ *разн. знач.* уцэнка, -кі *ж*; **~ка уже сделана** уцэнка ўжо зроблена; **значительная ~ка** значная ўцэнка.

УЦЕПИТЬ *сов. разг.* учапіць; **~СЯ** учапіцца.

УЧАСТ||ВОВАТЬ *несов.* удзельнічаць; (*принимать участие*) прымаць (браць) удзел; **~ВУЮЩИЙ** *сущ.* удзельнік, -ка *м*; **~ИЕ** *ср* 1. (*совместное действие, обладание*) удзел, -лу *м*; **привлекать кого-либо к ~ию** прыцягваць каго-небудзь да ўдзелу; **принимать ~ие в чём-либо** прымаць (браць) удзел у чым-небудзь; **концерт с ~ием лучших артистов** канцэрт з удзелам лепшых артыстаў; 2. (*сочувствие*) спагада, -ды *ж*, спачуванне, -ння *ср*; **проявить ~ие** праявіць спагаду (спачуванне), паспагадаць; **слушать с ~ием** слухаць са спагадай (са спачуваннем).

УЧАСТИТЬ *сов. в разн. знач.* учасціць, пачасціць; **он участил свой посещения** ён учасціў (пачасціў) свае наведванні; **у. темп** учасціць тэмп; **~СЯ** учасціцца, пачасціцца.

УЧАСТКОВ||ЫЙ 1. *прил.* участковы; **~ая избирательная комиссия** участковая выбарчая камісія; **у. врач** участковы ўрач; 2. *сущ.* (*милиционер*) *разг.* участковы, -вага *м*.

УЧАСТЛИВ||О *нареч.* спагадліва, спачувальна; **~ОСТЬ** спагадлівасць, -ці *ж*, спачувальнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** спагадлівы, спачувальны.

УЧАСТНИ||К удзельнік, -ка *м*; **у. Великой Отечественной войны** удзельнік Вялікай Айчыннай вайны; **у. экспедиции** удзельнік экспедыцыі; **~ки занятий** удзельнікі заняткаў; **у. соревнования** удзельнік спаборніцтва; **у. собрания** удзельнік сходу; **~ЦА** удзельніца, -цы *ж*.

УЧАСТ||ОК *м* 1. участак, -тка *м*; (*выделенная часть*) дзялянка, -кі *ж*; **дробить на ~ки** драбніць на ўчасткі; **земельный у.** зямельны ўчастак (зямельная дзялянка); **поражённый у. (кожи)** пашкоджаны ўчастак (скуры); **у. заражения** *воен.* участак заражэння; 2. (*область, сфера*) участак, -тка *м*, галіна, -ны *ж*; **важный у. работы** важны ўчастак (важная галіна) работы; 3. *в др. знач.* участак, -тка *м*; **избирательный у.** выбарчы ўчастак; **врачебный у.** лекарскі ўчастак; **у. обороны полка** *воен.* участак абароны палка; **полицейский у.** *уст.* паліцэйскі ўчастак.

УЧАСТ||Ь *ж* доля, -лі *ж*, лёс, *род.* лёсу *м*; **разделить у.** зазнаць тую-ж долю; **подчиниться ~и** прымірыцца з лёсам.

УЧАЩАТЬ *несов. в разн. знач.* учашчаць, пачашчаць; *см.* **участить**; **~СЯ** учашчацца, пачашчацца.

УЧАЩАЯСЯ *сущ.* навучэнка, -кі *ж*; (*ученица*) вучаніца, -цы *ж*, вучнёўка, -кі *ж*; (*студентка*) студэнтка, -кі *ж*; (*слушательница*) слухачка, -кі *ж*; (*курсантка*) курсантка, -кі *ж*.

УЧАЩ||ЕНИЕ учашчэнне, -ння *ср*, пачашчэнне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** учашчаны, пачашчаны.

УЧАЩ||ИЙСЯ 1. *прил.* навучэнскі; (*ученический*) вучнёўскі; (*студенческий*) студэнцкі; (*слушательский*) слухацкі; (*курсантский*) курсанцкі; **~аяся молодёжь** вучнёўская (школьная) моладзь, моладзь навучальных устаноў; **2.** *сущ.* навучэнец, -нца *м*; (*ученик*) вучань, -чня *м*; (*студент*) студэнт, -та *м*; (*слушатель*) слухач, -ча *м*; (*курсант*) курсант, -та *м*.

УЧЁБА *ж* навучанне, -ння *ср*; вучоба, -бы *ж*.

УЧЕБНИК падручнік, -ка *м*.

УЧЕБН||ЫЙ 1. (*связанный с учением*) навучальны; **у. год** навучальны год; **~ое пособие** навучальны дапаможнік; **~ое заведение** навучальная ўстанова; **у. план** навучальны план; **~ая часть** навучальная частка; **2.** (*тренировочный*) вучэбны; **у. батальон** вучэбны батальён; **у. самолёт** вучэбны самалёт; **~ая стрельба** вучэбная стральба.

УЧЕН||ИЕ 1. (*действие*) вучэнне, -ння *ср*, навучанне, -ння *ср*; **время ~ия** час вучэння (навучання); **кончить учение** скончыць вучэнне (навучанне); **быть в ~ии** вучыцца; **2.** (*наука, теория*) вучэнне, -ння *ср*; **учение о социалистическом государстве** вучэнне аб сацыялістычнай дзяржаве; **марксистско-ленинское учение о партии** марксісцка-ленінскае вучэнне аб партыі; **мичуринское учение** мічурынскае вучэнне; **великое учение Маркса, Энгельса, Ленина, Сталина** вялікае вучэнне Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

УЧЕНИ||К вучань, -чня *м*; **~ЦА** вучаніца, -цы *ж*, вучнёўка, -кі *ж*; **~ЧЕСКИЙ** вучнёўскі; **~ЧЕСТВО** вучнёўства, -ва *ср*.

УЧЁН||ОСТЬ вучонасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** *прил.* (*много знающий*) вучоны; **~ые люди** вучоныя людзі; **2.** *сущ.* (*специалист*) вучоны, -нага *м*; **замечательные открытия советских ~ых** выдатныя адкрыцці савецкіх вучоных; **мировой ~ый** сусветны вучоны; **3.** *прил.* (*научный*) навуковы; вучоны; **~ый комитет** навуковы камітэт; **~ое общество** навуковае таварыства; **~ый совет** вучоны савет; **~ая степень** вучоная ступень; **~ый секретарь** вучоны сакратар.

УЧЁС учос, -су *м*; **~АННЫЙ** учасаны.

УЧЕСТЬ *сов.* **1.** улічыць; падлічыць; **я учёл его замечание** я ўлічыў яго заўвагу; **у. расходы** улічыць (падлічыць) выдаткі; **2.** (*вексель*) *фин.* дыскантаваць.

УЧЁСЫВАТЬ *несов.* учэсваць; **~СЯ** учэсвацца.

УЧЁТ 1. (*регистрация*) учот, -ту *м*; **снять (сняться) с ~а** зняць (зняцца) з учоту; **стать на у.** стаць на ўчот; **брать на у.** браць на ўчот; **2.** *в др. знач.* улік, -ку *м*, падлік, -ку *м*; **у. товаров** улік (падлік) тавараў; **бухгалтерский у.** бухгалтарскі ўлік (падлік); **у. труда** улік (падлік) працы; **вести у.** весці ўлік (падлік); **не поддаваться ~у** не паддавацца ўліку (падліку); **~НЫЙ 1.** (*относящийся к подсчёту*) падліковы; **2.** (*относящийся к учёту, регистрации*) учотны; **~ная карточка** учотная картка; **3.** *фин.* дысконтны; **~ный процент** дысконтны працэнт; **~ЧИК** учотчык, -ка *м*; **~ЧИЦА** учотчыца, -цы *ж*.

УЧИЛИЩ||Е вучылішча, -шча *ср*; **военное у.** ваеннае вучылішча; **ремесленное у.** рамеснае вучылішча; **художественное у.** мастацкае вучылішча; **~НЫЙ** вучылішчны.

УЧИН||ЕНИЕ учыненне, -ння *ср*; **~ЁННЫЙ** учынены; **~ИТЬ** *сов.* учыніць; **~ИТЬСЯ** учыніцца; **~ЯТЬ** *несов.* учыняць; **~ЯТЬСЯ** учыняцца.

УЧИТЕЛЬ *в разн. знач.* настаўнік, -ка *м*, *мн.* настаўнікі, -каў; **народный у.** народны настаўнік; **Маркс, Энгельс, Ленин, Сталин — великие учители пролетариата** Маркс, Энгельс, Ленін, Сталін — вялікія настаўнікі пралетарыяту; **~НИЦА** настаўніца, -цы *ж*; **~СКАЯ** *сущ.* настаўніцкая, -кай *ж*; **~СКИЙ** настаўніцкі; **~СТВО** *в разн. знач.* настаўніцтва, -ва *ср*; **десять лет ~ства** дзесяць год настаўніцтва; **советское ~ство** савецкае настаўніцтва; **~СТВОВАТЬ** *несов.* настаўнічаць.

УЧИТЫВАТЬ *несов.* **1.** улічваць; падлічваць; **2.** (*векселя*) дыскантаваць; *см.* **учесть**; **~СЯ** *страд.* **1.** улічвацца; падлічвацца; **2.** дыскантавацца.

УЧИТЬ *несов. в разн. знач.* вучыць; **у. русскому языку** вучыць рускай мове; **у. историю** вучыць гісторыю; **марксизм-ленинизм учит, что теория неразрывна с практикой** марксізм-ленінізм вучыць, што тэорыя непарыўна з практыкай; **~СЯ** вучыцца; ◇ **~ся на собственных ошибках** вучыцца на ўласных (на сваіх) памылках; **век живи — век учись** *погов.* век жывí — век вучыся.

УЧКОМ (ученический комитет) вучком, -ма *м* (вучнёўскі камітэт).

УЧРЕДИТЕЛЬ заснавальнік, -ка *м*; **~НЫЙ** устаноўчы; **~ное собрание** *полит.* устаноўчы сход; **~СКИЙ** заснавальніцкі.

УЧРЕДИТЬ *сов.* **1.** (*основать*) заснаваць; **2.** (*установить*) устанавіць; (*ввести*) увесці.

УЧРЕЖД||АТЬ *несов.* **1.** (*основывать*) заснoўваць; **2.** (*устанавливать*) устанаўліваць; (*вводить*) уводзіць; **~АТЬСЯ** *страд.* **1.** засноўвацца; **2.** устанаўлівацца; уводзіцца; **~ЕНИЕ** *ср* **1.** (*действие*) заснаванне, -ння *ср*; *неоконч.* засноўванне, -ння *ср*; устанаўленне, -ння *ср*; *неоконч.* устанаўліванне, -ння *ср*; **~ение комиссии** заснаванне (засноўванне) камісіі; **2.** (*организация, заведение*) установа, -вы *ж*; **государственное ~ение** дзяржаўная ўстанова; **3.** (*общественное установление*) устанаўленне, -ння *ср*; **политические ~ения общества** палітычныя ўстанаўленні грамадства; **~ЁННЫЙ 1.** заснаваны; **2.** устаноўлены; уведзены; **~ЕНСКИЙ, ~ЕНЧЕСКИЙ** устаноўскі.

УЧТЁННЫЙ 1. улічаны, падлічаны; **2.** (*о векселе*) *фин.* дыскантаваны.

УЧТИВ||О *нареч.* пачціва; (*с почтением*) пашанай, з павагай; (*вежливо*) далікатна; **~ОСТЬ** пачцівасць, -ці *ж*; далікатнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** пачцівы; (*вежливый*) далікатны.

УЧУ||Г *рыбол.* ез, *род.* еза, *мн.* езы, *род.* езаў; яз, *род.* яза, *мн.* язы, *род.* язоў; **~ЖНЫЙ** езны, язны.

УЧУЯТЬ *сов. разг.* учуць, пачуць.

УШАН *зоол.* кажан, -на *м*.

УШАНКА *просторeч.* вушанка, -кі *ж*.

УШАСТЫЙ *разг.* вушаты; **у. филин** вушаты пугач.

УШАТ цэбар, -бра *м*; **вылить у. холодной воды на кого-либо** *перен.* выліць цэбар халоднай вады на каго-небудзь.

УШАЧИ *пос.* Ушачы, *род.* Ушач.

УШАЧСКИЙ РАЙОН Ушацкі раён.

УШИБ *м* **1.** (*действие*) удар, -ру *м*; **получить у.** выцяць, ударыць (*што*), атрымаць удар; **2.** (*синяк*) выцятае месца; **~АТЬ** *несов.* ударáць; **~АТЬСЯ** ударацца; **~ИТЬ** *сов.* выцяць, ударыць; **~ИТЬСЯ** выцяцца, ударыцца; **~ЛЕННЫЙ** выцяты, ударaны.

УШИВАТЬ *несов.* ушываць; **~СЯ** ушывацца.

УШИВ||КА *ж* ушыўка, -кі *ж*; (*неоконч. действие*) ушыванне, -ння *ср*; **~ОЧНЫЙ** ушывачны.

УШИР||ЕННЫЙ пашыраны; **~ИТЕЛЬНЫЙ** пашыральны; **~ИТЬ** *сов.* пашырыць; **~ИТЬСЯ** пашырыцца; **~ЯТЬ** *несов.* пашыраць; **~ЯТЬСЯ** пашырацца.

УШИТЫЙ ушыты.

УШИ́ТЬ *сов.* ушы́ць; **∼СЯ** ушы́цца.
УШИ́ЦА *уменьш.-ласк.* ю́шка, -кі *ж.*
У́ШКО *см.* ушко́ I.
УШКО́ I *уменьш.* ву́шка, -ка *ср*; ◇ **у́шки на маку́шке** *разг.* слых на семяры́х; **за у., да на со́лнышко** *погов.* за ву́шка, ды на со́нейка; **для ми́лого дружка́ и серёжка из ушка́** *посл.* для мі́лага дру́га і завушні́чка з ву́ха.
УШК||О́ II *в разн. знач.* ву́шка, -ка *ср*; **у. сапога́** ву́шка бо́та; **∼и́ из пшени́чной муки́** ву́шкі з пшані́чнай мукі́.
УШКО́ III (*у иглы*) ву́шка, -ка *ср.*
УШКУ́Й *ист.* ушку́й, *род.* ушку́я *м*; **∼НИК** *ист.* ушку́йнік, -ка *м*; **∼НИЧАТЬ** *несов. ист.* ушку́йнічаць.
УШН||И́К *разг.* вушні́к, -ка́ *м*; **∼О́Й** вушны́.
УЩЕ́||ЛИСТЫЙ цясні́ністы; **∼ЛЬЕ** *ср* цясні́на, -ны *ж.*
УЩЕМ||И́ТЬ *сов. прям., перен.* ушчамі́ць; *см.* **ущемля́ть**; **∼И́ТЬСЯ** ушчамі́цца; **∼ЛЕ́НИЕ** ушчамле́нне, -ння *ср*; **∼ЛЁННЫЙ** *прич., прил. прям., перен.* ушчэ́млены; **∼ЛЯ́ТЬ** *несов. прям., перен.* ушчэ́мліваць; **∼ля́ть па́льцы** ушчэ́мліваць па́льцы; **∼ля́ть в права́х** ушчэ́мліваць у права́х; **∼ля́ть самолю́бие** ушчэ́мліваць самалю́бства; **∼ЛЯ́ТЬСЯ** ушчэ́мліваца.
УЩЕ́РБ *м* **1.** шко́да, -ды *ж*; (*урон*) уро́н, -ну *м*; (*потеря*) стра́та, -ты *ж*; **без ∼а для де́ла** без шко́ды (без уро́ну) для спра́вы; **понести́ у.** стра́ціць (пане́сці стра́ту); **причини́ть у.** пашко́дзіць (прычыні́ць стра́ту); **в у. кому́-либо** на шко́ду каму́-не́будзь; **2.** *астр.* ушчэ́рб, -бу *м*; **луна́ уже́ на ∼е** ме́сяц ужо́ на ўшчэ́рбе; ◇ **на ∼е** *перен.* на ско́не, у заняпа́дзе; **∼ЛЁННЫЙ** *прил.* **1.** (*оскорблённый*) абра́жаны; (*обиженный*) пакры́ўджаны, скры́ўджаны; **2.** *см.* **уще́рбный** I; **∼НЫЙ 1.** (*о луне*) шчарба́ты; **2.** *перен.* ушчэ́рбны.
УЩИПНУ́ТЬ *сов.* ушчыпну́ць.
УЭЛЬС Уэ́льс, -са *м.*
УЭ́ЛЬССКИЙ уэ́льскі.
УЮ́Т *м* уту́льнасць, -ці *ж*; **∼НО** *нареч.* уту́льна; **∼НОСТЬ** уту́льнасць, -ці *ж*; **∼НЫЙ** уту́льны.
УЯЗВ||И́МОСТЬ ура́зліваcць, -ці *ж*; сла́басць, -ці *ж*; присту́пнасць (для напа́даў); **∼И́МЫЙ** ура́злівы; сла́бы; прысту́пны (для напа́даў); **∼И́ТЬ** *сов.* ура́зіць; (*оскорбить*) абра́зіць; (*уколоть*) укало́ць; **∼ЛЁННЫЙ** *прич., прил.* ура́жаны; абра́жаны; уко́латы; **∼лённое самолю́бие** абра́жанае (уко́латае) самалю́бства; **∼ЛЯ́ТЬ** *несов.* (*поражать*) уража́ць; (*оскорблять*) абража́ць; (*колоть*) кало́ць.
УЯСН||Е́НИЕ уразуме́нне, -ння *ср*; усведамле́нне, -ння *ср*; **∼ЁННЫЙ** уразуме́ты; усвядо́млены; **∼И́ТЬ** *сов.* уразуме́ць; (*осознать*) усвядо́міць; **∼И́ТЬСЯ** стаць зразуме́лым; (*выясниться*) высветлі́цца; **∼Я́ТЬ** *несов.* уразумява́ць; (*осознавать*) усведамля́ць; **∼Я́ТЬСЯ 1.** станаві́цца зразуме́лым; (*выясняться*) высвятля́цца; **2.** *страд.* уразумява́цца; усведамля́цца; *см.* **уясня́ть.**

Ф

ФА *муз.* фа *нескл., ср.*
ФАБЗАВКО́М (фабри́чно-заводско́й комите́т) фабзаўко́м, -ма *м* (фабры́чна-заво́дскі камітэ́т).
ФАБЗА́||ВУЧ (шко́ла фабри́чно-заводско́го учени́чества) фабза́вуч, -ча *м* (шко́ла фабры́чна-заво́дскага вучнёўства); **∼ВУ́ЧНИК** *разг.* фабза́вучнік, -ка *м*; **∼УЧ, ∼У́ЧНИК** *см.* **фабза́в||уч, ∼у́чник.**
ФАБКО́М (фабри́чный комите́т) фабко́м, -ма *м* (фабры́чны камітэ́т).
ФАБ||ЛИО́, ∼ЛЬО́ *лит.* фабліё *нескл., ср.*
ФА́БРИКА фа́брыка, -кі *ж*; **пряди́льная ф.** прадзі́льная фа́брыка; **тка́цкая ф.** тка́цкая фа́брыка; **спи́чечная ф.** запа́лкавая фа́брыка; **бума́жная ф.** папяро́вая фа́брыка; папе́рня; ◇ **ф. лжи** *неодобр.* фа́брыка хлусні́.
ФА́БРИКА-КУ́ХНЯ фа́брыка-ку́хня, *род.* фа́брыкі-ку́хні *ж.*
ФАБРИК||А́НТ фабрыка́нт, -та *м*; **∼А́Т** фабрыка́т, -ту *м*; **∼А́ЦИЯ** *прям., перен.* фабрыка́цыя, -цыі *ж*; **∼О́ВАННЫЙ** фабрыкава́ны; **∼ОВА́ТЬ** *несов. прям., перен.* фабрыкава́ць; **∼ОВА́ТЬСЯ** *страд.* фабрыкава́цца.
ФА́БРИТЬ *несов.* фа́брыць; (*красить*) фарбава́ць; **∼СЯ** фа́брыцца; фарбава́цца.
ФАБРИ́ЧНО-ЗАВО́ДСК||ИЙ, ∼О́Й фабры́чна-заво́дскі; **шко́ла ∼о́го учени́чества** шко́ла фабры́чна-заво́дскага вучнёўства.
ФАБРИ́ЧН||ЫЙ I *прил.* фабры́чны; **ф. ко́рпус** фабры́чны ко́рпус; **∼ым спо́собом** фабры́чным спо́сабам.
ФАБРИ́ЧНЫЙ II *сущ. уст.* фабры́чны, -нага *м.*
ФА́БУЛ||А *лит.* фа́була, -лы *ж*; **∼Я́РНЫЙ** фабуля́рны.
ФАВН *миф.* фаўн, *род.* фа́ўна *м.*
ФАВО́Р фаво́р, -ру *м, мн. нет*; **быть в ∼е** быць у фаво́ры; **∼И́Т** *в разн. знач.* фавары́т, -та *м*; **∼ИТИ́ЗМ** фавары́тызм, -му *м*; **∼И́ТКА** фавары́тка, -кі *ж.*
ФАГЕДЕНИ́ЗМ *мед.* фагедэні́зм, -му *м.*
ФАГО́Т *муз.* фаго́т, -та *м*; **∼И́СТ** *муз.* фагаты́ст, -та *м*; **∼НЫЙ** фаго́тны.
ФАГОЦИ́Т *физл.* фагацы́т, -та *м*; **∼О́З** *физл.* фагацыто́з, -зу *м.*
ФА́З||А *в разн. знач.* фа́за, -зы *ж*; **социали́зм — пе́рвая ф. коммуни́зма** сацыялі́зм — пе́ршая фа́за камуні́зма; **ф. ку́колки у шелкови́чного червя́** *биол.* фа́за ку́калкі ў шаўкаві́чнага чарвяка́; **у́гол сдви́га фаз** *тех.* ву́гал зру́ху фаз; **∼ы луны́** фа́зы ме́сяца.
ФАЗА́Н *зоол.* фаза́н, -на *м*; **∼ИЙ** фаза́навы; **∼ий пету́х** фаза́н.
ФА́ЗИС фа́зіс, -су *м.*
ФА́ЗНЫЙ *эл., тех.* фа́зны.
ФАЗОИНДИКА́ТОР *эл.* фазаіндыка́тар, -ра *м.*
ФАЗОМЕ́ТР *физ., тех.* фазаме́тр, -ра *м.*
ФАЙ *текст.* фай, *род.* фа́ю *м*; **∼ДЕШИ́Н** *текст.* файдэшы́н, -ну *м*; **∼ДЕШИ́НОВЫЙ** файдэшы́навы.
ФА́КЕ||Л *м* фа́кел, -ла *м*, пахо́дня, -ні *ж*; **∼ЛЬНЫЙ** фа́кельны; **∼ЛЬЩИК** *прям., перен.* фа́кельшчык, -ка *м.*
ФАКИ́Р *в разн. знач.* факі́р, -ра *м.*
ФАКСИ́МИЛЕ факсі́міле *нескл., ср.*
ФАКТ факт, *род.* фа́кту *м*; **соверши́вшийся факт** здзе́йснены факт; **общеизве́стный факт** агульнавядо́мы факт; **достове́рный факт** вераго́дны (дакла́дны) факт; **привести́ фа́кты** прыве́сці фа́кты; **оби́льный фа́ктами** бага́ты фа́ктамі; ◇ **с фа́ктами в рука́х** з фа́ктамі ў рука́х; **факт налицо́** *разг.* факт у наяўнасці; **э́то факт!** гэ́та факт!; **факт, что...** факт, што...; **го́лые фа́кты** го́лыя фа́кты; **фа́кты — упря́мая вещь** фа́кты — упа́ртая рэч.
ФАКТИ́С *тех.* факты́с, -су *м.*
ФАКТИ́Ч||ЕСКИ *нареч.* факты́чна; **∼ЕСКИЙ** факты́чны; **∼еское доказа́тельство** факты́чны до́каз; **∼еское положе́ние де́ла** факты́чнае стано́вішча спра́вы; **вот**

~еская сторона́ де́ла вось факты́чны бок спра́вы; ~НОСТЬ факты́чнасць, -ці ж; ~НЫЙ факты́чны.
ФА́КТОР I фа́ктар, -ру м; **постоя́нно де́йствующие ~ы** пастая́нна дзе́ючыя фа́ктары.
ФА́КТОР II (*посредник*) *уст.* фа́ктар, -ра *м.*
ФАКТОРИА́Л *мат.* фактарыя́л, -ла *м.*
ФАКТО́РИЯ *в разн. знач.* факто́рыя, -рыі *ж.*
ФАКТУ́Р||А *иск., торг.* факту́ра, -ры *ж*; **~ИСТ** *торг.* фактуры́ст, -та *м*; **~НЫЙ** факту́рны.
ФАКУЛЬТАТИ́ВН||О *нареч.* факультаты́ўна; **~ОСТЬ** факультаты́ўнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** факультаты́ўны; **~ый курс ле́кций** факультаты́ўны курс ле́кцый.
ФАКУЛЬТЕ́Т факульто́т, -та *м*; **истори́ческий ф.** гіста-ры́чны факульто́т; **медици́нский ф.** медыцы́нскі факульто́т; **~СКИЙ** факульто́цкі.
ФАЛА́НГА I *ист.* фала́нга, -гі *ж.*
ФАЛА́НГА II *анат.* фала́нга, -гі *ж.*
ФАЛА́НГА III *зоол.* фала́нга, -гі *ж.*
ФАЛА́НГЕР *зоол.* фала́нгер, -ра *м.*
ФАЛАНГИ́СТ *воен. ист.* фалангі́ст, -та *м.*
ФАЛА́НГОВЫЙ *воен. ист.* фала́нгавы.
ФАЛАНСТЕ́Р *ист.* фаланстэ́р, -ра *м.*
ФА́ЛДА фа́лда, -ды *ж.*
ФАЛЛО́ПИЕВ: **~а труба́** *анат.* фало́піева труба́.
ФА́ЛЛОС *этнол.* фа́лас, -са *м.*
ФАЛЬКЛА́НДСКИЕ ОСТРОВА́ Фалькла́ндскія астравы́.
ФАЛЬКОНЕ́Т *воен. ист.* фальканет, -та *м.*
ФАЛЬСИФИ||КА́Т фальсіфіка́т, -ту *м*; **~КА́ТОР** фальсіфіка́тар, -ра *м*; **~ка́торы исто́рии** фальсіфіка́тары гісто́рыі; **~КА́ТОРСКИЙ** фальсіфіка́тарскі; **~КА́ЦИЯ** в *разн. знач.* фальсіфіка́цыя, -цыі *ж*; **~ка́ция истори́ческих фа́ктов** фальсіфіка́цыя гістары́чных фа́ктаў; **гру́бая ~ка́ция же́мчуга** гру́бая фальсіфіка́цыя жэ́мчугу; **~ЦИРО́ВАННЫЙ** фальсіфікава́ны; **~ЦИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* фальсіфікава́ць; **~ЦИ́РОВАТЬСЯ** *страд.* фальсіфікава́цца.
ФАЛЬЦ *тех., тип.* фальц, *род.* фа́льца *м.*
ФАЛЬЦАППАРА́Т *тип.* фальцапара́т, -та *м.*
ФАЛЬЦЕ́БЕЛЬ *стол.* фальцэ́бель, -ля *м*, фальцу́бель, -ля *м.*
ФАЛЬЦЕВА́ЛЬН||ЫЙ *тип.* фальцава́льны; **~ая маши́на** фальцава́льная машы́на.
ФАЛЬЦЕВ||А́НИЕ *тип.* фальцава́нне, -ння *ср*; **~А́ТЬ** *несов. тип.* фальцава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* фальцава́цца.
ФАЛЬЦЕ́Т *муз.* фальцэ́т, -ту *м.*
ФАЛЬЦО́В||АННЫЙ фальцава́ны; **~КА** *тип.* фальцо́ўка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** фальцо́вачны; **~ЩИК** *тип.* фальцо́ўшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** фальцо́ўшчыца, -цы *ж.*
ФАЛЬШИ́||ВИТЬ *несов. разг. в разн. знач.* фальшы́віць; **роя́ль расстро́ен, ~вит** *муз.* рая́ль расстро́ены, фальшы́віць; **~ВКА** *разг. пренебр.* фальшы́ўка, -кі *ж*; **~ВО** *нареч. в разн. знач.* фальшы́ва; **~во изобрази́ть что́-либо** фальшы́ва паказа́ць што-не́будзь; **петь ~во** *муз.* спява́ць фальшы́ва; **~во улыба́ться** фальшы́ва ўсміха́цца.
ФАЛЬШИВОМОНЕ́ТЧИК фальшываманет́чык, -ка *м.*
ФАЛЬШИ́В||ОСТЬ *в разн. знач.* фальшы́васць, -ці *ж*; **~ЫЙ** *в разн. знач.* фальшы́вы; **~ый докуме́нт** фальшы́вы дакуме́нт; **~ая но́та** *муз.* фальшы́вая но́та; **~ое положе́ние** фальшы́вае стано́вішча.
ФАЛЬШКИ́ЛЬ *мор.* фальшкі́ль, -ля *м.*
ФАЛЬШ||Ь *ж в разн. знач.* фальш, *род.* фа́льшу *м*, *мн. нет*; **иску́сство не те́рпит ни мале́йшей ~и** мастацтва не перано́сіць ніякага фа́льшу.
ФАЛЬЭ́РЦ *горн.* фальэ́рц, -цу *м.*
ФАМИ́||ЛИЯ *ж* 1. про́звішча, -шча *ср*; **назва́ть своё и́мя и ~лию** назва́ць сваё імя́ і про́звішча; **де́вичья ф.** дзяво́чае про́звішча; 2. (*род*) фамі́лія, -ліі *ж*; 3. (*семья*) *уст.* сям'я́, -м'і *ж*; **~ЛЬНЫЙ** *в разн. знач.* фамі́льны; **~льный архи́в Пу́шкиных** фамі́льны архі́ў Пу́шкіных; **~льное схо́дство** фамі́льнае падабе́нства.
ФАМИЛЬЯ́Р||НИЧАТЬ *несов. разг.* фамілья́рнічаць; **~НО** *нареч.* фамілья́рна; **~НОСТЬ** фамілья́рнасць, -ці *ж*; **не допуска́ть ~ности** не дапуска́ць фамілья́рнасці; **~НЫЙ** фамілья́рны.
ФАНАБЕ́РИЯ *разг.* фанабэ́рыя, -рыі *ж.*
ФАНАТИ́ЗМ фанаты́зм, -му *м.*
ФАНА́Т||ИК *рел., перен.* фана́тык, -ка *м*; **~И́ЧЕСКИ** *нареч.* фанаты́чна; **~И́ЧЕСКИЙ** фанаты́чны; **~И́ЧКА** фанаты́чка, -кі *ж*; **~И́ЧНО** *нареч.* фанаты́чна; **~И́ЧНОСТЬ** фанаты́чнасць, -ці *ж*; **~И́ЧНЫЙ** фанаты́чны.
ФАНДА́НГО (*танец*) фанда́нго *нескл., ср.*
ФАНЕ́Р||А *в разн. знач.* фане́ра, -ры *ж*; **ф. кра́сного де́рева** фане́ра чырво́нага дрэ́ва; **авиацио́нная ф.** авіяцы́йная фане́ра; **трёхсло́йная ф.** трохслаёвая фане́ра; **~НЫЙ** фане́рны; **~ная перегоро́дка** фане́рная перагаро́дка; **~ный лист** фане́рны ліст.
ФАНЕРОПИ́ЛЬНЫЙ фанерапі́льны.
ФАНЕ́Р||ОЧНЫЙ фане́рачны; **~ЩИК** фане́ршчык, -ка *м.*
ФАНЗА́ (*ткань*) фанза́, -зы́ *ж.*
ФА́НЗА́ (*дом*) фанза́, -зы́ *ж.*
ФАНТ 1.: **фа́нты** (*игра*) фа́нты, -таў *ед. нет*; 2. *в др. знач.* фант, *род.* фа́нта *м.*
ФАНТАЗ||ЁР фантазёр, -ра *м*; **~ЁРКА** фантазёрка, -кі *ж*; **~ЁРСТВО** фантазёрства, -ва *ср*; **~И́РОВАТЬ** *несов.* фантазі́раваць.
ФАНТА́ЗИЯ *в разн. знач.* фанта́зія, -зіі *ж*; **худо́жественная ф.** маста́цкая фанта́зія; **предава́ться ~м** аддава́цца фанта́зіям; **что э́то у тебя́ за ф.?** *разг.* што гэ́та ў цябе́ за фанта́зія?; **«Фанта́зия» Шу́мана** *муз.* «Фанта́зія» Шу́мана.
ФАНТАСМАГ||ОРИ́ЧЕСКИЙ фантасмагары́чны; **~О́РИЯ** *в разн. знач.* фантасмаго́рыя, -рыі *ж*; **э́то сплошна́я ~о́рия** гэ́та суцэ́льная фантасмаго́рыя.
ФАНТА́СТ фанта́ст, -та *м*; **~ИКА** в *разн. знач.* фанта́стыка, -кі *ж*; **~И́ЧЕСКИ** *нареч.* фантасты́чна; **~И́ЧЕСКИЙ** фантасты́чны; **~и́ческие слу́хи** фантасты́чныя чу́ткі; **~и́ческая литерату́ра** фантасты́чная літарату́ра; **~И́ЧНО** *нареч.* фантасты́чна; **~И́ЧНОСТЬ** фантасты́чнасць, -ці *ж*; **~И́ЧНЫЙ** фантасты́чны.
ФАНТО́М *в разн. знач.* фанто́м, -ма *м.*
ФА́НТЫ *см.* **фант 1.**
ФАНФА́Р||А *муз., перен.* фанфа́ра, -ры *ж*; **~И́СТ** *муз.* фанфары́ст, -та *м*; **~НЫЙ** *муз.* фанфа́рны.
ФАНФАРО́Н *разг. пренебр.* фанфаро́н, -на *м*; **~ИТЬ** *несов. разг. пренебр.* фанфаро́ніць; **~СТВО** фанфаро́нства, -ва *ср.*
ФА́Р||А фа́ра, -ры *ж*; **автомоби́льные ~ы** аўтамабі́льныя фа́ры.
ФАРА́ДА *эл.* фара́да, -ды *ж.*
ФАРАДИЗА́ЦИЯ *мед.* фарадыза́цыя, -цыі *ж.*
ФАРАДИ́ЧЕСКИЙ *эл.* фарады́чны.
ФАРАНДО́ЛА (*танец*) фарандо́ла, -лы *ж.*
ФАРАО́Н *в разн. знач.* фарао́н, -на *м*; **~ОВСКИЙ** *ист.* фарао́наўскі.
ФАРВА́ТЕР *мор., перен.* фарва́тэр, -ру *м.*
ФАРЕ́РСКИЕ ОСТРОВА́ Фарэ́рскія астравы́.
ФАРИНГИ́Т *мед.* фарынгі́т, -ту *м.*
ФАРИНГОСКОПИ́Я *мед.* фарынгаскапі́я, -пі́і *ж.*
ФАРИСЕ́Й *ист., перен.* фарысе́й, -се́я *м*; **~КА** *перен.* фарысе́йка, -кі *ж*; **~СКИ** *нареч. перен.* па-фарысе́йску; **~СКИЙ** *ист., перен.* фарысе́йскі; **~СТВО** *ист., перен.* фарысе́йства, -ва *ср.*
ФАРМАКОГНО́ЗИЯ *фарм.* фармакагно́зія, -зіі *ж.*
ФАРМАКО́Л||ОГ фармако́лаг, -га *м*; **~ОГИ́ЧЕСКИЙ** фармакалагі́чны; **~О́ГИЯ** фармакало́гія, -гіі *ж.*

ФАРМАКОПЕ́Я *мед.* фармакапе́я, -пе́і *ж.*

ФАРМАКОТЕРАП||Е́ВТИКА *мед.* фармакатэрапе́ўтыка, -кі *ж*; **~И́Я** *мед.* фармакатэрапі́я, -пі́і *ж.*

ФАРМАКОХИ́МИЯ *фарм.* фармакахі́мія, -міі *ж.*

ФАРМАЦ||Е́ВТ *мед.* фармацэ́ўт, -та *м*; **~Е́ВТИКА** *мед.* фармацэ́ўтыка, -кі *ж*; **~ЕВТИ́ЧЕСКИЙ** фармацэўты́чны; **~И́Я** *см.* **фармаце́втика.**

ФАРС *театр., перен.* фарс, *род.* фа́рса *м*; **~ОВЫЙ** *театр.* фа́рсавы.

ФА́РТИНГ (*монета*) фа́ртынг, -га *м.*

ФА́РТУ||К фартух, -ха́ *м*; **кухо́нный ф.** кухо́нны фарту́х; **~ЧНЫЙ** фартухо́вы.

ФАРФО́Р ▪ *разн. знач.* фарфо́р, -ру *м*; **ва́за из ~а** ва́за з фарфо́ру; **колле́кция ру́сского ~а** кале́кцыя ру́скага фарфо́ру; **саксо́нский ф.** саксо́нскі фарфо́р; **~ОВЫЙ** *в разн. знач.* фарфо́равы; **~овые изоля́торы** *эл.* фарфо́равыя ізаля́тары; **~овая гли́на** фарфо́равая глі́на; **~овый заво́д** фарфо́равы заво́д.

ФАРШ *кул.* фарш, *род.* фа́ршу *м*; **~ИРО́ВАННЫЙ** *кул.* фаршырава́ны; **~ИРОВА́ТЬ** *несов. кул.* фаршырава́ць; **~ИРОВА́ТЬСЯ** *страд.* фаршырава́цца; **~ИРО́ВКА** *кул.* фаршыро́ўка, -кі *ж.*

ФАС ▪ *разн. знач.* фас, *род.* фа́са *м*; **прямо́й фас** (*окопа, хода сообщения*) про́сты фас.

ФАСА́Д фаса́д, -да *м*; **~НЫЙ** фаса́дны.

ФАСЕ́Т *в разн. знач.* фасе́т, -та *м*; **~КА** *в разн. знач.* фасе́тка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** фасе́тачны; **~очный глаз** *зоол.* фасе́тачнае во́ка.

ФА́СКА *тех.* фа́ска, -кі *ж.*

ФАСО́В||АННЫЙ фасава́ны; **~А́ТЬ** *несов. торг.* фасава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* фасава́цца; **~КА** фасо́ўка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** фасо́вачны; **~ЩИК** фасо́ўшчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** фасо́ўшчыца, -цы *ж.*

ФАСО́||ЛЕВЫЙ фасо́левы; **~ЛЬ** фасо́ля, -лі *ж.*

ФАСО́Н *прям., перен* фасо́н, -ну *м*; **снять ф.** зняць фасо́н; **на но́вый ф.** *перен.* на но́вы фасо́н; **~ИСТЫЙ** *разг.* фасо́ністы.

ФАСОННОЛИТЕ́ЙНЫЙ *тех.* фасонналіце́йны.

ФАСО́Н||НЫЙ *тех.* фасо́нны; **~ное желе́зо** фасо́ннае жале́за; **~ное литьё** фасо́ннае ліццё; **ф. кирпи́ч** фасо́нная цэ́гла; **~ная труба́** фасо́нная труба́; **~ЩИК** *спец.* фасо́ншчык, -ка *м*; **~ЩИЦА** фасо́ншчыца, -цы *ж.*

ФАСЦИА́ЦИЯ *бот.* фасцыя́цыя, -цыі *ж.*

ФАСЦИОЛЁЗ *вет.* фасцыялёз, -зу *м.*

ФА́СЦИЯ *анат.* фа́сцыя, -цыі *ж.*

ФАТ фат, *род.* фа́та *м.*

ФАТА́ *ж* вэлюм, -ма *м.*

ФАТАЛИ́||ЗМ фаталі́зм, -му *м*; **~СТ** фаталі́ст, -та *м*; **~СТИ́ЧЕСКИ** *нареч.* фаталісты́чна; **~СТИ́ЧЕСКИЙ, ~СТИ́ЧНЫЙ** фаталісты́чны; **~СТКА** фаталі́стка, -кі *ж.*

ФАТА́ЛЬН||О *нареч.* фата́льна; **~ОСТЬ** фата́льнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** фата́льны.

ФА́ТА-МОРГА́НА фа́та-марга́на, -ны *ж.*

ФАТОВ||А́ТОСТЬ фатава́тасць, -ці *ж*; **~А́ТЫЙ** фатава́ты; **~СКО́Й** фатаўскі́; **~СТВО́** фатаўство́, -ва́ *ср.*

ФА́ТУМ фа́тум, -му *м.*

ФА́УНА фа́уна, -ны *ж.*

ФАЦЕ́Т *см.* **фасе́т.**

ФАЦЕ́ЦИЯ *лит. уст.* фацэ́цыя, -цыі *ж.*

ФА́ЦИЯ *геол.* фа́цыя, -цыі *ж.*

ФАШИЗ||А́ЦИЯ *полит.* фашыза́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАННЫЙ** фашызава́ны; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов. полит.* фашызава́ць; **~И́РОВАТЬСЯ** фашызава́цца.

ФАШИ́ЗМ *полит.* фашы́зм, -ма *м*; **разгро́м герма́нского ~а Сове́тской А́рмией** разгро́м герма́нскага фашы́зма Саве́цкай А́рміяй.

ФАШИ́Н||А *тех.* фашы́на, -ны *ж*; **~ИЗА́ЦИЯ** фашыніза́цыя, -цыі *ж*; **~НИК** фашы́ннік, -ку *м*; **~НЫЙ** фашы́нны; **~ная да́мба** фашы́нная да́мба.

ФАШИ́СТ *полит.* фашы́ст, -та *м*; **~ВУЮЩИЙ** *прич., прил. полит.* фашы́ствуючы; **~вующая империалисти́ческая реа́кция** фашы́ствуючая імперыялісты́чная рэа́кцыя; **~КА** фашы́стка, -кі *ж*; **~СКИЙ** фашы́сцкі; **~ский терро́р** фашы́сцкі тэро́р.

ФАЭТО́Н фаэто́н, -на *м.*

ФАЯ́НС *в разн. знач.* фая́нс, -су *м*; **торго́вля ~ом** га́ндаль фая́нсам; **~ОВЫЙ** фая́нсавы; **~овая посу́да** фая́нсавы по́суд (фая́нсавая пасу́да); **~овый заво́д** фая́нсавы заво́д.

ФЕВРА́ЛЬ лю́ты, -тага *м*; **~СКИЙ** лютаўскі; **февра́льская буржуа́зно-демократи́ческая револю́ция** лютаўская буржуа́зна-дэмакраты́чная рэвалю́цыя.

ФЕДЕР||АЛИЗА́ЦИЯ *полит.* федэраліза́цыя, -цыі *ж*; **~АЛИ́ЗМ** *полит.* федэралі́зм, -ма *м*; **~АЛИ́СТ** *полит.* федэралі́ст, -та *м*; **~АЛИСТИ́ЧЕСКИЙ** федэралісты́чны; **~АЛИ́СТКА** федэралі́стка, -кі *ж*; **~АЛИ́СТСКИЙ** федэралісты́чны; **~А́ЛЬНЫЙ** *полит.* федэра́льны; **~а́льное госуда́рство** федэра́льная дзяржа́ва; **~а́льное госуда́рственное устро́йство** федэра́льны дзяржа́ўны лад; **на ~а́льных нача́лах** на федэра́льных асно́вах; **~А́Т** *ист.* федэра́т, -та *м*; **~АТИ́ВНЫЙ** *полит.* федэраты́ўны; **Росси́йская Сове́тская Федерати́вная Социалисти́ческая Респу́блика (РСФСР)** Расі́йская Саве́цкая Федэраты́ўная Сацыялісты́чная Рэспу́бліка (РСФСР); **~ати́вное госуда́рство** федэраты́ўная дзяржа́ва; **~А́ЦИЯ** *полит. в разн. знач.* федэра́цыя, -цыі *ж*; **Всеми́рная ~а́ция профсою́зов** Сусве́тная федэра́цыя прафсаю́заў; **Всеми́рная ~а́ция демократи́ческой молодёжи** Сусве́тная федэра́цыя дэмакраты́чнай мо́ладзі; **Междунаро́дная демократи́ческая ~а́ция же́нщин** Міжнаро́дная дэмакраты́чная федэра́цыя жанчы́н; **~И́РОВАНИЕ** *полит.* федэрыраванне, -ння *ср.*

ФЕЕРИ́Ч||ЕСКИЙ, ~НЫЙ фееры́чны; **~еское зре́лище** фееры́чнае відо́вішча.

ФЕЕ́РИЯ *театр., перен.* фее́рыя, -рыі *ж.*

ФЕЙЕРБАХИА́Н||ЕЦ *филос.* фейербахія́нец, -нца *м*; **~СКИЙ** фейербахія́нскі; **~СТВО** *филос.* фейербахія́нства, -ва *ср.*

ФЕЙЕРВЕ́РК феерве́рк, -ка *м*; ◇ **ф. слов** *перен.* феерве́рк слоў.

ФЕЙЕРВЕ́РКЕР *воен. ист.* феерве́ркер, -ра *м.*

ФЕКА́||ЛИИ *мн.* фека́ліі, -лій, *ед.* фека́лія, -ліі *ж*; **~ЛЬНЫЙ** фека́льны.

ФЕЛЛА́Х фела́х, -ха *м.*

ФЕЛУ́КА *см.* **фелю́га.**

ФЕЛЬДМА́РША||Л *воен.* фельдма́ршал, -ла *м*; **~ЛЬСКИЙ** фельдма́ршальскі; **~льский жезл** фельдма́ршальскае жазло́; **~ЛЬСТВО** фельдма́ршальства, -ва *ср.*

ФЕЛЬДФЕ́БЕЛЬ *воен. уст.* фельдфе́бель, -ля *м*; **~СКИЙ** фельдфе́бельскі.

ФЕ́ЛЬДШЕР фе́льчар, -ра *м*; **~И́ЦА** фе́льчарка, -кі *ж*; **~СКИЙ** фе́льчарскі; **~ские ку́рсы** фе́льчарскія ку́рсы.

ФЕЛЬДШПА́Т *мин.* фельдшпа́т, -ту *м*; **~И́Т** *мин.* фельдшпаты́т, -ту *м.*

ФЕЛЬДЪЕ́ГЕ||РСКИЙ фельд'е́герскі; **~рская связь** фельд'е́герская су́вязь; **~РЬ** фельд'е́гер, -ра *м.*

ФЕЛЬЕТО́Н фельетон, -на *м*; **~И́СТ** фельетані́ст, -та *м*; **~И́СТКА** фельетані́стка, -кі *ж*; **~НЫЙ** фельето́нны; **~ный стиль** фельето́нны стыль.

ФЕЛЮ́ГА *мор.* фелюга, -гі *ж.*

ФЕМИНИЗ||А́ЦИЯ *биол.* фемініза́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАННЫЙ** фемінізава́ны; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов. биол.* фемінізава́ць; **~И́РОВАТЬСЯ** фемінізава́цца.

ФЕМИН||И́ЗМ *полит.* фемі́нізм, -ма *м*; **~И́СТ** фемі́ніст, -та *м*; **~И́СТСКИЙ** фемі́нісцкі.

ФЁН *метеор.* фён, *род.* фёну *м.*

ФЕНАЦЕТИ́Н *фарм.* фенацэці́н, -ну *м.*

ФЕ́НИКС *миф.* фе́нікс, -са *м.*
ФЕНИ́Л *хим.* фені́л, -ла *м*; **~ОВЫЙ** фені́лавы.
ФЕНОГЕНЕ́ТИКА *биол.* фенагене́тыка, -кі *ж.*
ФЕНО́Л *хим.* фено́л, -ла *м*; **~И́Т** *мин.* феналі́т, -ту *м*; **~ОВЫЙ** фено́лавы.
ФЕНОЛ||ОГИЧЕСКИЙ феналагі́чны; **~О́ГИЯ** *биол.* феналогія, -гіі *ж.*
ФЕНО́МЕН *филос.*, *перен.* фено́мен, -на *м*; **~АЛИ́ЗМ** *филос.* фенаменалі́зм, -ма *м*; **~АЛИ́СТ** *филос.* фенаменалі́ст, -та *м*; **~А́ЛЬНО** *нареч.* *перен.* фенамена́льна; **~А́ЛЬНЫЙ** *филос.*, *перен.* фенамена́льны.
ФЕНОТИ́П *биол.* фенаты́п, -пу *м.*
ФЕО́Д *ист.* фео́д, *род.* фео́да *м*; **~А́Л** *ист.* феада́л, -ла *м*; **~АЛИ́ЗМ** *ист.* феадалі́зм, -ма *м*; **~А́ЛЬНЫЙ** феада́льны; **~а́льный строй** феада́льны лад.
ФЕОДАТА́РИЙ *ист.* феадата́рый, -рыя *м.*
ФЕОДО́СИЯ *г.* Феадо́сія, -сіі *ж.*
ФЕРГАНА́ *г.* Фергана́, -ны́ *ж.*
ФЕРГА́НСКАЯ О́БЛАСТЬ Ферга́нская во́бласць.
ФЕ́РЗЕВЫЙ *шахм.* фе́рзевы.
ФЕРЗЬ *м шахм.* ферзь, *род.* ферзя́ *м*, карале́ва, -вы *ж.*
ЧУМА́ЗЫЙ *разг.* 1. *прил.* мурзáты; 2. *сущ. уст. пренебр.* шмаравóз, -за *м.*
ЧУМА́||К *ист.* чумáк, -кá *м*; **~ЦКИЙ** *ист.* чумáцкі.
ЧУМИ́ЗА *с.-х.* чумíза, -зы *ж.*
ЧУМИ́ЧКА *ж* 1. (*уполовник*) *обл.* апалóнік, -ка *м*; 2. *перен.* (*замарашка*) мýрза, -зы *м и ж.*
ЧУМНО́Й, ЧУ́МНЫЙ 1. *прил.* чýмны; 2. *сущ.* чýмны, -нага *м.*
ЧУНЦИ́Н г. Чунцы́н, -на *м.*
ЧУНЦИ́НСКИЙ чунцы́нскі.
ЧУР! *межд. разг.* цур!
ЧУРА́ТЬСЯ *несов. разг.* цурáцца.
ЧУРБА́Н *м* 1. цурбáн, -нá *м*; (*чурка*) пацурбáлак, -лка *м*; 2. *перен. бран.* даўбéжка, -кі *ж*, дóўбня, -ні *ж.*
ЧУРЕ́К чурэ́к, -ка *м.*
ЧУ́РКА *ж* цýрка, -кі *ж*; (*чурбан*) пацурбáлак, -лка *м*, аскабáлак, -лка *м.*
ЧУ́Т||КИЙ 1. чýйны, чýткі; 2. (*отзывчивый*) чýлы, спагáдлівы; **~КО** *нареч.* 1. чýйна, чýтка; 2. чýла, спагáдліва; **~КОСТЬ** 1. чýйнасць, -ці *ж*, чýткасць, -ці *ж*; 2. чýласць, -ці *ж*, спагáдлівасць, -ці *ж.*
ЧУ́ТОЧКУ *нареч. разг.* трóшкі, кры́шачку; чýтачку.
ЧУТЬ 1. *нареч.* (*едва, еле*) ледзь, лéдзьве; чуць; (*немножко*) трóшкі, кры́шку; чуць; **чуть вспо́мнил** ледзь (лéдзьве) успóмніў; **чуть живо́й** ледзь жывы́; **чуть заме́тная улы́бка** ледзь прыкмéтная ўсмéшка; **чуть поумне́л** трóшкі (кры́шку) паразумнéў; **пи́ща была́ чуть посо́лена** éжа былá трóшкі (кры́шку, чуць) пасóлена; 2. *союз* як тóлькі, ледзь тóлькі; **чу́ть кто скри́пнет, я услы́шу** як тóлькі хто скры́пне, я пачýю; ◇ **чуть свет** чуць свет, да світáння, на зóлку; **чуть что** чуць што; **чуть (бы́ло) не...** трахá не...; **чуть ли не...** *разг.* трахá не, амáль ці не, здаéцца, ці не...; **чуть ли не вы са́ми э́то рассказы́вали** здаéцца (ці не) вы сáмі гэ́та расказвалі.
ЧУТЬЁ *ср* 1. (*у животных*) нюх, *род.* нюху *м*; 2. *перен.* чуццё, -ццё *ср*; (*нюх*) нюх, *род.* нюху *м.*
ЧУТЬ-ЧУТЬ ледзь-ледзь, чуць-чуць.
ЧУФА́ *бот.* чуфá, -фы́ *ж.*
ЧУ́ЧЕ||ЛО 1. чýчала, -ла *ср*; 2. (*пугало*) пýдзіла, -ла *ср*; 3. *перен. бран.* пýдзіла, -ла *ср*; ◇ **ч. горо́ховое** *перен. разг.* пýдзіла гарóхавае; **~ЛЬНИК** чýчальнік, -ка *м*; **~ЛЬНЫЙ** чýчальны.
ЧУ́ШКА I (*свинья*) *разг.* свíнка, -кі *ж.*
ЧУ́ШКА II 1. *спец.* чýшка, -кі *ж*; 2. *спорт.* гарадкí, -кóў *ед. нет.*
ЧУШЬ *ж* лухтá, -ты́ *ж*; глýпства, -ва *ср.*
ЧУ́ЯТЬ *несов.* чуць; **~СЯ** *безл.* чýцца, адчувáцца.
ЧЬЁ, ЧЬЯ *мест. см.* **чей.**

Ш

ША́БАТ *тех.* шáбат, -та *м.*
ША́БАШ *рел., миф.* шáбас, -су *м.*
ШАБА́Ш *в знач. сказ. разг.* шабáш, бáста; **~ИТЬ** *несов. обл.* шабáшыць.
ША́БЕР *тех.* шáбер, -ра *м.*
ШАБЛО́Н *тех., перен.* шаблóн, -ну *м*; **~ИЗИ́РОВАННЫЙ** шабланізавáны; **~ИЗИ́РОВАТЬ** *сов. и несов.* шабланізавáць; **~ИЗИ́РОВАТЬСЯ** *страд.* шабланізавáцца; **~НО** *нареч.* шаблóнна; **~НОСТЬ** шаблóннасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** *тех., перен.* шаблóнны.
ША́БОТ *см.* **шáбат.**
ША́БР||ЕНИЕ *тех.* шáбранне, -ння *ср*; **~ЕННЫЙ** шáбраны; **~ИТЬ** *несов. тех.* шáбрыць.
ШАБР||ОВА́ТЬ *несов. стр.* шабравáць; **~О́ВКА** *стр.* шабрóўка, -кі *ж.*
ША́ВКА *ж разг.* кýдла, -лы *ж*, кýндаль, -ля *м.*
ШАГ *м* 1. (*движение ногой при ходьбе*) крок, *род.* крóку *м*; шаг, *род.* шáгу *м*; **сде́лать шаг вперёд** ступíць (зрабíць) крок напéрад; **кру́пные, ме́лкие шаги́** буйны́я, дрóбныя крóкі; **во́льный шаг** вóльны крок; **разме́ренные (ме́рные) шаги́** мéрныя крóкі; **отме́рить шага́ми** адмéраць крóкамі; **отбива́ть шаг** адбівáць крок; 2. (*движение пешком*) крок, *род.* крóку *м*; (*поступь*) хадá, -ды́ *ж*, ступá, -пы́ *ж*; **бе́глый шаг** *воен.* бéглы крок; **приба́вить ша́гу** прыбáвіць крóку; **заме́длить, уско́рить шаг** прыцíшыць, паскóрыць крок (хадý); **ско́рым (бы́стрым) ша́гом** шпáркім крóкам (шпáркай хадóй); **ти́хим ша́гом** цíхім крóкам, цíхай хадóй (ступóй); **пла́вный, твёрдый, разме́ренный шаг** плáўны, цвéрды, мéрны крок; плáўная, цвёрдая, мéрная хадá (ступá); 3. *перен.* (*действие, поступок*) крок, *род.* крóку *м*; (*мера, мероприятие*) зáхад, -ду *м*; **ло́жный шаг** няпрáвільны крок; **большо́й шаг вперёд** вялíкі крок напéрад; **предприня́ть шаги́** зрабíць зáхады; **дальне́йшие шаги́** далéйшыя зáхады; 4. *тех.* шаг, *род.* шáгу *м*; **шаг зубча́того колеса́** шаг зубчáстага кóла; ◇ **шаг вперёд, два шага́ наза́д** крок напéрад, два крóкі назáд; **в двух (в не́скольких) шага́х отсю́да** за два крóкі (за нéкалькі крóкаў) адгэ́туль; **гига́нтские шаги́** *спорт.* гігáнцкія крóкі; **дви́гаться гига́нтскими шага́ми** ісцí гігáнцкімі крóкамі; **дипломати́ческий шаг** дыпламаты́чны крок; **ло́вкий шаг** спры́тны крок; **на ка́ждом шагу́ (что ни шаг)** на кóжным крóку; **не отступа́ть ни на шаг** не адступáць ні на крок; **не отходи́ть ни на шаг от кого́-либо** не адыхóдзіць (не адыхóдзіцца) ні на крок ад кагó-нéбудзь; **ни ша́гу да́льше** ні крóку далéй; **ни ша́гу наза́д** ні крóку назáд; **пе́рвые шаги́** пéршыя крóкі; **сде́лать пе́рвый шаг** зрабíць пéршы крок; **сде́лать реши́тельный шаг** зрабíць рашýчы крок; **шаг за ша́гом** крок за крóкам; **ша́гу ступи́ть нельзя́ (не мо́жет)** крóку зрабíць нямóжна (не мóжа); **ша́гу не сде́лать** крóку не зрабíць.
ШАГ||А́ТЬ *несов.* 1. крóчыць; шагáць; (*ступать*) ступáць; (*идти*) ісцí; (*ходить*) хадзíць; 2. (*через кого-что*) пераступáць, ступáць; **ш. че́рез кана́ву** пераступáць (ступáць) цéраз канáву; ◇ **ш. че́рез тру́пы** *перен.* ступáць цéраз трýпы; **~А́ЮЩИЙ** *прил.* шагáючы; **~а́ющий экскава́тор** *тех.* шагáючы экскавáтар; **~И́СТИКА** *пренебр.* шагíсцыка, -кі *ж*, маршырóўка, -кі *ж*; **~НУ́ТЬ** *сов. и однокр.* ступíць, зрабíць крок; шагнýць; ◇ **далеко́ ~ну́ть** далёка пайсцí; **~ну́ть не даю́т (нельзя́)** ступíць не даюць (нямóжна).
ША́ГОМ *нареч.* ступóю, крóкам; **е́хать ш.** éхаць ступóю; ◇ **ш. марш!** *воен.* шáгам марш!
ШАГРЕ́||НЕВЫЙ шчыгры́навы; **~НИ́РОВАННЫЙ** *тех.* шчыгрынавáны; **~НИ́РОВАТЬ** *несов. тех.* шчыгрынавáць;

~НИ́РОВАТЬСЯ шчыгрынава́цца; **~НЬ** *ж* шчыгры́н, -ну *м*.

ШАЖ||КО́М *нареч. разг.* дро́бнай хадо́ю; **~О́К** *м* дро́бная хада́; **идти́ лёгкими ~ка́ми** ісці́ дро́бнай (лёгкай) хадо́й.

ША́ЙБА *тех.* ша́йба, -бы *ж*.

ША́ЙКА I (*банда*) ша́йка, -кі *ж*, ба́нда, -ды *ж*; (*компания*) хе́ўра, -ры *ж*; **ш. воро́в, разбо́йников** ша́йка (ба́нда) зладзе́яў, разбо́йнікаў.

ША́ЙКА II (*для воды*) ра́жка, -кі *ж*.

ШАЙТА́Н *миф.* шайта́н, -на *м*.

ШАКА́Л *зоол.* шака́л, -ла *м*; **~ИЙ** шакалі́ны.

ШАЛА́НДА *мор.* шала́нда, -ды *ж*.

ШАЛА́Ш буда́н, -на́ *м*.

ШАЛЁВАННЫЙ *плотн.* шалява́ны.

ШАЛЕВА́ТЬ *несов. плотн.* шалява́ць; **~СЯ** *страд.* шалява́цца.

ШАЛЁВКА *плотн.* шалёўка, -кі *ж*.

ША́ЛЕВЫЙ ша́левы.

ШАЛЕ́ТЬ *несов. разг.* шале́ць.

ШАЛИ́||ТЬ *несов.* **1.** (*резвиться*) дурэ́ць; (*забавляться*) забаўля́цца; **2.** (*вести себя или обращаться с кем-чем-л. легкомысленно*) жартава́ць; **ш. с огнём** жартава́ць з агнём; **3.** (*бесчинствовать*) свавольіць, гарэ́зс… гарэ́заваць; (*грабить*) гра́біць; ◇ **~шь!** *разг.* жарту́еш!; ду́дкі!; **~шь! не обма́нешь!** жарту́еш! (ду́дкі!) не ашука́еш!

ШАЛОВЛИ́В||О *нареч.* дурасліва, сваво́льна, гарэ́зліва; **~ОСТЬ** *ж* дурасліва́сць, -ці *ж*, сваво́льства, -ва *ср*, гарэ́злівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ 1.** (*любящий шалить*) дурасли́вы, сваво́льны, гарэ́злівы; **2.** (*игривый*) жартаўлі́вы, гуллі́вы.

ШАЛОПА́Й *разг.* шалапу́т, -та *м*; **~НИЧАТЬ** *несов. разг.* шалапу́тнічаць.

ША́ЛОСТЬ I *ж* (*весёлая проказа, проделка*) сваво́льства, -ва *ср*.

ША́ЛОСТЬ II (*к* **ша́лый**) шалёнасць, -ці *ж*.

ШАЛУ́Н, ~И́ШКА *разг.* дураслі́вец, -лі́ўца *м*, сваво́льнік, -ка *м*, гарэ́за, -зы *м*; **~ЬЯ** дурасліўка, -кі *ж*, сваво́льніца, -цы *ж*, гарэ́за, -зы *ж*.

ШАЛФЕ́Й *бот.* шалфе́й, -фе́ю *м*.

ША́ЛЫЙ шалёны.

ШАЛЬ *ж* ху́стка, -кі *ж*, шаль, *род.* ша́ля *м*; ◇ **воротни́к ша́лью** ша́левы каўне́р.

ШАЛЬН||О́Й шалёны, ашале́лы, утрапёны; **~а́я пу́ля** шалёная (сляпа́я) ку́ля; **~ы́е де́ньги** дурны́я гро́шы.

ШАМА́Н шама́н, -на *м*; **~СКИЙ** шама́нскі; **~СТВО** шама́нства, -ва *ср*.

ШАМА́Я *зоол. см.* **шемая́**.

ША́МКА||НЬЕ ша́мканне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* ша́мкаць.

ШАМО́Т *стр.* шамо́т, -ту *м*; **~НЫЙ, ~ОВЫЙ** шамо́тавы.

ШАМПАНИЗ||А́ЦИЯ шампаніза́цыя, -цыі *ж*; **~И́РОВАННЫЙ** шампанізава́ны; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов.* шампанізава́ць.

ШАМПА́НСКОЕ *сущ.* шампа́нскае, -кага *ср*.

ШАМПА́НЬ Шампа́нь, -ні *ж*.

ШАМПИНЬО́Н *м бот.* шампін'ён, -на *м*; пячуры́ца, -цы *ж*.

ШАМПУ́НЬ *м* и *ж* шампу́нь, -ню *м*.

ШАНДА́Л *уст.* шанда́л, -ла *м*.

ША́НДРА *бот.* ша́ндра, -ры *ж*; ша́нта, -ты *ж*.

ША́НЕЦ *воен.* ша́нец, *род.* ша́нца *м*.

ША́НКЕРНЫЙ *мед.* ша́нкерны.

ШАНКР *мед.* ша́нкір, -ру *м*.

ШАНС шанц, *род.* ша́нцу *м*; **име́ть ~ы** мець ша́нцы.

ШАНСОНЕ́Т||КА шансане́тка, -кі *ж*; **~НЫЙ** шансане́тны.

ШАНТА́Ж шанта́ж, -жу́ *м*; **~И́РОВАТЬ** *несов.* шантажава́ць; **~И́СТ** шантажы́ст, -та *м*; **~И́СТКА** шантажы́стка, -кі *ж*; **~НЫЙ** шанта́жны.

ШАНТРАПА́ *бран.* шантрапа́, -пы́ *м* и *ж*.

ШАНХА́Й *г.* Шанха́й, -ха́я *м*.

ШАНХА́ЙСКИЙ шанха́йскі.

ШАНЦ *воен.* ша́нец, *род.* ша́нца *м*.

ША́НЦЕВЫЙ *воен.* ша́нцавы.

ШАНЬДУ́Н Шаньду́н, -на *м*.

ШАПИРО́ГР||АФ шапіро́граф, -фа *м*; **~А́ФНЫЙ** шапіро́графны; **~А́ФСКИЙ** шапіро́графскі.

ША́ПК||А *в разн. знач.* ша́пка, -кі *ж*; **мехова́я ш.** цёплая ша́пка, кучо́мка; ◇ **дать по ~е** *разг.* даць па ша́пцы; **заломи́ть ~у** надзе́ць ша́пку набакі́р; залама́ць ша́пку; **на во́ре ш. гори́т** *погов.* на зло́дзеі ша́пка гары́ць, ≅ хто парася́ ўкраў, таму́ ў вуша́х пішчы́ць; **получи́ть по ~е** *разг. прям., перен.* атрыма́ць па ша́пцы; **по Се́ньке и ш.** *разг.* па Се́ньку і ша́пка; **ш. воло́с** ша́пка валасо́ў; **~у лома́ть** *разг.* шапкава́ць, ша́пку здыма́ць; **ш.-невиди́мка** *фольк.* ша́пка-невідзі́мка; **~ами закида́ем** *разг.* ша́пкамі закі́даем.

ША́ПОЧ||КА *уменьш.* ша́пачка, -кі *ж*; ◇ **Кра́сная ш.** *фольк.* Чырво́ная ша́пачка; **~НИК** ша́пачнік, -ка *м*; **~НЫЙ** ша́пачны, ша́пкавы; ◇ **прийти́ к ~ному разбо́ру** *разг.* прыйсці́ на ша́пачны разбо́р; **~ное знако́мство** *разг.* ша́пачнае знаёмства.

ШАПЧО́НКА *пренебр.* шапчы́на, -ны *ж*.

ШАР *м* шар, *род.* шара́ *м*; (*скатанный*) га́ла, -лы *ж*; **возду́шный шар** паве́траны шар; **земно́й шар** зямны́ шар; **билья́рдный шар** більярдны шар; **пове́рхность ша́ра** *мат.* паве́рхня шара́; **про́бный шар** *прям., перен.* про́бны шар; ◇ **хоть шаро́м покати́** *перен.* хоць шаро́м пакаці́, (пу́ста) як вы́мецена.

ШАРАБА́Н шараба́н, -на *м*.

ШАРА́ДА шара́да, -ды *ж*.

ШАРА́ХАНЬЕ (*в сторону*) кі́данне, -ння *ср*, шара́ханне, -ння *ср*.

ШАРА́ХАТЬСЯ *несов.* (*бросаться в сторону*) кі́дацца, шара́хацца.

ШАРА́ХНУТЬ *сов. разг.* трэ́снуць, тра́хнуць, уда́рыць, шара́хнуць.

ШАРА́ХНУТЬСЯ *сов.* **1.** (*броситься в сторону*) кі́нуцца, шара́хнуцца; **2.** (*удариться*) трэ́снуцца, тра́хнуцца, уда́рыцца, шара́хнуцца.

ШАРЖ шарж, *род.* ша́ржу *м*; **~И́РОВАННЫЙ** шаржы́раваны; **~И́РОВАТЬ** *несов.* шаржы́раваць; **~ИРО́ВКА** шаржыро́ўка, -кі *ж*.

ШАРИА́Т *рел.* шарыя́т, -ту *м*.

ША́РИК *м в разн. знач.* ша́рык, -ка *м*; (*скатанный*) га́лачка, -кі *ж*; **кра́сные кровяны́е ~и** *физл.* чырво́ныя крывяны́я ша́рыкі; **бе́лые кровяны́е ~и** *физл.* бе́лыя крывяны́я ша́рыкі; **~ОВЫЙ** ша́рыкавы; **~овый подши́пник** ша́рыкавы падшы́пнік; **~овый ход** ша́рыкавы ход.

ШАРИКОПОДШИ́ПНИК *тех.* шарыкападшы́пнік, -ка *м*.

ША́РИТЬ *несов.* шна́рыць, шука́ць; (*щупать*) ма́цаць.

ШАРК *сказ. разг.* шорг, шарк.

ША́РК||АНЬЕ шо́рганне, -ння *ср*, ша́рканне, -ння *ср*; **~АТЬ** *несов.* шо́ргаць, ша́ркаць; **~НУТЬ** *однокр.* шо́ргнуць, шаргану́ць, ша́ркнуць.

ШАРКО́ВЩИНА *пос.* Шарко́ўшчына, -ны *ж*.

ШАРКО́ВЩИНСКИЙ РАЙО́Н Шарко́ўшчынскі раён.

ШАРКУ́Н *презр.* шарку́н, -на́ *м*.

ШАРЛАТА́Н шарлата́н, -на *м*; **~КА** шарлата́нка, -кі *ж*; **~ИТЬ** *несов.* шарлата́ніць; **~СКИЙ** шарлата́нскі; **~СТВО** шарлата́нства, -ва *ср*.

ШАРЛО́ТКА *кул.* шарло́тка, -кі *ж*.

ШАРМА́Н||КА *прям., перен.* катры́нка, -кі *ж*; **игра́ть на ~ке** ігра́ць на катры́нцы; **завёл ~ку** *перен. разг.* завёў катры́нку; **~ЩИК** катры́ншчык, -ка *м*.

ШАРНИ́Р *тех.* шарні́р, -ра *м*; **~НЫЙ** шарні́рны.

ШАРО́ВАННЫЙ *с.-х.* шаро́ваны, абагна́ны.
ШАРОВА́РЫ шарава́ры, -раў *ед. нет.*
ШАРОВА́ТЬ *сов. и несов. с.-х.* шарава́ць; *сов.* абагна́ць; *несов.* абганя́ць; **~СЯ** *страд.* шарава́цца, абганя́цца.
ШАРОВИ́ДН||ОСТЬ шарападо́бнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** шарападо́бны.
ШАРО́ВКА *ж с.-х.* шаро́ўка, -кі *ж*, абганя́нне, -ння *ср.*
ШАРОВ||О́Й шаравы́; **~а́я пове́рхность** шаравая паве́рхня; **ш. сегме́нт** шаравы́ сегме́нт; **ш. кла́пан** *тех.* шаравы́ кла́пан.
ШАРОМЫ́||ГА *м и ж разг. презр.* шахра́й, -ра́я *м*, шахра́йка, -кі *ж*, прайдзісве́т, -та *м*, ашука́нец, -нца *м*, ашука́нка, -кі *ж*; **~ЖНИК** шахра́й, -ра́я *м*, прайдзісве́т, -та *м*, ашука́нец, -нца *м*.
ШАРООБРА́ЗН||ОСТЬ шарападо́бнасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** шарападо́бны.
ШАРО́Ш||ЕЧНЫЙ шаро́шкавы, фрэ́зерны; **~КА** *тех.* шаро́шка, -кі *ж*, фрэ́за, -зы *ж*.
ШАРТРЕ́З (*сорт ликёра*) шартрэ́з, -зу *м*.
ШАРФ шаль, *род.* ша́ля *м*, ша́лік, -ка *м*.
ША́РФОВЫЙ ша́левы, ша́лікавы.
ШАССИ́ *тех.* шасі́ *нескл.*, *ср.*
ША́СТА||ЛКА *с.-х.* шатрава́лка, -кі *ж*; **~ЛЬНЫЙ** шатрава́льны; **~НЬЕ** *с.-х.* шатрава́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов. с.-х.* шатрава́ць.
ШАСТЬ *простореч. сказ.* шась, шусь.
ШАТА́||НИЕ 1. (*качание*) хіста́нне, -ння *ср*, калыва́нне, -ння *ср*; **2.** (*ходьба без цели*) бадзя́нне, -ння *ср*, блука́нне, -ння *ср*; **3.** *перен.* (*колебание*) хіста́нне, -ння *ср*; **~ТЬ** *несов.* хіста́ць, калыва́ць; **~ть столб** хіста́ць слуп; **его́ ~ет от уста́лости** ён хіста́ецца ад сто́мленасці; **~ТЬСЯ 1.** (*качаться*) хіста́цца, калыва́цца; **зуб ~ется** зуб хіста́ецца (калыва́ецца); **2.** (*бродить, слоняться*) *разг.* бадзя́цца, блука́ць; **~ться без де́ла** бадзя́цца без рабо́ты; **3.** *перен.* (*колебаться*) хіста́цца; **4.** *страд.* хіста́цца, калыва́цца; *см.* **шата́ть**; **~ЮЩИЙСЯ** *прил.* хі́сткі.
ШАТЕ́Н шатэ́н, -на *м*; **~КА** шатэ́нка, -кі *ж*.
ШАТЁР шацёр, *род.* шатра́ *м*.
ШАТИ́Р||ОВАННЫЙ шаці́раваны; **~ОВАТЬ** *несов. жив.* шаці́раваць; **~ОВАТЬСЯ** *страд.* шаці́равацца; **~О́ВКА** *жив.* шаціро́ўка, -кі *ж*.
ША́ТИЯ *ж простореч.* ша́ція, -ціі *ж*, зброд, *род.* збро́ду *м*, згра́я, *род.* згра́і *ж*.
ША́Т||КИЙ *прям.*, *перен.* хі́сткі; **~кое здоро́вье** сла́бае здаро́ўе; **~КО** *нареч. прям.*, *перен.* хі́стка; ◇ **ни ~ко, ни ва́лко** *погов.* та́к сабе; сяк-так; **~КОСТЬ** *прям.*, *перен.* хі́сткасць, -ці *ж*.
ШАТРО́ВЫЙ шатро́вы.
ШАТУ́Н *м* **1.** *тех.* шату́н, -на́ *м*; **2.** (*бродяга*) *разг.* бадзя́га, -гі *м и ж*; **~НЫЙ** *тех.* шатуно́вы; **~ЬЯ** *разг.* бадзя́га, -гі *ж*.
ША́ФЕР ша́фер, -ра *м*, дру́жка, -кі *м*; **~ИЦА** ша́ферка, -кі *ж*, дру́жка, -кі *ж*.
ШАФРА́Н 1. *бот.* шафра́н, -ну *м*; **2.** (*сорт яблок*) шафра́н, -на *м*; **~НЫЙ, ~ОВЫЙ** шафра́навы.
ШАХ I (*титул*) шах, *род.* ша́ха *м*.
ШАХ II *шахм.* шах, *род.* ша́ха *м*; **шах и мат** шах і мат.
ШАХМАТИ́СТ шахматы́ст, -та *м*; **~КА** шахматы́стка, -кі *ж*.
ША́ХМА||ТНЫЙ ша́хматны; **в ~тном поря́дке** у ша́хматным пара́дку; **ш. бала́нс** *бухг.* ша́хматны бала́нс; **ш. ход** *перен.* ша́хматны ход; **~ТЫ** ша́хматы, -таў *ед. нет.*
ШАХОВА́ТЬ *несов. шахм.* шахава́ць.
ША́ХТ||А ша́хта, -ты *ж*; **каменноу́гольная ш.** каменнаву́гальная ша́хта; **вентиляцио́нная ш.** вентыляцы́йная ша́хта; **~ЕННЫЙ** ша́хтавы; **~ЁР** шахцёр, -ра *м*; **~ЁРСКИЙ** шахцёрскі; **~ёрская ла́мпа** шахцёрская ля́мпа.

ША́ХТ||НЫЙ, ~ОВЫЙ ша́хтавы; **~ное по́ле** ша́хтавае по́ле; **~овое обору́дование** ша́хтавае абсталява́нне.
ШАХТОУПРАВЛЕ́НИЕ (управле́ние ша́хтой, ша́хтами) шахтакірау́ніцтва, -ва *ср* (кірау́ніцтва ша́хтай, ша́хтамі).
ША́ШЕ||ЛЬ, ~НЬ *зоол.* ша́шаль, -ля *м*.
ША́ШЕЧН||ИЦА ша́шачніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** ша́шачны; **~ая доска́** ша́шачная до́шка.
ШАШИ́СТ шашы́ст, -та *м*; **~КА** шашы́стка, -кі *ж*.
ША́ШКА I (*сабля*) ша́шка, -кі *ж*.
ША́ШК||А II (*в игре*) ша́шка, -кі *ж*; **брать ~у за ~ой** браць ша́шку за ша́шкай.
ША́ШКА III (*пироксилиновая*) ша́шка, -кі *ж*; **подрывна́я ш.** падрыўна́я ша́шка; **дымова́я ш.** дымава́я ша́шка.
ША́ШКИ ша́шкі, -шак *ед. нет*; **игра́ в ш.** гульня́ ў ша́шкі.
ШАШЛЫ́||К *кул.* шашлы́к, -ка́ *м*; **~ЧНАЯ** *сущ.* шашлы́чная, -най *ж*; **~ЧНЫЙ** шашлы́чны.
ША́ШНИ ша́шні, -няў *ед. нет.*
ШВАБ шваб, *род.* шва́ба *м*.
ШВА́БКА шва́бка, -кі *ж*.
ШВА́БРА шва́бра, -ры *ж*, шчо́тка для падло́гі.
ШВАЛЬ *простореч. в разн. знач.* дрэнь, *род.* дрэ́ні *ж*.
ШВА́ЛЬНЯ *порт.* шва́льня, -ні *ж*.
ШВАРТО́В *мор.*, *ав.* швартоў, -то́ва *м*; **отда́ть ~ы** адда́ць шварто́вы; **~А́ТЬ** *несов. мор.*, *ав.* швартава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* швартава́цца; **~ИТЬ** *несов. мор.*, *ав.* шварто́віць; **~ЫЙ** *мор.*, *ав.* шварто́вы.
ШВАРЦВА́ЛЬД (*горы*) Шварцва́льд, -да *м*.
ШВАХ *сказ. разг.* швах.
ШВЕД швед, *род.* шве́да *м*.
ШВЕ́Д||КА шве́дка, -кі *ж*; **~СКИЙ** шве́дскі; **~ская гимна́стика** *спорт.* шве́дская гімна́стыка.
ШВЕ́Й||КА *разг.* шва́чка, -кі *ж*; **~НИК** шве́йнік, -ка *м*; **~НИЦА** шве́йніца, -цы *ж*; **~НЫЙ** шве́йны; **~ная маши́на** шве́йная машы́на; **~ная мастерска́я** шве́йная майстэ́рня.
ШВЕЙЦА́Р швейца́р, -ра *м*.
ШВЕЙЦА́РЕЦ швейца́рац, -рца *м*.
ШВЕЙЦА́РИЯ Швейца́рыя, -рыі *ж*.
ШВЕЙЦА́РКА швейца́рка, -кі *ж*.
ШВЕЙЦА́РСКАЯ *сущ.* швейца́рская, -кай *ж*.
ШВЕЙЦА́РСКИЙ I (*относящийся к Швейцарии*) швейца́рскі; **ш. сыр** швейца́рскі сыр.
ШВЕЙЦА́РСК||ИЙ II (*относящийся к швейцару*) швейца́рскі; **~ая ливре́я** швейца́рскаяліўрэ́я.
ШВЕ́ЛЛЕР *тех.* шве́лер, -ра *м*; **~НЫЙ** шве́лерны.
ШВЕЦ *тип.* сшыва́льшчык, -ка *м*.
ШВЕ́ЦИЯ Шве́цыя, -цыі *ж*.
ШВЕЯ́ шва́чка, -кі *ж*.
ШВО́РЕНЬ *см.* **шкво́рень.**
ШВЫРКО́В||ЫЙ: ~ые дрова́ *спец.* кастро́выя дро́вы, дрэ́ўкі.
ШВЫРКО́М *нареч. разг.* по́швыркам, кідко́м.
ШВЫРНУ́ТЬ *однокр.* шпурну́ць, кі́нуць.
ШВЫРО́К 1. (*бросок*) по́швырак, -рка *м*; **2.** (*дрова*) дрэ́ўкі, *род.* дрэ́вак *ед. нет*; **3.** *спорт.* по́швырак, -рка *м*.
ШВЫРЯ́||НИЕ *разг.* **1.** шпурля́нне, -ння *ср*, кі́данне, -ння *ср*; **2.** *перен.* раскіда́нне, -ння *ср*; (*неоконч. действие*) раскі́дванне, -ння *ср*; **ш. де́ньга́ми** раскі́дванне гро́шай; **~ТЬ** *несов. разг.* **1.** (*бросать*) шпурля́ць, кі́даць; **2.** *перен.* (*расточать*) раскіда́ць (*што*), раскі́дваць (*што*); **~ТЬСЯ 1.** шпурля́цца, кі́дацца; **2.** раскіда́цца, раскі́двацца.
ШЕБАРШИ́ТЬ *несов. разг.* ша́стаць, шамаце́ць, шо́ргаць.
ШЕВЕЛ||Е́НИЕ 1. варушэ́нне, -ння *ср*, шавяле́нне, -ння *ср*; **2.** варо́чанне, -ння *ср*; **~И́ТЬ** *несов.* **1.** (*двигать*) варушы́ць, шавялі́ць; **2.** (*сено*) варо́чаць; ◇ **~и́ть мозга́ми** *разг.* варушы́ць мазга́мі; **~И́ТЬСЯ 1.** варушы́цца, шавялі́цца; **не ~и́сь!** не варушы́ся! (не шавялі́ся!); **2.** *перен.*

шавяліцца; **~ятся сомнения** шавеляцца сумненні; ◇ **ну, ~ясь!** ну, варушыся!

ШЕВЕЛЬНУТЬ *однокр.* варухнуць, шавяльнуць; **пальцем не ш.** пальцам не варухнуць; **~СЯ** 1. варухнуцца, пашавяліцца; 2. *перен.* пашавяліцца; *см.* **шевелиться.**

ШЕВЕЛЮРА шавялюра, -ры *ж.*

ШЕВИОТ *текст.* шавёт, -ту *м*; **~ОВЫЙ** шавётавы.

ШЕВРО шаўро, -ра *ср*; **~ВЫЙ** шаўровы.

ШЕВРОН *воен.* шаўрон, -на *м.*

ШЕДЕВР шэдэўр, -ра *м.*

ШЕЕЛИТ *мін.* шэеліт, -ту *м.*

ШЕЙ||КА *в разн. знач.* шыйка, -кі *ж*; **ш. вала** *тех.* шыйка вала; **ш. рельса** шыйка рэйкі; **ш. матки** *анат.* шыйка маткі; **раковые ~ки** ракавыя шыйкі; **~НЫЙ** шыйны; **~ные позвонки** *анат.* шыйныя пазванкі; **~ная вена** *анат.* шыйная вена.

ШЕЙХ шэйх, *род.* шэйха *м.*

ШЕКСНА *р.* Шэксна, -ны *ж.*

ШЕЛЕП *уст.* бізун, -на *м.*

ШЕЛЕС||Т *м в разн. знач.* шастанне, -ння *ср*, шолах, -ху *м*, шамаценне, -ння *ср*, шапаценне, -ння *ср*, шалясценне, -ння *ср*; **~ТЕТЬ** *несов.* шастаць, шамацець, шапацець, шалясцець.

ШЁЛК *в разн. знач.* шоўк, *род.* шоўку *м*; **шёлк-сырец** шоўк-сырэц; **искусственный шёлк** штучны шоўк; **кручёный шёлк** кручаны шоўк; **она одета в шелка** яна адзета ў шаўкі; ◇ **в долгу, как в шелку** *погов.* у даўгу, як у шаўку.

ШЕЛКОВИДНЫЙ шоўкападобны.

ШЕЛКОВИ||НА шаўкавіна, -ны *ж*; **~НКА** шаўкавінка, -кі *ж*; **~СТОСТЬ** шаўкавістасць, -ці *ж*; **~СТЫЙ** шаўкавісты.

ШЕЛКОВИЦА *бот.* шаўкоўніца, -цы *ж.*

ШЕЛКОВИЧН||ЫЕ *мн. сущ. бот.* шаўкавічныя, -ных; **~ЫЙ** шаўкавічны; **~ый червь** шаўкавічны чарвяк.

ШЕЛКОВОД *с.-х.* шаўкавод, -да *м*; **~НЫЙ** шаўкаводны; **~СТВО** *с.-х.* шаўкаводства, -ва *ср*; **~ЧЕСКИЙ** шаўкаводны.

ШЁЛКОВ||ЫЙ *прям., перен.* шаўковы; **~ое волокно** шаўковае валакно; **он стал как ш.** *перен.* ён зрабіўся (стаў) як шаўковы.

ШЁЛКОКОМБИНАТ шоўкакамбінат, -та *м.*

ШЁЛКОМОТА||ЛЬНЫЙ шоўкаматальны; **~ЛЬНЯ** *текст.* шоўкаматальня, -ні *ж*; **~ЛЬЩИК** *текст.* шоўкамальшчык, -ка *м*; **~ЛЬЩИЦА** шоўкаматальшчыца, -цы *ж*; **~НИЕ** *текст.* шоўкаматанне, -ння *ср.*

ШЁЛКООБРАБАТЫВАЮЩИЙ *текст.* шоўкаапрацоўчы.

ШЁЛКООТДЕЛИТЕЛЬН||ЫЙ *зоол.* шоўкааддзяляльны; **~ые железы** шоўкааддзяляльныя залозы.

ШЕЛКОПРЯД *зоол.* шаўкапрад, -да *м.*

ШЁЛКОПРЯД||ЕНИЕ *текст.* шоўкапрадзенне, -ння *ср*; **~ИЛЬНЫЙ** шоўкапрадзільны; **~ИЛЬНЯ** *текст.* шоўкапрадзільня, -ні *ж.*

ШЁЛКОТКАЦКИЙ *текст.* шоўкаткацкі.

ШЕЛЛАК *хим.* шэлак, -ку *м.*

ШЕЛОМ *ист.* шалом, -ма *м.*

ШЕЛОХНУТЬ *сов.* зварухнуць; **~СЯ** зварухнуцца.

ШЕЛУДИВ||ЕТЬ *несов.* шалудзівець; **~ОСТЬ** шалудзівасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** шалудзівы.

ШЕЛУ||ХА *ж прям., перен.* шалупінне, -ння *ср*; **~ШЕНИЕ** лушчанне, -ння *ср*; **~шение кожи** *мед.* лушчанне скуры; **~ШИЛЬНЫЙ** лушчыльны; **~ШИТЬ** *несов.* лушчыць; **~ШИТЬСЯ** лушчыцца.

ШЕЛЬМ||А *просторечн. бран.* шэльма, -мы *м* и *ж*; **~ЕЦ** *простореч. бран.* шэльма, -мы *м*; **~ОВАНИЕ** *ист., перен.* шальмаванне, -ння *ср*; **~ОВАННЫЙ** *ист., перен.* шальмаваны; **~ОВАТЬ** *несов. ист., перен. разг.* шальмаваць; **~овать честного человека** *перен.* шальмаваць сумленнага чалавека; **~ОВСКОЙ** шальмоўскі; **~ОВСТВО** шальмоўства, -ва *ср.*

ШЕЛЬФ *геогр.* шэльф, *род.* шэльфа *м.*

ШЕЛЮГ||А *бот.* ракіта, -ты *ж*; **~ОВАНИЕ** *с.-х.* ракітаванне, -ння *ср*; **~ОВАТЬ** *несов.* ракітаваць.

ШЕМАЯ *зоол.* шамайка, -кі *ж.*

ШЕМИЗЕТКА шэмізетка, -кі *ж.*

ШЕМЯКИН: ш. суд *перен.* шамякаў суд.

ШЕНКЕЛЬ *спорт.* шэнкель, -ля *м*, *мн.* шанкалі, -лёў.

ШЕПЕЛЕВАТ||ОСТЬ шапляватасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** шапляваты.

ШЕПЕЛЯ||ВИТЬ *несов.* шапляць; **~ВО** *нареч.* шаплява; **~ВОСТЬ** шаплявасць, -ці *ж*; **~ВЫЙ** шаплявы.

ШЕПНУТЬ *однокр.* шапнуць, шапянуць.

ШЁПОТ шэпт, *род.* шэпту *м.*

ШЕПОТКОМ *нареч. разг.* шэптам.

ШЁПОТОМ *нареч.* шэптам.

ШЕПТАЛА шаптала, -лы *ж.*

ШЕПТ||АТЬ *несов.* шаптаць; **~АТЬСЯ** шаптацца; **~УН** *разг.* шаптун, -на *м*; **~УНЬЯ** шаптуха, -хі *ж.*

ШЕРАРДИЗАЦИЯ *тех.* шэрардызацыя, -цыі *ж.*

ШЕРБЕТ шарбет, -ту *м.*

ШЕРЕНГ||А *ж воен.* шарэнга, -гі *ж*, шэраг, -га *м*; **в две ~и** у дзве шарэнгі; **~ОВЫЙ** шарэнгавы.

ШЕРЕШЁВО *пос.* Шарашова, -ва *ср.*

ШЕРЕШЁВСКИЙ РАЙОН Шарашоўскі раён.

ШЕРИФ шэрыф, -фа *м.*

ШЕРЛ *мин.* шэрл, *род.* шэрлу *м.*

ШЕРОМЫ||ГА, ~ЖНИК *см.* **шаромы||га, ~жник.**

ШЕРОХОВАТ||ОСТЬ 1. шурпатасць, -ці *ж*; 2. *перен.* шурпатасць, -ці *ж*; няроўнасць, -ці *ж*, нацягнутасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** 1. шурпаты; 2. шурпаты (*о стиле*); няроўны (*о характере*); нацягнуты (*об отношениях*).

ШЕРСТЕЗАГОТ||ОВИТЕЛЬНЫЙ шэрсцезанарыхтоўчы; (*по заготовке овечьей шерсти*) воўнанарыхтоўчы; **~ОВКА** шэрсценарыхтоўка, -кі *ж*; (*овечьей шерсти*) воўнанарыхтоўка, -кі *ж.*

ШЕРСТЕОБРАБАТЫВАЮЩИЙ шэрсцеапрацоўчы.

ШЕРСТИ||НКА шарсцінка, -кі *ж*; **~СТЫЙ** шарсцісты; **~ТЬ** *несов.* шарсціць.

ШЁРСТ||КА *ласк.* шэрстка, -кі *ж*; **~НОСТЬ** шэрснасць, -ці *ж*; **~НЫЙ** шэрсны.

ШЕРСТОБ||ИТ *текст.* шапавал, -ла *м*; **~ИТНЫЙ** шапавальны; **~ОЙНЯ** *текст.* шапавальня, -ні *ж.*

ШЕРСТОКРЫЛ *зоол.* шэрстакрыл, -ла *м.*

ШЕРСТОМОЙКА *текст.* шэрсцемыйка, -кі *ж*, воўнамыйка, -кі *ж.*

ШЕРСТОНОСНЫЙ *спец.* шэрсценосны, воўнаносны.

ШЕРСТОПРЯД||ЕНИЕ шэрсцепрадзенне, -ння *ср*, воўнапрадзенне, -ння *ср*; **~ИЛЬНЫЙ** шэрсцепрадзільны, воўнапрадзільны; **~ИЛЬНЯ** шэрсцепрадзільня, -ні *ж*, воўнапрадзільня, -ні *ж.*

ШЕРСТОТКА||ЦКИЙ шэрсцеткацкі, воўнаткацкі; **~ЧЕСТВО** шэрсцеткацтва, -ва *ср*, воўнаткацтва, -ва *ср.*

ШЕРСТОТРЕПАЛЬНЫЙ шэрсцетрапальны, воўнатрапальны.

ШЕРСТОЧЕСАЛЬНЫЙ шэрсцечасальны, воўначасальны.

ШЕРСТ||Ь *ж* 1. (*у животных*) шэрсць, *род.* шэрсці *ж*; (*овечья*) воўна, -ны *ж*; 2. *в др. знач.* шэрсць, *род.* шэрсці *ж*; ◇ **гладить против шерсти** гладзіць супроць шэрсці; **по шерсти** па шэрсці; **~ЯНИК** шарсцянік, -ка *м*; **~ЯНКА** (*ткань*) шарсцянка, -кі *ж*; **~ЯНОЙ** шарсцяны.

ШЕРХЕБЕЛЬ *плотн., стол.* шархебель, -ля *м*, шархубель, -ля *м.*

ШЕРШАВ||ЕТЬ *несов.* шурпацець; **~ОСТЬ** шурпатасць, -ці *ж*; шорсткасць, -ці *ж*; **~ЫЙ** шурпаты; (*жёсткий*) шорсткі; **~ая кожа** шорсткая (шурпатая) скура.

ШЕРШ||ЕНЬ *зоол.* шэршань, -шня *м*; **~НЕВОЙ** шэршневы.

ШЕСТ *м* шост, *род.* шаста *м*, жэрдка, -кі *ж.*

ШЕСТВ||ИЕ *ср* шэсце, -ця *ср*; ход, *род.* ходу *м*; **первомайское ш.** першамайскае шэсце; ◇ **замыкать ш.** ісці ззаду; **~ОВАТЬ** *несов.* ісці; ступаць.

ШЕСТЕРЁНКА *тех.* шасцярэнька, -кі *ж.*

ШЕСТЕРИК шасцярык, -ка *м*; **~ОВЫЙ** шасцерыковы.

ШЕСТ||ЁРКА *ж* **1.** шасцёрка, -кі *ж*; **2.** (*лошадей*) шасцярык, -ка *м*; **~ЕРНОЙ** шасцярны.

ШЕСТЕРНЯ I *тех.* шасцярня, -ні *ж.*

ШЕСТЕРНЯ II *ж* (*лошадей*) шасцярык, -ка *м.*

ШЕСТЕРО шэсць, *род.* шасці; (*с сущ., употребляющимися только во мн.*) шасцёра, -цярых; **ш. человек** шэсць чалавек; **ш. саней** шасцёра саней.

ШЕСТИВЕСЁЛЬНЫЙ шасцівёславы.

ШЕСТИГЛАВЫЙ **1.** шасцігаловы; **2.** *арх.* шасцікупальны.

ШЕСТИГОД||ИЧНЫЙ, ~ОВОЙ шасцігадовы.

ШЕСТИГРАНН||ИК *мат.* шасціграннік, -ка *м*; **~ЫЙ** шасцігранны.

ШЕСТИДЕСЯТИЛЕТ||ИЕ шасцідзесяцігоддзе, -ддзя *ср*; **~НИЙ** шасцідзесяцігадовы.

ШЕСТИДЕСЯТНИ||К *ист.* шасцідзесятнік, -ка *м*; **~ЦА** шасцідзесятніца, -цы *ж.*

ШЕСТИДЕСЯТЫЙ шасцідзесяты.

ШЕСТИДНЕВ||КА *разг.* шасцідзёнка, -кі *ж*; **~НЫЙ** шасцідзённы.

ШЕСТИДЮЙМОВЫЙ шасціцалёвы.

ШЕСТИКЛАССН||ИК *школ.* шасцікласнік, -ка *м*; **~ИЦА** шасцікласніца, -цы *ж*; **~ЫЙ** шасцікласны.

ШЕСТИКРАТНЫЙ шасціразовы, шасцікратны.

ШЕСТИЛЕПЕСТНЫЙ *бот.* шасціпялёсткавы.

ШЕСТИЛЕТ||ИЕ шасцігоддзе, -ддзя *ср*; **~НИЙ** шасцігадовы.

ШЕСТИМЕСЯЧНЫЙ шасцімесячны.

ШЕСТИНОГИЙ шасціногі.

ШЕСТИПАЛЫЙ шасціпальцы.

ШЕСТИПОЛЬ||Е *с.-х.* шасціполле, -лля *ср*; **~НЫЙ** шасціпольны.

ШЕСТИСЛОЖНЫЙ *грам.* шасціскладовы.

ШЕСТИСОТЛЕТ||ИЕ шасцісотгоддзе, -ддзя *ср*; **~НИЙ** шасцісотгадовы.

ШЕСТИСОТЫЙ шасцісоты.

ШЕСТИСТВОЛЬНЫЙ *воен.* шасціствольны.

ШЕСТИСТОПНЫЙ *лит.* шасцістопны; **ш. стих** шасцістопны верш.

ШЕСТИСТОРОННИЙ *мат.* шасцістаронні.

ШЕСТИУГОЛЬН||ИК шасцівугольнік, -ка *м*; **~ЫЙ** шасцівугольны.

ШЕСТИЧАСОВОЙ шасцігадзінны; **ш. поезд** шасцігадзінны поезд.

ШЕСТИЭТАЖНЫЙ шасціпавярховы.

ШЕСТИЯРУСНЫЙ шасціярусны.

ШЕСТНАДЦАТИЛЕТНИЙ шаснаццацігадовы.

ШЕСТНАДЦА||ТЫЙ шаснаццаты; **~ТЬ** шаснаццаць, -ці.

ШЕСТОЙ шосты.

ШЕСТОК прыпек, -ка *м*; ◇ **всяк сверчок знай свой ш.** *посл.* ≅ не тыч носа не ў сваё проса; калі худ, не лезь на кут.

ШЕСТЬ шэсць, *род.* шасці.

ШЕСТЬДЕСЯТ шэсцьдзесят, *род.* шасцідзесяці.

ШЕСТЬСОТ шэсцьсот, *род.* шасцісот.

ШЕСТЬЮ *нареч.* (*об умножении*) шэсць у...; **ш. шесть** шэсць у шэсць.

ШЕФ *в разн. знач.* шэф, *род.* шэфа *м.*

ШЕФ||СКИЙ *в разн. знач.* шэфскі; **~СТВО** шэфства, -ва *ср*; **~СТВОВАТЬ** *несов.* шэфстваваць.

ШЕФФИЛД Шэфільд, -да *м.*

ШЕЯ *ж* **1.** шыя, *род.* шыі *ж*; **по шею** па шыю; **2.** *перен.* карак, -рка *м*, шыя, *род.* шыі *ж*; **бросаться (вешаться) кому-либо на шею** *разг.* кідацца (вешацца) каму-небудзь на шыю; **гнать в три шеи** *разг.* гнаць у карак; **гнуть шею** *перен.* гнуць шыю (карак); **дать кому-либо по шее** *простореч.* даць каму-небудзь па карку; **на свою шею** *разг.* на сваю шыю (на сваю галаву); **получить по шее** *простореч.* атрымаць па карку; **сидеть у кого-либо на шее** *перен. разг.* сядзець у каго-небудзь на шыі (на карку); **свихнуть, сломать себе шею на чём-либо** *перен. разг.* звярнуць (скруціць, зламаць) сабе галаву (карак) на чым-небудзь.

ШИБЕР *тех.* шыбер, -ра *м.*

ШИБ||КИЙ *разг.* шпаркі; **~КО** *нареч. разг.* **1.** (*быстро*) шпарка; **2.** (*очень сильно*) вельмі, надта.

ШИВОРОТ *разг.* каўнер, -няра *м*; **взять кого-либо за ш.** узяць каго-небудзь за каўнер; ◇ **ш.-навыворот** *разг.* шыварат-навыварат.

ШИЗОГОНИЯ *биол.* шызагонія, -ніі *ж.*

ШИЗОФРЕН||ИК *мед.* шызафрэнік, -ка *м*; **~ИЧЕСКИЙ** шызафрэнічны; **~ИЧКА** шызафрэнічка, -кі *ж*; **~ИЯ** *мед.* шызафрэнія, -ніі *ж.*

ШИИТ *рел.* шыіт, -та *м.*

ШИК шык, *род.* шыку *м.*

ШИКАНЬЕ шыканне, -ння *ср.*

ШИКАРН||О *нареч.* шыкоўна, шыкарна; **~ЫЙ** шыкоўны, шыкарны.

ШИК||АТЬ *несов.* шыкаць; **~НУТЬ** *однокр.* шыкнуць.

ШИК||НУТЬ *однокр. разг.* шыкнуць; **~ОВАТЬ** *несов. разг.* шыкаваць.

ШИЛЛИНГ (*монета*) шылінг, -га *м.*

ШИЛ||О шыла, -ла *ср*, *мн.* шылы, -лаў; ◇ **~а в мешке не утаишь** *посл.* шыла ў мяшку не схаваеш.

ШИЛОВИДНЫЙ шылападобны, шылаваты.

ШИЛОКЛЮВКА *ж зоол.* шыладзюб, -ба *м.*

ШИЛОХВОСТКА **1.** *зоол.* шылахвостка, -кі *ж*; **2.** *перен. разг.* шылахвостка, -кі *ж*; пляткарка, -кі *ж.*

ШИЛОХВОСТЬ *зоол.* шылахвостка, -кі *ж.*

ШИЛЬ||НЫЙ шыльны; **~ЦЕ** *уменьш.* шыльца, -ца *ср*; **~ЧАТЫЙ** шыльчасты.

ШИМОЗА *хим.* шымоза, -зы *ж.*

ШИМПАНЗЕ *зоол.* шымпанзэ *нескл.*, *м.*

ШИНА шына, -ны *ж*; **пневматическая ш.** пнеўматычная шына.

ШИНЕЛИШКА *ж пренебр.* шынялёк, -лька *м.*

ШИНЕЛЬ *ж* шынель, -няля *м*; **~НЫЙ** шынельны.

ШИНКАР||ИТЬ *несов. уст.* шынкарыць; **~КА** *уст.* шынкарка, -кі *ж*; **~СКИЙ** шынкарскі; **~СТВО** *уст.* шынкарства, -ва *ср.*

ШИНКАРЬ *уст.* шынкар, -ра *м.*

ШИНКОВА||ЛЬНЫЙ шаткавальны; **~НИЕ** шаткаванне, -ння *ср.*

ШИНКОВ||АННЫЙ шаткаваны; **~АТЬ** *несов.* шаткаваць; **~АТЬСЯ** *страд.* шаткавацца; **~КА** *ж* **1.** (*действие*) шаткаванне, -ння *ср*, шаткоўка, -кі *ж*; **2.** (*шинковальная машина*) шаткаўніца, -цы *ж.*

ШИННЫЙ шынны; **ш. завод** шынны завод.

ШИНОК *м уст.* шынок, -нка *м.*

ШИНШИЛЛ||А (*животное и мех*) шыншыла, -лы *ж*; **~ОВЫЙ** шыншылавы.

ШИНЬОН шын'ён, -на *м.*

ШИП I *м* **1.** (*колючка на растении*) калючка, -кі *ж*; **2.** *тех.* шып, *род.* шыпа *м*; **3.** *стол.* палец, -льца *м*; **4.** (*на подкове*) гак, *род.* гака *м.*

ШИП II *зоол.* шып, *род.* шыпа *м.*

ШИП III *м* (*шипение*) шыпенне, -ння *ср*; (*змеи, гусей*) сыканне, -ння *ср.*

ШИПЕНИЕ **1.** шыпенне, -ння *ср*; (*змеи, гусей*) сыкан-

не, -ння *ср*; 2. *перен.* (*ворчание, злобствование*) *разг.* сыканне, -ння *ср.*

ШИПЕ́ТЬ *несов.* шыпець; (*о пресмыкающихся, птицах, млекопитающих, а также перен. — ещё*) сыкаць; сіпець.

ШИПО́ВНИК *м бот.* шыпшына, -ны *ж*; **~ОВЫЙ** шыпшынавы.

ШИПОВО́Й I 1. (*относящийся к колючке на растении*) калючкавы; 2. *тех.* шыпавы; 3. *стол.* пальцавы; 4. (*относящийся к шипу на подкове*) гакавы.

ШИПОВО́Й II *зоол.* шыпавы.

ШИПУ́Н 1. *зоол.* шыпун, -на *м*; 2. *горн.* шыпун, -ну *м.*

ШИПУ́Ч||ЕСТЬ шыпучасць, -ці *ж*; **~ИЙ** шыпучы; **~ий напи́ток** шыпучы напітак; **~КА** *разг.* шыпучка, -кі *ж.*

ШИПЯ́Щ||ИЙ *лингв.* 1. *прил.* шыпячы; **~ие согла́сные** шыпячыя зычныя; 2. *сущ.* шыпячы, -чага *м.*

ШИ́РЕ *сравн. ст.* 1. *нареч.* шырэй; **ш. откры́ть глаза́** шырэй расплюшчыць вочы; 2. *прил.* шырэйшы; **э́та река́ широка́, а та ещё ш.** гэта рака шырокая, а тая яшчэ шырэйшая; ◇ **держи́ карма́н ш.** *разг.* падстаўляй кішэнь.

ШИРИ́ЛЬНЫЙ *тех.* шырыльны.

ШИРИН||А́ шырыня, -ні *ж*; **в ~у́** ушыркі.

ШИРИ́НКА *ж* 1. *порт.* прарэх, -ха *м*; шырынка, -кі *ж*; 2. (*платок*) *обл.* хустка, -кі *ж*; хусцінка, -кі *ж.*

ШИ́РИТЬ *несов.* шырыць, пашыраць; **ш. социалисти́ческое соревнова́ние** шырыць (пашыраць) сацыялістычнае спаборніцтва; **~СЯ** шырыцца, пашырацца; **растёт и ши́рится движе́ние сторо́нников ми́ра** расце і шырыцца (пашыраецца) рух прыхільнікаў міру.

ШИ́РМ||А *прям., перен.* шырма, -мы *ж*; **створча́тая ш.** створкавая шырма; ◇ **служи́ть ~ой** служыць (з'яўляцца) шырмай.

ШИРО́К||ИЙ *в разн. знач.* шырокі; **~ая у́лица** шырокая вуліца; **ш. пиджа́к** шырокі пінжак; **~ие сте́пи** шырокія стэпы; **~ие пла́ны** шырокія планы; **~ие ма́ссы** шырокія масы; **в ~ом смы́сле** у шырокім сэнсе; ◇ **на ~ую но́гу** раскошна.

ШИРОКО́ *нареч. прям., перен.* шырока; **ш. откры́тые глаза́** шырока расплюшчаныя вочы; **ш. испо́льзовать достиже́ния нау́ки** шырока выкарыстаць дасягненні навукі; **ш. жить** *перен.* шырока (раскошна) жыць; **~ВА́ТЫЙ** шыракаваты; зашырокі.

ШИРОКОВЕТВИ́СТЫЙ шырокагалінны, галінасты.

ШИРОКОВЕЩА́||НИЕ *радио* шырокавяшчанне, -ння *ср*; **~ТЕЛЬНО** *нареч.* шырокавяшчальна; **~ТЕЛЬНЫЙ** *в разн. знач.* шырокавяшчальны; **~тельная ста́нция** *радио* шырокавяшчальная станцыя; **~тельная рекла́ма** шырокавяшчальная рэклама.

ШИРОКОГО́РЛЫЙ шырокагорлы.

ШИРОКОГРУ́ДЫЙ шырокагруды.

ШИРОКОДОСТУ́ПНЫЙ шырокадаступны.

ШИРОКОКОЛЕ́ЙН||ЫЙ *ж.-д.* шырокакалейны; **~ая желе́зная доро́га** шырокакалейная чыгунка.

ШИРОКОКО́СТНЫЙ шырокакасцявы, шырокі ў касці.

ШИРОКОКРЫ́ЛЫЙ шырокакрылы.

ШИРОКОЛИ́СТ||ВЕННЫЙ, ~НЫЙ, ~ЫЙ шырокалісты; **ш. лес** шырокалісты лес.

ШИРОКОЛИ́ЦЫЙ шырокатвары.

ШИРОКОЛО́БЫЙ шырокалобы.

ШИРОКОНО́СКА *зоол.* шыроканоска, -кі *ж.*

ШИРОКОНО́СЫЙ шыроканосы.

ШИРОКОПЛЕ́ЧИЙ шырокаплечы, плячысты.

ШИРОКОПО́Л||ЫЙ 1. (*с широкими полями*) шырокаполы; **~ая шля́па** шырокаполы капялюш; 2. (*с широкими полами*) шырокакрысы; **ш. пиджа́к** шырокакрысы пінжак.

ШИРОКОРЯ́ДНЫЙ *с.-х.* шыракарадны.

ШИРОТА́ шырыня, -ні *ж*; **ш. взгля́дов** шырыня поглядаў; **се́верные широ́ты** *геогр.* поўночныя шырыні; **ю́жные широ́ты** *геогр.* поўднёвыя шырыні.

ШИРО́ТНЫЙ *геогр.* шырынны, шырынёвы.

ШИРОЧ||А́ЙШИЙ найшырэйшы, самы шырокі; **~ЕННЫЙ** *разг.* шырачэзны.

ШИРПОТРЕ́Б (товары широкого потребления) шырспажыў, -жыву *м* (тавары шырокага спажывання).

ШИРЬ шыр, *род.* шыры *ж*; **во всю ширь** ва ўсю шыр.

ШИ́ТО-КРЫ́ТО *разг.* шыта-крыта.

ШИ́Т||ЫЙ 1. *прич.* шыты; 2. *прил.* (*вышитый*) вышываны; **~ое серебро́м пла́тье** вышываная серабром сукенка; ◇ **не лы́ком шит** *погов.* не лыкам шыты; **~о бе́лыми ни́тками** *разг.* шыта белымі ніткамі.

ШИТЬ *несов.* 1. шыць; 2. (*вышивать*) вышываць; ◇ **на живу́ю ни́тку шить** *разг.* на жывую нітку шыць.

ШИТЬЁ *ср* 1. шыццё, -цця *ср*; 2. (*вышивание*) вышыванне, -ння *ср*; 3. (*вышивка*) вышыўка, -кі *ж*; **золото́е ш. на воротнике́** залатая вышыўка на каўняры.

ШИ́ТЬСЯ *несов. страд.* шыцца.

ШИ́ФЕР *мин., стр.* шыфер, -ру *м*; **~НЫЙ** шыферны; **~ные разрабо́тки** шыферныя распрацоўкі.

ШИФО́Н *текст.* шыфон, -ну *м*; **~ОВЫЙ** шыфонавы.

ШИФОНЬЕ́Р шыфан'ер, -ра *м*; **~КА** шыфан'ерка, -кі *ж.*

ШИФР *в разн. знач.* шыфр, *род.* шыфру *м*; **ключ ши́фра** ключ шыфру; **~ОВА́ЛЬНЫЙ** шыфравальны; **~ОВА́ЛЬЩИК** шыфравальшчык, -ка *м*; **~О́ВАННЫЙ** шыфраваны; **~ОВА́ТЬ** *несов.* шыфраваць; **~ОВА́ТЬСЯ** *страд.* шыфравацца; **~О́ВКА** *ж* шыфраванне, -ння *ср*, шыфроўка, -кі *ж.*

ШИ́ХТ||А *тех.* шыхта, -ты *ж*; **~ОВА́ЛЬНЫЙ** шыхтавальны; **~О́ВАННЫЙ** *тех.* шыхтаваны; **~ОВА́ТЬ** *несов. тех.* шыхтаваць; **~О́ВКА** *ж тех.* шыхтаванне, -ння *ср*, шыхтоўка, -кі *ж*; **~ОВЫЙ** шыхтавы.

ШИШ *разг.* кукіш, -ша *м*; ◇ **ни шиша́** *простореч.* ні шыша.

ШИША́К *ист.* шышак, -ка *м*; шлем, *род.* шлема *м.*

ШИ́Ш||КА *ж* 1. (*на голове и т. п.*) гуз, *род.* гуза *м*, шышка, -кі *ж*; **ш. на лбу** гуз на лбе; **ш. му́дрости** шышка мудрасці; 2. *бот.* шышка, -кі *ж*; **сосно́вая ш.** *бот.* хваёвая (сасновая) шышка; ◇ **был он кру́пная ш.** *ирон.* быў ён вялікая шышка; **на бе́дного Мака́ра все ~ки ва́лятся** *погов.* на беднага Макара ўсе шышкі валяцца; **~КОВА́ТЫЙ** гузаваты, шышкаваты.

ШИШКОВИ́ДН||ЫЙ *анат.* шышкападобны; **~ая железа́** шышкападобная залоза.

ШИШКО́ВНИК *м бот.* мушмула, -лы *ж.*

ШИШКОНО́СНЫЙ *бот.* шышканосны.

ШКАЛА́ *в разн. знач.* шкала, -лы *ж*; **ш. термо́метра** шкала тэрмометра; **ш. опла́ты** шкала аплаты.

ШКА́ЛИК *уст. разг.* шкалік, -ка *м.*

ШКА́Н||ЕЧНЫЙ *мор.* шканцавы; **~ЦЫ** *мор.* шканцы, -цаў *ед. нет.*

ШКАП *см.* **шкаф.**

ШКАТУ́Л||КА шкатулка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** шкатулачны, шкатулкавы.

ШКАФ *м* 1. шафа, -фы *ж*; 2. (*духовка*) духоўка, -кі *ж.*

ШКА́Ф||ИК *м уменьш.* шафка, -кі *ж*; **~НЫЙ** шафавы.

ШКАФУ́Т *мор.* шкафут, -та *м.*

ШКА́ФЧИК *м* шафка, -кі *ж.*

ШКВАЛ шквал, *род.* шквалу *м*; **ш. огня́** *перен.* шквал агню.

ШКВА́||ЛИСТЫЙ шквалісты; **~ЛЬНЫЙ** шквальны; **~льный ого́нь** *воен.* шквальны агонь.

ШКВА́РКИ *мн.* (*ед.* **шква́рка** *ж*) скваркі, -рак, *ед.* скварка, -кі *ж.*

ШКВО́РЕНЬ шворан, -рна *м.*

ШКИВ *тех.* шкіў, *род.* шківа *м.*

ШКИПЕР *мор.* шкіпер, -ра *м*; **~СКИЙ** шкіперскі.
ШКЛОВ *г.* Шклоў, *род.* Шклова *м.*
ШКЛОВСКИЙ РАЙОН Шклоўскі раён.
ШКОЛ||А *в разн. знач.* школа, -лы *ж*; **высшая ш.** вышэйшая школа; **Высшая партийная ш.** Вышэйшая партыйная школа; **средняя ш.** сярэдняя школа; **неполная средняя ш.** няпоўная сярэдняя школа; **начальная ш.** пачатковая школа; **сельская ш.** сельская школа; **ш. фабрично-заводского ученичества** школа фабрычна-заводскага вучнёўства; **ремесленная ш.** рамесная школа; **романтическая ш.** *лит.* рамантычная школа; **он прошёл хорошую ~у** *перен.* ён прайшоў добрую школу.
ШКОЛИТЬ *несов.* муштраваць.
ШКОЛЬН||ИК школьнік, -ка *м*; **~ИЦА** школьніца, -цы *ж*; **~ИЧАТЬ** *несов. разг.* школьнічаць; **~ИЧЕСКИЙ** школьніцкі; **~ИЧЕСТВО** школьніцтва, -ва *ср*; **~ЫЙ** школьны; **~ый учитель** школьны настаўнік; **~ый работник** школьны работнік; **ребёнок ~ого возраста** дзіця школьнага ўзросту.
ШКОТ *мор.* шкот, *род.* шкота *м.*
ШКОТОВЫЙ *мор.* шкотавы.
ШКУНА *см.* **шхуна.**
ШКУР||А *прям., перен.* шкура, -ры *ж*; **овечья ш.** авечая шкура; ✧ **дрожать за свою ~у** дрыжаць за сваю шкуру; **спасать свою ~у** ратаваць сваю шкуру; **быть в чьей-либо ~е** быць у чыёй-небудзь шкуры; **делить ~у неубитого медведя** *погов.* дзяліць шкуру незабітага мядзведзя; **волк в овечьей ~е** воўк у авечай шкуры; **с одного вола двух шкур не дерут** *погов.* з аднаго вала двух шкур не дзяруць; **драть ~у с кого-либо** *разг.* драць шкуру з каго-небудзь; **спустить ~у с кого-либо** *разг.* спусціць шкуру з каго-небудзь; **~КА** *в разн. знач.* шкурка, -кі *ж*; **беличьи ~ки** ваверкавыя шкуркі; **~ка яблока** шкурка яблыка; **~НИК** *презр.* шкурнік, -ка *м*; **~НИЧАТЬ** *несов. презр.* шкурнічаць; **~НИЧЕСКИЙ** шкурніцкі; **~НИЧЕСТВО** *презр.* шкурніцтва, -ва *ср*; **~НЫЙ** шкурны.
ШЛАГБАУМ шлагбаум, -ма *м.*
ШЛАК *м тех.* шлак, *род.* шлаку *м*, дзындра, -ры *ж.*
ШЛАКОБЕТОН *тех.* шлакабетон, -ну *м.*
ШЛАКОБЛОКИ *мн. тех.* шлакаблокі, -каў.
ШЛАКОВ||АТЬ *несов. тех.* шлакаваць; **~АТЬСЯ** шлакавацца; **~ИК** *тех.* шлакавік, -ка *м.*
ШЛАКОВЫЙ *тех.* шлакавы.
ШЛАКОСНИМАТЕЛЬ *тех.* шлаказдымнік, -ка *м.*
ШЛАМ *горн., тех.* шлам, *род.* шламу *м.*
ШЛАМОВЫЙ *горн., тех.* шламавы.
ШЛАНГ *тех.* шланг, *род.* шланга *м*; **пожарный ш.** пажарны шланг; **~ОВЫЙ** шлангавы.
ШЛАФРОК *уст.* шлафрок, -ка *м.*
ШЛЕЙ||КА шлейка, -кі *ж*; **~НЫЙ 1.** поўшорны; **2.** шлейны; *см.* **шлея.**
ШЛЕЙФ шлейф, *род.* шлейфа *м.*
ШЛЕМ *в разн. знач.* шлем, *род.* шлема *м*; **стальной шлем** стальны шлем; **пробковый шлем** коркавы шлем; **водолазный шлем** вадалазны шлем.
ШЛЕМНИК *бот.* шлемнік, -ку *м.*
ШЛЁНКА *в разн. знач.* шлёнка, -кі *ж.*
ШЛЁП *межд. разг.* шлёп, плясь.
ШЛЁПАНЦЫ *мн. разг.* шлёпанцы, -цаў, *ед.* шлёпанец, -нца *м*; пантофлі, -ляў, *ед.* пантофель, -фля *м.*
ШЛЁПАНЬЕ *разг. в разн. знач.* шлёпанне, -ння *ср*, плясканне, -ння *ср*; *см.* **шлёпать.**
ШЛЁП||АТЬ *несов. разг. в разн. знач.* шлёпаць, пляскаць; **ш. по руке** шлёпаць (пляскаць) па руцэ; **ш. туфлями** шлёпаць туфлямі; **ш. по воде** шлёпаць па вадзе; **~АТЬСЯ** шлёпацца, пляскацца; **~НУТЬ** *однокр. разг. в разн. знач.* шлёпнуць, пляснуць; **~НУТЬСЯ** шлёпнуцца, пляснуцца.
ШЛЕПОК пляскач, *род.* плескача *м.*
ШЛЕЯ 1. (*часть сбруи*) поўшоры, -раў *ед. нет*; **2.** (*лямка вместо хомута*) шляя, *род.* шляі *ж.*
ШЛИССЕЛЬБУРГ Шлісельбург, -га *м.*
ШЛИФ *спец.* шліф, *род.* шліфа *м.*
ШЛИФОВА||ЛЬНЫЙ шліфавальны; **ш. станок** шліфавальны станок; **~ЛЬНЯ** шліфавальня, -ні *ж*; **~ЛЬЩИК** шліфавальшчык, -ка *м*; **~НИЕ** *ср прям., перен.* шліфаванне, -ння *ср*, шліфоўка, -кі *ж.*
ШЛИФОВ||АННЫЙ *прям., перен.* шліфаваны; **~АТЬ** *несов. прям., перен.* шліфаваць; **~АТЬСЯ** шліфавацца; **~КА** *ж прям., перен.* шліфаванне, -ння *ср*, шліфоўка, -кі *ж*; **~ЩИК** *см.* **шлифовальщик.**
ШЛИХ *горн.* шліх, *род.* шліху *м*; **~ОВОЙ** шліхавы.
ШЛИХТ *м*, **ШЛИХТА** *ж текст.* шліхта, -ты *ж.*
ШЛИХТИК *стол.* шліхтубель, -ля *м.*
ШЛИХТ||ОВАЛКА *тех.* шліхтавальня, -ні *ж*; **~ОВАЛЬНЫЙ** шліхтавальны; **~ОВАНИЕ** *тех.* шліхтаванне, -ння *ср*; **~ОВАННЫЙ** шліхтаваны; **~ОВАТЬ** *несов. тех.* шліхтаваць; **~ОВАТЬСЯ** шліхтавацца; **~ОВКА** *ж тех.* шліхтаванне, -ння *ср*, шліхтоўка, -кі *ж.*
ШЛИХТУБЕЛЬ *см.* **шлихтик.**
ШЛЮЗ шлюз, *род.* шлюза *м*; **пропустить через шлюз** прапусціць праз шлюз; **открыть шлюзы** адчыніць шлюзы.
ШЛЮЗ||НЫЙ *тех.* шлюзавы, шлюзны; **~ные ворота** шлюзавыя (шлюзныя) вароты; **~ная камера** шлюзавая (шлюзная) камера; **~ОВАНИЕ** *тех.* шлюзаванне, -ння *ср*; **~ОВАТЬ** *сов. и несов. тех.* шлюзаваць; **~овать реку** шлюзаваць раку; **~овать суда** шлюзаваць судны; **~ОВАТЬСЯ** *страд.* шлюзавацца; **~ОВОЙ, ~ОВЫЙ** *тех.* шлюзавы, шлюзны.
ШЛЮП *мор.* шлюп, *род.* шлюпа *м.*
ШЛЮПБАЛКА *мор.* шлюпбэлька, -кі *ж.*
ШЛЮП||КА шлюпка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** шлюпкавы, шлюпачны.
ШЛЮС *спорт.* шлюс, *род.* шлюсу *м.*
ШЛЯП||А *ж* **1.** капялюш, -ша *м*; **2.** *перен.* шляпа, -пы *ж*; ✧ **дело в ~е** *разг.* усё ў парадку; **~КА** *ж* **1.** (*уменьш. к* **шляпа** 1) капялюшык, -ка *м*; **2.** (*гриба и т. п.*) шапка, -кі *ж*; (*гвоздя, стержня и т. п.*) плешка, -кі *ж*, галоўка, -кі *ж*; (*патрона*) пятка, -кі *ж*; **~НИК** капялюшнік, -ка *м*; **~НИЦА** капялюшніца, -цы *ж*; **~НЫЙ** капялюшны; **~ОЧНЫЙ** шапкавы; (*о грибах*) шапкаваты; плешачны; **~ОНКА** *ж разг. пренебр.* капелюшок, -шка *м.*
ШЛЯТЬСЯ *несов. разг.* бадзяцца, швэндацца, снoўдацца.
ШЛЯХ *обл.* шлях, *род.* шляху *м.*
ШЛЯХЕТ||СКИЙ шляхецкі; **~СТВО** *ист.* шляхецтва, -ва *ср.*
ШЛЯХТ||А *ист.* шляхта, -ты *ж*; **~ИЧ** *ист.* шляхціц, -ца *м.*
ШМАЛЬТА *тех.* шмальта, -ты *ж.*
ШМЕЛИНЫЙ чмяліны.
ШМЕЛЬ чмель, *род.* чмяля *м.*
ШМУЦТИТУЛ *тип.* шмуцтытул, -ла *м.*
ШМЫГ *межд. разг.* шмыг.
ШМЫГ||АТЬ *несов. разг.* **1.** шмыгаць; **ш. в дверь** шмыгаць у дзверы; **2.** (*шаркать*) шоргаць, шаркаць; ✧ **ш. носом** *разг.* шморгаць носам; **~НУТЬ** *однокр.* **1.** шмыгнуць; **~нуть в дверь** шмыгнуць у дзверы; **2.** (*шаркнуть*) шаркнуць, шоргнуць.
ШМЯК *межд. простореч.* чмяк.
ШМЯК||АТЬ *несов. простореч.* чмякаць; **~АТЬСЯ** чмякацца; **~НУТЬ** *однокр. простореч.* чмякнуць; **~НУТЬСЯ** *однокр. простореч.* чмякнуцца; **~нулся об землю** чмякнуўся вобземлю.
ШНЕК *тех.* шнэк, *род.* шнэка *м.*
ШНИЦЕЛЬ *кул.* шніцэль, -ля *м.*

ШНУР *в разн. знач.* шнур, *род.* шнура́ *м*; **шнур для занаве́ски** шнур для фіра́нкі; ◇ **бикфо́рдов шнур** *тех.* бікфо́рдаў шнур; **~ОВА́ЛЬНЫЙ** шнурава́льны; **~ОВА́НИЕ** *в разн. знач.* шнурава́нне, -ння *ср*; **~О́ВАННЫЙ** *в разн. знач.* шнурава́ны; **~ОВА́ТЬ** *несов. в разн. знач.* шнурава́ць; **~ова́ть боти́нки** шнурава́ць чараві́кі; **~ова́ть инвента́рную кни́гу** шнурава́ць інвента́рную кні́гу; **~ОВА́ТЬСЯ** шнурава́цца; **~О́ВКА** *ж* **1.** (*действие*) шнурава́нне, -ння *ср*, шнуро́ўка, -кі *ж*; **2.** *в др. знач.* шнуро́ўка, -кі *ж*; **~ОВО́Й** шнуравы́; **~ова́я кни́га** шнурава́я кні́га; **~О́К** шнуро́к, -рка́ *м*.

ШНЫРЯ́ТЬ *несов. разг.* шны́рыць.

ШОВ *м в разн. знач.* шво, *род.* шва *ср*; **разгла́дить шов** вы́прасаваць шво; **шить ме́лким швом** шыць дро́бным швом; **накла́дывать швы** *мед.* накла́дваць (наклада́ць) швы; **сварно́й шов** *стр.*, *тех.* зварно́е шво; ◇ **ру́ки по швам** *воен.* ру́кі па швах; **треща́ть по всем швам** *разг.* трашча́ць па ўсіх швах.

ШОВИНИ́||ЗМ *полит.* шавіні́зм, -ма *м*; **~СТ** *полит.* шавіні́ст, -та *м*; **~СТИ́ЧЕСКИЙ** шавіністы́чны; **~СТКА** шавіні́стка, -кі *ж*.

ШО́ВНЫЙ *спец.* шыўны́; **ш. материа́л** шыўны́ матэрыя́л.

ШОК *мед.* шок, *род.* шо́ку *м*.

ШОКИ́РОВА||ННЫЙ шакі́раваны; **~ТЬ** *несов.* шакі́раваць; **~ТЬСЯ** *страд.* шакі́равацца.

ШОКОЛА́Д *в разн. знач.* шакала́д, -ду *м*; **ш. в пли́тках** шакала́д у плі́тках; **ча́шка ~у** ку́бак шакала́ду; **~КА** *разг.* шакала́дка, -кі *ж*; **~НЫЙ** *в разн. знач.* шакала́дны; **~ная фа́брика** шакала́дная фа́брыка; **~ный отте́нок** шакала́днае адце́нне.

ШО́МПО||Л *воен.* шо́мпал, -ла *м*; **~ЛЬНЫЙ** шо́мпальны.

ШО́ПОТ *см.* **шёпот**; **~ОМ** *см.* **шёпотом.**

ШО́Р||ЕЦ шо́рац, -рца *м*; **~КА** шо́рка, -кі *ж*.

ШО́РН||ИК ры́мар, -ра *м*; **~ЫЙ 1.** шле́йны; **~ая у́пряжь** шле́йнаяву́праж, шляя́; **2.** (*относящийся к изготовлению шорных изделий*) ры́марскі; **~ая мастерска́я** ры́марская майстэ́рня; **~ые изде́лия** ры́марскія вы́рабы.

ШО́РОХ *м* шо́рах, -ху *м*, шо́ргат, -ту *м*, ша́станне, -ння *ср*.

ШО́РЫ 1. *прям.*, *перен.* шо́ры, -раў *ед. нет*; **2.** (*шлея*) шляя́, *род.* шляі́ *ж*.

ШОСС||Е́ *ср* шаша́, -шы́ *ж*, шасэ́ *нескл.*, *ср*; **~Е́ЙНЫЙ** шашэ́йны, шасэ́йны; **~И́РОВАННЫЙ** шашава́ны, шасава́ны; **~И́РОВАТЬ** *сов. и несов.* шашава́ць, шасава́ць, праклада́ць шашу́; **~И́РОВАТЬСЯ** *страд.* шашава́цца, шасава́цца.

ШОТЛА́НДЕЦ шатла́ндзец, -дца *м*.

ШОТЛА́НДИЯ Шатла́ндыя, -дыі *ж*.

ШОТЛА́НДКА I (*ж род к* **шотла́ндец**) шатла́ндка, -кі *ж*.

ШОТЛА́НДКА II (*клетчатая ткань*) шатла́ндка, -кі *ж*.

ШОТЛА́НДСКИЙ шатла́ндскі.

ШОФЁР шафёр, -ра *м*; **~СКИЙ** шафёрскі; **~ские права́** шафёрскія правы́.

ШПА́Г||А шпа́га, -гі *ж*; **скрести́ть ~и** *прям.*, *перен.* скрыжава́ць шпа́гі; **прода́ть ~у** *перен. уст.* прада́ць шпа́гу.

ШПАГА́Т шпага́т, -ту *м*; **~НЫЙ** шпага́тны.

ШПАГОГЛОТА́ТЕЛЬ шпагаглыта́льнік, -ка *м*.

ШПА́ЖНИК *бот.* шпа́жнік, -ку *м*; ме́чнік, -ку *м*.

ШПА́Ж||НЫЙ шпа́гавы, шпа́жны; **~О́НКА** *пренебр.* шпа́жка, -кі *ж*.

ШПАКЛ||ЁВАННЫЙ шпаклява́ны; **~ЕВА́ТЬ** *несов.* шпаклява́ць, **~ЕВА́ТЬСЯ** *страд.* шпаклява́цца; **~ЁВКА** *ж* **1.** (*действие*) шпаклява́нне, -ння *ср*, шпаклёўка, -кі *ж*; **2.** (*вещество*) шпаклёўка, -кі *ж*; (*для замазки стёкол в окнах*) кіт, *род.* кі́ту *м*; **~ЁВОЧНЫЙ** шпаклёвачны; **~ЁВЩИК** шпаклёўшчык, -ка *м*; **~ЁВЩИЦА** шпаклёўшчыца, -цы *ж*.

ШПА́ЛА *см.* **шпа́лы.**

ШПАЛЕ́Р||А *в разн. знач.* шпале́ра, -ры *ж*; **стоя́ть ~ами** стая́ць шпале́рамі; **~НИК** *сад.*, *лес.* шпале́рнік, -ку *м*.

ШПАЛЕ́РЫ (*обои*) *уст.* шпале́ры, -лер *ед. нет.*

ШПАЛОПРОПИ́ТОЧНЫЙ *ж.-д.* шпалапрапі́тны.

ШПА́ЛЫ *мн.* (*ед.* **шпа́ла** *ж*) *ж.-д.* шпа́лы, -лаў, *ед.* шпа́ла, -лы *ж*.

ШПАНГО́УТ *мор.* шпанго́ут, -та *м*.

ШПА́НДЫРЬ *сапож.* шпа́ндыр, -ра *м*.

ШПА́Н||КА *в разн. знач.* шпа́нка, -кі *ж*; **~СКИЙ** шпа́нскі; **~ская му́ха** *зоол.* шпа́нская му́ха.

ШПАРГА́ЛКА *школ.* шпарга́лка, -кі *ж*.

ШПА́РИТЬ *несов.* **1.** па́рыць, абва́рваць; **2.** *перен. разг.* шпа́рыць; **~СЯ** апа́рвацца, абва́рвацца.

ШПАТ I *мин.* шпат, *род.* шпа́ту *м*; **полево́й шпат** палявы́ шпат; **известко́вый шпат** ва́пнавы (ва́пенны) шпат.

ШПАТ II *вет.* шпат, *род.* шпа́ту *м*.

ШПА́ТЕЛЬ *тех.* шпа́тэль, -ля *м*.

ШПАТОВИ́ДНЫЙ *мин.*, *вет.* шпатападо́бны.

ШПА́ТОВЫЙ *мин.* шпа́тавы.

ШПА́Ц||ИЯ *тип.* шпа́цыя, -цыі *ж*; **разби́ть на ~ии** разбі́ць на шпа́цыі.

ШПЕНЁК шпянёк, -нька́ *м*.

ШПИГО́В||АННЫЙ шпігава́ны; **~А́ТЬ** *несов. прям.*, *перен.* шпігава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд. прям.*, *перен.* шпігава́цца; **~КА** *ж* **1.** шпігава́нне, -ння *ср*, шпіго́ўка, -кі *ж*; **2.** *перен.* шпігава́нне, -ння *ср*.

ШПИК I *м* (*свиное сало*) са́ла, -ла *ср*, шпік, *род.* шпі́ку *м*.

ШПИК II (*шпион, сыщик*) *разг. презр.* шпік, *род.* шпіка́ *м*, шпег, *род.* шпе́га *м*.

ШПИКОВА́ТЬ *см.* **шпигова́ть.**

ШПИЛЕВО́Й *арх.*, *мор.* шпілявы́.

ШПИ́ЛЕЧНЫЙ шпі́лечны, шпі́лькавы.

ШПИЛЬ *арх.*, *мор.* шпіль, *род.* шпі́ля *м*.

ШПИ́ЛЬК||А *в разн. знач.* шпі́лька, -кі *ж*; **рогові́е ~и** рагавы́я шпі́лькі; **подпуска́ть ~и** *перен.* падпуска́ць шпі́лькі.

ШПИНА́Т *бот.* шпіна́т, -ту *м*; **~НЫЙ** шпіна́тны, шпіна́тавы.

ШПИНГАЛЕ́Т *м тех.* шпінгале́т, -та *м*, за́шчапка, -кі *ж*, засаўка, -кі *ж*.

ШПИ́НДЕЛЬ *тех.* шпі́ндэль, -ля *м*.

ШПИНЬ *тех.* шпень, *род.* шпяня́ *м*.

ШПИО́Н шпіён, -на *м*; **~А́Ж** шпіяна́ж, -жу *м*; **~ИТЬ** *несов.* шпіёніць; **~КА** шпіёнка, -кі *ж*; **~СКИЙ** шпіёнскі; **~СТВО** шпіёнства, -ва *ср*.

ШПИЦ I *арх.* шпіц, *род.* шпі́ца *м*, шпіль, *род.* шпі́ля *м*, спіча́к, -ка́ *м*.

ШПИЦ II (*порода собак*) шпіц, *род.* шпі́ца *м*.

ШПИЦБЕ́РГЕН *о.* Шпіцбе́рген, -на *м*.

ШПИЦРУ́ТЕН *чаще мн. ист.* шпіцру́тэн, -на *м*.

ШПЛИНТ *тех.* шплінт, *род.* шплі́нта *м*.

ШПОН *м*, **ШПО́НА** *ж тип.* шпо́на, -ны *ж*; **на шпо́нах** на шпо́нах.

ШПО́Н||КА *тех.* шпо́на, -ны *ж*, шпо́нка, -кі *ж*; **~ОЧНЫЙ** *тех.* шпо́начны.

ШПО́Р||А шпо́ра, -ры *ж*; ◇ **дать ~ы коню́** даць шпо́ры каню́.

ШПО́РЕЦ *бот.* шпо́рац, -рца *м*.

ШПО́РИТЬ *несов.* шпо́рыць.

ШПО́РНИК I *м бот.* рагу́лькі, -лек, *ед.* рагу́лька, -кі *ж*.

ШПО́РНИК II *зоол.* шпо́рнік, -ка *м*.

ШПО́РНЫЙ шпо́рны.

ШПО́РЦА *зоол.* шпо́рка, -кі *ж.*
ШПРЕ *р.* Шпрэ *нескл., ж.*
ШПРИНТО́В *мор.* шпрынто́ў, -то́ва *м.*
ШПРИЦ *мед.* шпрыц, *род.* шпры́ца *м.*
ШПРИЦО́В||АННЫЙ *тех.* шпрыцава́ны; **~А́ТЬ** *несов. тех.* шпрыцава́ць; **~А́ТЬСЯ** *страд.* шпрыцава́цца; **~КА** *ж тех.* шпрыцава́нне, -ння *ср,* шпрыцо́ўка, -кі *ж.*
ШПРО́Т||Ы *мн.* (*ед.* **шпрот** *м.,* **шпро́та** *ж*) шпро́ты, -таў, *ед.* шпро́та, -ты *ж;* **~НЫЙ** шпро́тны, шпро́тавы.
ШПУ́ЛЬ||КА шпу́лька, -кі *ж;* **~НИК** шпу́льнік, -ка *м;* **~НИЦА** шпу́льніца, -цы *ж.*
ШПУ́ЛЯ *спец.* шпу́ля, -лі *ж.*
ШПУНТ *тех.* шпунт, *род.* шпу́нта *м;* **~ОВА́ЛЬНЫЙ** *тех.* шпунтава́льны; **~О́ВАННЫЙ** шпунтава́ны; **~ОВА́ТЬ** *несов. тех.* шпунтава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** шпунтава́цца; **~О́ВКА** *тех.* шпунто́ўка, -кі *ж;* **~ОВО́Й** *тех.* шпунтавы́.
ШПУНТУ́БЕЛЬ *стол.* шпунту́бель, -ля *м.*
ШПУР *горн., тех.* шпур, *род.* шпу́ра *м;* **~ОВО́Й** шпуравы́.
ШПЫНЯ́ТЬ *несов.* **1.** *разг.* кало́ць; **2.** *перен. разг.* дапяка́ць, дайма́ць; (*издеваться*) кпіць, здзе́кавацца (*з каго-чаго*).
ШРАМ шрам, *род.* шра́ма *м.*
ШРАПНЕ́ЛЬ шрапне́ль, -лі *ж;* **~НЫЙ** шрапне́льны.
ШРЕ́ДЕР *с.-х.* шрэ́дэр, -ра *м;* **~О́ВАННЫЙ** шрэдэрава́ны; **~ОВА́ТЬ** *сов. и несов. с.-х.* шрэдэрава́ць; **~ОВА́ТЬСЯ** *страд.* шрэдэрава́цца.
